ПАМЯЦЬ



ГІСТОРЫКА-
ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ
ХРОНІКІ
ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ
БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ
ВЫДАННЕ
СТВАРАЕЦЦА
ПАВОДЛЕ
РАШЭННЯ
ЎРАДА
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

ПАМЯЦЬ

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН

У 2 кнігах

Кніга 1-я

МІНСК
БЕЛТА
2001

УДК 947.6
ББК 63.3 (4 Беи)
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г.К.КІСЯЛЁЎ (галоўны рэдактар выдавецкага цэнтра БЕЛТА),
А.М.ГАЛІЦКІ, І.А.ПРОЦКІН, У.Я.РАЙСКІ, Б.В.УЛЬЯНКА

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

А.М.ГАЛІЦКІ (старшыня камісіі), В.Т.БАБРАЎНІЧЫ, А.К.КУНДЗЕЛЕЎ,
Ф.Ф.МУХА, В.М.НОВІКАВА, Г.Ф.ПАСЬКО, У.Я.РАЙСКІ, І.П.ЧАРНЯК, М.А.ЧЭЧКА,
Л.У.ЯЖОВА, В.І.ЯНЧАНКА

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

Б.В.УЛЬЯНКА (кіраўнік цэнтра), У.І.ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М.З.БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст), Р.А.ЧАРНАГЛАЗАВА (рэдактар)

Укладальнік
У.Я.РАЙСКІ

Мастак
Э.Э.ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі
В.А.РАГАЛЕВІЧА

ISBN 985-6302-34-X

© БЕЛТА, 2001

Родныя краявіды. У наваколлі адселенай в. Андрэеўка.

9 — 5-е тысячагоддзі да н.э.	Першапачатковае засяленне тэрыторыі Буда-Кашалёўшчыны чалавекам.
VII — III стагоддзі да н.э.	Гэтым часам датуецца дзейнасць чалавека на Кашалёўскім і Смычкоўскім гарадзішчах.
Другая палова 1-га тысячагоддзя н.э.	Рассяленне радзімічаў на тэрыторыі раёна.
Канец XI стагоддзя н.э.	Буда-Кашалёўшчына ў складзе Чарнігава-Северскай зямлі.

Веснавая паводка на Дняпры каля в. Губіцкі Кардон.

1335 г.	Тэрыторыя раёна ў складзе Вялікага княства Літоўскага.
1452 г.	Першае ўпамінанне Буда-Кашалёва ў гістарычных крыніцах.
Пачатак XVII ст.	Буда-Кашалёўшчына ў складзе Рэчы Паспалітай.
1601—1603 гг.	Страшэнны голад і масавая смяротнасць на тэрыторыі рэгіёна.

Каля аднаго з дубоў-волатаў.

5 жніўня 1772 г.	Першы падзел Рэчы Паспалітай. Буда-Кашалёўшчына далучана да Расійскай імперыі.
1772—1776 гг.	Тэрыторыя раёна ўвайшла ў Рагачоўскі павет Магілёўскай губерні.
1796—1801 гг.	Буда-Кашалёўшчына ў складзе Беларускай губерні.
1802—1917 гг.	Тэрыторыя раёна ў складзе Магілёўскай губерні.
1845 г.	У в. Кашалёў адкрылася першае народнае вучылішча.

Уваравіцкае гарадзішча.

1866 г.	Адкрылася Рагінскае народнае вучылішча.
Восень 1873 г.	Уведзены ўчастак Лібава-Роменскай чыгункі са станцыямі Буда-Кашалёўская, Уза і інш.
1888 г.	У Буда-Кашалёве пабудавана прадпрыемства па вырабе драўляных дэталей для ткацкіх станкоў.
1912 г.	У Буда-Кашалёве адкрыўся тэхнікум лясной гаспадаркі.
1914 г.	У в. Кашалёў адкрылася земская бальніца.

Курганны могільнік у наваколлі в. Дуравічы.

7—8 сакавіка 1917 г.	Выбраны першы валасны Савет і сельскія камітэты.
8 мая 1917 г.	Забастоўка рабочых Наспенскага шклозавода.
Чэрвень—ліпень 1917 г.	Масавыя хваляванні сялян і рабочых на Буда-Кашалёўшчыне.
Снежань 1917 г.	Сфарміраваны Рагінскі і іншыя партызанскія атрады для барацьбы з польскімі легіянерамі корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага.

Старадаўні парк і сажалка ў в. Шырокае.

Канец лютага 1918 г.	Буда-Кашалёўшчыну акупіравалі войскі кайзераўскай Германіі.
30 лістапада 1918 г.	Мястэчкі Буда-Кашалёва, Уваравічы, ст. Уза і іншыя населеныя пункты вызвалены ад нямецкіх акупантаў.
14 снежня 1918 г.	На ст. Уза пачаліся перагаворы паміж прадстаўнікамі нямецкага камандавання і савецкай дэлегацыяй.
Люты 1919 г.	У воласці сфарміравана тылавое апалчэнне.

Будынак Рагінскага спіртзавода. Пабудаваны ў XIX стагоддзі.

27—28 сакавіка 1919 г.	На ст. Уза разгромлены атрады, якія ўдзельнічалі ў антысавецкім стракапытаўскім мяцяжы.
26 красавіка 1919 г.	Створана і ўключана ў РСФСР Гомельская губерня, у склад якой увайшла і Буда-Кашалёўшчына.
22 кастрычніка 1919 г.	Утвораны валасныя рэўкомы.
Сакавік—май 1920 г.	Абарона воласці ад польскіх інтэрвентаў.

Станцыя Буда-Кашалёўская.

1920 г.	У воласці з'явіўся першы трактар «Фардзон».
1 лістапада 1921 г.	Пачаў працаваць завод «Адраджэнне» ў в. Наспа.
Канец 1921 г.	Арганізавана першая ў раёне ініцыятыўная камсамольская група.
28 мая 1923 г.	Валвыканком пераведзены з в. Кашалёў у в. Буда-Кашалёва.
3 сакавіка 1924 г.	Буда-Кашалёўская воласць у складзе Бабруйскай акругі БССР.

Станцыя Уза.

17 ліпеня 1924 г.	Утвораны Буда-Кашалёўскі раён у складзе Бабруйскай акругі.
8 снежня 1926 г.	Утвораны Уваравіцкі раён у Гомельскай акрузе БССР.
23 кастрычніка 1927 г. — ліпень 1930 г.	Буда-Кашалёўскі раён у складзе Гомельскай акругі.
10 мая 1931 г.	Выйшаў у свет першы нумар раённай газеты «Ленінскі шлях».

Курган Славы ў гонар савецкіх воінаў-вызваліцеляў каля в. Гаўлі.

1932 г.	У раёне пабудавана першая МТС.
1936 г.	Пабудавана раённая электрастанцыя.
1938 г.	У раёне пачала працаваць Рагінская МТС.
1938 г.	Буда-Кашалёва атрымала статус гарадскога пасёлка.
1938—1940 гг.	Наватары раёна ўдзельнічалі ў рабоце ВДНГ у Маскве.

Помнік загінуўшым воінам-вызваліцелям, партызанам і землякам у в. Губічы.

22 чэрвеня 1941 г.	Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Правядзенне масавай мабілізацыі. У Буда-Кашалёўскім і Уваравіцкім раёнах створаны знішчальныя батальёны, атрады народнага апалчэння.
20 ліпеня 1941 г.	Пачалася эвакуацыя на ўсход насельніцтва, маёмасці МТС, калгасаў і прадпрыемстваў.
Сярэдзіна жніўня 1941 г.	Акупацыя раёна нямецка-фашысцкімі войскамі.
27 снежня 1941 г.	Масавы расстрэл акупантамі насельніцтва ў Буда-Кашалёве.

Ветэраны вайны ў час ускладання вянкоў да помніка савецкім воінам і партызанам у Буда-Кашалёве.

1943 г.	На тэрыторыі раёна дзейнічаюць Гомельская, Буда-Кашалёўская і Уваравіцкая партызанскія брыгады.
Сакавік— 23 лістапада 1943 г.	Дзейнасць Буда-Кашалёўскага і Уваравіцкага падпольных РК КП(б)Б.
28 лістапада 1943 г.	Вызвалены г.п. Буда-Кашалёва.
5 снежня 1943 г.	Уся тэрыторыя раёна вызвалена ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

Да чытача

Чарговая кніга з серыі гісторыка-дакументальных хронік «Памяць» прысвечана Буда-Кашалёўскаму раёну — аднаму з маляўнічых куткоў Гомельшчыны. Яна — вынік нястомнай, карпатлівай працы вялікага аўтарскага калектыву, у складзе якога навукоўцы і аматары-краязнаўцы, выкладчыкі ВНУ і школьныя настаўнікі, работнікі раённага выканаўчага камітэта, ваеннага камісарыята, сельсаветаў, супрацоўнікі архіваў і музеяў, журналісты, ветэраны вайны і працы, выдавецкія рэдактары — усе тыя, хто неабыякавы да гісторыі роднай Бацькаўшчыны, да яе мінулага і сучаснага.

Гісторыя Буда-Кашалёўшчыны цесна і непарыўна звязана з гісторыяй нашай краіны. Гэты край багаты на гістарычныя падзеі, цікавых людзей, якія праславілі не толькі свой раён, але і ўсю нашу Беларусь.

На старонках гэтай кнігі чытач знойдзе шмат цікавага, сустрэне імёны дарагіх і блізкіх людзей, адкрые для сябе малавядомыя факты з гісторыі сваёй малой радзімы.

У кнізе, як і ў папярэдніх выданнях серыі, шырока выкарыстаны архіўныя дакументы, разнастайныя публікацыі з друкаваных крыніц, гістарычныя нарысы, напісаныя спецыяльна для гэтага выдання, успаміны ўдзельнікаў і сведкаў падзей. Безумоўна, стваральнікі не маглі цалкам ахапіць усю гісторыю краю: далёка не ўсе факты знайшлі адлюстраванне на старонках хронікі, не ўсе прозвішчы тых, хто заслугоўвае гістарычнай памяці, занесены ў мемарыяльныя спісы. На тое ёсць шмат аб'ектыўных прычын. Але з выхадам хронікі «Памяць» краязнаўчая работа не спыняецца, а, наадварот, павінна атрымаць новы імпульс. І можна з упэўненасцю сказаць, што наперадзе нас чакаюць новыя гістарычныя адкрыцці, з небыцця будуць вяртацца новыя імёны, а гэта значыць, што будуць пісацца новыя старонкі «Памяці».

Гісторыка-дакументальная хроніка «Памяць. Буда-Кашалёўскі раён» выходзіць у дзвюх кнігах. Першая з іх ахоплівае перыяд гісторыі ад старажытных часоў да 1944 г., уключаючы падзеі, звязаныя з вызваленнем раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У ёй таксама змешчаны спісы землякоў, стаўшых ахвярамі палітычных рэпрэсій і пазней рэабілітаваных, спісы загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну партызан, падпольшчыкаў, мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, а таксама спісы воінаў Чырвонай арміі, што загінулі пры абароне і вызваленні раёна і пахаваны на яго тэрыторыі.

Раённая камісія па напісанні гісторыка-дакументальнай хронікі выказвае шчырую падзяку ўсім, хто прымаў удзел у рабоце над кнігай і садзейнічаў яе выданню.


БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН
Цэнтры раёнаў
Цэнтры сельсаветаў
Шчыльнасць забруджвання мясцовасці цэзіем-137 Кі/км²
1–5
5–15
15–40
больш за 40
РАГАЧОЎСКІ РАЁН
КАРМЯНСКІ РАЁН
ЧАЧЭРСКІ РАЁН
ВЕТКАЎСКІ РАЁН
ГОМЕЛЬСКІ РАЁН
РЭЧЫЦКІ РАЁН
ЖЛОБІНСКІ РАЁН
ГОМЕЛЬСКАЯ ВОБЛ.
БУДА-КАШАЛЁВА
ЧАЧЭРСК
ГОМЕЛЬ
Буда-Кашалёўскі біял. зак.
Дняпро
Сож
Чачора
Ржаўка
Уза
Бярэзіна
53°
52°30′
30°30′
Збароў
Гадзілавічы
Курганне
Новы Крыўск
Турск
Красніца
Рыскаў
Ходасавічы
Антонаўка
Высокае
Вял. Стрэлкі
Майскае
Гарадзец
Мікалаеўка
Меркулавічы
Надзеждзіна
Прыбар
Хімы
Зорка
Саўгасная
Майсеевка
Кірава
Стоўпня
Лозаў
Антонаўка
Глыбочыца
Бабоўка
Матнявічы
Дзербічы
Рагінь
Каромка
Калыбаўка
Хальч
Буда-Люшаўская
Негаўка
Вазнясенскі
Роўкавічы
Ніўкі
Бердыж
Стар. Рудня
Слабада-Люшаўская
Бронніца
Падлужжа
Салтанаўка
Хмяльное
Любавін
Ліпінічы
Струкі
Забалоцце
Крутое
Баранаўка
Пірэвічы
Галы
Сябровічы
Шарыбаўка
Кучынск
Забаб'е
Шарыбаўка
Дубраўка
Скепня
Качан
Качанова
Хароўшаўка
Халочча
Патапаўка
Кашалёва
Гаўлі
Рудня-Кашалёўская
Дудзічы
Наспа
Мядзведзева
Патапаўка
Ліпа
Колас
Мікалаеўка
Дзікава
Пабядзіцель
Бурлак
Камінтэрн
Шыхаў
Губічы
Жытанежжа
Бушаўка
Дуравічы
Шырокае
Нов. Уза
Дубавіца
Міхалеўка
Новы Свет
Іванаўка
Марозавічы
Чараток
Акцябр
Губіцкі Кардон
Надайка
Радзеева
Чэрапаўка
Барчанкі
Верх. Алба
Васход
Макаўе
Радзеева
Пянчын
Буслы
Камунар
Асобіна
Данілавічы
Елянец
Асавок
Глазаўка
Калініна
Лапічы
Залены Востраў
Клёнавіца
Стар. Буда
Блюдніца
Падсямёнаўка
Кр. Знамя
Цхінічы
Уза
Смычок
Чырв. Курган
Уваравічы
Калініна
Пыхань
Крыўск
Бацунь
Рудзянец
Гаралок
Стар.-Гусявіца
Калінінскі
Нов.
Лазурная
Горваль
Сенавец
Грыгараўка
Бальшавік
Рудня-Альхоўка
Чабатовічы
Лозкі
Баркі
Любань
Рагі
Іволськ
Касцюкоўка
Азарэліна
Хоўхла
Рудня Целяшоўская
Цярэнічы
Міліград
Васільполле
Стар. Беліца
Яроміна
Падалессе
Бярвенаўка
Целяшы
Светач
Глыбаў
Чорнае
Калінаўка
Краснае
Гарноўка
Урыцкае
Буда-Люшаўская
Хмяльное
Гаўлі
Губічы
Жытанежжа
Марозавічы
Недайка
Глазаўка
Пянчын
Елянец
Стар. Буда
Крыўск
Смычок
Гарадок
Бацунь
Чабатовічы
Іволськ
Любань
Хоўхла
Бабрык Жлоб.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЁН размешчаны на паўночным усходзе Гомельскай вобласці. Утвораны 17.7.1924 г. Плошча 1,6 тыс. кв. км. Насельніцтва 43,6 тыс. чалавек (на 1.1.2000). Цэнтр раёна – Буда-Кашалёва, горад абласнога падпарадкавання, у якім пражывае 9,5 тыс. чалавек. У раёне 242 населеныя пункты, у т.л. г.п. Уваравічы; 21 сельскі і 1 пасялковы Саветы: Акцябрскі, Буда-Люшаўскі, Бярвёнаўскі, Глазаўскі, Губіцкі, Гусявіцкі, Дуравіцкі, Забалоцкі, Івольскі, Камунараўскі, Кашалёўскі, Крыўскі, Ліпініцкі, Марозавіцкі, Мікалаеўскі, Патапаўскі, Рагінскі, Старабудскі, Узоўскі, Чабатовіцкі, Шырокаўскі і Уваравіцкі. Раён мяжуе з Рагачоўскім (на паўночным захадзе), Чачэрскім (на паўночным усходзе), Жлобінскім (на захадзе, часткова мяжа праходзіць па р. Днепр), Рэчыцкім і Гомельскім (на поўдні), Веткаўскім (на ўсходзе) раёнамі. Найбольшая працягласць тэрыторыі раёна з захаду на ўсход – 52 км, з поўначы на поўдзень – 61 км.

Сельская гаспадарка раёна прадстаўлена 11 калгасамі, 12 сельскагаспадарчымі унітарнымі прадпрыемствамі, рэспубліканскім аграпрамысловым унітарным прадпрыемствам «Асобіна», у складзе якога Гомельская бройлерная і Буда-Кашалёўская птушкафабрыкі, Узоўскі камбінат хлебапрадуктаў, былыя саўгасы імя Галавачова і «Праўда», 27 фермерскімі гаспадаркамі. З 21,4 тыс. чалавек працаздольнага насельніцтва ў сельскай гаспадарцы заняты 6,9 тыс. чалавек.

Вядучымі прамысловымі прадпрыемствамі раёна з'яўляюцца сумеснае беларуска-галандскае прадпрыемства ААТ «Аміпак», адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Буда-Кашалёўскія сыры», «Буда-Кашалёўская сельгасхімія», «Буда-Кашалёўскі райаграснаб», унітарныя прадпрыемствы «Уваравіцкі льнозавод», «Узоўскі кансервавы агароднінасушыльны завод», «Уваравіцкае аўтатранспартнае прадпрыемства», будаўнічыя арганізацыі МПМК-92, ДРБУ-184, прадпрыемства меліярацыйных сістэм, дзяржаўная лесагаспадарчая ўстанова «Буда-Кашалёўскі лясгас». Існуе біялагічны заказнік.

Дзейнічаюць ААТ «Буда-Кашалёўскі камбінат бытавога абслугоўвання», у складзе якога 2 Дамы быту, 16 комплексных прыёмных пунктаў, у сістэме спажывецкай каапераціі – 102 магазіны, камбінат грамадскага харчавання, каапнарыхтпрамгандаль, камбінат кааператыўнай прамысловасці.

У раёне 24 сярэднія, 14 базавых і 1 пачатковая школы, 34 дашкольныя ўстановы, 2 музычныя школы. Кадры для сельскай гаспадаркі рыхтуе Буда-Кашалёўскі аграрна-тэхнічны каледж. З медыцынскіх устаноў дзейнічаюць цэнтральная і Уваравіцкая раённыя, 3 участковыя бальніцы, 1 сельская амбулаторыя, 33 фельчарска-акушэрскія пункты. Сетка ўстаноў культуры прадстаўлена 40 клубамі і 41 бібліятэкай. Дзейнічаюць дзіцяча-юнацкая спартыўная школа па веласпорце і дзіцяча-юнацкі клуб фізічнай падрыхтоўкі.

Раён уваходзіць у лік раёнаў, асабліва пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Значная частка яго тэрыторыі забруджана радыенуклідамі. 22 населеныя пункты адселены і пахаваны. За час, што прайшоў пасля катастрофы, насельніцтва раёна скарацілася на 8,6 тыс. чалавек.

Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка Мінск – Гомель, аўтамабільныя дарогі Бабруйск – Гомель, Гомель – Магілёў. Выдаецца раённая газета «Авангард» (заснавана ў 1931 г.).

Мікрараён Буда-Кашалёва.

Прырода раёна

ГЕАЛАГІЧНАЯ БУДОВА І КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ

У тэктанічных адносінах тэрыторыя раёна прымеркавана да Прыпяцкага прагіну (Гарадоцка-Хацецкай ступені) і заходняга схілу Варонежскай антэклізы. Зверху залягаюць пароды антрапагенавага ўзросту магутнасцю 7—70 м, ніжэй — неагенавыя і палеагенавыя 10—35 м, мелавыя 50—120 м, юрскія 50—110 м, дэвонскія 220—1600 м, верхнепратэразойскія (венд і рыфей) 20—50—250 м адклады. Агульная магутнасць асадкавага чахла 800—2100 м. Пад ім на глыбіні 650—800 м на ўсходзе, 1000—2000 м на захадзе ніжэй узроўню мора пароды крышталічнага фундаменту. Радовішчы торфу, цэментных і тугаплаўкіх глін, для грубай керамікі, пяску (Энцыклапедыя прыроды Беларусі. Мн., 1983. Т. 1. С. 348).

Найбольш вядомыя і распрацаваныя радовішчы карысных выкапняў

АСОБІНСКАЕ РАДОВІШЧА СУГЛІНКАЎ. За 0,7 км на паўднёвы захад ад в. Асобіна. Разведаныя запасы 14 тыс. куб. м, прагнозныя — 564 тыс. куб. м. Магутнасць карыснай тоўшчы 1 — 5,3 м, ускрышы (пяскі, супескі) 0,2 — 2,4 м. Радовішча эксплуатуецца малым прадпрыемствам «Макаўе».

ЗАРАНСКАЕ РАДОВІШЧА ГЛІН. Каля заходняй ускраіны пас. Зара. Разведаныя запасы 5,1 млн. т, перспектыўныя — 5 млн. т. Магутнасць карыснай тоўшчы 3,5—11,2 м, ускрышы 1,6—9 м. Гліны прыдатныя для вытворчасці аглапарыту, цэменту (у сумесі з фосфарагіпсам), вырабу цэглы і труб. Не распрацоўваецца.

ЕЛЯНЕЦКАЕ РАДОВІШЧА ГЛІН. За 0,2 км на паўднёвы ўсход ад в. Елянец. Разведаныя запасы 815 тыс. куб. м, перспектыўныя — 885 тыс. куб. м. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,5—15 м, ускрышы 0,2—3 м. Гліны прыдатныя для вырабу цэглы. Не распрацоўваецца.

КАРАБЛІШЧА. Нізіннае балота на паўночным усходзе ў вадазборы р. Чачора. Плошча 1,3 тыс. га. Глыбіня торфу да 6 м, сярэдняя — 3 м, ступень распаду 26%, попельнасць 11%, запасаў засталося каля 1 млн. т. Торф здабываецца на ўгнаенне і паліва. Балота асушана адкрытай сеткай, участкі торфаздабычы часткова рэкультываваны, частка асушаных зямель пад ворывам і сенажаццю.

МІХАЛЁЎСКІ ТОРФАМАСІЎ. Нізіннае балота на ўсходзе раёна ў вадазборы р. Ліпа. Плошча 1,3 тыс. га, у межах прамысловага пакладу да 0,9 тыс. га. Глыбіня торфу да 7 м, сярэдняя — 2 м, ступень распаду 34%. Запасы торфу каля 2 млн. т. Невялікая здабыча торфу на ўгнаенне. Балота асушана адкрытай сеткай і выкарыстоўваецца пад ворыва і сенажаць.

ПРАСЕКІ. Радовішча суглінкаў каля заходняй ускраіны пас. Засценны. Разведаныя запасы 245 тыс. куб. м, перспектыўныя — 346 тыс. куб. м. Магутнасць карыснай тоўшчы 1—4,7 м, ускрышы (торф, пяскі) да 2 м. Суглінкі прыдатныя для вырабу цэглы. Не распрацоўваецца.

САЛАЎЁЎСКАЕ РАДОВІШЧА ПЯСКОЎ. За 0,6 км на поўдзень і паўднёвы захад ад в. Салаўёва. Разведаныя запасы 211 тыс. куб. м, перспектыўныя — 130 тыс. куб. м. Магутнасць карыснай тоўшчы 1,2—2,3 м, ускрышы да 0,2 м. Не распрацоўваецца.

СМЫЧКОЎСКАЕ РАДОВІШЧА ГЛІН. Каля ўсходняй ускраіны в. Смычок. Разведаныя запасы 12,3 млн. т, перспектыўныя 29,4 млн. т. Магутнасць карыснай тоўшчы 4,6—14 м, ускрышы (пяскі) 2—12 м. Гліны прыдатныя для вырабу керамзіту, аглапарыту. Не распрацоўваецца.

ШАРЫБАЎСКАЕ РАДОВІШЧА СУГЛІНКАЎ. За 0,5 км на поўдзень ад в. Шарыбаўка. Разведаныя запасы 185 тыс. куб. м. Магутнасць карыснай тоўшчы 0,7 — 3,9 м, ускрышы 0,2—1,2 м. Распрацоўвалася цагельным заводам (в. Якімаўка).

РЭЛЬЕФ

Тэрыторыя раёна раўнінная. Паўночнаўсходняя яго частка знаходзіцца ў межах Чачорскай раўніны, паўднёва-заходняя — у межах Гомельскага Палесся. Агульны нахіл тэрыторыі з поўначы на поўдзень. Пераважаюць вышыні 135—145 м над узроўнем мора. Каля 45% тэрыторыі з абсалютнымі адзнакамі 140—150 м, 44% — 130—140 м, 10% — 120—130 м. Найменшая абсалютная адзнака на паўднёвым захадзе, на

мяжы з Рэчыцкім раёнам — урэз русла Дняпра — 117 м над узроўнем мора. Найвышэйшыя пункты на тэрыторыі раёна каля в. Анастасьеўка (157 м) на поўначы, у в. Жытанежжа (157 м), за 8 км на захад ад Буда-Кашалёва, на поўначы раёна каля в. Варварына (153 м) і на паўднёвым усходзе каля в. Рудзянец (154 м) над узроўнем мора.

КЛІМАТ

Асаблівасць кліматычных умоў Буда-Кашалёўшчыны вызначаецца яе геаграфічным становішчам, раўнінным рэльефам, заходнім пераносам паветраных мас. Тэрыторыя размешчана ва ўмераным кліматычным поясе і мае ўмерана кантынентальны тып клімату.

Геаграфічная шырата (да 53^0 паўночнай шыраты) вызначае вугал падзення сонечных праменяў, даўжыню дня і сонечнага асвятлення і г.д. У дзень летняга сонцастаяння (22 чэрвеня) у Буда-Кашалёве ён дасягае да 60^0 45', у дзень зімовага сонцастаяння памяншаецца да 13° 45', у дні раўнадзенстваў (21 сакавіка і 23 верасня) складае 37° 15'. Больш як на 10 гадзін змяняецца за год працягласць дня.

Гадавая сумарная сонечная радыяцыя на тэрыторыі раёна складае 3850 — 3900 МДж/кв. м.

Вялікі ўплыў аказвае заходні перанос паветраных мас з Атлантычнага акіяна, разам з якімі прыходзяць марскія ўмераныя паветраныя масы. У сярэднім за год цыкланальная цыркуляцыя робіць уплыў на надвор'е на працягу 210 сутак. Назіранні за метэаралагічнымі паказчыкамі праводзяць бліжэйшыя метэастанцыі — Жлобінская (працуе з 1924 г.) і Чачэрская (працуе з 1885 г.).

Сярэдняя тэмпература ліпеня 18,4 °С, студзеня -7,4 °С. Тэмпература паверхні глебы адпаведна 22 °С і -7 °С. Абсалютны мінімум тэмпературы паветра -36 °С (студзень), максімальны 37 °С (жнівень). За халодны перыяд (кастрычнік — сакавік) колькасць дзён з тэмпературай ніжэй 0 °С складае 125 — 135, а з ападкамі — 77. За цёплы перыяд (красавік — кастрычнік) дзён з тэмпературай вышэй 0 °С — 230 — 240, з ападкамі — 82 — 88. Усяго сярэдняя колькасць ападкаў за год па Жлобінскай метэастанцыі — 595 мм, па Чачэрскай — 637 мм. Сярэдняя адносная вільготнасць паветра — 78% (Жлобінская) і 79% (Чачэрская). У сярэднім за год 160 дзён з ападкамі. Сярэдняя вышыня снегавога покрыва 20 — 25 см, якое трымаецца на працягу 110 — 120 дзён.

Працягласць безмарознага перыяду ў паветры 160 — 170 дзён (паводле назіранняў з 27 красавіка па 5 кастрычніка), на паверхні глебы 140 — 150 дзён (з 9 мая па 26 верасня). Сярэдняя дата снегараставання 8 сакавіка — 19 сакавіка, а адтавання глебы да глыбіні 10 см — 25 сакавіка, да глыбіні 30 см — 3 сакавіка.

Сярэднямесячная тэмпература глебы па тэрыторыі раёна ў маі на глыбіні 5 см — 14 — 15 °С, у чэрвені — 18,5 — 20 °С, ліпені — 20,5 — 21 °С, жніўні — 18,5 — 20 °С, верасні 13 — 14 °С, кастрычніку 6,0 — 6,5 °С. Паводле агракліматычнага раянавання тэрыторыя Буда-Кашалёўшчыны адносіцца да Паўднёвай агракліматычнай вобласці.

УНУТРАНЫЯ ВОДЫ РАЁНА

Гідраграфічная сетка раёна адносіцца да басейна Чорнага мора.Тэрыторыя Буда-Кашалёўшчыны размяшчаецца ў зоне дастатковага ўвільгатнення. Рэльеф і геалагічная будова стварылі неабходныя ўмовы для развіцця гідраграфічнай сеткі. Паўднёва-заходняя мяжа раёна (з Жлобінскім і Рэчыцкім раёнамі) праходзіць па Дняпры, у які ўпадаюць з тэрыторыі раёна невялікія рачулкі Чарамха і інш. Па тэрыторыі раёна працякаюць правыя прытокі Сожа — Чачора, Ліпа, Уза. У раёне мноства штучных сажалак, пракладзены меліярацыйныя і магістральныя каналы.

Унутраныя воды раёна належаць да Прыпяцкага гідралагічнага раёна. Густата натуральнай рачной сеткі 0,35 км/кв. км. Даўжыня меліярацыйных каналаў 7,4 тыс. км, у т.л. адрэгуляваных водапрыёмнікаў 128 км, магістральных і падвадных каналаў 557 км, рэгуляцыйных каналаў — 460 км.

ДНЯПРО (ДНЕПР). Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў яго верхнім цячэнні. Пойма Дняпра на тэрыторыі раёна лугавая, парэзана шматлікімі старыцамі да 8 — 10 км, суправаджаецца павышанымі грывістымі ўчасткамі пясчаных узгоркаў і прырэчышчавых валоў. Рэчышча моцна звілістае, багатае перакатамі і мелямі. Крыніцамі жыўлення з'яўляюцца снегавыя воды — каля 50%, грунтавыя — 27%, дажджавыя — 23%. Рэжым Дняпра на Беларусі вывучаецца з

1876 г. Бліжэйшыя гідралагічныя пасты Жлобін, Рэчыца. Веснавое разводдзе праходзіць адной хваляй, рэдка — дзвюма, трыма. Сярэдняя вышыня пад'ёму вады каля Рэчыцы — 4 м. Доля веснавога сцёку — 57%, летне-асенняга і зімовага адпаведна да 30 і 13%. Таўшчыня лёду 60—80 см. Сярэдняя тэмпература вады летам 19—22°С, найбольшая ў ліпені — 28°С (1954).

Вада ў рацэ гідракарбанатная — кальцыевага класа, умерана цвёрдая, павышанай і сярэдняй мінералізацыі.

Водзяцца акунь, плотка, лешч, шчупак, лінь, карась, верхаводка, гусцяра, чахонь, судак, падуст, вусач, сом, язь і інш.

У пасляаварыйны перыяд у зоне тэхнагеннага арэала Чарнобыльскай АЭС вядуцца назіранні за станам радыеактыўнага забруджвання басейна Дняпра і падземных вод. Агульная сетка назіранняў уключае 96 свідравін, з якіх 13 размешчаны ў даліне Дняпра, з іх 9 — па водазаборах Жлобіна і Рэчыцы, 4 — ніжэй упадзення р. Сож. Для кантролю за радыяцыйным станам падземных вод у басейне р. Сож і яе прытокаў Ліпы, Беседзі, Сянны закладзены 43 назіральныя свідравіны, у т.л. у даліне р. Ліпа (правы прыток Сожа) — 6.

ДУЛЕПА, рака, правы прыток Чачоры. У Рагачоўскім і Буда-Кашалёўскім раёнах. Пачынаецца на поўначы ад в. Бярозавы Гай. На ўсім працягу каналізаваная. Вадазбор каля 60 кв. км, нізінны, пад лесам да 20% плошчы. Даўжыня 12,5 км. За 26 км на поўнач ад Буда-Кашалёва каля в. Выдрыца ў даліне р. Дулепа створана вадасховішча Чачора. Плошча — 0,75 кв. км, даўжыня да 3 км, шырыня да 250 м, найбольшая глыбіня 3 м, сярэдняя 1,5 м. Аб'ём вады 1,1 млн. куб. м. Лясы ў паўночна-заходняй частцы вадазбору, уздоўж поймы ракі размяшчаюцца балоты.

Вадасховішча створана для арашэння зямель і з мэтай адпачынку.

ІВОЛЬКА, рака, правы прыток Узы ў Буда-Кашалёўскім і Гомельскім раёнах. Пачынаецца на паўночным усходзе ад в. Багамолаўка (Буда-Кашалёўскі раён), упадае ў р. Уза паміж вёскамі Рудня-Целяшоўская і Целяшы (Гомельскі раён). Даўжыня 19 км. Вадазбор 81 кв. км.

ЛІПА, рака, правы прыток Сожа. Пачынаецца на мяжы Буда-Кашалёўскага і Рагачоўскага раёнаў на паўночным захадзе ад в. Буда-Люшаўская, за 1 км на паўднёвы ўсход ад в. Вуглы Рагачоўскага раёна. Упадае ў Сож на мяжы з Чачэрскім раёнам. Найбольшыя прытокі Гліна і Прудаўка (злева). Даўжыня 64 км. Вадазбор (577 кв. км) — хвалістая, слаба перасечаная раўніна, рэльеф дробнаўзгорысты. Амаль на ўсім працягу рака каналізаваная. Даліна ракі ў нізоўі да 3,5 км. Вялікія плошчы вадазбору займаюць сельскагаспадарчыя ўгоддзі. На перыяд веснавога разводдзя прыпадае 68% гадавога сцёку. Гідралагічныя назіранні вяліся ў розныя гады. Урэз вады каля в. Чырвоны Гарадок 132 м, каля в. Мачулішча шырыня ракі 8 м, глыбіня 0,6 м. У сучасны момант басейн ракі забруджаны радыеактыўнымі элементамі, у т.л. цэзіем-137. У вярхоўях 1—5 Кі/кв. км, далей —5—15, у ніжнім цячэнні ад 15 да 40 Кі/кв. км і болей. На берагах ракі размяшчаюцца населеныя пункты: Буда-Люшаўская, Зарэчча, Любавін, Чырвоны Гара-



Паводка на Дняпры
каля в. Губіцкі Кардон.

док, Рудня-Кашалёўская, Герой, Ліпа, Андрэеўка і інш.

ЛЮБІЧА, рака, правы прыток Чачоры ў Буда-Кашалёўскім і Чачэрскім раёнах. Пачынаецца на ўсход ад в. Струкі ў забалочанай мясцовасці (урочышча Лубянка). Плошча вадазбору занята ў асноўным сельскагаспадарчымі землямі. Пад лесам да 15% плошчы. Даўжыня 9,5 км. Выкарыстоўваецца мясцовым насельніцтвам. Найбольшыя населеныя пункты Любімае і Роўкавічы (Чачэрскі раён).

ПРУДАЎКА, рака, левы прыток р. Ліпа, працякае ў Буда-Кашалёўскім раёне. Пачатак бярэ на поўнач ад в. Забалоцце з тарфянога масіву, упадае ў Ліпу на ўсходзе ад в. Дудзічы на мяжы Чачэрскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў. Даўжыня 26 км. Вадазбор (106 кв. км) нізінны, рэчышча каналізаванае. У верхнім цячэнні, на правабярэжжы, і ў ніжнім плошча вадазбору пад лясамі.

УЗА, рака, правы прыток Сожа. Працякае ў Буда-Кашалёўскім і Гомельскім раёнах. Даўжыня 76 км. Пачынаецца на паўднёвым захадзе ад в. Бярозаўка, упадае ў р. Сож каля в. Бабовічы (Гомельскі раён). Адзнака абсалютнай вышыні ў вярхоўях ракі — 157 м (в. Жытанежжа). Асноўныя прытокі Хочамля і Іволька (справа), густата рачной сеткі 0,23 км/кв. км. Паводле Ф.І.Сяцко, вадазбор 944 кв. км. Даліна трапецападобная, шырыня 0,6—0,8 км, найбольшая 1,5 км, схілы пакатыя і спадзістыя. Пойма ў вярхоўі і ніжнім цячэнні адсутнічае, у сярэдняй частцы — двухбаковая, затапляецца вадой на глыбіню 0,3—0,8 м на два тыдні. Рэчышча каналізаванае. На перыяд веснавога разводдзя прыпадае 65% гадавога сцёку. Замярзае ў сярэднім на 90 сутак (найбольшы перыяд 138 сутак — 1927/28 г.). На рацэ знаходзяцца населеныя пункты Марозавічы, Пянчын, Уваравічы, Рудня-Целяшоўская, Целяшы, Прыбар, Бабовічы.

ХОЧАМЛЯ, рака ў Буда-Кашалёўскім раёне, правы прыток Узы. Даўжыня 11 км. Вадазбор 42 кв. км. У сярэднім і ніжнім цячэнні рэчышча каналізаванае.

ЧАЧОРА, рака, правы прыток р. Сож. Пачынаецца на паўночным захадзе ад в. Буда-Баравая Кармянскага раёна, працякае па тэрыторыі Буда-Кашалёўскага і Чачэрскага раёнаў. Даўжыня 52 км. Асноўныя прытокі: Дулепа, Любіча (справа) і Глыбокая (злева), упадае ў Сож у Чачэрску. Вадазбор 551 кв. км у межах Прыдняпроўскай раўніны. Пойма двухбаковая, шырынёй 200—600 м, складзена з пяскоў і тарфянікаў, асушаная, асобныя ўчасткі парараслі хмызняком. Даліна ракі шырынёй ад 500 да 800 м. Рэчышча амаль на ўсім працягу каналізаванае. На мяжы Буда-Кашалёўскага і Чачэрскага раёнаў, каля в. Мікольск, шырыня ракі 10—12 м, глыбіня 0,4—0,7 м, дно пясчанае, урэз вады 127,5 м. Каля 53% гадавога сцёку прыпадае на веснавы перыяд. Замярзае ў 1-й дэкадзе студзеня, крыгалом у канцы сакавіка. З 1962 г. дзейнічае гідралагічны пост Дзербічы на тэрыторыі раёна. Каля мяжы Буда-Кашалёўскага і Чачэрскага раёнаў на рацэ размешчана вадасховішча Меркулавічы. Створана ў 1973 г., плошча каля 0,8 кв. км, даўжыня 3,1 км, найбольшая глыбіня 4,5 м, сярэдняя — 1,3 м, аб'ём вады больш за 1 млн. куб. м. Рака выкарыстоўваецца як водапрыёмнік меліярацыйных сістэм. На паўночным захадзе ад в. Лозаў ва ўрочышчы Беліца вядуцца торфараспрацоўкі. Уся тэрыторыя торфараспрацовак прарэзана асушальнымі каналамі і звязана імі з Чачорай.

ГЛЕБЫ

Адносяцца да Кіраўска-Кармянска-Гомельскага аграглебавага падраёна. Глебы сельскагаспадарчых угоддзяў (у %): дзярнова-падзолістыя — 35,4, дзярнова-падзолістыя забалочаныя — 39,9, дзярнова-карбанатныя забалочаныя — 13, поймавыя (алювіяльныя) — 4,1, тарфяна-балотныя — 7,6; паводле механічнага складу (у %): суглінiстыя — 39, супясчаныя — 39,8, пясчаныя — 13,6, тарфяныя — 7,6. Плоскасная эрозія на 5,6% плошчы ворных зямель, у т.л. на 0,6% сярэдняя і моцная.

РАСЛІННАСЦЬ

На тэрыторыі раёна сустракаюцца прадстаўнікі лесатундры, тайгі, сярэднееўрапейскія і паўднёвыя віды расліннасці. Вялікую групу складаюць заносныя віды, у асноўным пустазелле агародаў і палёў, вадаёмаў і лугоў. Расліннасць належыць да Палеска-Прыдняпроўскай геабатанічнай акругі. Пад лясамі, якія адносяцца да падзоны шыракаліста-хваёвых, усяго 20% тэрыторыі раёна. Лясныя масівы плошчай каля 120 кв. км у асноўным на паўднёвым захадзе раёна на надпоймавай тэрасе Дняпра (Борхаўская лясная дача). Гэтыя лясы

амаль не пацярпелі ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Забруджванне тэрыторыі цэзіем-137 складае ад 0,1 да 0,9 Кі/кв. км.

Другі лясны масіў (52 кв. км) знаходзіцца на поўначы раёна ад в. Курган да в. Факел. Тэрыторыя забруджвання цэзіем-137 складае ад 5 да 15 Кі/кв. км. Невялікія плошчы лясоў знаходзяцца на паўночным захадзе раёна, паабапал шашы Гомель — Жлобін і выкарыстоўваюцца для адпачынку. Склад лясоў (у %): хвойныя — 52,7, дубовыя — 20,9, чорнаальховыя — 11,2, бярозавыя — 9,6 і інш. — 5,6. Амаль 39% лясоў — штучныя насаджэнні.

Лугі размяшчаюцца невялікімі ўчасткамі, агульная плошча 40 502 га. Нізінныя лугі займаюць 77,9%, заліўныя 12,6%, сухадолы 5%.Знаходзяцца пераважна ў поймах рэк Дняпро, Чачора, Ліпа і Уза.

Балоты належаць да Кармянска-Гомельскага тарфянога раёна, плошча 8606 га, большая частка нізіннага тыпу. Асноўныя балотныя масівы: Міхалёўскі торфамасіў, Караблішча, Беліца і інш.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІ ЛЯСГАС. Арганізаваны ў 1936 г. з 4 лясніцтваў. Знаходзіцца на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага і часткова Рэчыцкага раёнаў. Плошча 45,4 тыс. га, у т.л. пад лесам 32,3 тыс. га (1998). Лясы 1-й (15,5 тыс. га) і 2-й (19,1 тыс. га) груп. Амаль 38,1% лясоў — маладнякі, 40,6% — сярэднеўзроставыя, 11,6% — прысліваючыя, 9,7% — спелыя. Агульны запас дрэвастою каля 5,3 млн. куб. м. Сярэдні ўзрост лясоў 43 гады. Штогод аб'ём лесасечнага фонду каля 40 тыс. куб. м., высечак догляду 26 тыс. куб. м, лесааднаўленне на плошчы 180 га. На тэрыторыі лягаса Буда-Кашалёўскія дубровы і помнікі прыроды рэспубліканскага значэння — Буда-Кашалёўскія дубы-волаты.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІЯ ДУБРОВЫ — лясны масіў у Палеска-Прыдняпроўскай геабатанічнай акрузе падзоны шыракаліста-хваёвых лясоў на водападзеле ў міжрэччы Дняпро — Сож. Плошча 6,2 тыс. га. Пераважаюць дубовыя лясы кісліцнага, сніткавага, арляковага, радзей чарнічнага тыпаў. 76% дуброў маюць узрост да 60 гадоў. Трапляюцца кісліцныя бярэзнікі і асіннікі. На ўзвышэннях зеленамошныя хвойнікі. У выніку безгаспадарчай дзейнасці чалавека ў канцы XIX — пачатку XX ст., у гады Першай сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў дубровы часткова былі высечаны. Асабліва скараціліся плошчы 100—200-гадовых насаджэнняў. Лесагаспадарчыя мерапрыемствы накіраваны на аднаўленне дуброў.

БУДА-КАШАЛЁЎСКІЯ ДУБЫ-ВОЛАТЫ — помнік прыроды рэспубліканскага значэння (з 1963 г.). 7 паасобных дрэў дуба звычайнага (1999), узрост 240—320 гадоў.

№ квартала	Вышыня, м	Дыяметр дрэва, м	Узрост, гадоў
7	34,5	1,14	240
7	34,0	1,34	260
8	36,0	1,16	300
24	36,0	1,24	300
32	38,5	1,44	320
71	32,5	1,24	300
73	30,0	1,38	300

ЖЫВЁЛЬНЫ СВЕТ

Паводле зоагеаграфічнага раянавання паўночная частка тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна адносіцца да Цэнтральнага, а паўднёвая — да Палескага зоагеаграфічнага раёнаў. Прадстаўнікамі мясцовых лясоў з'яўляюцца лось, дзік, янот-паласкун, казуля, куніца лясная, вавёрка звычайная, тхор чорны, барсук, воўк, ласка, ліс, сабака янотападобны, заяц-русак, заяц-бяляк, дзяцел зялёны і інш.

У норах, дуплістых пнях і калодах, у ламаччы жывуць тхор, ласка, гарнастай, вожык. У светлых лясах з высечкамі і сенажацямі на поймавых лугах жывуць дзікія козы-казулі. Тыповымі жыхарамі шыракалістага лесу з'яўляюцца соні, а таксама мышападобныя грызуны: мышы палявая і лясная, жаўтагорлая лятучая мыш, а з птушак — цецярук, рабчык, глушэц. Шырока распаўсюджаны вераб'іныя: дразды, сініцы, саракапуты, аўсянкі, івалгі, гарыхвосткі, салаўі. Шматлікія прадстаўнікі лясоў драпежныя птушкі: ястраб-цецяроўнік, сокал-каршачок, змеяед, асаед, беркут, арлан-белахвост і інш. У старых лясах, парках і гаях сустракаюцца совы, з паўзуноў — гадзюка звычайная, вуж, мядзянка, яшчаркі, з земнаводных — жабы, квакша, рапуха-часночніца.

З жывёльнага свету вадаёмаў і ўзбярэжжаў сустракаюцца бусел чорны і белы.

У басейне Дняпра, Сожа водзяцца бычок-пясочнік, сцерлядзь, гальян азёрны, сілец, лешч, чырванапёрка, верхаводка, шчупак, карась, акунь, сом, плотка, таўсталобік, сазан і інш.

У поймах рэк Дняпро, Сож, Чачора, Ліпа і Уза шмат вадаплаўных птушак — крыжанка, качка шэрая, чырок-свістунок, чырок-траскунок, шылахвостка, нырок, а таксама птушкі вадаёмаў — крыжанкі, чайкі, ластаўка берагавая, чапля шэрая, паганка малая, гагара чорнаваллёвая і інш. З млекакормячых на берагах рэк і пратокаў сустракаюцца бабёр, выдра, вадзяная палёўка (вадзяны пацук), норка еўрапейская, норка амерыканская і андатра. На балотах селіцца жураўель шэры, кулікі, сава балотная, зімой — курапатка белая. Прадстаўнікамі жывёльнага свету палёў і лугоў з'яўляюцца грызуны (палёўка шэрая, мыш-малышка, мыш палявая), заяц-бяляк, вожык, крот, шпакі, вароны, галкі, гракі і інш.

У агародах і садах сустракаюцца буразубкі, вожык, крот, а побач з жыллём чалавека жывуць сініцы, снегіры, дзятлы, сарокі, каршуны, ястрабы, совы, а таксама вялікае мноства шкоднікаў садоў і агародаў. Многія з прадстаўнікоў жывёльнага свету занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Л.А.Лісоўскі.

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел

ГОРАД БУДА-КАШАЛЁВА

Акцябрскі сельсавет: вёскі Акцябр, Пыцькаўка, Чэрапаўка; пасёлак Красны Акцябр.

Буда-Люшаўскі сельсавет: вёскі Буда-Люшаўская, Любавін, Новы Любавін, Слабада-Люшаўская, Хмяльное, Шутнае; пасёлкі Зарэчча, Перагрузачны, Рошча.

Бярвёнаўскі сельсавет: вёскі Бярвёнаўка, Хоўхла; пасёлкі Броськаў, Васільполле, Заброддзе.

Глазаўскі сельсавет: вёскі Глазаўка, Жытанежжа, Іванаўка; пасёлкі Васільеўка, Дзікава, Макаўе, Новы Свет, Чарняцін, Чырвоны Сцяг.

Губіцкі сельсавет: вёскі Губічы, Наспа, Мікалаеўка; пасёлкі Вольны, Гара, Губіцкі Кардон, Інтэрнацыянал, Новае Жыццё, Прырэчча, Уютны.

Гусявіцкі сельсавет: вёскі Аляксандраўка, Новая Гусявіца, Пянчын, Старая Гусявіца; пасёлкі Грыгараўка, Зара, Калініна, Людкава, Пушча, Уладзіміраўка, Чырвоны Свет.

Дуравіцкі сельсавет: вёскі Бурлак, Броды, Дубавіца, Дуравічы, Залунеўе, Леніна, Мачулішча, пасёлак Балдуі.

Забалоцкі сельсавет: вёска Забалоцце; пасёлкі Мікольск, Кучынск.

Івольскі сельсавет: вёскі Івольск, Лозкі, Сінічына; пасёлкі Восаў, Дунай, Красная Плошча, Расцяробы, Смаловыя Лозкі, Чырвоны Лужок.

Камунараўскі сельсавет: вёска Асобіна; пасёлкі Блюдніца, Зімнік, Камунар, Красін, Макаўе, Ніва, Падсяменаўка, Северны, Цёмны Восаў.

Кашалёўскі сельсавет: вёскі Брылёў, Зарэчча, Кастрышча, Кашалёў, Куляшоўка, Польпін, Рудня-Віктарынская, Рудня-Кашалёўская, Стараселле, Сялец, Шарыбаўка; пасёлкі Баравое Ляда, Возера-Пойма, Вялікі Мох, Гарадзішча, Куляшова, Любіца, Чырвоны Гарадок.

Крыўскі сельсавет: вёскі Багамолаўка, Бацунь, Крыўск; пасёлкі Добрая Надзея, Зарэчча, Матылёўка, Першабацунскі, Пабеда, Порасль, Савет.

Ліпініцкі сельсавет: вёскі Бронніца, Ліпінічы, Люшаў, Негаўка, Салтанаўка, Струкі; пасёлкі Буда, Зялёны Дуб, Новы Шлях, Першамайскі, Якімаўка.

Марозавіцкі сельсавет: вёскі Беразіна, Берастоўка, Бушаўка, Марозавічы; пасёлкі Адчаянны, Бадзёры, Беразоўка, Ветка, Высокая Грыва, Дземідоўка, Зялёная Дубрава, Зялёны Дуб, Кавалёва, Кантаровічы, Мігай, Новая Буда, Новая Уза, Папаратнае, Пабядзіцель, Рэкорд, Славянец, Уборкі, Чарот, Ясакар.

Мікалаеўскі сельсавет: вёскі Варварына, Выдрыца, Галавачы, Зорка, Любань, Надзеждзіна, Мікалаеўка, Прыбар, Саўгасная, Уладзіміраўка, Фундамінка.

Патапаўскі сельсавет: вёскі Галы, Гаўлі, Забаб'е, Мядзведзева, Патапаўка; пасёлкі Дзедаў Курган, Дзёміна, Дубраўка, Качан, Козі Рог, Муравей, Перамога.

Рагінскі сельсавет: вёскі Аляксандраўка, Антонаўка, Дзербічы, Каромка, Курганне, Лозаў, Майсееўка, Рагінь, Рудня Лозаўская, Слабодка, Факел.

Старабудскі сельсавет: вёскі Елянец, Недайка, Старая Буда; пасёлкі Асавок, Баец, Барок, Даліна, Красны Свет, Лявада,

Мар'іна Поле, Новы Свет, Падчыстае, Салаўёў, Светлы, Усход, Ясмень.

Уваравіцкі пасялковы Савет: г.п.Уваравічы, вёскі Лапічы, Радзеева, Тэклёўка; пасёлкі Высокая Грыва, Завідаўка, Зялёны Востраў, Радзеева.

Узоўскі сельсавет: вёскі Калініна, Рудзянец, Уза, Ціхінічы; пасёлкі Баркі, Рагозішча, Чырвоны Сцяг.

Чабатовіцкі сельсавет: вёскі Зялёная, Кленавіца, Рудня-Альхоўка, Смычок, Стаўпішча, Чабатовічы; пасёлкі Бушаўка, Гарадок, Зарэчча, Каменка, Камсамольскі, Красны, Краснабудскі, Красны Курган, Крылоў, Лебедзеў, Ленінскі, Лугавы, Любань, Салаўёў, Сенавец, Яслішча, Ясны Бор.

Шырокаўскі сельсавет: вёскі Міхалёўка, Шырокае; пасёлкі Аляксандраўка, Бярозавая Рошча, Камінтэрн, Колас, Красногорск, Чараты, Чарняцкая Паляна, Чарняцін, Ярاполле.

Населеныя пункты, якія не існуюць або перайменаваны

АЗЭТАЎКА, пасёлак да 1928 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, зліўся з в. Фундамінка.

АНТОНЦАВА, пасёлак да 1932 г. у Марозавіцкім сельсавеце, цяпер п. Кавалёва.

АРОЛ, пасёлак да 1961 г. у Акцябрскім сельсавеце.

АСІНАЎКА, пасёлак да 26.6.1969 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Любавін.

БЕЛЫ МОРГ, пасёлак да 2.10.1975 г. у Недайскім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Светлы.

БУДЗІШЧА, пасёлак да 1931 г. у Гусявіцкім, да 26.6.1969 г. у Крыўскім сельсаветах, жыхары пераехалі ў в. Крыўск.

БЯРОЗАВАЕ БАЛОТА, пасёлак да 9.12.1983 г. у Гусявіцкім сельсавеце.

ВАЗРАЖДЗЕННЕ, пасёлак да 12.8.1996 г. у Патапаўскім сельсавеце.

ВАРАІ, пасёлак да 1947 г. у Гусявіцкім сельсавеце.

ВОЛКАЎ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Акцябрскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Ліпа.

ВОСАЎ, пасёлак да 1.10.1976 г. у Марозавіцкім сельсавеце.

ВЯЛІКІ РОГ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Бярвёнаўскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Бярвёнаўка.

ГАЛЕНКІ, пасёлак да 1.10.1976 г. у Марозавіцкім сельсавеце.

ГАЛЫДА, пасёлак да 1938 г. у Івольскім сельсавеце.

ГАРАДЗЕЦ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Акцябрскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Ліпа.

ГРОМ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Марозавіцкім сельсавеце, жыхары пераехалі ў п. Зялёны Дуб.

ГУТА, пасёлак да 15.10.1964 г. у Патапаўскім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Вазраждзенне.

ДНЯПРОЎСК, пасёлак да 26.6.1969 г. у Чабатовіцкім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Смычок.

ДОЎГІЯ, пасёлак да 1930 г. у Недайскім сельсавеце.

ДРАЗДЫ, хутар да 1939 г. у Забалоцкім сельсавеце.

ДУБЕНСК, пасёлак да 1930 г. у Губіцкім сельсавеце, жыхары пераехалі ў п. Новае Жыццё.

ДУБРАЎКА, пасёлак да 26.6.1969 г. у Крыўскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Крыўск.

ЗБОРНЫ, пасёлак да 1929 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, зліўся з в. Самуйлаў.

ЗЯЛЁНКІ, пасёлак да 20.8.1981 г. у Крыўскім сельсавеце.

ЗЯЛЁНЫ КРЫЖ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, зліўся з в. Фундамінка.

ІВАШКАЎ, пасёлак да 13.5.1982 г. у Гусявіцкім сельсавеце.

КАБЫЛЯНКА, пасёлак да 30.7.1964 г. у Калінінскім сельсавеце, перайменавана ў в. Рассветная.

КАЛІНІНА, пасёлак да 1963 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце.

КРАСНІЦА, пасёлак да 1939 г. у Забалоцкім сельсавеце.

КРЫВУЛЯ, пасёлак да 1936 г. у Івольскім сельсавеце.

КУЛЬТУРНЫ, пасёлак да 1929 г. у Рагінскім сельсавеце.

ЛОСЕЎ, пасёлак да 1 кастрычніка 1976 г. у Дуравіцкім сельсавеце.

МАЛАХАЎСКАЕ, пасёлак да 1933 г. у Недайскім сельсавеце, быў перайменаваны ў Белы Морг.

МІКОЛЬСК, пасёлак да 26.6.1969 г. у Глазаўскім сельсавеце. Жыхары пераехалі ў в. Старая Буда Недайскага сельсавета.

МІХЕЕЎ, пасёлак да 1930 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, зліўся з в. Фундамінка.

НОВАЕ ЖЫЦЦЁ, пасёлак да 7.6.1979 г. у Гусявіцкім сельсавеце, жыхары пераехалі ў г.п. Уваравічы.

НОВАЯ НЕДАЙКА, пасёлак да 1936 г. у Недайскім сельсавеце.

НОВАЯ СЯМЁНАЎКА, пасёлак да 26.6.1969 г. у Недайскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Недайка.

НОВАЯ ХАРОШАЎКА, пасёлак да 1.10.1976 г. у Забалоцкім сельсавеце.

НОВЫ, пасёлак да 11.1.1973 г. у Калінінскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Уза.

НОВЫЯ РЭЙКІ, пасёлак да 1955 г. у Недайскім сельсавеце.

ПАД'ЯСЕНЬ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Ліпініцкім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Бронніца.

ПАДЛЕССЕ, пасёлак да 8.8.1964 г. у Губіцкім сельсавеце.

ПАКРОЎСКІ, пасёлак да 1936 г. у Недайскім сельсавеце.

ПАПАРАТНЫ, пасёлак да 18.9.1968 г. у Камунараўскім сельсавеце.

ПАСЁЛАК ІМЯ БУХАРЫНА, да 6.12.1937 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Калініна.

ПАСЁЛАК ІМЯ СТАЛІНА, да 29.12.1962 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Рошча.

ПАСЁЛАК ІМЯ СТАЛІНА, да 4.12.1964 г. у Чабатовіцкім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Лугавы.

ПАСЁЛАК N 9, да 1922 г. у Губіцкім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Уютны.

ПАСТРАЛКІ, пасёлак да 1928 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, цяпер в. Варварына.

ПАЎДНЁВЫ МІКОЛЬСК, пасёлак да 1939 г, у былым Забабскім сельсавеце.

ПАШКОЎСКІ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Івольскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Бацунь Крыўскага сельсавета.

ПЕРАЛАЗ, вёска да 1931 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, цяпер в. Уладзіміраўка.

ПЕРШАМАЙСК, пасёлак да 1967 г. у Акцябрскім сельсавеце.

ПЕРШАМАЙСКІ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Патапаўскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Гаўлі.

ПЕРШАМАЙСКІ, пасёлак да 1.10.1976 г. у Чабатовіцкім сельсавеце.

ПРАЛЕТАРЫЙ, пасёлак да 1968 г. у Чабатовіцкім сельсавеце.

ПУШКІНА, пасёлак да 1.10.1976 г. у Чабатовіцкім сельсавеце.

ПЫРАЧКІН, пасёлак да 1930 г. у Губіцкім сельсавеце, цяпер пас. Прырэчча.

ПЯТЫ ПАСЁЛАК, да 1929 г. у Недайскім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Усход.

ПЯЦІДВОРКА, пасёлак да 4.11.1982 г. у Ліпініцкім сельсавеце.

ПЯЦІХАТКІ, пасёлак да 1929 г. у Губіцкім сельсавеце, перайменаваны ў пас. Падлессе.

РАГАВЫ, пасёлак да 26.6.1969 г. у Крыўскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў в. Порасль.

РАССВЕТНАЯ, вёска да 1986 г. у Узоўскім сельсавеце. Перададзена ў Гомельскі раён.

САМУЙЛАЎ, вёска да 1930 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, цяпер в. Зорка.

СВАШЫН, пасёлак да 1936 г. у Івольскім сельсавеце.

СЕЛІШЧА, вёска да 26.6.1969 г. у Акцябрскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў пас. Цёмны Восаў Камунараўскага сельсавета.

СТАЛІНА, пасёлак, з 30.12.1961 г. в. Акцябр.

СТАЛІНА, пасёлак да 1947 г. у Буда-Люшаўскім сельсавеце.

СТРЭЛКА, пасёлак да 1928 г. у Недайскім сельсавеце, цяпер пас. Асавок.

УГОЛЬЦЫ, вёска да 1937 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, цяпер в. Надзеждзіна.

ФАШЧАЎКА, пасёлак да 1968 г. у Бярвёнаўскім сельсавеце.

ЦАРКОЎЕ, вёска да 30.7.1964 г. у Мікалаеўскім сельсавеце, цяпер в. Саўгасная.

ЦЕМНІКІ, пасёлак да 1936 г. у Недайскім сельсавеце.

ЧЫЖАЎКА, пасёлак да 1963 г. у Бярвёнаўскім сельсавеце.

ЧЫРВОНЫ СЦЯГ, пасёлак да 1968 г. у Рагінскім сельсавеце, цяпер в. Факел.

ЧЫСТАЕ, пасёлак да 1.10.1976 г. у Глазаўскім сельсавеце.

ЧЫСТАЯ ЛУЖА, пасёлак да 1.10.1976 г. у Камунараўскім сельсавеце.

ШУЛЬСКАЕ, пасёлак да 1934 г. у Гусявіцкім сельсавеце.

ЯНАЎКА, пасёлак да 26.6.1969 г. у Недайскім сельсавеце, жыхары пераехалі ў пас. Красны Свет.

ЯНАЧКАЎ, пасёлак да 1936 г. у Крыўскім сельсавеце.

Населеныя пункты, якія адселены і пахаваны ў сувязі з Чарнобыльскай катастрофай

Акцябрскі сельсавет: вёскі Ліпа, Лугінічы, Новая Ліпа; пасёлкі Баявы, Герой, Зацішша, Лук'янаў, Уютны.

Забалоцкі сельсавет: вёска Харошаўка; пасёлкі Баркі, Усход, Вясёлы Курган, Вясёлы Пахар, Доўгі, Засценны, Новае Забалоцце.

Шырокаўскі сельсавет: вёскі Андрэеўка, Прысеншчына; пасёлкі Калацін, Новая Гута, Новы Свет, Салаўёўка.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ — 1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Пачатак засялення тэрыторыі, якую займае Буда-Кашалёўскі раён, першабытным чалавекам можна аднесці да эпохі мезаліту (9—5-е тысячагоддзі да н. э.). У 9-м тысячагоддзі да н. э. закончыўся ледніковы перыяд і пачаўся сучасны геалагічны перыяд — галацэн. Да часу наступлення мезаліту ландшафтныя і кліматычныя зоны прынялі выгляд, блізкі да сучаснага. Тым не менш шчыльнасць насельніцтва была яшчэ даволі нізкая. Асноўнымі заняткамі яго былі паляванне і рыбалоўства. Менавіта таму мезалітычныя плямёны сяліліся паблізу паляўнічых угоддзяў і вадаёмаў, зручных для рыбнай лоўлі. На жаль, помнікі эпохі мезаліту на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна да гэтага часу не вывучаны, таму цяжка меркаваць аб іх культурна-храналагічнай прыналежнасці.

У канцы 5-га — 4-м тысячагоддзі да н. э. на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя на мясцовай мезалітычнай аснове сфарміраваўся своеасаблівы комплекс помнікаў эпохі неаліту, што дало магчымасць даследчыкам вылучыць тут культуру, якая атрымала назву верхнеднянпроўскай. У эпоху неаліту першабытна-абшчынны лад дасягнуў найвышэйшага росквіту. Асновай гаспадаркі былі рыбалоўства, паляванне і збіральніцтва. Пачаўся пераход да жывёлагадоўлі і земляробства. Тэхнічныя дасягненні верхнедняпроўскіх плямён, абумоўленыя як унутраным развіццём, так і запазычаннямі ў суседзяў, яшчэ больш узмацнілі намечаную ў мезаліце дыферэнцыяцыю плямён.

Кераміка — адно з важнейшых вынаходніцтваў эпохі неаліту. З'яўленне глінянага посуду дало магчымасць асвоіць новыя прыёмы прыгатавання і захоўвання ежы. Неалітычная кераміка верхнедняпроўскай культуры прадстаўлена шыракагорлымі таўстасценнымі пасудзінамі з вострым ці яйцападобным дном. Паверхня іх арнаментавана ўзорамі: пераважна ямкавымі ўціскаі ці адбіткамі грабеньчатага штампа. Гліняны посуд і яго фрагменты — гэта найбольш масавая катэгорыя знаходак пры даследаванні неалітычных стаянак. У эпоху неаліту ўдасканальваецца і апрацоўка каменю. Шырокае распаўсюджанне атрымалі крамянёвыя прылады з двухбаковай апрацоўкай паверхні. Да канца неаліту распаўсюдзіліся сякеры, цёслы і долаты з прышліфаваным лязом ці поўнасцю адшліфаваныя. На тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна вядома некалькі неалітычных стаянак (Андрэеўка, Асавок, Сінічына і інш.), аднак раскопкі на іх не праводзіліся.

На рубяжы 3-га і 2-га тысячагоддзяў да н. э. на тэрыторыі сучаснай Беларусі пачаўся бронзавы век. Гэты перыяд

характарызуецца карэнным пераваротам у самой аснове жыцця мясцовага насельніцтва. Побач з традыцыйнымі формамі гаспадаркі (збіральніцтва, паляванне, рыбалоўства) шырокае распаўсюджванне атрымалі жывёлагадоўля і земляробства.Ператварэнне жывёлагадоўлі і земляробства ў пануючыя формы гаспадаркі, пашырэнне абмену паміж плямёнамі садзейнічалі станаўленню патрыярхальных адносін, хуткаму распаўсюджванню агульных рысаў матэрыяльнай і духоўнай культуры. Аддаленасць Беларусі ад асноўных цэнтраў металургіі ў бронзавым веку, асабліва ў пачатку, была прычынай нязначнага пашырэння на яе тэрыторыі бронзавых вырабаў. Таму тут яшчэ доўга ўладарылі прылады з каменю, косці, рога і дрэва. Яшчэ больш шырока, чым у неалітычную эпоху, прымяняецца шліфаванне, свідраванне і пілаванне каменю.

Найбольш характэрныя вырабы таго часу — каменныя свідраваныя сякеры. На тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна каменныя сякеры бронзавага веку сустракаюцца амаль у 20 пунктах (Буда-Кашалёва, Губічы, Івольск, Крыўск, Радзеева, Уваравічы і інш.).

У перыяд ранняга бронзавага веку паўднёва-ўсходнюю Беларусь займалі плямёны сярэднедняпроўскай культуры. Як мяркуюць даследчыкі, гэта прышлае насельніцтва ўваходзіла ў вобласць распаўсюджвання культур шнуравой керамікі, ці баявых сякер у Еўропе. Засяленне тэрыторый плямёнамі гэтай культуры вялося найчасцей у поймах рэк ці на краі надпоймавых тэрас. Гэта былі невялікія паселішчы, якія складаліся з наземных збудаванняў слупавой канструкцыі з адкрытымі ачагамі.

Для сярэднедняпроўскай культуры характэрны пахаванні на курганных і бескурганных могільніках паводле абраду трупапалажэння і трупаспалення. Інвентар, выяўлены пры пахаваннях, складаецца з керамікі, каменных і бронзавых прылад працы, зброі і ўпрыгожанняў. Кераміка сярэднедняпроўскай культуры прадстаўлена ляпнымі гаршкамі з выпуклым тулавам, круглым ці ўшчыльненым днішчам, арнаментаванымі ў верхняй частцы наразнымі лініямі і адбіткамі шнура. Крэмневыя вырабы складаюцца з пласцінчатых нажоў, наканечнікаў стрэл і коп'яў, скрабкоў, клінападобных сякер і інш.

У другой палове 2-га — пачатку 1-га тысячагоддзя да н. э. сярэднедняпроўскую культуру змяніла сосніцкая. Помнікі гэтай культуры даследаваны значна менш. Паходжанне плямён сосніцкай культуры, іх далейшы лёс не вызначаны.

Важнай вяхой у сацыяльна-эканамічным развіцці мясцовага насельніцтва была старажытная металургія жалеза. Балотныя і азёрныя руды (буры жалязняк), з якіх у старажытнасці здабывалі жалеза, былі шырока распаўсюджаны ў лясной паласе Усходняй Еўропы. Металургія жалеза, ляднае (агнявое) земляробства, жывёлагадоўля ператварыліся ў аснову эканомікі насельніцтва, што забяспечыла пераход да аселага ладу жыцця і рэгулярнага атрымання прыбавачнага прадукту. Пераход да аселага ладу жыцця садзейнічаў і працэсу фарміравання будучых этнакультурных супольнасцей ва Усходняй Еўропе, у тым ліку і славян. Рэгулярнае атрыманне прыбавачнага прадукту паскорылі працэсы маёмаснай дыферэнцыяцыі плямён і распаду першабытнаабшчынных адносін.

Абвастрыліся супярэчнасці паміж плямёнамі, ваенныя сутычкі становяцца звычайнай з'явай. Археалагічныя матэрыялы сведчаць, што тэрыторыю Беларусі не міналі хвалі магутных міграцый германскіх, кельцкіх, іранскіх і іншых народаў.

У пачатку ранняга жалезнага веку тэрыторыю Гомельшчыны засялялі плямёны мілаградскай культуры

(VII — III ст. да н. э.), якая атрымала сваю назву ад гарадзішча каля вёскі Мілаград Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

Асноўным тыпам паселішчаў былі гарадзішчы, часам умацаваныя 2—3 абарончымі валамі і равамі. Апрача валоў і равоў пляцоўкі гарадзішчаў акружаліся частаколам. Гарадзішчы ўзводзіліся звычайна на крутых берагах рэк (Уваравічы) або на невялікіх узвышшах сярод балот (Кашалёў, Смычок). Жыллё плямён мілаградскай культуры — паўзямлянкі, пазней крыху заглыбленыя ў зямлю, і наземныя пабудовы слупавой канструкцыі. Плошча іх ад 10 да 50 кв. м, ацяплялася адкрытымі ачагамі розных тыпаў. Бескурганныя могільнікі мілаградскай культуры, даследаваныя на Гомельшчыне, утрымлівалі пахаванні па абраду трупаспалення за межамі могільніка. Для пахаванняў характэрна невялікая колькасць перапаленых чалавечых касцей, ачышчаных ад попелу і вугалю, і зусім сціплы рэчавы інвентар або яго поўная адсутнасць. Надзвычай своеасаблівы мілаградскі посуд і гліняныя грузікі. Кераміка прадстаўлена кругладоннымі і пласкадоннымі ляпнымі пасудзінамі з шарападобным і яйцападобным тулавам. Большасць мілаградскіх гаршкоў арнаментавана ямкавымі або пальцавымі ўцісканнямі па шыйцы ці венчыку.

Значныя вынікі для вывучэння гісторыі насельніцтва Гомельскага Пасожжа ў раннім жалезным веку былі атрыманы ў 1988 — 1993 гг. аўтарам пры вывучэнні гарадзішча ў г. п. Уваравічы. Помнік размешчаны ва ўрочышчы Гарадок, на паўднёвай ускраіне гарадскога пасёлка, на высокім выступе карэннай правабярэжнай тэрасы р. Уза. Пляцоўка прамавугольнай формы памерам каля 65х67 м узвышаецца над поймай на 8 м. Умацавана валам, вышыня якога захавалася да 2 м, а шырыня ў аснове — да 9—10 м. З заходняга і ўсходняга бакоў пляцоўкі захаваліся рэшткі рова шырынёю да 2—3 м і глыбінёю да 1 м. Даследавана 640 кв. м пляцоўкі. Устаноўлена, што гарадзішча было ўзведзена носьбітамі мілаградскай культуры ў VII — VI ст. да н. э.

Выяўлены рэшткі больш як дзесяці наземных і заглыбленых у зямлю пабудоў, у тым ліку і «доўгага дома», вельмі



План гарадзішча Уваравічы.



Бронзавыя ўпрыгожанні з Уваравіцкага гарадзішча.

значныя для мілаградскай культуры. Мяркуючы па шматлікіх рэштках бронзаліцейнай, жалезаробчай, касцярэзнай і іншых вытворчасцей, Уваравіцкае гарадзішча з'яўлялася важным эканамічным цэнтрам Верхняга Падняпроўя ў раннім жалезным веку. Яго насельнікі падтрымлівалі актыўныя гандлёвыя і культурныя сувязі са скіфамі, кельтамі і іншымі народамі. Паводле меркавання некаторых даследчыкаў, помнікі мілаградскай культуры пакінуты неўрамі, якія згадваюцца ў «Гісторыі» Герадота, аднак этнічная прыналежнасць апошніх не выяўлена.

Вырабы з каменю і косці, знойдзеныя на Уваравіцкім гарадзішчы.

У канцы III ст. да н. э. на тэрыторы Паўднёвай Беларусі з'яўляецца новае насельніцтва — плямёны зарубінецкай культуры. Мясцовае мілаградскае насельніцтва было асімілявана ці выцеснена прышэльцамі. Асноўным тыпам іх пасяленняў у Верхнім Падняпроўі былі гарадзішчы, як правіла, уладкаваныя на месцы папярэдніх мілаградскіх. Жыллё зарубінецкай культуры — невялікія, злёгку заглыбленыя, наземныя пабудовы слупавой канструкцыі. Ацяпляліся яны адкрытымі ачагамі розных тыпаў. Пахаванні выключна на бескурганных могільніках. Пахавальны абрад — трупаспаленне за межамі пахавання. Суправаджальны інвентар складаўся з глінянага посуду, прылад працы, прадметаў узбраення і ўпрыгожанняў. Зарубінецкая кераміка прадстаўлена грубаляпнымі гаршкамі, упрыгожанымі па краі венчыка пальцавымі ўцісканнямі, насечкамі і зашчыпамі. Для зарубінецкай культуры характэрна глянцаваная кераміка, якая з'явілася тут у выніку ўплыву кельтаў. У апошніх быў запазычаны цэлы шэраг тыпаў упрыгожанняў (фібулы, бранзалеты і г. д.).

Асноўным заняткам насельніцтва зарубінецкай культуры было земляробства і жывёлагадоўля, аб чым сведчаць знаходкі на паселішчах зярнят проса, пшаніцы, жалезных сярпоў, каменных таўкачоў і зерняцёрак. Апрача падсечнага земляробства «зарубінцы» ведалі ўжо і ворнае. У 1991 г. на Уваравіцкім гарадзішчы аўтарам гэтага артыкула знойдзена рабочая

частка рала. Значнае развіццё ў зарубінецкай культуры атрымалі бронзаліцейная і жалезаробчая вытворчасць, ткацтва і інш. У якасці падсобных промыслаў захоўваліся паляванне і рыбалоўства.

Зарубінецкая культура (III ст. да н. э. — I ст. н. э.) адносіцца да латэнізаваных культур Усходняй Еўропы. Большасць даследчыкаў звязвае яе насельнікаў са старажытнымі славянамі — венедамі, але выказваліся і іншыя меркаванні аб іх этнічнай прыналежнасці.

У I ст. н. э. у выніку змянення клімату, знешнепалітычнай сітуацыі і сацыяльна-эканамічных адносін насельніцтва зарубінецкай культуры пакідае гарадзішчы. Асноўным тыпам паселішчаў становяцца невялікія неўмацаваныя пасяленні — селішчы. Позназарубінецкія плямёны змаглі выпрацаваць аптымальную сістэму гаспадаркі і сацыяльнай арганізацыі, што дазволіла ім стаць самай вялікай этнакультурнай супольнасцю ў лясной паласе Усходняй Еўропы. Помнікі першай паловы 1-га тысячагоддзя н. э. на тэрыторыі Гомельшчыны яшчэ слаба вывучаны. У Буда-Кашалёўскім раёне селішчы гэтага часу вядомы ў в. Марозавічы і г. п. Уваравічы, аднак раскопкі іх не праводзіліся.

Вядомы на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна і помнікі калочынскай культуры (V — VIII ст. н. э.). Селішчы гэтай культуры знаходзіліся на невысокіх месцах каля вады. Часцей выкарыстоўвалі край надпоймавых тэрас, радзей — астанцы або дзюнныя ўзгоркі ў поймах рэк. Жыллё калочынскіх помнікаў — паўзямлянкі, прамавугольныя ў плане, плошчай каля 9 — 16 кв. м з апорным слупом у цэнтры падлогі і

Археалагічныя знаходкі зарубінецкай культуры: ляпны посуд (1, 2, 5—7, 10, 11, 22, 23), бронзавыя шпількі (3, 4) і фібулы (8, 9, 12, 13, 14), жалезныя наканечнікі стрэл (15, 16), шпора (17), нож (18), сякеракельт (19), наканечнік кап'я (20), каса (21).

адкрытым ачагом. Нярэдка селішчы ўзнікалі побач са старажытнымі гарадзішчамі, складаючы з імі адзіны комплекс. Гарадзішчы гэтага часу выконвалі функцыю ўкрыцця і язычніцкіх свяцілішчаў. Пахавальныя помнікі калочынскай культуры прадстаўлены бескурганнымі і курганнымі могільнікамі, абрад пахавання — трупаспаленне.

У 1910 г. Е.Р.Раманаў успамінаў пра сляды бескурганных могільнікаў з абрадам трупаспалення каля вёсак Губічы (урочышча Кардон) і Рудня-Альхоўка. Уся кераміка з помнікаў калочынскай культуры выраблена без дапамогі ганчарнага круга.

Найбольшае распаўсюджванне атрымалі грубаляпныя слабапрафіляваныя і рабрыстыя гаршкі. Насельніцтва займалася земляробствам і жывёлагадоўляй, былі развіты здабыча і апрацоўка жалеза, бронзаліцейная і касцярэзная вытворчасць, ткацтва. З жалеза выраблялісе сякеры, сярпы, нажы, наканечнікі стрэлаў і коп'яў і інш., з бронзы — бранзалеты, пярсцёнкі, фібулы і інш. Адносна этнічнай прыналежнасці насельнікаў калочынскай культуры ў даследчыкаў няма адзінага меркавання. Адны лічаць, што яна належала славянам, іншыя — балцкім плямёнам.

Другая палова 1-га тысячагоддзя н. э. на тэрыторыі Беларусі характарызуецца пераходам ад першабытнаабшчыннага ладу да феадальнага. На змену вялікасямейнай абшчыне прыходзіць земляробчая (суседска-вялікасямейная).

З'явіліся новыя ўстойлівыя этнапалітычныя аб'яднанні — племянныя саюзы. Сярод усходнеславянскіх племянных саюзаў на тэрыторыі Беларусі «Аповесць мінулых гадоў» называе радзімічаў, месца рассялення якіх — басейн Сажа. У сярэдзіне IX ст. радзімічы былі вымушаны плаціць даніну Хазарскаму каганату. У 885 г. кіеўскі князь Алег вызваляе іх ад хазарскай даніны. У 984 г. радзімічы адмовіліся плаціць даніну Кіеву, аднак былі разбіты авангардам кіеўскага войска на чале з ваяводам Воўчым Хвастом на рацэ Пяшчань. З гэтага часу радзімічы пазбавіліся самастойнасці і іх тэрыторыя ўвайшла ў склад Кіеўскай Русі. Тым не менш радзімічы захавалі свае этнаграфічныя асаблівасці амаль да канца XII ст.

Шчыльнасць насельніцтва ў гэты час значна ўзрасла. Помнікаў, якія адносяцца да перыяду Старажытнай Русі, на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна даволі шмат. Гэта неўмацаваныя селішчы і курганныя могільнікі. Селішчы размяшчаліся па берагах рэк, часта на гэтых месцах узнікалі населеныя пункты, таму помнікі ў большасці дрэнна захаваліся. Лепш захаваліся курганныя могільнікі. Яшчэ нядаўна ў Буда-Кашалёўскім раёне было каля 30—40 курганных могільнікаў. Аднак большасць з іх былі ўзараны. У наш час захавалася не больш як 20 курганных груп (каля населеных пунктаў Андрэеўка, Блюдніца, Бронніца, Дубраўка, Дуравічы, Елянец, Забалоцце, Акцябр, Патапаўка, Старая Буда, Чабатовічы і інш.). Раскопкі праводзіліся на курганных могільніках каля в. Елянец, Іванаўка і Чабатовічы (даследаванні ў 1888 г. і 1904 г. Е.Р.Раманава, у 1893 г. В.Б.Антановіча, у 1921 г. К.М.Палікарповіча). Усе курганы — круглыя ў плане насыпы дыяметрам 5—12 м, вышынёй 0, 5—2, 5 м, радзей вялікага памеру. Да пачатку XI ст. пахавальны абрад — трупаспаленне за межамі пахавання. З распаўсюджваннем хрысціянства пачаў пераважаць абрад трупапалажэння на гарызонце, пазней — у яме.

Радзіміцкі курганны інвентар даволі разнастайны. Спецыфічныя ўпрыгожанні — бронзавыя і сярэбраныя сяміпромневыя скроневыя кольцы. У 1904 г. Е.Р.Раманаў у час раскопак курганоў на левым беразе Дняп-

ра каля прыстані Кардон выявіў і дрыгавіцкія скроневыя кольцы. У склад караляў увайшлі звычайныя шкляныя пацеркі розных колераў, а таксама пазалочаныя і пасярэбраныя.

Часам сустракаюцца манетападобныя і іншыя падвескі, лунніцы, пацеркі і інш. У 1892 г. у курганным могільніку ў г. п. Уваравічы знойдзена арабская манета 930 г. Папулярнымі былі бронзавыя і сярэбраныя бранзалеты розных тыпаў. Радзей у радзіміцкіх пахаваннях знаходзілі прадметы ўзбраення і прылады працы.

Вясною 1980 г. пры пераворванні поля каля пас. Козі Рог брыгадзір Дз.М.Юрцоў знайшоў клад з сямі старажытнарускіх білонных шыйных грыўняў. Знаходкі былі дастаўлены ў Гомель у абласны краязнаўчы музей. У Гомельскім Прыдняпроўі падобныя грыўні ў кладах сустрэліся ўпершыню.

Казярожскія шыйныя грыўні знойдзены паблізу Дняпра, усяго за некалькі кіламетраў ад ракі. У помніках радзімічаў XI—XII ст. вітыя складанажгутавыя грыўні звычайна не сустракаюцца. Належалі яны, відаць, буйному гандляру, які вёз іх на продаж.

А.І.Драбушэўскі.

Па слядах радзімічаў

Гісторыя Буда-Кашалёўшчыны апошніх стагоддзяў 1-га тысячагоддзя н. э. цесна звязана з усходнеславянскім племянным аб'яднаннем радзімічаў, якія засялілі тэрыторыю Беларускага Пасожжа і стварылі тут гарады Гомій (Гомель), Чычэрск (Чачэрск), Рупой, Прапошаск (Слаўгарад), Крэчут (Крычаў) і іншыя. Радзімічы ўпамянуты ў летапісах у сувязі з палітычнымі падзеямі нашай гісторыі канца 1-га — пачатку 2-га тысячагоддзя н. э.

Паходжанне радзімічаў да канца не высветлена. Кіеўскі летапісец XII ст., аўтар «Аповесці мінулых гадоў» меркаваў, што радзімічы маюць заходняе паходжанне. Згодна з легендай, у далёкія часы іх продкі жылі дзесьці на тэрыторыі Польшчы, у «ляхаў» Роданачальнік племя Радзім разам з братам Вяткам і сваякамі адправіўся ў далёкі шлях на ўсход. Вятка са сваім родам асеў на берагах Акі, дзе паклаў пачатак племені вяцічаў. Радзіму ж спадабаўся лясны пасожскі край.

Адны сучасныя вучоныя (Б.А.Рыбакоў, Л.Д.Побаль) мяркуюць, што продкі радзімічаў пражывалі ў Пасожжы з глыбокай даўніны, ва ўсякім разе, з часоў Рымскай імперыі, іншыя (В.В.Сядоў, У.У.Багамольнікаў) — адносяць іх рассяленне ў тутэйшым краі прыкладна да VIII—IX стагоддзяў н. э.

Радзімічы занялі не толькі берагі Сожа, але засялілі і яго прытокі, у тым ліку Узу, Ліпу, выйшлі да берагоў Дняпра, дзе пражывала роднаснае племя дрыгавічоў. Сла-

Радзімічы. Мастак Ю.Лупіненка.



Жылая пабудова VI – IX ст.
Рэканструкцыя паводле раскопак А.Макушнікава.

вян цікавілі перш за ўсё ўраджайная зямля і добрыя лугі, дзе была магчымасць займацца земляробствам і жывёлагадоўляй. Такія выдатныя мясціны яны знайшлі ў наваколлях Уваравічаў, Чабатовічаў, Івольска, Марозавічаў, Дуравічаў і іншых населеных пунктаў.

Радзімічы стварылі асабістую ваенна-палітычную арганізацыю пад кіраўніцтвам племянных правадыроў-князёў і старэйшын. У летапісах такая форма ўлады названа «княжэннем». Правадыры канцэнтравалі ў сваіх руках свецкую ўладу і жылі за кошт перыядычнага збору даніны шляхам аб'езду падуладнага насельніцтва (палюддзе). Данінай служылі прадукты земляробства, жывёлагадоўлі, палявання і лясных промыслаў. Правадыры ўзначальвалі дружыны і народныя апалчэнні, наладжвалі абарону зямель ад знешніх ворагаў. У мірны час племянная вярхушка займалася актыўнымі гандлёвымі аперацыямі, пастаўляючы ў Кіеў і іншаземным купцам пушніну, мёд, воск і рабоў. Духоўная ўлада была ў руках язычніцкіх жрацоў — вешчуноў, якія адпраўлялі рэлігійныя культы ў спецыяльных храмах — свяцілішчах. Асноўную колькасць насельніцтва складалі сяляне – абшчыннікі і простыя жыхары гарадскіх пасадаў. У палітычных і эканамічных адносінах землі Буда-Кашалёўшчыны цягнуліся да суседніх гарадоў і крэпасцей і ў першую чаргу да Гомеля.

У IX ст. радзімічы знаходзіліся ў залежнасці ад Хазарскага каганата. Хазарскія кіраўнікі абклалі ўсходнеславянскія плямёны, у тым ліку і жыхароў Пасожжа, данінай. У 885 г. старажытнарускі князь Алег, які аб'яднаў вялікія славянскія землі Паўночнай і Паўднёвай Русі ў адзіную Кіеўскую дзяржаву, вызваліў радзімічаў ад хазарскіх пабораў і абклаў іх сваёй асабістай данінай. Аднак лясны пасожскі край не ўвайшоў у склад вялікай дзяржавы, якая ўтварылася, і яшчэ доўга захоўваў сваю палітычную аўтаномію.

З летапісаў вядома, што радзімічы як кіеўскія саюзнікі прымалі ўдзел у далёкіх паходах велікакняжацкіх дружын на сталіцу магутнай Візантыі Канстанцінопаль (Царград), бывалі ў Балгарыі, Грэцыі, рабілі напады на прыморскія візантыйскія правінцыі. Адзін з такіх набегаў адбыўся ў 907 г., калі 80-тысячная армія Алега (у яе складзе былі і радзімічы) абрушылася на Канстанцінопаль, дзе «много убийства сотвори» грэкам, «разбиша многа полаты, пожгоша церквн», захапіла палонных.

Канец радзіміцкай аўтаноміі быў пакладзены кіеўскім князем Уладзімірам Святаславічам у 984 г., які паслаў на радзімічаў войска пад кіраўніцтвам ваяводы Воўчы Хвост. Сустрэўшы радзімічаў на рацэ Пяшчане (згодна з новымі знаходкамі — дзесьці на шляху з Чарнігава ў Гомель), кіеўскія дружыны нанеслі ім адчувальнае паражэнне.

Радзіміцкая групоўка, якая асела на тэрыторыі цяперашняй Буда-Кашалёўшчыны, утварае свае селішчы на берагах Узы, Ліпы, малых рачулак недалёка ад сучасных Андрэеўкі, Буда-Люшава, Патапаўкі, Рудзянца, Дуброўкі, Буда-Кашалёва, Забалоцця і іншых.

Месцы радзіміцкіх паселішчаў знойдзены і абследаваны археолагамі Л.Д.Побалем, А.І.Драбушэўскім і аўтарам гэтага артыкула недалёка ад Уваравічаў, Новай Гусявіцы, Марозавічаў, Прысеншчыны.

У IX – XI стагоддзях узнікаюць не толькі часовыя, але і пастаянныя паселішчы, якія былі мнагалюднымі і існавалі на працягу некалькіх стагоддзяў. Вёскі выцягваліся вуліцамі ўздоўж рэк і поймаў, забудоўваліся драўлянымі зрубнымі дамамі і гаспадарчымі пабудовамі.

Галоўным заняткам насельніцтва было земляробства і жывёлагадоўля. Радзімічы вырошчвалі жыта, проса, ячмень, рэпу, гарох, чачавіцу. Да XI – XIII стагоддзяў галоўнай формай земляробства стала папарная з выкарыстаннем двухполля і трохпол-

ля. У найбольш заселеных месцах прыходзілася выкарчоўваць пні, каб павялічыць землі пад поле.

На кожным двары была свойская жывёла — быкі, свінні, козы, авечкі, коні. У многіх паселішчах пражывалі майстры — ганчары, металургі, кавалі, цесляры. Амаль у кожнай вёсцы займаліся здабычай і перапрацоўкай балотнай руды.

Патрыярхальныя сем'і аб'ядноўваліся ў сельскія тэрытарыяльныя абшчыны — верві. Асобныя сем'і вялі самастойную гаспадарку, выкарыстоўвалі палі, замацаваныя за імі, былі ўласнікамі прылад працы, вырашчаных прадуктаў земляробства, жывёлагадоўлі і рамесніцтва.

У калектыўным карыстанні знаходзілася значная частка ворнай зямлі і сенажаці, лясы, месцы рыбнай лоўлі, промыслу бабра. У нетрах сялянскай абшчыны адбываўся працэс эканамічнага і сацыяльнага расслаення, умацоўвалася прыватная ўласнасць на зямлю і ўгоддзі. Большая частка багаццяў знаходзілася ў руках племяннной знаці, якая паступова захоплівала самыя ўрадлівыя землі. З цягам часу ў залежнасць да вярхушкі племя траплялі радавыя абшчыннікі. Князі-правадыры надзялялі зямлёй сваіх дружыннікаў. Учарашнія воіны станавіліся баярамі-землеўладальнікамі.

Буда-Кашалёўскі край размешчаны на водападзеле буйнейшых транспартна-гандлевых артэрый сярэднявечча — Дняпра і Сожа, што садзейнічала эканамічнаму развіццю рэгіёну, уцягванню насельніцтва ў мясцовы і знешні гандаль. Водныя і сухапутныя дарогі вялі ў бок Гомеля, Чачэрска, Рагачова, Стрэшына і Рэчыцы. З Гомеля ў мясцовыя сёлы паступалі высакаякасныя рамесныя вырабы, тканіна, нажы, сякеры, інструменты, замкі, ключы, упрыгожанні. Праз гарады сюды ж паступалі тавары і з іншых рэгіёнаў Русі, упрыгожанні і культавыя прадметы кіеўскага і іншаземнага паходжання. Акрамя прадукцыі сельскай гаспадаркі, дзічыны, лясных дароў, сёлы пастаўлялі ў гарады каштоўную сыравіну для чорнай металургіі і кавальскай справы, нарыхтоўвалі драўніну для фартыфікацыйнага і грамадзянскага будаўніцтва і г. д.

У 988 г. пры князю Уладзіміру Святаславічу пачынаецца масавае хрышчэнне Кіеўскай Русі. Старажытнаруская дзяржава прыняла візантыйскае хрысціянскае веравызнанне ў якасці афіцыйнай рэлігіі. Аднак увядзенне хрысціянства ў краі радзімічаў аказалася справай далёка не простай і зацягнулася на стагоддзі. Нават у XII — XIII ст. многія мясцовыя жыхары прытрымліваліся традыцыйных язычніцкіх вераванняў і абрадаў, пра што аўтар «Аповесці мінулых гадоў» выказваўся негатыўна. Радзімічы не прызнавалі «закона Божага» і стваралі самі сабе «закон», доўгія гады яны не прызнавалі царкоўны шлюб, але ладзілі паміж вёскамі гульбішчы, сходзіліся на «скокі» і на ўсе «д'ябальскія» песні, дзе і «кралі» сабе жонак.

Язычнікі спраўлялі рэлігійныя культы каля рэк, азёр, ручаёў, шанавалі не святых, а калодзежы, крыніцы, вялікія камяні і дубровы. У іх не было адзінага бога, а ўяўляемы свет яны «насялялі» многімі бажаствамі, якія «існавалі» не толькі на небе, а і ў лясах, вадзе, палях, дамах. Кожны род меў сваіх асабліва паважаных у дадзенай мясцовасці багоў. Пакланяліся Перуну-грамавержцу, сонечнаму Дажбогу, уладару неба Сварогу, заступніку жывёлы і ўсялякага багацця Вялесу, бажаству ўрадлівасці і дамашняй гаспадаркі Макошы. Акрамя таго, язычнікі верылі ў лесавікоў, дамавых, спраўлялі ахвярапрынашэнне ваўкалакам.

Радзімічы будавалі і спецыяльныя капішчы з драўлянымі і каменнымі ідаламі ў мясцінах, дзе іх шанавалі.

Хрысціянства пры падтрымцы княжацкай улады паступова пашырала свае ўладанні, выцясняла язычніцкіх вешчуноў у малалюдныя лясныя ўрочышчы, знішчаючы ідалаў і раскопваючы капішчы.

Найбольш цікавымі помнікамі язычніцкіх часоў на Буда-Кашалёўшчыне з'яўляюцца курганныя могільнікі X — XII ст. Гістарычнай навуцы яны сталі вядомыя яшчэ ў 1873 г., калі Імператарская археалагічная камісія сабрала аб іх першыя звесткі. Навуковыя раскопкі гэтых помнікаў мінуўшчыны ўпершыню правялі ў канцы XIX — пачатку XX ст. гісторык, прафесар Кіеўскага універсітэта У.Б.Антановіч і беларускі вучоны-краязнаўца, грамадскі дзеяч Е.Р.Раманаў.

Яшчэ каля 100 гадоў таму курганныя могільнікі знаходзіліся каля многіх населеных пунктаў. Яны былі вядомыя ў населеных пунктах Забаб'е, Іволск, Калініна, Ру-

дзянец, Сінічына, Новая Гусявіца, Губіцкі Кардон, а таксама ў іншых месцах. Былі ўстаноўлены як адзіночныя курганы, так і вялікія могільнікі, якія налічвалі каля 100—150 земляных насыпаў. Большая частка курганоў даўно знішчана пры расшырэнні палёў, будаўніцтве дарог і мастоў, меліярацыі, раскапана шукальнікамі скарбаў. Разбурэнне унікальных помнікаў працягваецца і зараз. Шукальнікі золата і зброі «працуюць» на курганах Забалоцця, Андрэеўкі, Дуравічаў. Знік пад плугам земляроба некалі вялікі могільнік у Сенаўцы пад Чабатовічамі.

Самы вялікі на Буда-Кашалёўшчыне могільнік, які налічваў 150 курганоў, размяшчаўся на беразе Узы ў м. Уваравічы. Яго знішчэнне пачалося яшчэ ў XIX ст. Пры шуканні скарбаў тут былі знойдзены чалавечыя косці, металічныя падвескі, каля пахаванага мужчыны быў знойдзены жалезны нож і посуд з гліны. У 1976 г. перад вачыма беларускага археолага Я.Г.Звяругі паўсталі толькі рэштткі гэтага помніка — 34 насыпы. Але і яны хутка былі знішчаны. Гістарычная навука ўжо ніколі не прачытае першапачатковыя старонкі гэтага багатага сваім мінулым кутка Буда-Кашалёўшчыны.

Пакуль яшчэ захаваліся курганы каля Забалоцця, Слабады-Люшаўскай, Андрэеўкі, Дуброўкі, Елянца, Дуравічаў, Блюдніцы, Патапаўкі, Бродаў. Але і яны могуць у недалёкім будучым знікнуць.

Сучасныя жыхары Буда-Кашалёўскага раёна добра ведаюць старажытныя могільнікі, называюць іх курганамі. Вяскоўцы часта расказваюць пачутыя ад бацькоў і дзядоў паданні, нібыта курганы насыпаны ў час паходаў шведскага караля Карла XII або французскімі салдатамі Напалеона Банапарта і ў іх пахаваны іншаземныя захопнікі, адкуль і пайшла іх назва — «шведскія», «французскія» магілы. Некаторыя сцвярджаюць, што ў курганах закапаны скарбы. Але археалагічныя раскопкі рашуча абвяргаюць гэтыя ўяўленні. Пад курганнымі насыпамі вучоныя знаходзяць пахаванні сярэдневяковых жыхароў мясцовых вёсак радзімічаў і дрыгавічоў, зробленыя па канонах язычніцкага пахавальнага рытуалу.

Калі хто-небудзь паміраў, родныя і блізкія выбіралі месца пахавання на могілках абшчыны. Мясціна старанна выпальвалася, каб прагнаць «варожых духаў» (паводле паданняў, агонь валодаў свяшчэннай ачышчальнай сілай). На гэта месца клалі нябожчыка, а побач з ім тыя рэчы, якія раней служылі пры жыцці і маглі б «спатрэбіцца» ў замагільным свеце: мужчынам — нож, крэсіва, посуд з гліны для ежы, калі-нікалі касу і іншыя прылады працы; жанчынам — верацяно з прасліцамі, шкляныя і каменныя пацеркі, металічныя падвескі, скроневыя кольцы, шыйныя грыўні, іншыя сціплыя ўпрыгожанні і прыналежнасці адзення. Золата і каштоўнасцей у курганах няма, што характэрна для ўсіх могільнікаў усходніх славян X—XII ст. Нябожчыка засыпалі зямлёй з ровікаў, якія выкопвалі вакол месца пахавання. Пасля таго, як насып дасягаў пэўнай (да 3—4 м) вышыні, разводзілі на ім і ў ровіках рытуальныя вогнішчы, учынялі памінкі.

Пад уплывам хрысціянскай рэлігіі звычай узвядзення курганоў адмірае на працягу XII ст. Пазней мясцовыя сяляне хаваюць ужо ў звычайных грунтавых ямах у адпаведнасці з патрабаваннямі царквы. З цягам часу гісторыя курганоў сцерлася з народнай памяці, і іх сталі прымаць за месца пахавання нейкіх іншаземцаў.

Археалагічныя раскопкі курганоў праводзіліся ў шэрагу месцаў, у т. л. у Елянцы, Ціхінічах, Губіцкім Кардоне, Уваравічах, Чабатовічах. Сярод знаходак найчасцей сустракаюцца бронзавыя сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, падвескі з бронзы, шкляныя і каменныя пацеркі, дробныя жалезныя прадметы, ганчарныя вырабы. У Губіцкім Кардоне знайшлі пярсцёнкападобныя трохпацерныя скроневыя кольцы. Раскопкі курганоў далі вельмі цікавую інфармацыю аб жыхарах Буда-Кашалёўшчыны X—XII ст. і разам з матэрыяламі даследаванняў у іншых рэгіёнах Беларусі — аб усходнеславянскай вопратцы і ўбранні таго часу.

Асноўнымі відамі сялянскай вопраткі X—XII ст. былі сарочка і паясное адзенне. Верхняй вопраткай служылі світы, наплечныя пакрывалы і кажухі. Тканае адзенне было з ільну, шэрсці, прывезенага шоўку, нярэдка яно ўпрыгожвалася вышыўкай, ніткамі бісеру і металічнымі пранізкамі.

Асаблівую ролю ў адзенні мелі ўпрыгожанні, частка якіх насіла племянны этнавызначальны характар. Так, радзіміцкія жанчыны насілі сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы, дрыгавіцкія — пацеркі,

аздобленыя зерню. У радзіміцкі жаночы ўбор уваходзілі таксама ў выглядзе зоркі і пярсцёнка спражкі-фібулы, металічныя, пятлістыя і біэліпсоідныя падвескі, вітыя шыйныя абручы — грыўні з разеткамі на канцах, пацеркі. Распаўсюджана было нашэнне пярсцёнкаў і бранзалетаў.

З 1026 г. гістарычны лёс звязвае зямлю радзімічаў (і Буда-Кашалёўшчыну) з Чарнігава-Северскай зямлёй. У гэтым годзе адбываецца фармальны раздзел Кіеўскай дзяржавы паміж сынамі Уладзіміра Святаславіча — Яраславам і Мсціславам. Радзіміцкая тэрыторыя на ўсход ад Дняпра пераходзіць пад кіраўніцтва Мсціслававых намеснікаў, а сам Мсціслаў становіцца кіраўніком Чарнігава. Пасля смерці апошняга (1036 г.) Яраслаў Мудры ўстанаўлівае сваю ўладу над усёй Кіеўскай Руссю.

Выява радзімічанкі. Рэканструкцыя І.У.Чаквіна на чэрапе з курганнага могільніка Юдзічы. XI ст. Скульптар Л.П.Яшэнка.

У другой палове XI ст. Чарнігава-Северская зямля канчаткова афармляецца ў княства. Патомкі першага дастаткова самастойнага кіраўніка Чарнігава князя Святаслава Яраславіча (сярэдзіна XI ст.) захоўваюць уладу ў Чарнігава-Северскай зямлі амаль да пачатку мангола-татарскай агрэсіі сярэдзіны XIII ст. Радзіміцкія ўладанні з Гомелем і Чачэрскам, а таксама Рэчыца і Рагачоў надоўга адыходзяць да чарнігаўскіх князёў.

Князі атрымліваюць немалыя даходы з радзіміцкіх і дрыгавіцкіх зямель паміж Гомелем і Рэчыцай. Землі на водападзеле Сожа і Дняпра былі заселены сялянамі («людзьмі»), якія множылі сваёй працай багацце княства. Адсюль, ад сёл і ніў, ішлі і «кармленне», і «дані», і розныя падаткі. Хутчэй за ўсё, да XII ст. частка сёл ужо была перададзена ва ўладанне блізкіх паплечнікаў князя — яго дружыннікаў, а таксама праваслаўнага духавенства. Трапіўшы ў залежнасць ад буйных землеўладальнікаў, мясцовыя сяляне працягвалі несці павіннасці ў карысць дзяржавы, плацілі царкоўную «дзесяціну». Зямельныя ўладанні склалі моцны падмурак, на які абапіралася эканамічная і палітычная ўлада феадальнага саслоўя.

Мірнае жыццё сялян, у т. л. продкаў сучасных жыхароў Буда-Кашалёўшчыны, не раз прыпынялася ў гады феадальных войнаў.

Адна з іх адбылася ў 1142 г., калі ў сувязі са смерцю пераяслаўскага князя Андрэя Уладзіміравіча пачаліся черговыя перамяшчэнні князёў па «сталах», якія суправаджаліся сутыкненнямі. Вялікі кіеўскі князь Усевалад Вольгавіч «зняважыў» князёў чарнігаўскіх, не надзяліўшы іх новымі зямельнымі ўладаннямі. Апошнія пачалі ваенныя дзеянні, але сустрэлі адпор. Удар па чарнігаўскіх князях нанёс



Рэчы радзімічаў з курганоў X—XII ст.: скроневыя кольцы — бранзалетападобнае (1) і сяміпрамянёвыя (2,4); падвескі — гронкавая (3), эліпсоідная (5), язычковая (7), пятлістая (9); буйназярнёная пацерка (6); пласткаватая грыўня (8).

Свінцовая пячатка чарнігаўскага князя Святаслава Усеваладавіча, які ў сярэдзіне XII ст. валодаў землямі Буда-Кашалёўшчыны (з раскопак А.Макушнікава ў Гомелі).

смаленскі князь Расціслаў Мсціславіч, які павёў свой полк на чарнігаўскае Пасожжа, дзе «паваяваў» воласць, якая акружала Гомель.

Відаць, Гомель Расціславу ўзяць не ўдалося, яго здабычай сталі навакольныя паселішчы. Не выключана, што ў 1142 г. пацярпелі і сёлы Буда-Кашалёўшчыны. Абрабаваўшы мясцовых жыхароў, смаляне вярнуліся дадому.

Канец XII ст. прайшоў пад знакам барацьбы паўднёварускіх кіраўнікоў са сцепнякамі. Ноўгарад-Северскі князь Ігар Святаславіч, не раслічыўшы асабістыя сілы, рашаецца на адчайны паход у глыб палавецкага стэпу (1185 г.), які закончыўся катастрофай для паўднёвай Русі і паслужыў сюжэтам вядомага «Слова пра паход Ігаравы». Разгром Ігара Святаславіча полаўцамі на берагах Каялы прывёў да таго, што сцепнякі хлынулі на ноўгарад-северскія і чарнігаўскія землі. «И быть скорбь и туга люта, яко же николи же не бывало, и по всей волости Черниговской, князи изымани и дружына изымана, избита». Трэба думаць, што і ў гомельска-рэчыцкіх валасцях нейкі час гаспадарылі полаўцы, палілі і рабавалі пасожскія сёлы. Толькі ў канцы 1180 – пачатку 1190-х гадоў князям удалося ачысціць Чарнігава-Севершчыну ад палавецкіх войскаў.

У 1223 г. каля граніц Русі з'явіліся мангола-татарскія полчышчы Чынгісхана. Вялікі кіеўскі князь Мсціслаў Раманавіч разумеў, што наступнай за полаўцамі ахвярай гэтых вялікіх і раз'юшаных заваёўнікаў можа стаць Русь. Аднадушна адгукнуліся на заклік выступіць супраць мангола-татараў мясцовыя князі.

У войска Мсціслава прывёў сваіх ратнікаў і чарнігаўскі князь Мсціслаў Святаславіч. Можна меркаваць, што ў яго дружыне былі і гомельскія, і чачэрскія, і рэчыцкія воіны, у т. л. і выхадцы з сучаснай Буда-Кашалёўшчыны.

Аб'яднаўшыся з полаўцамі, рускае войска сышлося з мангола-татарамі на берагах ракі Калкі. Апошнія аказаліся мацнейшымі. Пасля жорсткага паражэння на Русь вярнулася ледзь не дзесятая частка тых, хто выступіў у паход. І ўсё ж «сеча лютая» не была марнай: абяскроўленыя захопнікі пакуль не рашыліся ўварвацца ва ўсходнеславянскія землі.

Трагічныя падзеі адбыліся ў канцы 1230-х гадоў. Археалагічныя раскопкі ў Гомелі паказалі, што горад штурмавалі і разбуралі мангола-татары. Яго лёс, відавочна, раздзялілі і многія сёлы Ніжняга Пасожжа.

А.А.Макушнікаў.

Археалагічныя помнікі Буда-Кашалёўшчыны

У дадзенай падборцы матэрыялаў прыведзены кароткія звесткі аб археалагічных помніках X–XIII ст., іх геаграфічным размяшчэнні, захаванасці, асноўных знаходках. У дужках змешчаны прозвішчы вучоных, якія даследавалі помнікі, і даты абследаванняў. Чорным словам выдзелены населены пункт, да якога прывязаны помнік.

Акцябр (былая Папоўка), цэнтр сельсавета. Курганны могільнік з 8 (было 9) насыпаў. На паўночнай ускраіне вёскі каля клуба і на могілках. Разбураны. Вядомы з 1873 г. (Звяруга Я.Г., 1976; Макушнікаў А.А., 1993).

Андрэеўка, Шырокаўскі с/с. Адзіночныя курганы на Ліпскім Востраве ва ўрочышчы Бутраміс (Палікарповіч К.М., 1926; Ляўданскі А.М., Каваленя А.Дз., 1936) Курганны могільнік (каля 100 насыпаў). За 2,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі, на левым беразе Ліпы, ва ўрочышчы Ліпскі Востраў (Палікарповіч К.М., 1926; Звяруга Я.Г., 1976).

Бацунь, Крыўскі с/с. У пачатку XX ст. ва ўрочышчы Клешанка было 42 курганы.

Блюдніца, Камунараўскі с/с. Курганны могільнік з 11 насыпаў (было 50). За 0,25 км на паўднёвы захад ад вёскі, на

могілках. Вядомы з 1873 г. (Звяруга Я.Г., 1976; Макушнікаў А.А., 1993).

Броды, Дуравіцкі с/с. Рэшткі курганнага могільніка (18 насыпаў). За 350 м на паўночны ўсход ад вёскі, у полі. Курганы вышынёй 1, 2—2, 5 м, дыяметрам 7—11 м (Ізотаў Л.П., 1992).

Бронніца, Ліпініцкі с/с. 4 курганы (было 10). За 2 км на ўсход ад вёскі. Вышыня 1, 3—2 м, дыяметр 7—12 м. Вядомыя з 1873 г. (Звяруга Я.Г., 1976).

Буда-Кашалёва. У наваколлі населенага пункта ў пачатку XX ст. было 15 курганоў.

Буда-Люшаўская, цэнтр сельсавета. 2 курганы (было 3) вышынёй 1—1,3 м, дыяметрам 8—10 м. За 0, 3 км на ўсход ад вёскі злева ад дарогі на Негаўку. У раскапаным сялянамі кургане знойдзены чалавечыя косці. Вядомыя з 1873 г. (Звяруга Я.Г., 1976).

Віктарын, былы фальварак. У 1873 г. у полі было 5 курганоў.

Галенкі, былы пасёлак у Марозавіцкім с/с. З 1910 г. вядомыя курганы.

Глазаўка, цэнтр сельсавета. Ва ўрочышчы Падбудзішча, паводле даных канца XIX ст., было вядома 26 курганоў. Узараны (Салаўёва Г.Ф., 1965).

Губіцкі Кардон, Губіцкі с/с. Могільнік са 100 курганоў. На левым беразе Дняпра. У 1904 г. Е.Р.Раманаў раскапаў 15 насыпаў з пахаваннямі па абрадах трупапалажэння ў ямах і 1 на старажытным гарызонце. Знойдзены трохпацеркавыя скроневыя кольцы дрыгавіцкага тыпу і інш.

Дубраўка, Ліпініцкі с/с. Каля 60 курганоў. За 0, 5 км на паўночны захад ад вёскі, на могілках і каля іх. Вышыня 0, 7—2, 5 м, дыяметр 5—12 м, 1 насып — адпаведна 3 і 18 м (Звяруга Я.Г., 1976; Ізотаў Л.П., 1992).

Дуравічы, цэнтр сельсавета. Рэшткі курганнага могільніка з 24 насыпаў. За 2, 5 км на ўсход ад вёскі. Злева ад шашы на Пыцькаўку, на могілках пас. Бурлак. Пры ворыве былі знойдзены чалавечыя косці і шкляныя пацеркі. У літаратуры помнік фігуруе пад назвай «Пыцькаўка». Вядомы з 1873 г. (Звяруга Я. Г., 1976; Макушнікаў А.А., 1993) Рэшткі курганнага могільніка з 18 насыпаў. За 1, 1 км на паўночны захад ад вёскі і за 0, 5 км на паўночны захад ад моста, на краі левабярэжнай надпоймавай тэрасы р. Ліпы, у полі. Помнік вядомы з 1873 г. (Звяруга Я.Г., 1976; Ізотаў Л.П., 1992). Курганны могільнік з 48 насыпаў. За 3 км ад вёскі, у лесапаласе ва ўрочышчы Чыстая Лужа. У літаратуры ён фігуруе пад назвай «Радзеева». Вядомы з 1873 г. (Звяруга Я.Г., 1976; Макушнікаў А.А., 1993). Па звестках мясцовых жыхароў, яшчэ адзін курганны могільнік ёсць у лесе, за 1, 5—2,5 км на поўнач ад вёскі.

Елянец, Недайскі с/с. Курганны могільнік (8 насыпаў). За 2, 5—3 км на паўночны ўсход ад вёскі па лясной дарозе. Вышыня 0, 5—0, 9 м, дыяметр 6—7 м. У 1888 г. Е.Р.Раманаў раскапаў курган з пахаваннем па абраду трупапалажэння (Звяруга Я.Г., 1976). Курганны могільнік (21 курган). На высокім левым беразе Дняпра, у лесе, ва ўрочышчы Курганне (Раманаў Е.Р., 1888).

Забаб'е, Патапаўскі с/с. Курганны могільнік з 4 насыпаў размяшчаўся ва ўсходняй частцы вёскі справа ад чыгункі

Усходнеславянскія воіны-дружыннікі XII—XIII ст. у цяжкіх даспехах (паводле матэрыялаў раскопак). Рэканструкцыя Ю.Лупіненкі.

Жлобін — Гомель, на агародах, на правым беразе меліярацыйнага ручая. Узараны. Вядомы з 1873 г. (Макушнікаў А. А., 1993).

Забалоцце, цэнтр сельсавета. Курганны могільнік з 32 насыпаў. За 2, 8 км ад вёскі, справа ад шашы Забалоцце — Буда-Кашалёва ва ўрочышчы Лубянка. Вядомы з 1873 г. (Зяруга Я.Г., 1976; Макушнікаў А.А., 1993). Па звестках мясцовых жыхароў, яшчэ адзін курганны могільнік размешчаны за 2,5 — 3 км на захад ад вёскі, злева ад шашы Забалоцце — Буда-Кашалёва, у лесе ва ўрочышчы Дзедня.

Іванаўка, Глазаўскі с/с. Курганны могільнік размяшчаўся каля рова Курганне за 2, 5 — 3 км ад вёскі. Быў вядомы з пачатку XX ст. Узараны (Салаўёва Г.Ф., 1965; Зяруга Я.Г., 1975 — 1976).

Іволььск, цэнтр сельсавета. У канцы XIX ст. у вёсцы было каля 100 курганоў у 4 пунктах: ва ўрочышчах Дубраўка, Гразівец, каля царквы і ў полі. Пры вырыве знаходзілі чалавечыя косці, жалезныя сякеры і посуд з гліны.

Калініна (былая Сямёнаўка), цэнтр сельсавета. Паводле даных 1910 г., у вёсцы былі курганы.

Козі Рог, Патапаўскі с/с. Паводле звестак мясцовых жыхароў, у пасёлку былі курганы. Узараны.

Красны Курган, Чабатовіцкі с/с. Курганны могільнік з 18 насыпаў. За 1, 5 км на паўночны захад ад пасёлка па дарозе на Патапаўку. Вышыня 0, 7 — 1, 6 м, дыяметр 5 — 11 м (Зяруга Я.Г., 1976). Курганны могільнік з 50 насыпаў. За 1 км на паўночны захад ад пасёлка ў лесе. Вышыня 1, 5 — 2,5 м, дыяметр 8 — 10 м (Хацкевіч А.А., 1982).

Крыўск, цэнтр сельсавета. Паводле даных 1910 г., на беразе Іволькі былі курганы.

Любавін, Буда-Люшаўскі с/с. Паводле даных канца XIX ст., у вёсцы было 48 курганоў.

Люшаў, Ліпініцкі с/с. Паводле даных пачатку XX ст., у вёсцы былі курганы.

Марозавічы, цэнтр сельсавета. Паводле даных 1910 г., у вёсцы было 30 курганоў. Рэшткі паселішча за 5 км на захад ад вёскі ва ўрочышчы Гром. Знаходкі ганчарнай керамікі (Побаль Л.Д., 1964). Рэшткі сярэдневяковага селішча. За 6 км ад вёскі на правым беразе р.Уза, за 3 км ад вёскі Зара. Узворваецца (Побаль Л.Д., 1964).

Негаўка, Ліпініцкі с/с. Паводле даных канца XIX ст., у вёсцы было 10 — 15 курганоў.

Новая Гусявіца, Гусявіцкі с/с. Курганны могільнік з 50 насыпаў. За 2, 6 — 2, 7 км ад вёскі на ўчастку надпоплаўнай тэрасы правага берага р. Уза. Знішчаны. Пры ўзворванні знаходзілі чалавечыя косці. Быў вядомы з 1873 г. (Макушнікаў А.А., 1993). Рэшткі мнагаслойнага пасялення. За 3 км ад вёскі на схіле надпоплаўнай тэрасы правага берага р. Уза. Парушаны ўзворваннем. Плошча не менш як 100 x 60 м. Знойдзены фрагменты ганчарнага посуду X — XII ст., (Макушнікаў А.А., 1981, 1993).

Патапаўка, цэнтр сельсавета. Курганны могільнік з 38 насыпаў. Ва ўсходняй частцы вёскі на могілках. Вядомы з 1873 г. (Зяруга Я.Г., 1976; Макушнікаў А.А., 1993).

Прудаўка, былая вёска ў Рудзянецкай воласці. Былі курганы, вядомыя з 1910 г.

Прысеншчына, Шырокаўскі с/с. Рэшткі паселішча са знаходкамі ганчарнай керамікі. За 0, 5 км на поўдзень ад вёскі, на правым беразе Ліпы. Плошча каля 1 га (Драбушэўскі А.І., пачатак 1980-х гадоў).

Рагінь, цэнтр сельсавета. Паводле даных 1910 г., у вёсцы было 10 курганоў.

Рудзянец, Калінінскі с/с. Паводле даных 1910 г., на левым беразе Узы было 15 курганоў. Знойдзена звітая з дроцікаў грыўня, бронзавыя скроневыя кольцы.

Рудня-Кашалёўская, Кашалёўскі с/с. Курганны могільнік з дзвюх груп (10 і 5 насыпаў). Знаходзіўся на паўночнай ускраіне вёскі. Знішчаны. Быў вядомы з 1873 г. (Ізотаў Л.П., 1992).

Сенавец, Чабатовіцкі с/с. У канцы XIX ст. па дарозе з Чабатовічаў у Іволььск на ўзвышшы сярод балот было 120 курганоў.

Сінічына, Іволььскі с/с. Рэшткі селішча з ганчарнай керамікай. За 0, 4 — 0, 5 км на поўнач ад вёскі ў напрамку да могілак, на левым беразе Іволькі (Драбушэўскі А.І., пачатак 1980-х гадоў). У канцы XIX ст. на беразе Іволькі ў полі было 9 курганоў.

Слабада-Люшаўская, Буда-Люшаўскі с/с. Курганны могільнік з 24 насыпаў (было 38). За 0, 2 км на паўночны захад ад вёскі, злева ад аўтадарогі на Селівонаўку, на могілках і побач. Вядомы з 1873 г. (Зяруга Я.Г., 1976; Макушнікаў А.А., 1993).

Смычок, Чабатовіцкі с/с. Паводле даных 1910 г., на левым беразе Дняпра былі курганы.

Старая Буда, Недайскі с/с. Курганны могільнік з 22 насыпаў. За 1 км на захад ад вёскі на могілках ва ўрочышчы Хрэйкі. Вышыня да 3, 5 м, дыяметр да 12 м (Хацкевіч А. А., 1982).

Струкі, Ліпініцкі с/с. Паводле даных 1873 г., у полі калі вёскі было 20 курганоў.

Сялец, Кашалёўскі с/с. Паводле даных пачатку XX ст., у вёсцы было 5 курганоў.

Уваравічы, цэнтр пасялковага савета. Курганны могільнік са 150 насыпаў размяшчаўся за 0,5 км на поўдзень ад пасёлка ў левабярэжжы р. Уза. У 1892 г. пры аматарскіх раскопках знойдзены чалавечыя шкілеты, металічныя падвескі, нож, гліняны посуд. У 1897 г. Е.Р. Раманаў знайшоў арабскі дырхем 932—933 гг. Помнік знішчаны ў 1970—1980 гг. (Раманаў Е.Р., 1897; Звяруга Я.Г., 1976).

Харошаўка, Забалоцкі с/с. Рэшткі курганнага могільніка (раней было 14 насыпаў у 2 групах). У паўночна-заходняй частцы вёскі, на агародах. Помнік вядомы з 1873 г.

Хоўхла, Бярвёнаўскі с/с. Паводле даных 1910 г., у вёсцы былі курганы.

Ціхінічы, Калінінскі с/с. 3 курганы на беразе р. Журбіцы. Раскапаны ў канцы XIX — пачатку XX ст. Е.Р. Раманавым. Знойдзены чалавечыя шкілеты, пацеркі і металічныя скроневыя кольцы.

Чабатовічы, цэнтр сельсавета. У канцы XIX — пачатку XX ст. у вёсцы і каля яе было шмат курганоў: 6 — па дарозе з Буды ў Шылавічы; 25 — па дарозе з Чабатовічаў у Буду; курганы па дарозе з Буды ў Глазаўку; 37 курганоў на балоце Саланое Будзішча. 14 курганоў даследаваў у 1897 г. У.Б.Антановіч, яны датуюцца канцом X—XII ст. У канцы 1970-х гадоў у цэнтры Чабатовічаў захаваліся 3 курганы дыяметрам 12—14 м, вышынёй 1,2—1,6 м (Раманаў Е.Р., канец XIX ст.; Звяруга Я.Г., 1976).



Шыйныя грыўні з казярожскіх скарбаў.

А.А.Макушнікаў.

Казярожскія скарбы

Вясной 1980 г. пры ўзворванні поля каля пасёлка Козі Рог Патапаўскага сельсавета мясцовым жыхаром Дз.М.Юрцовым быў знойдзены скарб з сямі шыйных грыўняў. Усе знаходкі паступілі ў Гомельскі абласны краязнаўчы музей.

Шыйныя грыўні — абручы, вядомыя многім народам Еўразіі са старажытнейшых часоў. Яны былі шырока распаўсюджаны і ва ўсходніх славян, з'яўляючыся традыцыйнай прыналежнасцю жаночага ўбрання. Асабліва яны характэрны для радзімічаў і вяцічаў.

Грыўні, выкананыя з серабра і золата, уваходзілі таксама і ў мужчынскае ўбранне. Амаль заўсёды яны былі атрыбутам улады і насілiся, у большасці, прадстаўнікамі сацыяльных вярхоў старажытнарускага грамадства.

Па матэрыялах курганоў і скарбаў X—XIII ст. вядома некалькі тыпаў шыйных абручоў. Усе экзэмпляры, што захоўваюцца ў Гомельскім абласным краязнаўчым музеі, адносяцца да аднаго тыпу — вітых. Выкананы яны з білоннага дроту круглага сячэння. Акрамя серабра і медзі ў сплаве прысутнічаюць прымесі свінцу, волава, цынку, жалеза, якія складаюць менш аднаго працэнта саставу металу. Вага грыўняў хістаецца ад 200, 3 да 341, 5 г.

Усе вырабы са скарбу 1980 г. выкананы ў адной тэхніцы складанага жгута — звіты з трох (6 экзэмпляраў) або пяці (1 экзэмпляр) жгутоў, якія складаюцца з двух

перакручаных паміж сабой дротаў, дыяметр якіх памяншаецца ад цэнтра да канцоў. Апошнія, у сваю чаргу, аб'яднаны шляхам кавальскай зваркі і раскаваны ў вузкія пласцiністыя наканечнікі з замкамі ў выглядзе дзвюх спіральна закручаных петляў (6 экзэмпляраў), або двух загнутых кручкоў (1 экзэмпляр). Усе вырабы дадаткова перавіты суканымі ніткамі (з двух тонкіх перакручаных паміж сабой дротаў).

Кожная знаходка мае некаторыя індывідуальныя асаблівасці, якія датычацца таўшчыні дроту, шчыльнасці віцця, вагі, арнаментацыі наканечнікаў.

Скарб быў знойдзены за 200—300 метраў ад курганнай групы, якая размяшчалася на заходняй ускраіне в. Козі Рог і складалася з некалькіх дзесяткаў паўсферычных насыпаў. Да нашага часу захаваліся ўсяго 2—3 пашкоджаныя курганы, астатнія разбураны пры збудаванні сіласнай ямы. Па словах мясцовых жыхароў, пры земляных работах на тэрыторыі могільніка знаходзілі гліняныя вырабы, упрыгожанні з металаў, чалавечыя косці. Цяжка сказаць, ці існавала якая-небудзь сувязь паміж гэтым археалагічным помнікам і скарбам.

Цікавым было паведамленне Дз.М.Юрцова аб тым, што ў 60-я гады ў пасёлку быў таксама знойдзены скарб з пяці грыўняў. Удалося адшукаць толькі адну з іх. Па тэхніцы выканання і знешняму выгляду яна цалкам аналагічная вышэй апісаным вырабам са скарбу 1980 г. Яна з білоннага дроту, звіта з трох падвоеных жгутоў, перавіта трыма суканымі ніткамі. Віццё не вельмі шчыльнае. Наканечнікі пласцiністыя, арнамент на іх не захаваўся, канцы абламаны.

Маецца яшчэ адно паведамленне аб тым, што ў дарэвалюцыйны час у мясцовага памешчыка, уладальніка невялікага шклозавода ў наваколлі пасёлка, таксама было некалькі падобных вырабаў. На жаль, гэтыя звесткі праверыць немагчыма.

Грыўні падобнага тыпу знойдзены як пры раскопках курганоў, так і ў складзе скарбаў, якія датуюцца па часе ўхавання XI, XII, а часам і пачаткам XIII стагоддзя. Тэхніка складанага жгута, метад кавальскай зваркі, афармленне замкоў дазваляюць датаваць рэчы казярожскіх скарбаў канцом XI — першай паловай XII стагоддзя. Час іх ухавання можа быць і больш познім: XII — пачатак XIII стагоддзя.

Скарбы знойдзены ў левабярэжжы Дняпра, усяго за некалькі кіламетраў ад гэтага важнага гандлёвага шляху старажытнасці і, верагодна, абавязаны апошняму сваім з'яўленнем.

Такія тэхнічныя прыёмы вытворчасці, як атрыманне дроту рознага дыяметра, кавальская зварка, скань, складаны жгут, дазваляюць бачыць у падобных вырабах прадукцыю гарадскога рамяства. Можна меркаваць, што грыўні з Козяга Рога былі выраблены ў адной з ювелірных майстэрняў Кіева. Належалі яны, хутчэй за ўсё, буйному гандляру, які вёз іх па Дняпры на продаж, але ў сілу нейкіх абставін быў вымушаны схаваць свой нерэалізаваны тавар.

Паводле характару, складу і колькасці вырабаў казярожскія знаходкі унікальныя для тэрыторыі Беларусі. Яны стаяць побач з лепшымі прыкладамі старажытнарускага ювелірнага мастацтва. Яны яшчэ раз сведчаць аб тонкім мастацкім гусце майстроў «па злату і срэбру», аб высокім узроўні развіцця рамёстваў на ўсходнеславянскіх землях у сярэдневякоўі.

У.А.Літвінаў.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У XIII ст. у сувязі з пагрозай агрэсіі нямецкіх рыцараў з захаду і манголататарскай арды з усходу пачаўся працэс аб'яднання асобных княстваў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Цэнтрам кансалідацыі стала летапісная Літва, размешчаная на тэрыторыі сучасных усходняй Літвы і Панямоння.

Летапіс пад 1235 г. паведамляе пра «Літву Міндоўга». Князь Міндоўг здолеў падпарадкаваць сабе іншых князёў і стаў вялікім князем. У 1253 г. ён каранаваўся ў Наваградку (Навагрудку). Міндоўг стаў вялікім князем дзяржавы, якая пачалася з аб'яднання літоўскіх і наваградскіх зямель. Першай яе

сталіцай быў Навагрaдак з усходнеславянскім насельніцтвам і культурай.

У канцы XIII ст. вялікім князем стаў Віцень. Як і яго папярэднікі, ён імкнуўся ўмацаваць новую дзяржаву. Віценю ўдалося дасягнуць яе адзінства. У замежнай палітыцы вялікіх князёў асноўнае месца займала барацьба з агрэсіяй нямецкіх рыцараў. Паводле летапісу, князь Віцень на пачатку свайго княжання ў Літве прыдумаў усяму княству герб і пячатку — «рыцар збройны на кані з мячом, якога называюць пагоня».

Рознымі шляхамі адбывалася ўключэнне іншых беларускіх зямель у склад Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ). Са згоды мясцовага баярства і купецтва да яго далучылася ў 1307 г. Полацкая зямля. У пачатку XIV ст. — Менскае княства. Прыкладна ў гэты час увайшлі ў ВКЛ Пінская і Берасцейская землі. Віцебскае княства апынулася ў складзе Вялікага княства дзякуючы шлюбу. У 1318 г. віцебскі князь Яраслаў выдаў сваю дачку Марыю замуж за літоўскага князя Альгерда. Праз два гады Яраслаў памёр і віцебскім князем стаў Альгерд.

Пасля смерці Віценя велікакняжацкі трон заняў Гедзімін (Гедымін). Уся дзейнасць Гедзіміна была накіравана на далейшае ўмацаванне ВКЛ і пашырэнне яго тэрыторыі. Галоўнай знешняй пагрозай і тады заставалася агрэсія Тэўтонскага ордэна. Гедзімін у сваёй дзейнасці ўлічваў інтарэсы беларускіх феадалаў і арыентаваўся на іх падтрымку. Гэта спрыяла мірнаму ўваходжанню ў ВКЛ Берасцейскай, Віцебскай, Мінскай, Тураўскай, Пінскай і іншых беларускіх зямель. Але міжрэчча ніжняга Сожа і Дняпра, дзе знаходзіцца сучасны Буда-Кашалёўскі раён, тады ў склад княства не ўвайшло.

У 1323 г. Гедзімін перанёс сталіцу дзяржавы ў Вільню. Узросшая роля кіраўніка дзяржавы добра бачна ў змене яго тытула. Гедзімін пачаў называць

Гедзімін.

Альгерд.

сябе «каралём Літвы і Русі», «каралём літоўцаў і многіх рускіх». Пад назвай «руския» маюцца на ўвазе жыхары беларускіх зямель. Таму дзяржава стала называцца «Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае». Але часцей ужывалася скарочаная назва «Вялікае княства Літоўскае».

Вялікі князь Гедзімін быў мудры правіцель і цярпліва адносіўся да розных рэлігій. Сам Гедзімін не аддаваў перавагі ні праваслаўю, ні каталіцтву і заставаўся язычнікам. Такія адносіны да рэлігіі садзейнічалі ўмацаванню дзяржавы і міру ў ёй. Пяць яго сыноў прынялі праваслаўе. Улада ў дзяржаве стала спадчыннай.

У 1345 г. вялікім князем стаў Альгерд, сын Гедзіміна. Альгерд — адзін з выдатных палкаводцаў, быў збіральнікам і ахоўнікам беларуска-літоўскай дзяржавы. З 1345 па 1370 гг. удзельнічаў шмат разоў у адпоры агрэсіі крыжакоў. У канцы 1340-х — 1350-я гады да ВКЛ было далучана Чарнігава-Северскае княства. Тады ж у палітычнай залежнасці ад Альгерда апынулася Смаленскае княства. Ён імкнуўся пашырыць свой уплыў на Цвер, што абвастрыла яго адносіны з Маскоўскім княствам. Учыніў тры паходы на Маскву ў 1368, 1370, 1372 гадах. Агульным вынікам гэтых паходаў было далучэнне смаленскіх і бранскіх зямель да ВКЛ. Менавіта ў гэты час тэрыторыя Буда-Кашалёўшчыны

Ягайла.

Вітаўт.

ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага.

Альгерд вёў барацьбу з татарамі, адваяваў у Залатой Арды Кіеўскае княства. У 1363 г. у вялікай бітве на р. Сінія Воды (каля Паўднёвага Буга) ён разграміў войскі трох татарскіх ханаў — васалаў Залатой Арды і далучыў да Вялікага княства Падольскую, Валынскую і іншыя землі. У час праўлення Альгерда тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага павялічылася ўдвая, яно стала самай вялікай дзяржавай сярэдневяковай Еўропы.

У XIV—XV ст. усходнеславянскія народы складалі пераважную большасць насельніцтва краіны, таму ў Вялікім княстве стала дамінаваць іх культура. Так званая «руская» мова ў яе беларускім варыянце была афіцыйна прызнанай агульнадзяржаўнай мовай справаводства і вялікакняжацкага двара. Яна абслугоўвала ўсе сферы грамадскага жыцця. На ёй пісаліся шматлікія акты, граматы, статуты, летапісы і хронікі.

Пасля смерці Альгерда ў краіне пачаў правіць яго сын Ягайла. Ажаніўшыся з польскай каралевай Ядвігай, ён стаў польскім каралём. Згодна з умовамі Крэўскай уніі 1385 г. Ягайла абавязаўся хрысціць усіх літоўцаў-язычнікаў паводле каталіцкага абраду. На беларускіх землях пачалі ўзводзіцца касцёлы і будавацца каталіцкія кляштары. Ягайла, у процілегласць свайму дзеду Гедзіміну, імкнуўся зрабіць каталіцкую царкву адзінай у дзяржаве, што выклікала пратэст як праваслаўнай, так і язычніцкай часткі насельніцтва. Частка знаці (беларускай, украінскай і рускай) стала прымаць каталіцтва, пераймаць польскую мову і звычаі, якія цяпер былі ў пашане пры двары літоўскіх князёў. Крэўская унія мела надзвычай істотныя вынікі для ўсяго Вялікага княства Літоўскага. У адной дзяржаве побач з праваслаўнымі беларусамі, украінцамі і рускімі з'явіліся каталікі літоўцы, беларусы і палякі. Князь літоўскі і кароль польскі разам з каталіцкім духавенствам актыўна падтрымлівалі каталіцкую шляхту (дваранства), роля якой значна ўзрасла, а разам з гэтым расло і запрыгоньванне сялян.

Ваенны саюз дзвюх дзяржаў — Вялікага княства Літоўскага і Польскага каралеўства — прывёў да поўнага разгрому Нямецкага (Тэўтонскага) ордэна ў 1410 г. у бітве пад Грунвальдам, якая паклала канец больш як 200-гадовай крыжацкай агрэсіі на літоўскія і беларускія землі.

Пасля перамогі над ордэнам Вялікае княства Літоўскае дасягае найвышэйшай ступені магутнасці і ператвараецца ў адну з уплывовых еўрапейскіх дзяржаў. Пры князю Вітаўце (1392—1430) былі далучаны новыя землі на ўсходзе і паўднёвым усходзе. Заходняя мяжа дзяржавы дасягала да Беластока і Прусіі, а ўсходняя праходзіла за 107 вёрстаў ад Масквы. З поўначы і поўдня землі дзяржавы абмываліся Балтыйскім і Чорным морамі. Аўтарытэт Вялікага княства прызнавалі рускія княствы на ўсходзе, чэшскія гусіты; з ім мусілі лічыцца польскі кароль і германскі імператар, а ў грознай Залатой Ардзе, здаралася, кіравалі стаўленікі Вітаўта.

Вітаўт правёў шэраг рэформаў, скіраваных на ўмацаванне цэнтральнай улады. Былі ліквідаваны буйныя ўдзельныя княствы, на большасці

тэрыторыі ўведзены новыя адміністрацыйныя адзінкі — ваяводствы, у якіх кіравалі намеснікі. Уводзіўся шэраг вышэйшых дзяржаўных пасад, феадалы, якія прынялі каталіцтва, набывалі рыцарскія гербы і атрымлівалі маёмасныя прывілеі.

Вітаўт і маскоўскі князь Васіль I заключылі пагадненне, у выніку якога граніцы паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай былі вызначаны па прытоку Акі, рацэ Угры. Але гэтыя граніцы не былі добра акрэсленыя. Пасля смерці Васіля I Вітаўт падпарадкаваў сабе Цвярское і Разанскае княствы, а таксама землі ў вярхоўях Акі.

Умацаванне Вялікага княства Літоўскага патрабавала далейшых змяненняў у яго адносінах з Польскім каралеўствам. Узнікла пытанне аб прысваенні Вітаўту каралеўскага тытула і пераўтварэнні Вялікага княства Літоўскага ў каралеўства. Вітаўт памёр у 1430 г., калі рыхтаваліся да яго каранацыі.

Скарыстаўшы смерць Вітаўта, Польшча распачала кампанію па аслабленню Вялікага княства Літоўскага і адарванню ад яго шэрагу тэрыторый на паўднёвым захадзе. Вялікім князем стаў сын Альгерда Свідрыгайла (1430—1432), які выступіў супраць уніі. Галоўнай апорай Свідрыгайлы былі беларускія і ўкраінскія феадалы. Тады польскія арыстакраты і літоўскія феадалы, дамовіўшыся паміж сабой, абвясцілі вялікім князем Жыгімонта Кейстутавіча (1432—1440). Вялікае княства Літоўскае распалася на дзве часткі, паміж якімі ўспыхнула вайна. Вынік барацьбы вырашыла частковае ўраўнаванне правоў феадалаў-католікаў і праваслаўных. У 1435 г. Свідрыгайла быў разбіты ў крывавай бітве, і абедзве часткі Вялікага княства аб'ядналіся пад уладай Жыгімонта.

Спадзяванні магнатаў Польскага каралеўства на ўваходжанне пасля смерці Жыгімонта Вялікага княства ў склад польскай дзяржавы аказаліся марнымі. Новым гаспадаром быў выбраны Казімір Ягайлавіч (1440—1492), які згадзіўся стаць польскім каралём у 1447 г. толькі пры ўмове захавання суверэнітэту Вялікага княства Літоўскага.

З другой паловы XV ст. з поўдня Вялікаму княству Літоўскаму пачынае пагражаць татарскае Крымскае ханства, утворанае ў выніку распаду Залатой Арды. З канца гэтага стагоддзя пачашчаюцца набегі крымчакоў на землі непасрэдна Беларусі.

У хуткім часе пачаліся войны паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай, якая актыўна схіляла да сябе праваслаўных феадалаў, незадаволеных засіллем феадалаў-католікаў пры велікакняжацкім двары.

У 1487—1493 гг. на службу да Масквы перайшлі князі Варатынскія, Бялеўскія, Мярэцкія, Вяземскія. Выходзілі яны не з голымі рукамі, а са сваімі валасцямі, якія далучаліся да Маскоўскай дзяржавы.

У 1494 г. маскоўскаму князю Івану III і вялікаму князю літоўскаму Аляксандру Казіміравічу ўдалося дамовіцца аб міры і падпісаць яго. Аляксандр, ажаніўшыся з дачкой маскоўскага вялікага князя Івана III Аленай, прызнаў усе «ад'езды на службу» прыгранічных князёў і далучэнне да Масквы іх уладанняў.

Мір з Масквой аказаўся надзвычай кароткім. Праз 6 гадоў, 14 ліпеня 1500 г., «з'ехалася войска літоўскае з маскоўскім, і ўчынілі між сабой бой і сечу вялікую, і пабіла Масква Літву». Новы мірны дагавор падпісаны ў 1503 г. Ён быў для княства яшчэ больш цяжкі, чым папярэдні. Да Масквы адышлі Чарнігаў, Ноўгарад-Северскі, Гомель, Бранск, Пуціўль, Старадуб, Мцэнск з іх землямі. Міжрэчча ніжняга Сожа і Дняпра з тэрыторыяй сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна надоўга апынулася ў памежжы паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай.

З гэтага часу пачаліся бясконцыя войны паміж Вялікім княствам Літоўскім і ўзмацнелым пасля вызвалення ад татарскай няволі Вялікім княствам Маскоўскім, якое абвясціла свае спадчынныя правы на ўсе славянскія землі Кіеўскай Русі, у тым ліку на тыя, што знаходзіліся пад уладай Вялікага княства Літоўскага. Вялікаму княству Літоўскаму з 1492 па 1522 г. давялося вытрымаць чатыры вайны з Маскоўскай дзяржавай. Асабліва ўпартая была апошняя, пачатая ў 1512 г. Рашаючая бітва адбылася 8 верасня 1514 г. пад Оршай. 35-тысячнае войска гетмана Вялікага княства Літоўскага Канстанціна Астрожскага разбіла 80-тысячную маскоўскую армію. Тым не менш у выніку чатырох войнаў Вялікае княства Літоўскае страціла значную частку зямель на ўсходзе.

Пагрозу Вялікаму княству Літоўскаму складалі частыя набегі крымскіх татараў, што суправаджаліся рабаўніцтвам і разбурэннямі беларускіх гарадоў і вёсак, захопам у палон мірных жыхароў, якіх потым прадавалі ў рабства. На пачатку XVI ст. былі прадпрыняты дзейсныя меры па барацьбе з крымскімі татарамі. Крымчакам былі нанесены сур'ёзныя паражэнні, пасля чаго небяспека з поўдня аслабла.

У першай палове XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім узмацнілася ўлада буйных феадалаў — магнатаў: прывілеяванае становішча знаці было замацавана ў вышэйшым юрыдычным дакуменце — Статутах (1529, 1566, 1588 гг.) Вялікага княства Літоўскага. Былі створаны мясцовыя органы кіравання — павятовыя сеймікі. Дэпутаты ад паветаў збіраліся на Вольны Сейм, які стаў вышэйшым заканадаўчым і кантралюючым органам дзяржавы, што набыла рысы саслоўнай манархіі.

У сярэдзіне XVI ст. канчаткова завершана тэрытарыяльна-адміністрацыйная рэформа, пачатак якой быў пакладзены яшчэ пры Вітаўце. Дзяржава была падзелена на ваяводствы. У XVI ст. існавалі Полацкае, Віцебскае, Навагрудскае, Берасцейскае (Брэсцкае), Мінскае і Мсціслаўскае ваяводствы. Тэрыторыя Буда-Кашалёўскага раёна ўваходзіла ў Мінскае ваяводства.

З XIV ст. на развіццё культуры Вялікага княства Літоўскага моцны ўплыў аказвалі заходнееўрапейскія традыцыі. У XVI ст. на землях Беларусі і Літвы пашыраюцца ідэі гуманізму, Рэнесансу. Узнікае беларускае кнігадрукаванне: першадрукар Францыск Скарына выпусціў у 1517—1519 гг. Біблію на старабеларускай мове.

У Вялікім княстве Літоўскім распаўсюджваецца Рэфармацыя, пашыраюцца яе асноўныя плыні — кальвінізм і арыянства. У другой палове XVI ст. пратэстанцтва моцна пацясніла асноўныя канфесіі дзяржавы — каталіцтва і праваслаўе, гэтаму ў значнай ступені спрыяла пазіцыя буйнейшых магнатаў Беларусі і Літвы.

У перыяд росквіту феадальных адносін грамадства ў Вялікім княстве Літоўскім падзялялася на саслоўі. Для вызначэння саслоўяў ужывалася назва «станы». Саслоўі (станы) былі прывілеяваныя і простыя.

На працягу XIV—XVI ст. галоўнае багацце краіны — зямля — перайшла да феадалаў: вялікага князя і знаці. Яны з'яўляліся «людзьмі вышэйшага стану». Найбуйнейшым уласнікам зямлі была дзяржава ў асобе вялікага князя. Значная частка зямлі знаходзілася ў спадчынным карыстанні князёў і шляхты. Феадалы падраздзяляліся на групы: князі, паны, баяры-шляхта і інш.

На версе феадальнай лесвіцы знаходзіўся вялікі князь, а ніжэй — удзельныя князі. Памеры іх уладанняў былі надзвычай вялікія. Некаторыя магнаты мелі магчымасць выстаўляць на вайну буйныя атрады конных воінаў. Побач з магнатамі было шмат

сярэдніх і дробных землеўладальнікаў, якія складалі служылае саслоўе. Яны называліся баярамі; потым увайшлі ў склад шляхты — свабодных ваеннаслужывых людзей. Паступова шляхта набывала ў Вялікім княстве Літоўскім усё большыя і большыя правы.

Князі былі прадстаўнікамі радавітай арыстакратыі (нашчадкі Рурыкавічаў, полацкіх Рагвалодавічаў, Гедзімінавічаў), што валодалі вялікай пазямельнай маёмасцю. Паны — гэта феадалы, якія займалі важныя пасады ў дзяржаве. Польскі тытул (ганаровае званне) «пан» стаў ужывацца ў Вялікім княстве Літоўскім з пачатку XV ст. і перадаваўся па спадчыне. У познім сярэднявеччы ўсё часцей пашыралася польская назва феадалаў — «шляхціцы», што азначала род, парода. Шляхціцы за валоданне зямлёй павінны былі несці ваенную службу пад харугвамі (сцягамі) вялікага князя або буйнога землеўладальніка. Служба за зямлю — важнейшая прыкмета феадалізму ў Еўропе. Землі належалі таксама епіскапству, манастырам і цэрквам. Аднак іх уладанні тады не былі такімі значнымі, як пазней.

Самую вялікую частку насельніцтва, што мела дачыненне да зямлі, складалі сяляне. Яны вялі сваю гаспадарку (дым) на зямлі ўласнымі прыладамі працы і сіламі сваёй сям'і (звычайна 5—7 чалавек).

Асноўная частка сялян дзялілася на пахожых (вольных) людзей і непахожых. Пахожым дазваляўся пераход ад аднаго пана да іншага. Яны плацілі даніну землеўладальніку прадуктамі і грашамі за надзелы зямлі, якімі карысталіся. Непахожыя былі пазбаўлены права пераходу да іншага пана. Поўнай уласнасцю феадала была чэлядзь нявольная, якая жыла пры дварах феадалаў.

Сяляне знаходзіліся ў рознай ступені залежнасці ад феадалаў. Паводле сваіх павіннасцей сяляне падзяляліся на даннікаў, цяглых, чыншавых і слуг.

Сялян, у якіх асноўным відам павіннасцей была даніна, называлі даннікамі. Землеўладальнік перадаваў вольнаму селяніну ў карыстанне зямлю. За гэта той аддаваў феадалу даніну прадуктамі: збожжам, мясам, мёдам, птушкай і г. д. Аброк збожжам і іншымі сельскагаспадарчымі прадуктамі называўся тады дзякло. У XV ст. быў уведзены і грашовы аброк (чынш) за карыстанне зямлёй. Сяляне, якія плацілі яго землеўладальнікам, называліся чыншавыя.

Цяглыя сяляне адбывалі паншчыну. Яны працавалі на зямлі феадала некалькі дзён у тыдзень са сваёй рабочай жывёлай (валом ці канём) і са сваімі прыладамі. Паншчына пазней стала галоўнай формай феадальнага прыгнёту. Мелася таксама група сялян-слуг. Яны выконвалі пры панскім двары розныя работы, былі конюхамі, садоўнікамі, рамеснікамі, паляўнічымі і г. д.

Феадалы, адабраўшы ў сялян зямлю, імкнуліся ўстанавіць прыгон — прымусовую працу сялян на пана з дапамогай дзяржавы. Раней сяляне, незадаволеныя сваім гаспадаром, маглі перайсці ва ўладанне іншага пана і атрымаць у яго зямельны ўчастак. У нейкай ступені гэта абмяжоўвала феадальны прыгнёт. Але прывілей 1447 г. абавязваў феадалаў беглых сялян не прымаць. Судзебнік 1448 г. прадугледжваў нават пакаранне за дапамогу пры ўцёках залежных людзей ад феадалаў. Такім чынам, у XV ст. узмацнілася запрыгоньванне сялян феадаламі. У наступным стагоддзі становішча сялян яшчэ больш пагоршыцца.

Гаспадарка селяніна стала асноўнай ячэйкай сельскагаспадарчай вытворчасці. Зямельныя надзелы сялян перадаваліся па спадчыне. Сяляне адной вёскі складалі грамаду. Грамада — гэта назва абшчыны ў XIII—XVIII ст. у Беларусі, у тым ліку на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна, на якой тады не існавала гарадоў. Звычайна грама-

да аб'ядноўвала насельніцтва асобнай вёскі. Жыхары некалькіх вёсак уваходзілі ў склад больш шырокай арганізацыі — воласці. У шэрагу раёнаў, асабліва ў гаспадарскіх уладаннях на ўсходзе Беларусі, грамада адыгрывала значную ролю ў арганізацыі сялянскага землекарыстання і выплаты феадальнай рэнты. У XVI ст. на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна існавалі вёскі: Кошалева, Чабатовічы, Уваравічы і інш.

У агульным карыстанні грамады былі паша, лясы і воды. Пераважала трохпольная сістэма земляробства. За карыстанне зямлёй да XVI ст. падданыя сяляне плацілі натуральную рэнту (даніну), пазней адпрацоўвалі паншчыну ў гаспадарцы феадала ці плацілі грашовы чынш. З канца XV ст. у маёнтках феадалаў узнікаюць фальваркі — невялікія паселішчы (1—5 двароў), якія першапачаткова ўяўлялі сабой асобную феадальную гаспадарку з комплексам будынкаў і панскай ворнай зямлёй. Зямлю апрацоўвалі чэлядзь нявольная і феадальна-залежныя сяляне. Да XV ст. існавалі дробныя фальваркі, якія забяспечвалі феадалаў прадуктамі. З сярэдзіны XVI ст. у сувязі з ажыццяўленнем «уставы на валокі» 1557 г. складвалася фальваркова-паншчынная сістэма, пры якой сельскагаспадарчыя прадукты выпрабляліся пераважна на продаж.

Г.В.Штыхаў.

* * *

Мангола-татарскае нашэсце нанесла страшэнную шкоду ўсходнеславянскім княствам, пакінуўшы руіны, папялішчы. Насельніцтва Гомеля і сельскай мясцовасці рэзка скарацілася: людзі шукалі прыстанішча ў аддаленых землях, куды не змаглі дабрацца атрады драпежных баскакаў і іх прыслужнікаў. Многія сёлы так і не адрадзіліся пасля падзей XIII ст.

З сярэдзіны XIV ст. гістарычныя лёсы зямель паўднёва-ўсходняй Беларусі неразрыўна звязаны з Вялікім княствам Літоўскім. На гістарычнай сцэне княства выступіла ў якасці федэрацыі Літвы і Русі, тры чвэрці насельніцтва якой складалі русіны, русічы (продкі беларусаў і ўкраінцаў).

З канца XIII — XIV ст. за ўсходнім рэгіёнам дзяржавы з ядром у Полацку і Смаленску замацоўваецца назва «Белая Русь». Былое радзіміцкае Пасожжа, гістарычна цесна звязанае з чарнігава-северскімі землямі, яшчэ доўгі час, да XVI — XVII ст., захоўвае былую назву — Северыя.

Северыя і Кіеўшчына, а разам з імі і землі Ніжняга Пасожжа, цярпелі ад татарскага ярма амаль да сярэдзіны XIV ст. Вызваленне мясцоваму насельніцтву прынёс літоўска-беларускі князь Альгерд (правіў разам з Кейстутам у 1345 — 1377 гг.), Гомель з навакольнымі валасцямі ўвайшоў у склад Вялікага княства Літоўскага ў канцы 1350 — пачатку 1360-х гадоў.

Палітычная гісторыя Буда-Кашалёўскага краю ў другой палове XIV — першай палове XV ст. невядомая. Трэба меркаваць, што значная частка яго мясцовасцей падпарадкоўвалася гомельскім удзельным князям Фёдару Карыятавічу, Патрыкію Нарымантавічу, Аляксандру Патрыкіевічу, Свідрыгайлу Альгердавічу, Васілю Яраславічу. Да сярэдзіны XV ст. (каля 1452 г.) адносіцца адно з першых упамінанняў у пісьмовых крыніцах населенага пункта Буда-Кашалёўшчыны, які існуе і да сённяшняга дня. Свідрыгайла Альгердавіч падараваў у той час баярыну Андрэю Саковічу сяло Гомельскай воласці Дуровічы (цяпер Дуравічы).

Адносна спакойным для ніжнясожскага рэгіёну (і зямель Буда-Кашалёўшчыны) быў час кіравання ў Старадубе і Гомелі беглага з Масковii ўдзельнага князя Івана Андрэевіча Мажайскага (каля 1454 — 1483 гг.). У гэты час назіраецца эканамічны пад'ём,

расце колькасць насельніцтва, узнікаюць новыя сёлы. Іван Андрэевіч атрымліваў немалыя даходы з вёсак, якія акружалі Гомель, дзе працавалі яго сяляне. Частку сёл ён падараваў прыбліжаным, а сяло Дуравічы пасля смерці Андрэя Саковіча перадаў сваім сынам Андрэю і Сямёну.

Пасля смерці Івана Мажайскага Гомель з наваколлем пераходзіць да яго сына Сямёна, што было пацверджана граматай вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча Ягелончыка 1 ліпеня 1496 г. У 1499 г. Сямён Іванавіч валодаў не толькі Гомелем і Старадубам, але «выслужыў» яшчэ Чарнігаў, воласці Карачаў і Хацімль. Гэтыя ўладанні аддаваліся Сямёну, яго жонцы, дзецям і нашчадкам «назаўсёды». Мажайскія мелі права «трымаць» гарады і сёлы з усімі маёнткамі, сялянамі, ворнымі і бортнымі землямі, бабровымі і паляўнічымі ўгоддзямі, лясамі, рэкамі, азёрамі, сажалкамі. Княжацкаму сямейству дазвалялася збіраць падаткі, даніну і гандлёвыя пошліны, якія былі заведзены ў гэтых месцах з даўніх часоў. Правы Мажайскага абмяжоўвала адзінае патрабаванне вялікага князя — удзельнаму князю забаранялася ўмешвацца ў асабістыя справы і ўласнасць мясцовых баяр, якія атрымалі свае вольнасці і прывілеі паводле велікакняжацкіх грамат.

На рубяжы XV–XVI ст. Буда-Кашалёўскі край трапіў у цэнтр ваеннай і палітычнай барацьбы, апынуўшыся на мяжы паміж двух магутных суседзяў — вялікіх княстваў Літоўскага і Маскоўскага.

У 1499 г. Сямён Іванавіч, узважыўшы выгады ад змянення сваёй палітычнай арыентацыі, уступіў у «змову» з маскоўскім князем Іванам III і ранняй вясной 1500 г. «адпаў» з вялікім старадубска-гомельска-чарнігаўскім удзелам ад Вялікага княства Літоўскага і далучыўся да Масквы. Пачалася даўно ўжо наспелая мас-

Аляксандр.

коўска-літоўская вайна, у ходзе якой Іван III Васільевіч «люди свои посылаше, многы силы, без вести», заняў некалькі літоўскіх гарадоў, у т.л. Бранск, Почап, Гомель з воласцю.

У 1503 г. вялікі князь літоўскі, кароль польскі Аляксандр Ягелончык і вялікі князь маскоўскі Іван III Васільевіч падпісваюць дамову аб міры на 6 гадоў, каб у «те перемирные лета межи себе рати и войны не замысляти». Іван абяцае «не воевати и не зацепляти ни чим» уладанняў Літвы, у т. л. Рэчыцы, Стрэшына і Чачэрска. Аляксандр, у сваю чаргу, адмаўляецца ад прэтэнзій на маскоўскія ўладанні і землі маскоўскіх «слуг», у т. л. князя Сямёна. Сярод пералічаных у дагаворы вёсак каля Гомеля, якія знаходзіліся ва ўладанні Сямёна, сустракаем Уваравічы, Кашалёў Лес (г. зн. Кашалёва), Марозавічы і Ліпінічы. Наступныя падзеі паказалі, што мірная згода так і засталася на паперы. У 1507 г. пачынаецца новая вялікая вайна паміж Літвой і Масковіяй за ўсходнеславянскія землі, баявыя дзеянні разгортваюцца амаль па ўсім беларускім Падняпроўі. У 1508 г. зноў вядуцца перамовы, мірная згода з цяжкасцямі вытрымліваецца да 1512 г.

Між іншым, сутыкненні працягваюцца і ў тыя перамірныя «лета». Асабліва трывожна было на мяжы паміж маскоўскім Гомелем і літоўскай Рэчыцай. У 1511 г. Васіль Мажайскі,

Жыгімонт I Стары.

нашчадак памерлага да таго часу Сямёна, вырашае расшырыць асабістыя ўладанні ў заходнім накірунку і захоплівае паселішчы літоўскага боку, якія ўваходзілі ў Рэчыцкую воласць. Сярод іх былі Чабатовічы і Бацунь.

У час нападу сялянам чыніліся крыўды і страты вялікія. Не жадаючы абвастраць і без таго складаную знешнепалітычную сітуацыю, маскоўскія ўлады абяцалі разабрацца з Мажайскім, а «вінаватых казніць». Аднак новая жорсткая вайна ўспыхнула ўжо ў наступным 1512 г.

Пагранічнае размяшчэнне Буда-Кашалёўскага краю «забяспечыла» яму неспакойнае жыццё на доўгія дзесяцігоддзі. Наваколле Гомеля, Рэчыцы, Стрэшына, іншыя падняпроўскія замкі сталі аб'ектамі пастаянных нападаў з абодвух бакоў. Нягледзячы на лютаўскае 1523 г. перамір'е, пагранічныя канфлікты Масковіі і Літвы не затухаюць. З двух бакоў рабуюць маёмасць баяр і сялян, забіраюць жывёлу, выразаюць і бяруць у палон мірнае насельніцтва.

Ужо ў 1524 г. рускія наменікі ў Старадубе і Гомелі пасылалі свае ўзброеныя атрады ў наваколлі Рэчыцы і Стрэшына. Рабункі і забойствы на мяжы працягваліся і ў наступным годзе. Старадубскі намеснік князь Аляксандр Іванавіч Абаленскі паведамляў у Маскву, што слугі вялікага князя літоўскага робяць, у прыватнасці, набегі з Рэчыцы на воласць Гомельскую. Такіх нападаў было некалькі. Мясцовых жыхароў зноў забівалі, бралі ў палон, жывёлу забіралі. Тым часам літоўска-беларускі бок прад'яўляў маскоўскім уладам аналагічныя прэтэнзіі: са Старадуба і Гомеля падданым валасцей Стрэшынскай і Горвальскай (куды ўваходзіла частка сёл Буда-Кашалёўшчыны) рабілі вялікія «кривды и грабежи». Зімой 1524 – 1525 г. пагранічныя валасці «звоевали» атрады намеснікаў гомельскіх і старадубскіх: «статки людей разграбили, людей помучили и иных посекли, а многих у полон повели», агалілі многа сёл. Узаемныя абяцанні бакоў навесці парадак на мяжы па-ранейшаму заставаліся не выкананымі.

У 1527 г. маскоўскі князь Васіль III Іванавіч і літоўскі князь Жыгімонт I Стары падпісваюць чарговае перамір'е на 6 гадоў. Жыгімонт абяцае «не воевати и не зацепляти ничем» маскоўскіх уладанняў, у т. л. сёл Уваравічы, Кашалёў Лес, Марозавічы і Ліпінічы. Князі абяцалі вызваліць усіх палонных, забяспечыць свабодны праезд і гандаль для «гасцей» (купцоў), абмяняцца пасламі і г. д. Аднак ужо ў 1529 і 1532 гг. маюць месца новыя пагранічныя сутычкі.

Вырашыўшы адваяваць усю Северыю і скарыстаўшы смерць Васіля III Іванавіча (1533), Вялікае княства Літоўскае пачынае новую вайну з Масковіяй. Баявыя дзеянні вядуцца з пераменным поспехам да 1536 г. У 1535 г. прабіў час Гомеля і навакольных сёл. Шматтысячнае войска караля Жыгімонта (пешае, коннае, з вялікім артылерыйскім абозам), сфарміраванае з літоўска-беларускіх, татарскіх і наёмных польскіх атрадаў, пад камандаваннем гетмана Юрыя Мікалаевіча Радзівіла рушыла праз рэчыцкія, буда-кашалёўскія і гомельскія сёлы з Рэчыцы на Гомель. Пасля тыднёвой аблогі 17 ліпеня 1535 г. Гомель здаўся. Част-

ка мясцовых баяр «присягу вчиняла» Жыгімонту, паабяцаўшы яму «верне служити».

У выніку кампаніі 1535—1537 гг. была захоплена ўся Северыя. Аднак рэальным набыццём ВКЛ паводле дагавору 1537 г. аказаўся толькі Гомель. З гэтага часу землі Буда-Кашалёўшчыны зноў былі поўнасцю вернуты пад літоўскі скіпетр.

У 1535 г. Жыгімонт зацвярджае рашэнне аб утварэнні Гомельскага староства—гаспадарскага (велікакняжацкага) уладарства пад кіраўніцтвам буйных дзяржаўных чыноўнікаў. Трэба меркаваць, што ў склад гэтай адміністрацыйнай адзінкі ўвайшла і значная частка буда-кашалёўскіх сёл. Старостамі-дзяржаўцамі назначалі славутых феадалаў за верную службу вялікаму князю. Яны «трымалі» Гомель з воласцю ад імя гаспадара ці пажыццёва, ці да асобнага распараджэння вярхоўнай улады. Старосты выконвалі ўсе адміністрацыйна-судовыя функцыі пры дапамозе мясцовага «врада» і «враднікаў», кожны год перадавалі ў дзяржаўную казну («до скарбу господарского») сабраныя з мяшчан і валашчан падаці. Да 1560 г. асноўны падатак браўся ў натуральнай форме — збожжам, футрам, мёдам і ўсялякімі павіннасцямі—работамі. Частка навакольных сёл у гэты час не падпарадкоўвалася старостам і належала баярам, праваслаўнай царкве, уласніцкія правы якіх, як і раней, рупліва аберагаліся велікакняжацкімі граматамі-прывілеямі.

У чаканні магчымых нападаў маскавітаў і крымскіх татар вярхоўная ўлада накіроўвала атрады коннай «сторажи», узбраенне і амуніцыю. Сіламі мясцовых мяшчан і сялян, а таксама жыхароў іншых падняпроўскіх валасцей у Гомельскім замку вяліся фартыфікацыйныя работы. У 1560 г., у час праўлення старосты Тышкевіча, каралеўскімі служачымі «панамі-рэвізорамі» Т.Валасевічам і М.Нарушэвічам, якіх прыслалі ў Гомель для правядзення аграрнай рэформы, было састаўлена поўнае апісанне (рэвізія-інвентар) Гомельскага староства з пералікам яго паселішчаў, абазначэннем іх прыналежнасці да розных катэгорый феадальнай уласнасці, колькасці дымоў (сялянскіх гаспадарак), зямельных надзелаў, межаў угоддзяў і г. д. На старонках гэтага унікальнага дакумента пералічаны ўсе сёлы Буда-Кашалёўшчыны сярэдзіны XVI ст. — Бацунь, Губічы, Марозавічы, Кашалёва, Уваравічы, Дуравічы, Чабатовічы.

5 сёл (Бацунь, Губічы, Марозавічы, Кашалёва, Уваравічы) мелі статус гаспадарскіх (велікакняжацкіх) і кіраваліся праз адміністрацыю Гомельскага старосты-дзяржаўцы. Сяло Чабатовічы (Чоботовічы) было «выслужана» панамі Халецкімі, а Дуравічы (Дуровічы) з'яўляліся леннай (падараванай з правам атрымання ў спадчыну нашчадкам мужчынскага полу) уласнасцю паручніка Гомельскай роты Яна Фашча.

Аграрная рэформа («помера волочная») мела на мэце рэарганізаваць даўно існуючую сістэму сялянскага карыстання зямлёй, абкладання сялян феадальнымі павіннасцямі і павышэнне даходнасці гаспадарскіх маёнткаў. Рэвізоры мералі сялянскую зямлю («ровналі грунты») на так званыя службы — роўныя па памерах участкі. Служба станавілася новай адзінкай абкладання прыгонных сялян замест мінулай — дыма. Сяляне-даннікі ператвараліся ў чыншавікоў, якія былі абавязаны плаціць падаткі не столькі натуральнымі прадуктамі, колькі грашыма — чыншам. Грашовыя падаткі ішлі як у карысць вялікага князя, так і мясцовага старосты.

Павіннасці дзяржаўных гомельскіх сялян з 1560 г. выглядалі так: «в кождый год о светом Михале свята римского мають давати до скарбу

господарского с каждое службы по пятьдесят грошей (столькі ішло з зямлі сярэдняй якасці, з добрай плацілі па 60, а з «подлой», г. зн. дрэннай — па 40 грошай. — *А. М.*), жита бочку ровную, без верха и нетоптаную, по бочке овса, за каждый воз сена — по 4 пенязя, за каждый пуд меда — по 25 грошей». Акрамя таго, «за ловы звериные, яко великого, так и малого зверя, а теж куничные, беличные и иные всякие и пташие» — «копа одна и грошей сорок, за ловы рыбные и гоны бобровые копа одна, за езовщину (уладкаванне прылад для лоўлі рыбы. — *А.М.*) с каждое службы по шести грошей».

Старосце належала з «каждое службы жита на пол бочки, овса пол бочки, тое меры, которою на господаря его милости маеть быти давано; а зособно за каждую копою всякого плату по шести грошей, а над то с каждое службы по два возы дров».

У 1560 г. у сяле Бацунь сяляне Сак Ясковіч, Алісей Гапановіч, Мікіта Бярэчыч валодалі трыма дымамі, трыма валамі, трыма канямі і дзвюма службамі «грунту доброго». У тым жа сяле баярын Белка Кажамячыч разам з сялянамі валодаў бортным угоддзем («островом») Коўпін, за што служыў вялікаму князю «конем одним службу земскую». У сяле Губічы было 15 гаспадарак з 12 валамі, 4 канямі і 4 службамі «грунту подлого». Губіцкія гаспадаркі належалі Міхаілу Максімовічу, Кузьме Астапковічу, Аксюту Піліповічу, Багдану Астапковічу, Аніску Ермашэвічу, Паўлу Гапановічу, Грышку Ярашковічу, Сцяпану Цішковічу, Усціну Кандратовічу, Івану Аніськовічу, Сяргею Якававічу, Аўдзею Іванавічу, Федзьку Драбышэвічу, Сямёну Какорычу, Грышку Хадотавічу, Данілу Арцёмавічу. У вёсцы Марозавічы было 4 двары сялян Івана Юркавіча, Гаўрылы Якававіча, Якава Качанавіча, Мікіты Сцяпанавіча і Дзяміда Смальняніча. Ворная зямля ў Марозавічах лічылася «добрай».

У Кашалёве налічвалася 12 двароў і 4 службы «добрай» ворнай зямлі. Жыхарамі Кашалёва былі Апанас Старац, Восіп Булізіч, Хрол Хаміч, Радка Калёнікавіч, Аўсей Навумавіч, Нічыпар Іванавіч, Мішка Казановіч, Грыдко Данілавіч, Федзька Галвіновіч, Амяльян Гурчын, Міна Мікітавіч і Янка Макавовіч. Ужо ў сярэдзіне XVI ст. у Кашалёве была царква Святога Міхаіла, якой «здавна» належала зямля Пятроўшчына. У 1560 г. настаяцелем Міхайлаўскай царквы служыў айцец Хілімон (Філімон). Ва Уваравічах мелася 11 гаспадарчых двароў сялян Сідара Пятровіча, Грышкі Пераяціча, Данілы і Дарошкі Арцямовічаў, Грышкі Грыковіча, Грына Малеевіча, Андрэя Малішэвіча, Гаўрылы Скароднa, Міткі Васілевіча, Івана Карповіча, Ігната Крыўца. На ўваравіцкіх землях баярын Пранко Астаповіч «держал» ворныя землі Аздразоўшчыну, Роўкаўшчыну, Маркаўшчыну, Самсонаўшчыну і «остров» Гусявіцкі, а баярын Ян Фашч — «остров» Дуравіцкі. Ва Уваравічах была Прачысценская царква, настаяцелем якой у дакуменце 1560 г. названы айцец Міхайла.

У гады цяжкай для Вялікага княства Літоўскага Лівонскай вайны (1558–1583) кіруючыя колы падрыхтавалі вялікую палітычную акцыю, якая вызначыла далейшы гістарычны лес беларускага народа. Размова ідзе аб неадназначнай паводле сваіх глыбінных вынікаў Люблінскай уніі 1569 г. — аб'яднанні Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага ў федэратыўную дзяржаву. Так на палітычнай карце Еўропы з'явілася новае дзяржаўнае ўтварэнне — Рэч Паспалітая, з якім і была звязана гісторыя Буда-Кашалёўшчыны да канца XVIII ст.

А.А.Макушнікаў .

Дакументы сведчаць

З ПЕРАМІРНАЙ ГРАМАТЫ КАРАЛЯ АЛЯКСАНДРА І ЯГЕЛОНЧЫКА І ВЯЛІКАГА МАСКОЎСКАГА КНЯЗЯ ІВАНА ІІІ ВАСІЛЬЕВІЧА

1503 г.

Мы Александр Божею милостию Король Польский и Великий Князь Литовский, Руский, Князь Прусский, Жомоитский и иных. Што посылали есьмо до тебе, брата и тестя нашего Иоана, Божею милостию Государя всея Руси и Великого Князя Володимерского и Московского и Новгородского и Псковского и Тферского и Югорского и Пермского и Болгарского и иных, послов своих.., о миру и доброй смолве, и то ныне межи нас не сталося и послы наши говорили от нас тобе.., штобы ты с нами взял перемирие на шесть лет, на то, штобы нам в тые перемирные лета межи себе рати и войны не замысляти. (. . .)Тебе Иоану (. . .) наших земель(. . .) волостей Мозыря, Пчича, Брагиня, Речичи, Горволя, Стрешина, Чечерска, Пропциска, Могилева, города Мстиславля с волостьми, города Кричева с волостьми, города Смоленска и волостей, (. . .) города Витебска и волостей, (. . .) города Полоцка и волостей, . . . — в тые перемирные лета, шесть лет, не воевати и не защепляти ни чим. А мне Александру. . . ваших земель, Московское земли, . . ., не воевати и не зачепати ни чим; такеж и тих ваших городов и волостей и земель, которые за вашими слугами, за Князем Семеном Ивановичем Стародубским и за Князем Василем Ивановичем за Шемячичом, и за Князем Семеном Ивановичем за Бельским, и за Трубецкими Князьми, и за Масальскими и за иными вашими слугами. . ., города Чернигова с волостьми, города Рыльска с волостьми, города Новгородска Северского с волостьми, города Гомля с волостьми, города Любеча с волостьми, города Почопа с волостьми, города Трубецка с волостьми, города Радогоща с волостьми, города Бранска с волостьми, да волостей: Карачова, Хотимля, Поповы горы, Мглина и Дрокова, и сел: Уваровичь, Телешевичь, Тереничь, Кошелева леса, Морозовичь, Липиничь. . . А послати мне Александру. . . к вам послов своих. . . ; а приехати им к вам и отъехати добровольно безо всякое зачепки. . . А коли вы пошлете до нас своих послов о каких делех, и вашим послом по нашим землям к нам добровольно приехати и отъехати безо всяких зачепок; а вашим купцом изо всих ваших земель во вси мои земли приехати со всяким товаром и торговати на всякий товар.

А в тыи перемирныи шесть лет какова учинится обида межи наших Князей и людей в землях и в водах и в инных каких обидных делех, и наши Князи и наместники и волостели украинныи съехався, да тем обидным делом всим управу учинят на обе стороне; а в каких обидных делех наши Князи и наместники и волостели не учинят управу, и нам о то сослати судей, и они съехався, да тим обидным делом всим управу учинят на обе стороне без хитрости: и татя, беглеца, холопа, робу, должника, по исправе выдати. . .

Сборник Муханова. М., 1856. № 79. С. 125—129.

З МАСКОЎСКІХ ПАСОЛЬСКІХ КНІГ АБ СКАРГАХ КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА І СТАРОГА НА НЕЗАКОННЫЯ ДЗЕЯННІ КНЯЗЯ МАЖАЙСКАГА НА ЛІТОЎСКА-МАСКОЎСКАЙ МЯЖЫ

1511—1514 гг.

Того же лета 1511 приезжал к великому князю Василью Ивановичю от Жигимонта короля дворянин его Богдан Довгердов з грамотою, а в грамоте своей король писал о обидных о порубежных делех, да о том, что Можайской забрал села его Речицкий Засуев, Гоботовичи (Чабатовічы), Калскевичи, Бацуни, Чорные, Агирево, Заспа, Левошевичи, Кисловичи, Борки, и чинить себе рубеж по Днепр; и о том бы с обе стороны выслать государю бояр своих, а королю панов своих, и они, съехався, управу учинят и виноватых казнят, а пограничным местом рубежи покладут. А правил Богдан великому князю от короля поклон. И князь великий против того ж королю писал, что его людем чинятца обиды и убытки великие, и он бы того велео сыскати; а что будет лихо учинилось его людем, и государь пошлет там на границы своих добрых людей и того велит сыскать, а сыскав, управу учинить, а виноватых сказнить, а в земли и в воды через перемирные грамоты вступатца не велит; а бояр своих хочет послать; а како именем и о которые часы, государь о том ведомо учинит.

Сборник Императорского Русского исторического общества. СПб., 1892. Т. 35. Ч. 1. С. 495—496.

З МАТЭРЫЯЛАЎ ЛІТОЎСКА-МАСКОЎСКІХ ПЕРАМОЎ АДНОСНА «ПОГРАНИЧНЫХ ОБИДНЫХ ДЕЛ» У НАВАКОЛЛЯХ ГОМЕЛЯ, РЭЧЫЦЫ, ГОРВАЛЯ, РАГАЧОВА І ІНШЫХ МЕСЦАХ

1525 г.

СА СЛОЎ ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ МАСКОЎСКАГА ВАСІЛЯ ІВАНАВІЧА КАРАЛЮ ЖЫГІМОНТУ КАЗІМІРАВІЧУ, ЯКІЯ БЫЛІ ПЕРАДАДЗЕНЫ МАСКОЎСКІМ ПАСЛОМ ДВАРАНІНАМ ФЁДАРАМ АФАНАСЬЕВЫМ:

«Великий государь Василей, Божьею милостию, государь всеа Руси и великий князь, велел тебе говорити: присылал к нам из Стародуба наместник наш, князь Олександр Иванович Оболенской, что твои люди из Пропойска и из Речицы, приказщики, Сенка Полозов, через перемирные грамоты вступаются в наши волости Стародубские и Гомейские; да неодинова приходя, в тех волостех людей, иных до смерти побили, а иных головами к себе свели в Речицу и Пропоеск з женами и з детми, а животы их многие пограбили. И наш наместник, князь Олександр, о том посылал к твоим наместником украинным неодинова, чтоб в наши волости и села и в земли и в воды через перемирные грамоты не вступались и людем нашим обиды не чинили; а которых наших людей свели головами з женами и з детми, и они б тех людей отпустили; а которые грабежи нашим людем от твоих людей учинились, и они б в тех делех управу учинили. И твои наместники наших людей, которых, поймали в тех волостех, и до сех мест держат у себя, а в обидных делех нашим людем с твоими людми управы ни в чем не учинят».

З ДАРУЧЭННЯ ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ МАСКОЎСКАГА ПАСЛУ Ф. АФАНАСЬЕВУ:

«А нечто взмолвят Федору про то, что из Гомиа приходили великого князя люди да в Литовском взяли за свое. И Федору говорити: того яз не слыхал, чтоб где государя нашего люди в Литовском что взяли; а то ведаю гораздо, что государь наш приказывает своим наместником украинным, чтоб в королевы земли и в воды не вступались и обиды Королевым людем не чинили».

З АДКАЗАЎ КАРАЛЕЎСКІХ СЛУГ МАСКОЎСКАМУ ПАСЛУ:

«Государь наш король и великий князь, его милость Жигимонт, велел тебе говорити: многократ воеводы и наместники наши украинные, с Полотцка, з Витебска, с Орши, з Дубровны, со Мстиславля, с Кричова, с Пропойска и с Чичерска, з Речицы, з Горволя и из иншых многих городов наших и волостей украинных пишут к нам, иж от брата и свата нашого, великого князя Василья Ивановича, с пограничных его городов и волостей, з Лук Великих, со Ржевы, с Торопца, з Стародуба и з Гомья и из инших его городов и волостей украинных кривды и грабежи великии людем нашим делаютца: как жо наместники его стародубскии и гомейскии и иных и помещики тамошнии тое зимы прошлое, колкоснадцать сот людей у волости наши увослали и многии села Мозырскии и волость Стрешинскую и Горволскую звоевали, статки людей розграбили, людей помучили и иных посекли, а многих у полон повели; и к тому ещо люди, села и воды и земли Речицкии, и Горволскии, и Пропойскии, и Чичерскии, и иных городов и волостей наших позабирали, чего у перемирных грамотах великому князю не выписано. И врядники наши к его державцам посылают, абы в люди и воды наши не вступались, а держали рубеж с нами по перемирным грамотам, а суд и управу чинили и пленных, повыпускали; и они тых людей и земль и вод не поступают, а суда и управы нашим людем не делают, еще день ото дня болшии кривды и шкоды чинят, как же мы тых часов о том посылали до великого князя посла нашего Богухвала Дмитреевича. Государь наш король и великий князь его милость велел тебе говорити: и ты бы своему государю, великому князю Василью Ивановичу, говорил, абы он, подле нашего с ним крестного целованья, тыи волости и земли и воды, которыи у перемирной грамоте уписаны в нашу сторону, поступитись наместником и подданным нашим велел, а вперед бы не казал ся в то ничим уступати. А о грабежох и кривдах управу людем нашим во всем вчинити казал, а тых людей пленных, которыи помещики его на волостех наших пленили и статки их забрали, зася поотдавати велел, а винных бы за то казал казнити. А мы в тыи волости и земли и воды, которыи стоят у перемирной грамоте брату и свату нашему великому князю у его сторону, также не кажем уступатись ничим, а тым всим обидным делом, которыи будут от наших людей его людем стались, кажем управу вчинити, а виноватых нашод, велим показнити, а бы вперед за то межи нами лиха никоторого не было».

Сборник Императорского Русского исторического общества. СПб., 1892. Т. 35. Ч. 1. С. 693, 695, 697—698.

З МАТЭРЫЯЛАЎ ПАСОЛЬСТВА ВЯЛІКАГА КНЯЗЯ МАСКОЎСКАГА ВАСІЛЯ III ІВАНАВІЧА ДА КАРАЛЯ ЖЫГІМОНТА I, ШТО ДАТЫЧАЦЦА ПАРУБЕЖНЫХ КАНФЛІКТАЎ НА МАСКОЎСКА-ЛІТОЎСКАЙ МЯЖЫ І ПЕРАМІР'Я

1527 г.

Из списка о порубежных землях и жалобах 30 марта 1527 г., привезенного из Кракова в Москву от русских послов гонцом Васюком Безобразовым: А се список о порубежных землях и о жалобах... Во што ся не вступати великому князю по перемирным грамотам... Города Чичерска села: Онисимковичи, а Навилавка, а Волосовичи, Струмень, Лугиничи, Пукличи, а Орехвичи, половина Липинич, Оношковичи, Зеленово, Карповичи, а Выстриганов, великому князю не вступатись. А что перешло в сторону великого князя, по перемирной грамоте, села Чичерской волости: Скарбовичи, Залесье, Бабичи, Голодно, Светиловичи, Липиничи, Лапичи, Полешан, в те села великому королю невступатися. А Стрешинской волости села: Еленци, Губичи, а Скепно, Пыреевичи, в те села великому князю не вступатися. А что отошло в сторону великого князя села Стрешинской волости, по перемирной грамоте: Тереничи, Телешевичи, Уваровичи, Морозовичи, в те села великому королю не вступатись. А Горволские волости села: Буцуничи, Чобот, Засовье, а Бокиниш, Корскевичи Чорные, в те села великому князю не вступатися. А что отошло в сторону великого князя, по перемирной грамоте, село Горволское волости Кошелев Лес, в то село великому королю не вступатись. Города Речицы села: Батковичи, Кисловичи, Левошевичи.., во все те села и заходы Речитцкие великому князю не вступатись.

Сборник Императорского Русского исторического общества. СПб., 1892. Т. 35. Ч. 1. С. 751—752.

У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Расійская дзяржава дамагалася важнага для яе выхаду да Балтыйскага мора. Аднак на шляху ў Еўропу стаялі Лівонскі ордэн, Польскае каралеўства і Вялікае княства Літоўскае. Гэта абумовіла новае абвастрэнне паміж дзяржавамі і выклікала Лівонскую вайну 1558—1583 гг.

Калі пачаліся ваенныя дзеянні, Вялікае княства Літоўскае і Лівонскі ордэн заключылі саюз. У 1559 г. ордэн перайшоў пад пратэктарат Вялікага княства. Цар Іван IV (Грозны) накіраваў свае асноўныя ваенныя сілы да паўночна-ўсходніх межаў Вялікага княства Літоўскага, г. зн. у Беларусь. У 1562 г. рускія войскі стаялі каля сцен Віцебска, Оршы, Дуброўны, Шклова, Копысі. У 1563 г. яны аблажылі Полацк. Невялікі гарнізон на чале з ваяводам С. Давойнам мужна адбіваўся на працягу двух тыдняў, але вымушаны быў здацца. Узяцце Полацка адкрывала шлях рускім войскам на Вільню. Цяжкасці вайны разам з іншымі абставінамі як унутранага, так і знешняга характару прымусілі Вялікае княства Літоўскае пайсці на заключэнне Люблінскай уніі з Польшчай.

У 1569 г. у Любліне быў скліканы сумесны сейм Польшчы і Вялікага княства, дзе было падпісана пагадненне аб уніі, згодна з якім утваралася федэратыўная дзяржава — Рэч Паспалітая. На чале яе знаходзіўся польскі кароль (ён жа і вялікі князь літоўскі), які выбіраўся пажыццёва прадстаўнікамі шляхты Польшчы і Вялікага княства. Абедзве гэтыя часткі дзяржавы захавалі асобныя адміністрацыю, законы, фінансы, войскі, дзяржаўныя мовы. Беларусь заставалася ў межах Вялікага княства, а Украіна адыходзіла да Польшчы. Люблінская унія дзейнічала да 1795 г.

Аб'яднанне Вялікага княства Літоўскага і Польшчы на аснове Люблінскай уніі дазволіла каралю Стафану Баторыю сабраць войска і пачаць новае наступленне. У 1579 г. ён асадзіў Полацк і завалодаў горадам. Затым армія Баторыя асадзіла Пскоў. Упар-

тая абарона Пскова прымусіла караля пайсці на мірныя перагаворы. У 1582 г. было падпісана перамір'е на 10 гадоў: Полацк, Веліж і Лівонія заставаліся ў Рэчы Паспалітай, а Вялікія Лукі і іншыя гарады, захопленыя Баторыем, былі вернуты Расіі.

Няўдача, якую пацярпела Руская дзяржава ў Лівонскай вайне, з'явілася вынікам эканамічнай адсталасці, што не дало магчымасці паспяхова вытрымаць доўгую барацьбу з моцным праціўнікам. Аднак у час вайны быў разбіты Лівонскі (Інфлянцкі) ордэн, каталіцкая дзяржава і ваенна-духоўная арганізацыя нямецкіх рыцараў ва ўсходняй Прыбалтыцы. Яго землі былі падзелены паміж Вялікім княствам Літоўскім, Швецыяй і Даніяй, пазней гэта была васальная тэрыторыя Рэчы Паспалітай. У выніку вайны паўночна-ўсходняя частка Беларусі была спустошана і зруйнавана.

Бітвы Лівонскай вайны адбываліся на поўначы, далёка ад ніжняга Пасожжа. Гісторыкі лічаць, што час з 1537 г. па 1632 г. быў даволі мірным у гісторыі сярэдневяковай Гомельшчыны.

Своеасаблівым працягам Люблінскай уніі стала Брэсцкая царкоўная унія, прынятая на царкоўным саборы ў 1596 г. Гэтая падзея працягвае выклікаць супярэчлівыя пачуцці і ацэнкі. Вынікам уніі было ўтварэнне новай царкоўнай арганізацыі, якая заняла прамежкавае становішча паміж каталіцызмам і праваслаўем. Насаджэнне уніяцтва закранула і Гомельшчыну. Наогул вернікі уніяцкай царквы пазней (у XVIII ст.) складалі 76 працэнтаў насельніцтва Беларусі.

На працягу гісторыі Вялікага княства Літоўскага, калі яно знаходзілася ў складзе федэратыўнай дзяржавы Рэчы Паспалітай, у ліку найбольш складаных праблем былі рознаэтнічнасць і рознаканфесіянальнасць насельніцтва. Паводле сацыяльнага складу насельніцтва падзялялася на два асноўныя класы — феадалы («людзі шляхецкага роду») і залежныя сяляне («людзі простага стану»). Намінальным вярхоўным уласнікам усіх зямель у дзяржаве лічыўся вялікі князь. Саслоўе феадалаў складалася з князёў, паноў, баяр і зямян. З XVI ст. іх сталі называць шляхтай, якая карысталася палітычнымі правамі, падатковымі і гандлёвымі льготамі. Большасць мясцовай шляхты на працягу XVII – XVIII ст. перайшла ў каталіцтва і паланізавалася.

Падзеі, якія адбываліся ў 1648 – 1651 гг., сучасныя гісторыкі тлумачаць як антыфеадальную вайну. Для яе былі характэрныя сумесныя масавыя выступленні сялян і казацка-сялянскіх атрадаў супраць феадалаў, змыканне іх з рухам гарадскіх нізоў. Мэтай іх барацьбы стала вынішчэнне шляхты, незалежна ад яе этнічнага паходжання. Значную ролю ў пад'ёме антыфеадальнага руху адыграла народнае паўстанне на Украіне пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага. Для падтрымкі народнага руху на Беларусі Багдан Хмяльніцкі накіраваў атрады казакаў. Жыхары паўднёвых беларускіх гарадоў Мазыра, Турава, Гомеля, Рэчыцы, Лоева і іншых, як сведчаць крыніцы, «усе паказачыліся і пакляліся адзін аднаму стаяць да апошняга». Поспехі казацка-сялянскага войска нарабілі перапалоху сярод шляхты, каталіцкага і уніяцкага духавенства. Яны ратаваліся ўцёкамі ў глыб Вялікага княства Літоўскага. Такі паварот падзей у Беларусі занепакоіў кіруючыя колы Рэчы Паспалітай. Паводле загаду караля пачалі фарміравацца новыя шляхецкія апалчэнні, значна павялічвалася колькасць наёмнай ваеннай сілы. Агульнае кіраванне войскам, якое налічвала прыкладна 12 – 13 тысяч, было даручана Янушу Радзівілу. У пачатку 1649 г. Я.Радзівіл са значнымі сіламі рушыў на Палессе.

Вясной 1649 г. атрад казакаў на чале з палкоўнікам Нябабам нечакана з'явіўся каля Гомеля і захапіў горад.

Казакі ўчынілі страшэнную разню. Падышоўшыя да воласці войскі Вялікага княства Літоўскага вымусілі Нябабу пакінуць Гомель і яго акругу.

31 ліпеня 1649 г. каля Лоева адбылася жорсткая бітва, у якой прыняло ўдзел шматтысячнае з абодвух бакоў войска. Страты сярод казакаў і паўстанцаў, што далучыліся да іх, былі значныя. У крывавай сечы перамогу атрымала ўрадавае войска, якому ўдалося ўзяць пад свой кантроль поўдзень Беларусі.

Буйныя няўдачы казацкіх войскаў вясной і летам 1651 г. на Беларусі, у тым ліку каля Гомеля, спынілі тут народны рух. Жорсткая антыфеадальная вайна, якая працягвалася тры гады, закончылася паражэннем сялянства і гарадскога плебсу. Новы пад'ём антыфеадальнага руху наступіў з пачаткам вайны паміж Расійскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай 1654 – 1667 гг. Гэта была феадальная вайна расійскага самадзяржаўя за землі Смаленшчыны, Беларусі, Украіны, Літвы, Польшчы і польскі трон. Спачатку пасля ўпартых баёў на рубяжах Дняпра і Заходняй Дзвіны рускія войскі і казакі занялі значную тэрыторыю Беларусі і 33 яе гарады, у тым ліку Полацк, Віцебск, Гомель, Магілёў, Мсціслаў. Затым былі заваяваны Бабруйск, Глуск, Мінск, Слонім, Клецк, Навагрудак і інш.

Аднак увосень і зімой 1658 – 1659 гг. становішча рускіх войскаў рэзка пагоршылася. Шляхта, мяшчане і сяляне, што раней прысягалі цару, пачалі масава адмаўляцца ад прысягі і выступаць супраць Расіі. Адначасова разгарнулася барацьба паміж рускімі і ўкраінскімі войскамі. Руская армія пачала цярпець паражэнні і адступаць. Нарэшце было падпісана Андрусаўскае перамір'е 1667 г., паводле якога Беларусь засталася ў межах Рэчы Паспалітай. Вынікі вайны для тэрыторыі Беларусі былі асабліва трагічныя – насельніцтва тут скарацілася больш як у два разы.

У канцы XVII ст. у Расіі склаліся перадумовы для ўзнаўлення барацьбы за выхад да Балтыйскага мора. Галоўным праціўнікам Расіі ў Паўночнай вайне (1700 – 1721) з'явілася Швецыя.

Удзельнікі падзей 1648 – 1651 гг.: 1 – нямецкі наёмны пехацінец, 2 – панцырны кавалерыст Рэчы Паспалітай, 3 – венгерскі наёмны пехацінец, 4 – беларускі мешчанін, 5 – казацкі старшына, 6 – казак, 7 – беларускі селянін. Малюнак Ю.Лупіненкі.

Пасля таго, як у 1706 г. урад Рэчы Паспалітай заключыў сепаратны мір са Швецыяй, шведскі кароль Карл XII рушыў праз тэрыторыю Беларусі, каб пачаць наступленне на Расію. Ён марыў захапіць Маскву. На тэрыторыі Беларусі захопнікі рабавалі, забівалі мірных жыхароў, палілі гарады і вёскі. У 1708 г. Пётр I разграміў шведскае войска каля вёскі Лясная недалёка ад Прапойска (цяпер Слаўгарад). Пасля перамогі над шведамі ў вырашальнай бітве пад Палтавай (ліпень 1709 г.) рускія войскі ачысцілі ад шведаў тэрыторыю Беларусі, Літвы, Польшчы. Паўночная вайна таксама прычыніла Беларусі вялікія страты, загінуў кожны трэці жыхар.

На працягу XVIII ст. Рэч Паспалітая знаходзілася ў стане заняпаду. Уся ўлада ў краіне апынулася ў руках шляхты. Яе самавольству і самаўпраўству не было мяжы. Магнаты вялі сапраўдныя войны паміж сабой. Унутраную слабасць Рэчы Паспалітай выкарысталі ўрады суседніх моцных дзяржаў — Расіі, Прусіі і Аўстрыі. Яны ажыццявілі падзелы Рэчы Паспалітай, у выніку якіх гэта дзяржава перастала існаваць. Першы падзел Рэчы Паспалітай, паводле якога да Расійскай імперыі адыходзіла ўсходняя частка Беларусі, адбыўся ў 1772 г. Да Расіі былі далучаны беларускія землі на ўсход ад Дняпра і на поўнач ад Заходняй Дзвіны. Менавіта паводле гэтага падзелу тэрыторыя Буда-Кашалёўскага раёна апынулася ў складзе Расійскай імперыі.

У 1793 г. адбыўся другі падзел Рэчы Паспалітай. Да Расіі была далучана цэнтральная частка Беларусі. Спробу захаваць самастойнасць дзяржавы распачалі прагрэсіўныя колы шляхты. У сакавіку 1794 г. яны ўзнялі паўстанне, якое ўзначаліў ураджэнец Беларусі генерал Тадэвуш Касцюшка. Цэнтрам паўстання стаў Кракаў. Паўстанне распаўсюдзілася на тэрыторыю Беларусі і Літвы. Нягледзячы на асобныя поспехі паўстанцаў у бітвах з царскімі войскамі, паўстанне пацярпела паражэнне. Пасля гэтага Расія, Аўстрыя і Прусія ажыццявілі ў 1795 г. трэці падзел Рэчы Паспалітай, у выніку якога да Расіі адышла заходняя частка Беларусі.

З канца XVIII ст. пачаўся перыяд расійскага панавання на беларускіх землях. Сяляне, якія з нецярпеннем чакалі абяцанай ім зямлі і волі, засталіся падманутымі. Зямлёй і маёнткамі надзялілі не іх, а царскіх генералаў і чыноўнікаў. У Беларусь пацягнуўся бясконцы паток новых гаспадароў.

Г.В.Штыхаў.

* * *

У Рэчы Паспалітай тэрыторыя Буда-Кашалёўшчыны ўваходзіла ў склад Рэчыцкага павета Мінскага ваяводства.

Кліматычныя ўмовы ў Еўропе ў першай палове XVII ст. вызначаліся крайняй нестабільнасцю. На фоне агульнага паніжэння тэмпературы, павелічэння колькасці суровых зім узрасла агульная вільготнасць, узняўся ўзровень рэк і азёр, развівалася інтэнсіўнае забалочванне.

У пачатку XVII ст. на Усходнюю Еўропу навалілася стыхійнае бедства, якое не абышло і ўсходнюю Беларусь. Аўтар Баркулабаўскага летапісу (з мястэчка Баркулабава, каля 20 км ад Быхава) пісаў:

«Год 1600. Была зима люта и снежная. Орати начали на четвертой неделе после Пасхи [Вялікдзень — 2. IV. па старым стылі]. . . великие болести, хоробы также войны великие, голод, неврожай сильный; было поветрие альбо мор на людей перехожих, множество на Низ идучих; около 4 тысящ з голоду мужей и жен, детей пошло так, иж страшно было видети, иж на улицах, по дорогах, по гумнах, у ровех псы мертвых многие тела ели»[1].

З восені — зімы 1601 г. пачалася чарга галодных гадоў. З-за дажджлівага лета 1601 г. «начали жито на хлеб жать голодные люди перед Усекновением главы св. Иоанна Предтечи [11. IX], а в копы начали жито жать на св. Симеона Столпника [4. IX] и то зерно было очень мягко. А дожали жито перед Покровом за 2 недели, так как дождь шел недель 12. А 4 октября снег великий выпал и . . . ярицу, овес, ячмень, боб, горох. . . все снегом засыпало. А до 10 октября целую неделю снег сильный шел, выпал до полголени, также и буря снежная была. . . а так лежал снег 2 недели, с великих морозов река Днепр замерзла и ездили по нему как среди зимы. А потом . . . снег ростал и река Днепр вскрылась. А потом начали жать — горевать по снегу и стужу. Когда морозы были большие — огонь клали, сами грелись, даже страшно и жалко было глядеть. 2 — 3 человека за день едва снопов 40 нажнуть, овса или ярицы, ибо сильно полегли к земле. . . Маки, горохи, бобы, проса, репа — это все погибло. Зима была злая, снега большие и сильные были морозы. А когда наступила весна 1602 года, то много людей мертвых нашли, по 5 по 30 в одну яму хоронили. Больных, голодных, пухлых многое множество — страх видеть гнев божий»[2]. Моцны голад ва ўсходняй Беларусі працягваўся да 1605 г. У 1608 г. адзначаны катастрафічныя дажджавыя паводкі ва Усходняй Еўропе, пракаціліся эпідэміі воспы, было незвычайна шмат выпадкаў захворвання шаленствам. Усплёскі прыродных анамалій фіксаваліся яшчэ неаднаразова — у 1638, 1639, 1668, 1669, 1690 гг. У 1695 г., паводле паведамлення магілёўскага ігумена Арэста, у чэрвені «великий снег выпал, который через несколько дней лежал в Могилеве и в окрестностях оного. . . отчего вдруг дороговизна на хлеб стала в Белоруссии»[3]. У цэлым жа за XVII ст. адзначаецца 24 галодныя гады[4].

Многімі галоднымі гадамі былі адзначаны і першыя дзесяцігоддзі XVIII ст., але сярэдзіна — другая яго палова аказаліся даволі спрыяльнымі — галадалі толькі два разы.

Страшным бедствам з'явілася эпідэмія XVII — XVIII ст. Раз у 10 — 15 гадоў знішчальна дзейнічала воспа, у 1654 — 1657, 1710, 1770 гг. — эпідэміі чумы, у 1729 — 1730, 1737 — 1738 гг. — грыпу[5]. Нярэдка голад і эпідэміі лютавалі адначасова ў гады войнаў, шматразова павялічваючы колькасць ахвяр.

На пачатак XVII ст. Буда-Кашалёўскі край быў заселены дастаткова слаба. У XVI ст. пісьмовыя крыніцы ўзгадваюць Уваравічы, Кашалёў (Кашалёў Лес), Дуравічы, Елянец, Ліпінавічы, Марозавічы, Рагінь, Чабатовічы, Губічы, Дзербічы, Лапічы[6]. У першай палове XVII ст. гэта былі ў асноўным дробныя і сярэднія па памерах паселішчы (да 30 двароў), якія ва ўсходняй Беларусі ў разглядаемы перыяд складалі крыху больш як 66%[7]. Значныя паселішчы і крэпасці таго часу — Горваль, Стрэшын, Чачэрск, Гомель, Рэчыца — знаходзіліся даволі блізка да тэрыторыі Буда-Кашалёўшчыны, таму многія падзеі, якія адбываліся там, у пэўнай ступені закраналі і насельніцтва гэтага краю. І ўсё ж гэта ўздзеянне не было моцным, таму што па яго тэрыторыі не праходзілі важныя сухапутныя дарогі — толькі на ўсходзе набліжаўся шлях Чарнігаў — Гомель — Магілёў (праходзіў тады праз Пакалюбічы, Шарсцін, Сябровічы, Чачэрск), на захадзе шлях Чарнігаў — Бабруйск (праз Лоеў, Рэчыцу, Горваль і далей па правым беразе Бярэзіны). Праз поўнач тэрыторыі раёна ішоў другарадны шлях Чачэрск — Рагачоў [праз Меркулавічы, Царкоўе (сучаснае Саўгаснае), Гадзілавічы].

Палітычная гісторыя Беларусі XVII — XVIII ст. багатая на яркія і трагічныя падзеі. І хоць населеныя пункты Буда-Кашалёўшчыны вельмі рэдка ўпамінаюцца ў дакументах таго часу, гэта не

значыць, што мясцовае насельніцтва не прымала ўдзел у тых падзеях.

Асноўнымі парушальнікамі спакою ва ўсходняй частцы Рэчы Паспалітай да сярэдзіны XVII ст. з'яўляліся казакі. Казацкія атрады (загоны) рабілі рэйды з тэрыторыі Украіны далёка на поўнач, у Беларусь. Не менш небяспечныя іншы раз былі і простыя перамяшчэнні лаяльных уладам казацкіх атрадаў, іх пастоі. Баркулабаўскі летапіс паведамляў: «У годзе ад Божага нараджэння 1603. Былі казакі запарожскія з нейкім гетманам Іванам Куцковічам. З ім было казакаў 4 тысячы. . . У месцы Магілёве Іван Куцка склаў з сябе казацкае гетманства, бо ў войску стала вялікае свавольства: што хто захоча, тое і робіць. . . Казакі былі на пастоі ў Полацку, Віцебску, Оршы, Мсціслаўі, Крычаве, Магілёве, Галоўчыне, Рэчыцы, Любечы, Чачэрску, Гомелі, Быхаве, Рагачове і па ўсіх іншых месцах. . . Калі казакі запарожскія адсюль на ніз выязджалі, дык вельмі шкодзілі па вёсках і местах: жанчын, дзяўчат і падлеткаў многа з сабой забіралі, і коней шмат з сабой пабралі. На кожнага казака прыходзілася па 8, 10, 12 коней, 3—4 падлеткі, 2—3 жанчыны і дзеўкі»[8].

Блізкасць Буда-Кашалёўшчыны да граніцы з Расіяй (яна ў пачатку XVII ст. праходзіла па рэчышчы Сожа каля вёсак Падлужжа, Сябровічы, Шапатовічы), безумоўна, трывожыла жыхароў нашага краю ў час паходаў самазванцаў (1604—1609) і войскаў Рэчы Паспалітай у Расію (1609—1613). Толькі пасля Дэулінскага перамір'я (1618) граніца была перанесена далей на ўсход, да Дзясны.

Аднак нядоўга жыхары Буда-Кашалёўшчыны жылі адносна спакойна. Ужо ў 1648 г. на Украіне і ў Беларусі ўспыхнула магутнае народнае антыфеадальнае паўстанне, якое каштавала велізарных ахвяр беларускаму народу.

Для падтрымкі паўстанцаў Беларусі, а таксама для таго, каб забяспечыць Украіне бяспеку ад магчымага паходу шляхецкага войска з Беларусі, Багдан Хмяльніцкі неаднаразова прысылаў сюды буйныя казацкія злучэнні. Звычайна гэтыя атрады пранікалі праз Лоеўскую пераправу і далей на поўнач накіроўваліся да Рэчыцы, дзе разыходзіліся тры дарогі — на Гомель, Мазыр—Тураў і на Бабруйск. Такім чынам, усе атрады, якія ішлі на поўнач ад Рэчыцы, праходзілі паблізу Буда-Кашалёўшчыны і, натуральна, не маглі не з'яўляцца на яе тэрыторыі.

Ужо летам—восенню 1648 г. на Беларусі дзейнічалі атрады Галавацкага, Галоты, Нябабы і іншых вядомых казацкіх палкоўнікаў[9]. Распаўсюджваліся і падпісаныя Б.Хмяльніцкім універсалы з заклікам «тамашнім людзям» ад «Гомля и за Днепр аж до Борисова и далей, до Быхова теж, Могилева и далей» паднімацца на барацьбу супраць прыгнятальнікаў[10]. І заклікі, і казакі шмат разоў узмацнялі накал барацьбы, павялічвалі колькасць мясцовых паўстанцаў.

У непасрэднай блізкасці да Буда-Кашалёўшчыны адбылося шмат буйных бітваў. Так, летам 1648 г. пад Рэчыцай было разгромлена шляхецкае войска пад камандаваннем Валовіча, пад Горвалем — злучэнне на чале з Мірскім. Да восені 1648 г. казацка-сялянскімі атрадамі былі ўзяты ўсе бліжэйшыя да Буда-Кашалёўшчыны гарады і крэпасці — Гомель, Рэчыца, Горваль, Чачэрск, Стрэшын. Мясцовая шляхта, каталіцкае і уніяцкае духавенства збеглі, ратуючыся ад расправы. Але ўжо восенню 1648 г. назначаны гетманам Януш Радзівіл пачынае контрнаступленне. Буйная бітва, якая закончылася паражэннем паўстанцаў, адбылася ў чэрвені 1649 г. пад Чачэрскам, куды з Рагачова, дзе знаходзіліся асноўныя сілы Радзівіла, прыбылі яго войскі.

Да сярэдзіны лета 1649 г. гетману ўдалося ўзяць пад свой кантроль усю Беларусь. Усмірэнне паўстанцаў суправаджалася масавымі пакараннямі —

не шкадавалі нават жонак і дзяцей паўстанцаў[11]. Першы этап вайны завяршыўся цяжкім паражэннем казацка-сялянскага войска пад Лоевам 31 ліпеня 1649 г., і толькі падпісанне Збораўскага дагавору паміж Рэччу Паспалітай і казакамі спыніла паход шляхецкіх атрадаў на Украіну.

Другі ўсплёск ваенных дзеянняў прыпадае на сярэдзіну 1651 г., калі Б.Хмяльніцкі зноў накіраваў казацкія атрады на Беларусь. Але паход злучэння Забелы на Гомель ужо не меў асаблівага поспеху. Не ўзяўшы горад, казакі адступілі. На гэты раз ім не ўдалося выклікаць усеагульнае паўстанне мясцовага насельніцтва. Жорсткае паражэнне казакі зноў пацярпелі пад Лоевам, дзе 6 ліпеня 1651 г. было разгромлена злучэнне Марціна Нябабы. І хоць асобныя казацкія загоны працягвалі яшчэ дзейнічаць да сярэдзіны верасня (яны былі выведзены паводле Белацаркоўскага дагавору 18.9.1651 г.), шырокай падтрымкі стомленае ад войнаў мясцовае насельніцтва ім не аказвала.

Тры гады войнаў і паўстанняў натуральна не абышлі бокам і Буда-Кашалёўшчыну. Мясцовае сялянства актыўна ўдзельнічала ў барацьбе. Яно павінна было карміць ваюючыя арміі. І на яго, зразумела, абрушыліся рэпрэсіі.

Але не паспела Беларусь перавесці дух, як вясной 1654 г. пачалася новая, яшчэ больш жудасная вайна паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай 1654—1667 гг. І зноў паўднёва-ўсходняя Беларусь апынулася ў зоне дзеяння казацкіх войскаў, якія ўзначаліў саратнік Б.Хмяльніцкага Іван Залатарэнка. Зноў былі ўзяты бліжэйшыя да тэрыторыі сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна крэпасці, зноў на плечы мясцовага сялянства лёг вялікі цяжар — карміць чужое войска, якое да таго ж не вызначалася сваімі паводзінамі. Узначаліў яго казацкі палкоўнік Іван Нячай, які замяніў загінуўшага ў 1655 г. І.Залатарэнку. Рускія войскі і казакі занялі ўсю тэрыторыю Беларусі, але кантраляваць яе ім было не пад сілу. У краіне расла незадаволенасць, разгортваўся партызанскі рух, які дасягнуў вялікага размаху ў паветах, што межавалі з Рэчыцкім, Магілёўскім і Мсціслаўскім паветамі. На бок незадаволеных новай уладай перайшоў атрад Дзяніса Мурашкі, аднаго з нячаеўскіх камандзіраў. І хоць тэрыторыя Буда-Кашалёўшчыны ў цэлым не ўваходзіла ў зону дзеянняў загонаў Дз.Мурашкі, асобныя сёлы несумненна цярпелі як ад рабаўніцтва рускіх войскаў, так і ад казакаў[12]. У пачатку 1660-х гадоў, у выніку ўзмацнення партызанскага руху і каардынацыі сіл Рэчы Паспалітай, рускія войскі пачынаюць страчваць свае заваёвы, і, згодна з заключаным у 1667 г. Андрусаўскім перамір'ем, граніца зноў наблізілася да Сожа[13].

Вынікі вайны былі цяжкімі для беларускага народа. Насельніцтва зменшылася больш як у два разы (з 2,9 млн. да 1,4 млн. чал.). Вялікія страты пацярпеў і Рэчыцкі павет — яго насельніцтва скарацілася з 30 394 да 11 804 чалавек, г. зн. на 61,2%[14]. Частка насельніцтва загінула, частка перасялілася — добраахвотна або прымусова. На вызваленыя землі, спустошаныя вёскі ў сваю чаргу перасяліліся выхадцы з іншых месцаў, часцей за ўсё з яшчэ больш разбуранай Украіны. Магчыма, у гэты час на Буда-Кашалёўшчыне з'явілася вёска Гаўлі, назва якой мае ўкраінскае паходжанне («варона, рассеяны, наіўны чалавек»)[15].

Падзеі сярэдзіны XVII ст. аказалі ракавое ўздзеянне і на Рэч Паспалітую ў цэлым. Пачынаецца і паскараецца палітычны, эканамічны і ваенны ўпадак гэтай дзяржавы.

Падзеі Паўночнай вайны пачатку XVIII ст. значна менш уздзейнічалі на жыхароў Буда-Кашалёўскага краю. Па дарозе праз Прапойск (сучасны Слаўгарад), Чачэрск і Гомель праходзілі расійскія войскі пад камандаваннем

А.С.Меншыкава пасля перамогі над шведамі пад Лясной, не затрымаўшыся тут. У далейшым, аж да 1812 г., бурныя палітычныя падзеі абыходзілі раён. Палітычная гісторыя рэгіёну вызначыла і асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця. Перыяды стабільнасці чаргаваліся з дзесяцігоддзямі спаду (1648 — сярэдзіна 1660-х гадоў; канец XVII — другое дзесяцігоддзе XVIII ст.). Адпаведна хісталася і шчыльнасць насельніцтва, велізарную большасць якога складалі сяляне. Асноўным заняткам мясцовага сялянства было земляробства і жывёлагадоўля, дадатковым — пчалярства, збіральніцтва і некаторыя віды промыслаў (галоўным чынам лясныя).

Неабходнасць займацца промысламі дыктавалася вялікай лясістасцю рэгіёну і не вельмі спрыяльнымі для земляробства глебамі. У сярэдзіне XVIII ст. буйныя лясныя масівы цягнуліся ад Дняпра і Сожа, пакідаючы больш або менш бязлеснай толькі сярэдзіну тэрыторыі сучаснага раёна. Уздоўж яго цяперашняй паўднёвай мяжы цягнуліся балоты.

Сацыяльна-эканамічнае становішча мясцовага сялянства ў мірны час вызначалася праводзімай у XVII — XVIII ст. ва ўсходняй Беларусі валочнай рэформай. Тут яна мела шэраг істотных асаблівасцей, але незалежна ад гэтага галоўная мэта рэформы — павышэнне прыбыткаў маёнткаў — захавалася. Складаная палітычная абстаноўка і блізкасць дзяржаўнай мяжы вымушалі ўлады пачаць яе пазней і праводзіць марудна і непаслядоўна. Да канца XVIII ст. было зроблена прыкладнае «ўраўнаванне грунтоў» (г. зн. участкаў) і назначаны новыя павіннасці і грашовыя выплаты. Адзінкай абкладання павіннасцямі стала не валока, а больш звычная для мясцовага насельніцтва служба. Па разліках польскага гісторыка Г. Лаўмяньскага, служба складала 30 моргаў (1 валока або 21, 36 га) ворнай зямлі. З гэтага ўчастка патрэбна было плаціць 20 грошаў (згодна з універсалам, прынятым на Люблінскім вольным сейме ў 1569 г.)[16]. У прыватнаўласніцкіх маёнтках павіннасці насілі ў асноўным комплексны характар. Яны складаліся з грашовай (чынш), натуральнай (дзякла, мезліва) і адпрацоўчай (прыгон) рэнты. Памер паншчыны ва ўсходняй Беларусі быў некалькі ніжэйшы, чым у цэнтры і на захадзе (2 дні ў тыдзень са службы ў магнацкіх і 2—3 дні — у шляхецкіх маёнтках). Штотыднёвая паншчына дапаўнялася сезоннай (гвалты, талокі, згоны) — работамі па зборы ўраджаю, на сенакосе, па рамонту млыноў, плацін і г. д. Памеры экстраардынарных павіннасцей хісталіся ад 6 да 28 дзён у год[17]. У натуральны аброк уваходзілі прадукты земляробства, жывёлагадоўлі, пчалярства, збіральніцтва (сушаныя грыбы, ягады), сельскіх промыслаў (пянька, пража, сеці і інш.). Асноўную ролю адыгрывала збожжа (60—75% агульнага кошту). Чынш устанаўліваўся з памеру зямельнага ўчастка з улікам якасці глебы. У цэлым, па падліках беларускага гісторыка П.А.Лойкі, кошт усіх павіннасцей у грашовым эквіваленце ў сярэдзіне XVI ст. складаў 88,1 гроша (для цяглых сялян 49% — прыгон, 38% — дзякла і мезліва і 13% — чынш). Да сярэдзіны XVII ст. яны выраслі да 558 грошаў (22% прыгон, 49% — дзякла і мезліва і 29% — чынш). У першай палове XVIII ст. яны ўжо складалі 2080 грошаў (адпаведна 45%, 27%, 28%). Улічваючы падзенне вартасці гроша літоўскага, фіксуецца ўзмацненне эксплуатацыі ў тры разы.[18]

На сучаснай тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна ў XVII — XVIII ст. было прадстаўлена некалькі відаў феадальнага землекарыстання. У канцы XVI — пачатку XVII ст. значная частка рэгіёну становіцца ўладаннем Віленскага каталіцкага біскупства, уваходзячы ў склад яго Стрэшынскага маёнтка. Сярод вёсак маёнтка ўпамінаюцца Губічы, Кашалёва, Марозавічы, Уваравічы. Зямля тут была падзелена на службы,

якія складаліся з 2 сялянскіх дымоў. З кожнай службы збіралі чынш у 40 грошаў і дзякла 1 бочку жыта і 1 бочку аўса (бочка віленская — мера аб'ёму сыпкіх цел, ёмістасць — 452,3 — 407 літраў)[19]. Грашовыя паступленні да 1635 г. са Стрэшынскага маёнтка выраслі ў сем разоў. У маёнтку былі вёскі цяглыя і асадныя (чыншавыя), аднак фальварак створаны не быў і асноўнай павіннасцю і цяглых, і асадных сялян заставаўся чынш (прыгон складаў усяго толькі 3 дні вясной і 3 — летам). Цяглыя плацілі чынш з асобных службаў, асадныя — «агулам» з усяго сяла. У канцы 20 — пачатку 30-х гадоў XVII ст. адміністрацыя адмовілася ад выдзялення цяглых вёсак, усё насельніцтва пераводзілася на чынш. У 1647 г. у Стрэшынскай воласці праходзіць перамерванне зямлі, і асноўнай падатковай адзінкай становіцца валока, а пануючай формай павіннасці застаецца чынш[20].

Частка тэрыторыі раёна заставалася ў гаспадарчым (велікакняжацкім) уладанні (у складзе Гомельскага, Горвальскага, Чачэрскага і, магчыма, Рэчыцкага старостваў). Звычайна гэтыя землі перадаваліся ў карыстанне магнатам і шляхце. Памеры павіннасцей у такіх паселішчах устанаўліваліся іх трымальнікамі з разліку: выплата дзяржаўнай рэнты і атрыманне ўласнага прыбытку. Дзяржава брала з кожнай службы Гомельскага староства 50 грошаў, па 1 бочцы жыта і аўса, па 4 пенязі (1/10 гроша) з кожнага воза сена і іншыя больш дробныя павіннасці. Дзяржаўца [староста ўсяго маёнтка (воласці) або непасрэдны трымальнік усёй зямлі] здаваў па 6 грошаў са службы, па 2 вазы сена і столькі ж дроў, па паўбочкі жыта і аўса. Такім чынам, нормы эксплуатацыі гэтых сялян былі вышэйшыя. У ліку гаспадарскіх уладанняў рубяжа XVI — XVII ст. упамінаюцца Бацунь, Губічы, Марозавічы, Кашалёва і інш. У Чачэрскі маёнтак уваходзіла Рагінь.

Сярод прыватных уладальнікаў на тэрыторыі Буда-Кашалёўшчыны былі прадстаўнікі старашляхецкіх родаў Перасвет-Солтанаў, Фашчаў, Халецкіх, Ліпінскіх, Дарыя-Дзерналовічаў. Многія з іх захавалі свае ўладанні да XX ст. У XVII — XVIII ст. яны таксама праводзяць пераўтварэнні ў маёнтках, выкарыстоўваючы прынцыпы валочнай рэформы. Гэта прывяло да ўзмацнення эксплуатацыі сялян, росту ўдзельнай вагі паншчыны, з'яўленню фальваркаў. Аднак гэтыя пераўтварэнні, як і паўсюдна ва ўсходняй Беларусі, ішлі марудна, непаслядоўна з-за вельмі складанай палітычнай сітуацыі. Фальваркі тут сустракаліся значна радзей, чым на захадзе і ў цэнтры Беларусі.

Паводле даных В.І.Мялешкі, у буйнейшых маёнтках, якія межавалі з тэрыторыяй сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна і ўключалі ў сябе некаторыя яго населеныя пункты (Стрэшынскім у 1759 г., Данілавіцкім у 1765 г. і Гомельскім у 1771 г.), фальваркаў не было[21]. Аднак у прыватнаўласніцкіх дробных і сярэдніх уладаннях яны павінны былі быць (на жаль, дакументаў гэтай эпохі захавалася вельмі мала).

Асартымент культур, якія высяваліся на тэрыторыі раёна, можна прасачыць па даных за другую палову XVIII ст. у Чачэрскім старостве: азімае жыта ад 43 да 33,3%, авёс ад 54,1 да 33,4%, грэчка ад 13,9 да 3,4%. Акрамя таго, у нязначнай колькасці высяваліся ячмень, пшаніца, гарох, каноплі і лён. Ураджайнасць была невысокая, складаючы ва ўраджайныя гады сам — 4 — 5 (для жыта і пшаніцы) сам — 5 — 7,5 (ячмень), сам - 4 — 3 (грэчка); сярэдняя ж значна меншая: жыта сам — 3,5, пшаніца сам — 2,5, ячмень сам — 4,2, авёс сам — 2,2, грэчка сам — 2,4[22].

Даволі нізкая ўраджайнасць тлумачыцца і адносна слабым развіццём жывёлагадоўлі. Так, у другой палове XVIII ст. ва ўсходняй Беларусі прыпадала на двор у сярэднім 2,2 запрэжкі

рабочай жывёлы, 2,6 галавы буйной, 4,2 галавы дробнарагатай жывёлы і 3,3 галавы свіней[23]. У Стрэшынскім маёнтку ў 1759 г. на двор прыпадала ўсяго 1,9 запрэжкі цяглавай жывёлы[24]. Неабходна адзначыць, што ў сярэдзіне — другой палове XVIII ст. сельская гаспадарка ўсходняй Беларусі ўжо ліквідавала вынікі войнаў і знаходзілася на ўздыме.

Асноўным дакументам, які рэгуляваў прававое становішча насельніцтва ў XVII—XVIII ст., быў трэці Статут ВКЛ (1588). Згодна з гэтым Статутам, насельніцтва княства дзялілася на саслоўі — шляхту, духавенства, мяшчан і простых людзей, якія, у сваю чаргу, складаліся з некалькіх груп. На вяршыні саслоўнай лесвіцы знаходзілася шляхта (князі, паны радныя, паны харугоўныя, аселая шляхта (зямяне), неаселая (служылая) шляхта, засцянковая шляхта). Апошняя саслоўная група — засцянковая шляхта — паводле маёмаснага становішчы мала чым адрознівалася ад сялян, мела невялікі

Шляхта XVIII ст. Малюнак Я.Матэйкі.

надзел зямлі і сама працавала на ім. Але шляхецкае саслоўе па прававым статусе рэзка адрознівалася ад простых людзей. Шляхціцы былі асабіста вольнымі, вызваленымі ад падаткаў і павіннасцей (акрамя звязаных з вайной). Толькі яны маглі займаць пасады ў дзяржаўным апараце, вольна прадаваць і купляць зямлю, валодаць сялянамі і г. д.

Асноўная маса сялянства была прымацавана да зямлі. Пастанова Генеральнай канфедэрацыі Варшаўскага сейма 1573 г. давала шляхце права прымяняць да сялян любыя пакаранні аж да смяротнай кары. І толькі ў 1768 г. сейм пастанавіў, што «отнине не только шляхциц за убийство шляхцица и крестьянин за крестьянина должен отвечать головой, но также, если шляхциц злостно и умышленно, а не нечаянно убил насмерть крестьянина, то его осудить на казнь»[25]. Але гэта пастанова шляхтай Рэчы Паспалітай практычна ігнаравалася, тым больш што прыватнаўласніцкія сяляне не маглі прад'явіць іск ні свайму, ні іншаму феадалу-крыўдзіцелю.

Не з'яўляючыся ўласнікамі зямлі, сяляне не мелі фармальнага права распараджацца ёю. Аднак на практыцы яны іншы раз аддавалі частку сваёй надзельнай зямлі ў арэнду, заклад або пастаяннае карыстанне сялянам гэтага ж уладання. Хоць маёмасць сялян, згодна з Уставай на валокі 1557 г., належала землеўладальніку, сваёй рухомай маёмасцю яны маглі распараджацца дастаткова вольна.

Дакументам, які рэгуляваў адносіны паміж феадаламі і іх сялянамі, з'яўляўся інвентар, у якім вельмі падрабязна апісвалася маёмасць селяніна (пабудовы, жывёла, склад сям'і, колькасць зямлі, а таксама падаткі). Пазямельныя і павіннасныя пытанні пры складанні інвентара вырашаліся на месцы, на аснове традыцый. У дробных уладаннях інвентары звычайна складаліся больш рэдка і ва ўладальнікаў заста-

валася вялікая прастора для злоўжыванняў.

На жаль, захавалася вельмі мала дакументаў, якія б больш канкрэтна апісвалі жыццё Буда-Кашалёўшчыны гэтага перыяду. Пасля далучэння да Расіі становішча некалькі змянілася, і назвы мясцовых населеных пунктаў усё часцей сустракаюцца на старонках архіўных матэрыялаў.

Крыніцы:

1. Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32. С. 185–187.
2. Там жа. С. 187–188.
3. Археографический сборник. Вильна, 1867. Т. 2. С. 30.
4. Дулов А.В. Географическая среда и история России. М., 1983. С. 18.
5. Васильев В.Г., Сегал А.Е. История эпидемий в России. М., 1960. С. 41, 54–60.
6. Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии. Конец XIV–1648 г. Мн., 1988. С. 107; Спиридонов М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси. Мн., 1993. Карта «Беларусь в конце XVI в.».
7. Капыскі З. Ю., Капыскі Б. З. Беларуская вёска і яе насельніцтва ў канцы XVI — першай палове XVII ст. //Беларускі гістарычны часопіс. 1993. №2. С. 42.
8. Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997. С. 248–249.
9. Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 26.
10. Там жа. С. 25.
11. Там жа. С. 39–43.
12. Сагановіч Г. Невядомая вайна. Мн., 1995. С. 70–82.
13. Там жа. С. 125–126.
14. Мелешко В.И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. Мн., 1974. С. 65.
15. Жучкевич В.А. Краткий топонимический словарь. Мн., 1974. С. 65.
16. Голубеў В.Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVII–XVIII стст. Мн., 1992. С. 55.
17. Лойко П.О. Феодальная рента в частновладельческих поместьях Белоруссии во второй половине XVI–XVIII стст. //Автореф. На соискание учен. степени канд. историч. наук. Мн., 1984. С. 12–13.
18. Там жа. С. 17–19.
19. Голубеў В.Ф. Сялянскае землеўладанне і землекарыстанне на Беларусі XVII–XVIII стст. Мн., 1992. С. 86.
20. Там жа. С. 87.
21. Мелешко В.И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. Мн., 1975. С. 94–96.
22. Там жа. С. 236–238.
23. Мелешко В.И., Королева Е.Г. Скотоводство в крестьянском хозяйстве Белоруссии во второй половине XVIII в. //Сельское хозяйство и крестьянство Беларуси. Мн., 1991. С. 93, 97–98.
24. Там жа. С. 86.
25. Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1960. Т. 2. С. 259.

В.І.Сычоў.

Дакументы сведчаць

АПІСАННЕ СЕЛЬСКІХ ПАСЕЛІШЧАЎ БУДА-КАШАЛЁЎШЧЫНЫ ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ІНВЕНТАРА ГОМЕЛЬСКАГА СТАРОСТВА

1560 г.

Село Бацуны. Сак Ескович, Олисей Гапонович, Микита Беречич — волов три, кони три, дымы три, служба. Тыеж Сак, Олисей, Микита, другая служба; а под кождою службою сеножатей воз по шести; в том селе дымы три, службы две грунту доброго, сеножатей воз дванадцать. Повинность того села: в каждый год о светом Михале, свята римского, мают давати до скарбу господарского с каждое службы по копе грошей, жита бочку ровную, без верха и нетресеную, овса бочку также ровную, без верха и нетоптаную, то чинить служоб две, коп две, жита бочки две, овса бочки две, з сеножатей от возов дванатцати, од кождого воза сена по чотыри пенязи, то чинить грошей чотыри; за дань медовую здавна платят копу одну; за ловы звериные, яко великого, так и малого звера, и теж куничные, белочные и инные всякие и пташие грошей дватцать; за ловы рыбные и за гоны бобровые ничого давать не повинни, иж их не мают; за езовщину с кождое службы по шести грошей, то чинить грошей дванатцать. Сумма всех платов и доходов господарских с того села коп три, грошей тридцать шесть, пенезей осимь, жита бочки две, овса бочки две. Доходы на державцу с кождое службы жита пол бочки, овса пол бочки тоеж меры, которою на господара его милости мает быти давано, а зособна за кождою копою всякого плату по шести грошей; а надто с кождое

службы по два воза сена, або за кождый воз по три гроши, а по два возы дров. А окром того, што на той уставе описано, никоторых иншых платов, ани подачок жадных, ни на господара его милости, ни на державцу своего, ани на врадников земских и надворных давати не повинни. Граница того села описана быти не могла, иж грунт суместный з селом тыеж волости Гомельское с Тереничи и теж з селми пана Халецкого з Чоботовичи, с Козкевичи и з Чорными. Ловов звериниых, окром переходом, а рыбных и гонов бобровых никторых нет. При том же селе боярин Белко Кожамячич, который мает остров спольный с тым селом Бацуны, на имя Ковпин, одно в дереве бортном отчизну и дедизну свою и с того господару королю его милости конем одним службу земскую служить; якож и подданые господарские о том справу давали, иж тот остров Ковпин отчизна и дедизна его боярская.

Село Губичи. Михал Максимович, Кузьма Остапкович, Оксюта Пилипович, Богдан Остапкович — волы три, конь один, дымы три, служба. Ониско Ермашевич, Павел Гапонович, Гришко Ярошкович, Степан Тишкович — волы чотыри, кони два, дымы чотыри, служба. Устин Кондратович, Иван Онискевич, Сергей Яковович, Овдей Иванович — волы два, дымы чотыри, служба. Федько Дробышевич, Семен Кокорич, Гришко Ходотович, Данило Артемович — волов три, конь один, дымов три, служба; а под кождою службою сеножатей возов по дватцать пfive; в том селе дымов петнацать, служоб чотыри грунту подлого, сеножать воз сто. При том селе пустовщизны — на имя Ивановская, Захиринская, в тых запустело грошей копа одна. Повинность того села: в кождый год о светом Михале, свята римского, мают давати до скарбу господарского с кождое службы по сороку грошей, жита бочку ровную, без верха и нетресеную, овса бочку также ровную, без верха и нетоптаную, то чинить з служоб чотырох коп две, грошей сорок, жита бочок чотыри, овса бочок чотыри, з сеножатей от возов ста од кождого воза сена по чотыри пенези, то чинить грошей сорок; за дань медовую здавна грошьми платят коп семь, пенези чотыри; а зособна платят з острова Еленипкого Гридко Ходотович, Данило Артемович копу одну, грошей тридцать; за ловы звериные, яко великого, так и малого зверу, и теж куничные, белочные и инные всякие и пташие, грошей сорок; за бобровые гоны грошей дватцать; за ловы рыбные копа одна; за езовщину с кождое службы по шести грошей, то чинить з служоб чотырох — грошей дватцать чотыри. Сумма всих платов и доходов господарских с того села коп чотырнатцать, грошей чотырнадцать, пенези чотыри, жита бочок чотыри, овса бочок чотыри. Доходы на державцу с кождое службы жита пол бочки, овса пол бочки тоеж меры, которою на господара его милости маеть быти давано, а зособна за кождою копою всякого плату по шести грошей, а надто с кождое службы по два возы сена, або за кождый воз по три гроши, а по два возы дров. А окром того, што на той уставе описано, никоторых иншых платов, ани подачок жадных на господара его милости, ни на державцу своего, ани на врадников земских, ани надворных давати не повинны. Граница того села: от границы Морозовское, а от ручая Чернятына у Бранков мох, от того моху в реку Днепр, Днепром уверх у Лосинец ручай, тым ручаем уверх у Черемошну речку, тою речкою уверх зася до границы Морозовское и до ручея Чернятына, откуль ся граница почала. Широкость того всего грунту от реки Днепра до Чернятына удолж на две мили, а впоперок от Лосенца речки до Еленского острова на три версты. Ловов звериниых, окром переходом, никоторых нет; ловы рыбные и гоны бобровые на реце Днепре, от речки Лосенца до речки Глушца, одним берегом на две версты.

Село Морозовичи. Иван Юркович, Гаврило Яковович — волов три, кони два, дымы два, служба. Яков Кочанович, Микита Степанович, Демид Смольнянич — волов два, конь один, дымы два, служба, а под кождою службою сеножатей воз по десять; при том селе пустовщизны — Белавищина и Михалевщина, в тых запустело грошей сорок пять; в том селе дымов чотыри, службы две грунту доброго, сеножатей воз дватцать. Повинность того села: в кождый год о светом Михале, свята римского, мают давати до скарбу господарского с кождое службы по копе грошей, жита бочку ровную, без верха и нетресенную, овса бочку также ровную, без верха и нетоптаную, то чинить з служоб двох коп две, жита бочок две, овса бочок две; з сеножатей от воз дватцати, от кождого воза сена по чотыри пенязи, то чинить грошей осемь; за дань медовую здавна грошьми платят копу одну, грошей петнадцать; за ловы звериные, яко великого, так и малого звера, и теж куничные, белочные и инные всякие и пташие грошей тридцать; за ловы рыбные и гоны бобровые ничего платить не повинни, иж их не мают; за езовщину с кождое службы по шести грошей, то чинить дванадцать. Сумма всих платов и доходов господарских с того села, коп чотыри, грошей пять, жита бочок две, овса бочок две. Доходы на державцу: с кождое службы жита пол бочки, овса пол бочки тое меры, которою на господара его милости мает быти давано; а зособна за кождою копою всякого плату по шести грошей, а над то с кождое службы по два

возы сена, або за кождый воз по три гроши, а по два возы дров. А окром того, што на той уставе описано, никотрых инших платов, ани подачок жадных, ни на господара его милости, ни на державцу своего, ани на врадников земских и надворных давати не повинни. Граница того села описана быти не могла, иж грунт суместный з селом тоеж волости Гомельское з Кошелевом; ловов зверинных, окром переходом, а рыбных и гонов бобровых никоторых нет.

Село Кошелево. Опанас Старц и Осип Булизичи – волов чотыри, кони чотыри, дымы два, служба, вольная на старценство; Хрол Хомич, Радко Коленикович, Овсей Наумович – волов чотыри, кони два, дымы два, служба; Ничипор Иванович, Мишко Козакович, Гридко Данилович – волов два, кони два, дымы три, служба; Федько Голвинович, Амелиан Турчин, Мина Микитич, Янко Макавович – волов шесть, коней пять, дымы чотыри, служба; а под кождою службою сеножатей воз по петнацать. При том селе пустовщизны на имя Хлусовская, Пашковская, Гвоздовская, Дербиниская, в тых запустело. В том селе дымов дванацать, службы чотыри, а з старцовою службою грунту доброго, сеножати воз сорок пять, окром старцовое сеножати. Повинность того села: в кождый год о светом Михале, свята римского, мают давати с кождое службы по копе грошей, жита бочку ровную, без верха и нетресеную, овса бочку ровную, также без верха и нетоптаную, то чинить з служоб трех коп три, жита бочки три, овса бочки три, окром старцовое службы вольное; з сеножати от возов сорока пети, от кождого воза сена по чотыри пенези, то чинить грошей, осимнатцать; за дань медовую здавна грошьми платят коп чотыри, грошей дватцать семь; за ловы зверинные, яко великого, так и малого зверу, и теж куничные, белочные и инные всякие и пташие грошей тридцать; за ловы рыбные и за гоны бобровые ничого давати не повиннии, иж их не мают; за езовщину с кождое службы по шести грошей, то чинить з служоб трех грошей осимнатцать. Сумма всих платов и доходов господарских с того села: коп осимъ, грошей тридцать три, жита бочок три, овса бочок три. Доходы на державцу: с кождое службы жита пол бочки, овса пол бочки тоеж меры, которою на господара его милости мает быти давало, а зособна за кождою копою всякого плату по шести грошей, а надто с кождое службы по два возы дров, а по два возы сена, або за кождый воз по три гроши. А окром того, што на той уставе описано, никоторых инших платов, ани подачок жадных, ни на господара его милости, ни на державцу своего, ани на врадников земских, и надворных давати не повинни. Граница того села: от границы Дуравицкое, от ручая Боянского у речку Ульбячу, с тое Ульбячи у Нелицкое болото при границы села Чечерского Дудицкого, с того болота у Волесцы лес, от того леса через речку Глину у Сожский ручай; тым ручаем уверх у Улибячу речку, Улибячою уверх, в реку Доброшу, от Добруши через речку Радогоскую, у Нощ болото, с того болота у Березницу речку, от Березницы зася до ручея Боянского, откуль ся тая граница почала. Широкость того всего грунту, от Нелицкого болота до болота Нощи, вдолж на чотыри версты, а вноперок от Боянского ручея до Осец леса на две версты; а зособна обруб суплетный з Морозовичи вдолж на пол мили, а впоперок также на пол мили. Ловов зверинных, окром переходом, а рыбных и гонов бобровых никоторых нет. Тыеж подданые мают остров на имя Усожский борок, спольный з селом Чечерским, з Липиничи, другой остров Счеников мают в грунте сел тоеж волости Гомельское, в Бобовицком и Волковыцком. При том селе церковь заложенья светого Михала; при той церкви поп Хилимон держит землю Петровщину здавна на тую церковь, и мы тую землю по старому при той церкви зоставили, якож и подданые господарские сознавали, иж тая земля здавна на тую церковь надана.

Село Уваровичи. Сидор Петрович з братьею, Гришко Переятич – волы чотыри, кони чотыри, дымы два, служба; Данило а Дарошко Артемовичи – волов чотыри, кони чотыри, дымы два, служба; Гришко Грикович, Гринь Малеевич – волов три, кони два, дымы два, служба. Андрей Малишевич, Гаврило Скородко – вол один, конь один, дымы два, служба. Митко Василевич, Иван Карпович, Игнат Кривей – вол один, кони два, дымы три, служба; а под кождою службою сеножатей воз по десять. В том селе дымов одинацать, служоб пять, грунту доброго, сеножати воз петдесят. При том селе пустовщизны, на имя Ходиковская, Севроковская, Сиротчина, Окулинская, Волужинщина; в тых залегло коп две, грошей сорок семь. Повинность того села: в кождый год о светом Михале, свята римского, мают давати до скарбу господарского с кождое службы по копе грошей, жита бочку ровную, без верха и нетресеную, овса бочку также ровную, без верха и нетоптаную, то чинить с служб пяти коп пять, жита бочок пять, овса бочок пять; з сеножатей от воз петидесят, от кождого воза сена по чотыри пенези, то чинить грошей дватцать; за дань медовую здавна грошьми платят коп семь, грошей тридцать чотыри; за ловы зверинные, яко великого так и малого зверу и теж куничные, белочные и инные всякие и пташие копа одна; за бобровые гоны грошей дватцать; за ловы рыбные ничого давати

не повинни, иж их не мают; за езовщину с кождое службы по шести грошей, то чинить с служоб пяти грошей тридцать. Сумма всих платов и доходов господарских с того села коп четырнадцать, грошей тридцать чотыри, жита бочок пять, овса бочок пять. Доходы на державцу: о кождое службы жита пол бочки, овса пол бочки тоеж меры, которою на господара его милости мает быти давано, а зособна за кождою копою всякого плату по шести грошей, а надто с кождое службы по два возы сена, або за кождай воз по три гроши, а по два возы дров. А окром того, што на той уставе описано, никотрых инших платов, ани подачок жадных, ни на господара его милости, ни на державцу своего, ани на врадников земских и надворных давати не повинни. При том селе боярин Пронко Остапович держал землю за листы врадовыми, на имя Оздрозовщину, Ровковщину, Марковщину а Сомсоновщину, в которых земли пашное грунту доброго и з зарослями бочок на петнацать, с которых земль до того часу никоторого плату до скарбу господарского не платил, нижли с теперешнего нового постановенья мает в кождый год до скарбу господарского давати с кождое бочки земли за чинш, за жито, за овес по два гроши, по пять пенезей и по одном трети пенезя, то чинить грошей тридцать осимь. При том селе остров на имя Гусевицкий, который держит боярин Гомельский Пронко Остапкович за листы врадовыми, а теперь тот остров приняли подданые господарские того села на имя Свирид а Сидор Ивановичи, и мают з нее плату в кождый год до скарбу господарского давати грошей сорок. При том селе церковь заложенье светое Пречистое, при той церкви поп на имя Михайло ку той церкви никоторых земль не мает. Граница того села: от речки Белицы болотом Кобылим в речку Хочемлю, от речки Хочемли ручаем уверх до реки Узы, через реку Узу при границы Кошелевской, села тоеж волости Гомельское, в речку Березницу, речкою Березницою уверх у болото Сущее, з болота логом у лог Любеняковец, от Любини логом до Чистое лужи, от Чистое лужи до речки Колинца, Колинцою вниз до логу Ижинца, з Ижинца у курган Теребенив, от кургана дорогою у конец другое Чистое лужи, от Чистое лужи у Мезлики, от Мезликов у Волковино селище, от того селища до границы Белицкое и зася до болота Кобыльего откуль ся граница почала. Широкость того всего грунту: од Кобыльего болота до лугу Узында удолж на осьмь версты, а впоперок от тогож болота Кобыльего до речки Хочемли также на осемь верст; ловов зверинных, окром переходом, и рыбных никоторых нет; гоны бобровые на реце Узе, от границы Белицкое до речки Белизлиницы, одним берегом на две версты. Тыеж подданые мают остров на имя Еленцы спольные з селом Губичом, другий остров, на имя Берестан, межи грунтов волости замку господарского Речицкого села Заспы и теж межи селом волости Гомельское Волкович и Теменевич. При том селе держит за листом его королевское милости остров Дуровицкий пять пустовщизн боярин Гомельский Ян Фащ; дано ему самому, жоне и детем его мущизного плоду.

Люди волости Гомельское новорозданные. . . Пану Василю а пану Андрею Халецким дано у в одном обрубе сел чотыри, то есть: Чоботовичи, Засовье, Кольскевичи а Чорные, человеков петдесят. Широкость того всего грунту удолж на шесть миль, а впоперок на чотыри мили, индей ширей, индей ужей; листов данины господарское на тые села не оказано, иж сами панове Халецкие на тот час у Гомли не были за послугою господарскою и земскою военною.

АПІСАННЕ СЁЛ БУДА-КАШАЛЁЎШЧЫНЫ ПАВОДЛЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ІНВЕНТАРА ГОМЕЛЬСКАГА СТАРОСТВА

1560 г.

Село Бацуны. Граница того села описана быти не могла, их грунт сумесной з селом тыех волости Гомельское с Тереничи и тех с селами пана Халецкого з Чоботовичи, з Козкевичи и з Черными. Ловов звериных, окром переходом, а рыбных и гонов бобровых никоторых нет.

Село Губичи. Граница того села: от границы Морозовское, а от ручая Чернятына у Бранков мох, от того моху в реку Днепр, Днепром уверх у Лосинец ручай, тым ручаем уверх у Черемоину речку, тою речкою уверх зася до границы Морозовское и до ручей Чернятына, откуль ся граница почала. Широкость того всего грунту от реки Днепра до Чернятына удолж на две мили, а впоперок от Лосенца речки до Еленского острова на три версты. Ловов зверинных, окром переходом, никоторых нет; ловы рыбные и гоны бобровые на реце Днепре, от речки Лосенца до речки Глущца, одним берегом на две версты.

Акты, издаваемые Виленскою Археографическою комиссиею. Т. XIII. Акты Главного Литовского Трибунала. Вильна, 1886. С. 366—371, 376.

ВЫПІС З КНІГ РЭЧЫЦКАГА ГАРАДСКОГА СУДА АБ ПСАВАННІ БОРТНЫХ ДРЭЎ СЯЛЯНАМІ ЦАРКОЎНАГА МАЁНТКА СТРЭШЫН НА ЗЕМЛЯХ ЗЯМЯНІНА П. ВАРОНЫ КАЛЯ ГУБІЧ

1 верасня 1585 г.

Прыеждчал до враду замку г[оспо]д[а]рского Речицкого, до м[е]не, Яроша Жижемского, старосты речицкого, земянин г[оспо]д[а]рскии повету Речыцкого пан Павел Андреевич Ворона, оповедаючы и обтежливе жалуючы на подданых каноников капитулы костела головног[о] Виленског[о] светог[о] Станислава Стрешинских, сел обеюх Лобских, именем: на Артема а Костея и Хилька Якимовичов, Трухона а Ивана Куряновичов, Дешка Ермолича, на Саву з братом его Капустичов, на Кузму а Филю з братом Заичычов, Хилимона Ермаковог[о] сына, Климаша, Степана и Давыда Колыбичов, на Василя и сына его, Ивана Татарыновича, на Кузму з братом его Гаврылом и з сыном Толокович[а], а на Матфея з братею Тонконоговичов и иных мужов тых сел обудвух Лобских о том иж деи в року теперешним, осмдесят пятом, м[еся]ца августа двадцат осмог[о] дня, з многими деи помочниками своими тые подданые стрешинские, выш мененые, нашодшы моцно кгвалтом на остров его Еленскии, лежачыи при кгрунтех села г[оспо]д[а]рского Гомелског[о] Губич, у повете Речыцком, не маючы деи до тог[о] острова жадных уходов, а ни уступ, выдрали своволне пчол в дереве бортном роев — 31 рои и, сосну одну выдравшы, пчолы сожгли.

И просил м[е]не пан Павел Ворона о приданае возног[о] на огледане подраня тых пчол у вострове его помененом Еленским от тых подданых поименених стрешинских.

Ям ему в недостатку возных на тот час, прыдал на то служебника своего Яна Бутянского, который там, в том острове его бывши и тог[о] подранья пчол огледавшы, перед м[е]не прышодшы, сознал тыми словы, иж деи за прыданеи вашои м[и]л[о]сти пана моего был есми о паном Павлом Вороною у вострове его Еленьском и виделом за оказаньем его пчол свежовыдраных у дереве бортном в соснах и в дубех роев — 31 рои и сосну одну сожженую.

Которое подранье пчол менил пан Павел Ворона от подданых стрешинских обеюх сел Лобских, и просил пан Павел Ворона, абы яко оповеданье его, так и того слуги моего сознане, до книг кгродских речицких было записано. Што я, прынявшы ку ведомости моей врадовои, до книг кгродских записати велел, на што и выпис с книг под печатю моею пан Павел Ворона собе взял. Писан в Речыцы.

Социально-политическая борьба народных масс Белоруссии (конец XIV в. — 1648 г): Сб. документов и материалов в 3 томах. Мн., 1988. Т. I. С. 107.

З ДОПЫТАЎ КАЗАКАЎ, ЯКІЯ ЎЦЯКЛІ Ў РАСІЮ З РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

8 лютага 1638 г.

Февраля в 15 день перешли на государево царево и великого князя Михаила Федоровича всеа Русии имя в Севеск из литовской стороны Микитка Васильев, Адамка Павлов. Микитка Васильев в роспросе оказался из черкас холост, а служивал де с казаки в Запорогах да и на королевских де службах бывал, и жалованья королевское имывал с казаки вряд по полтора рубли на месец, коли на службах бывал. А Одамка в роспросе сказался Гомельского уезду, живал в селе Кошелеве, а послужил де в черкаских городках у казаков в товарищах в казацких.

Воссоединение Украины с Россией. Документы и материалы в 3 томах. Т. 1. М., 1954. С. 185, 188.

З АНАНІМНЫХ ПАВЕДАМЛЕННЯЎ АБ ДЗЕЯННЯХ ПАЎСТАЎШЫХ КАЗАКАЎ НА УКРАІНЕ І ПАЎДНЁВЫМ УСХОДЗЕ БЕЛАРУСІ, У т. л. У НАВАКОЛЛЯХ ГОМЕЛЯ, РЭЧЫЦЫ, ГОРВАЛЯ, СТРЭШЫНА І ЖЛОБІНА

9 жніўня 1648 г.

Из Чернигова. Захватив замок путем измены, перебили там казаки свыше 180 человек шляхты значительной. Некоторые шляхтичи имели при себе свыше 100 челядников. Урядников земских, ротмистров и отборных солдат до 30, всех их, а также жен и детей перебили. Посылаю список погибших. Из Чернигова и отовсюда переносят пушки в Новгород, а казну — в Гомель. [Повстанцы] удерживают за Днепром Гомель, Стародуб, Чичерск, Новгород, Чер-

нигов, штурмуют Кричев, а Пропойск не сможет устоять. А с этой стороны [повстанцы] осадили Любеч, Лоев, Халмеч, Речицу, Горволь, Стрешин, Слоним [Жлобин]. Рогачев не сможет оборониться и не задержатся [повстанцы] в Новом Быхове.

Чернигову 1300 лет: Сборник документов и материалов. Киев, 1990. С. 36.

ЛІСТ НАКАЗНОГА ГЕТМАНА І. ЗАЛАТАРЭНКІ ЦАРУ АЛЯКСЕЮ МІХАЙЛАВІЧУ АБ АСАДЗЕ КАЗАКАМІ ГОМЕЛЯ І БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ У РЭЧЫЦЫ, ЖЛОБІНЕ, СТРЭШЫНЕ, РАГАЧОВЕ, ГОРВАЛІ

1654 г.

Божиею милостию, великому государю царю и вел. кн. Алексею Михайловичю. . . Иван Микифорович, гетман наказной от е. м. пана Богдана Хмелницкого, гетмана Войска Запорожского, и слуга в. ц. вел. со унижением челобитный мой поклон под ноги в. ц. вел. со всем Войском Запорожским, яко верный и желательный, смиренно отдаюсь.

Нынешняго году 14 дня июля отдана нам есть грамота в. ц. вел. чрез гонца, подьячего Якова Портомоина, в которой объявляти в. ц. вел. изволил суть, что великому государю нашему, в. ц. вел., городы Дорогобуж, Невль, Белая, Полоцк, Рославль добили челом и веру в. ц. вел. шляхта, служилые, и мещане, и уездные всякие люди на верное подданство, по святой евангельской заповеди, учинили; и в. ц. вел. пришодшы под Смоленск, с помощию бога всемогущего, около него промышляешь, и до Януша Радивила бояр и воевод в. ц. вел. со многими ратными людми, чтобы около него и около людей, ратных, при нем будучих, промышляти, росказати изволил есть: за что мы желательные и верные поданные вашего ц. вел., благодарим бога всемогущего, в троице святой единого, иже он за поклонением нашим, в. ц. вел. многих, християн, в высокой своей милости, до узнания правды и до отдания челобитного поклону и подданства в. ц. вел. приводити и покаряти изволил.

Того ж бога всемогущего, в троице святой единого, усердно молим, чтобы короли, княжата, места силные и недобытые в. ц. вел., помазаннику божию, вскоре прилучить, чтобы счастьем в. ц. вел. всякий народ нигде отстоятися не мог, приятно от сердца желаем и верне хотим. По росказанию в. ц. вел. шли есмя с Войском Запорожским, при мне будучем, на Гомель, в котором на заставе от ляхов стоит ратных людей не мало, как я чрез Петра Забелу до в. ц. вел. писал, в замку велми оборонном, стрелбы и порохов и запасов немало имеючих; до которых писали есмя имянем в. ц. вел. и Богдана Хмелницкого, гетмана Войск Запорожских в. ц. вел. На что они гордо и сурово до нас отписали, которых листы в. ц. вел. отсылаем.

А мы, выразумевши из тех листов, что когда их тут оставим не добывши, всей Литве и войскам их сердца и смелости додадут.

Те ж неприятели, по отступлению нашему, выпадши из тое ямы разбойничиския, с того голоду, как есмя их принудили и из пушек надбили, в наши край впадши, жон и детей наших живых, пускати не будут и места в. ц. вел. украинные испустошат. Стоячи под тем Гомлем, посылали есмя в загоны, которые по той там стороне Днепра замки и места поймали, и под мечь непослушные, а города, которые нам шкоды прежде чинили, попалити велели есмя, особный замок Речицкий, замок Злобин, замок Стрешин, замок Рогачев, замок Горволь позжено.

Волощаня, как речицкие, гомельские, такожде и селяне тех мест, которые по лесах крылися, счастьем в. ц. вел. поклонилися и от нас листы взяли, имеют в наши города итти на житье. В том же листу в. ц. вел. указ нам итти с Тимофеем Ивановичем Спасителевым под Смоленеск, чего мы, яко желает елень на источники водные, так мы желаем в. ц. вел. служити;однако ж тех, врагов наших, позадь нас будучих, есть дело велми не безотрадное оставить.

Имеем ожидати ведомости от в. ц. вел. через Петра Забелу, который, как скоро принесет, так того ж часа на услугу в. ц. вел. рушимся, и в дороге прямо идучи, нигде не замешкаем; а тем времянем около тех осадных, голодом принуженых и снарядом надгубленных, вземши господа бога на помоць, счастьем в. ц. вел. около их промышляти будем. Со унижением тогда в. ц. вел. челом бьем: не изволь, в. ц. вел., на нас имети зазле: понеже жены и дети наши оплакали бы нас, естли бы есмы тех неприятелей наших живых пустити имели. На останок, гонец в. ц. вел. Яков Портомоин присмотрелся, каков имеем около их промысел, то отдаст словесно и пространнее в. ц. вел. извещение; толко господь всемогущий во всем да поможет нам, счастьем в. ц. вел.

При том дай, Христе, царю, чтоб есмя в. ц. вел. в добром здоровье во всяких радостных потехах победителем над неприятелми счастливо государе твуючего, долголетне зрети могли.

Дан из табору под Гомлем июля 15 дня от рождества христова 1654. В. ц. вел. наинижайший слуга и верный подданный. Иван Микифорович, гетман наказный от Богдана Хмелницкого, гетмана Войск Запорожских в. ц. вел.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. СПб., 1889. Т. 14. С. 135—138.

У ліхалецці шведскага нашэсця

У час Паўночнай вайны Пётр I і яго генералы ажыццяўлялі ў Беларусі ў барацьбе са шведамі тактыку, прынятую яшчэ ў 1706 г. на ваенным савеце ў Жолкве. Акадэмік Я.В.Грэкаў у манаграфіі «Паўночная вайна» прыводзіць гэты план: «...давать ли с неприятелем баталии в Польше или при своих границах, где положено, чтобы в Польше не давать: понеже, ежели б какое несчастие учинилось, тобы трудно иметь ретираду; и для того положено дать баталию при своих границах, когда того необходимая нужда требовать будет; а в Польше на переправах и партиями, так же оголоженьем провианта и фуража, томить неприятеля...»

Такія нападзенні «партиями» — невялікімі атрадами, часцей за ўсё коннымі, а часам і коннымі, і пешымі — у выніку вельмі «томили» шведскага агрэсара і да Лясной, і пасля Лясной.

Страты шведаў ад налётаў нерэгулярнай конніцы і расправа сялян з тымі, хто адставаў, памяншалі колькасць шведскай арміі. 7 ліпеня 1708 г. з Мінска Карл XII падышоў непасрэдна да межаў Расіі. Фуражу і правіянту ў яго было ўсяго на тры месяцы. Але і на гэты тэрмін іх не вельмі хапала, і арміі давялося «подголодавать» яшчэ да Магілёва. Шведы лічылі, што іх жадаюць «оголожевать» разбурэннем мясцовасці па шляху адыходу рускай арміі. Але яны не ўлічвалі, што па абодва бакі дарогі былі месцы, якія руская конніца не закранула і не магла б закрануць, бо не было ні часу, ні сіл. Таму была падстава спадзявацца на добраахвотны падвоз і продаж прадуктаў з гэтых аддаленых вёсак, да якіх адносіліся і вёскі Буда-Кашалёўшчыны. Але тут ужо пачалася народная барацьба супраць агрэсара. У Літве сяляне яшчэ дастаўлялі шведскай арміі прадукты, у Беларусі ні за грошы, ні насіллем амаль нічога здабыць было немагчыма. Значыць, разлічваць трэба было выключна на свой уласны абоз.

...Карл XII працягваў рух да рускай мяжы... Правіянту і фуражу заставалася вельмі мала. Змардаваным, някормленым коням не заўсёды было пад сілу выцягваць з беларускіх балот артылерыйскія гарматы. Паўсюдна распаўсюджваліся цяжкія страўнікавыя захворванні... Шведы жорстка рабавалі беларускае насельніцтва, катавалі сялян, вымагаючы ў іх звесткі аб схаваным збожжы.

Кастрычнік 1708 г. быў асабліва цяжкі для жыхароў Буда-Кашалёўшчыны. Паралельна з наступаючай шведскай арміяй ішлі галоўныя сілы Шарамецьева з усходу, а з захаду — кавалерыйскія часці князя Меншыкава. І ўсім былі патрэбны харчы і фураж.

Шведам не ўдавалася дастаць іх ні абяцаннямі заступніцтва, ні іншымі метадамі. Насельніцтва ўцякала ў лясы, шмат яго згінула там, але гінулі і шведы, якія палявалі за ўцекачамі, каб прымусіць іх даць хлеб. І гора было тым шведам, якія ў гэтых блуканнях па лясах, палях і балотах аказваліся ва ўладзе гэтых самых уцекачоў.

На тэрыторыі Буда-Кашалёўшчыны, дзе шведы прайшлі не затрымліваючыся, не засталося народных песень, якія адносіліся б да гэтага перыяду, але вусныя паданні аб шведах як акупантах дайшлі да нашага часу. Збіральнікі беларускага фальклору адзначаюць прыказкі, у якіх захаваліся народныя ўспаміны аб бядотным становішчы шведскай арміі, калі яна праходзіла дрымучымі лясамі і невылазнымі балотамі: «Босы як швед».

Захавалася паданне і аб тым, як шведскі генерал Левенгаўпт падаслаў шпіёна, каб

накіраваць рускіх не тым шляхам, але невядомы беларускі селянін паказаў правільную дарогу, а шпіёна павесілі на асіне. Адсюль узнікла і прымаўка: «Тутэйшая асіна не шведская павуціна».

У архіве секцыі археалогіі Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь ёсць запісы шэрагу легенд аб зверствах шведаў і аб партызанах-героях, якія пайшлі на шведа, але пацярпелі паражэнне і былі перабіты і закапаны каля вёсак Гаўлі, Ліпа, Чабатовічы, Кашалёва і інш.

Захаваўся запіс падання аб уцёках шведаў пасля паражэння пад Лясной і аб тым, як яны разбягаліся па лясах, а затым кінуліся да ракі Сож і, пераправіўшыся цераз яе, пабеглі далей. Легенда вельмі трапна адзначае бядотныя вынікі паражэння для шведаў: «Швед пад Лясной згубіў боты і штаны, а ў Рудні пакінуў і шапку».

Аказанае шведам упартае супраціўленне з боку сялян на Беларусі, у тым ліку і на Буда-Кашалёўшчыне, адыграла немалаважную ролю ў агульнай барацьбе з захопнікамі. Ужо пасля Лясной Пётр I ведаў, што партызаны знішчаюць збягаючага з месца бою непрыяцеля — «понеже и по лесам мужики зело бьют их».

Не ўступаючы ў вялікія бітвы, руская і шведская арміі тым не менш знаходзіліся ў пастаянных узброеных сутыкненнях. Для грунтоўнай бітвы са шведскай арміяй сіл у галоўнакамандуючага князя Шарамецьева было не вельмі многа.

11 кастрычніка 1708 г. князь Меншыкаў пачаў паход з Гомеля на Старадуб, хоць яго палкі яшчэ не ўсе фарсіравалі раку Сож. Наперадзе была генеральная бітва пад Палтавай і поўны разгром шведскай арміі Карла XII.

У.Я.Райскі.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ

Усходняя Беларусь была далучана да Расійскай імперыі ў 1772 г. у выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай. У жыцці мясцовага насельніцтва пачалася новая эпоха.

На далучаныя землі быў распаўсюджаны расійскі адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, асноўнай адзінкай якога з'яўлялася губерня. Адміністрацыйны падзел новых тэрыторый некалькі разоў мяняўся, таму і тэрыторыя сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна на працягу амаль стагоддзя мела розную адміністрацыйную прапіску: уваходзіла ў Рагачоўскую правінцыю (1772 — 1776), Рагачоўскі і Беліцкі паветы (1776 — 1782) Магілёўскай губерні, тыя ж паветы Магілёўскага намесніцтва (1782 — 1795), потым Беларускай губерні (1796 — 1801), Рагачоўскі павет (да 1852) і Гомельскі павет (з 1852) Магілёўскай губерні.

Паветы падзяляліся на ключы на чале з войтамі, абранымі з асяроддзя землеўладальнікаў ці іх аканомаў. Войтам падпарадкоўваліся сотнікі і дзесятнікі, якія выбіраліся сялянскім мірам «из добрых і незазорных селян». Сотнікі выбіраліся ад 100 — 200 двароў, дзесятнікі ад 1 — 25 двароў. Названыя асобы прызначаліся паліцэйска-выканаўчай уладай. Галоўным абавязкам паліцыі было недапушчэнне самавольных перамяшчэнняў насельніцтва. Уводзілася пашпартная сістэма.

Новае размеркаванне паветаў (1775) пашырыла іх тэрыторыі і павялічыла колькасць насельніцтва ў іх. Павет быў падзелены на больш дробныя паліцэйскія адзінкі — станы. Станам правіў прыстаў, якога прызначаў губернатар, меліся пісьмавадзіцель і чыноўнік канцылярыі. Пры станах знаходзіліся і земскія суды (спраўнік, засядацелі, чыноўнікі канцылярыі). Станавы прыстаў абапіраўся на сельскую выбарную паліцыю — соцкіх і дзесяцкіх (сярод дзяржаўных і ўдзельных сялян) і вотчынную паліцыю памешчыкаў. У 1878 г. была створана пасада бліжэйшага памочніка станавога прыстава — паліцэйскага ўрадніка.

Абавязкі ўрадніка былі вельмі разнастайныя — ад устанаўлення парадку да кантролю за продажам віна. Практычна ўлада яго над сялянамі была бязмежная. З 1903 г. у Кашалёве, Уваравічах і іншых валасных цэнтрах на тэрыторыі сучаснай Буда-Кашалёўшчыны дзейнічалі і паліцэйскія ўраднікі.

Такімі былі вынікі новага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу рэгіёну ў складзе Расійскай імперыі.

АГУЛЬНЫ СТАН ЭКАНОМІКІ

Эканамічныя наступствы далучэння Беларусі да Расійскай імперыі мелі супярэчлівы характар. З аднаго боку, у складзе Расіі, якая ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. з'яўлялася адной з найбольш моцных дзяржаў свету, беларускім тэрыторыям было забяспечана больш стабільнае эканамічнае і палітычнае становішча. З другога — панаванне прыгонніцтва абумоўлівала ўсё больш моцнае адставанне ад еўрапейскіх дзяржаў, затрымлівала фарміраванне капіталістычных адносінаў.

Дарэчы, палітычнае жыццё Расійскай імперыі ў канцы XVIII — сярэдзіне XIX ст. было бурлівым. І хоць найбольш значныя падзеі адбываліся за межамі Буда-Кашалёўшчыны, яны тым не менш закраналі і мясцовае насельніцтва, змушаючы яго ўдзельнічаць у войнах Расіі з туркамі, шведамі, французамі, персамі, шляхам рэкруцкіх набораў і матэрыяльных павіннасцей. Так, у вайну 1812 г., хоць баявыя дзеянні і не закранулі тэрыторыю Буда-Кашалёўшчыны, але паўночная частка Рагачоўскага павета была настолькі спустошана, што павет трапіў у лік найбольш пацярпелых ад вайны. Паводле даных рэвізій, сялянскае насельніцтва губерні зменшылася за 1811 — 1816 гг. на 72 797 мужчынскіх «душ» — з 359 946 да 287 149 чалавек (Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 52). Трэба ўлічваць і тое, што на тэрыторыях, якія не былі ахоплены ваеннымі дзеяннямі, адбываліся дадатковыя наборы рэкрутаў. Так, за кошт насельніцтва Магілёўскай губерні была даўкамплектавана рэкрутамі 11-я Заходняя армія П.І.Баграціёна (Тамсама. С. 19). Акрамя таго, павялічваліся павіннасці, у сялянскіх гаспадарках рэквізаваліся коні.

Войны балюча адбіваліся на сялянскіх гаспадарках. У рэкруты забіралі найбольш здаровых і моцных мужчын ва ўзросце 19 — 35 гадоў (1 чалавек з 20 — 25 двароў). Гаспадаркі пазбаўляліся лепшых рабочых рук, і гэта стрымлівала іх развіццё.

У цэлым жа гаспадаркі на тэрыторыі сучаснага раёна развіваліся досыць дынамічна, дзякуючы блізкасці асноўнай транспартнай артэрыі рэгіёну — Дняпра і паступоваму ўцягванню ў агульнарасійскі рынак.

Да часу ўваходжання ўсходнебеларускіх зямель у склад Расійскай імперыі сельская гаспадарка гэтага рэгіёну не толькі аднавілася пасля заняпаду сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст., але і зрабіла істотны крок наперад. Значным фактарам развіцця эканомікі ў Беларусі быў рост насельніцтва — з 1,5 мільёна ў 1717 г. да 3,6 мільёна чалавек у 1791 г.

Аднаўляліся і павялічваліся ворныя плошчы і колькасць вёсак. Але ва ўсходняй Беларусі тэмпы развіцця былі ніжэйшыя, чым у заходняй і цэнтральнай яе частках. Гэта тлумачылася і значна большымі стратамі насельніцтва ў папярэдні перыяд, і блізкасцю мяжы з Расіяй, з-за чаго тут не атрымала значнага развіцця фальварковая паншчынная гаспадарка.

Галоўную ролю ў эканоміцы рэгіёну адыгрывала сялянская аброчная гаспадарка, фінансавыя магчымасці якой немагчыма супаставіць з магчымасцямі гаспадаркі шляхецкай ці, тым больш, магнацкай.

У другой палове XVIII ст. заселенасць тэрыторыі сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна значна павялічылася.

Рост попыту на лес у сувязі з будаўніцтвам расійскага флоту на Чорным моры і вывазам у Заходнюю Еўропу паскорыў распрацоўкі лясного масіву — Кашалёўскай дачы. Тут у XVII і XVIII ст. з'яўляецца некалькі новых паселішчаў — Сялец, Рудня, Славянец, Шарыбаўка, Буда, Бронніцы, Ліпа. Ствараліся новыя паселішчы і вакол ужо існаваўшых сёл, такіх, як Уваравічы, Марозавічы, Чабатовічы, Елянец, Рагінь, Лапічы. Гэты працэс паскорыўся пасля далучэння Беларусі да Расійскай імперыі дзеля задавальнення попыту на сельскагаспадарчую прадукцыю, лес і лесаматэрыялы.

Буда-Кашалёўскі рэгіён заставаўся ў гэты час аграрным. Адсутнасць значных шляхоў зносін, блізкасць гандлёва-рамесных цэнтраў мясцовага значэння (Гомель, Рэчыца, Рагачоў, Чачэрск), а таксама тое, што значную частку тэрыторыі раёна займалі дробныя і сярэднія шляхецкія маёнткі, — усё гэта не садзейнічала тут працэсу ўтварэння гарадоў.

ПРАВАВОЕ СТАНОВІШЧА

На далучаных землях паступова ўкаранялася расійская дзяржаўная ўлада. Каб заспакоіць мясцовае насельніцтва, Кацярына II у 1772 г. выдала ўказ «аб захаванні ўсіх асаблівасцей» далучаных да Расіі беларускіх зямель. На мясцовую шляхту былі пашыраны прывілеі згодна з «Даравальнай граматай дваранству» (1785). Урад ставіў перад шляхтай толькі адну ўмову — прынесці прысягу на вернасць расійскай манархіі. Тыя ж, хто адмаўляўся рабіць гэта, павінны былі ў трохмесячны тэрмін прадаць свае маёнткі і з'ехаць за межы імперыі. Калі маёмасць у вызначаны тэрмін прадаць не паспявалі, яна пераходзіла дзяржаве.

На тую шляхту, якая пагаджалася прыняць расійскае падданства, распаўсюджваліся правы і прывілеі расійскага дваранства. Але для гэтага, акрамя прынясення прысягі, неабходна было прадаставіць уладам дакументы, якія пацвярджалі б шляхецкае паходжанне. Гэтая практыка, якая атрымала назву «разбор шляхты», дала магчымасць уладам вылучыць з дваранскага стану значную колькасць дробнай і беззямельнай шляхты, бо такіх дакументаў у яе звычайна не было. На тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна, напрыклад, у аколіцы Лапічы, жыло 60 сем'яў дробнай ваколічнай шляхты, якая трымалася уніяцкага веравызнання аж до ліквідацыі уніі ў 1839 г. Да 1848 г. частка гэтай шляхты, якая не здолела пацвердзіць сваё паходжанне, была пераведзена ў мяшчанскі стан (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 3097. Воп. 1. Спр. 1. Л. 9 — 11; Спр. 5. Л. 5—6; Спр. 11. Л. 5 — 6).

На ўсе групы насельніцтва далучаных зямель паступова пашыралася расійскае грамадзянскае заканадаўства. У перыяд з 70-х гадоў XVIII ст. да 20-х гадоў XIX ст. расійскія ўлады спрабавалі прыстасаваць мясцовае заканадаўства да новых умоў. Асноўным заканадаўчым кодэксам у гэты час заставаўся Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. З сярэдзіны 20-х гадоў да пачатку 30-х гадоў XIX ст. улады распачыналі спробы стварыць нейкі «сімбіёз» агульнарасійскага і мясцовага заканадаўства. Але пасля паўстання 1830—1831 гг. палітыка царызму ў гэтым пытанні перамянілася.

Расійская ўлада імкнулася ліквідаваць праявы мясцовай аўтаноміі ва ўсіх сферах жыцця. Былі ўведзены расійская судовая сістэма (у Магілёўскай губерні — з 1.1.1831 г.), а таксама сістэма мер і вагі. Значна пагоршылася стаўленне расійскіх улад да каталіцкай царквы, а уніяцкая ў 1839 г. была ўвогуле ліквідавана. У 1841 — 1843 гг. царкоўныя землі былі секулярызаваны, а духавенству было прызначана дзяржаўнае ўтрыманне. Сярод гэтых царкоўных зямельных уладанняў трэ-

ба назваць і маёнтак рымска-каталіцкага мітрапаліта Станіслава Богуш-Сестранцэвіча. Пасля смерці мітрапаліта маёнтак адышоў ва ўладанне каталіцкага касцёла ў в. Рудзянец.

У 1837 г. у маёнтку было 186 двароў і 1360 сялян. Пасля секулярызацыі сяляне былі пераведзены ў стан дзяржаўных. Як ужо было адзначана, большую частку мясцовага насельніцтва складалі прыватнаўласніцкія сяляне. Пасля ўваходжання гэтых зямель у Расійскую імперыю тут амаль не адбылося змен у складзе мясцовых землеўладальнікаў. Асноўную масу іх складала мясцовая шляхта. Сярод яе былі і прадстаўнікі старажытных славутых родаў. Так, графы Солтаны вядомыя тут з XVI ст., у м. Люшаў нават знаходзілася сямейная грабніца-крыпта для пахавання прадстаўнікоў гэтага роду.

З сярэдзіны XVII — пачатку XVIII ст. вядомы тут Войнічы-Сенажэцкія, Фашчы, Халецкія, Будзяноўскія, Дзерналовічы. Гэта былі прадстаўнікі буйной землеўладальніцкай шляхты, хоць уласна на Буда-Кашалёўшчыне ім належалі, галоўным чынам, дробныя і сярэднія маёнткі. Амаль усе яны былі каталіцкага веравызнання.

Да сярэдзіны XIX ст. уладанні на тэрыторыі раёна пачалі набываць і расійскія дваране, сярод якіх былі генерал Вязьміцінаў, графіня Чарнышова. Але маёнткі іх тут таксама былі досыць сціплыя па памерах.

На тэрыторыі раёна найбольш значным па памерах было дзяржаўнае ўладанне Кашалёўскае староства. Свой пачатак яно брала з XVII ст., а ў 1765 г. у ім былі 4 населеныя пункты з 72 дварамі. У 1773 г. у 7 паселішчах налічвалася 469 душ мужчынскага полу (Мелешко В.И. Очерки аграрной истории Восточной Белоруссии. Мн., 1975. Приложения. Табл. 3. С. 228). Асноўным багаццем Кашалёўскага староства і суседняга з ім маёнтка Віктарын, які належаў Дарыя-Дзерналовічам, быў лес. Распрацоўка масіваў карабельнага і будаўнічага лесу вялася ў вельмі значных памерах. Да 80-х гадоў XIX ст. яго амаль не засталося. Так, у Кашалёўскай і Меркулавіцкай валасцях лес, хоць і займаў у гэты час 25% усёй тэрыторыі, застаўся толькі нізкай якасці — «на дровы» (Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии... Могилев на Днепре, 1884. Кн. 2. С. 682).

У 20 — 40-я гады XIX ст. былі зроблены спробы аднаўлення лясных багаццяў прырэчных зон усходняй часткі Беларусі. Была распрацавана праграма перабудовы лясной гаспадаркі і выкарыстання лесу. Высечка і вываз лесу дазваляліся толькі з кастрычніка да красавіка. Лясныя масівы падзяляліся на лясніцтвы, аб'езды і абходы. Высякаць можна было толькі спецыяльна адабраныя і пазначаныя дрэвы. Для іх вывазу ствараліся прасекі, якія падзялялі лесасекі. Суцэльная адначасовая высечка забаранялася. Планавалася таксама аднаўленне лесу і штучнымі насаджэннямі (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 3013. Воп. 1. Спр. 12. Л. 6 — 9). Аднак, на жаль, гэтая праграма так і не была ажыццёўлена. Гэтаму перашкодзіла заганная практыка перадачы дзяржаўных уладанняў у арэнду, калі арандатары мелі магчымасць амаль без аніякага кантролю, па-драпежніцку весці гаспадарку. Так, па скарзе адхіленага ад кіравання ўладаннем шляхціца Юдзіцкага ў 1824 — 1825 гг. была назначана рэвізія, якая паказала гаротны стан гаспадаркі. Павятовы маршалак С.Солтан прызначыў кіраваць уладаннем свайго брата П.Солтана. Той, у сваю чаргу, перадаў гаспадарку ў арэнду Г.Эпштэйну. Арандатар прымушаў сялян «адпрацоўваць прыгон у большых памерах, чым патрабавалася ў адпаведнасці з колькасцю зямлі, вазіць ранняй вясной па раздарожжы на сваіх конях непамерна вялікія бочкі са смалой, даваў пазыкі пад 100% у год». Сяляне

паведамілі, што арандатар перанёс паншчыну з восені на вясну, калі быў даўжэйшы дзень, звыш азначаных у інвентары нормаў прымушаў працаваць на створанай ім фабрыцы цыновак, вырабляць смаляную лучыну, за што плаціў печаным хлебам па завышаным кошце.

Рэвізор адзначаў наяўнасць корчмаў і шынкоў у воласці — 8 на 7 вёсак, да таго ж яны не плацілі дзяржаўныя падаткі.

Жорсткая эксплуатацыя сялян прывяла да заняпаду гаспадаркі: «фальварковыя палі пад яравое збожжа не падрыхтаваны, такія ж і сялянскія, азіміна не засеяна азімым збожжам у вельмі значнай колькасці... Нават... агароды іх таксама не ўзараны і не засеяны, бо ў сялян няма ні коней, ні насення. Фальварковыя будынкі і, асабліва, сялянскія дайшлі амаль да разбурэння» (Тамсама. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 25156. Л. 1—27).

Натуральна, што пры такім прававым стане і спосабе гаспадарання ніякага «штучнага» аднаўлення лясных багаццяў адбыцца не магло.

Такім чынам, у дарэформенны перыяд на тэрыторыі раёна існавалі прыватнаўласніцкія, дзяржаўныя і да пачатку 40-х гадоў XIX ст. царкоўныя ўладанні. Пры гэтым абсалютная большасць насельніцтва Буда-Кашалёўшчыны складалася з прыватнаўласніцкіх прыгонных сялян.

СЯЛЯНСКІЯ ГАСПАДАРКІ

Становішча прыватнаўласніцкіх сялян (і юрыдычнае, і эканамічнае) амаль не змянялася. І Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г., і расійскае Саборнае ўлажэнне 1649 г. замацоўвалі саслоўны стан і прыгоннае права. Правы сялян на працягу XVII—XVIII ст. былі яшчэ больш абмежаваныя. Сяляне, па сутнасці, ператварыліся ў аб'ект права. Толькі ў 1768 г. сейм Рэчы Паспалітай забараніў уласнікам маёнткаў асуджаць прыгонных сялян да пакарання смерцю. Але з-за адсутнасці дзейснага кантролю сапраўднае становішча сялян амаль не змянілася. Пасля далучэння беларускіх зямель да Расійскай імперыі адбыліся судовыя працэсы супраць шляхціцаў, якія парушалі гэтую забарону (Козловский П.Г. Правовое положение крестьян Белоруссии//Социально-экономическое и правовое положение крестьян в дореволюционной России. Воронеж, 1983. С. 127).

У Расіі становішча прыгоннага селяніна няшмат чым адрознівалася ад становішча раба. Шэраг указаў 1760—1783 гг. дазвалялі памешчыкам высылаць сваіх сялян у Сібір і на катаржныя работы. Пры гэтым сасланыя сяляне залічваліся памешчыку ў лік рэкруцкага набору. Сялянам пад пагрозай бізуноў і вечнай высылкі ў Нерчынск забаранялася скардзіцца на памешчыкаў. Сяляне павінны былі ўтрымліваць за свой кошт нават тыя войскі, якія ўлады накіроўвалі для задушэння сялянскіх хваляванняў. Заканадаўства Расійскай імперыі, такім чынам, фактычна пазбаўляла сялян, асноўную частку насельніцтва, усіх правоў. Сяляне не маглі валодаць нерухомасцю: надзелы, на якіх яны працавалі, пабудовы на надзельнай зямлі належалі ці дзяржаве, ці царкве, ці памешчыку.

Пасля задушэння царызмам сялянскай вайны Е.Пугачова ўрад, жадаючы пазбегнуць паўтору падобных падзей, пайшоў на поўнае заканадаўчае пашырэнне правоў сялян. Так, паводле ўказу 29.1.1788 г., дваровым і дзяржаўным сялянам дазвалялася купляць у памешчыка землі, сумежныя з іх надзеламі. Такім чынам, частка сялян атрымала магчымасць ператварацца ў землеўладальнікаў (Российское законодательство X—XX вв. М., 1987. Т. 5. С. 60).

Маніфест Паўла I ад 5.4.1797 г. абмяжоўваў памер паншчыны трыма днямі на тыдзень, а таксама забараняў прыцягваць сялян да працы на памешчыка па нядзелях (Тамсама. С. 62). Але

дадзены заканадаўчы акт заставаўся на паперы, бо ў ім не была акрэслена дакладная адзінка, якая вызначала нормы эксплуатацыі.

Аляксандр I указам ад 12.12.1801 г. дазволіў дзяржаўным сялянам, купцам і мяшчанам набываць незаселеную зямлю (Российское законодательство X – XX вв. М., 1988. Т. 6. С. 28 – 29). Такім чынам, зноў былі пашыраны магчымасці доступу падатковых палажэнняў у кола землеўладальнікаў. Указ ад 20.2.1803 г. дазваляў памешчыкам адпускаць прыгонных на волю паасобку або цэлымі вёскамі з абавязковым надзяленнем іх зямлёй. За гэта сяляне, паводле ўзаемнага дагавору з памешчыкам, павінны былі ці выконваць павіннасці, ці заплаціць выкуп. Гэтыя сяляне ўтваралі групу т.зв. вольных хлебаробаў, правы іх былі шырэйшыя нават у параўнанні з дзяржаўнымі сялянамі. Вольныя хлебаробы вызваляліся ад рэкруцкай павіннасці і выплаты чыншу, яны маглі прадаваць у арэнду і пакідаць у спадчыну свой зямельны надзел. Разам з дзяржаўнымі сялянамі вольныя хлебаробы неслі земскія павіннасці і плацілі падушны падатак. Указам ад 28.12.1818 г. вольным хлебаробам разам з іншымі групамі сялян было дазволена ствараць фабрыкі і заводы з выплатай падаткаў у дзяржаўную казну (Тамсама. С. 30 – 37).

Аднак саслоўе вольных хлебаробаў засталося нешматлікім. Цалкам па імперыі яно налічвала ў 1861 г. 1 111 829 душ мужчынскага полу (Тамсама. С. 32).

Указ ад 2.4.1842 г. дазваляў прыгонным сялянам, якія былі пераведзены па ўзаемнаму дагавору з памешчыкам на чынш, набываць рухомую і нерухомую маёмасць, займацца гандлем, браць шлюб без узгаднення з памешчыкам (Тамсама. С. 37 – 43).

Апошнім указам перадрэформеннага перыяду, які датычыўся сялянскага пытання, да 3.3.1848 г. было дазволена прыватнаўласніцкім сялянам набываць, са згоды іх памешчыкаў, ненаселеныя землі і іншую маёмасць (Тамсама. С. 43 – 45).

Такім чынам, на працягу першай паловы XIX ст. адбывалася паступовае заканадаўчае пашырэнне правоў сялян, у тым ліку, хоць і са значнымі абмежаваннямі, і ў сферы маёмасных адносін. Аднак для прыватнаўласніцкіх сялян гэтыя правы маглі быць ажыццёўлены толькі са згоды іх уладальнікаў-памешчыкаў.

Маёмасны стан прыватнаўласніцкіх сялян таксама цалкам залежаў ад памешчыка. Матэрыяльнае становішча сялян Буда-Кашалёўшчыны ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. можна прасачыць па матэрыялах інвентароў, дзе фіксаваліся сялянскія павіннасці, колькасць зямлі ў сялянскім надзеле, стан гаспадаркі.

У вёсках Гута, Ліпа, Забалоцце, Струкі, Шарыбаўка, Бронніца і Рудня-Віктарынская, якія належалі Дарыя-Дзерналовічам, у 1799 г. налічвалася разам 196 двароў з агульным насельніцтвам 1271 чалавек. У гэтую колькасць уваходзіла 11 двароў, у якіх жылі 34 чалавекі беззямельных сялян-бабылёў. У вёсках Гута і Ліпа асноўная маса гаспадарак (52 з 55) мела зусім невялікія зямельныя надзелы ў 1/8 і 1/16 валокі. У астатніх названых вёсках колькасць такіх малазямельных гаспадарак была значна меншая (54 са 130). Памеры надзелаў у асноўнай частцы гаспадарак тут ваганіся ад 3/16 да 1/2 валокі, прычым большасць гэтых гаспадарак (70) мела надзелы 1/4 валокі.

Такім чынам, на аднаго цяглага селяніна прыпадала ад 0,4 да 1,3 дзесяціны надзельнай зямлі. Падлікі сведчаць, што такой колькасці зямлі было зусім недастаткова. Пры сярэдняй ураджайнасці сам-тры і норме сяўбы адна чвэрць на дзесяціну, на спажыванне заставалася дзве чвэрці з дзесяціны на год, г. зн. 250 – 300 кг зерня. Але ж

пры гэтым нельга забывацца на тое, што сяляне звычайна выкарыстоўвалі трохполле, г. зн. засявалася толькі 2/3 надзелу, а трэцяя яго частка заставалася ў папары. Значыць, земляробства не магло забяспечыць селяніну пражытак. Таму сяляне яшчэ займаліся і жывёлагадоўляй. Інвентары паказваюць наяўнасць у сялянскай гаспадарцы буйной рагатай жывёлы, авечак, свіней. Вялікае значэнне ў гаспадарцы мела цяглая жывёла — коні, валы. Усяго па гэтых вёсках налічвалася 329 запрэжак (адна запрэжка — 1 конь ці 2 валы), г. зн. на 1 цяглы двор прыпадала 1,8 запрэжкі (без уліку бабылёў). Гэта некалькі ніжэй, чым у сярэднім па ўсходняй Беларусі (каля 2 запрэжак на цяглы двор).

Але, калі ўлічыць невялікія памеры сялянскіх надзелаў, трэба прызнаць гэты паказчык цалкам дастатковым. Было так, што 14 сем'яў цяглых сялян увогуле не мелі рабочай жывёлы. У той жа час былі гаспадаркі, дзе яе было больш, чым патрабавалася. У в. Струкі некалькі сем'яў валодалі 4, 7, 8 дарослымі рабочымі конямі і, адпаведна, 4, 2 і 2 маладымі конямі. Селянін в. Бронніца Патап Андрэеў, зямельны надзел якога складаў 1/4 валокі, трымаў 8 дарослых і 2 маладыя кані. У в. Ліпінічы селянін Янка Апанасаў, пры такім жа надзеле зямлі, меў 7 коней. Гэтыя сяляне, як і шмат іншых, знайшлі дадатковую крыніцу прыбытку ў рамізніцтве. У гэтых сем'ях мелася і шмат іншай свойскай жывёлы. У валоданні сям'і Янкі Фёдарава з в. Струкі было 8 дарослых і 2 маладыя кані, 3 маладыя валы, 3 цялят, 12 авечак і 6 свіней. Сям'я налічвала 10 чалавек, з якіх 7 былі працаздольныя. Пры гэтым зямельны надзел у 1/2 валокі цалкам складаўся з прыёмнай, але не цяглай зямлі, што вызваляла сям'ю ад паншчыны.

Значнае развіццё ў сялянскай гаспадарцы атрымала і пчалярства. Так, у Шарыбаўцы з 24 гаспадарак пчол трымалі 18, у Струках пчалярствам займаліся 8 гаспадарак з 12, у Бронніцах — 5 з 15, у Забалоцці — 20 з 48. Акрамя таго, сяляне займаліся льнаводствам і птушкагадоўляй (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 3014. Воп. 1. Спр. 9. Л. 5 адв. — 35).

Частка сялян не мела ворнай зямлі, а толькі прысядзібную — агарод, ці ўвогуле не мела і яе. Гэтыя сяляне — агароднікі і бабылі — плацілі толькі дзяржаўны падушны падатак, а агароднікі яшчэ і за сядзібу. Такім сялянам прыходзілася працаваць па найме, займацца рамяством і промысламі ці жабраваць.

Сялянскія павіннасці складаліся з трох асноўных частак: адпрацовачнай — паншчыны, натуральнай прадуктовай рэнты — аброку, грашовай рэнты — чыншу.

Памер паншчыны вызначаўся колькасцю зямлі ў сялянскім надзеле і памерамі іншых павіннасцей. Ад надзелу ў 1/2 валокі часцей за ўсё адпрацоўвалі 3—4 дні паншчыны з цягла, пад якім разумеліся працаздольныя мужчыны і жанчыны гаспадаркі. Звычайна сяляне адпрацоўвалі паншчыну на сваіх конях ці валах. Грашовы аброк (чынш) з надзелу ў 1/2 валокі складаў 4 руб. 80 кап. срэбрам. Натуральны прадуктовы аброк выплачвалі мёдам, калі ў сялянскай гаспадарцы былі пчолы, па 4 фунты з вулля ці борці, 16 гарцаў канаплянага семя, 2 пуды пянькі, 4 курыцы і 40 яек (Тамсама). Пры гэтым цэны на гэтыя прадукты ў канцы XVIII ст. былі наступныя: 1 чвэрць жыта ці аўса каштавала 1 руб. — 1 руб. 20 кап., 1 чвэрць пшаніцы — 2 руб. 50 кап., 1 пуд пянькі — 80 кап., за 1 пуд мёду давалі 1 руб. 20 кап., за 1 чвэрць канаплянага семя — 1 руб. 20 кап. Для параўнання: 1 фунт цукру каштаваў 60 кап., 1 фунт гарбаты (чаю) — 2 руб. 80 кап.

Ад надзелу ў 1/2 валокі сяляне таксама павінны былі адпрацаваць на панскай зямлі 6 дзён у год на ворыве і

2 дні на вывазе гною. У склад сялянскіх павіннасцей уваходзілі таксама гвалты — звычайна не больш 10 дзён у год, якія часцей за ўсё адпрацоўвалі на ўборцы ўраджаю ці на сенакосе. У інвентарах зафіксаваны таксама падводная павіннасць, калі сяляне забяспечвалі разнастайныя перавозкі, маставая (рамонт мастоў, грэбляў), падарожчына (грашовы эквівалент падводнай павіннасці). Калі ў панскім маёнтку існавалі прамысловыя прадпрыемствы, частку паншчынных дзён сяляне адпрацоўвалі на гэтых прадпрыемствах. Паводле падлікаў беларускага гісторыка В.В.Чапко, агульны памер сялянскіх павіннасцей з надзелу ў 1/2 валокі ў грашовым разліку складаў у сярэднім 30—45 руб. у год, у асобных выпадках дасягаў 70 руб. у год (Ежегодник по аграрной истории Восточной Европы, 1960. Киев, 1962. С. 366).

Такім чынам, становішча прыватнаўласніцкіх сялян, якія складалі асноўную частку насельніцтва Буда-Кашалёўшчыны, вызначалася як цяжкае. Пераважная частка сялянскіх гаспадарак з цяжкасцю забяспечвала пражытачны мінімум.

СЯЛЯНСКІ ДВОР, СЯЛЯНСКАЯ ХАТА

Як жа выглядалі на Буда-Кашалёўшчыне сялянскія двор і хата ў XIX ст.?

Акрамя хаты на сялянскім падворку былі клець, хлеў для коней, валоў і кароў, загон для авечак, паветка, пад якой захоўвалі калёсы, вазкі, сані, прылады працы. Таксама ставіліся дрывотня для дроў, сяннік і гумно, у якім сушылі і абмалочвалі снапы, захоўвалі салому.

Хата, сені, істопка, клець стваралі асобную групу пабудоў. Частка двара, на якой яны размяшчаліся, разам з брамай і палісаднікам называліся чыстым дваром. Пабудовы для жывёлы, птушкі, гаспадарчага інвентару стваралі гаспадарчы двор. Абгароджа-

Сялянская хата ў в. Глазаўка. Канец XIX ст.

ная плотам тэрыторыя двара, дзе жывёла ўтрымлівалася днём, называлася дзеннікам. Чысты двор і дзяннік называліся разам проста дваром. Астатняя частка сядзібы называлася гумнішчам.

Сялянская хата на Буда-Кашалёўшчыне працяглы час заставалася курнай. Печы не мелі комінаў, дым выходзіў праз дзверы ці адтуліну ў сцяне ў сені праз падвешаную над чаранам плеценую і абмазаную глінай выцяжку. У халоднае надвор'е шчыліну для дыму закрывалі мехам з саломай. Вядома, што сцены і скляпенні ў курных хатах былі закапцелыя. Толькі ў XIX ст. пачалі пашырацца чыстыя хаты з дымаходам. Нізка над глінабітнай падлогай размяшчаліся адно—два акенцы. У куце стаяла печ з камянёў. Уздоўж сцяны падлогу высцілалі дошкамі, гэта было месца для адпачынку. Вышэй на сценах — жэрдкі з сухімі дрывамі.

Па дыяганалі ад печы знаходзіўся чырвоны кут, ганаровае месца ў хаце. Тут стаяў стол, накрыты настольнікам, на ім салянка. Па баках уздоўж сцен — лавы, шырокія, колатыя плахі на калодах ці суках, замацаваных у сцяне. Лавы часта былі і месцам працы, таму ў іх рабілі адтуліны і зажымы для прасніц, часальных грабянёў і іншых прылад. У куце віселі абразы, упрыго-

жаныя ручнікамі. Чырвоны кут быў месцам збору ўсёй сям'і. Чынна за стол садзіўся бацька, побач з ім члены сям'і, госці. На драўляную міску клаўся бохан, накрыты ручніком. У гаршку падавалі варыва. Тут святкавалі святы, вяліся сямейныя бяседы. На покуце клалі і нябожчыка. Чырвоны кут быў своеасаблівым хатнім алтаром. Уздоўж глухой сцяны было месца для адпачынку, якое дадаткова вызначалася білам з падвешаным полагам. Гэтым хата як бы падзялялася на два пакоі. Тут рабілі яшчэ часта палаці — насціл, які адным канцом абапіраўся на печ, а другім падвязваўся да бэлькі; на гнуткім пруце да бэлькі мацавалася дзіцячая люлька-калыска. Паміж месцам адпачынку і чырвоным кутом у хаце было рабочае месца. Тут усталёўвалі сноўніцы, кросны; шавец тут ставіў свой услон з цiскамі для шыцця і інш.

Важным элементам у хаце была крыніца асвятлення — лучнік (светач). Часта гэта была драўляная калода, у якую замацоўвалася стойка. Увечары лучнік ставілі пасярэдзіне хаты. У расшчэплены канец яе ўторквалася лучына. Абгарэлае вуголле з лучыны падала ў начоўкі з вадой.

У старыну амаль у кожнай хаце ткалі, таму вельмі часта ў іх стаялі кросны, для ганчарных вырабаў былі прыстасаваны шырокія паліцы ўздоўж сцен.

ПРАДПРЫЕМСТВЫ І СЯЛЯНСКІЯ ПРОМЫСЛЫ

У прыватнаўласніцкіх уладаннях Буда-Кашалёўшчыны здаўна існавалі прадпрыемствы для перапрацоўкі мясцовай сыравіны. У першую чаргу гэта былі лесапільні, буды, дзе выраблялі смалу, дзёгаць, выпальвалі драўняны вугаль, выпрацоўвалі паташ. Ставілі мясцовыя памешчыкі і вінакурні. З пачатку XIX ст. да 1861 г. на тэрыторыі раёна ўзнікла 6 прадпрыемстваў: 4 вінакурні, 2 цукровыя заводы.

Выраб гарэлкі для мясцовай шляхты здаўна быў адным з найбольш прыбытковых заняткаў. А вось выраб цукру пачаўся ў Беларусі толькі ў 30-я гады XIX ст. Гэта праца мела тут сезонны характар. У залежнасці ад ураджаю цукровых буракоў яна доўжылася ад 33 да 119 дзён у год. На Мікалаеўскім заводзе, больш буйным і лепш абсталяваным, працавалі вольнанаёмныя рабочыя і замежныя майстры. У Насенскай цукраварні працавалі прыгонныя сяляне ў лік паншчыны.

Увогуле ў дарэформенны час памешчыцкія прадпрыемствы не атрымалі значнага развіцця. Гэтаму перашкаджалі не толькі пераважна натуральны характар гаспадаркі, але і агульная абмежаванасць рынку збыту, дрэнны стан шляхоў зносін.

Сялянскія промыслы захоўвалі ў гэты час традыцыйны характар. З пачатку XIX ст. тут у досыць значных памерах выраблялiся посцілкі-цыноўкі, шырока вядомыя ў рэгіёне. Мясцовыя патрэбы ў рамесных вырабах задавальнялі кушняры, краўцы, шаўцы, калеснікі-стэльмахі, бондары, сталяры, цесляры, кавалі і іншыя.

У СТАНЕ КРЫЗІСУ ПРЫГОННАЙ ГАСПАДАРКІ

У першай палове XIX ст. выразна праявіўся крызіс прыгоннай гаспадаркі. Узмацнялася эксплуатацыя сялян, вынікам якой станавілася масавая галеча. Царскі ўрад разумеў небяспеку далейшага існавання прыгонніцтва. Па словах шэфа жандараў А.Х.Бенкендорфа, «крепостное состояние есть пороховой погреб под государством». Таму палітыка ўрада была накіравана на змякчэнне найбольш жорсткіх праяў і супярэчнасцей прыгону пры захаванні самой прыгоннай сістэмы. Менавіта на ўмацаванне гэтай сістэмы быў накіраваны і шэраг мерапрыемстваў, якія праводзіліся царызмам у Беларусі.

Каб зменшыць сацыяльную напружанасць, абмежаваць жорсткую эксплу-

атацыю сялян, урад пачаў праводзіць на вёсцы рэформы, якія павінны былі ўпарадкаваць падаткаабкладанне сялян, іх павіннасці і абараніць ад непамерных пабораў.

Першапачаткова рэформа закранула толькі дзяржаўных сялян. Прадугледжвалася, што пры здачы казённых маёнткаў у арэнду прыватным асобам, арандатары больш не атрымлівалі судовай улады над сялянамі. Была праведзена люстрацыя (вопіс дзяржаўных уладанняў). Паншчына замянялася грашовым аброкам. Павіннасці былі строга рэгламентаваны. Гэтыя пераўтварэнні пачалі шырока ажыццяўляцца з 1841 г. і некалькі палепшылі становішча дзяржаўных сялян (Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1961. Т. 3. С. 233—242).

У дачыненні да прыватнаўласніцкіх сялян рэформа (атрымала назву інвентарнай) пачала праводзіцца пазней. У Магілёўскай губерні — з сярэдзіны 1850-х гадоў і да адмены прыгону так і не была закончана. Між тым інвентары 50-х гадоў яскрава сведчаць аб значным узрастанні сялянскіх павіннасцей у параўнанні з канцом XVIII — пачаткам XIX ст.

На Буда-Кашалёўшчыне ў вёсцы і фальварку Негаўка паншчына з надзелу ў 1/2 валокі дасягнула 10 дзён у тыдзень (5 дзён мужчынскіх з конямі і 5 дзён жаночых). Адначасова Негаўскі інвентар 1852 г. адлюстроўваў паглыбленне маёмаснага расслаення сялянства, вылучэнне бяднейшых і заможных сялян.

Рэформа прадугледжвала складанне новых інвентароў памешчыцкіх маёнткаў з мэтай вызначэння галоўных павіннасцей сялян у адпаведнасці з велічынёй і якасцю іх зямельных надзелаў. Павіннасці не маглі перавышаць 1/3 валавога даходу з надзелу. Паншчына абмяжоўвалася 6 днямі ў тыдзень. Падводная павіннасць вылічвалася з нормы паншчыны. Дадатковыя павіннасці адмяняліся. Памешчыкі павінны былі надзяліць кожную «рэвізскую душу» не менш як 3,75 дзесяціны прыдатнай для гаспадарання зямлі. За парушэнне памешчыкам нормаў інвентару прадугледжваліся меры пакарання, у т. л. спагнанні і перавод маёнтка пад апеку дзяржавы. Сяляне за парушэнне інвентарных нормаў таксама неслі адказнасць ажно да цялеснага пакарання і суда. Аднак ажыццяўленне інвентарнай рэформы ў прыватнаўласніцкіх уладаннях было спынена супраціўленнем памешчыкаў.

Увядзенне абавязковых інвентароў мала ўплывала на становішча сялян. Хоць сяляне і атрымалі досыць значныя зямельныя надзелы — ад 4,75 да 9 дзесяцін на «рэвізскую душу», павелічэнне надзелаў адпаведна выклікала павелічэнне павіннасцей. Гэта прымушала сялян адмаўляцца ад зямлі. Як адзначаў вядомы расійскі публіцыст і грамадскі дзеяч Ф.П.Яленеў, інвентары, «составлявшиеся самими помещиками, под мнимым лишь надзором местной власти и наполовину еще не оконченные, они не только ни на волос не улучшили положение крестьян, но часто требовали с них еще тягчайших повинностей, чем какие существовали дотоле» [Скалдин (Еленев Ф.П.). В захолустье и в столице. СПб., 1870. С. 337].

Шматлікія спробы «мадэрнізаваць» прыгоннае права скончыліся няўдала. Нарастанне сялянскага пратэсту супраць прыгону вызначала неабходнасць карэнных перамен. Супраціўленне сялян прыгонніцкай эксплуатацыі праяўлялася і на Буда-Кашалёўшчыне, хоць насіла тут у асноўным пасіўныя формы — адмовы ад выканання павіннасцей і ўцёкі. У 1809 г. сяляне Кашалёўскага староства адмовіліся ад выканання завышаных новым арандатарам капітанам Молерам павіннасцей і «сышлі ў лес». Губернскі пракурор Спіранскі і страпчы Бак, якія вывучалі гэты выпадак, знайшлі дзеянні сялян абгрунтаванымі. Нягледзячы на гэта,

магілёўскі губернатар загадаў трох завадатараў біць кнутамі і саслаць у Сібір на катаржныя работы, а яшчэ 11 пасля збіцця нагайкай былі сасланы ў Сібір на пасяленне (Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1979. Т. 4. С. 189). Аднак і пакаранні не маглі спыніць рост пратэстных настрояў насельніцтва. Сяляне Буда-Кашалёўшчыны прынялі ўдзел у самым буйным сялянскім хваляванні ў паўднёва-ўсходняй Беларусі. У 1841 г. распаўсюдзіліся чуткі, быццам цар дазволіў сваім указам прыгонным вольна перасяляцца ў Бесарабію і Екацярынаслаўскую губерню, а ў м. Дабранка (на мяжы Магілёўскай і Чарнігаўскай губерняў) выдаюць жадаючым перасяліцца пашпарты. Сапраўды, у Дабранцы дзейнічала група аферыстаў, якая за досыць вялікія грошы забяспечвала сялян фальшывымі пашпартамі. У склад гэтай групы ўваходзілі жыхары Дабранкі — адстаўны афіцэр М.Старадумскі, купец другой гільдыі В.Бучыеў, мешчанін М.Бяляўскі і жыхары м. Беліца — купец трэцяй гільдыі Т.Кушняроў, мяшчане Я.Цоглін, А.Сухарукаў і двое сялян князя Паскевіча. Яны распаўсюджвалі розныя чуткі. Сялянам казалі, што памешчыкі не жадаюць выконваць царскі ўказ і выставілі старожы, каб перахапіць сялян-перасяленцаў. Таму, як папярэджвалі сялян, шлях на поўдзень будзе цяжкі і небяспечны. Выкарыстаўшы надзеі сялян на лепшае жыццё, аферысты скуплялі за невялікія грошы сялянскую маёмасць, і прадалі больш за 1 тысячу фальшывых пашпартоў. Усяго ў гэты перасяленчы рух было ўцягнута да 1,5 тыс. чалавек. Сярод іх следчыя дакументы называлі сялян буда-кашалёўскіх памешчыкаў Фашчаў, Солтанаў, Байковых і Бардоўскага (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 12495).

Для перагляду прыгоннага права ўлады неаднаразова стваралі сакрэтныя камітэты, якія павінны былі выпрацаваць кірункі сялянскай рэформы. Але ніякіх сапраўдных змен прапанавана не было. 30.3.1856 г. цар Аляксандр II у прамове перад маскоўскімі дваранамі заўважыў: «Слухи носятся, что я хочу дать свободу крестьянам; это несправедливо, и вы можете сказать всем направо и налево; но чувство враждебное между крестьянами и их помещиками, к несчастью, существует... Я убежден, что рано или поздно мы должны к этому придти... гораздо лучше, чтобы это произошло свыше, нежели снизу... (Голос минувшего. 1916. № 5—6. С. 393).

У 50-я гады XIX ст. крызіс прыгонніцтва паглыбіўся. Нізкая эканамічная эфектыўнасць прыгонніцкай гаспадаркі яскрава праявілася ў час Крымскай вайны, у якой Расія пацярпела паражэнне. Гэта падштурхнула царызм да неадкладных рэформаў.

АДМЕНА ПРЫГОННАГА ПРАВА. РАЗВІЦЦЁ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ АДНОСІН

Нарэшце працяглыя абмеркаванні і падрыхтоўка рэформаў завяршыліся выданнем маніфеста 19.2.1861 г. і «Палажэнняў аб сялянах, што выйшлі з прыгоннай залежнасці». Згодна з «Палажэннямі», памешчыкі гублялі права ўласнасці над асобай селяніна. Сяляне атрымалі права набываць нерухомую маёмасць, займацца гандлем, ствараць прамысловыя прадпрыемствы. Пытанне аб зямлі спрабавалі вырашыць шляхам кампрамісу: памешчык заставаўся ўласнікам зямлі, але сяляне атрымалі ў карыстанне надзелы, якія павінны былі пастунова выкупляць. Да моманту выкупу зямельных надзелаў сяляне лічыліся «часова абавязанымі» і за карыстанне імі абавязаны былі несці павіннасці на карысць землеўладальніка. Размеркаванне зямлі паміж памешчыкамі і сялянамі, павіннасці сялян вызначаліся «Устаўнымі граматамі». Яны складаліся чыноўнікамі — «міравымі пасрэднікамі» — з ліку мясцовых дваран.

На Буда-Кашалёўшчыне, як і па ўсёй Беларусі, сялянская рэформа ажыццяўлялася на аснове Агульнага палажэння і двух Мясцовых палажэнняў, у адпаведнасці з якімі вышэйшыя памеры сялянскіх надзелаў вагаліся ад 4 да 5,5 дзесяціны на «душу», а ніжэйшы складаў 1/3 вышэйшага. На тэрыторыі раёна ўсе сяляне атрымалі вышэйшыя надзелы. Паводле Устаўных грамат сяляне атрымлівалі ў карыстанне такую ж колькасць зямлі, якую мелі да рэформы. За карыстанне вышэйшым надзелам сяляне павінны былі адпрацоўваць на паншчыне 40 дзён мужчынскіх і 30 жаночых ці заплаціць 8 рублёў аброку ў год. Рэформа пакінула галоўныя павіннасці — паншчыну і аброк-чынш, былі адменены толькі дадатковыя павіннасці (будаўнічая і інш.) і рэчавыя зборы — натуральны аброк ці даніна. Выкананне павіннасцей на карысць памешчыка было гарантавана кругавой парукой. Селянін мог атрымаць надзельную зямлю ва ўласнасць толькі пасля выкупу. Памеры выкупной сумы вызначаліся зыходзячы з 6% капіталізацыі гадавога аброку-чыншу. Сяляне Магілёўскай губерні павінны былі плаціць за вышэйшы душавы надзел, зыходзячы з кошту 1 дзесяціны ў 33 руб. 33 кап. Сярэдні рыначны кошт 1 дзесяціны вагаўся ў межах 18 руб. Выкупная сума была значна вышэйшая за рыначны кошт зямлі, бо, па сутнасці, уключала ў сябе і выкуп асобы селяніна (Фридман М.Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958. С. 109). Пры выкупе сяляне плацілі 20% патрэбнай сумы, астатнія 80% дзяржава кампенсавала памешчыку каштоўнымі паперамі. Сяляне ператвараліся ў даўжнікоў дзяржавы. Пазыку патрэбна было пагасіць шляхам выплаты 6% на працягу 49 гадоў. У выніку сяляне Магілёўскай губерні выплацілі суму ў чатыры разы большую, чым рыначны кошт зямлі.

Рэформа вызначыла і парадак кіравання сялянамі. Сялянская абшчына — грамада, якую складалі жыхары аднаго буйнога ці некалькіх дробных паселішчаў, выбірала сельскага старасту і зборшчыка падаткаў. Некалькі абшчын стваралі воласць, якая падпарадкоўвалася валасной управе на чале са старшынёй. Валасная ўправа, яе старшыня выбіраліся на валасным сходзе. Сялянская адміністрацыя размяркоўвала і збірала падаткі, абвяшчала загады цэнтральных і мясцовых улад і сачыла за іх выкананнем.

Адмена часоваабавязанага стану сялян і пераход на абавязковы выкуп былі зацверджаны 1.7.1863 г. Выкупныя плацяжы зніжаліся на 20%. Устаўныя граматы былі перагледжаны, частка сялянскіх надзелаў была павялічана. Гэтыя захады ўрада былі выкліканы пачаткам паўстання 1863—1864 гг. і пагрозай перарастання яго ў аграрную рэвалюцыю.

Аднак правядзенне рэформы задаволіла далёка не ўсіх вяскоўцаў. Дваровыя сяляне вызваляліся без зямлі. Зямельны надзел яны маглі атрымаць ад памешчыка толькі па яго ўласнай волі. Не атрымалі зямлі і рэкруты, што служылі ў арміі і не мелі сям'і. Таксама засталіся без зямлі бабылі, значна менш душавога надзелу атрымалі агароднікі.

Хоць цалкам па Беларусі незадавальненне сялян рэформай выклікала шматлікія хваляванні, на Буда-Кашалёўшчыне значных сялянскіх выступленняў не было. У тэрмін былі складзены ўстаўныя граматы, праведзена размеркаванне памешчыцкай і сялянскай зямлі. Але хоць мясцовыя сяляне і атрымалі вышэйшыя душавыя надзелы, вельмі хутка пачаў адчувацца недахоп зямлі.

Рэформа садзейнічала развіццю капіталістычных адносін у вёсцы, адбывалася яе расслаенне. Земляробства ўсё менш забяспечвала выжыванне сялянскай сям'і. Нізкая ўрадлівасць

глебы, невысокі ўзровень агракультуры, значная канкурэнцыя з боку таннага ўкраінскага збожжа, якая асабліва праявілася пасля пабудовы чыгункі, вымушалі мясцовых сялян больш актыўна займацца промысламі.

На мяжы 70—80 гг. XIX ст. найбольшае развіццё атрымала адыходніцтва: сплаў лесу, будаўніцтва чыгункі, праца на цагельных, цукровых і вінакурных заводах, зямельныя работы. Займаліся сяляне і рамізніцтвам, кавальскім, сталярным, бандарным, алейным промысламі. Адбывалася нават спецыялізацыя некаторых вёсак па асобных відах промыслаў. Так, вёскі Новая і Старая Гусявіцы і больш за палову двароў Іванаўкі займаліся вырабам фурманак, вазоў-драбін, калёс, саней. Гэты промысел прыносіў сялянам 18—30 руб. у год. Мясцовыя майстры вывозілі свае вырабы на кірмашы Гомеля, Рагачова, Рэчыцы. Досыць значным быў алейны промысел, сыравінай для якога служыла канаплянае семя. У Магілёўскай губерні гэтым промыслам былі заняты каля 200 саматужнікаў, з іх 47 у межах сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна (цалкам па Рагачоўскаму павету іх налічвалася 154). Вышэйшы гадавы заробак у гэтым промысле — 40 руб. — адзначаны ў Наспе. Больш раўнамерна былі размеркаваны па вёсках кушняры, якія выраблялі скуры і аўчыны, шаўцы, якія займаліся вырабам скуранога абутку, краўцы, якія шылі кажухі. Найбольш значная канцэнтрацыя гэтых рамеснікаў зафіксавана ва Уваравічах. Памеры заробкаў на гэтых промыслах залежалі перад усім ад кваліфікацыі майстра і колькасці заказаў. Так, уваравіцкі мешчанін-шавец зарабляў да 120 руб. у год, кушнер у гэтай жа вёсцы атрымліваў 90 руб., а кравец — 80 руб. у год. У той жа час жыхары больш дробных паселішчаў —Дзербічаў, Ціхінічаў, Хоўхлы, Лозава зараблялі гэтымі промысламі 3—15 руб. у год.

Але найбольшае пашырэнне ўсё ж атрымалі рамізніцтва і адыходніцтва (адпаведна 93 і 355 двароў). Яны забяспечвалі досыць высокія заробкі — да 45 руб. у год.

Найбольшае значэнне рамізніцтва мела да пабудовы Лібава-Роменскай чыгункі, але з другой паловы 60-х гадоў XIX ст. абмяжоўвалася мясцовымі перавозкамі (дастаўка грузаў да чыгуначных станцый і рачных прыстаняў, падвоз будматэрыялаў і г. д.).

Адыходніцтва падзялялася на зімняе і летняе. Узімку ажыццяўлялася высечка лесу, апрацоўка і пагрузка драўніны, выраб гонты, праца на цукровых і вінакурных заводах. Летам — сплаў лесу, зямельныя работы, будаўніцтва чыгункі, працавалі на цагельнях, нарыхтоўвалі карчы для выганкі дзёгцю. Такім чынам, промыслы давалі даволі значны дадатковы заробак сялянам.

Але асноўным заняткам усё ж заставалася земляробства. Статыстыка сведчыць, што значная частка паселішчаў Буда-Кашалёўшчыны (Рудзянец, Радзеева, Хоўхла, Крыўск, Лапічы, Ціхінічы, Чабатовічы, Фундамінка, Івольск, Сямёнаўка) захавала пераважна земляробчы характар. І ў тых вёсках, дзе атрымалі развіццё рамізніцтва і адыходніцтва, асноўным заняткам сялян заставалася земляробства.

В.І.Сычоў, В.А.Міхедзька.

Вымушанае перасяленне сялян

Пасля адмены прыгону на Беларусі пачалося паскоранае развіццё капіталізму. На Буда-Кашалёўшчыне яшчэ да правядзення рэформы палепшыўся стан шляхоў зносін, што, безумоўна, спрыяла развіццю гаспадаркі. Да 1859 г. была закончана пракладка шашы Санкт-Пецярбург—Кіеў на ўчастку Гомель—Доўск. Шаша была добраўпарадкавана, мела насыпы, адхоны, была забрукавана. Добраўпарадкаванне шашы, у

першую чаргу яе брукоўка, было закончана ўжо на пачатку XX ст. На сучаснай тэрыторыі раёна на шашы былі пабудаваны 2 станцыі — Ліпа, каля аднайменнай вёскі, і Чачора, каля в. Дзербічы (Дембовецкий А. Опыт описания Могилевской губернии... Кн. 2. С. 627).

Да 1874 г. быў пабудаваны ўчастак Гомель—Жлобін Лібава-Роменскай чыгункі, які прайшоў якраз пасярэдзіне тэрыторыі сучаснага раёна. Неўзабаве пачалі працаваць чыгуначныя станцыі Буда-Кашалёва і Сямёнаўка (сучасная Уза).

Пабудова шашы і чыгункі значна палепшыла ўмовы вывазу традыцыйных для рэгіёну тавараў — лесу, шкла, скур, збожжа, мёду і інш.

У цэлым у парэформенны час эканоміка Буда-Кашалёўшчыны грунтавалася на сельскагаспадарчай вытворчасці. Сялянская рэформа стварыла ў раёне шырокі слой дробных землеўласнікаў — сялян. Аднак на мяжы 80—90-х гадоў XIX ст. зноў як найбольш вострае паўстала зямельнае пытанне. Сялянскія зямельныя надзелы ў выніку сямейных падзелаў драбніліся, а прадукцыйнасць сялянскай працы павышалася нязначна. Гэта вымушала сялян шукаць дадатковы заробак, займацца промысламі. Расла колькасць беззямельных сялян, якія вымушана прадавалі свае сямейныя надзелы. Такім чынам, у рэгіёне фарміравалася тыповае для паслярэформеннай Беларусі аграрнае перанасяленне.

Каб зменшыць напружанасць на вёсцы, царскі ўрад усё большае значэнне надаваў перасяленню сялян у мясцовасці, дзе яшчэ былі вольныя землі. Пачатак гэтай палітыкі быў адзначаны цыркулярам Міністэрства ўнутраных спраў ад 13.4.1868 г. «Аб парадку перасялення сялян на свабодныя казённыя землі». Ён прадугледжваў магчымасць перасялення як для асобных сялянскіх сем'яў, так і для сялянскай грамады агулам. У апошнім выпадку патрабаваўся папярэдні дазвол урада. Публікацыя цыркуляра выклікала неспадзяваны ўздым перасяленчых настрояў у сялянскім асяроддзі. Таму ўжо 4 мая таго ж года губернатарам было рэкамендавана «всемерно препятствовать кочевому настроению крестьян», а 5 лістапада 1868 г. віленскі генерал-губернатар Патапаў патрабаваў прыпыніць усялякія перасяленні і «зорко следить за всяким проявлением стремления к переселению и своевременно предупреждать оное» (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1872. Л. 1). Афіцыйныя ўстановы дзейнічалі згодна з гэтым патрабаваннем ажно да 1894 г. Створаная пад кіраўніцтвам міністра ўнутраных спраў Д.С.Сіпягіна Асобая нарада 2.7.1894 г. прыйшла да высновы аб неабходнасці спалучэння мер барацьбы супраць самавольных сялянскіх перасяленняў з мерапрыемствамі па ўпарадкаванню аграрнай міграцыі. Было вырашана аднавіць выдачу дазволаў на перасяленні, а ў 1896 г. пры міністэрстве была створана спецыяльная перасяленчая ўправа, якая займалася забеспячэннем працэсу перасялення ад выдачы дазволу да ўладкавання перасяленцаў на новым месцы. У красавіку 1896 г. Мікалай II падпісаў указ, якім дазваляў сялянам накіроўваць сваіх прадстаўнікоў для агляду месцаў мерканага перасялення. Гэты ўказ меў на мэце прадухіліць так званыя «адваротныя перасяленні», якія ў 1895 г. складалі 7% агульнай колькасці перасяленняў.

У другой палове 90-х гадоў XIX ст. колькасць перасяленцаў значна ўзрасла. Калі ў 1886—1889 гг. з Магілёўскай губерні выехалі 327 чалавек, у 1891—1895 гг. — 371 чалавек, дык у 1896 г. губерню пакінулі больш за 1100 аграрных перасяленцаў [Верещагин П. Д. Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.). Мн., 1978. С. 74—75, 91]. Гэты год трэба лічыць пачаткам уступлення заходніх губерняў у «вялікае перасяленне» (Тамсама. С. 91).

Буда-Кашалёўскія сяляне таксама спрабавалі пазбавіцца ад галечы шляхам перасялення. Жыхары Сямёнаўкі, Кабылянкі, Рудзянца, Асобіна ў 1897 г. спрабавалі перасяліцца ў Сібір. Найбольш заяў аб перасяленні — 47 з 53 —было пададзена сялянамі з Сямёнаўкі. Аднак дазвол атрымалі толькі тыя, хто пасля продажу нерухомасці меў маёмасці не менш як 200 руб. на двор. Але такіх сем'яў у Сямёнаўцы было толькі 6, ды яшчэ 2 сям'і выехалі да сваякоў, што перасяліліся раней (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 2014., Воп. 1. Спр. 1533. Л. 4—31).

Заявы на перасяленне падавалі таксама сяляне Елянца, Недайкі, Сяльца, Буды-Люшаўскай, Рагіні, Уваравічаў. Сяляне абгрунтоўвалі сваё жаданне перасяліцца малазямеллем ці ўвогуле адсутнасцю зямлі,

нявялікімі памерамі мясцовых заробкаў. Аднак улады адмовілі ім у дазволе на перасяленне. (Тамсама. Ф. 2014. Воп. 1. Спр. 1533, 1604, 1783, 1943, 1945, 2262).

У пошуках заробкаў сяляне былі вымушаны наймацца ў парабкі да памешчыкаў, а таксама да заможных сялян, колькасць якіх павялічылася пасля рэформы 1861 г. Сярод такіх заможных сялян былі Грушніцкі, які валодаў 100 дзесяцінамі, з якіх 63 дзесяціны былі ворнай зямлёй, Анікеічы — адпаведна 246 і 141 дзесяціны, Краснабай — 56 і 24 дзесяціны, Багамолаў — 100 і 60 дзесяцін, Галіцкі — 160 і 135 дзесяцін, Лунькоў — 60 і 52 дзесяціны, Рашэтнікаў — 290 і 210 дзесяцін, Прануза — 133 і 102 дзесяціны.

Сярод сельскай буржуазіі былі і мяшчане. Так, мешчанін Кушняроў валодаў ажно 3 маёнткамі з 1828 дзесяцінамі зямлі, з якіх 971 дзесяціна была ворнай зямлёй, Ляснеўскі, адпаведна, 510 і 288 дзесяцін, Пігунова — 345 і 327 дзесяцін, Якаўлеў — 783 і 362 дзесяціны, і іншыя.

Такім чынам, парэформенная вёска на Буда-Кашалёўшчыне ва ўмовах паскоранага развіцця капіталізму апынулася перад праблемай абеззямельвання сялян і іх вымушаных уцёкаў з бацькаўшчыны ў пошуках спрыяльных умоў для жыцця. Галоўнымі месцамі для перасялення сталі Сібір, Кубань, Закаўказзе і іншыя малазаселеныя землі Расіі.

В.І.Сычоў.

Народная адукацыя

У 1864 г. у Расіі прайшла рэформа школьнай адукацыі. Было ўведзена «Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах». У Беларусі дзейнічалі «Часовыя правілы», якія павінны былі забяспечыць у адукацыі вядучую ролю рускай мовы. У школах Беларусі забаранялася навучанне на беларускай і польскай мовах, дазвалялася толькі на рускай.

Менавіта ў гэты час на тэрыторыі раёна былі адкрыты наступныя школы: Уваравіцкая (1864), Рагінская і Узоўская (1868), Бацунская (1872), Недайская (1873), Чабатовіцкая (1874), Шырокаўская, Міхалеўская (1880), Гавельская (1887), Пянчынская (1894), Губіцкая і Бушаўская (1895), Шарыбаўская (1900), Глазаўская і Буда-Кашалёўская (2-я палова XIX ст.) і іншыя.

Першае народнае вучылішча на Буда-Кашалёўшчыне было адкрыта ў в. Кашалёва ў 1845 г. На ўтрыманне вучылішча адпускалася 292 руб. Грошы збіраліся з дзвюх крыніц: дзяржаўныя сяляне ўносілі 251 рубель, сельская абшчына — 41.

У 1882/83 навучальным годзе Кашалёўскае вучылішча наведвалі 24 хлопчыкі і ўсяго толькі 4 дзяўчынкі, у 1883/84 адпаведна — 26 і 2, а ў 1884/85 — 28 і 2, у 1885/86 — 37 і 2. Як бачна, колькасць навучэнцаў павышалася толькі за кошт вучняў мужчынскага полу, а жанчыны заставаліся непісьменнымі.

Склад настаўнікаў мала мяняўся. Так, праваслаўе з 3 студзеня 1849 г. і далей да канца 1880-х гадоў выкладаў выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі святар Феафіл Савініч. З 1878 г. у вучылішчы выкладаў выпускнік Полацкай настаўніцкай семінарыі Ісідар Лаўравіч Іовічаў, у 1883 г. яго змяніў Яўграф Іванавіч Раменскі, з лістапада 1884 г. — Уладзімір Падабед.

У 1905—1906 гг. пабудавалі новую школу, якая працуе і сёння. Будаўніцтвам школы кіраваў мясцовы ляснічы І.Л.Юстаў. Школа стала двухкласным вучылішчам з шасцігадовым тэрмінам навучання. Працавалі 3 настаўнікі. Камплектнасць 1—2-га класаў складала 20—25 вучняў, а ў 5—6-х класах — па 10—12 чалавек. Так, у 1915 г. шосты клас скончылі 10 чалавек, у т.л. 2 з бядняцкіх сем'яў — Макар Аляксандравіч Мікалаеў і Рыгор Іванавіч Агееў, астатнія з больш заможных сем'яў Кашалёва і суседніх вёсак.

У першай палове XIX ст. была адкрыта школа ў в. Ліпінічы. Размяшчалася яна ў хаце селяніна М.А.Крапаснога. Настаўнік зімой вучыў дзяцей і быў на ўтрыманні іх бацькоў, а летам наймаўся пасвіць жывёлу. Вучні, якія скончылі школу, пакідалі вёску, накіроўваючыся на заробкі.

У 1864 г. на валасным сходзе было вырашана адкрыць у мястэчку Уваравічы народнае мужчынскае вучылішча. Гэта пастанова была зацверджана саветам у складзе губернатара, архірэя, дырэктара вучылішчаў і двух прадстаўнікоў ад губернскага земскага сходу. Але працавала

вучылішча нядоўга. У 1871 г. яно было закрыта ў сувязі з ліквідацыяй Уваравіцкай воласці. Дзеці павінны былі наведваць Рудзянецкае народнае вучылішча. Па дагавору са святаром у мястэчку Уваравічы была адкрыта царкоўна-прыходская школа. Настаўнікам быў селянін Нічыпар Якаўцоў, якому сялянская абшчына плаціла 33 рублі ў год са сталом. Навучэнцаў было 54, з іх 2 дзяўчынкі. У 1910 г. у вёсцы на вул. Набярэжнай было адкрыта народнае вучылішча, якое мела 4 класныя пакоі і настаўніцкую. На чатырох аддзяленнях тут навучалася 85 вучняў. Выкладалі дзве настаўніцы святар мясцовай царквы. Першай настаўніцай была Наталля Тырымава.

Буда-Кашалёўская пачатковая школа была адкрыта ў 1890-я гады. Тут было некалькі навучэнцаў, працаваў адзін настаўнік. Школа размяшчалася ў невялікім сялянскім будынку, каля чыгуначнай станцыі. Настаўнік жалавання не меў, бацькі ўтрымлівалі яго падворна. Каб ацяпляць памяшканне школы, дзеці насілі ў палатняных сумках па два палены дроў.

А вось у в. Рагінь ужо на ўтрыманне народнага вучылішча казна адпускала 90 руб. 40 кап., а сельская абшчына больш за 277 руб. Архівы сведчаць, што ў 1882 г. у вучылішча паступілі 20 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка, у 1883 г. — іх колькасць была тая ж, у 1885 г. вучобу пачалі 32 хлопчыкі і 1 дзяўчынка, у 1886 г. — 35 і 2. Карціна была ранейшай, як і ў Кашалёўскай воласці: амаль усім дзяўчынкам наканавана было заставацца непісьменнымі. Выкладала ў вучылішчы з 1 кастрычніка 1879 г. і ўсё наступнае дзесяцігоддзе выпускніца Магілёўскай жаночай гімназіі Юлія Васільеўна Шымковіч, якая паспяхова здала экзамены на званне настаўніцы. Святаром

Ф.П.Буланаў.

у вучылішчы быў у 1881 г. выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі Іаан Рыгоравіч Хруцкі, у 1882 г. яго змяніў Міхаіл Андрэевіч Лепяшынскі з в. Студзянец Касцюковіцкага павета, дарэчы, выхадзец з сям'і вядомых рэвалюцыянераў Лепяшынскіх.

У сяле Чабатовічы народнае вучылішча адкрылася ў 1874 г. Казна адпускала на яго ўтрыманне 90 руб., астатнія 168 руб. 16 кап. плаціла сельская абшчына. З 1878 г. у вучылішчы выкладаў народны настаўнік Іван Станіслававіч Костка, у 1883 г. яго змяніў І.Л.Іовічаў, які быў пераведзены сюды з Кашалёўскага народнага вучылішча. Святаром у вучылішчы з 1878 г. і ўсё наступнае дзесяцігоддзе быў выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі Сафроній Аляксеевіч Бекарэвіч. Колькасць навучэнцаў, хлопчыкаў і дзяўчынак, была наступнай: 1882 г. — 16 і 4; 1883 г. — 21 і 6; 1885 г. — 29 і 2; 1886 г. — 42 і 2.

З 1874 г. па 1908 г. вучылішча было аднакласным з чатырохгадовым тэрмінам навучання. У 1908 г. яно было пераўтворана ў двухкласнае з тэрмінам навучання шэсць гадоў. Навучальны год пачынаўся з другой паловы кастрычніка. Пры школе меўся

Будынак Недайскага народнага вучылішча, пабудаванага ў 1914 г.

інтэрнат на 20 месцаў для дзяцей, якія хадзілі ў школу з аддалёных вёсак.

У 1913 — 1916 гг. у Чабатовіцкай школе вучыўся будучы народны артыст СССР П.С.Малчанаў, а ў 1921 — 1922 гг. ён тут працаваў настаўнікам пачатковых класаў.

У 1902 г. сяляне Івольскай сельскай абшчыны Чабатовіцкай воласці хадайнічалі перад дырэктарам народных вучылішчаў Магілёўскай губерні аб адкрыцці ў вёсцы народнага вучылішча. У тым жа годзе яно было адчынена. Прыгаворам сялянскай абшчыны на штогадовае ўтрыманне вучылішча было асігнавана 100 руб., ад казны — 415 рублёў. Жалаванне настаўніка складала 300, а святара — 50 рублёў. У 1903 — 1904 гг. тут было 46 вучняў: 42 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі. Івольскае народнае вучылішча не мела асобнага памяшкання, таму «испрашивало» ў Міністэрства народнай адукацыі сродкі на яго пабудову ў суме 1500 рублёў. Грошы былі выдзелены ў 1904 г. Першай настаўніцай стала Таццяна Максімава.



СВИДѢТЕЛЬСТВО.

Рогачевскій Уѣздный Училищный Совѣтъ симъ удостовѣряетъ, что КАЗАНЦЕВА, Нина Матвѣева, крестьянка хутора Осовка Недойской волости

родивш 14 іюля 1904 года вѣроисповѣданія православнаго успѣшно окончил а въ 1916 году курсъ ученія въ Недойскомъ народномъ училищѣ.

Выдано 10 сентября 1916 года.

Предсѣдатель Совѣта

Инспекторъ народныхъ училищъ

Члены Совѣта:

№ ... Училища.

№ ... Училищнаго Совѣта.

Пасведчанне аб заканчэнні вучылішча.

У 1907 г. вучылішча ўжо працавала ў новым памяшканні. Навучэнцаў было 51, 47 хлопчыкаў і 4 дзяўчынкі. Вядома, што ў 1907 г. 8 вучняў былі выключаны, астатнія скончылі школу. На ўтрыманне вучылішча за год было зрасходавана 473 рублі. У школьнай бібліятэцы за год на пазакласнае чытанне было выдадзена ўсяго 35 экзэмпляраў кніг. У вучнёўскай бібліятэцы на 1 студзеня 1907 г. было 18 назваў, 165 тамоў кніг на суму 64 руб. 22 кап. За год закуплена 6 назваў кніг, 62 тамы на суму 24 руб. 38 кап.

Навучальных дапаможнікаў на 1 студзеня 1908 г. налічвалася 31, у тым ліку атласаў, глобусаў, карт і карцін — 5, мадэляў, прылад для малявання — 5, прописаў — 20, іншых падручнікаў на суму 12 руб. 65 кап. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 2254. Воп. 2. Спр. 243. Л. 1, 3, 8, 14, 51, 80; Спр. 387. Л. 1, 7, 19, 37; Спр. 556. Л. 168).

Народнае вучылішча ў в. Рудзянец адкрылася ў 1868 г. і ўтрымлівалася толькі на сродкі валаснога бюджэту — 250 руб. Суадносіны хлопчыкаў і дзяўчынак сярод навучэнцаў былі такімі: у 1882 г. — 74 і 4; у 1883 г. — 64 і 2; у 1884 г. — 58 і 23; у 1886 г. — 60 і 12. Параўноўваючы колькасць навучэнцаў у в. Рудзянец з названымі раней валаснымі вучылішчамі, можна адзначыць рост колькасці дзяўчынак, ды і хлопчыкаў, сярод навучэнцаў. Звязана гэта імкненне моладзі Рудзянецкай воласці атрымаць адукацыю з блізкасцю да Гомеля, куды моладзь хацела трапіць на работу. А гэты прамысловы цэнтр, які хутка развіваўся, нібы магнітам прыцягваў да сябе адукаваных маладых людзей. З 1880 г. выкладаў у вучылішчы выхаванец Полацкай настаўніцкай семінарыі Даніїл Цімафеевіч Брацянкоў, у 1886 г. яго змяніў Кліменцій Лук'яненкаў.

Святаром у вучылішчы з 1876 г. і ўсе наступныя гады быў выхаванец Магілёўскай духоўнай семінарыі Георгій Аляксандравіч Бржазінскі.

У валасным цэнтры, в. Недайка, народнае вучылішча адкрылася ў 1873 г. На яго ўтрыманне казна адпускала 172 руб. 10 кап. Навучэнцамі тут былі ў асноўным хлопчыкі: 1882 г. — 32, 1883 г. — 28, 1885 г. — 33 хлопчыкі і 4 дзяўчынкі, 1886 г. — 40 хлопчыкаў і 1 дзяўчынка. З 1 верасня 1879 г. і ўсё наступнае дзесяцігоддзе настаўнікам тут быў выпускнік Полацкай настаўніцкай

семінарыі Фёдар Пятровіч Буланаў, святаром з 1874 г. выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі Павел Страдомскі.

Некаторыя дзеці вучыліся ў навучальных установах іншых валасных цэнтраў, суседніх з Буда-Кашалёўшчынай — у Старой Рудні, Дудзічах, Меркулавічах, Стрэшыне, Салонае і інш., дзе пасля 1864 г. былі таксама адкрыты народныя вучылішчы.

З 1880-х гадоў пачалося масавае адкрыццё царкоўна-прыходскіх школ ва ўсіх валасцях. Меліся школы Міністэрства народнай асветы, а таксама земскія школы.

Да канца XIX ст. у вёсках Буда-Кашалёва і Уваравічы дзейнічалі вышэйшыя пачатковыя вучылішчы, у якіх выкладаліся алгебра, геаграфія, фізіка, гісторыя, прыродазнаўства.

Усяго да пачатку XX ст. на тэрыторыі сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна было 17 царкоўна-прыходскіх школ, у якіх навучалася 540 дзяцей, працавала каля 30 настаўнікаў. Галоўнымі прадметамі былі Закон Божы, царкоўнаславянская мова і царкоўныя спевы. За 2—3 гады навучання ў такіх школах дзеці атрымлівалі пачатковыя веды па рускай мове і арыфметыцы.

У першай чвэрці XX ст. былі адчынены яшчэ 8 школ: Сямёнаўская (1901), Івольская (1902), Дуравіцкая (1903), Патапаўская (да 1907), Буда-Люшаўская, Струкаўская (1908), Мікалаеўская (да 1913), Гусявіцкая (1914).

У 1901 г. у в. Сямёнаўка (Калініна) была адчынена трохкласная царкоўнапрыходская школа. Да гэтага часу дзяцей вучыў па чарзе ў сялянскіх хатах першы настаўнік Аляксандр Васілевіч Міронаў. У новай школе працавалі два настаўнікі: жанчына, якая вучыла дзяўчат, і мужчына, які выкладаў хлопчыкам. Тры разы ў тыдзень з Уваравіцкай царквы прыязджаў святар. Каб атрымаць сямігадовую адукацыю, патрэбна было наведваць Рудзянецкае вучылішча.

Настаўнікі народных вучылішчаў мелі жалаванне да 120 руб. у год з правам пражывання ў бясплатнай кватэры.

Канонам іудзейскай рэлігіі навучалі ў яўрэйскіх школах і малітвеных дамах, якія адчыніліся ў некаторых месцах.

У пачатку XX ст. колькасць пісьменных людзей значна ўзрасла, з'явілася магчымасць адкрыць новыя навучальныя ўстановы і з тэхнічным ухілам. Так, у 1912 г. у м. Буда-Кашалёва быў адкрыты тэхнікум лясной гаспадаркі.

Падрыхтавалі
І.Я.Краўцоў, Ф.Ф.Муха.

Царква і канфесіі

На далучаных да Расійскай імперыі беларускіх землях існавала досыць складанае канфесіянальнае становішча. Сярод хрысціян большасць складалі уніяты — каля 39%, католікі — 38%. Праваслаўных налічвалася каля 6,5%, яшчэ менш было стараверaў — 4% і пратэстантаў — 1,6% (Канфесіі на Беларусі. Мн., 1998. С. 5).

З нехрысціянскіх канфесій іудзеі складалі 9,2% насельніцтва краю, мусульмане — 1%.

На тэрыторыі ўсходняй Беларусі размеркаванне канфесій было іншым. Удзельная вага католікаў і пратэстантаў была значна ніжэйшая, практычна не было мусульман. Працэнт праваслаўнага насельніцтва быў значна большым, да таго ж тут была сканцэнтравана пераважная большасць стараверaў.

Пасля далучэння ўсходняй Беларусі царскім указам тут была дазволена дзейнасць усіх канфесій. Духавенства, пры ўмове прынясення прысягі на вернасць імператрыцы, захоўвала свае пасады і маёмасць. Але праваслаўе, якое з'яўлялася пануючай дзяржаўнай рэлігіяй, атрымала больш шырокія правы.

Амаль адразу пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай пачалося ажыццяўленне палітыкі «вяртання» уніятаў, як святароў, так і простых вернікаў, да праваслаўя — «веравызнання бацькоў і дзядоў». Ужо ў 1781 г. магілёўскі епіскап Георгій Каніскі паведамляў аб пераходзе ў праваслаўе больш як 385 тыс. уніятаў.

У 1782 г. да праваслаўя далучыліся яшчэ 18 тыс. уніятаў, у 1783 г. — 9,7 тыс. Аднак гэты працэс прыпыніўся да 1795 г. (Тамсама. С. 32). Найбольш верагодна, што менавіта ў гэты час перайшлі ў праваслаўе і большасць буда-кашалёўскіх уніятаў.

У апісаннях цэркваў і прыходаў за 1828—1829 гг. уніяты ўзгадваюцца толькі ў аколіцы Ліпінічы і ў прыходзе, дарэчы, ужо праваслаўнай, Чабатовіцкай царквы

Нараджэння Маці Божай. У далейшым, у 1839 г. уніяцкая царква на тэрыторыі Расійскай імперыі была ліквідавана. Перайшлі ў праваслаўе і чабатовіцкія уніяты, а ліпініцкія, у асноўным, у каталіцтва [Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 3097. Воп. 1. Спр. 1. Л. 3—4, 9—11; Спр. 2. Л. 13—14; Спр. 5. Л. 5—6, 13—14; Спр. 6. Л. 4—5; Спр. 11. Л. 5—6].

Праваслаўе на Буда-Кашалёўшчыне, як цалкам і па Беларусі, стала самай значнай канфесіяй.

Праваслаўныя цэрквы на тэрыторыі сучаснага раёна падпарадкоўваліся магілёўскаму епіскапу. Колькасць храмаў паступова ўзрастала. Так, на мяжы 60-х гг. XIX ст. налічвалася 8 прыходскіх цэркваў, а ў 1909 г. — ужо 10 (НГАБ. Ф. 2301. Воп. 5. Л. 2; Памятная книжка Могилевской губернии на 1909 год. Могилев, 1909. С. 110, 233).

Амаль усе праваслаўныя храмы Буда-Кашалёўшчыны ўяўлялі сабой тыповыя вясковыя цэрквы: драўляныя, на каменным ці цагляным падмурку, аднакупальныя, са званіцай, аднапрастольныя. Яны будаваліся, у тым ліку, і за кошт ахвяраванняў прыхаджан-памешчыкаў: царква Нараджэння Маці Божай ва Уваравічах — Пішчэвіча, царква Нараджэння Маці Божай у Чабатовічах — Халецкага, царква Праабражэння Гасподняга ў Івольску — Чарамісінавай. У канцы 50-х гадоў XIX ст. на рамонт храмаў былі выдзелены дзяржаўныя сродкі, што дазволіла аднавіць храмы ў Чабатовічах, Івольску, Рагіні, Старой Рудні (НГАБ. Ф. 2301. Воп. 5. Спр. 2; Ф. 3097. Воп. 1. Спр. 1—7, 11). Нягледзячы на гэта, да пачатку XX ст. большасць храмаў была ў заняпалым стане і патрабавала нават не рамонту, а перабудовы.

Царкоўныя прыходы на Буда-Кашалёўшчыне былі досыць шматлюдныя. Гэта тлумачылася ў першую чаргу невялікай колькасцю храмаў. Калі на мяжы 50—60-х гадоў XIX ст. тут было 8 цэркваў, дык на Веткаўшчыне — 20, на Чачэршчыне — 12. Але, нягледзячы на шматлікасць прыхаджан, забеспячэнне мясцовага духавенства было досыць дрэннае.

Да прыняцця 20.7.1842 г. «Палажэння аб забеспячэнні праваслаўнага духавенства Заходняга краю» святары жылі на ахвяраванні прыхаджан. Але мясцовыя сяляне, як ужо адзначалася, заможнымі ў большасці не былі. Таму святары павінны былі самі клапаціцца аб сабе, у тым ліку не заўсёды законным шляхам. Так, святар Івольскай Праабражэнскай царквы В.К.Шчэрбаў у 1829 г. быў затрыманы падчас самавольнай высечкі лесу (НГАБ. Ф. 3097. Воп. 1. Спр. 5. Л. 9—10).

З 1.1.1843 г. святарам прызначалася дзяржаўнае ўтрыманне. Памеры яго былі досыць сціплыя — ва Уваравіцкім прыходзе святару прызначалася 180 руб. у год, дзякану — 80 руб., дзячку — 40 руб. Таму паборы з прыхаджан не спыняліся. Акрамя грашовага ўтрымання прычтам вясковых прыходаў выдзялялася ворная і агародная зямля агульным памерам 33 дзесяціны.

Уся праца па абслугоўванні царквы ўскладалася на сялян. Яны павінны былі ў спецыяльна вызначаныя дні, як і на паншчыне, рамантаваць царкоўныя пабудовы, агароджы, забяспечваць царкву палівам, апрацоўваць царкоўную зямлю.

Нормы (урокі) выканання такіх работ у 1851 г. для прыхаджан Свята-Мікалаеўскай царквы ў с. Старая Беліца, што належала памешчыкам Перасвет-Солтанам з Буда-Кашалёўшчыны, былі наступныя: усяго на 1 дзесяціну працоўных дзён прыпадала ворных цяглых — 18, паўцяглых — 18; сенакосных цяглых — 2, паўцяглых — 5.

Святары Буда-Кашалёўшчыны ў большасці мелі спецыяльную багаслоўскую адукацыю. Амаль усе яны былі выхаванцамі Магілёўскай семінарыі.

Навучанне ў семінарыі праводзілася па досыць шырокай праграме. Акрамя багаслоўскіх дысцыплін семінарысты вывучалі рускую мову і літаратуру, рускую і сусветную грамадзянскую гісторыю, філасофію, мовы: у пачатку XX ст. — грэчаскую, лацінскую, французскую — абавязкова і на выбар, без адзнакі, нямецкую ці яўрэйскую — ідыш. Таксама вывучалі логіку, дыдактыку, псіхалогію, алгебру, геаметрыю, фізіку, а з сярэдзіны 40-х гадоў XIX ст. — аграномію. Выпускнікі семінарыі, акрамя святарства, маглі абраць шлях настаўніка народных вучылішчаў. Калі ж выпускнік адмаўляўся ад кар'еры святара ці настаўніка, ён мусіў вярнуць грошы, што былі затрачаны на яго навучанне. У пачатку XX ст. гэта было 336 руб. 67 кап. (Грыгаровіч І.І. Беларуская іерархія. Мн., 1992. С. 31—33; НГАБ. Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 141. Л. 4—5 адв.).

У параўнанні з праваслаўем каталіцтва на Буда-Кашалёўшчыне было прадстаўлена значна менш. Большасць мясцовай шляхты былі каталікамі: Перасвет-Солтаны, Халецкія, Фашчы, Палонскія, Львоўскія, Дарыя-Дзерналовічы, Завітневічы, Венцславовічы і іншыя.

Своеасаблівымі мясцовымі цэнтрамі каталіцтва былі аколіца Лапічы і сяло Ціхінічы, дзе ў канцы XIX ст. адкрыты касцёлы, а таксама Люшаў, дзе касцёл існаваў яшчэ з пачатку XVII ст. (Список населенных мест Могилевской губернии. 1908 г. Б. м., б. г. С. LVI – LVII, 46 – 47, 150 – 151).

У сярэдзіне XIX ст. у парафіі Люшаўскага касцёла Нараджэння Маці Божай налічвалася 827 прыхаджан, у парафіі Успенскага касцёла ў в. Радуга, да якога былі прыпісаны каталікі з Ціхінічаў і Лапічаў — 1366 чалавек (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 2301. Воп. 5. Спр. 2).

У параўнанні з праваслаўнымі, якіх тут было больш за 21 тыс. чалавек, каталікі складалі нязначную колькасць вернікаў.

Іудзеяў на Буда-Кашалёўшчыне таксама было няшмат. Існавалі сінагога і малітоўная школа ва Уваравічах і сінагога ў Рагіні. На жаль, не захавалася статыстычных даных аб колькасці іудзеяў. Няма звестак і аб колькасці зусім нешматлікіх на Буда-Кашалёўшчыне старавераў. Іх вёсак тут не было, асобныя перасяленцы з'яўляліся ўжо ў парэформенны час. Так, сяляне Анікеічы набылі ў Івольскай сялянскай грамады 246 дзесяцін, сям'я Кушняровых валодала 90 дзесяцінамі ў наваколлі хутара Ігнатаўка, Пічуновы валодалі 345 дзесяцінамі на хутары Хачэмля (Список населенных мест Могилевской губернии. С. 46 – 47, 149 – 151).

Такім чынам, канфесіянальнае становішча на тэрыторыі Буда-Кашалёўшчыны было на той час тыповае для ўсёй ўсходняй Беларусі.

В. І. Сычоў.

ЦЭРКВЫ І ПРЫХОДЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БУДА-КАШАЛЁЎШЧЫНЫ

Павет, дабрачынне	Населены пункт, храм	Колькасць прыхаджан.			Заўвагі
		Мужч.	Жанч.	Усяго	
Гомельскі пав., Уваравіцкае дабрачынне	Уваравічы, Нараджэння Маці Божай	1631	1673	3304	36 дзес. зямлі, святары: дабрач. А.П.Петрашэня (1811 – 1838), Д.В.Страчановіч (1829), І.Г.Саракалетаў (1834 – 1844), В.І.Саракалетаў (1847 – ?), К.Саракалетаў (1909)
	Рудзянец	1729	1834	3563	36 дзес. зямлі, святары: Главінскі (1825), Леплінскі (1827 – 1848)
	Чабатовічы, Нараджэння Маці Божай	808	884	1692	30 дзес. зямлі, святары: М.В.Далгаполаў (1814 – пасля 1848), С.Бекарэвіч
Рагачоўскі пав., Рагачоўскае дабрачынне	Забалоцце, Пакроўская Екацярынінская прыпісная	556	569	1125	
Рагачоўскі пав., Чачэрскае дабрачынне	Недайка, Троіцкая	1109	1195	2304	Святар В.Скальскі, 1909
	Кашалёў, Міхайлаўская	1464	1609	3073	Святары В.Чулкевіч, І.Савініч, 1909
	Рагінь, Мікалаеўская	1288	1382	2670	Святар І.Валійскі, 1909
	Крыўск, Мікалаеўская прыпісная	8121	9712	17 833	Прыпісана да Свержаня
	Глазаўка, Пакроуская				Святар Барсукоў, 1909
	Царкоўе				І.Ксяндзоў, 1909

НОРМЫ (УРОКІ) ПРАЦЫ СЯЛЯН ПА АБСЛУГОЎВАННІ ЦАРКВЫ

Назвы работ	Пад азіміну, дзён		Пад яравыя, дзён		Сенакос, дзён	
	Цягл.	Паўцягл.	Цягл.	Паўцягл.	Цягл.	Паўцягл.
3-разовае ворыва сахой	9	—	6	—		
Правядзенне барознаў	1/2	—	1/2	—		
Баранаванне (2-3-разовае)	3	—	2	—		
Ачыстка барознаў рыдлёўкай	—	1/2	—	1/2		
Вываз на палі гною (42 вазы)	6	—	6	—		
Раскідванне гною		1		1		
Вываз на палі насення	1/4	—	1/4	—		
Сяўба	—	1/4	—	1/4		
Уборка ўраджаю	—	9	—	6		
Перавозка збожжа ў гумно	1/2	—	1	—		
Укладка ў сцірты	—	1/2	—	1/2		
Малацьба, веянне збожжа	—	9	—	6		
Розныя патрэбы	—	3/4	—	3/4		
Касьба сена					—	2
Прасушка, укладка ў копы					—	2
Укладка сена ў сцірты					—	1
Перавозка сена					2	—

Усяго на 1 дзесяціну працоўных дзён: ворных цяглых — 18, паўцяглых — 18; сенакосных цяглых — 2, паўцяглых — 5.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 3013. Воп. 1. Спр. 148. Л. 309.

ДЗЁННЫЯ НОРМЫ (УРОКІ) ПРАЦЫ СЯЛЯН ПА АБСЛУГОЎВАННІ ЦАРКВЫ

1. Узворванне 1/3 дзес. 1 канём ці 2 валамі, сахой.
2. Баранаванне 1/2 дзес., 2-разовае.
3. Вывазка на поле 7 вазоў гною.
4. Вывазка насення для сяўбы на 4 дзес.
5. Перавозка ў гумно 6 коп збожжа.
6. Перавозка 3 вазоў сена па 25 пудоў.
7. Перавозка на 15 вёрст 20—25 пудоў грузу.
8. Перавозка 1/3 сажні дроў.
9. Сяўба збожжа на 4 дзес.
10. Уборка 1 капы азімых ці 1,5 капы яравых.
11. Касьба на 1/3 дзес.
12. Увязка 3 коп збожжа.
13. Малацьба азімага збожжа з 1.04 па 1.10—50 снап. (40 снап.).
14. Малацьба яравога збожжа з 1.04 па 1.10—70 снап. (50 снап.).
15. Укладка ў сцірты збожжа з 2 дзес.
16. Раскідванне гною на 1 дзес.
17. Касьба сена на 1/2 дзес.
18. Уборка сена з 1/2 дзес.
19. Укладка сена ў сцірты з 1 дзес.
20. Высечка дроў 1/3 дзес.

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 3013. Воп. 1. Спр. 148. Л. 309 адв.

Падрыхтаваў В.І.Сычоў.

У гады першай расійскай рэвалюцыі

Напярэдадні рэвалюцыі 1905—1907 гг. на тэрыторыі цяперашняга Буда-Кашалёўскага раёна вялі прапагандысцкую работу арганізацыі розных сацыялістычных партый — Гомельскі камітэт Бунда, Палескі камітэт РСДРП і інш. У сялянскім асяроддзі найбольшай папулярнасцю карысталіся агітатары Гомельскага камітэта партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў (эсэраў). Гэта тлумачылася тым, што эсэраўскія праграмныя палажэнні, якія прадугледжвалі канфіскацыю ўсіх памешчыцкіх,

манастырскіх, удзельных і дзяржаўных зямельных уладанняў і далейшую сацыялізацыю ўсёй зямлі, у найбольшай ступені адпавядалі надзённым патрабаванням сялянскай масы.

На Буда-Кашалёўшчыне, як і ўвогуле ў гомельскім рэгіёне, сялянства асабліва пакутавала ад вострага малазямелля. Сярэднія памеры зямельнага надзелу на душу насельніцтва тут былі значна ніжэйшыя, чым у цэлым па Расіі. Гэта акалічнасць вымушала сялян весці барацьбу з мясцовымі латыфундыстамі самымі рашучымі сродкамі. Іх часта насільны характар тлумачыўся перш за ўсё тым, што ва ўмовах суцэльнай грамадзянскай бяспраўнасці пераважная большасць насельніцтва абараніць свае інтарэсы легальнымі метадамі не мела магчымасці.

Так, 9 ліпеня 1905 г. адбылася забастоўка сялян в. Міхалеўка, якія патрабавалі павышэння заработнай платы. Сяляне з'явіліся ў маёнтак Гута памешчыцы Селіверставай і пад пагрозай прымянення сілы прымусілі спыніць работу тых, хто не далучыўся да забастоўкі. 11 ліпеня забастоўшчыкі, узброеныя віламі, нажамі, кісцянямі, знялі з работы працаваўшых у фальварку. Яны зноў прыйшлі ў маёнтак Гута, дзе іх сустрэла паліцыя. Аднак гэта мера не аказала неабходнага ўздзеяння і, як бачна з данясення Магілёўскага губернатара таварышу міністра ўнутраных спраў, сяляне «трымалі сябе вельмі дзёрзка, з выклікам» (Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 3. Мн., 1953. С. 505).

Паводле сведчання ўдзельніка гэтых акцый Н.Г.Карнеева, выступленне сялян в. Міхалеўка было арганізавана мясцовай рэвалюцыйнай групай (дэмакратамі). Праз два тыдні ў в. Міхалеўка прыбылі казакі. Стараста сабраў усіх жыхароў на сход. Потым казачы афіцэр запатрабаваў выдаць кіраўнікоў забастоўкі. Але вяскоўцы трымаліся мужна і нікога не выдалі. Казакі арыштавалі 5 чалавек, якіх з-за адсутнасці доказаў праз некаторы час вызвалілі (Архіў Гомельскага абласнога краязнаўчага музея. Ф. 5. Спр. 264. Л. 1).

Выступленні сялянства, якое знаходзілася пад цяжкім сацыяльным і нацыянальным прыгнётам, адбываліся і ў іншых месцах Буда-Кашалёўшчыны. Паводле данясення магілёўскага спраўніка, у маёнтку Зарэчча сяляне гуртам, нягледзячы ні на якія пераконванні мясцовых улад, працягвалі травіць засеяныя канюшынай палі, пагражалі забойствам служачым эканоміі, якія спрабавалі праганяць жывёлу з патравы (Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Т. 3. С. 505). Трэба адзначыць, што такія выступленні супярэчылі праграмным і тактычным устаноўкам як РСДРП, так і партыі эсэраў, якія імкнуліся абмежаваць размах барацьбы рамкамі перш за ўсё палітычных патрабаванняў (Устаноўчага сходу, дэмакратычнай рэспублікі і г. д.). Прыхільнікамі актыўных дзеянняў — патраў, парубак, самавольных захопаў, запашак і іншых разнавіднасцей так званага «аграрнага тэрору», якія былі для сялян традыцыйнымі сродкамі барацьбы, — выступалі толькі анархісты і эсэры-максімалісты (ультралевае крыло партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў). Яны патрабавалі рэалізацыі ў ходзе сацыяльнай рэвалюцыі праграмы «максімум» — перадачы непасрэдна ў рукі народа не толькі зямлі, але і заводаў, фабрык і самой дзяржаўнай улады.

У снежні 1905 г. у час Усерасійскай чыгуначнай забастоўкі ст. Гомель і ўчастак Гомель — Жлобін Лібава-Роменскай чыгункі, у тым ліку і ўсе станцыі і лінія на тэрыторыі сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна, былі захоплены рабочымі ў свае рукі. Калі на задушэнне забастоўкі была кінута карная экспедыцыя генерала Арлова, які раней праславіўся сваёй жорсткасцю ў барацьбе з вызваленчым рухам у Прыбалтыцы, то паміж станцыямі Уза і Касцюкоўкай баявая рабочая дружына намагалася арганізаваць крушэнне поезда з драгунамі, якія рухаўся на Гомель.

Жыхары Буда-Кашалёўшчыны бралі актыўны ўдзел у падзеях першай расійскай рэвалюцыі і ў іншых рэгіёнах імперыі. Матрос Радзівон Пятровіч Каратачкін, які быў прызваны ў армію ў 1902 г. з в. Кастрышча Кашалёўскай воласці, у ліпені 1906 г. стаў адным з ініцыятараў узброенага выступлення матросаў і салдат Кранштата.

Радзівон Каратачкін служыў на флоце ўжо 4 гады і карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод таварышаў, даўно праводзіў сярод матросаў рэвалюцыйную агітацыю. Ён быў адным з тых, хто першы заклікаў матросаў 4-га Балтыйскага флоцкага

экіпажа арыштоўваць афіцэраў і захопліваць зброю. Агульнае ж кіраўніцтва выступленнямі як 4-га экіпажа, так і іншых экіпажаў 1-й дывізіі ажыццяўляў былы дэпутат Дзяржаўнай думы Аніпка.

Адначасова паўстанне пачалося і ў часцях 2-й дывізіі. У 11 гадзін вечара сацыяліст-рэвалюцыянер матрос Мікалай Ягораў штыком закалоў дзяжурнага афіцэра.

Пасля аб'яднання рэвалюцыйных матросаў 1-й і 2-й дывізій кіраўнікам паўстання стаў М.Ягораў. Але спроба прыцягнуць на свой бок Енісейскі пяхотны полк не мела поспеху: енісейцы засталіся верныя свайму камандаванню і адкрылі па паўстанцах агонь. Пасля жорсткай перастрэлкі рэвалюцыйныя матросы, што засталіся без боепрыпасаў, былі вымушаны адступіць. Пачаліся аблавы і масавыя арышты. Хутка пала апошняя апора паўстаўшых, якая знаходзілася ўвесь час пад абстрэлам, захоплены мінёрамі форт «Канстанцін». Выратавацца ад карнікаў удалося нямногім. Быў арыштаваны і апазнаны як адзін з галоўных «зачыншчыкаў» беспарадкаў і Радзівон Каратачкін. Ён быў расстраляны 21 верасня 1906 г. каля Кранштата разам з 18 іншымі ўдзельнікамі паўстання.

Жорсткія рэпрэсіі ў адносінах да ўдзельнікаў паўстання выклікалі акты насілля з боку рэвалюцыянераў.

26 снежня 1906 г. кіраўнік Кранштацкага паўстання матросаў Мікалай Ягораў, які пасля яго задушэння ўступіў у лятучы баявы атрад Паўночнай вобласці, расстраляў галоўнага ваеннага пракурора Паўлава. Мікалай Ягораў быў пакараны смерцю ў пачатку 1907 г.

Баявая арганізацыя эсэраў-максімалістаў, у склад якой уваходзілі і ўраджэнцы Гомельшчыны Іван і Аляксандр Малеевы, Эльля Забельшанскі і член баявой дружыны Гомельскага камітэта партыі эсэраў Іван Мішын («Ваня-малый»), таксама прыняла рашэнне аб арганізацыі замаху на аднаго з найбольш высокапастаўленых чыноўнікаў — прэм'ер-міністра Сталыпіна.

12 жніўня 1906 г. яго дача на Аптэкарскім востраве ў Санкт-Пецярбургу была ўзарвана Э.Забельшанскім, І.Мішыным і Н.Івановым, якія загінулі ў выніку замаху.

Паражэнне рэвалюцыі прывяло большасць сацыялістычных партый у стан цяжкага крызісу. Пад уплывам правых дзеячаў Гомельскі камітэт партыі эсэраў перайшоў да тактыкі «малых спраў». Члены Гомельскага камітэта прысяжны паверааны Ф.Г.Калашнікаў, прыватны паверааны Г.Л.Файгенберг, адзін са старшынь Гомельскага камерцыйнага сходу Р.І.Пеўзнер прынялі ўдзел у стварэнні таварыства патранажу, якое аказвала дапамогу асобам, вызваленым з месцаў зняволення. Таварыства пачало дзейнічаць у 1910 г. і аказвала грашовую дапамогу былым зняволеным. Праз некаторы час таварыства купіла на Буда-Кашалёўшчыне ў маёнтку Радзеева, што за 2 вярсты ад раз'езда № 23 Лібава-Роменскай чыгункі, 30 дзесяцін зямлі для арганізацыі выхаваўча-папраўчай зямельна-рамесніцкай калоніі для непаўналетніх злачынцаў, якія займаліся жабрацтвам і бадзяжніцтвам. Выбар месца для будаўніцтва калоніі, відавочна, быў звязаны з тым, што земскім начальнікам 2-га ўчастка, у які ўваходзіла ў той час Целяшоўская воласць з цэнтрам у м. Уваравічы, быў памешчык П.І.Перасвет-Солтан, які жыў ва Уваравічах і адначасова быў таварышам старшыні таварыства патранажу.

У Радзееве былі ўзведзены будынкі для выхавальнікаў, адміністрацыі і майстэрняў. Меркавалася адкрыць калонію восенню 1914 г., але перашкодзіла сусветная вайна, якая абвастрыла да крайнасці ўсе супярэчнасці самадзяржаўнай Расіі і выклікала новы рэвалюцыйны крызіс: масы рашуча ўзняліся на барацьбу за ўладу, зямлю і волю.

Ю.Э.Глушакоў.

Дакументы сведчаць

ДАНЯСЕННЕ ШТАБС-КАПІТАНА КОРПУСА ЖАНДАРАЎ У МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ НАЧАЛЬНІКУ III АДДЗЯЛЕННЯ АБ АДМОВЕ СЯЛЯН МАЁНТКА НЕДАЙКІ АДБЫВАЦЬ ДВУХДЗЁННУЮ ПАНШЧЫНУ

15 красавіка 1861 г.

Могилевской губ. Рогачевского у. в им. Недойки помещика Пересвет-Солтана, заключающемся в 700 душах, крестьяне отказались отбывать барщину, как прежде отбывали 2 дня

в неделю, объявив, что они более 1 дня в неделю отрабатывать помещику не будут; в имение сие съезжал земский исправник, но все убеждения его остались без успеха, о чем он и донес начальнику губернии.

Находящийся здесь свиты е. вел. контр-адмирал Зарин по совещании об этом с начальником губернии с. ч. отправляется в означенное имение для личного разъяснения и внушения крестьянам их обязанностей в отношении к помещику, а для лучшей обстановки при этом случае сделано распоряжение, чтобы квартирующая вблизи этого имения рота Могилевского резервного батальона к приезду контр-адмирала Зарина перешла на квартиру в им. Недойки. Доводя о сем до сведения в. с., имею честь присовокупить, что о последствиях поездки контр-адмирала Зарина я не премину донести.

Полковник Соколов 1-й.

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861 – 1862). [Док. № 224. С. 397 – 398.]

ВЫКУПНЫ ДАГАВОР СЯЛЯН ВЁСКІ ГЛАЗАЎКА ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

31 жніўня 1863 г. *

Крестьянам д. Глазовки совокупно с усадебной оседлостью продаются полевые земли и угодия в высшем размере душевого надела.

Д. Глазовка принадлежит Марии Алексеевне Хлюдзинской (урожд. Пересвет-Солтан), Изобеле и Мальвине Пересвет-Солтан.

Временнообязанные крестьяне д. Глазовки Чеботовичской волости Глазовского сельского общества, в числе 270 рев. душ муж. пола, приобретают земли целым сельским обществом полный душевой надел.

По уставной грамоте предоставлено в пользование крестьянам д. Глазовки 1085 дес. 1500 саж. кв., неполный душевой надел по 4 дес. 50 саж. кв., но по их желанию и согласию владельцев уступает им полный высший душевой надел, т. е. по 4 дес. 100 саж. кв. на ревизскую душу, что составит на 270 рев. душ 1215 дес. Оброка с них причитается по 8 руб. серебром, со всех 2160 руб. По капитализации сего оброка выкупная сумма составляет 36 тыс. руб. серебром. Сумма, испрашиваемая от правительства, 28800 руб., а доплаточная от крестьян 1/5 часть - 7200 руб. Крестьяне состоят на издольной повинности. Оброка с них подлежит 2160 руб., а по капитализации оброка следует владельцам платежи от правительства 28800 руб. и дополнительно сверх ссуды от правительства платежа от временнообязанных крестьян д. Глазовки 7200 руб., оплата коей разлагается с согласия владелиц на 12 лет по 600 руб. в год. Означенные деньги сельский староста или сборщик должны ежегодно собирать с крестьян и вносить под расписку помещицы 1 января и 15 октября. Если деньги не будут сполна внесены в означенные сроки, то крестьяне обязываются отбывать взамен оставшегося в недоимке платежа, в летнее рабочее время соответствующее число рабочих дней, считая мужской с лошадью или парой волов рабочий день в 0, 30 руб., пеший в 0, 20 руб. сер.

Право продажи питей остается в исключительном пользовании владельцев имения.

Выгон и прогон скота остаются общими, как для крестьян, так и для владельцев (10 десятин).

Временнообязанные крестьяне обязываются беспрекословно, до присылки им крепости и ввода их во владение выкупаемой землей, отбывать согласно уставной грамоте издольную повинность.

За исправность платежа и неуклонное отбывание издольной повинности, а равной и могущей быть недоимки, все общество временнообязанных крестьян ответствует друг за друга круговой порукой.

В предположенном отводе для крестьян земли весь находящийся лес остается в пользовании крестьян, кроме дубовых дерев толщиной от 5 вершков, которые владельцы оставляют за собой и должны вырубить в течение 5 лет.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 2003. Воп. 1. Спр. 632. Л. 58 – 60.

---

*Дата зацвярджэння дагавора.

ЗВАРОТ ДА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА ЖЫХАРОЎ ВЁСКІ БУДА-ЛЮШАЎСКАЯ СТАРАРУДНЯНСКАЙ ВОЛАСЦІ РАГАЧОЎСКАГА ПАВЕТА МАЦВЕЯ ФАМІНА І АЛЯКСЕЯ АНДРЭЕВА

24 чэрвеня 1896 г.

В 1855 году мы поступили в военную службу и вышли уже в отставку в 1876 г. и лишились права на получение от казны 3 руб. пособия, а также не попали по освобождении крестьян от крепостной зависимости под наделение землей и проживаем в деревне Люшевская Буда безземельными со своими семействами, которые состоят из нас, Матвея Фомина, жены, 5 сыновей и дочери и Алексея Андреева, жены и 2 сыновей, и положительно не имеем никаких источников чем заниматься в престарелых летах, а дети малолетние хотя могут чем заняться, но земли нет, то все должны скитаться за насущным куском хлеба и без всякого приюта. А так как отставным нижним чинам предоставлено Правительством... поселяться... в Кубанской области и по Закавказкому краю на казенной земле, посему имеем честь покорнейше просить Ваше Превосходительство произвесть о нашем семейном положении дознание, а так же и о том, что мы безземельные, и по убеждении исходя из ходатайствований нам разрешения на право переселения в Кубанскую область или в Закавказский край, о чем нам и объявить по месту жительства.

АПІСАННЕ СЯМ'І І ГАСПАДАРКІ МАЦВЕЯ ФАМІНА

Рабочих душ мужск. пола 3, женского — 2

Нерабочих душ мужского пола 3, женского — 2

Земли нет. Оценка хозяйства — 120 руб (дом и надворные постройки, овин, скот — 1 лошадь, 1 корова, 2 телки, 2 свиньи). Заработки — рубка и возка леса у лесопромышленников, но они недостаточны для обеспечения семьи.

Арендная плата — пахотная земля 3—6 руб. за десятину, сенокосная — 10—25 рублей.

Рэзалюцыя на дакуменце: у хадайніцтве аб перасяленні адмовіць у сувязі з адсутнасцю сродкаў у сям'і.

11. IV. 1897 г.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 2014. Воп. 1. Спр. 1604. Л. 4—8.

Падрыхтаваў В. І. Сычоў.

СТАТЫСТЫЧНЫЯ ДАНЫЯ ПА НЕКАТОРЫХ МАЁНТКАХ НА ТЭРЫТОРЫІ СУЧАСНАГА БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА Ў 2-й ПАЛАВІНЕ XIX СТАГОДДЗЯ

Вёска (маёнтак, фальварак), уладальнік	Двароў	Душ (м.-ж.) працазд.	Зямлі ў дзес.			Урадлівасць	Павіннасць м.+ж.
			Усяго	Сялян	Надзел		
1	2	3	4	5	6	7	8
Сінічына вёска, маёнтак Уласьеў	?	124—125 64—61	1223,5	661	сядзібны 1,1/3; ворыўны 6,0 сенакос 2,2/3 Усяго 10	збожжавых сам-3 сена 100 пудоў з дзесяціны	прыгон 2+2 у тыдзень 12+12 у год
Віктарын маёнтак Ф.Дарыяловіча	?	596—563 321—319	12 618	3007	сядзібны 1,1/3; ворыўны 6,0 сенакос 3,0 Усяго 10,1/3	збожжавых 2,1/2	прыгон 2+2 у тыдзень 18+14 у год
Івольск, вёска і фальварак Дунін-Баркоўскі	55 цяглых 2 бабылёў ?	230—236 4043	1033,1/3		сядзібны 1,1/3 ворыўны 6,0 сенакос 2,2/3 Усяго 10	збожжавых сам-3 сенакос 70 пудоў з дзесяціны	прыгон 2+2 у тыдзень 8+8 у год
Дзербічы, фальварак, Чыжыцкі	28	59—57 35—35	582	286	сядзібны 1,1/3 ворыўны 6,0 сенакос 3,0 Усяго 10/3	збожжавых сам-4 сена 80 пудоў з дзесяціны	прыгон 2+2 згон 18+14

1	2	3	4	5	6	7	8
Люшаў Случаноўскі	35	93 – 98 45 – 43		360	сядзібны 1/2 ворыўны 6,0 сенакос 1,1/2 Усяго 8	збожжавых сам-3 сена 125 пудоў з дзесяціны	прыгон 2+2 згоны 9+9
Недайка, фальварак Нолькен	?	57 – 63 27 – 28	856	274,1/3	сядзібны 1,1/3 ворыўны 6,0 сенакос 2,2/3 Усяго 10	збожжавых сам-6 сена 80 пудоў з дзесяціны	прыгон 2+2 згон 6+6
Сямёнаўка, фальварак Драбышэўскі	?	22 – 23 10 – 12	300	120	сядзібны 1/2 ворыўны 8,0 сенакос 1,1/2 Усяго 10	збожжавых сам-3 сена 80 пудоў з дзесяціны	прыгон 2+2 згон 8+8
Крыўск, фальварак, Караткевіч	?	11 – 14 5 – 6	102, 2/3	42,1/3	сядзібны 1,1/4 ворыўны 6,0 сенакос 2 Усяго 9,1/4	збожжавых сам-3 сена 120	прыгон 2+2 згон 8+8
Фундамінка, Сенажэнскі	41	182 – 190 98 – 83	1893	1082, 1/1	сядзібны 1/2 ворыўны 6,5/8 сенакос 2,0 Усяго 9,1/8	збожжавых сам-4 сено 100 пудоў з дзесяціны чынш	прыгон 2+2 згон 8+8 3,95 рубля

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1297. Воп.1 . Спр.18715. Л.118 – 215; Спр.18718. Л.6 – 27.

РАЗВІЦЦЁ ПРОМЫСЛАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА Ў 70—80-я ГАДЫ XIX ст. (ПА НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ)

Населены пункт	Двароў/душ	Кушнерскі шавецкі кравецкі, дв./душ	Занята ў промыслах					Усяго, дв./душ
			Драбіна-калёсны, дв./душ	Сталярна-бандарны, дв./душ	Алейны, дв./душ	Кавальскі, дв./душ	Раміз-ніцтва, дв./душ	
1	2	3	4	5	6	7	8	9
УВАРАВІЧЫ	154/701	14/32	5/5	12/12	–/–	6/7	–/–	37/56
РУДЗЯНЕЦ	88/250	3/3	1/1	–/–	–/–	1/1	–/–	5/5
ПЯНЧЫН	110/459	3/4	6/6	3/3	–/–	–/–	–/–	12/13
РАДЗЕЕВА	75/398	4/6	–/–	2/2	–/–	–/–	–/–	6/8
ХОЎХЛА	48/298	2/3	–/–	–/–	–/–	1/1	–/–	3/4
КРЫЎСК	82/384	2/2	–/–	1/1	3/6	1/1	–/–	4/4
ЦАРКОЎЕ	77/475	3/3	–/–	5/5	1/2	–/–	40/40	48/48
ЛОЗАЎ	70/401	5/5	–/–	–/–	1/2	–/–	15/15	20/20
ДЗЕРБІЧЫ	34/188	1/1	–/–	1/1	–/–	–/–	–/–	2/2
ЗАБАЛОЦЦЕ	107/711	–/–	–/–	–/–	–/–	–/–	25/30	25/30
ЛАПІЧЫ	24/142	4/4	–/–	–/–	–/–	–/–	–/–	4/4
ЦІХІНІЧЫ	10/162	1/1	–/–	–/–	–/–	1/1	–/–	2/2
НОВАЯ ГУСЯ-ВІЦА	70/418	3/3	70/70	2/2	–/–	–/–	–/–	70/75
СТАРАЯ ГУСЯ-ВІЦА	62/344	–/–	60/60	5/5	–/–	2/2	–/–	62/69
ЧАБАТОВІЧЫ	115/562	2/2	–/–	1/1	–/–	1/1	–/–	4/4
БАЦУНЬ	53/334	1/1	8/8	–/–	–/–	–/–	–/–	9/9
СІНІЧЫНА	58/363	2/2	1/1	–/–	–/–	1/1	–/–	4/4
МАРОЗАВІЧЫ	78/363	2/2	10/10	1/1	–/–	–/–	–/–	13/13
ФУНДАМІНКА	83/456	1/1	–/–	1/1	2/4	–/–	–/–	2/2
СЯЛЕЦ	48/243	2/2	–/–	–/–	–/–	–/–	24/94	26/96
ІВОЛЬСК	95/490	1/1	–/–	1/1	–/–	1/1	–/–	3/3

1	2	3	4	5	6	7	8	9
БЯРВЁНАЎКА	20/113	1/1	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	1/1
НЕДАЙКА	90/680	—/—	8/17	—/—	—/—	—/—	30/50	38/67
ІВАНАЎКА	56/328	—/—	31/72	—/—	1/2	—/—	—/—	31/72
ЖЫТАНЕЖЖА	28/202	—/—	10/15	—/—	—/—	—/—	—/—	10/15
ГЛАЗАЎКА	118/648	—/—	—/—	15/15	—/—	—/—	—/—	15/15
КАШАЛЁЎ	176/1031	—/—	—/—	1/1	—/—	—/—	70/135	71/136
СЯМЁНАЎКА	110/480	—/—	—/—	1/1	—/—	1/1	—/—	2/2
ШАЦІЛАЎКА	7/53	—/—	—/—	1/1	—/—	—/—	—/—	1/1
НАСПА	—/—	—/—	—/—	—/—	1/1	—/—	—/—	—/1
НЕГАЎКА	—/—	—/—	—/—	—/—	2/4	—/—	6/14	6/18
АСІНАЎКА	—/—	—/—	—/—	—/—	5/10	—/—	—/—	—/10
ЛЮШАЎ	—/—	—/—	—/—	—/—	1/2	—/—	—/—	—/2
РУДНЯ-ЛОЗАВА	32/198	—/—	—/—	—/—	2/4	2/2	8/8	10/14
ГАЛАВАЧЫ	53/312	—/—	—/—	—/—	1/2	1/1	13/13	14/16
АНТОНАЎКА	20/120	—/—	—/—	—/—	—/—	1/1	—/—	1/1
СМЫЧАК	38/198	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	3/5	3/5
РАГІНЬ	93/583	2/2	—/—	2/2	3/6	1/1	63/63	68/74
ЕЛЯНЕЦ	70/509	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	21/47	21/47
КЛЯНОВІЦА	33/182	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	4/5	4/5
БУДА-КАШАЛЁВА	28/223	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	26/54	26/54
РУДНЯ-КАШАЛЁЎСКАЯ	32/256	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	20/62	20/62
БУШАЎКА	103/672	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	17/37	17/37
СЛАВЯНЕЦ	45/290	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	13/22	13/22
ПАТАПАЎКА	82/689	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	19/41	19/41
ШАРЫБАЎКА	64/440	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	16/28	16/28
СТРУКІ	38/257	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	2/5	2/5
БРОННІЦА	34/253	—/—	—/—	—/—	—/—	—/—	3/4	3/3
ЛІПА	71/395	2/2	1/1	1/1	1/2	1/1	10/12	15/19

Табліца складзена паводле кн.: Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии. Могилев, 1883. Т. 2. С. 302, 354, 368—369, 409—410, 415—419, 433, 444, 447, 492—498, 500, 509—511, 521—523.

ФАБРЫЧНА-ЗАВОДСКІЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ НА БУДА-КАШАЛЁЎШЧЫНЕ Ў КАНЦЫ XIX — ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

Предприятия	Год осн.	Место-нахождение	Владельцы	Мощность	Количество рабочих
1	2	3	4	5	6
Стекольный з-д	1898	у д.Наспа (д.Кленовицы)	АВРАМОВ М.П. КУРЫНДИН Г.С.	-	45
Винокуренный з-д № 150, сгорел, восстановлен	1880 1885	м.Уваровичи	АКЦИЗ П.И.	16 л.с.	9
Винокуренный з-д № 133	1892	с.Чеботовичи им. Засовье	ВЕНЦСЛАВОВИЧ Валер. Людв., землевл., катол., дворянин		9
Винокуренный з-д № 131	1893	с. Рогинь	ДОРИА-ДЕРНАЛОВИЧ Стеф. Цез., дворянин, катол.	8 л.с.	8
Винокуренный з-д № 10	1900	с.Дуравичи	ДРИБИНЦЕВ Сав.Тимоф., купец	10 л.с.	9
Винокуренный з-д № 142	1899	х.Верхулище	ДРИБИНЦЕВ С.Т., почет. потом. г-н	20 л.с.	8

1	2	3	4	5	6
Винокуренный з-д № 145	1888	им. Гута	СУЛИСТРОВСКАЯ Ванда Игн., дворянка	12 л.с.	12
З-д сухой перегонки древесины/смола, древ.спирт, древ.уголь	1899	д.Кленовицы	ДОРИА-ДЕРНАЛОВИЧ Север.Ст., двор., годовой доход 46 300 р.		47
Винокуренный з-д		д.Наспа	ВЯЗЬМИТИНОВ Вадим Александрович	12 л.с.	8
Винокуренный з-д № 76	1907	с.Церковье	ШКЛЯРОВА А.М.	16 л.с.	6
Лесопильный з-д	1903	д.Наспа	Наслед. БАРАНОВСКОГО Д.В. – К.И.БАРАНОВСКИЙ	30 л.с.	50
Лесопильный з-д, клепка	1907	д.Гута	КУРЫНДИН Гавр. Сем., потом.поч. гражданин	60 л.с.	25
Лесопильный з-д	1898	ур.Белый Берег	ЧЕРНЫШЕВ-КРУГЛИКОВ И.И., граф		24
Крахмальный з-д	1899	им.Плюсицы	ДОРИА-ДЕРНАЛОВИЧ Эдмунд Цезарович		8
Сенопрессовальный з-д	1886	ур.Кривой Гиров	МАК-ДОНАЛЬД Яков Яковлевич, англ. подданный		164
Винокуренный з-д № 25		д.Кленовицы	РОМАНОВ Ник. Вас.	16 л.с.	8
Винокуренный з-д	1909	им. Плюсицы	ДОРИА-ДЕРНАЛОВИЧ Эдмунд Цезарович		
Дегтярный з-д	до 1909	д.Разгуляевка	ДОРИА-ДЕРНАЛОВИЧ Эдмунд Цезарович		

Табліца падрыхтавана паводле даведнікаў: Список фабрик и заводов Европейской России. СПб., 1903; Список винокуренных заводов Российской империи 1886—1888 гг. СПб., 1890; Фабрики и заводы всей России. Киев, 1913; Фабрично-заводские предприятия Российской империи. 2-е изд. Петроград, 1914.

Падрыхтаваў І.Я.Краўцоў.

* * *

Сукновальная фабрика Окуня Иделя, мещанина, иудея, м.Тихиничи Рогачевского уезда. Год основания — 1867. Мастер — 1, постоянных рабочих нет. Количество вырабатываемых изделий — 60 арш. Валовой доход — 120 рублей.

Сукновальная фабрика Ф.Паскевича, д. Прибор. Основана в 1870. Один постоянный рабочий. Изготавливалось 3500 арш. изделий. Валовой доход — 70 руб. Фабрика в аренде у купца Петра Мельникова с крупчатым заводом и мельницей за 900 руб.

Сукновальная фабрика Ф.Паскевича, д.Уза.Основана в 1830 г. Один постоянный рабочий. Изготавливалось 3300 арш. изделий. Валовой доход 66 руб. В аренде у купца Ишкола с крупчатым заводом и мельницей за 700 руб.

Сукновальная фабрика Акциз Прасковьи, дворянки, православной, м.Уваровичи. Основана в 1825 г., один постоянный рабочий. Изготавливалось 3600 арш. изделий. Валовой доход 72 руб. В аренде у крестьянина Елисея Иванова с мельницей за 120 руб.

Сукновальная фабрика Кошелевской церкви, д.Рудня — Кошелевская Рогачевского уезда. Основана в 1830. Мастер — 1. Изготавливалось 5500 арш. изделий. Валовой доход 110 руб. Фабрика в аренде у мещанина Мордуха Левицкого с мельницей за 150 руб.

Сукновальная фабрика Пузыко Николая и Алексея, дворяне римско — католического вероисповедания, с. Староселье. Год основания 1700. Мастер — 1. Изготавливалось 4500 арш. изделий, валовой доход 90 руб.

Сукновальная фабрика Дариа — Дерналовича Цезария, дворянина римско — католического вероисповедания, с.Рогинь Рогачевского уезда. Год основания — «с давних времен». Один постоянный рабочий. Изготавливалось изделий 10000 арш. Валовой доход 200 руб. Фабрика в аренде у мещанина И.Левина с мельницей за 700 руб.

Сукновальная фабрика Сулистровской Ванды, дворянки, католички, д.Липа Рогачевского уезда. Год основания 1830. Один постоянный рабочий. Валовой доход 40 руб., в аренде у мещанина Нисона Розанова с мельницей за 200 руб.

Смолярно-дегтярный завод Иситина Василия, дворянина, православного, фольварк Наспа. Год основания 1878. Один мастер и пять постоянных рабочих. Изготавливалось 2600 пуд. изделий. Валовой доход 1560 руб.

Березово — дегтярный завод Иситина Василия. Основан в 1865. Один мастер и два постоянных рабочих. Изготовляет 600 пуд. изделий в год. Валовой доход 900 руб.

Круподерный завод Блюминовой Бейли, мещанки, иудейки, м.Уваровичи Гомельского уезда.Основан в 1876. Один постоянный рабочий. Изготовлялось 280 пуд. изделий. Валовой доход 130 руб.

Паровая мельница Ф.Паскевича, д.Прибор Рогачевского уезда. Основана в 1870. Один мастер,три рабочих. В год изготавливает 1760 пуд. изделий. Валовой доход 4400 руб. В аренде у купца Петра Мельникова за 900 руб.

Паровая мельница Ф.Паскевича в д.Уза. Основана в 1841 г. Работают один мастер и трое рабочих. Вырабатывается 1280 пуд. изделий. Валовой доход 3200 руб. В аренде у купца Ишкова за 700 руб.

Кирпичный завод Акциз Прасковьи, м.Уваровичи. Год основания 1880. Имел 4 рабочих, изготовляет 100 тыс. шт. изделий. Валовой доход 1000 руб.

Кирпичный завод Яковцова Никифора и Самуйнова Карпа, крестьяне, православные, м.Уваровичи. Основан в 1876. Имел 2 рабочих. Валовой доход 600 руб.

Винокуренный завод Сулистровской Ванды, помещица, римско — католической веры, д.Гута Рогачевского уезда. Год основания 1875. Один мастер и 8 рабочих.

Матэрыял падрыхтаваны паводле кн.: Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии. Кн.2. Могилев-на-Днепре. 1884. С. 154, 157, 162, 163, 170, 181, 186, 189.

Падрыхтаваў Ю.Э.Глушакоў.

* * *

Прадпрыемствы, іх месцазнаходжанне	Год заснавання, упамінання	Уладальнік	Валавая прадукцыя	Абсталяванне	Колькасць работнікаў
1	2	3	4	5	6
в. ЦАРКОЎЕ					
Сукнавальны завод	з даўніх часоў, пасля 1881 г.	мешч. Б.Пеўзнер (1881)	20 000 арш. (1880)	млын (1880)	1
в. НАСПА					
Цукровая мануфактура	1856 — 1862 гг.	двар. Вязміцінаў	342 пуды (1859)	4 гідр. прэсы 16 катлоў (1861)	121 (1859) 132 (1861)
Лесапільна-дрэваапрацоўчы	1897 — 1913 гг.	двар. Вязміцінаў	—	—	155
Шклозавод	1897 — 1919гг.	купцы М.П.Аўрамаў Г.С.Курындзін	—	пар.рух. 50 к/с Кошт абст. 75 тыс.р. (1913)	45 (1903) 200 (1913)

1	2	3	4	5	6
Лесапільна-гантарэзны завод	1903—1914 гг.	купцы Бараноўскія	на 20 тыс.р. (1913)	пар. рух. 30 к/с	50
Лесапільна-гантарэзны завод (ур.Гута)	1907—1913 гг.	купец Курындзін Г.С.	—	пар.рух. 60 к/с (1907)	25
в. РАГІНЬ					
Вінакурны завод	1826—1913 гг.	двар. Дарыя-Дзерналовіч	—	пар. рух. 8 к/с (1900)	12
в. ЛОЗАЎ					
Сукнавальны завод	пасля 1881	дзяржаўная маёмасць, аранд.Пячорская Т. (1881)	2000 арш. (1880)	млын (1880)	1
в. ДУРАВІЧЫ					
Вінакурны завод	1826—1913 гг.	купцы Дрыбінцавы (з 1861)	—	пар. рух. 10 к/с (1900)	9
в. ЗАБАЛОЦЦЕ					
Вінакурны завод	1826—1913 гг.	двар.Дарыя-Дзерналовічы	—	пар. рух. 16 к/с (1913)	10
в. ЛІПА					
Сукнавальны завод	1840—пас. 1881	двар.Суліструоўская	12 000 арш. (1880)	млын (1880)	1
в. РУДНЯ ЛІПІНІЦКАЯ					
Сукнавальны завод	1846—1881 гг.	двар.Дарыя-Дзерналовіч,аранд. мешч.І.Рудніцкі	4600 арш. (1880)	млын (1880)	1
в. МІКАЛАЕЎКА					
Цукраварны завод	1852—1867 гг.	А.Комар	1000 пуд.	3 пар. рух. 60 к/с, 4 гідр. прэсы, 3 цэнтрыфугі, 3 катлы (імпартныя)	202 (1859)
в. МАРОЗАВІЧЫ					
Вінакурны завод	1855—1884 гг.	барон Нолькен, аранд. Н.Манапсаў	116 500 л	пар. рух. (1884)	16
в. ГУБІЧЫ					
Сукнавальны завод	1858—пасля 1881	двар.Іолшын В.	2600 арш. (1880)	—	1
в. СЯМЁНАЎКА					
Крупадзёрная фабрыка	1876—пасля 1881	мешч.Дзм.Усевіч	250 п. (1880)	—	1
в. ДЗЕРБІЧЫ					
Крупадзёрны завод	1878—пасля 1881	мешч.І.Басін	110 пудоў	—	1

1	2	3	4	5	6
в. БУДА-КАШАЛЁВА					
Ткацка-станочны завод	1888—пасля 1895	—	—	—	—
в. КАШАЛЁЎ					
Лесапільны завод	1898 — пасля 1909	купец Ардашнікаў	—	—	45
Лесапільны завод	1898	Кацнельсон	—	—	45
в. КЛЕНАВІЦА					
Вінакурны завод	1901—1903	двар.Дарыя-Дзерналовічы	—	пар. рух. 16 к/с (1908)	8
х.ВЯРХУЛІШЧА					
Вінакурны завод	1899	купец Дрыбінцаў	—	пар.рух. 10 к/с	9
ур. РАЗГУЛЯЕЎКА					
Дзягцярны завод	1909—1914	двар.Э.Д.Дарыя-Дзерналовіч	—	—	—

Друкуецца паводле наступных крыніц: Дембовецкий А.С. Опыт описания Могилевской губернии. Могилев, 1884.Кн.2; Прамысловасць дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988; Список фабрик и заводов Европейской России. СПб., 1903; Список винокуренных заводов Российской империи 1886—1888 гг. СПб., 1890; Фабрики и заводы всей России. Киев, 1913.

АБ ЧАБАТОВІЦКІМ СПАЖЫВЕЦКІМ ТАВАРЫСТВЕ

В марте 1913 г. в д.Чеботовичи открылось потребительское общество. Его председатель учитель Чеботовичской земской школы Ф.И.Прокопенко. По состоянию на 1 января 1915 г. оборот за 10 месяцев составил 14.000 руб., а валовая прибыль 3400 руб. Чистая прибыль-1300 руб. Основной капитал (вместе со взносами приказчика - 160 руб.) — 360 рублей. Членов учредителей общества было 36 человек, а на 1 января 1915 г.— свыше 100 человек.

Гомель и его уезд. Гомель, 1915. С. 53.

АПІСАННЕ НЕКАТОРЫХ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ БУДА-КАШАЛЁЎШЧЫНЫ

1908 г.

Мест. Уваровичи. Принадлежит часть Евгению, Ольге и Антону Липинским, часть Уваровичскому сельскому обществу. 25 верст от Гомеля, 5 верст от ж.д. ст. Семеновки.

Управляется мещанским управлением.

Жителей всего 2372; христиан — 1522, евреев — 850; дворян и чиновников — 17, священнослужителей — 5, мещан — 850, крестьян — 1500.

Каменных построек — 2, деревянных — 730. Мощеных улиц нет, ярмарок не бывает. Имеется почтовое отделение, сельская лечебница, ссудно—сберегательное товарищество.

Руденецкое волостное правление

Состоит из 11 сельских обществ (Руденецкое, Семеновское, Тихиничское, Лепичское, Радеевское, Пенчинское, Ново-Гусевицкое, Старо-Гусевицкое, Азделенское, Роговское, Уваровичское).

Церквей — 2 (Руденец, Уваровичи), костелов — 2 (Тихиничи, Лапичи), 1 синагога и 1 еврейская молитвенная школа (Уваровичи).

Училищ — 12 [Руденец, Блюдница, Радеево, Семеновка, Роги, Азделин, Ст.Гусевицы, Н. Гусевицы, Пенчин, Уваровичи (2)].

Винных лавок — 3 (Руденец, Семеновка, Уваровичи).

Мельниц — 36. Фабрик и заводов — нет.

Чеботовичское волостное правление

Состоит из 11 сельских обществ (Чеботовичское, Старобудское, Кривское, Ховхленское, Ивольское, Бацунское, Синичинское, Глазовское, Морозовицкое, Чернянское, Гировское).

Церквей (правосл.) — 4 (Чеботовичи, Ивольск, Глазовка, Черное).

Училищ — 9 (Чеботовичи, Ст.Буда, Кривск, Ивольск, Бацуни, Синичино, Глазовка, Черное, Морозовичи), 1 школа грамоты. Казенных винных лавок — 4 (Чеботовичи, Ивольск, Глазовка, Черное). Мельниц — 33.

Кошелевское волостное правление

Состоит их 14 сельских обществ (Кошелевское, Селецкое, Буда-Кошелевское, Шарибовское, Дуравичское, Бушевское, Бронницкое, Заболоцкое, Коромское, Потаповское, Славенецкое, Струковское, Рудня-Кошелевское, Липиничское).

Православных церквей — 3 (Кошелев, Селец, Рудня-Кошелевская), католическая каплица при имении Викторин.

Училищ — 9 (Кошелев, Буда—Кошелев, Шарибовка, Дуравичи, Бушевка, Заболотье, Потаповка, Славенец, Струки). Школ грамоты — 4.

Приемный покой — 1 (Кошелев). Казенных винных лавок — 2 (Кошелев, Бушевка). Мельниц — 46. Заводов — 2 (винокуренный — Дуравичи, дегтярный — Разгуляевка).

Недойское волостное правление

Состоит из 10 сельских обществ (Недойское, Ивановское, Житонежское, Гавельское, Наспенское, Губечское, Еленецкое, Смычковское, Кленовичское, Ольховское). Церковь—1 (Недойка). Училищ — 8 (Недойка, Житонеж, Наспа, Губичи, Еленец, Смычок, Ольховка, Гавли).

Школ грамоты — 3. Лечебница — 1 (Недойка). Казенных винных лавок — 2 (Недойка, Наспа). Мельниц — 30. Заводов — 4 (лесопильный, винокуренный — Наспа, стекольный и угольный — Кленовица).

Список населенных мест Могилевской губернии. С. XXXVII, LVI-LVII, XCIV-XCVII, CX-CXIII.

Падрыхтаваў В.І.Сычоў.

СТАТЫСТЫЧНЫЯ ДАНЫЯ АБ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ БУДА-КАШАЛЁЎШЧЫНЫ

1908 г.

Название нас. п.	Земле-владелец	Земли десятин			Всего	Дворов	Население		Душ всего
		уд.	неуд.	лес			муж.	жен.	
1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
Рудзянецкая валасць Гомельскага павета									
с. Руденец	Сел.общ.(с/о)	1623	224	20	1867	185	537	578	1115
с. Руденец	церковь	67	—	—	67	1	2	3	5
ус. Руденец	к.С.Евмененко	9	—	—	9	1	1	2	3
ус. Руденец	к.Н.Гапонов	1/2	—	—	1/2	1	2	3	5
Блюдница	с/о	1221	75	8	1304	136	454	447	901
Семеновка	с/о	2178	178	5	2361	202	716	723	1439
ус. Семеновка	Д.Двоскин	1/2	—	—	1/2	1	1	3	4
Особин	с/о	741	339	10	1090	96	334	314	648
Кобылин	с/о	214	243	5	462	18	84	85	169
Выс.Кобылин	Д.Аксенов	1/2	—	—	1/2	1	1	1	2
Тихиничи	с/о	346	40	—	386	53	182	157	339
им.Тихиничи	дв.А.Шелюто	140	10	—	150	1	—	—	—
Лапичи	с/о	410	15	—	425	36	125	125	250
Радеев	с/о	2066	20	—	2086	165	521	457	978
им.в Радееве	бр. фон Фитингоф-Шель	148	22	—	170	1	3	2	5
Пенчин	с/о	1252	58	—	1310	131	464	457	921

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
им.в Пенчине	дв.Яд.Пересвет-Солтан	1000	220	—	1220	1	2	3	5
Н.Гусевица	с/о	1308	30	—	1338	121	393	424	817
Ст.Гусевица	с/о	1693	68	—	1761	104	380	405	785
м.Уваровичи	с/о	2043	33	—	2076	314	693	655	1348
м.Уваровичи	церковь	36	—	—	36	1	1	1	2
им. в Уваровичах	п.П.Акциз	—	—	—	—	2	6	8	14
х. Ворой	п.П.Акциз	—	—	—	—	1	3	4	7
ф.Теклевка	п.П.Акциз	—	—	—	—	1	2	3	5
Поликовская лес. контора	п.П.Акциз	1987	188	400	2575	1	3	2	5
Ст-ка Уваровичи	п.П.Акциз	—	—	—	—	1	3	5	8
им. Прудовка	дв.Полухин	720	105	50	875	1	2	6	8
лес.ст.Глинище	Полухин	—	—	—	—	1	1	1	2
ф. Заречье	к.В.Грушниц	63	22	15	100	1	1	1	2
окол. Лапичи	мещ. Лапич	676	600	—	1276	178	291	286	577
	Всего:	20 044,5	2390	511	22 945	1757	5208	5161	10 639
Чабатовіцкая воласць Гомельскага павета									
с.Чебатовичи	с/о	1082	228	—	1310	186	696	709	1405
ус.Чебатовичи	д.Венцлавович	—	—	—	—	1	2	4	6
Ст.Буда	с/о	343	34	—	377	91	322	333	655
Кривск	с/о	784	40	—	824	132	503	479	982
Ховхло	с/о	376	100	—	476	74	283	301	584
ф.Ховхло	мещ.Кушнеров	797	102	230	1129	1	4	6	10
Ивольск	с/о	818	100	—	918	163	482	512	994
ф.Ивольск	кр.Аникеичи	141	50	55	246	1	2	4	6
ус.Ивольск	причт.	30	25	—	55	2	6	7	13
Бацунь	с/о	997	28	56	1081	103	413	421	834
Синичин	с/о	720	90	90	900	98	349	373	722
Глазовка	с/о	1086	150	—	1236	192	675	703	1378
ф.Глазовка	п.гр.Юрлов	999	67	321	1387	3	1	3	4
Морозовичи	с/о	820	60	—	880	153	527	532	1059
ф.Победное	д.Владимиров	154	100	100	354	1	1	—	1
ф.Поросля	м.Богданович	70	2	3	75	1	1	3	4
ф.Васильполье	м.Лесневский	285	200	25	510	2	5	7	12
Васильполье	жит.поселка	37	20	—	57	10	35	29	64
ф.Великий Рог	д.Чиж	30	10	10	50	1	1	1	2
х.Великий Рог	к.Краснобай	24	16	16	56	1	3	3	6
ф.Татарин	д.П-Солтан	450	2	3	455	2	1	—	1
х.Богомоловка	к.Богомолов	60	20	20	100	3	15	19	34
п.Будище	жит.поселка	400	20	20	440	9	24	27	51
х.Галинка	к.Галицкий	135	15	10	160	5	18	21	39
х.Игнатовка	м.Кушнеров	85	2	3	90	1	5	6	11
п.Кожедубовка	м.Чубановы	26	2	3	31	3	9	11	20
п.Пароход	жит.поселка	561	48	—	609	12	36	26	62
п.Солоное	тов.кр-н	45	10	15	70	5	24	29	51
х.Халимоновка	к.Луньков	52	3	5	60	1	5	6	11
х.Повзовка	к.Решетников	210	20	60	290	3	29	30	59
х.Б.Столпня	к.Пронузо	102	25	6	133	5	21	19	40
ок.Борвеновка	жит.околицы	202	110	8	320	30	99	88	187
п.Фащевка	с/о	133	30	15	178	9	34	37	71
х.Хочемля	м.Пигунова	327	8	10	345	2	8	11	19
п.Чистое	жит.поселка	57	40	3	100	7	31	35	66
	Всего:	12 438	1677	1087	15 202	1313	4670	4795	9465

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
Кашалёўская воласць Рагачоўскага павета									
с.Кошелев	с/о	1900	119	–	2019	265	918	908	1826
Р-Кошелевская	с/о	354	50	–	404	67	270	245	515
Селец	с/о	402	41	–	445	64	227	249	476
Зак.Лески	с/о	30	4	–	34	2	6	10	16
х.Мачулище	к.Лесковский	100	20	40	160	6	22	25	47
Выс.Селец	с/о	80	5	–	85	13	44	57	101
Б-Кошелевская	с/о	364	50	–	414	57	176	191	367
ж.д.ст.Б-Кошелевская	Либава-Роменская ж.д.	–	–	–	–	1	41	33	74
Выс.Бор.Корма	с/о	50	20	–	70	2	16	18	34
Выс.Ивонь I	с/о	63	11	–	74	8	30	31	61
Выс.Ивонь II	с/о	60	9	–	69	6	24	30	54
Выс.Болдуи	с/о	63	4	–	67	6	21	27	48
Бушевка	с/о	920	100	–	1020	121	427	441	868
Славенец	с/о	518	50	–	568	65	217	194	411
Бронница	с/о	400	56	–	456	62	247	226	473
Струки	с/о	401	35	–	436	53	190	207	397
Коромка	с/о	353	45	–	398	50	200	243	443
Заболотье	с/о	565	50	–	615	85	335	330	665
х.Дрозды	м.Томанские	55	10	5	70	6	18	19	37
Дуравичи	с/о	756	46	–	802	106	375	382	757
Потаповка	с/о	861	61	–	922	148	535	475	1010
Зак.Потаповка	с/о	26	5	–	31	2	7	6	13
Кострище	с/о	226	55	–	281	39	144	134	278
Шарибовка	с/о	723	61	–	784	111	388	390	778
Липиничи	с/о	445	52	–	497	70	276	251	527
Р-Викторинская	с/о	201	27	–	228	30	127	110	237
ф.Бронница	д.Д.-Дернолович	350	50	100	500	1	7	9	16
им.Викторин	Д.-Дернолович	4841	560	3881	9282	3	15	21	36
х.Городище	Д.-Дернолович	1,5	–	–	1,5	1	3	2	5
ф.Заботье	Д.-Дернолович	2990	450	3000	6440	1	20	16	36
з-д Разгуляевка	Д.-Дернолович	–	–	–	–	1	4	3	7
х.Будище	п.гр.Дрибинец	2	–	–	2	1	2	3	5
им.Дуравичи	гр.Дрибинец	2000	900	1800	4700	1	24	12	36
ф.Никольск	гр.Дрибинец	406	10	–	416	1	7	6	13
Р.Липиничская	к.Кожемяко	25	–	–	25	1	3	4	7
им.Кошелево	казна	20	10	–	30	1	4	3	7
раз.Л-Роменск. ж.д.		–	–	–	–	2	9	6	15
ж.д.будки	Л-Роменск.ж.д.	–	–	–	–	14	48	37	85
лесные сторож. (8 шт.)		–	–	–	–	10	39	26	65
	Всего:	20 620	2968	8826	32 414	1484	5608	5397	11 005
Недайская воласць Рагачоўскага павета									
Недойка	с/о	1340	222	–	1562	196	701	655	1356
Недойка	церковь	39	15	–	54	2	7	6	13
Ивановка	с/о	1081	140	–	1221	97	411	384	795
Житонежье	с/о	837	89	–	926	55	200	212	412
Губичи	с/о	1092	70	–	1162	141	501	503	1004
Еленец	с/о	1143	57	–	1200	119	434	387	821
х.Великод.Грива	Капустин	110	14	103	227	2	13	10	23
Гавли	с/о	542	10	–	552	87	307	320	627
Наспа	с/о	540	16	–	556	118	386	393	779
Кленовица	с/о	490	23	–	513	49	180	160	340
Смычок	с/о	680	32	–	712	72	234	235	469
Ольховка	с/о	786	21	–	807	73	267	260	527

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
им.Наспа	д.Вязьмитинов	4683	158	6470	11 311	8	15	10	25
Выс.Николаевка	–	110	20	30	160	28	102	93	195
Губичский кард.	–	50	–	–	50	3	12	12	24
Демин кард.	–	28	–	–	28	1	3	3	6
им.Кленовица	д.Романов	495	200	3605	4300	12	16	7	23
им.Недойка I	м.Яковлев	362	53	368	783	1	5	4	9
им.Недойка II	м.Кушнеров	89	60	460	609	3	7	4	11
Дед.Курган	д.Ландышевская	247	15	98	360	4	7	8	15
х.Городок	к.Павлов, др.	132	10	40	182	7	26	16	42
Марьинполье	к.Курьянов	118	10	20	148	12	38	32	70
х.Медведев	к.Берченковы	177	25	23	225	3	7	8	15
х.Осовок	к.Казанцевы	34	6	2	42	2	6	6	12
Лесоп.з-д.Наспа	Барановский	–	–	–	–	8	35	18	53
д.Гута (з-ды)	Курындин	–	–	–	–	12	68	82	150
Паром, перепр.	д.Вязьмитинов	–	–	–	–	1	3	2	5
Лесн.стор.(2)	–	–	–	–	–	2	3	3	6
Дом.									
х.Губ.Кардон	–	–	–	–	–	3	4	6	10
х.Копанки	м.Хилькевич	70	30	40	140	3	9	11	20
	Всего:	15 275	1296	11 259	1122	4005	4007	3850	7857

З АДКАЗУ КІРАЎНІЦТВА ЦЭНТРАЛЬНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА БЕЛАРУСКАЙ ССР НА ЗАПЫТ АБ МІНУЛЫМ ВЁСКІ НЕДАЙКІ

24 кастрычніка 1972 г.

Тов. Даниленко П.Н. СШ с. Недойки, Недойского с/Совета, Б.-Кошелевского р-на Гомельской обл.

В нашем архиве имеются очень малочисленные документы, рассказывающие о прошлом села Недойки. В селе находилось волостное правление.

В 1861 г. село входило в состав имения Недойка и принадлежало помещику Станиславу Пересвет-Солтану. Крестьянская реформа 1861 г. дала возможность крестьянам села Недойки выкупить свои наделы земли у помещика. Выкуп продолжался около 40 лет. Попрежнему крестьяне находились в зависимости от помещиков. По сведениям за 1908 г. видно, что имение Недойка было разделено на два имения: Недойку 1-ю и Недойку 2-ю.

Имение Недойка-1-я принадлежало мещанке Яковлевой, Недойка-2-я — мещанину Д.А.Кушнерову. В Недойке 1-й было 783 десятины земли, из которой 368 десятин под лесом. В Недойке-2-й было 609 десятин земли: из которой под лесом 460 десятин. Крестьяне совершенно не имели лесных угодий и были в полной зависимости от помещика. Село Недойка располагалось на реке Недойка, которая в начале XX века уже называлась ручьем.

По сельскохозяйственной переписи 1917 г., проведенной накануне Октября, крестьянам села Недойка принадлежало 1403,76 десятин земли. В селе было 250 хозяйств, из них 24 хозяйства безземельных. Число хозяйств без всякого скота — 14, число хозяйств без рабочего скота — 28, число хозяйств без коров — 19. Скота у крестьян было: лошадей (в том числе и жеребят) — 317, крупного рогатого скота (в том числе и телят) — 443, овец — 406, свиней (в т.ч. и поросят) — 607.

Население села в 1917 г.: мужчин — 565, женщин — 521.

Высевались следующие сельскохозяйственные культуры: озимая рожь, ячмень, овес, гречиха, просо, картофель, лен, конопля, чечевица.

По обработке зерна в селе было 2 ветряных мельницы, 1 водяная.

В 1873 г. в селе было открыто народное училище, которое помещалось в общественном доме. На содержание училища отпускалось из суммы волости 100 рублей. В 1877—1878 гг. в училище обучалось 27 мальчиков. Так что в 1973 г. школе в селе Недойка исполнится 100 лет.

В начале XX в. в селе был открыт медицинский приемный пункт. В селе находилась приходская Троицкая церковь, новое каменное здание которой было построено в 1894 г. Церкви принадлежало 54 десятины удобной земли. Крестьяне села Недойки были православными. А оба имения в XX в. принадлежали старообрядцам. Более полными сведениями по истории села Недойка архив не располагает.

Основание: ЦГИА БССР в г.Минске, ф.2001, оп.1, д.955, л.46; ф.2084, оп.1, д.746, л.11. «Памятная книжка Виленского учебного округа» на 1878—1879 уч.г., л.408. «Список населеных мест Могилевской губернии», 1908 г., л.153.

Директор ЦГИА БССР Н.Лещенко
Нач.отд.использ.и публик. Т.Воробьева

Лёсам звязаны з краем

СТАНІСЛАЎ ІВАНАВІЧ БОГУШ-СЕСТРАНЦЭВІЧ

Беларускі вучоны, літаратар і дзеяч рымска-каталіцкай царквы С.І.Богуш-Сестранцэвіч нарадзіўся 3.9.1731 г. у в. Занкі Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. Ён дзядзька беларускага паэта В.Дуніна-Марцінкевіча. Вучыўся ва універсітэтах Кёнігсберга, Амстэрдама, Лондана, Франкфурта. Да 1761 г. быў афіцэрам прускага гусарскага палка і Літоўскай гвардыі. Пасля адстаўкі — хатні настаўнік і выхавацель дзяцей князя Радзівіла. У 1763 г. скончыў Варшаўскую школу піяраў і атрымаў сан ксяндза. Быў настаяцелем у манастырах у Гомелі і Бабруйску, канонікам і біскупам-суфраганам у Вільні. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай і далучэння ўсходняй часткі Беларусі да Расійскай імперыі прызначаны (1773) епіскапам беларускім (рэзідэнцыя ў Магілёве), у 1782 — архіепіскапам, кіраўніком беларускай каталіцкай епархіі, а потым мітрапалітам усіх рымска-каталіцкіх цэркваў у Расіі. Кацярына II дамаглася для яго ад Папы Рымскага правоў на знак кардынала. У 1798 г. імператар Павел I узвёў яго ў званне камандора Вялікага Крыжа Св. Іаана Іерусалімскага. Богуш-Сестранцэвіч выступаў супраць разумовага прыгнёту і схаластыкі ў навуцы, быў праціўнікам езуітаў і экспансіі Ватыкана на ўсход. Намаганнямі езуітаў, якія мелі ўплыў на Паўла I, Богуш-Сестранцэвіч быў высланы з Пецярбурга ў маёнтак Рудзянец. Пасля смерці Паўла I вярнуўся ў Пецярбург, дзе працягваў кіраваць каталіцкай царквой у Расіі да канца свайго жыцця. Кар'еру царкоўнага дзеяча паспяхова сумяшчаў з дзейнасцю вучонага і літаратара. Праводзіў даследаванні ў галіне медыцыны, філалогіі і гісторыі, выбіраўся членам Расійскай акадэміі навук і Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі. У час працы ў Магілёве заснаваў там друкарню. У 1783 г. ён выдаў тут сваю вершаваную трагедую «Гіцыя ў Таўрыдзе», якую прысвяціў Кацярыне II. Ён аўтар гістарычнай працы «Аб Заходняй Расіі» (1793), у якой разглядаў пытанне пра паходжанне беларусаў, рускіх і украінцаў. Яго пяру належаць таксама «Гісторыя Таўрыды» (1800, у 2 тамах), «Гісторыя сарматаў і славян» (1812, у 4 тамах), «Граматыка літоўская» (не выдадзена, адна з першых спроб навуковай характарыстыкі беларускай мовы), а таксама вершы, казанні і іншыя дыдактычныя творы. Памёр С.І.Богуш-Сестранцэвіч 13.12.1826 г.

УЛАДАЛЬНІКІ МАЁНТКАЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ НА БУДА-КАШАЛЁЎШЧЫНЕ (канец XIX — пачатак XX ст.)

ДРЫБІНЦАЎ Васіль Савіч, прысяжны паверанны, член павятовага дваранскага сходу, ганаровы міравы суддзя. Член Дзяржаўнай думы. Займаў пасаду члена Гомельскага камітэта папячыцельства імператрыцы Марыі Аляксандраўны аб сляпых. У 1915 г. гласны Гомельскай гарадской думы.

ПЕРАСВЕТ-СОЛТАНЫ. Маёнткі сямейства Перасвет-Солтанаў на Буда-Кашалёўшчыне размяшчаліся ў вёсках Галееўка, Пенчын, Люшаў, Стасін, Астравы, Касцельная і інш.

П.І.Перасвет-Солтан з'яўляўся земскім начальнікам 2-га ўчастка Гомельскага павета (Пакалюбіцкая і Целяшоўская воласці). Кантора яго размяшчалася на ст. Старая Беліца, а паштовы адрас быў — м. Уваравічы. П.І.Перасвет-Солтан быў таварышам старшыні таварыства патранажу.

Іншыя члены сямейства таксама актыўна ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці дарэвалюцыйнай Расіі. Так, Я.Перасвет-Солтан быў членам Гомельскага рымска-каталіцкага таварыства дабрачыннасці. Міхаіл Юльевіч Перасвет-Солтан — намеснікам старшыні павятовай земскай управы, Мечыслаў Стах. Перасвет-Солтан — памочнікам прысяжнага паверанага.

ФІЦІНГОФ-ШЭЛЬ, бароны. Адзін з маёнткаў баронаў фон Фіцінгоф-Шэль размяшчаўся ў в. Радзеева Рудзянецкай воласці Гомельскага павета. Тут яны мелі 170 дзес. зямлі з маёнткам, у якім у 1908 г. пражывала 5 душ. Кантора ў маёнтку Радзеева, паштовы адрас — м. Уваравічы. Барыс Іванавіч Фіцінгоф-Шэль (1767—1829) — батанік, вывучаў рускую флору. Член-заснавальнік і прэзідэнт імператарскага мінералагічнага таварыства, прэзідэнт імператарскага чалавекалюбівага таварыства.

Барыс Аляксандравіч Фіцінгоф-Шэль (1829—1901) — служыў у артылерыі. Пасля выхаду ў адстаўку прысвяціў сябе музыцы. Вывучаў ігру на фартапіяна ў Гензэльта, тэорыю кампазіцыі — у Фохта, карыстаўся парадамі А.С.Даргамыжскага. Інструментоўку засвоіў па дапаможніках Маркса і Феціса. Аўтар опер «Мазепа» (1859), «Тамара» (1888) паводле сюжэта паэмы М.Ю.Лермантава «Дэман», «Марыя Сцюарт», «Heliodora», балетаў «Гарлемскі Цюльпан», «Золушка» (1893), араторыі «Іаан Дамаскін» і каля 80 малых твораў царкоўнай і камернай музыкі. У 1899 г. выдаў успаміны «Сусветныя знакамітасці. 1848—1898».

Рыгор Іванавіч Фіцінгоф-Шэль быў надворным саветнікам, земскім начальнікам 3-га ўчастка Гомельскага павета (Рудзянецкая і Чабатовіцкая воласці).

Падрыхтавалі Ю.Э.Глушакоў, У.Я.Райскі.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

У лютым 1917 г. у Расіі адбыўся стыхійны рэвалюцыйны выбух. Цар Мікалай II мусіў адрачыся ад прастола. Улада аказалася ў руках Часовага ўрада і Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Так самадзяржаўе ў краіне змянілася двоеўладдзем.

Рэвалюцыйныя падзеі хутка дакаціліся да правінцыі. Ва Уваравіцкай воласці, тэрыторыя якой уваходзіць у склад сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна, праходзілі стыхійныя мітынгі. На іх гучалі прамовы і заклікі прадстаўнікоў розных палітычных партый.

Мясцовыя памешчыкі і буржуазія ў пачатку сакавіка 1917 г. выбралі пераважна з членаў валаснога земства «Камітэт грамадскай бяспекі і дабрабыту». Сваім складам і першапачатковымі дзеяннямі ён стараўся паказаць, што новая ўлада з'яўляецца законнай пераемніцай старой. Практычна ў воласці ўлада з рук памешчыкаў перайшла ў рукі прадстаўнікоў буржуазіі (заможных сялян, купцоў, лесапрамыслоўцаў). У партыйным сэнсе гэта была ўлада кадэтаў, меншавікоў, правых эсэраў. «Камітэт» адразу заявіў аб прызнанні Часовага ўрада і ў імя перамогі на фронце заклікаў насельніцтва спыніць рэвалюцыйную барацьбу. Хутка ў воласці з'явіўся і камісар Часовага ўрада, а «Камітэт» стаў дарадчым органам пры ім. Гэта надавала новай валаснай уладзе дваякі выгляд дэмакратычнасці.

Тым не менш рэвалюцыйна настроенае насельніцтва разагнала старое валаснoе праўленне, былі арыштаваны старасты ў вёсках, члены земскай управы, іншыя прадстаўнікі ўлады. Такім чынам, спыніць развіццё рэвалюцыйнага руху ў краі не ўдалося. Не дапамаглі і спробы падмануць сялян бачнасцю нацыяналізацыі зямлі. Было нават абвешчана, што памешчыцкія маёнткі ў воласці — народны набытак, які часова, да Устаноўчага сходу, пакінуты ў карыстанні іх былых уладальнікаў. Аднак падман хутка раскрыўся. Сялянству здавалася, што пытанне аб зямлі новай уладай адцягваецца пад любымі прычынамі. Таму яны захоплівалі землі памешчыкаў і кулакоў, канфіскоўвалі інвентар і хлебныя лішкі, патрабавалі адмены прымусовай арэнды і зніжэння арэнднай платы за зямлю, засявалі ўчасткі прыватнаўласніцкіх зямель, якія пуставалі, і г. д.

Устанавіць адзінаўладдзе ў мясцовым кіраванні буржуазіі не ўдалося. У воласці прайшлі выбары рабочых і сялянскіх дэпутатаў. 7—8 (20—21) сакавіка 1917 г. былі абраны першыя Саветы. Пад іх кіраўніцтвам у воласці адбыліся выбары ў сельскія камітэты, вылучэнне кандыдатаў у валасны камітэт.

Барацьба за зямлю пашыралася. Сельскія камітэты пазбаўляліся ад абаронцаў памешчыцкай уласнасці на зямлю і станавіліся сапраўды народнымі органамі ўлады. Яны ўпэўнена ўзначальвалі ў воласці барацьбу за пераход памешчыцкай зямлі ў рукі сялян.

Валасны камітэт і валасны Савет спачатку праводзілі адкрыта праўрадавую палітыку. І гэта было зразумела: большасць дэпутатаў у Савеце з'яўляліся дэлегатамі ад дробнабуржуазных палітычных партый, якія падтрымлівалі мясцовых кадэтаў і іншыя правыя партыі «Камітэта грамадскай бяспекі і дабрабыту». Такая тактыка ў пачатку рэвалюцыі стрымлівала развіццё сялянскай барацьбы за зямлю.

Пад двайной абаронай мясцовых улад памешчыкі і буржуазія ўзмацнілі эксплуатацыю. Непажаданых рабочых проста выкідвалі на вуліцу, а ўсякае выступленне падаўлялася так званай «народнай міліцыяй» — пераапранутымі ў ваенную форму стражнікамі, паліцэйскімі і жандарамі.

У Буда-Кашалёўскай, як і ў іншых валасцях, усплёск рэвалюцыйнага руху стаў той сілай, якая дала магчымасць сялянам самім шукаць шляхі вырашэння свайго лёсу. Але за кім ісці ў гэтай барацьбе? Каго паслаць сваім прадстаўніком у сельскі Савет ці Камітэт? Аб гэтым у вёсках на «сходках», якія зацягваліся да світання, кіпелі спрэчкі. «Неадкладна раздзяліць памешчыцкія землі» ці «чакаць рашэнняў Устаноўчага сходу» — такой была альтэрнатыва спрэчак.

У красавіку — чэрвені 1917 г. у воласці прайшлі выбары ў сялянскія Саветы. З іх прадстаўнікоў былі арганізаваны выканкомы ў вёсках і валасныя выканкомы сялянскіх дэпутатаў.

Часовы ўрад не спяшаўся спыняць імперыялістычную вайну, абвяшчаць мір, надзяляць зямлёй вясковую бедната, якая складала большасць насельніцтва. Больш за палову гаспадарак былі беспасяўныя або мелі 1 — 2 дзесяціны пасеваў. На адзін бядняцкі двор прыпадала менш за 1/4 дзесяціны ворнай зямлі на едака. Кожная шостая — сёмая сям'я жабравала. Дарослае мужчынскае насельніцтва было на фронце ці на абарончых работах. У вёсках гаспадарамі засталіся ў асноўным жанчыны, старыя і падлеткі. Значна скарацілася колькасць жывёлы, асабліва коней. Зямлю апрацоўваць не было каму. Таму пасяўныя плошчы скарачаліся, зацягваліся тэрміны сельскагаспадарчых работ. Падала ўраджайнасць. Большасць салдатак станавіліся жабрачкамі, вымушаны былі ісці на паклон за кавалкам хлеба да памешчыкаў і кулакоў. Апошнія на гэтым нажываліся, багацелі.

Ужо ў сакавіку 1917 г. узнікненне ў Мінскай і Магілёўскай губернях валасных і павятовых сялянскіх камітэтаў было выкарыстана бальшавікамі для работы сярод сялянства. А ў пачатку красавіка паўсюдна пачалі стварацца павятовыя і валасныя Саветы сялянскіх дэпутатаў. Актывізавалася барацьба працоўных за паляпшэнне свайго жыцця. Сяляне ўзмацнілі высечку лесу, сталі часцей захопліваць землі.

Улады спрабавалі спыніць развіццё сялянскага руху. Урад пасылаў дырэктывы і тэлеграмы губернскім і павятовым упраўленням з патрабаваннем «...прыняць рашучыя меры... аж да ваеннай сілы» для падаўлення сялянскіх выступленняў». (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 398. Воп. 2. Спр. 113. Л. 72, 128 адв.)

16(29) красавіка 1917 г. магілёўскі губернскі камісар тэлеграфаваў павятовым камісарам аб неабходнасці прымаць меры для задушэння беспарадкаў. 7(20) мая 1917 г. у данясенні Часоваму ўраду ён паведамляў, што сялянскі рух ахапіў усю губерню. (Магілёўская губерня ўключала Гомельскі і Рагачоўскі паветы, тэрыторыя якіх уваходзіць у склад сучаснай Гомельскай вобласці).

11(24) чэрвеня 1917 г. згодна з распараджэннем Часовага ўрада магілёўскаму губернскаму камісару прадпісвалася прымяняць рэпрэсіўныя меры супраць сялян за захоп імі памешчыцкай зямлі і інвентару. У дакуменце гаварылася: «Имеющие место в Могилевской губернии переходы частновладельческих земель и инвентаря в распоряжение волостных комитетов и вмешательство последних в управление хозяйством противоречат постановлениям Временного правительства и являются противозаконными. Лица, допускающие самовольный захват чужой собственности и инвентаря, подлежат законной ответственности по суду» (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 398. Воп. 2. Спр. 113. Л. 72).

12(25) чэрвеня 1917 г. магілёўскі губернскі ўрадавы камісар паведамляў Міністэрству ўнутраных спраў, што салдаты Заходняга фронту і маракі Балтыйскага флоту, якія прыбывалі для дапамогі сельскай гаспадарцы, прапагандуюць аграрную праграму бальшавікоў і прымаюць удзел у сялянскіх хваляваннях (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 398. Воп. 1. Спр. 43. Л. 73).

19 чэрвеня (2 ліпеня) 1917 г. рагачоўскі павятовы камісар інфармаваў міністра земляробства Часовага ўрада, што сяляне ў павеце захопліваюць лугі і сенажаці, сякуць памешчыцкія лясы, праганяюць упраўляючых маёнткаў (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 408. Воп. 1. Спр. 665. Л. 9 — 10).

У маі — чэрвені 1917 г. на тэрыторыі сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна сялянскія Саветы бралі ўсю паўнату ўлады на месцах у свае рукі. Яны самастойна раздавалі памешчыцкую зямлю і сенажаці сялянам, якія жылі ў нястачы. Усе сельскія камітэты на практыцы не толькі выконвалі рашэнні Саветаў, але развівалі гэтыя рашэнні, ішлі далей.

Па ініцыятыве мясцовай рэвалюцыйна настроенай інтэлігенцыі ў валасці быў створаны аб'яднаны рабочы прафсаюз, разгарнулася барацьба за паніжэнне рознічных цэн на спажывецкія тавары з тым, каб зрабіць іх даступнымі для беднякоў, рабочых, рамеснікаў. У выніку гандляры вымушаны былі знізіць цэны ў сваіх крамах.

У канцы чэрвеня 1917 г. у Гомелі па ініцыятыве Палескага камітэта РСДРП(б) адбылася нарада прадстаўнікоў Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Жлобіна, Веткі, Кармы, Уваравіч, Лоева, Хойнікаў, Давыд-Гарадка, Почапа і інш. (Гомельскі абласны краязнаўчы музей. Ф. 5. Спр. 2). Яна праходзіла напярэдадні выбараў у мясцовыя Саветы.

Менавіта ў гэты час у валасці прайшлі перавыбары першых часовых Саветаў. Кандыдатаў ад розных палітычных партый аб'ядноўвала адзінае патрабаванне — спыніць імперыялістычную вайну, якая яшчэ працягвалася. З валасці на фронт па мабілізацыі пайшлі тысячы мужчын. Многія загінулі або прапалі без вестак, апынуліся ў нямецка-аўстрыйскім палоне, іншыя вярнуліся дадому калекамі. Шматлікія сялянскія гаспадаркі збяднелі ці наогул перасталі існаваць. Адкрытую незадаволенасць вайной выказвалі салдаты, што вярталіся з фронту.

Чатыры месяцы, якія мінулі пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г., не змянілі становішча. Больш таго, буржуазія арганізавалася і пачала пераходзіць у наступленне. Усё гэта абвастрала палітычную сітуацыю.

Прызначаны 18 (31) ліпеня 1917 г. новы вярхоўны галоўнакамандуючы генерал Л.Г.Карнілаў у адказ на выступленні сялян і салдат у прыфрантавой паласе (Буда-Кашалёўская валасць адносілася менавіта да такіх тэрыторый) загадаў «зброяй разганяць мітынгі салдат, а сялян прыфрантавых

губерняў за захоп памешчыцкіх пасеваў ці хлеба знявольваць у папраўчыя арыштанцкія аддзяленні тэрмінам да трох гадоў».

Масавы пратэст у воласці выклікалі падзеі 3(16) і 4(17) ліпеня ў Пецярбургу і Маскве. У вёсках адбыліся хваляванні.

25 — 26 ліпеня (7 — 8) жніўня 1917 г. у Гомелі на канферэнцыі мясцовых Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў буда-кашалёўская дэлегацыя заявіла, што валасны Савет не падтрымлівае палітыку Часовага ўрада.

У ноч з 26 на 27 жніўня (з 8 на 9 верасня) генерал Л.Г.Карнілаў выступіў з Маніфестам «Да рускага народа» і абвясціў сябе ваенным дыктатарам Расіі.

Падтрыманыя беспартыйнымі дэлегатамі левыя дэмакратычныя сілы Буда-Кашалёўскага Савета адкрыта выказалі свой недавер Часоваму ўраду, чым умацавалі свае пазіцыі ў Савеце.

28 жніўня (10 верасня) Савет звярнуўся да насельніцтва воласці з заклікам запісвацца ў чырвонагвардзейскія атрады.

Рабочыя Лібава-Роменскай чыгункі на ўчастку ст. Уза — Буда-Кашалёў і ў іншых месцах арганізавалі атрады Чырвонай гвардыі. Адным з іх камандаваў рабочы Н.М.Арол з в. Рудзянец. У атрадзе было больш за 100 узброеных вінтоўкамі і кулямётамі байцоў.

Праз воласць праходзілі важныя ў ваенных адносінах прыфрантавыя дарогі, па якіх у Магілёў у Стаўку вярхоўнага галоўнакамандуючага да Карнілава накіроўваліся эшалоны з войскамі і ўзбраеннем, рухаліся конныя атрады. Каб спыніць іх, на асноўных чыгуначных станцыях і магістралях, на прыстанях і мастах цераз рэкі ўстанавілі чырвонагвардзейскія пікеты. Пад кантроль была ўзята работа пошты, тэлеграфа.

Прынятыя меры былі вельмі своечасовыя. У Стаўку да Карнілава войскі не прайшлі. Толькі на ўчастку Гомель — Жлобін чыгуначнікі за 6 дзён затрымалі 25 эшалонаў.

У верасні — кастрычніку 1917 г. у воласці прайшлі перавыбары зямельных камітэтаў. Эсэры, якія лічылі сябе гаспадарамі ў вёсцы, пацярпелі на іх паражэнне. Кандыдаты ад партыі эсэраў не атрымалі большасці і сярод дэлегатаў ад воласці на Установчы сход. Сяляне вылучылі ў зямельныя камітэты тых, хто быў гатовы вырашаць пытанне аб зямлі, выступаў за неадкладнае спыненне вайны, скліканне Установчага сходу. З Саветаў былі выведзены і дэлегаты ад іншых праўрадавых партый. У зямельных камітэтах і Саветах воласці бальшавікі стварылі свае партыйныя ячэйкі. Вакол іх арганізаваліся левыя рэвалюцыйныя палітычныя сілы. Узнік і першы саюз рабочай і сялянскай моладзі воласці. Барацьба левых сіл набывала востры характар. Актыўныя дзеянні рабочых і сялян прымусілі прадпрымальнікаў і заводчыкаў пад пагрозай страты сваіх капіталаў згадзіцца на ўвядзенне рабочага кантролю. Сельскія камітэты яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. дазволілі сялянам у воласці практычна поўнасцю распараджацца памешчыцкай зямлёй.

Калі ў лютым 1917 г. абурэнне мас узарвалася стыхійна, то напярэдадні кастрычніка 1917 г. бальшавікі і іншыя палітычныя партыі праз Саветы, зямельныя камітэты, армейскія і іншыя арганізацыі рыхтавалі рэвалюцыю. Арганізаваны пры Петраградскім Савеце ў сярэдзіне верасня 1917 г. Ваенна-рэвалюцыйны камітэт стаў каардынацыйным цэнтрам рэвалюцыйнага перавароту, ліквідацыі Часовага ўрада і стварэння ўмоў для пераходу ў краіне ўлады ў рукі Саветаў.

25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 г. II Усерасійскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў прыняў рашэнне аб пераходзе ўлады на месцах да

Саветаў, зацвердзіў склад урада — Савета Народных Камісараў на чале з У.І.Леніным. У пастанове ад 26 кастрычніка (8 лістапада) 1917 г. аб утварэнні новага ўрада гаварылася, што Савет Народных Камісараў з'яўляецца «...часовым рабочым і сялянскім урадам», які ажыццяўляе ўладу «...да склікання Устаноўчага сходу». У прынятым з'ездам Дэкрэце аб зямлі было падкрэслена, што пытанне аб зямлі ў поўным аб'ёме «...можа быць вырашана толькі Усенародным Устаноўчым сходам».

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

Не раней 8 (21) красавіка 1917 г.

Батраки имения Заболотье Рогачевского уезда приняли решение требовать сокращения рабочего дня и повышения заработной платы.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 398. Воп. 1. Спр. 43. Л. 73.

8 (21) мая 1917 г.

Рабочие Наспенского стекольного завода Буда-Кошелевской волости Рогачевского уезда предъявили требования владельцам завода по улучшению их материального положения, выплаты зарплаты за длительное время простоя производства, обеспечить прожиточный минимум семьям солдат-фронтовиков, мобилизованных с завода, предоставления нуждающимся рабочим огородов и пастбищ, квартир и оплаты расходов за отопление жилья. Владельцы завода Курындины категорически отказались выполнить эти требования. Стекольщики объявили забастовку и обратились в Гомельский Совет за поддержкой.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 2. Спр. 202. Л. 24.

26 мая (8 чэрвеня) 1917 г.

Сообщение газеты «Правда» (№ 66) об аресте рабочими Наспенского стекольного завода Рогачевского уезда администрации завода и вступление рабочих во владение заводом.

Распоряжение товарища Министра внутренних дел Временного правительства Рогачевскому губернскому комиссару В. А. Судзиловскому «...принять лично самые энергичные меры» для ликвидации конфликта и охране товаров и имущества владельцев Наспенского стекольного завода».

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 2. Спр. 202. Л. 26.

Канец мая 1917 г.

Решение экономической комиссии Гомельского Совета рабочих и солдатских депутатов о поддержании требований рабочих Наспенского стекольного завода и о санкции на арест имущества владельцев завода до удовлетворения требований рабочих.

Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. Ф. 406. Воп. 2. Спр. 202. Л. 26.

Май — чэрвень 1917 г.

Возвратившиеся из Петрограда делегаты 1-го Всероссийского съезда крестьянских депутатов, проходившего с 4 по 28 мая, отчитывались на сельских сходах и заседаниях местных Советов.

15 июня 1917 г. Буда-Кошелевский волостной Совет, заслушав отчет своего делегата, принял постановление, которым запретил помещикам без ведома исполкома Совета рубить лес, сдавать в аренду землю, продавать движимое и недвижимое имущество. Местные помещики Дорна-Дорниловичи, Дрибинцевы и другие магнаты послали жалобу министру земледелия, в которой писали, что крестьяне под влиянием приехавших из Петербурга делега-

тов Всероссийского крестьянского съезда рубят частновладельческие леса, захватывают и делят луга и сенокосы, снимают рабочих и устраняют управляющих.

Наше свободное слово. 1917. 17(30) чэрв.

Канец чэрвеня 1917 г.

В Гомеле по инициативе Полесского комитета РСДРП(б) проведено совещание представителей Советов рабочих, крестьянских и солдатских депутатов Жлобина, Ветки, Кормы, Уварович, Лоева, Хойник, Давид-Городка, Почепа и др.

Гомельскі абласны краязнаўчы музей. Ф. 5. Спр. 2.

Не раней 15 (28) ліпеня 1917 г.

В деревне Солтановка Рогачевского уезда судья привлек крестьян к ответственности за самовольный захват помещичьей земли. Тогда крестьяне арестовали судью и отправили его в Гомельский Совет.

Гомельскі абласны краязнаўчы музей. Ф. 5. Спр. 2.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Нашэсце

12(25) студзеня 1918 г. камандзір 1-га польскага корпуса генерал Ю.Р.Доўбар-Мусніцкі аб'явіў вайну Савецкай Рэспубліцы. Часці яго корпуса акупіравалі Рагачоўскі павет, авалодалі шэрагам чыгуначных станцый Палескай і Лібава-Роменскай чыгунак. Легіянеры разганялі Саветы, расстрэльвалі актывістаў, рабавалі насельніцтва.

14(27) студзеня 1918 г. газета «Звезда» надрукавала заклік Саўнаркома Заходняй вобласці і фронту да насельніцтва распачаць барацьбу супраць «контррэвалюцыйнага выступлення Доўбар-Мусніцкага». У той жа дзень Магілёўскі губернскі Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў звярнуўся да польскіх салдат з заклікам не ваяваць супраць Савецкай Рэспублікі і павярнуць зброю супраць сваіх класавых ворагаў — польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Але такімі мерамі спыніць польскае наступленне не ўдалося.

17(30) студзеня 1918 г. у вёсцы Забалоцце легіянеры адабралі ў сялян жывёлу і разрабавалі іх дамы.

20 студзеня (2 лютага) 1918 г. Магілёўскі губернскі выканаўчы камітэт Савета рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў накіраваў штабу польскіх войскаў у Рагачове ультыматум з патрабаваннем спыніць рэпрэсіі супраць грамадзян і вызваліць усіх арыштаваных да 9 гадзін вечара 21 студзеня.

Паўсюдна прайшоў запіс добраахвотнікаў у Чырвоную гвардыю, па вёсках — у партызанскія атрады і атрады самаабароны.

26 студзеня (8 лютага) 1918 г. газета «Известия Могилевского Совета» паведамляла, што ўсё насельніцтва губерні гатова «...по первому зову выступить против легионеров».

У канцы студзеня 1918 г. палякі накіроўваюць свае ўдары на Уваравічы і чыгуначныя станцыі воласці.

25 — 31 студзеня (7 — 13 лютага) 1918 г. чырвонагвардзейскія атрады нанеслі паражэнне корпусу Доўбар-Мусніцкага пад Жлобінам і Рагачовам. У паведамленні аб баях пад Жлобінам газета «Советская правда» за 31 студзеня 1918 г. пісала: «Ожесточенный бой идет у станции Жлобин. Бой шел у каждого дома ручными гранатами в течение 6 часов. Орудийный огонь продолжался 50 часов, выпущено много тысяч снарядов. Победили советские войска. Жлобин занят. Потери поляков ужасны... часть польских леги-

онеров присоединилась к советским войскам».

31 студзеня (13 лютага) 1918 г. быў вызвалены Рагачоў.

15 лютага 1918 г. «Правда» паведамляла: «...Польские солдаты массами сдаются в плен. Часть их разбрелась, побросав оружие. Большой железнодорожный мост в Рогачеве через р. Друть спасен разъездом Красной Армии, успевшим вовремя прорваться к мосту и захватить польских подрывников, подготовлявших мост к взрыву. При допросе офицеры разгромленной 1-й польской дивизии заявили, что целью польского корпуса было захват Минской и Могилевской губерний и их присоединение к Польше».

18 лютага 1918 г., парушыўшы мірныя пагадненні, 30 дывізій кайзераўскай Германіі без аб'яўлення вайны пачалі наступ па ўсім расійска-германскім фронце. На Беларусь нямецкія войскі наступалі дзвюма групамі: 10-я армія на Мінск — Магілёў — Віцебск, а 21-ы рэзервовы корпус — на Гомель. Галоўныя ўдары накіроўваліся на Полацк — Оршу з мэтай выйсці на Смаленск, а праз Гомель — Бранск — на Маскву.

Тэрыторыя Буда-Кашалёўскай воласці зноў стала тэатрам ваенных дзеянняў. У адным з загадаў нямецкага камандавання адзначалася: «...необходимо взять у населения все съестные и кормовые запасы, оставить на одного жителя в качестве дневной нормы не больше 250 гр. хлеба и 300 гр. картофеля».

Да пачатку наступу нямецкіх захопнікаў на Савецкую Рэспубліку значная колькасць войскаў Заходняга фронту была дэмабілізавана. Заходні фронт меў 3 арміі: на правым флангу — 3-я армія (на поўдзень ад возера Дрысвяты да м. Смаргонь), у цэнтры — 10-я армія (ад м. Смаргонь да р. Бярэзіна, прытока р. Нёман), на левым флангу — 2-я армія (ад р. Бярэзіна да р. Прыпяць); усяго 250 тыс. чалавек, у тым ліку 70 тыс. страявых салдат.

Перад немцамі фактычна не было фронту. Старая армія ўжо не існавала, а новая, рэвалюцыйная, толькі складвалася. Атрады самаабароны і чырвонагвардзейскія атрады былі галоўнай сілай абароны. Для барацьбы з нямецкімі акупантамі «... на прифронтовой полосе создавалась прочная завеса отрядов, задача коих — не пропускать в глубь России противника в случае возобновления им враждебных действий». Такім быў загад галоўнакамандуючага Заходнім фронтам ад 10 сакавіка 1918 г. У ім таксама падкрэслівалася, што «главная по силе завеса должна состоять из линии местных партизанских отрядов, усиленных на важнейших направлениях революционными войсками». Вызначаліся крыніцы і базы забеспячэння войскаў — «довольствие из местных средств покупкой, платой, реквизицией от жителей, как окажется удобней».

14 сакавіка 1918 г. у тэлеграме камісара Заходняга фронту Савету Народных Камісараў і Выбаргскаму штабу Чырвонай гвардыі паведамлялася: «Продвижению противника в Гомельском направлении положило решительный предел крестьянство окружных уездов, которое охотно, сознательно идет на помощь: формируются крестьянские партизанские отряды, наплыв добровольцев настолько велик, что не хватает выписываемого оружия, снаряжения и продовольствия. Крестьяне снабжают отряды хлебом и продовольственными продуктами».

16 сакавіка 1918 г. у зводцы Ваеннага камісарыята гаварылася: «На Западном фронте идет усиленное, успешное формирование крестьянских партизанских отрядов по своей инициативе. Разведка сообщает о начале перегруппировки германских ударных групп. В тылу немцев успешно действуют партизаны. Получены сведения, что между Гомелем и Жлобином взорван немецкий бронированный поезд. Крестьяне к немцам настроены враждеб-

но и к себе в деревню без сопротивления не впускают».

22 лютага 1918 г. Магілёўскі губвыканком увёў асаднае становішча. Пачалася мабілізацыя ў Чырвоную гвардыю. Былі прыняты меры па ўмацаванні важнейшых стратэгічных пунктаў, фарміраваліся партызанскія атрады. У кожную воласць было адпраўлена па 1000 вінтовак, шмат боепрыпасаў.

На Гомель нямецкія войскі наступалі дзвюма калонамі — з Мазыра і Жлобіна. Жорсткія баі ішлі пад Калінкавічамі, Горвалем, Жлобінам, Буда-Кашалёвам, Рэчыцай. У баях вызначыліся 2-і Гомельскі, Буда-Кашалёўскі, Рэчыцкі і іншыя партызанскія атрады.

У канцы лютага тэрыторыя Буда-Кашалёўскай воласці была акупіравана нямецкімі і польскімі войскамі. Услед за імі вярнуліся ў свае маёнткі памешчыкі. У сялян пачалі адбіраць і вывозіць усё, што мела хоць якую-небудзь каштоўнасць. Але кожная рэквізіцыя ўсё часцей прыводзіла да ўзброеных сутыкненняў з мясцовым насельніцтвам.

У.Я.Райскі.

З артыкула Г.Машчыцкага «Барацьба супраць нямецкіх і польскіх захопнікаў (1918 год)»

...Сур'ёзнае баявое хрышчэнне працоўным Гомельшчыны давялося прыняць у перыяд падаўлення контррэвалюцыйнага мяцяжу, узнятага супраць Савецкай улады белапольскім корпусам, на чале якога стаяў ...генерал Доўбар-Мусніцкі.

Першы корпус быў сфарміраваны ў ліпені 1917 года з салдат, афіцэраў і бежанцаў польскай нацыянальнасці... Белапалякі ўзялі пад абарону памешчыкаў і капіталістаў, асабліва польскай нацыянальнасці, якім у Беларусі да рэвалюцыі належала да 45 працэнтаў усіх зямель, многа фабрык і заводаў...

12 студзеня 1918 года корпус Доўбар-Мусніцкага пачаў актыўныя дзеянні супраць Савецкай Рэспублікі... Паўсюдна, дзе паяўляліся легіянеры, насельніцтва падвяргалася грабяжу і насіллям. Белапалякі разганялі органы Савецкай улады, жорстка распраўляліся з партыйнымі і савецкімі работнікамі. Услед за імі вярталіся ўцёкшыя ў час Кастрычніцкай рэвалюцыі капіталісты і памешчыкі, якія пры дапамозе белапалякаў па-зверску распраўляліся з насельніцтвам і аднаўлялі старыя парадкі. Так, часопіс «Рэвалюцыйная стаўка» 13 снежня 1917 года пісаў, што ў вёску Рагінь Рагачоўскага павета «...прыбыло каля 200 польскіх уланаў з кулямётамі і пачалі форменны пагром: рэжуць жывёлу, грабяць жыхароў, ёсць забітыя». Такі лёс напаткаў вёскі Рагачоўскага павета Забалоцце, Гарадзец, Сямёнаўку і многія іншыя.

...Па закліку Савецкай улады працоўныя... сталі на абарону роднай зямлі... Баявыя атрады для барацьбы з легіянерамі былі створаны... у с. Рагінь Буда-Кашалёўскай воласці і г.д... Адзін з партызанскіх атрадаў, які дзейнічаў у Рагачоўскім павеце, у баі каля с. Гарадзец разграміў вялікі атрад белапалякаў, захапіў канцылярыю яго палявога штаба, многа зброі, боепрыпасаў і ваеннапалонных.

Нямала подзвігаў зрабілі партызаны Рагінскага атрада, які дзейнічаў у Буда-Кашалёўскай воласці. Гэты атрад узнік у снежні 1917 г. Спачатку ў ім было 12 сялян-беднякоў, а ўзбраенне ў іх складалася з аднаго рэвальвера, вілаў і сякераў. Але неўзабаве гэты атрад ператварыўся ў вялікі, добра ўзброены, які зрабіў нямала подзвігаў у барацьбе супраць белапалякаў.

Камандаванне белапольскага корпуса накіравала супраць рагінскіх партызан вялікі карны атрад, узброены кулямётамі і гарматамі. Каля вёскі Негаўкі, размешчанай на паўднёвым захадзе ад Рагіні, адбылася жорсткая бітва. Белапалякі былі разбіты і адступілі назад у Рагачоў.

У канцы студзеня 1918 года рагінскія партызаны сумесна з чачэрскімі нанеслі сур'ёзнае паражэнне белапалякам каля с. Гарадзец. Партызанам дасталося нямала трафеяў. Звыш 50 легіянераў было ўзята ў палон. Застаўшыяся ў жывых легіянеры ў паніцы адступілі да Жлобіна...

...Не паспелі заціхнуць баі супраць

белапольскага корпуса Доўбар-Мусніцкага, як... у лютым 1918 года немцы, вераломна парушыўшы ўмовы Брэст-Літоўскага перамір'я, пачалі наступленне супраць Савецкай Расіі.

...Каб затрымаць прасоўванне праціўніка, ствараліся баявыя атрады з рабочых і сялян, спецыяльныя «атрады-заслоны» і асобныя атрады для барацьбы ў тыле ворага... У пачатку сакавіка 1918 года па Магілёўскай губерні ў рады Чырвонай Арміі і ў партызанскія атрады добраахвотна ўступіла 3312 чалавек... Баявыя атрады былі створаны ў Рэчыцы, Рагачове, Добрушы, Буда-Кашалёве, Карме і інш. населеных пунктах Гомельшчыны...

Стойка змагаўся Буда-Кашалёўскі атрад, які дзейнічаў у раёне паміж станцыямі Уза і Буда-Кашалёў.

Каб зламаць супраціўленне працоўных Гомельшчыны, нямецкія захопнікі жорстка распраўляліся з насельніцтвам. Рад населеных пунктаў яны знішчылі агнём артылерыі. Пры гэтым загінула многа мірных жыхароў. Але гэта не аслабіла, а, наадварот, яшчэ больш узмацніла супраціўленне працоўных...

...Створаныя яшчэ ў перыяд барацьбы супраць польскіх легіянераў баявыя атрады с. Роўкавічы, Рагінь, Наўхавічы, Ліпы, Забалоцця і Сябровічы рашылі аб'яднацца, каб сумесна даць бой захопнікам. На чале партызан стаяў Е.П.Якубаў.

Партызаны сустрэлі атрад нямецкіх войск каля шашэйнай дарогі паміж в. Забалоцце і Рагінь і разбілі яго ўшчэнт. Партызанам дасталася значная колькасць зброі, боепрыпасаў і абоз з рознай нарабаванай у мясцовага насельніцтва маёмасцю...

...Буйныя бітвы паміж партызанамі і нямецкімі войскамі адбыліся каля Буда-Кашалёва, дзе партызаны навакольных вёсак, аб'яднаўшыся ў адзін атрад, аказалі рашучае супраціўленне нямецкім захопнікам. Хаця пад напорам пераўзыходзячых сіл праціўніка яны і вымушаны былі адступіць, але працягвалі барацьбу аж да выгнання нямецкіх акупантаў з нашай зямлі.

...Палескі [падпольны]камітэт РКП(б) з'явіўся цэнтрам усенароднай барацьбы на Гомельшчыне супраць нямецкіх захопнікаў... 15 сакавіка 1918 г. была выпушчана першая лістоўка, якая заклікала працоўных Гомельшчыны да ўзмацнення барацьбы супраць нямецкіх акупантаў... Рэўком заклікаў рабочых і працоўных сялян павета зрабіць усё для таго, каб перашкодзіць немцам грабіць і вывозіць у Германію наш хлеб, нашы багацці. У адной з лістовак пісалася: «Таварышы сяляне! Немцы пасылаюць сваіх агентаў-гандляроў да вас у вёскі для скупкі хлеба і жывёлы. Вам плацяць дорага, але плацяць фальшывымі грашыма. Не прадавайце ім свайго хлеба. Ён вам патрэбен для асемянення сваіх і памешчыцкіх палёў, якія вы атрымаеце, калі бальшавікі прыйдуць»... Сяляне сталі хаваць збожжа, уганяць жывёлу ў лясы, аказваць рашучае супраціўленне нямецкім атрадам, што рыскалі па населеных пунктах з мэтай аграблення.

Супраціўленне працоўных расло з кожным днём. Так, сяляне в. Буда-Кашалёўскай Гомельскага павета, двойчы аграбленыя акупантамі, «узброіліся як-небудзь, аказалі адчайнае супраціўленне, але супраціўленне было зломлена, вёска зусім знішчана артылерыйскім агнём».

...Да канца 1918 года... скончылася першая сусветная вайна. Германія і яе саюзнікі пацярпелі паражэнне... 13 лістапада 1918 г. Савецкі ўрад ануляваў... Брэсцкі дагавор... і пачаў адкрытую барацьбу за выгнанне нямецкіх захопнікаў за межы краіны...

28 лістапада 1918 г. быў вызвалены г. Бабруйск, 30 лістапада — мястэчкі Буда-Кашалёва і Уваравічы, станцыі Уза і Касцюкоўка...

14 снежня 1918 г. на ст. Уза пачаліся перагаворы паміж прадстаўнікамі нямецкага камандавання і савецкай дэлегацыяй...

18 снежня ноччу са станцыі Уза ў Гомель прыбыло падраздзяленне чырвонаармейцаў, пераапранутых у цывільнае адзенне. Разам з гомельскімі партызанамі яны арыштавалі гетманскага вайсковага начальніка генерала Іванова і яго ад'ютанта і пачалі абяззбройваць пятлюраўскія войскі...

20 снежня 1918 г. часці Чырвонай Арміі ўступілі ў Гомель...

Друкуецца па кн.: Пад сцягам партыі. Гомель, 1959. С. 59—104.

Дакументы сведчаць

22 студзеня (4 лютага) 1918 г.

З ЗАГАДУ ГЛАЎКАВЕРХА

...Довбор-Мусницкий объявил войну Советским войскам. Наймиты буржуазии, поддерживаемые французскими деньгами, в тайном союзе с Украинской Радой, польский комитет и другие руководящие круги польской буржуазии недаром так противились демократизации армии: они знали, чем пахнет для них выборное начало в войсках. И когда оттягивать демократизацию больше не могли, они пошли на все: обманутые офицерами польские войска заняли Рогачев и Бобруйск, а отдельные войска осмелились ударить в тыл революционным войскам.

Советская власть не может допустить подобных, явно мятежнических действий...

...предписываю: прекратить отпуск довольствия приставшим к контрреволюционному командному составу и поднявшимся на защиту польских помещиков войскам...

Предлагая товарищам польским солдатам немедленно оставить место расположения польского корпуса и явиться с изъявлением готовности бороться вместе с русскими солдатами, арестовать командный состав и офицеров: командира корпуса Довбор-Мусницкого объявляю врагом революции и вне закона. Всех офицеров, взятых с оружием в руках, приказываю немедленно, на месте предавать революционному суду и действовать по отношению к ним без пощады, а в случае сопротивления расстреливать без суда. Крестьянам Могилевской губернии предлагаю расправляться с насильниками по своему усмотрению.

Верховный Главнокомандующий Н. Крыленко

Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці. Ф. 52. Воп. 1. Спр. 8. Л. 28—29.

Сакавік 1918 г.

Нямецкія акупанты знішчылі артылерыйскім агнём вёску Буда-Кашалёва.

Разгром немецких захватчиков в 1918 г. Госполитиздат, 1943. С. 124.

25 мая 1918 г.

Беларускі аддзел пры Наркамаце па справах нацыянальнасцей у сваім паведамленні аб стане ў акупіраванай Беларусі паведамляў: «Деревни изолированы друг от друга патрулями... В деревнях реквизируют дочиста все за четверть цены. За сопротивление бьют. Вообще телесные наказания в ходу. За слово «большевик» — 25 розг, «товарищ» — 25 рублей штрафа».

Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 году. Мн., 1947. С. 117.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

З РЭЗАЛЮЦЫІ СХОДУ МАБІЛІЗАВАНЫХ МАТРОСАЎ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

Лета 1918 г.

Мы, мобилизованные матросы, на общем собрании единогласно постановили: просить тов. комиссара по военным делам отправить нас в Могилевскую губ. для борьбы с белогвардейской бандой. Просим тов. комиссара Флеровского, чтобы нас, как истинных партийных людей и бывших в экспедиционных отрядах моряков, отправили вооруженными. Пощады нет прихлебателям и предателям Советской власти, где мы , матросы, как истинные борцы за социализм, и при первом вашем зове, мы готовы драться до последней капли крови за социализм и поддержать Советскую власть.

Настоящая резолюция принята всеми мобилизованными матросами Могилевской губернии.

За председателя секретарь (подписи неразборчивы)

Расійскі дзяржаўны архіў Ваенна-марскога флоту. Ф. р-315. Воп. 1. Спр. 78. Л. 3.

З ДАНЯСЕННЯ КАМЕНДАНТАЎ ЦЕЛЯШОЎСКАЙ ВОЛАСЦІ КАМАНДЗІРУ 1-га БАТАЛЬЁНА 147-га ПАЛКА 17-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ т. ЧЫЖЫКАВУ

13 лістапада 1918 г.

...По пути из д. Галеевка задержаны везущие 11 пудов сала в Гомель Болотцев и Осипов в 20 часов 12 ноября. Шлю их к Вам на разбор. Завтра мы приедем. Вышлите побольше литературы. Будем организовывать комбеды с немцами в Телешах. Задержано 1288 рублей украинскими и 1000 рублей керенскими.

Коменданты Телешовской волости агитаторы А. Мельниченко, Кузьменко.

Справка: Подразделения 1-го батальона 149-го полка (Командир Чижиков Логин Иванович) прибыли на станцию Уза и расположились на демаркационной линии, проходившей вблизи станции. Военкомом батальона с 1 октября 1918 г. был стойкий большевик БРИЧКИН Нассон, прошедший с боями дороги 1-й мировой и гражданской войны, знавший немецкий язык; командиром 1-й роты — ЕДЛИЧКИН Карл Иванович, имевший боевой опыт фронто-бойца. Вместе с сочувствующими эти три коммуниста батальона не ограничивались выполнением только своих служебных обязанностей по несению пограничной службы, борьбе с контрабандой и т. п. Они активно вели пропаганду среди немецких солдат, особенно после свершения ноябрьской 1918 г. революции в Германии, помогали создавать в частях оккупантов солдатские Советы. Результатом их пропагандистской работы стал даже такой факт, как участие немецких солдат в создании комбедов.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ КАМІТЭТА БЕДНАТЫ ВЁСКІ ГАЛЕЕЎКА КАМАНДЗІРУ 1-га БАТАЛЬЁНА

19 лістапада 1918 г.

Доводим до сведения командира 1-го батальона, что красноармейцы Вашей части МЕЛЬНИЧЕНКО и КУЗЬМЕНКО, а также два немца из 4-го полка участвовали при организации комитета бедноты и была роздана немецкая и русская литература.

Председатель комитета бедноты д. Галеевка М. Ковалев.

Секретарь комитета бедноты А. Банкрашков.

Три подписи на немецком языке.

З ДАНЯСЕННЯ ВАЕНКОМА 17-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ЧЛЕНУ РВС ЗАХОДНЯЙ АРМІІ І. Я. АЛІБЕГАВУ

23 лістапада 1918 г.

В Гомель послан для политической работы (представитель) от военкома 17-й стрелковой дивизии т. Рационер для организации Советской власти на местах. В 151-м полку командир полка (С.И.Абрамович) и большинство ротных командиров коммунисты. Военкома нет, но полк образцовый, в каждой роте есть коммунистическая ячейка. Настроение революционное. В 152-м полку военком Дергачев Спиридон Карпович, моряк-балтиец. В полку 1600 штыков, но около 600 босых (сформирован из партизанских отрядов Могилевской губернии, как и все полки 17-й сд). Полк занял г. Рогачев.

Военком 17-й сд Редер Адольф Яковлевич.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 3405. Воп. 1. Спр. 18. Л. 8; Спр. 1. Л. 39, 43—45.

Падрыхтаваў І.Я.Краўцоў.

З ЗАГАДУ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМЕНДАНТА ЧАБАТОВІЦКАЙ ВОЛАСЦІ

5 снежня 1918 г.

I. Объявляю, что с 1 декабря с. г. Чеботовичская вол. очищена от войск германских империалистов. С 1 декабря сего года я назначен революционным комендантом по Чеботовичской вол. до образования Советской власти. Никакой другой власти, кроме народной Советской, не подчиняться.

II. Самовольная порубка леса, выгонка самогонки и хранение оружия воспрещается.

III. Все имения бывших помещиков объявляются собственностью всего народа. За хищение имущества из имений, ставших теперь народным достоянием, виновные будут по всей строгости революционного закона караться вплоть до расстрела.

IV. Предписывается всем, имеющим оружие, сдать его в 3-дневный срок в комендатуру с. Чеботовичи (бывшее волостное правление): за неисполнение и укрытие оружия — самые строгие наказания революционного закона.

V. Все начальствующие лица, назначенные старой помещичьей властью: члены земской управы, сельские старосты и так далее — с 1 декабря сего года смещаются: вся власть должна перейти к комитетам деревенской бедноты, выбранным крестьянами, которые не пользуются чужим трудом. Предлагаю в каждой деревне выбрать такие комитеты из беднейшего слоя населения. Каждый кулак или богач, который пролезет в такой комитет, будет расстрелян.

За революционного коменданта А. Буренко.

По избрании комитетов председатели таковых должны обязательно явиться 14 декабря для участия в собрании.

За революционного коменданта А. Буренко.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 495. Воп. 1. Спр. 6. Л. 1.

АБ ПАДЗЕЯХ У ГОМЕЛІ

20 снежня 1918 г.

В город Гомель со станции Уза прибыло подразделение 1-го батальона 149-го полка 17-й стрелковой дивизии. Накануне ночью с 18 на 19 декабря Гомельский Ревком с помощью просочившихся в город партизан уезда захватил власть в свои руки, заняв почту, телеграф, телефон, банк, здание городской Думы, вокзал. Было арестовано свыше 250 белогвардейцев. От гарнизона ст. Уза действовал в Гомеле командир 1-го батальона Л. И. Чижиков. Из Могилева в Гомель специальным паровозом прибыли: Д. З. Мануильский, В. Р. Менжинский, Д. Гуревич. В театр «Художественный», в котором на митинге произносил речь Д. З. Мануильский, ворвались немецкие солдаты и офицеры и арестовали его и других членов советской делегации. Но через несколько часов всех отпустили, члены делегации на том же паровозе выехали на ст. Калинковичи. Немцы и гайдамаки захватили в Гомеле штаб большевиков на Ирининской улице и арестовали около 40 партийцев.

З ДАНЯСЕННЯ ВАЕНКОМА 149-га ПАЛКА І.П.ЛУМБОЎСКАГА

21 снежня 1918 г.

...Сего числа я приехал в 1-й батальон полка на ст. Уза, провел организационное собрание ячейки коммунистов, три члена партии и сочувствующие. Сегодня в Гомеле назревают крупные события. Все население, железнодорожные рабочие и пролетариат Гомеля рвутся в бой, и только благодаря популярности комбата Чижевского кое-как до сих пор удавалось сдерживать, что за последнее время стало не под силу. Мне кажется, что сегодня ночью окружающее население выступит под Гомель и разоружит гарнизон (противника), что, по их словам, легко выполнить и без потерь, так как они прекрасно знают расположение частей, караулов немцев. О настроении населения, об организации партизанских отрядов и связи их и об остальном сделаю дополнительный доклад.

Военком 149-го полка 17-й стрелковой дивизии ЛУМБОВСКИЙ.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 3405. Воп. 1. Спр. 1. Л. 48.

Даведка: 149-й полк сформирован в 1918 г. из партизанских отрядов Витебской губернии и имел наименование «149-й Стайковский полк» в связи с тем, что кадры полка составили партизаны д. Стайки Витебской губ. Вслед за покидающими Белоруссию немецкими оккупантами полк занимал освобожденные деревни и села на Могилевщине, а 1-й батальон 149-го полка был выдвинут на вновь образовавшуюся демаркационную линию и расположился на ст. Уза, ставшей центром по руководству партизанским движением Гомельского уезда, координации действия их и создания новых отрядов. Здесь же проводились переговоры советского и немецкого командования об условиях ухода немцев и занятия населенных пунктов частями Красной Армии. Так, 3 декабря 1918 года на ст. Уза из Жлобина прибыла пограничная конфликтная комиссия во главе с ее председателем Максимовским, сотрудником для поручений Погожеловым, командиром 151-го полка 17-й стрелковой дивизии Абрамовичем Сергеем Ивановичем. На ст. Уза к ним присоединились три представителя из Гомеля и уполномоченный Могилевского губкома партии Д. Гуревич. Местом встре-

чи с делегацией немцев был пункт между ст. Уза и Костюковка, где оказался разобранным железнодорожный путь. Около 19 часов туда же из Гомеля на автомобиле прибыла немецкая делегация: 7 солдат и офицер железнодорожной службы. Переговоры проходили в вагоне советской делегации.

Немцы с ходу отклонили предложение очистить Гомель, мотивируя это тем, что участок Уза — Гомель состоит собственностью Украины, а поэтому «...уступка участка может вызвать протест и вмешательство французского консула и послужит поводом к новой войне Германии с союзниками». Немецкая сторона также заявила, что дальнейшее удержание за собой Гомеля поможет немцам контролировать весь участок железной дороги Гомель — Лунинец для беспрепятственной эвакуации своих войск в Германию. Обе стороны согласились на совместное занятие станции Костюковка при условии, чтобы немцы не препятствовали белорусскому населению Гомеля и уезда поднять восстание против притеснения и произвола украинских гайдамаков-петлюровцев. В противном случае поддержка немцами петлюровцев вызовет всеобщую политическую забастовку.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 1262. Воп. 1. Спр. 146. Л. 1—2.

* * *

2 студзеня 1919 г.

Из 149 полка (со ст. Уза) сообщают: настроение населения в районе расположения полка доброжелательное, кругом Гомеля организовалось много партизанских отрядов, стоящих за Советскую власть... В полку настроение красноармейцев бодрое, открыт клуб, в котором для красноармейцев (и рабочих) читаются лекции на политические темы. В окрестных деревнях происходят выборы Советов, в которые большей частью приходят коммунисты...

Завполитотдел Западной армии Писарев.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 201. Воп. 2. Спр. 423. Л. 378.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ЭВАКУАЦЫІ НЕМЦАЎ

Да 5 студзеня 1919 г.

На ст. Уза Д.З.Мануильский, Д.Гуревич, Драгунский подписали с немецким командованием новое соглашение о восстановлении Советской власти на Гомельщине и в Гомеле с 12 час. 6 января и о содействии эвакуироваться немцам. Немцы согласились передать ревкому Гомеля 18 орудий, 50 пулеметов, 400 винтовок и много боеприпасов. Это было результатом железнодорожной забастовки гомельского узла ст. Уза, Буда-Кошелев, Забабье и других пунктов Либаво-Роменской жел. дороги, начавшейся 28 декабря 1918 г. в знак протеста против нарушений немцами договора о допущении советских войск в город Гомель.

Бастующих было более 3 тыс. человек... Паровозы испорчены, в некоторых местах взорваны мосты. С нашими повстанцами установлена связь, в тылу выполняют общую задачу, — говорилось в донесении командования Западной армии Главкому.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 6. Воп. 4. Спр. 36. Л. 202—203.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Як успомнім паходы...

З успамінаў К.Р.Новікава, былога начальніка Рагінскага партызанскага атрада

З Рагінскага маёнтка мы прагналі пана Дурналовіча. Усё багацце мы перадалі ў рукі беднаты нашай вёскі. Тым часам белапалякі пачалі наступленне на Беларусь. І вось 10 снежня 1917 года да нас у Рагінь прыехалі 12 легіянераў 3-га уланскага палка для расправы з сялянамі.

Бачачы, што становішча абвастраецца, я ўзяў з сабою зброю, пабег у сельсавет. Старшыні сельсавета Яцкоўскаму Мацвею ўнёс прапанову сабраць усіх дэмабілізаваных салдат і зброю. Сабралася каля 20 чалавек. Прыходзілі хто з чым (з віламі, паляўнічымі стрэльбамі, вінтоўкамі).

З гэтымі людзьмі мы абдумалі план дзеянняў. Вырашылі паслаць дэлегацыю да белапалякаў. Пайшлі мой брат Новікаў Марка, Маслакоў Максім (пасля расстра-

ляны белапалякамі) і Кашкоў З. Мы напісалі палякам патрабаванне: праз 30 хвілін ачысціць Рагінь. Праз некаторы час мы бачым, што ў вёску варочаецца наша дэлегацыя і з ёю ідуць польскі афіцэр і тры ўланы. Мы занялі месцы, чакаючы падыходу палякаў. Як толькі яны параўняліся з нашай засадай, мы выскачылі і скамандавалі ім астанавіцца. Тут жа мы іх абяззброілі.

Нам патрэбна было яшчэ абяззброіць астаўшыхся ў маёнтку 8 уланаў. Мы вырашылі, што палонных паставім уперадзе і пойдзем у маёнтак. Падыходзячы да маёнтка, я скамандаваў афіцэру, каб ён аддаў загад уланам скласці зброю. Белапалякаў мы абяззброілі. Так пачаў фарміравацца Рагінскі партызанскі атрад. Гэта быў толькі пачатак барацьбы нашага партызанскага атрада з белапалякамі.

Ленінскі шлях. 1936. 26 студз.

З успамінаў Р.Буксава, былога байца Рагінскага партызанскага атрада

Пасля некалькіх стычак з белапалякамі наш партызанскі атрад узмацніўся. З намі ўжо лічыліся як з магутнай баявой сілай. З м. Чачэрск мы атрымалі тэлеграму аб дапамозе. У ёй было ўказана, што з м. Сырская-Карма ідзе польская дывізія генерала Доўбар-Мусніцкага. Наш атрад у колькасці 30 чалавек конным маршам паехаў у Чачэрск. Прыязджаем і бачым — белапалякаў яшчэ няма. Мы арганізавалі насельніцтва для абароны, выбралі начальніка партызанскага атрада, а самі рушыліся на в. Меркулавічы. Наш начальнік партызанскага атрада Новікаў з партызанамі Гайковым Аляксеем і Талкачовым Кузьмой накіраваліся ў Рагінь для арганізацыі самаабароны. У Меркулавічы мы прыйшлі ноччу. Сяляне нам перадалі, што недалёка ў 3 км ад нас знаходзяцца белапалякі. Раней мы прайшлі в. Стоўпня і такім чынам наш атрад з 25 чалавек пры двух кулямётах аказаўся ў тыле белапалякаў. Навакольныя сяляне нам прыносілі звесткі аб тым, якая вёска занята белапалякамі. Наша разведка выкрыла, што па галоўнаму шляху ідзе белапольская калона. Мы пачалі раіцца, што рабіць? Патронаў у нас было вельмі мала, але, каб папоўніць запас патронаў, трэба ўступіць у бой. Мы абышлі калону кругом і з тылу знянацку накінуліся на белапалякаў. Ад белапалякаў мы адбілі абоз з патронамі і харчаваннем. Патронаў у нас цяпер было дастаткова. Па шляху ў м. Гарадзец мы часта сустракаліся з белапалякамі, з якімі вялі перастрэлку.

Неўзабаве мы ўбачылі, што ўперадзе насустрач нам ідуць белапалякі ў колькасці 150 чалавек. Мы заляглі ў засаду. Як толькі яны з намі параўняліся, мы адкрылі кулямётны і ружэйны агонь. Гэта перапалохала белапалякаў, якія ў беспарадку адступілі на Гарадзец. Але наш агонь быў меткім — многія белапалякі паляглі на дарозе. Мы адбілі ў белапалякаў кулямёты і інш. зброю. У гэтай сутычцы быў паранены адзін партызан. Пада мной быў забіты конь.

Каля в. Хімы нас абстралялі белапалякі. Але партызаны былі ўсюды. Раптам мы пачулі збоку моцнае «Ура» і моцны кулямётны агонь. Гэта нашы таварышы падаспелі на дапамогу.

Вёска Наспа

Гэта было ў сакавіку 1918 г. У вёску ўварваўся конны атрад белапалякаў з 8 чалавек пад камандаваннем двух афіцэраў. Спыніліся ў гаспадара Блюміна. Па загаду афіцэраў у яго дом склікалі сялян. Па даносу Блюміна выдзелілі 12 сялян, абвінавацілі іх у зачынанні грабяжу маёмасці пана Вязміціна. Афіцэры пачалі збіваць бізунамі Котава Майсея і Котава Пятра. У гэты момант Котаў Аляксей, Сінякоў Іван і Петрушкоў Максім непрыкметна выехалі ў в. Гаўлі, паведалі партызанам аб здзеках белапалякаў над сялянамі. Белапалякі ўчынілі здзекі і грабеж у в. Нагруж. Падводы з дабром былі гатовы да ад'езду, як у Гаўлі нечакана з'явіліся партызаны. Белапалякі пабеглі. У перастрэлцы трое былі забіты, двое паранены, астатнія ўцяклі. У гэты ж час белапалякі пачалі расправу ў в. Наспа. Яны расстрэльвалі непавінных, а трупы кідалі ў агонь. Так белапалякі спалілі забітага Ваяводава Якава, Раманенку Сілівея. Яго белапалякі забілі пасля таго, як ён нагрэў ім чай.

І.Гакаў.

Ленінскі шлях. 1939. 21 чэрв.

Мы перамаглі і пераможам

Я ўступіў у чырвонагвардзейскі атрад, які прыбыў з Оршы на ст. Уза, праследуючы немцаў, у 1918 годзе. У Гомелі мы абяззброілі немцаў і гайдамакаў. Прайшлі з баямі Бахмач, Нежын, вызвалялі Кіеў. У Кіеве атрад улiўся ў партызанскае злучэнне М.Шчорса. У студзені 1919 г. атрад рэарганізавалі ў 3-і Украінскі Савецкі полк. Мы з баямі занялі Сквіры, Пагрэбішча, Белую Царкву. Далей былі баі за Вінніцу, Бярдзічаў, Жытомір. У Жытоміры нашчэнт былі разбіты атрады Пятлюры. Калі нашы часці занялі Жытомір, Пятлюра ўцёк на самалёце на Роўна і Наваград-Валынскі.

У пачатку 1919 г. дывізія ўступіла ў баі з белапалякамі. На дапамогу польскім акупантам ішлі Дзянікін, Махно, французы і англічане. Прыходзілася адступаць. З прыходам Коннай Арміі С.М Будзённага белапалякі страцілі многа жывой сілы і зброі, пачалі адступаць. Мы гналі іх да Варшавы. У баі пад Корасценем загінуў легендарны герой грамадзянскай вайны М. Шчорс. У 1920 годзе наша часць была кінута на разгром банд Махно.

З.Е.Цецераў.

Ленінскі шлях. 1939. 21 чэрв.

З апісання баявых дзеянняў Рагінскага партызанскага атрада, складзенага яго камандзірам К.Р.Новікавым

Партызанскі атрад заснаваны ў 1917 годзе, 10-га снежня (па старому стылю). У пачатку былі толькі адны людзі, а зброі не было ніякай. Быў адзін рэвальвер у мяне. Вось з гэтым рэвальверам, з сякерамі, віламі і рыдлёўкамі мы раззброілі 12 белапольскіх уланаў (конных) 3-га ўланскага палка, які быў у Рагачове.

Спачатку ўзброілі 12 беднякоў з в. Рагінь — Буксава Рыгора, Хралянкова Трафіма, Гайкова Яўсея, Гайкова Сямёна, Гладунова Ігната, Новікава Аксёна, Новікава Панаса, Навікоўскага Рамана (забіты), Чарняўскага Арцёма, Паўлючкова Сцяпана (памёр), Маслакова Максіма (расстраляны), Навікоўскага Адама.

З гэтымі сіламі пад маім кіраўніцтвам мы і раззброілі 12 белапалякаў, якіх я адвёз у Гомель і здаў у рэўком.

Гэта 1-я сутычка з белапалякамі адбылася 10.12.1917 г.



К.Р.Новікаў.

У ноч з 11 на 12 снежня 1917 г. да нас у маёнтак Рагінь прыехалі 56 белапольскіх уланаў, і з-за таго, што я быў у Гомелі, мой атрад быў захоплены знянацку, партызаны разбегліся хто куды, аднаго Маскалёва злавілі.

Прыехаўшы ў Рагінь, я адкрыў стральбу адзін па белапалях. Трох уланаў я застрэліў (двух у хаце Буксава Еўсціна, а аднаго коннага — на дарозе, каля Шаўцовага гумна). Астатнія белапалякі, захапіўшы з сабой Маскалёва (якога расстралялі), уцяклі ў Рагачоў.

З той пары наш атрад стаў шпарка расці колькасцю. У горадзе Гомелі я атрымаў у Жыліна 60 вінтовак і камплект патронаў да іх.

Белапалякі не супакоіліся, яны кінулі супраць нас вялікія сілы, узброеныя кулямётамі і гарматамі, і зрабілі наезд на Буда-Люшаў, што ў 12 км ад в. Рагінь. Мы своечасова выступілі, занялі в. Негаўку, з якой і рабілі разведку ў Буда-Люшаў. Белапалякі білі з гармат па Негаўцы, калі даведаліся, што мой атрад знаходзіцца там, але калі мы павялі наступ у бок Буда-Люшава, то белапалякі падняллі гарматы на передкі і ўцяклі назад у Рагінь.

Негаўскія партызаны аддалі нам свой кулямёт, бо самі дзейнічаць з ім не маглі, таму што партызан там было вельмі мала, штосьць чалавекі 3 (аднаго з іх палякі забілі). Усё гэта было ў пачатку студзеня 1918 г.

У сярэдзіне студзеня 1918 г. з горада Ельні па шашы, што з Доўска на Гомель, у напрамку да нас рухалася белапольская дывізія генерала Доўбар-Мусніцкага. Гэтай мясцовасці пагражала небяспека. Жыхары м. Чачэрска ўсхваляваліся і прасілі нас дапамагчы. У Чачэрску быў атрад самаабароны і 2 кулямёты.

Я са сваімі коннікамі з'явіўся ў Чачэрск, у якім я не знайшоў ніводнага байца, бо яны ўсе пахаваліся, кулямёты і коней пахавалі таксама. Я разаслаў сваіх конных па ўсіх вуліцах і хатах шукаць партызан. Праз некалькі гадзін удалося склікаць 25 чалавек з вінтоўкамі на чале са старшым міліцыянерам Міхальчанкам.

Узяўшы кулямёты і коней, мы разам занялі в. Меркулавічы, адкуль і вялі разведку ў бок в. Гарадок. У в. Царкоўе я сабраў усе пяхотныя сілы. Белапалякі павярнулі ў бок в. Гарадзец і м. Жлобіна. Пад в. Столпін і м. Гарадзец у нас былі баі. Адразу ў нас забілі чатырох конных і аднаго партызана. Першы бой прайшоў няўдачна. З другога боку каля в. Угольцы ўступіў у бой 1-ы Магілёўскі партызанскі атрад.

Другі бой пад Гарадцом прайшоў удачна. Шмат белапалякаў было пабіта намі, 51 белапаляка мы ўзялі ў палон і адрэзалі частку абозу з рознымі рэчамі. Белапалякі пакінулі в. Гарадзец і пайшлі ў м. Жлобін.

У сярэдзіне лютага 1918 года з раз'езда Хальч выехалі 3 атрады белачачэнцаў-карнілаўцаў. Адзін — у м. Журавічы, другі — у м. Карму, трэці — у м. Чачэрск. Мой атрад далучыўся да Радкоўскага атрада, якім кіраваў Казлоўскі Ф., але не доўга мы былі разам... Пад вёскамі Антонаўка і Рудзенька мы разбілі чачэнцаў, узялі 200 вінтовак і 2 кулямёты. З м. Карма ехаў другі чачэнскі атрад на дапамогу разбітым, і мой атрад пад в. Вецвіца разбіў гэты атрад і ўзяў 1 кулямёт.

Усе рагінскія жыхары былі ўзброены і моцна трымаліся.

Увесь сакавік 1918 г. прайшоў у барацьбе з немцамі. Сяло Кашалёў двойчы пераходзіла з рук у рукі. У Кашалёве было 15 партызан. Супраць немцаў мы вялі баі ў в. Кашалёў, пад в. Бронніцай, Ліпінічамі, маёнткам Віктарынская і г. д. У гэты час у маім атрадзе было ўжо 1000 узброеных байцоў, але не ўсіх іх трэба лічыць партызанамі, гэта была часовая дапамога насельніцтва нашай барацьбе.

Актыўнымі партызанамі былі: Сарокін Хомка, Шаўцоў Міхась, Шаўцоў Іван, Кажэўнікаў Радзька, Мартынаў Барыс, Яцкоўскі Хомка, Чарнякоў Пятро, Гайкоў Сямён, Мартынаў Іван, Чарнякоў Федзька, Новікаў Марка, Кажэўнікаў П., Паўлючкоў Піліп, Чарнякоў Ігнат, Зыкаў Архіп, Навікоўскі Мікалай, Буксаў Сцяпан, Талкачоў Кузьма, Чуракоў Ларывон... Атрад меў свой штаб у в. Рагінь. Харчаваліся са сродкаў фальварка Рагінь. Аплачвалі з мясцовых сродкаў па 50 руб. у месяц кожнаму. Кіраўніком атрада на агульным сходзе партызаны выбралі Новікава Кірылу Раманавіча.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 296. Воп. 1. Спр. 180. Л. 34—36.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

За ўладу Саветаў

1919 год. Праз два-тры месяцы пасля заканчэння нямецкага нашэсця прыйшлі польскія акупанты. Тэрыторыя Буда-Кашалёўшчыны зноў стала прыфрантавой, а часам і месцам жорсткіх баёў.

10 красавіка 1919 г. па рашэнні Савета Народных Камісараў РСФСР у ліку дзевяці губерняў у Гомельскай прайшла мабілізацыя.

15 красавіка 1919 г. Дэкрэтам Усерасійскага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Савета Народных Камісараў РСФСР у сувязі з надзвычайным становішчам у краіне прадугледжвалася «...вести всю работу на обслуживание армии до высшей степени напряжения..., военная победа необходима в короткий срок, иначе война приведет нас к неминуемому экономическому истощению страны и крушению Советской власти» (Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф.32. Воп.1. Спр.25. Л.19).

17 красавіка 1919 г. на Буда-Кашалёўшчыне пачалі добраахвотны прызыў у Чырвоную армію і Ваенна-марскі флот, а ў хуткім часе прайшла прымусовая мабілізацыя шэрагу ўзростаў. Атрады, укамплектаваныя за кошт мясцовых сродкаў зброяй і амуніцыяй, спешна накіроўваліся на Заходні, Усходні, Петраградскі, Паўночны і Паўднёвы франты.

У маі 1919 г. пры валасных ваенкаматах былі сфарміраваны атрады асобага прызначэння. У іх залічвалі добраахвотнікаў з вызваленых ад мабілізацыі ў армію. Камсамольцы і камуністы ўключаліся ў атрады прымусова і незалежна ад займаемых імі пасад. Байцы не вызва-

ляліся ад сваіх службовых абавязкаў і з'яўляліся ў атрады па выкліку.

У першыя дні мабілізацыі на фронт пайшлі Бабкоў Максім Піліпавіч, Бозікаў Фёдар Міхайлавіч, Галушкін Парфен, Джумаў Мірон Цімохавіч, Жыцявец Іван Паўлавіч, Кавалёў Трафім Андрэевіч, Казлоў Пахом Фёдаравіч, Парфененка Лявон Восіпавіч, Чумакоў Іван Гапонавіч, Фядотаў Нічыпар Міхайлавіч і інш.

І куды толькі не закідвала вайна буда-кашалёўцаў! Яны ваявалі на Заходнім і Усходнім франтах, супраць палякаў і калчакаўцаў. Абаранялі Петраград і Царыцын, вызвалялі Украіну і Каўказ, штурмавалі Перакоп і Спаск, на Далёкім Усходзе білі японскіх захопнікаў.

Нямала буда-кашалёўцаў змагалася ў складзе экіпажаў баявых караблёў Балтыйскага, Чарнаморскага, Паўночнага і Ціхаакеанскага флатоў, Волжскай і Дняпроўскай ваенных флатылій.

Шмат нашых землякоў не вярнуліся з гэтай вайны.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

З МАТЭРЫЯЛАЎ АБ ЛІКВІДАЦЫІ СТРАКАПЫТАЎСКАГА ПАЎСТАННЯ Ў ГОМЕЛІ

9/3, Могилев. 26 марта 1919 г., 20 час.

Для ликвидации восстания в районе Гомеля приказываю:

1. Начальнику Жлобинского отряда Богданову при военкоме Адамовиче сосредоточиться с переданными ему частями в районе ст.Уза и, действуя с севера на Гомель, заставить засевшие там взбунтовавшиеся части эвакуироваться в направлении на Новозыбков для разоружения их отрядом Филиппова...

Член Реввоенсовета Беллитармии
ПЫЖЕВ Алексей Михайлович.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 1260. Воп. 2. Спр. 67. Л. 66.

Даведка: Атрад Адамовіча Іосіфа Аляксандравіча (у 1920-я г. старшыня Саўнаркома БССР) дзейнічаў з браняпоездам супраць стракапытаўцаў у раёне ст.Уза, каб прадухіліць прарыў мяцежнікаў з Гомеля ў напрамку Жлобіна. Пасля адыходу стракапытаўцаў з Гомеля на Рэчыцу атрад І.А.Адамовіча з раёна ст.Уза перакінуты ў Калінкавічы да раз'езда Галявіцы, перакрыў адыход стракапытаўцаў далей на Захад. У баі пад Галявіцамі мяцежнікі былі разгромлены, многія здаліся ў палон. У гэтых баях удзельнічалі добраахвотнікі з Буда-Кашалёва, а таксама мабілізаваныя па парт- і профмабілізацыях у атрад І.А.Адамовіча.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 1260. Воп. 2. Спр. 67. Л. 66.

23 сакавіка 1919 г.

Направленный на Калинковичский участок фронта с белополяками 68-й полк Тульской бригады под влиянием контрреволюционной агитации восстал и возвратился в Гомель. Шедший в это время на фронт 67-й полк Тульской бригады встретил восставший 68-й полк и присоединился к нему. Попытки коммунистов удержать войска от возвращения в Гомель не дали результатов. Комиссар 67-го полка Сундуков и еще несколько коммунистов были убиты. Предпринимаются меры для недопущения следования мятежников на Брянск и Тулу.

24 сакавіка 1919 г.

На ст.Гомель Полесской ж.д. из Калинковичей прибыли 11 эшелонов войск, выступивших под воздействием контрреволюционной агитации против Советской власти. Мятеж возглавил бывший царский офицер эсер Стрекопытов, действовавший под руководством правого эсера Бориса Савенкова — агента англо-франко-американских империалистов.

27—28 сакавіка 1919 г.

На ст.Уза стрекопытовцам нанесен удар курсантами из Могилева, партийными добровольческими отрядами из Бобруйска и Могилева, и мятежникам пришлось отступить к Гомелю.

Контрреволюционные войска арестовали находившийся у артиллерийского склада караул. Мятежники захватили телеграф, телефонную станцию, здание ЧК, тюрьмы. Из тюрьмы выпущены уголовные преступники, которых вооружили стрекопытовские мятежники.

АБ СТВАРЭННІ ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ

20 красавіка 1919 г.

Объединенное заседание Гомельского губкома РКП(б) совместно с представителями Могилевского губисполкома. Принято решение о конструировании Гомельской губернии из следующих уездов: Стародубский, Новозыбковский, Суражский, Мглинский, Почепский, Речицкий, Могилевский, Быховский, Рогачевский, Чаусский, Чериковский, Климовичский, Гомельский, Оршанский, Горецкий. Создан Гомельский губисполком и утверждены заведующие отделами.

Расійскі дзяржаўны архіў сацыяльна-палітычнай гісторыі. Ф. 17. Воп. 3. Спр. 67. Л. 43, 50, 201, 205—206.

З УКАЗА ПОЛЬСКІХ АКУПАЦЫЙНЫХ УЛАД

1 верасня 1919 г.

1.Все распоряжения и декреты большевистских властей, касающихся частной собственности, сим упраздняются. Право собственности вполне восстанавливается...

3. Всякая частная собственность, как захваченная, так и находящаяся сейчас не у законных владельцев, должна быть немедленно возвращена.

4. Владельцы имений и их юридические заместители обязаны до 10 сентября принять во владение имения...

[Указам прадпісвалася сялянам заплаціць памешчыкам за разбурэнні ў іх маёнтках, за ссечаны памешчыцкі лес, унесці арэндную плату].

Белоруссия в борьбе против польских захватчиков в 1919—1920 гг. ОГИЗ, 1940. С.157.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

На той далёкай, на грамадзянскай...

Мікалай Гардзеевіч Карнееў нарадзіўся 21 мая 1892 г. у в. Міхалёўка. У 1904 г. закончыў 4-класнае народнае вучылішча, але прадоўжыць далей адукацыю не было магчымасці. Мікалаю давялося пайсці зарабляць сабе на хлеб. У 1905 г. ён прыняў удзел у рэвалюцыйным выступленні сялян Міхалёўкі, якія патрабавалі павышэння заработнай платы. У 1908 г. Карнееў працаваў у маёнтку барона Нелькіна, атрымліваў па 25 капеек за 17-гадзінны працоўны дзень.

У 1910 г. ён едзе ў Кіеў, працуе на цагельным заводзе. Моцнае ўражанне на яго, як і на іншых рабочых завода, зрабіла забойства анархістам Багровым прэм'ер-міністра П.А.Сталыпіна ў Кіеўскім оперным тэатры ў верасні 1911 г.

З 1912 г. Мікалай працаваў на здабычы жалезнай руды каля Крывога Рога, адкуль і быў прызваны восенню 1913 г. у царскую армію. Служыў у артылерыі. У пачатку першай сусветнай вайны яго часць з Разані адразу ж была адпраўлена на фронт. На тэрыторыі Польшчы ў час баёў каля Мазурскіх азёр артылерыйская брыгада была разбіта і вымушана адысці. У 1915 г. Мікалай Карнееў у складзе новай брыгады трапляе на Румынскі фронт, дзе служыць наводчыкам. Потым атрымаў павышэнне ў феерверкеры (званне малодшага каманднага саставу ў артылерыі) і стаў камандзірам узвода.

У лютым 1917 г. у часці, дзе служыў Карнееў, найбольшую актыўнасць, паводле яго сведчання, праяўлялі прадстаўнікі партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў.

Пасля кастрычніка 1917 г. у ліку іншых Карнееў пакінуў фронт і адправіўся дадому. У гэты перыяд Буда-Кашалёўшчына была акупіравана нямецкімі войскамі. Кайзераўскія часці бязлітасна рабавалі насельніцтва. Пасля заняцця в. Міхалёўка нямецкім атрадам колькасцю каля 30 чалавек, адразу было арыштавана 5 сялян, а староста вёскі атрымаў загад даставіць немцам 200 яек, 2 кабаноў і адну карову. Пад свой штаб акупанты занялі будынак вясковай школы. На наступны дзень у вёску вярнуў-

ся барон Нелькін, былы ўладальнік маёнтка, які ўцёк ад рэвалюцыі. Ён патрабаваў ад сялян вярнуць усё, што яны падзялілі паміж сабой пасля канфіскацыі яго маёмасці. Усякія пратэсты жорстка падаўляліся. А Буда-Кашалёва, жыхары якога не захацелі адбываць павіннасці на карысць немцаў, было разбурана артылерыйскім агнём.

Яшчэ напярэдадні прыходу кайзераўскіх войскаў старыя франтавікі ў Міхалёўцы вырашылі арганізаваць супраціўленне акупантам. Па ініцыятыве былога унтэр-афіцэра Маліноўскага, поўнага Георгіеўскага кавалера, удзельніка руска-японскай і першай сусветнай войнаў, з Гомеля ў Міхалёўку былі дастаўлены 2 кулямёты «максім» і 40 вінтовак з боепрыпасамі. У канцы студзеня 1918 г. у в. Шапатовічы, якая знаходзілася за 12 км ад Міхалёўкі, быў сфарміраваны вялікі партызанскі атрад. Мікалай Карнееў па загадзе Маліноўскага адправіўся ў Шапатовічы для арганізацыі сувязі з ім. У выніку непаразумення Карнееў ледзь не быў расстраляны ў Шапатовіцкім атрадзе. Калі сітуацыю ўдалося высветліць, было дасягнута пагадненне пра супрацоўніцтва. Шапатовіцкі атрад атрымаў з Міхалёўкі кулямёты, вінтоўкі і патроны.

У лютым 1918 г. М.Г.Карнееў быў прызваны ў чырвонагвардзейскую артылерыйскую батарэю наводчыкам. У баі з немцамі ў в.Гута ён паказаў сябе вопытным артылерыстам. На агульным сходзе Карнеева тут жа на пазіцыі выбралі камандзірам батарэі. У баі каля в. Робчык Мікалай Карнееў разам з тэлефаністам употай наблізіўся да нямецкай батарэі, дакладна скарэкціраваў агонь сваіх гармат, у выніку варожая батарэя была поўнасцю выведзена з бою.

Пасля заключэння ў сакавіку 1918 г. Брэсцкага міру батарэя была выведзена на адпачынак. Раскіданыя партызанскія атрады былі перафарміраваны ў часці рэгулярнай Чырвонай арміі. Батарэю Карнеева 15-й Інзенскай дывізіі перакінулі пад Сызрань, дзе пачаўся мяцеж чэхаславацкага корпуса. Наперадзе баі з мяцежнікамі пад Самарай і Бугурусланам, дзе Мікалая, які не меў ваеннай адукацыі, замяніў ваенспец, былы афіцэр Дабрыскін. Аднойчы ноччу мяцежнікі раптоўна ўварваліся ў размяшчэнне батарэі. Але налёт непрыяцеля, на шчасце, удалося адбіць сумеснымі з пяхотай намаганнямі.

У сакавіку 1919 г. батарэя ўдзельнічала ў баях на Паўднёвым фронце на р.Данец супраць дзянікінцаў, якія рваліся да Масквы. Потым былі баі пад Растовам, Азовам, станцыяй Славянскай, Новарасійскам. А потым шпіталь, куды Карнееў трапіў з цяжкім паўторным тыфам. Пасля выпіскі Мікалай прыехаў на папраўку ў родную Міхалёўку.

Многае змянілася тут з тых часоў, як ён пайшоў на фронт. Назаўсёды прагналі барона Нелькіна і, здавалася, можна было б жыць і працаваць. Але новая ўлада вельмі хутка забылася пра свае абяцанні. Сацыялізацыя зямлі, якая была абвешчана Дэкрэтам аб зямлі і давала шырокія правы сялянскаму самакіраванню, пасля разрыву бальшавікоў з фактычнымі аўтарамі Дэкрэта — левымі эсэрамі, была заменена нацыяналізацыяй. Дзяржава «дыктатуры пралетарыяту» абклала працоўных вёскі непасільнай харчразвёрсткай. Сяляне спадзяваліся, што пасля разгрому контррэвалюцыі камуністычная партыя зменіць сваю палітыку ў адносінах да іх. Так і адбылося пад націскам сялянскіх паўстанняў у гады НЭПа.

Верыў у лепшую будучыню і Мікалай Карнееў. У 1921 г. ён зноў у Чырвонай арміі. На бранепоездзе «Перамога ці смерць» удзельнічае ў баявых аперацыях на Паўночным Каўказе. У 1922 г. пасля заканчэння грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі яму, як і іншым дэмабілізаваным чырвонаармейцам, было прапанавана застацца служыць у войсках АДПУ у Грозным ці Уладзікаўказе. Але Мікалай Гардзеевіч адмовіўся і паехаў на радзіму, у Міхалёўку, да мірнай сялянскай працы. Потым ён пераехаў у Гомель, дзе на працягу 38 гадоў працаваў электраманцёрам да свайго выхаду на пенсію.

Ю.Э.Глушакоў.

Напружаная восень 1919 года

Осенью 1919 г. деникинские войска, заняв Чернигов, находились в одном переходе от Гомеля. В волости прошли очередные партийная, профсоюзная и комсомольская мобилизации в Красную армию. Усиленными темпами шли работы по созда-

нию Гомельского укрепрайона. Его оборонительные сооружения строило все трудоспособное население губернии. Буда-кошелевцы также участвовали в работах. За один месяц была возведена оборонительная линия с окопами, блиндажами и проволочными заграждениями в 50 верст длиной. В октябре 1919 г. созданы волостные ревкомы, которые сосредоточили в своих руках всю полноту власти на местах. Во многих деревнях возобновили работу комитеты бедноты. Прошли митинги и собрания, на которых трудящиеся единодушно высказывали готовность всеми силами отстаивать Советскую власть. Так, в принятой на общем собрании д. Кошелев 5 октября 1919 г. резолюции подчеркивалось: «...В момент, когда все завоевания рабочих и крестьян находятся в опасности, все трудовое крестьянство должно сплотиться вокруг Красного Знамени Советской власти и Коммунистической партии и, изгоняя из своих рядов дезертиров, пойти на окончательный разгром буржуазно-помещичьей стаи» (Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 201. Воп. 3. Спр. 132. Л. 49).

Многие жители Буда-Кошелевщины вступили в формирующиеся 1, 2 и 3-й полки Гомельской отдельной крепостной бригады и в конце 1919 г. воевали против деникинцев на Украине, под Лоевом, против поляков — под Мозырем, Озаричами и Калинковичами в составе 47-й (позже переформированной в 57-ю) стрелковой дивизии.

Возвратившиеся с флотов моряки вступали на корабли Днепровской военной флотилии, действовавшей на Днепре, Припяти, Соже, Березине против петлюровцев, деникинцев, поляков и банд. В их числе К.Д.Горбачев (м. Уваровичи), О.Ф.Долиндовский (д. Кошелев), Д.П.Лисовский (д. Кривск), Д.И.Лукашов, Е.М.Евтушков (д. Кленовица), С.И.Быков (д. Гавли), Г.П.Мещанинов (д. Семеновка), М.М.Титоренко (д. Старая Буда), М.Д.Томашев (д. Ховхла), А.Ф.Трибулистов, П.А.Трибулистов, С.П.Трибулистов (д. Уза), Н.И.Чубанов (х. Зеленовка) и другие.

І.Я.Краўцоў.

Дакументы сведчаць

З ПРАТАКОЛА АГУЛЬНАГА СХОДУ ГРАМАДЗЯН ВЁСКІ КРЫЎСК ЧАБАТОВІЦКАЙ ВОЛАСЦІ

30 снежня 1919 г.

Повестка дня:

1. Перевыборы сельского исполкома.
2. Отправка добровольцев.
3. Текущие дела.

Заслушав доклад представителя от упродкома и члена РКП тов. Коношенко о том, что сельский исполком добровольно уходит в ряды Красной Армии вместе со всей молодежью деревни, подлежащей отбытию воинской повинности, общее собрание граждан д. Кривск избирает председателем тов. Семенова, секретарем тов. Ларионова и членом тов. Циркунова.

Отправка добровольцев, по единогласному постановлению, должна состояться обязательно 2 января 1920 г.

В вопросе «Текущие дела» обсуждалось много вопросов, касающихся отдельных личностей, урегулирование которых передано на усмотрение нового сельского Совета. Собрание с пением «Интернационала» и революционных песен заканчивается.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1649. Воп. 1. Спр. 2. Л. 7.

ПАД ПАГРОЗАЙ АКУПАЦЫІ

5 марта 1920 г. белополяки захватили Мозырь, Калинковичи, Шатилки и подошли к Речице, Жлобину и Буда-Кошелеву. Дальнейшее их продвижение за Днепр было остановлено советскими войсками и моряками Днепровской военной флотилии. Однако в мае 1920 г. белопольские войска предприняли новое наступление на Гомельщине, захватив Речицу, Лоев, Горваль, форсировав Днепр, и продвинулись к Гомелю. Вся территория Буда-Кошелевского края стала фронтовой, заполненной войсками Красной Армии, их тылами и штабами, скла-

дами и госпиталями, мастерскими для ремонта вооружения и обозов, даже бронепоездов. Гомельщина была объявлена на военном положении. Власть от исполкомов Советов перешла в руки Революционных комитетов. Успешно прошел призыв в армию молодежи 1901 г. рождения. С начала мая 1920 г. в крае прошла запись добровольцев и поставка в войска лошадей.

В мае 1920 г. на Буда-Кошелевщине развернулись боевые действия.

16 мая 1920 г. N 01196 оп/сек, Витебск. Из доклада штаба Западного фронта:

...10-я дивизия. Противник 14 мая занял д.Антоновку, Ящицы, Забродье, Василевичи и Ляды (в 20 — 30 км от Жлобина).

...16 мая противник выбит из д.Антоновка и отброшен на правый берег к д.Шатилки.

...57-я дивизия. Противник при содействии бронепоезда продолжает наступление вдоль ж.д. Речица — Гомель и занял линию д.Борхов и Копань (12 верст северо-западнее и 7 верст юго-восточнее г. Речицы)...

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф. 104. Воп. 4. Спр. 746. Л. 11.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ШТАБА 57-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

20 мая 1920 г.

...Во время демонстрации переправы через Днепр 1-й роты батальона ВОХР из района Ховхло — Бервеновка у д.Унорица 20 мая противник зажигательными снарядами обстрелял д. Черное и сжег ее. 2-я рота батальона после боя в 4 верс. северо-восточнее сенозавода, обстреливаемая сильным ружейно-пулеметным огнем, отошла и заняла линию Черное — Борхов...

27 мая 1920 г.

На участке 169-й бригады 57-й сд. К 10 час.части бригады занимают: 505-й полк на фронте ГЛУШЕЦ — ЧЕРНОЕ — БЕРВЕНОВКА — ВЕЛИКИЙ РОГ (штаб полка) — высоты в 5 верс. северо-зап. д.Копань...

6 чэрвеня 1920 г.

№ 206/оп 506-й и 507-й полки 169-й бригады, переданные в распоряжение комбрига 29-й и сосредоточены на правом берегу Днепра в районе ЖИРХОВКА — ГОРВАЛЬ (направление д. ЕЛЕНЕЦ — СМЫЧОК). 505-й полк занимает фронт по левому берегу Днепра от д.СМЫЧОК до высот, что в 5 верс. северо-западнее д.КОПАНЬ (оба пункта включительно для 505-го полка). 169-я саперная рота передвинута в д.ХОВХЛО. Части 170-й бригады приступили к смене 72-й бригады.

Начштаюжмозгруппы КЛИМОВСКИХ, военкомштаб Я.ГЕРЦБЕРГ.

9 чэрвеня 1920 г.

Боевой участок 169-й бригады 57-й сд. Около 7 час. силою до роты пехоты противник, переправившись на левый берег Днепра у д.ГЛУШЕЦ, произвел налет на расположение 506-го полка и артвзвода, что в 2-х верс. западнее д.ХОВХЛО, есть потери... В 506-м полку убито 5, ранено 3, без вести пропало 55 человек; в артвзводе убито 2, без вести пропало 9 человек (комсостав — 1, рядовых — 8), утеряно 10 винтовок; в 169-й саперной роте убито 2, ранен 1, без вести пропало 2 человека.

12 чэрвеня 1920 г.

№ 283/оп. Во исполнение директивы коммозгруппы № 283/г в 15 час. 20 мин. 1-й батальон 506-го полка, переправившись на правый берег Днепра в районе дд.УНОРИЦА — ЧЕРНОЕ, сбил заставы противника и теснил их при поддержке переправившегося вслед 2-го батальона того же полка к д.ОЗЕРЩИНА, что в 5 верс. севернее г.РЕЧИЦЫ. 505-й и 507-й полки... приступили к переправе в том же районе. 508-й полк в резерве в д.ВЕЛИКИЙ РОГ...

...Климовских, ...Я.Герцберг.

13 чэрвеня 1920 г.

№ 289/оп. К 12 час. 169-я бригада. Около 20 час. 12 июня под сильным огнем противника все полки бригады закончили переправу и продолжали теснить противника к ОЗЕРЩИНЕ. Около 21 час. противник стал накапливаться у д.УНОРИЦА, одновременно перей-

дя в контрнаступление со стороны ОЗЕРЩИНЫ, и отбросил части бригады к реке. Полки понесли огромные потери, под сильным огнем переправились в 23.00 на левый берег Днепра и для приведения в порядок оттянуты в д.ХОВХЛО...

...Точные потери за 12 июня. В 169-й бригаде убитых и раненых: убито комсостава — 5 и рядовых — 23, ранено соответственно — 12 и 95, утонуло рядовых — 25, осталось не подобранных рядовых — 31, без вести пропавших: комсостава — 11, рядовых — 58 человек; потеряно 9 пулеметов и 513 винтовок.

Расійскі дзяржаўны ваенны архіў. Ф.р. — 139. Воп. 1. Спр. 339. Л. 74, 115, 184, 186 — 187, 229, 231, 233.

Падрыхтаваў І.Я.Краўцоў.

АБ ДАПАМОЗЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

30 кастрычніка 1920 г.

Крестьяне села Недайка Рогачевского уезда собрали в помощь Красной Армии 5020 рублей деньгами, 41 полотенце, 16 брюк, 7 пар белья и др.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1056. Воп. 1. Спр. 2. Л. 374.

Удзельнікі грамадзянскай вайны і барацьбы з ваеннай інтэрвенцыяй 1918—1922 гг.

БАБКОЎ Максім Піліпавіч, н. у 1891, у Чырвонай арміі ў 1917 — 1922 гг. Скончыў 4 класы.Старшыня калгаса імя Сталіна № 2.

БОЗІКАЎ Фёдар Міхайлавіч, н. у 1897, у Чырвонай арміі ў 1919 — 1923.

ГАЛУШКІН Парфен, н. у 1899, у Чырвонай арміі ў 1917 — 1922.

ДЖУМАЎ Мірон Цімохавіч, н. у 1888, у Чырвонай арміі ў 1917 — 1923.

ЖЫЦАВЕЦ Іван Паўлавіч, н. у 1895, у Чырвонай арміі ў 1918 — 1921.

КАВАЛЁЎ Трафім Андрэевіч, н. у 1898, у Чырвонай арміі ў 1917 — 1922.

КАЗЛОЎ Пахом Фёдаравіч, н. у 1900, у Чырвонай арміі ў 1919 — 1923.

КАРОТЧЫКАЎ Ігнат Піліпавіч, н. у 1898, у Чырвонай арміі ў 1919 — 1923. Скончыў 4 класы. Выбіраўся членам сельсавета на працягу 6 гадоў. У 1935 быў старшынёй калгаса «Запавет Леніна».

ПАРФЕНЕНКА Трафім Восіпавіч, н. у 1899, у Чырвонай арміі ў 1919 — 1923.

ФЯДОТАЎ Нічыпар Міхайлавіч, н. у 1889, у Чырвонай арміі ў 1918 — 1922.

ЧУМАКОЎ Іван Гапонавіч, н. у 1896, у Чырвонай арміі ў 1918 — 1921.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 605. Л. 37 — 44.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

АСІПЦАЎ Улас Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1897 г. у в. Негаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Прапаў без вестак у 1921 г.

БАРАШКОЎ Кузьма Іванавіч. Нарадзіўся ў 1898 г. у в.Майсееўка Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Служыў у Тарашчанскім і Багунскім палках. Удзельнічаў у баях супраць польскіх (пад Жлобінам, Рагачовам) і нямецкіх захопнікаў, часцей Украінскай Цэнтральнай Рады, пятлюраўцаў, дзянікінцаў і інш. праціўнікаў савецкай улады. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай арміі вярнуўся на радзіму. Працаваў леснікам. У час калектывізацыі першы ўступіў у калгас «Новае жыццё», арганізаваны ў в. Майсееўка, быў яго старшынёй. Пазней выбраны старшынёй калгаса «Колас» у в. Мікалаеўка, у 1937 г. — старшынёй Забалоцкага сельсавета. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце, артылерыст-наводчык. Удзельнік штурму Берліна. Неаднаразова быў паранены і кантужаны. Пасля працаваў ляснічым. Памёр у 1957 г.

БАРАШКОЎ Піліп Іванавіч. Нарадзіўся ў 1895 г. у в.Майсееўка Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў Царкоўскую царкоўна-прыходскую школу, адзін курс Рысчкаўскага духоўнага вучылішча. Працаваў у Кіеве на цагельным заводзе. За ўдзел у рэвалюцыйных падзеях трапіў пад нагляд паліцыі. У пачатку 1914 г. вярнуў-

ся на радзіму. Паводле прыгавору сельскай абшчыны накіраваны ездавым у абоз на фронт у Галіцыю, дзе праслужыў да лютага 1917 г. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. вяртаецца на радзіму. Удзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях на Буда-Кашалёўшчыне, быў членам Меркулавіцкага валрэўкома. У лютым 1918 г. у баі супраць 1-га корпуса Ю.Р. Доўбар-Мусніцкага паранены, з групай чырвонагвардзейцаў трапіў у палон і быў расстраляны ў в. Туркі Бабруйскага раёна.

БЫКАЎ Стафан Іванавіч. Нарадзіўся ў в. Гаўлі Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік грамадзянскай вайны. У студзені 1919 г. добраахвотна ўступіў у 149-ы полк 17-й стралковай дывізіі. Ваяваў пад Пінскам, Вільняй, абараняў Маладзечна, Мінск, Лепель і Шацілкі, удзельнічаў у Варшаўскай аперацыі 1920 г.

ВАДЗЮЦІН Дзмітрый Леанідавіч. Нарадзіўся 5.10.1899 г. у г.Чачэрск Гомельскай вобласці ў сям'і малазямельнага селяніна. У 1912 г. скончыў 4 класы Чачэрскай народнай школы, у 1916 г. — вышэйшае пачатковае вучылішча. Працаваў у Чачэрскай валаснай канторы вучнем тэлеграфіста, з кастрычніка 1916 г. — тэлеграфістам Рагачоўскай павятовай канторы сувязі. 12.10.1917 г. у час дзяжурства на тэлеграфе прыняў з Петраграда тэлеграму на імя Рагачоўскай думы і ваеннага каменданта горада аб адрачэнні цара Мікалая II ад прастолу. У снежні 1917 г. на з'ездзе паштовых служачых павета Дз.Л.Вадзюцін выбраны сакратаром прафсаюза работнікаў сувязі. У час нямецкай акупацыі працаваў у Чачэрскай канторы сувязі ў неакупіраванай зоне, з кастрычніка 1918 г. да чэрвеня 1919 г. — у Рагачоўскай павятовай канторы сувязі. У 1920—1922 гг. у Чырвонай арміі, ваяваў на Заходнім і Паўднёвым франтах. Удзельнічаў у баях супраць польскіх войскаў, урангелеўцаў, махноўцаў. Пасля дэмабілізацыі працаваў у Чачэрскай, у 1932—1963 гг. — у Буда-Кашалёўскай канторах сувязі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Памёр 6.7.1979 г.

ВОЛКАЎ Сафрон Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1900 г. у в. Круты Бераг Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік грамадзянскай вайны. Загінуў пры штурме крэпасці Кранштат у 1921 г.

П.І.Барашкоў.

Дз.Л.Вадзюцін.

ГАРБАЧОЎ Кірыла Дзям'янавіч. Нарадзіўся 26.7.1892 г. у г.п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў царкоўна-прыходскую школу. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Удзельнічаў у вызваленні Буда-Кашалёўшчыны ад нямецкіх акупантаў. У 1919 — 1920 гг. марак Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Служыў на параходзе «Ваенна-санітарны № 2», удзельнічаў у баях супраць пятлюраўцаў і дзянікінцаў. У зімоўку 1919 — 1920 гг. у складзе каманды судна разам з атрадам маракоў флатыліі абараняў Гомель ад польскіх войскаў. Пасля дэмабілізацыі на гаспадарчай рабоце ў 2-м Кіеўскім артылерыйскім вучылішчы імя С.С. Каменева. Узнагароджаны медалямі. Памёр у 1969 г.

ДАВЫДАЎ Цярэнцій Дзянісавіч. Нарадзіўся ў 1887 г. у г. Буда-Кашалёва. Скончыў Кранштацкую школу электрыкаўміннага атрада Балтыйскага флоту. Плаваў на эскадраных мінаносцах. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г., лядовага паходу караблёў Балтыйскага флоту з Гельсінгфорса (г. Хельсінкі, Фінляндыя) у Кранштат вясной 1918 г., абароны Петраграда ад войскаў Юдзеніча ў 1919 г. у складзе экспедыцыйнага атрада маракоў.

ДАЛІНДОЎСКІ Ота Фаміч. Нарадзіўся ў 1894 г. у в. Кашалёў Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. У складзе Кашалёўскага партызанскага атрада змагаўся супраць войскаў 1-га польскага корпуса генерала Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага і

нямецкіх акупантаў. Адзін з арганізатараў прафсаюзаў у Кашалёўскай воласці. У студзені 1918 г. удзельнічаў ва ўзброеным паўстанні рабочых завода «Арсенал» у Кіеве супраць Украінскай Цэнтральнай Рады. З 1919 г. у Гомелі. Член РКП(б) з верасня 1919 г. З кастрычніка 1919 г. шыфравальшчык палітаддзела асобнай Крапаснай брыгады Гомельскага ўмацаванага раёна, старшы шыфравальшчык штаба Дняпроўскай ваеннай флатыліі (ДВФ). У студзені 1920 г. дастаўляў у Гомель матэрыялы для рамонту і ўзбраення кананерскіх лодак 1-га дывізіёна ДВФ. У маі — чэрвені 1920 г. флагманскі сакратар штаба караблёў паўднёвай групы ДВФ, якая дзейнічала супраць польскіх войскаў у раёне Канеў — Ржышчаў, вызваляла Кіеў. У чэрвені 1920 г. выбраны членам Кіеўскага губкома КП(б) Украіны ад маракоў ДВФ.

ЕЎТУШКОЎ *Яфім Мацвеевіч.* Нарадзіўся ў 1901 г. у в.Кленавіца Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік грамадзянскай вайны. У кастрычніку 1918 г. добраахвотна ўступіў у 151-ы полк 17-й стралковай дывізіі. Ваяваў супраць немцаў і пятлюраўцаў пад Мазыром і на поўначы Украіны, пад Вільняй, Маладзечнам, абараняў у 1919 г. і вызваляў у 1920 г. Мінск, удзельнічаў у Варшаўскай аперацыі 1920 г.

КУПРЫЯШЧАНКА Мікіта Усцінавіч. Нарадзіўся ў 1901 г. Удзельнік партызанскага руху на Буда-Кашалёўшчыне ў гады грамадзянскай вайны. Прымаў удзел у польска-савецкай вайне 1919—1920 гг. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у штурме Кёнігсберга і Берліна. Быў тройчы паранены. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1953 г.

КУПРЫЯШЧАНКА Усцін Іванавіч. Нарадзіўся ў 1870 г. Георгіеўскі кавалер. Удзельнік 1-й сусветнай (1914—1918), польска-савецкай (1919—1920) войнаў. Двойчы быў цяжка паранены. Прымаў удзел у барацьбе з нямецкімі акупантамі на Буда-Кашалёўшчыне ў 1918 г. Памёр у 1953 г.

ЛІСОЎСКІ Дзмітрый Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1895 г. у в. Крыўск Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. У 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную армію. У складзе 150-га палка 17-й стралковай дывізіі ўдзельнічаў у вызваленні Беларускага Палесся ад нямецкіх акупантаў, у баях з пятлюраўцамі і палякамі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

З узнагароднага ліста на Дз.П.Лісоўскага:

«Разведчик 150 стрелкового полка. Член РКП(б). Разведчик 6-й роты. Отличился во всех боях полка и разведках. Всегда храбро действовал в передовых линиях, увлекая своим примером бойцов. Так, 9 января 1920 года в бою у деревни Зеленый Остров Лепельского уезда он первым бросился в атаке кавалерийского эскадрона на противника. Легионеры были рассеяны, им были нанесены большие потери. С таким же геройством он действовал и 8 апреля 1920 года при наступлении на д.Боровики [цяпер у Светлагорскім раёне Гомельскай вобласці].

Командир 150 полка, комиссар полка».

ЛУКАШОЎ Дзмітрый Іванавіч. Нарадзіўся ў 1900 г. у в.Кленавіца Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік грамадзянскай вайны. У лістападзе 1919 г. добраахвотна ўступіў у 151-ы полк 17-й стралковай дывізіі. Ваяваў супраць палякаў пад Бабруйскам, вызваляў Мінск, удзельнічаў у Варшаўскай аперацыі 1920 г.

МЕШЧАНІНАЎ Рыгор Пятровіч. Нарадзіўся ў 1898 г. у в.Сямёнаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Тэлефаніст Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Удзельнік баёў за вызваленне ад палякаў Нароўлі, Барбарова, Мазыра.

НАВУМЕНКА *Лаўрэнцій Фёдаравіч.* Нарадзіўся ў 1895 г. у в.Ніва Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. на Балтыйскім флоце. Пасля дэмабілізацыі ў 1918 г. вярнуўся на радзіму. У складзе мясцовага партызанскага атрада ўдзельнічаў у барацьбе супраць нямецкіх акупантаў, аднаўляў савецкую ўладу. З 1919 г. рулявы бранякатэра № 1 міннага дывізіёна Дняпроўскай ваеннай флатыліі, ваяваў супраць дзянікінцаў і палякаў. Памёр ад тыфу 8.4.1920 г. Пахаваны ў Кіеве.

НОВІКАЎ Кірыла Раманавіч. Нарадзіўся ў 1894 г. у в. Рагінь Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. у Петраградзе. Восенню 1917 г. вы-

браны членам Баравіцкага павятовага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў Наўгародскай губерні. Дэлегат II Усерасійскага з'езду Саветаў. Петраградскім ВРК накіраваны ў Магілёўскую губерню. Удзельнічаў ва ўстанаўленні савецкай улады на Буда-Кашалёўшчыне. Арганізатар Рагінскага партызанскага атрада, які паспяхова змагаўся супраць 1-га польскага корпуса генерала Ю.Р.Доўбар-Мусніцкага і нямецкіх акупантаў.

СОЧНЕЎ Цімафей Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1900 г. у в. Гусявіца Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў 2 класы сельскай школы. У 1918 г. добраахвотна паступіў у Машынную школу Балтыйскага флоту. Служыў машыністам самастойнага кіравання. У складзе атрада кранштацкіх маракоў удзельнічаў у задушэнні мяцяжу чэхаславацкага корпуса, баях з калчакаўцамі. Пасля вяртання з фронту ў Кранштат быў прызначаны інструктарам па навучанні Машыннай школы. Удзельнік задушэння антыбальшавіцкага Кранштацкага паўстання 1921 г.

СЯРГЕЙЧЫКАВА Ганна Пятроўна. Нарадзілася ў в. Уза Буда-Кашалёўскага раёна. У 1919—1920 гг. працавала па вольнаму найму ў ваенных партах Гомеля і Кіева. На дапаможных караблях Дняпроўскай ваеннай флатыліі дастаўляла ў раёны баёў боепрыпасы, амуніцыю і прадукты харчавання.

ТАМАШОЎ Максім Данілавіч. Нарадзіўся 8.4.1895 г. у в.Хоўхла Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Скончыў Кранштацкую школу камендораў, служыў на Балтыйскім флоце. З кастрычніка 1919 г. у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі, камендор вартавога карабля «Беркут». Ваяваў супраць палякаў на Прыпяці і Бярэзіне, у Якімаўскай Слабадзе знішчыў польскі самалёт. У маі — чэрвені 1920 г. удзельнічаў у баях на Дняпры ад Ніжняй Албы да Жлобіна, у жніўні — лістападзе — на Прыпяці. Пасля гібелі камандзіра «Беркута» І.Е.Алейнікава 10.10.1920 г. у Петрыкаве прыняў часова камандаванне караблём.

ТРЫБУЛІСТАЎ Андрэй Піліпавіч. Нарадзіўся ў 1896 г. у в. Уза Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Чырвонаармеец 36-га ваенна-палявога мостабудаўнічага атрада. Наладжваў пераправы цераз Дняпро і Бярэзіну, змагаўся супраць палякаў у складзе дэсантнага атрада Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Вызваляў Мазыр, Барбароў, Скрыгалаў, удзельнічаў у Варшаўскай аперацыі 1920 г.

ТРЫБУЛІСТАЎ Міхаіл Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1897 г. у в. Уза Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Матрос блокшыва «Аргунь» у Кранштаце. Удзельнічаў у абароне Петраграда ў складзе экспедыцыйнага атрада маракоў.

ТРЫБУЛІСТАЎ Павел Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1901 г. у в.Уза Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік грамадзянскай вайны. Чырвонаармеец 36-га ваенна-палявога будаўнічага атрада, летам 1920 г. у складзе дэсантнага атрада Дняпроўскай ваеннай флатыліі дайшоў да Уладавы (Польшча).

ТРЫБУЛІСТАЎ Сямён Пятровіч. Нарадзіўся ў 1897 г. у в.Уза Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г., грамадзянскай вайны. Чырвонаармеец 36-га ваенна-палявога будаўнічага атрада, з чэрвеня 1920 г. у складзе дэсантнага атрада Дняпроўскай ваеннай флатыліі. З баямі дайшоў да Буга і Уладавы (Польшча).

ЦІТАРЭНКА Мацвей Міхайлавіч. Нарадзіўся ў 1901 г. у в.Старая Буда Буда-Кашалёўскага раёна. У грамадзянскую вайну качагар дапаможнага судна «Меліта» Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Ваяваў супраць дзянікінцаў, палякаў, банд Струка.

ЧУБАНАЎ Мікалай Іванавіч. Нарадзіўся 6.12.1891 г. на х. Зеляноўка Буда-Кашалёўскага раёна. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г. Марак Балтыйскага флоту. З кастрычніка 1919 г. служыў у Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Удзельнік абароны Гомеля ў 1919 г. ад дзянікінцаў, у 1920 г. — ад палякаў.

ШПАК Рыгор Канстанцінавіч. Нарадзіўся 24.1.1897 г. у в.Гарадзец Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў Радзееўскую сельскую школу, Рудзянецкае двухкласнае земскае вучылішча, Гомельскую губсаўпартшколу (1928), курсы пры ЦК ВКП(б) у Маскве (1937), Чыцінскую абласную двухгадовую партшколу (1952). Працаваў



Р.К.Шпак.

па найму ў памешчыка. З 1916 г. у царскай арміі. У час 1-й сусветнай вайны на Паўднёва-Заходнім фронце, кулямётчык. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. У грамадзянскую вайну на Заходнім, Паўднёва-Заходнім і Паўночна-Заходнім франтах. Быў паранены. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі працаваў старшынёй праўлення Уваравіцкай крэдытнай кааперацыі, сакратаром Уваравіцкага, Буда-Кашалёўскага, Капыльскага, Шклоўскага райкомаў КП(б)Б, Рухлаўскага (з 1938 г. Скавараддзінскага) райкома партыі Амурскай вобласці, загадчыкам аддзела, сакратаром Чыцінскага абкома ВКП(б). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў на Крымскім, Паўночна-Каўказкім франтах. Быў цяжка паранены ў баях за г. Керч (1942). Пасля выздараўлення працаваў начальнікам курсаў рэзерву старшага камсаставу Галоўупра, пазней — загадчыкам аддзелаў Чыцінскага абкома ВКП(б). З 1958 г. на пенсіі. Вярнуўся на радзіму, працаваў старшынёй Уваравіцкага райспажыўсаюза. Выбіраўся кандыдатам і членам ЦК КП(б)Б, дэпутатам абласных і раённых Саветаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Ганаровы грамадзянін г.п. Уваравічы. Памёр у 1975 г.

Родина помнит....

«За образцовое выполнение заданий командования наградить начальника полковой команды пеших разведчиков 153 стрелкового полка 17 стрелковой дивизии ШПАК Григория Константиновича орденом боевого Красного Знамени. Реввоенсовет 16 армии».

Этот приказ, датированный 1920 годом, Григорий Константинович услышал только спустя 42 года.

...Трудно было молодой Советской Республике в первые годы существования. Многочисленные враги стремились задушить ее. Трудовой народ, взяв в свои руки оружие, защищал завоевания революции. Тогда ушел добровольцем в ряды Красной Армии и молодой коммунист Григорий Шпак. Его зачислили в 153-й стрелковый полк 17-й стрелковой дивизии. В жестоких боях с врагом мужал, закалялся характер бойца. Шпак был умелым разведчиком, а потом стал командиром разведгруппы. Однажды Григория Шпака вызвал командир батальона.

— Нужно любыми средствами пробраться в тыл белополяков и отрезать вражескому батальону, который занимает район местечка Березино, пути отхода на город Игумен, — приказал он.

— Будет выполнено, — уверенно ответил Шпак.

В глухую морозную полночь 75 разведчиков на лыжах в белых маскировочных халатах неслышно исчезли в темноте. К трем часам прибыли на указанное место. А через полчаса батальон начал атаку. Белополяки яростно сопротивлялись. Но шквальный огонь красноармейцев косил их ряды. Внезапным броском с тыла отряд Шпака внес в ряды белополяков панику. И это решило исход боя. Вскоре Григорий Шпак был переведен в другую часть. Все годы гражданской войны он на фронте, участвовал во многих боях, отличался отвагой и большим умением.

Шпак демобилизовался, так и не узнав о награде. Но Родина не забыла героя. Его разыскали, и недавно в торжественной обстановке Григорию Константиновичу, уже ветерану трех войн, был вручен орден Красного Знамени.

— Я очень горжусь тем, что удостоен такой высокой награды, — заявил, получив награду, Г.К.Шпак. — И заверяю Советское правительство и родную партию, что, если Родина покличет, несмотря на то, что уже, как говорят, «списан» по годам, пойду с оружием в руках защищать свою любимую Отчизну.

Н.Новиков, г.п.Уваровичи Гомельской области.

Советский воин. 1961. № 23.

ЯКАЎЦАЎ Карней Аляксеевіч. Нарадзіўся ў 1888 г. у г.п. Уваравічы. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг., Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г., 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў. У 1905—1914 гг. член Гомельскай арганізацыі РСДРП. З кастрычніка 1917 г. першы старшыня Уваравіцкага валаснога выканкома Саветаў рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. У 1918 г. камандзір чырвонагвардзейскага атрада, які змагаўся супраць карнілаўскіх, польскіх і нямецкіх войскаў. У 1919 г. у час барацьбы з дзянікінцамі на Гомельшчыне ўзначальваў Уваравіцкі рэўком. З 1921 г. інструктар атрада асобага назначэння. У 1926 г. скончыў Гомельскую губсаўпартшколу. Працаваў на Паўночным Каўказе, у 1930-я гады — у Наркамаце саўгасаў СССР.

ЯКАЎЦАЎ Мікалай Карнеевіч. Нарадзіўся ў 1910 г. у г.п. Уваравічы Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыў Ленінградскае артылерыйскае вучылішча (1933). У 1930-я гады працаваў на ўзвядзенні ўмацаванняў Кранштацкай крэпасці. З 1936 г. аружэйны тэхнік артылерыйскага склада Галоўнага ваеннага порта Кранштат, ваентэхнік 2-га рангу. Удзельнік савецка-фінляндскай (1939—1940) і Вялікай Айчыннай (1941—1945) войнаў.

Кашалёўскі валасны рэўком

25 жніўня 1919 года па Рагачоўскаму павету было аб'яўлена ваеннае становішча... 14 верасня 1919 года член ВЦВК Механошын і прадстаўнік губвыканкома Сурта стварылі Рагачоўскі павятовы ваенна-рэвалюцыйны камітэт, які ў сваю чаргу прыступіў да стварэння валасных рэўкомаў па ўсяму павету, у тым ліку і ў Кашалёўскай воласці.

Рэвалюцыйны камітэт быў арганізаваны 22 кастрычніка 1919 года на пасяджэнні Кашалёўскага валаснога выканкома. У склад валрэўкома ўвайшлі Д.І.Шульчанка, прадстаўнік ад 99-га стралковага батальёна, член ваеннай камуністычнай ячэйкі Жукаў і член былога валаснога выканкома П.М.Сысоеў. Старшынёй рэўкома быў назначаны Д.І.Шульчанка, а сакратаром — Г.С.Ткачоў...

Было вырашана хадайнічаць перад павятовым рэўкомам аб вызваленні жыхароў воласці ад выканання нарада фурманак у г. Рагачоў, таму што Кашалёўская воласць у тэрміновым парадку нарыхтоўвала і вывозіла дровы для чыгункі. Акрамя гэтага, прынялі рашэнне аб мерах па забеспячэнні ўсіх школ воласці палівам, аб арганізацыі хат-чытальняў і мабілізацыі пісьменных для навучання жыхароў грамаце. Была створана камісія, якая кантралявала размеркаванне матэрыяльнай дапамогі, выдачу пайкоў сем'ям бяднейшых чырвонаармейцаў.

Прымяняліся рашучыя меры па ахове панскіх маёнткаў і лясных багаццяў, якія сталі ўсенародным здабыткам.

Набліжалася лінія фронту... Валрэўком заклікаў вясковую моладзь і ўсіх астатніх грамадзян удзельнічаць у фарміраванні партызанскага атрада... Ваеннае становішча і рэўком захаваліся да поўнага разгрому белапольскіх акупантаў. Увесь гэты час павятовы і валасны рэўкомы асноўную сваю работу будавалі ў плане ўсебаковай дапамогі часцям 8-й дывізіі 16-й арміі Заходняга фронту, забеспячэння парадку ў тылах размяшчэння вайсковых часцей... Валасны рэўком, акрамя бягучых спраў, выконваў даручэнні чыста баявога прызначэння: даваў арміі падводы, рабочых, жывёлу, фураж, прадукты харчавання, вёў барацьбу з дэзерцірствам. Паказальна тое, што ў воласці не было ніводнага контррэвалюцыйнага выступлення, не было амаль ніводнага дэзерціра. Жыхары воласці добра памяталі нямецкіх акупантаў, якія спалілі поўнасцю вёску Кашалёў.

Пытанні сацыяльнай і эканамічнай перабудовы вёскі шырока, дэмакратычна абмяркоўваліся на з'ездах прадстаўнікоў населеных пунктаў воласці. Так, на пасяджэнні з'езда прадстаўнікоў беднаты, сераднякоў, кааперацый, ад сем'яў чырвонаармейцаў абмяркоўваўся даклад аб арганізацыі камун на былых памешчыцкіх землях...

Разам з іншымі мерапрыемствамі была праведзена развёрстка надзвычайнага грашовага рэвалюцыйнага падатку на класавай аснове. Не менш важнай работай быў улік ураджаю 1919 года і правядзенне землямерных работ па падрыхтоўцы да сацыялізацыі зямлі. На аснове Канстытуцыі арганізаваны сельсаветы.

У выніку прынятых мер поўнасцю сабраны надзвычайны рэвалюцыйны падатак,

сабраны абмундзіраванне для арміі, зброя, фураж, выкананы акопныя работы. Быў праведзены «Тыдзень фронту», у ліпені 1920 года — «Тыдзень хворага і параненага чырвонаармейца». Вялася барацьба з эпідэміяй, за чысціню, чыталіся лекцыі на медыцынскія тэмы, паўсюдна праводзілася вучоба непісьменнага дарослага насельніцтва. Сялянства воласці паспяхова справілася з веснавой пасяўной кампаніяй 1920 года, поўнасцю і ў тэрмін здало хлеб дзяржаве...

Пасля таго, як лінія фронту адсунулася на захад, некаторы час рэўком працягваў сваю дзейнасць, а ў канцы верасня 1920 года былі праведзены перавыбары валаснога выканкома.

М. Косараў.

Авангард. 1968. 9 ліп.

Працоўны фронт

Грамадзянская вайна і ваенная інтэрвенцыя 1918—1922 гг. прымусілі Савецкі ўрад ператварыць краіну ў ваенны лагер. Дзейнічалі законы аб працоўнай павіннасці, мілітарызацыі вытворчасці, фарміраванні працоўнай арміі. Правядзенне такіх непапулярных мер ускладалася на мясцовыя Саветы.

Асноўны цяжар павіннасцяў ваеннага часу ляжаў на сялянах. Сяляне выконвалі ўстаноўленыя Дэкрэтамі ад 26 ліпеня 1918 г. ваенна-конскую, гужавую і ад 18 жніўня 1918 г. працоўную павіннасці. На сваіх фурманках падвозілі розныя грузы, харчаванне і фураж для воінскіх часцей, да партоў і чыгуначных станцый, расчышчалі снежныя заносы, рамантавалі дарогі і масты. Такія работы павінны былі аплачвацца, але атрымліваць грошы за іх удавалася не заўсёды.

Падворная павіннасць клалася цяжкім прыгнётам на насельніцтва воласці і, вядома, абвастрала яго адносіны з мясцовымі ўладамі. Сяляне нярэдка адкрыта выказвалі сваю незадаволенасць.

Ужо ў студзені 1919 г. на тэрыторыі Кашалёўскай, Чабатовіцкай і інш. валасцей былі разгорнуты ваеннаабмундзіровачныя майстэрні. Працавалі мабілізаваныя саматужнікі — краўцы з мястэчак, дзяўчаты і жанчыны з бліжэйшых вёсак. Швейныя машынкі і аснастку майстры прыносілі свае. Пераадольваючы цяжкасці ў забеспячэнні сыравінай і фурнітурай, ва ўмовах блізкасці фронту шылі для Чырвонай арміі ватовыя целагрэйкі і шынялі, летняе абмундзіраванне, бялізну і пасцельныя рэчы, скураныя тужуркі, шапкі-вушанкі, фуражкі і папахі, кавалерыйскую вупраж і амуніцыю. Асабліва мілітарызаванай была праца на чыгуначных станцыях.

У лютым 1919 г. у воласці сфарміравалі тылавое апалчэнне. У яго ўвайшлі асобы, якія не падлягалі прызыву ў армію па сацыяльнаму паходжанню. Да канца 1919 г. у тылавым апалчэнні было больш за 500 чалавек: святары мясцовых цэркваў, служачыя памешчыцкіх маёнткаў, заводчыкі, лесапрамыслоўцы, чыноўнікі і інш.

У канцы 1920 г. Савет Народных Камісараў РСФСР прыняў Дэкрэт «Аб парадку ўсеагульнай працоўнай павіннасці». На аснове гэтага Дэкрэта валрэўком аб'явіў у воласці мабілізацыю швейнікаў, шаўцоў, рымараў, гарбароў, будаўнікоў і інш. Тых, хто ўхіляўся ад мабілізацыі, расцэньвалі як працоўных дэзерціраў. Да іх прымянялі законы ваеннага часу.

Аграрнае пытанне заставалася галоўным у дзейнасці валвыканкома. Ішло надзяленне зямлёй беззямельных і малазямельных сялян за кошт былых памешчыцкіх угоддзяў. На Буда-Кашалёўшчыне да рэвалюцыі амаль 31,7% ворных зямель належалі памешчыкам і манастырам. Каля паловы іх адышло дзяржаве, астатнія — сялянам. На базе найбольш развітых маёнткаў ствараліся саўгасы.

У сувязі з непасрэднай пагрозай польскай акупацыі з 9 сакавіка 1920 г. улада ў воласці перайшла ў рукі рэўкома. Пад ахову атрадаў асобага назначэння былі ўзяты масты і важныя ў стратэгічных адносінах дарогі, пераправы. Загадам валрэўкома ўсе грамадзяне польскай нацыянальнасці ва ўзросце ад 16 да 60 гадоў былі перарэгістраваны. Працавала камісія з надзвычайнымі паўнамоцтвамі па барацьбе з дэзерцірамі.

Вясной 1920 г. у вёсках мясцовыя Саветы прыступілі да пераразмеркавання зямель, што выклікала незадаволенасць за-

можных сялян. Барацьба выйшла за межы сёл і вёсак. Яна працягвалася на пасяджэннях валвыканкома, на павятовым з'ездзе ў пачатку верасня 1920 г. Погляды дэлегатаў на палітыку савецкай улады ў адносінах да заможнага сялянства раздзяліліся. Адны называлі іх кулакамі-міраедамі, іншыя — вясковымі працаўнікамі, якія працуюць 12 — 15 гадзін у дзень, каб пабольш пасеяць, вырасціць лепшы ўраджай і жывёлу.

Дзяржава гарантавала, што працоўная гаспадарка застанецца недатыкальнай. Савецкая ўлада будзе засцерагаць інтарэсы працоўнага сялянства, імкнуцца дапамагчы яму, забяспечыць зямлёй.

Канфіскацыя памешчыцкіх і манастырскіх зямель прайшла без прымянення ваеннай сілы. Добраахвотнае аб'яднанне сялянства ў калектыўныя гаспадаркі (таварыствы, камуны і арцелі) толькі пачыналася. Але кіраванне памешчыцкімі маёнткамі і створанымі на іх базе саўгасамі не задавальняла сялян. Большая частка зямель у іх практычна пуставала. А гэта былі лепшыя землі! Насенне, інвентар, кармы раскрадаліся.

У 1919 — 1920 гг. мясцовыя Саветы праводзілі тыдні і месячнікі мабілізацыі сродкаў. Працоўнае сялянства актыўна ўдзельнічала ва ўсіх мерапрыемствах Савецкай улады. Нарыхтоўвалі і падвозілі сваім транспартам лесаматэрыялы і дровы, збіралі цёплае адзенне і бялізну, харчаванне і зброю для фронту, аднаўлялі разбураныя масты, калодзежы і дарогі, арганізоўвалі рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Ішла рашучая барацьба са спекуляцыяй і самагонаварэннем. У пачатку ліпеня 1920 г. валвыканком выдаў закон, які забараняў гандаль нарміраванымі прадуктамі (хлебам, мукой, крупамі, аўсом, бульбай, цукрам, соллю), не дазваляўся забой жывёлы і гандаль мясам. Асобы, якія парушалі гэты закон, арыштоўваліся, а коні, фурманкі, прадукты канфіскаваліся.

Пасля ўдалых аперацый Чырвонай арміі на франтах у ліпені 1920 г. тэрыторыя Буда-Кашалёўшчыны стала сапраўды тылавой. 12 жніўня 1920 г. Рэўваенсавет Заходняга фронту загадам № 1794 аб'явіў аб аднаўленні на тэрыторыі Гомельскай і Віцебскай губерняў выбараў органаў Савецкай улады. Быў выбраны выканком і сельскія Саветы. Да іх і перайшла ўся паўната ўлады.

Першая сусветная і грамадзянская войны прынеслі Буда-Кашалёўшчыне адчувальныя разбурэнні. У 1920 г. у параўнанні з 1916 г. у воласці значна скараціліся пасяўныя плошчы і пагалоўе жывёлы. Амаль палова гаспадарак не мела плугоў, а чвэрць — фурманак. Страты ад разрухі і разбурэння памнажаліся незаменнымі стратамі соцень людскіх жыццяў, пакалечанымі.

Да гаспадарчых цяжкасцяў дабавілася няўстойлівасць палітычных абставін. Актывізаваліся партыі меншавікоў і эсэраў. Яны выступалі супраць нацыяналізацыі, патрабавалі звароту гаспадарам ужо нацыяналізаваных прадпрыемстваў, адкрыта заклікалі на выбарах галасаваць супраць камуністаў. Тым не менш на мінулых выбарах у мясцовыя Саветы прыхільнікі бальшавікоў атрымалі перамогу. Выбраны валвыканком галоўнымі і неадкладнымі пытаннямі лічыў зямельныя адносіны, ліквідацыю беззямелля і малазямелля, выкананне заданняў па харчразвёрстцы. Устанаўліваліся строгія тэрміны паставак па харчразвёрстцы. За іх невыкананне рэквізавалася жывёла, маёмасць, накладаліся штрафы ў 10-кратным памеры да велічыні падатку. І было так, што харчорганы не заўсёды правільна выкарыстоўвалі свае правы, калі адбіралі лішкі прадуктаў у сялян. За парушэнне тэрмінаў падаткаў спынялася выдача солі, мануфактуры і іншых востдэфіцытных тавараў з кааперацыі. Мелі месца выпадкі скаргаў сялян на незаконныя дзеянні харчорганаў, а ў іншых выпадках і больш сумныя вынікі. Членам сельскіх Саветаў і валвыканкома даводзілася адначасова быць і памочнікамі харчатрадаў, і пасрэднікамі паміж імі і сялянамі, і праваднікамі палітыкі савецкай улады.

Каб зямля не пуставала, валвыканкомы і сельскія Саветы перадавалі яе пад пасеў сялянам ці калектыўным аб'яднанням (таварыствам па сумеснай апрацоўцы зямлі, камунам) і проста пад грамадскае заворванне бясплатна або за 1/3 ураджаю. Пры гэтым у распараджэнне сялян перадаваліся насенне, сельгасінвентар, машыны. У карыстанні сялян заставаліся і тыя ўчасткі зямлі, якія яны арандавалі на былых памешчыцкіх землях, пры ўмове, што гэта зямля апрацоўвалася без найму рабочай сілы. Самавольны захоп зямель катэгарычна забараняўся.

У забеспячэнні насельніцтва харчаваннем і таварамі павышалася роля спажывецкай, прамысловай і сельскагаспадарчай кааперацыі. Кааператыўныя аб'яднанні ў воласці станавіліся апорнымі пунктамі савецкай улады.

Летам 1920 г. у воласці часткова ўвайшлі ў строй лесапільныя і цагельныя заводы, гарбарныя, швейныя і іншыя арцелі. Ажывілася работа і ў сферы культуры. Пачалі працаваць кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы. Усе пісьменныя грамадзяне былі прыцягнуты да работы ў гуртках і школах лікбеза. Пад кантроль Саветаў узялі забеспячэнне школ палівам, абсталяваннем, вучэбнымі прыладамі і інш.

Усё адміністрацыйнае, гаспадарчае і масава-палітычнае жыццё заставалася падпарадкаваным галоўнай мэце — забеспячэнню перамогі Чырвонай Арміі на франтах грамадзянскай вайны.

У.Я.Райскі.

На шляху аднаўлення

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. і прыняты ў ноч на 27 кастрычніка (8—9 лістапада) Дэкрэт аб зямлі сталі пачаткам пераўтварэнняў усёй эканомікі і перш за ўсё аграрнага сектара на новай сацыялістычнай аснове.

У адпаведнасці з Дэкрэтам уся зямля абвяшчалася народнай уласнасцю. Памешчыцкія маёнткі, удзельныя, царкоўныя і манастырскія землі з усімі пабудовамі, інвентаром пераходзілі ў распараджэнне валасных зямельных камітэтаў і павятовых Саветаў сялянскіх дэпутатаў.

Скасоўвалася права прыватнай уласнасці на зямлю. Прысядзібныя землі і інвентар захаваліся ва ўласнасці малазямельных сялян, а высокакультурныя і былыя памешчыцкія гаспадаркі ператвараліся ў паказальныя і складалі дзяржаўную ўласнасць. Захаваліся і абшчынныя гаспадаркі, але пры ўмове замацавання права распараджацца імі за мясцовымі органамі самакіравання.

Дэкларавалася выключна ўраўняльнае землекарыстанне — падворнае, хутарское, абшчыннае або арцельнае.

У дапаўненне да Дэкрэта аб зямлі быў прыняты шэраг пастаноў і заканадаўчых актаў. Разам яны складалі прававую базу, на аснове якой ажыццяўляўся пераход да сацыялістычнай сістэмы гаспадарання на зямлі.

У 1918 — 1919 гг. прайшло карэннае пераразмеркаванне зямлі. Паводле прынятага ў лютым 1919 г. «Палажэння аб сацыялістычным землеўпарадкаванні» дазвалялася апрацоўваць столькі зямлі, колькі было гэта магчыма без наёмнай працы.

Ураўняльнае надзяленне сялян зямлёй праводзілі землеўпарадчыкі з мясцовых органаў улады і пад яе кантролем.

21 сакавіка 1921 г. ВЦВК РСФСР зацвердзіў «Закон аб харчовым падатку», праз некалькі дзён, разам з СНК — «Аб памерах натуральнага падатку», «Аб свабодным абмене, куплі і продажы сельскагаспадарчых прадуктаў у губернях, якія скончылі развёрстку», «Аб сельскагаспадарчай кааперацыі», а ў маі 1922 г. — «Аб працоўным землекарыстанні» і інш. Была створана заканадаўчая база ажыццяўлення Дэкрэта аб зямлі ва ўмовах мірнага часу — новай эканамічнай палітыкі (НЭПа), механізмы якой працавалі на аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі. Уводзіліся традыцыйныя рычагі рыначнага механізму шматукладнай эканомікі. Але цяпер ва усіх сферах рыначных адносін асноўным канкурэнтам дробнатаварнага сялянства, саматужнікаў і рамеснікаў, кааператыўнага і прыватнага гандлю выступала дзяржава. Вось такую палітыку савецкая ўлада прыняла ў 1921 г. «...надоўга і сур'ёзна».

Захоўвалася права прыватнага прадпрымальніцтва. Дазвалялася здача зямлі ў арэнду тэрмінова і на 3 гады за плату грашыма або натурай без права субарэнды. Дапускалася наёмная праца, але пры адначасовым удзеле ў ёй і наймальніка.

У гады НЭПа памеры сялянскіх гаспадарак у воласці значна наблізіліся да сярэдніх у губерні норм пасяўной плошчы — 3, 2 дзес. на двор. Колькасць беспасяўных гаспадарак паменшылася з 9,1% у 1917 г. да 0,83% вясной 1921 г., што было больш як у 10 разоў.

Грамадзянская вайна асабліва разбуральна адбілася на жывёлагадоўлі. У параўнанні з 1917 г. у рэгіёне ў 1920 г. група бясконных і бескароўных сялянскіх гас-

падарак значна ўзрасла. Амаль у 3 разы скарацілася прадукцыйнасць жывёлагадоўлі. Адначасова павялічылася і група гаспадарак з адным канём і адной каровай.

На тэрыторыі сучаснага Буда-Кашалёўскага раёна ў пачатку 1920-х гадоў размяшчаліся створаныя ў 1919 г. Івольская, Кашалёўская, Недайская, Чабатовіцкая, а з красавіка 1923 г. — Буда-Кашалёўская і Уваравіцкая валасці. Такі адміністрацыйна-тэрытарыяльны склад не дазваляе сёння адпаведна вызначыць памеры тэрыторыі і колькасць насельніцтва, іншыя эканамічныя паказчыкі для параўнання і аналізу з сучаснымі. Тым не менш можна канстатаваць, што на тэрыторыі Буда-Кашалёўшчыны ў пачатку 1920-х гадоў адбываўся прыкметны рост колькасці насельніцтва і сялянскіх гаспадарак.

Земляробства з'яўлялася галоўнай галіной эканомікі краю. Тут было занята амаль 93% працоўных рэсурсаў. Першае месца ў бюджэце воласці займала прадукцыя паляводства. У пачатку 1920-х гадоў жывёлагадоўля развівалася марудна, заставалася малапрадукцыйнай, насіла экстэнсіўны характар і была менш даходнай. У наступныя пасляваенныя гады колькасць жывёлы, асабліва свіней і кароў, працягвала скарачацца. Па даных статыстыкі на 1923 г., у параўнанні з 1916 г. на 100 дзес.ворнай зямлі колькасць жывёлы скарацілася на 60%, у разліку на 100 душ насельніцтва — на 47%, а на адну гаспадарку — больш як у 2 разы.

Вельмі нізкай заставалася ўраджайнасць глеб. Умоўна чысты ўраджай 1922 — 1923 гг. склаў у разліку на душу насельніцтва каля 2,5 ц збожжавых, бульбы — 6 ц, алейнага насення — 0,048 ц.

У гэтай няпростай эканамічнай сітуацыі мясцовыя Саветы выступалі ў ролі партнёраў вясковых таваравытворцаў. У першую чаргу яны займаліся адраджэннем разбураных вайной гаспадарак, рэгулявалі забеспячэнне сялян інвентаром, цяглавай сілай, насенным фондам. Ствараліся пасяўныя фонды, якія аб'ядноўвалі рэзервы насення сялянскіх гаспадарак. Менавіта праз Саветы дзяржава праводзіла такую крэдытную палітыку, якая дапамагала пашыраць пасяўныя плошчы перш за ўсё бядняцкім гаспадаркам.

Вясной 1921 г. для арганізаванага правядзення пасяўной кампаніі сельскія Саветы заснавалі пасяўкомы. Галоўная іх задача — пашырыць плошчы пасеваў. Праз пасяўкомы Саветы кантралявалі ход пасяўной, аказвалі дапамогу ў рамонце тэхнікі і інвентару, арганізоўвалі агравучобу. У красавіку 1921 г., у разгар пасяўной кампаніі, райвыканком праз сельсаветы правёў масавы «Двухтыднёвік чырвонага аратага». Мабілізавалі саматужнікаў

Сялянская хата ў пачатку 1920-х гадоў у в. Патапаўка.

кавалёў, слесараў, цесляроў і рымараў. З іх дапамогай у воласці адрамантавалі сотні адзінак сельгасінвентару, калёсы і інш. У Кашалёве, Уваравічах, Недайцы, Чабатовічах працавалі пракатныя пункты. Інвентар выдаваўся па даведках сельсаветаў.

Пасяўная кампанія 1921 г. у валасцях прайшла паспяхова і пасяўныя плошчы наблізіліся да ўзроўню 1916 г.

У першыя гады НЭПа сяляне плацілі 13 відаў падаткаў (збожжа, соль, малако, яйкі, птушка, воўна, скуры, пушніна, лён, агародныя культуры і інш.). Падатак здаваўся круглы год.

10 мая 1923 г. дзяржава ўвяла адзіны сельскагаспадарчы падатак, які вызначаўся ў збожжавых адзінках і выплачваўся на 40% натурай, астатняе — грашыма. Новым адзіным падаткам дазвалялася замена часткі абавязковага натуральнага падатку грашовым узносам і наадварот. Адзіны сельскагаспадарчы падатак, як уся падатковая палітыка дзяржавы, насіў класавы характар. Бядняцка-серадняцкім гаспадаркам даваліся льготы. Асноўны цяжар падаткаў у вёсцы падаў на так званыя «моцныя» гаспадаркі.

Складана праходзілі работы па землеўпарадкаванні. Акрамя таго, што яны абвастралі класавую варожасць, кошт іх для сялян быў даволі высокі. Ініцыятыва землеўпарадкавання належала беднаце, але правядзенне абярнулася для бедняка значнымі затратамі.

Карціну развіцця эканомікі раёна ў час рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і этапа аднаўлення паказвае аналіз зямельных адносін, колькасці свойскай жывёлы і коней у сялянскіх гаспадарках у 1917, 1920, 1922, 1923 гг.

Вясной 1923 г. Гомельскі губком абследаваў стан 8 валасцей некалькіх паветаў, у т.л. Чабатовіцкай, тэрыторыя якой сёння ўваходзіць у склад Буда-Кашалёўскага раёна. Аналіз прыведзеных даных па гэтай воласці з невялікімі адхіленнямі характарызуе становішча спраў на тэрыторыі іншых валасцей, якія складаюць цяперашні Буда-Кашалёўскі раён.

У дарэвалюцыйны час сялянскія гаспадаркі Чабатовіцкай воласці размяшчаліся ў асноўным на надзельных землях. У выніку малой забяспечанасці надзельнай зямлёй сяляне карысталіся натуральнай арэндай (палавіншчынай) і скупкай зямлі ў памешчыкаў.

Да моманту рэвалюцыі прыватнае землеўладанне значна скарацілася, і ў сялян Чабатовіцкай воласці мелася надзельнай зямлі 19 569 дзес., купленай — 14 034 дзес. Усяго — 24 504 дзес. Акрамя таго, гаспадаркі пашыраліся і за кошт палавіншчыны. У натуральную арэнду браліся галоўным чынам сенажаці і раскарчоўкі на тых жа ўмовах: лясныя высечкі — «ляды». У разліку на душу насельніцтва ўсяго прыпадала не больш за 1 дзес. ворнай зямлі і 0,25 дзес. сенажацяў.

Да так званых «заможных» адносіліся гаспадаркі з зямельным надзелам больш за 2—3 дзес. на душу. Землі, якія былі ў абшчынным уладанні, доўгі час не пераразмяркоўваліся.

У дарэвалюцыйны час у Чабатовіцкай воласці на хутары выйшла 17%, на водрубы — 11% гаспадарак.

Большая частка прадукцыі паляводства расходавалася ў сем'ях. Малазямельныя гаспадаркі расходавалі ўсю вырашчаную прадукцыю. Разам з тым, большую частку агародных культур і амаль усю прадукцыю тэхнічных культур збывалі на рынках. Выручаныя грошы ішлі на аплату падаткаў, куплю зямлі і на ...гарэлку. Толькі асобныя гаспадаркі адкладалі сродкі на так званыя «непрадбачаныя абставіны». Не пераставала іграць сваю ролю хатняе ткацтва, прадзенне і іншыя віды рамяства для сям'і.

Рэвалюцыя сур'ёзна змяніла зямельныя адносіны. Большая частка памешчыцкай зямлі была размеркавана. Выкарыстоўвалася яна па-драпежніцку, не ўгнойвалася. Сяляне стараліся ў першую чаргу падтрымліваць ураджайнасць сваіх участкаў. На новыя ўчасткі не хапала ўгнаенняў. Акрамя таго, надзельныя землі былі на значнай адлегласці ад уласнага двара.

Дакладныя звесткі пра падзел памешчыцкай зямлі ў рэгіёне не выяўлены.

У Чабатовіцкай воласці ў 1923 г. у зерорганаў было 1126 дзес., у сялян — 2642 дзес., у калгасаў — 321 дзес., у дзяржгасаў — 225 дзес. Усяго — 4314 дзес. ворнай зямлі, у т.л. у сялян і земорганаў было 86% былых памешчыцкіх зямель, у кааператыўных гаспадарках і дзяржгасах — 14%. У распараджэнні земорганаў заставаліся і лугі, якія часткова здаваліся сялянам у арэнду за натураплату, а часткова складалі дзяржфонды.

Прымаючы пад увагу рост насельніцтва і колькасць сялянскіх двароў, забяспечанасць зямлёй заставалася амаль як і да рэвалюцыі.

У гады грамадзянскай вайны харчразвёрстка прымушала сялян скарачаць пасевы тэхнічных культур. Таварнасць сялянскіх гаспадарак хутка падала.

НЭП павярнуў сялян у бок рыначных адносін, узрасла таварнасць гаспадарак. Але спагнанне падаткаў у натуральнай форме тармазіла гэты працэс. Стрымальным фактарам сталі і так званыя «нажніцы» цэн на прадукты сельскай гаспадаркі і прамысловыя тавары.

На прыкладзе сітуацыі ў Чабатовіцкай воласці можна канстатаваць, што адыходны промысел і ў дарэвалюцыйныя гады штогод вымываў з вёсак Буда-Кашалёўшчыны ад 8 да 12% працаздольнага насельніцтва (у 1910 — 1000 чал.), у іх ліку каля 40% моладзі. Малазямелле штурхала сялян і да перасялення. Пакідаючы абжытыя месцы, сяляне сем'ямі выязджалі ў Сібір, на Алтай і нават на Амур.

У паслярэвалюцыйныя гады хутка расла колькасць сялянскіх двароў. Калі ў 1917 г. у воласці было 2056 двароў, то ў 1922 г. — 2436 (штогод прырост складаў 4—6%). Колькасць гаспадарак павялічвалася галоўным чынам за кошт сямейных раздзелаў. Адбілася і вяртанне ў вёску ў пасляваенныя галодныя гады выхадцаў з сялян, якія па розных прычынах раней пайшлі жыць у гарады. Вярталіся яны, як правіла, з сем'ямі ў пакінутыя двары ці на гаспадаркі бацькоў, прымушаючы да раздзелу зямлі, жывёлы, інвентару і г.д.

У вайну рост насельніцтва ў воласці скараціўся на 6—8%. З пачаткам аднаўленчага перыяду колькасць насельніцтва хутка расце. Калі ў 1914 г. на аднаго працаздольнага прыходзілася прыкладна 2,03 едака, то ў 1923 г. — 2, 4. Ішоў падзел старых сем'яў і хуткі колькасны рост маладых. У воласці ў 1923 г. маладыя сем'і складалі ад 28 да 40%. Захавалася наёмная праца.

У наём на здзельную аплату ішлі галоўным чынам малазямельныя, бясконныя і безінвентарныя сяляне.

Па воласці ў 1917 г. большасць сялян (да 71%) мелі ад 1 да 6 дзес. пасяўной зямлі, 13% — больш за 6 дзес., а да 1 дзес. — 7%, беспасяўных было — 9%.

У перыяд грамадзянскай вайны ў воласці скарачаліся пасяўныя плошчы, і асноўная маса сялянскіх гаспадарак (больш за 87,4%) мелі да 4 дзес. пасеваў. Больш за 4 дзес. мелі 9% гаспадарак, беспасяўных — 3%. Памер пасяўных плошчаў сялянскіх гаспадарак у паслярэвалюцыйныя гады прама залежаў ад наяўнасці рабочай жывёлы. Група гаспадарак, якія мелі двух коней, пасля рэвалюцыі павялічылася з 38 да 40%.

У 1923 г. пасяўныя плошчы ў воласці пашырыліся да ўзроўню 1916 г. Сялянскіх двароў з пасевамі да 4 дзес. і вышэй стала 20%, у тым ліку з пасяўнымі плошчамі 6 дзес. і больш — 12%; да 4 дзес.— 39%, у тым ліку з пасевамі да 3 дзес. — 23%; да 2 дзес.— 32% двароў, у тым ліку беспасяўных — больш за 4%.

Калі параўнаць надзелы сялян ворнай зямлёй да рэвалюцыі і пасля заканчэння грамадзянскай вайны і па гэтаму паказчыку вызначыць катэгорыю гаспадарак, то выявіцца наступнае: да рэвалюцыі ў воласці 13% гаспадарак былі заможнымі, пасля рэвалюцыі іх засталося ўсяго 2%, а ў 1923 г. такіх гаспадарак у воласці стала 12%; серадзякоў адпаведна 32, 18 і 33%, беднякоў — 55, 80 і 55%.

Па колькасці буйной рагатай жывёлы: у заможных сялян — 17%, у серадзякоў — 40%, у беднякоў — 43%. Воласць была добра забяспечана лугамі і пашамі. І калі да рэвалюцыі рабочай жывёлы ў заможных сялян было 32%, то ў 1923 г. — 17%. У серадзякоў адпаведна — 36 і 42, у беднякоў — 32 і 40%, а ў 1923 г. — 43%. Такім чынам, у заможных сялян колькасць рабочай жывёлы пасля рэвалюцыі скарацілася амаль у 2 разы.

Конскае пагалоўе ў воласці выглядала наступным чынам. Калі да заможных гаспадарак аднесці тых, хто меў 3 і больш коней, да серадняцкіх — 2, да бядняцкіх — 1 каня, то ў Чабатовіцкай воласці ў дарэвалюцыйны час у групе заможных сялян мелася 29% коней, у гады грамадзянскай вайны — 7%, у 1923 г. — 10%; у групе серадзякоў адпаведна — 38, 41 і 40%, у групе беднякоў — 33, 52 і 50%.

Такім чынам, у 1923 г. у воласці гаспадарак з 3 конямі і 3 каровамі пры наяўнасці максімальнай пасяўной плошчы было 20% (заможныя), з 2 конямі і 2 каровамі і з 3 — 6 дзес. ворнай зямлі — 40% (серадзякі),

з 1 канём і 1 каровай і да 3 дзес. ворнай зямлі — 40% (бедцякі).

Воласць у складзе Гомельскай губерні адносілася да найбольш забяспечаных жывёлай. У гады вайны колькасць яе ў заможных гаспадарках рэзка скарацілася, асабліва маладняку. Табліца сведчыць, што і ў першыя пасляваенныя гады колькасць жывёлы ў воласці аднаўлялася марудна.

Від жывёлы	1917	1920	1922
Буйная рагатая жывёла	4453	4120	4411
На 1 гаспадарку БРЖ	2,25	1,8	1,75
Коні	4087	3344	3830
На 1 гаспадарку коней	2,06	1,45	1,5
Авечкі	4104	3314	3524
На 1 гаспадарку авечак	2,1	1,45	1,45
Свінні	4114	2846	2344
На 1 гаспадарку свіней	2,1	1,2	0,9

Лепшыя землі да рэвалюцыі адводзіліся выключна пад каноплі і лён. Гэта прадукцыя прызначалася для рынку. Вайна і рэвалюцыя змянілі структуру земляробства. У пасляваенныя гады пасевы лёну і канапель стрымлівалі натуральны характар падаткаў. Па воласці пасевы лёну скараціліся на 50%. Затое ўзраслі пасевы збожжавых культур: жыта на 2—3%, пшаніцы — у 8 разоў, ячменю — у 2 разы, проса — у 2 разы, бульбы — у 1,5 раза. Значна скараціліся пасевы кармавых траў (у 1917 — 234 дзес., у 1922 — 14 дзес.).

Нівеліроўка сялянскіх гаспадарак па асноўных паказчыках у воласці ў 1923 г. адпавядала іх узроўню ў 1916 г. Структура гаспадарак давала магчымасць абсалютнай большасці сялянства атрымліваць даходы ад уласных гаспадарак у такім памеры, каб задаволіць усе свае гаспадарчыя патрэбы і забяспечыць устойлівасць эканамічнага становішча. Сельская гаспадарка давала і харчаванне, і грошы, у той час як адыходны промысел — толькі грошы. Асноўны даход бюджэту сялян складаўся ад уласнай гаспадаркі. Розная магутнасць гаспадарак вызначала ўзроўні бюджэтаў. Валавы даход гаспадарак у 1923 г. у параўнанні з даваенным часам рэзка скараціўся. Прычынамі такога становішча былі скарачэнні пасеваў тэхнічных культур, а таксама колькасці пагалоўя прадукцыйнай і рабочай жывёлы.

Па стану на 1923 г. даход адной сялянскай гаспадаркі ў воласці складаў 100—150 руб. у бедняка, 200—350 руб. у серадняка і 500—1000 руб. у заможнага двара. У расходнай частцы бюджэту асноўныя затраты складалі падаткі.

Да рэвалюцыі падатак спаганяўся ў залежнасці ад памеру пасяўных плошчаў і складаў у сярэднім 8—25 руб. з двара. У 1923 г. гаспадаркі плацілі падаткаў ад 8 да 85 руб. у год. Памер падаткаў на бядняцкую гаспадарку вагаўся ад 8 да 12, на серадняцкую — ад 20 да 40, на заможную — ад 50 да 85 руб. у год. У беднякоў расходы на падаткі забіралі 9—19% бюджэту, у серадпякоў — 20—30%, у заможных сялян — 13—18%. Здаралася, што падаткі з заможных гаспадарак, якія па намінальных памерах былі ў 4—5 разоў большыя, чым у бядняцкіх, былі для іх значна менш адчувальныя, чым для беднякоў.

Такімі сталі вынікі эканамічнага і сацыяльнага развіцця Буда-Кашалёўскага рэгіёну ў гады новай эканамічнай палітыкі.

Да канца 1926 г. аграрны сектар раёна хутка развіваўся. Паявілася тэндэнцыя да росту агракультуры і прадукцыйнасці, таварнасці і даходнасці сельскагаспадарчай вытворчасці аднаасобнага і калектыўнага сектараў.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ГУБСАЎНАРГАСА

20 верасня 1920 г.

п.1. О мобилизации в продотряды.

... На т. Именитова возлагается задача выполнения разверстки по картофелю в Рогачевском уезде. Для выполнения задания ему необходим отряд минимум в 200 человек. По пяти богатейшим картофелем волостям (Дудицкой, Чечерской, Меркуловичской, Покатской, Полесской) предстояло собрать 500 000 п. картофеля. Если в продотрядах не будет требуемого количества людей, продразверстка в уезде выполнена не будет... Мобилизацию провести в 2—3 дня.

ПОСТАНОВИЛИ: Принимая во внимание невозможность выполнения разверстки картофеля по уезду без помощи вооруженных сил:

1. ... временно мобилизовать в продотряды часть членов профсоюзов.

2. ... мобилизацию закончить в семидневный срок.

3. ... мобилизация должна быть безоговорочной.

4. ...

Председатель

Президиум губсовнархоза

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 433. Воп. 1. Спр. 127. Л. 69.

РЭЗАЛЮЦЫЯ V ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЯТОВАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ АБ НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ

19 мая 1921 г.

В момент, когда все военные фронты ликвидированы и есть возможность перейти к мирному строительству, V уездный съезд Советов находит необходимым признать работу наробраза одной из ударных в нашем строительстве и поручить уисполкому и волисполкомам нового состава принять следующие меры:

1. Отремонтировать к началу учебного года все школьные здания и, где таковых нет, по возможности построить новые.

2. Снабдить все школьные помещения дровами.

3. Отвести для каждой школы земельные участки для устройства показательных полей.

4. Использовать кооперацию в целях снабжения школ всем необходимым.

5.Обязать уисполком войти с предложением в губисполком об уравнении работников просвещения в отношении снабжения и оплаты труда с рабочими ударных предприятий.

6. Все мероприятия, поименованные в пунктах 1 и 3, провести силами местного населения и на средства государства (лес, стекло, кирпич, гвозди и пр.).

7. Предложить уисполкому и волисполкомам поддерживать инициативу местного населения в проведении указанных выше мероприятий.

8. Предложить волнаробразам и волкоммунотделам принять самые энергичные меры к организации и открытию школьных учреждений в уезде, предоставив им в этом отношении самые широкие права.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 428. Воп. 2. Спр. 130. Л. 31—32.

З ПАСТАНОВЫ ГУБВЫКАНКОМА АБ МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА ЛІКВІДАЦЫІ НЕПІСЬМЕННАСЦІ СЯРОД НАСЕЛЬНІЦТВА

23 снежня 1921 г.

Ликвидация неграмотности, начатая Советской властью в разгар гражданской войны, в то время, когда кипела борьба на всех фронтах, приобретает сейчас, в период мирного хозяйственного строительства, еще более важное значение.

Работа по ликвидации неграмотности должна быть усилена. 3-я кампания по ликвидации неграмотности в нашей губернии с апреля месяца с.г. прервана из-за полевых работ и еще до сих пор не возобновлена. Ввиду изложенного губисполком постановляет: приступить к проведению 3-й кампании по ликвидации безграмотности на следующих основаниях:

п. 1

3-ю кампанию по ликвидации неграмотности по Гомельской губернии открыть с 1 января 1922 г. и закончить к 1 мая 1922 г.

Примечание: в сельских местностях таковую закончить к 1 апреля.

п. 2

В течение этого срока должна быть закончена полностью ликвидация неграмотности среди организованного населения (членов профсоюзов, на государственных и частных предприятиях) в возрасте до 40 лет.

п. 4

Дополнительно охватить обучением неграмотных жителей сельских местностей Гомельской губ., родившихся в 1899 г.

п. 5

Всем уклонившимся от обучения (неграмотные от 14 до 21 года), проживающим в сельских местностях Гомельской губ., явиться в волнаробраз для распределения по школам грамоты.

п. 6

Всех неграмотных, посещающих школы грамоты, освобождать от труднaлога из расчета 3 часа занятий за час трудналога, но не свыше 8 часов в месяц.

п. 7

Все подлежащие призыву и уклоняющиеся от обучения подвергаются денежному штрафу от 100 тыс.руб. до 500 тыс.руб.

п. 8

От обучения освобождаются больные по свидетельству врача, женщины, имеющие детей дошкольного возраста или обслуживающие семьи, состоящие из 4 чел.

п.9

Всем советским учреждениям оказывать всяческое содействие губернской комиссии по ликвидации безграмотности и ее органам на местах в проведении в жизнь настоящего постановления.

Председатель губисполкома Шнейдер.

Председатель губграмчека Кантар.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 24. Воп. 1. Спр. 128. Л. 247.

З ЦЫРКУЛЯРНАГА ПІСЬМА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА КП(б)Б УСІМ ВАЛАСНЫМ ПАРТЯЧЭЙКАМ

1922 г.

... В середине мая 1922 г. закончился всероссийский поместный собор православной церкви. Работа этого собора для нас имеет огромное значение, поскольку он должен окончательно вырвать почву из-под ног крайних контрреволюционеров в рясах, пытающихся сохранить за собой церковную организацию ... для борьбы против Советской власти.

Необходимо ознакомить крестьянские массы с основными решениями собора. Это должно быть сделано путем умелого освещения результатов собора..., нужно проявить осторожность..., лучше всего проводить эту работу через учителей и наиболее подготовленных беспартийных. Само собой понятно, что привлекать для этой работы беспартийных шкрабов и других следует очень тактично ... без принуждения.

Освещать результаты собора так, чтобы не создавать мнения, будто бы Советская власть готова сотрудничать с обновленной церковью.

Надо, чтобы население знало, что мы ... сотрудничать с церковью не собираемся ... Мы должны только использовать собор, чтобы показать, что Советская власть ... обеспечивает свободу вероисповедывания и т.д.

... Решения собора должны показать массам, что обвинения в наш адрес, что мы притесняем религию, что мы преследуем духовенство... клевета ...

Секретарь УКОМА (Мисников).

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 218. Воп. 1. Спр. 4. Л. 1—2.

З ЦЫРКУЛЯРНАГА ПІСЬМА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА КП(б)Б САКРАТАРАМ РАЙКОМАЎ ПАРТЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

17 сакавіка 1923 г.

...В ряде волостей имеет место отчуждение под те или иные нужды и закрытие церквей и отчуждение домов, занимавшихся ранее духовенством.

Уком указывает, что отчуждение церквей в деревне может производиться только при условии выявленного на то согласия большинства населения...

Есть сведения, что в некоторых местах волисполкомы предъявляют религиозным общинам требования о внесении известных сумм спец. налога, изобретаемых на местах, и при не внесении их закрывают церкви. Укомом приняты меры ... недопустимости подобных действий в дальнейшем.

Церковь может быть закрыта, если община категорически отказывается подписать договор о передаче во временное пользование и об ответственности ее за сохранность. Никакие ... не предусмотренные ЦК налоги и платежи с церквей и молитвенных домов не должны иметь место.

...Отчуждение в административном порядке может быть только для общественно-культурных нужд.

...Уком предлагает ... усилить ... агитацию за передачу церковных помещений под школы и иные культучреждения, за снятие части колоколов для тех или иных общественных нужд и т.д.

Эта агитация должна быть проведена чрезвычайно умело ... и только при наличии мнения большинства за подобные мероприятия оно может быть проведено в жизнь.

Этот циркуляр не подлежит распространению среди партийных масс и тем более беспартийных.

С коммунистическим приветом. Секретарь УКОМА КП(б)Б (Карпек)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 218. Воп. 1. Спр. 4. Л. 4.

З ПРАТАКОЛАЎ ПАСЯДЖЭННЯЎ КАШАЛЁЎСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНКОМА

6 сакавіка 1923 г.

СЛУШАЛИ: Об окончательном выполнении всех видов налога.

Докладчик Бедрицкий указал, что какая норма была наложена по всем видам налога на граждан волости, то такая должна быть внесена полностью и ни в коем случае не может быть снята. Все недоимки должны быть внесены не позже 10-го марта с/г. Между тем... кампания подворно-поимущественного налога выполнена только двумя сельсоветами Р.Кошелевским и Кострищенским.

Содокладчик тов. Куприевич указал, президиумом Уисполкома предложено дать покой гражданам деревни и не отрывать их от весенних работ. Для этого необходимо закончить выполнение недоимок в первую половину марта. К невыполнившим будут приниматься репрессивные меры, как-то: опись их имущества и продажа скота, чем будет достигнута возможность к окончанию выполнения всех видов налога, а по сему во избежание репрессий сельсоветы должны принять необходимые меры и широко разъяснить гражданам сроки окончания всех недоимок по налогам.

В прениях по докладу секретарь сельсовета д. Шарибовки указал, что есть часть граждан, которые в силу инструкций и различных распоряжений не могут быть освобождены от выполнения налогов.

Предсельсовета д. Рудня-Кошелевская т. Зайцевым отмечено, что упродкомом часто допускались ошибки, как, например, по имеющимся квитанциям недоимка составляет за сельсоветом 23 пуда продналога, а недоимка упродкома указана — 68 пудов.

Председатель д. Струки т. Кужанов указал, что необходимо пойти беднякам навстречу, которые в данный момент не в состоянии внести остатков налогов, перевести таковые в недоимку на 1923 г.

В заключительном слове т. Бедрицкий указал, что сельсоветам необходимо проводить классовую линию, помогая беднякам вносить налог за счет кулаков и таким образом кампании будут закончены в срок. На вопрос Зайцева ответил, что нужно исправить ошибку упродкомов, если таковая в действительности была, предъявив документальные данные соответствующим органам.

ПОСТАНОВИЛИ: ...Пленарное заседание констатирует факт о необходимости выполнения к 15 марта с/г остатков всех видов налога, а также одобряет постановление президиума Уисполкома от 12-го февраля с/г об окончании выплат всех видов налогов, дабы дать возможность приступить к землеробским весенним полевым работам.

Пленум просит президиум Уисполкома для беднейших граждан, не имеющих возможности внести налог в настоящий момент, перенести таковой им в недоимку на 1923 г.

СЛУШАЛИ: Доклад о весенней сельскохозяйственной кампании и об организации семенных фондов.

Докладчик т. Сазонов указывает, что...только в 1922 г. замечен перелом в сторону улучшения сельского хозяйства. Необходимо всем деревням заняться изучением культурного ведения такового, ...власти идут навстречу в достижении возрождения культурного хозяйства...

Содокладчик т. Бедрицкий по вопросу организации семенных фондов подчеркнул, что последние очень важны для самих граждан. Участковый агроном Ястроженский зачитал резолюцию съезда уездной земельной конференции, разъяснил важность подогнать посевную площадь до размеров, каковой она была до 1914 г. Выяснить, есть ли у граждан семена и хорошего ли они качества, потому что неочищенное зерно дает плохой урожай...

Т.Шульченко высказался за скорый раздел земли на поселки, где можно будет скорей развить культурное хозяйство...

ПОСТАНОВИЛИ: ...Считать все мероприятия весенне-посевной кампании ударно-боевыми. Приступить немедленно к учету семенных фондов деревень, учесть весь живой и сельскохозяйственный инвентарь. Приступить к ремонту сельскохозяйственных орудий.

...Освободить всех кузнецов и слесарей от отбытия трудгужналога и привлечь таковых к починке сельскохозяйственных орудий для семей красноармейцев и инвалидов самого беднейшего населения бесплатно... Привлечь население к засеву как можно большего количества культур льняного и конопляного семени.

Обязать население приступить к осушению болот и разработке сухих лугов.

Запретить убой скота-молодняка, приступить к организации сельскохозяйственной кооперации...

Сельсоветам немедленно приступить к учету всех веялок и других с.х. орудий для очистки семян к весеннему севу.

Пленум одобряет постановление президиума Уисполкома о предоставлении 25% сенокосов для бесплатного отвода бедноте и семьям красноармейцев, а также одобряет постановление об отводе сенокоса бесплатно племенным рассадникам.

...Запретить продажу яровых семян. Виновных штрафовать в размере 1-го пуда ржаных единиц, а у скупщиков забирать купленное и передавать комитетам взаимопомощи.

...Скорей осуществить разбивку всей земли на поселки и поручить сельсоветам следить за кулацким элементом, противоречащим в выборе землепользований...

СЛУШАЛИ: Об обязательном проведении телефонизации.

Докладчик т. Бедрицкий указывает, что... предстоит заготовить, вывезти 205 столбов, ... собрать 1056 пудов ржаных единиц.

ПОСТАНОВИЛИ: ...При выполнении задания в сборе 1056 пудов пленум находит нужным всю тяжесть налога возложить на кулаков, а не на трудовой элемент волости. Разверстку означенного задания провести по селениям, учитывая в каждой деревне кулаков...: Кошелеву — 100 ржаных единиц, Р.Кошелевской — 65 пудов, Сельцу — 90 пудов, Кулешовке — 20 пудов, Мачулищу — 80 пудов, Дуравичи — 100 пудов, Бушевке — 100 пудов, Славенец — 20 пудов, Буда-Кошелеву — 150 пудов, Потаповке — 100 пудов, Кострище — 30 пудов, Шарибовке — 100 пудов, Липиничи — 70 пудов, Бронницу — 70 пудов, Коромке — 80 пудов, Заболотье — 100 пудов, Дрозды — 30 пудов, Струки — 80 пудов и Р.Липиничской — 50 пудов.

СЛУШАЛИ: О школах. Доклад пред. волкома Бедрицкого.

Докладчик указывает, что сельсоветы должны для школ выделять здания и не менее 2 дес. земли. Земля нужна для ознакомления учащихся с культурными посевами.

ПОСТАНОВИЛИ: ...Все сельсоветы должны способствовать в наделении школ земельными участками, не считаясь даже с занятыми под огороды участками. Для Кошелевской и Буда-Кошелевской школ поручить волисполкому отвести земли на бывшей церковной огородной площади...

Подлинно подписали: Предволисполкома (Бедрицкий).

Члены:Гак и Сазонов.

Секретарь (Отрошка).

23 мая 1923 г.

СЛУШАЛИ: 1. О едином сельскохозяйственном налоге.

Докладчик председатель Уисполкома т. Евдокимов указал, что Центром издан Декрет об едином сельхозналоге и все какие только проводились налоги отпадают и на местах не должны проводиться никакие налоги, кроме вышеуказанного налога. Сбор налога будет проводиться в двойном виде: денежном и хлебном. За учет объектов обложения отвечают в

первую очередь сельсоветы, во вторую — волисполком. Во избежание недоразумений каждый глава семьи, давши сведения о своем хозяйстве, должен расписаться в их правильности.

ПОСТАНОВИЛИ: ...Пленум Кошелевского волисполкома одобряет правильную проводимую линию о введении единого сельхозналога, чем объясняется инициатива рабоче-крестьянского правительства улучшить положение крестьянства, освободив его от излишних оброков обложения, что морально отражалось на крестьянстве при выполнении различных налогов, и единый сельхозналог поднимет продуктивность сельского хозяйства крестьян, ибо он самоосознает, что статья обложения налогом одна лишь земельная площадь и что не будет являться причиной оторванности крестьянина от прямых сельскохозяйственных обязанностей.

СЛУШАЛИ: 2. О районировании волости.

Докладчик т. Евдокимов указал, что мы не районировали волости, а ставили вопрос по всему уезду, ибо этот вопрос назрел с 1919 г., и вот нам нужно усилить аппараты, сделав их крепкими, сильными, сократив разбухшие аппараты и таким образом мы сократим бюджет. Центром решено..., что надо на 50% губ. обл., уездов и волостей сократить. Нужно поставить ВИК на должную высоту, дабы гр. не ездили в высшие органы, удовлетворились на месте теми или иными вопросами. Сельсоветам будет дано больше прав. Районирование волостей нужно закончить до 15 июня. В состав волости войдет Недойская, за исключением трех деревень, и половина Старо-Рудницкой и волость, как таковая, будет насчитывать 54 деревни. Всем сельсоветам, которые хотят присоединиться к другому уезду или волости, необходимо подавать заявления по этому вопросу до 10 июня, после 10-го заявления приниматься не будут. Из 19 волостей уезда останутся 10 волостей... Было мнение о присоединении волости к Гомельскому уезду. Тов.Евдокимов разъяснил, что Уисполкомом и Центром отказано.

ПОСТАНОВИЛИ: Пленум сельсоветов Кошелевской волости считает вполне правильным проведение Советским правительством сокращения средств на нужды госаппарата и предлагает сельсоветам и волисполкому не ослаблять, а усилить работу... Пленум напоминает волисполкому, всем сельсоветам, что при укрупнении волости от советского аппарата требуется больше усилий и внимания, причем есть мнение сельсоветов о присоединении к Гомельскому уезду.

Секретарь (Отрошко).

28 мая 1923 г.

СЛУШАЛИ: 1. О переводе волисполкома из с. Кошелева в д. Буда-Кошелево при станции того же наименования.

Докладчик тов. Евдокимов указывает, что не позже 10 июня с.г. волисполкому надлежит переехать в д. Буда-Кошелевскую в намеченный дом Шиловых, который по решению нарсуда от 14-го мая остался за волисполкомом, где придется развернуться, ибо с 15 июня волисполкому надлежит принять Недойский ВИК, согласно инструкции о проведении в жизнь Постановления ВЦИК от 9 мая с.г. о проведении районирования уезда.

ПОСТАНОВИЛИ: 1.Поручить зам. предволисполкома т. Гаку произвести в срочном порядке ремонт в намеченном доме в д. Буда-Кошелевской и не позже 10-го июня с.г. перевести весь исполком со всеми подведомственными учреждениями в вышеуказанное намеченное место для центра волости.

СЛУШАЛИ: 2. О приобретении средств на закупку двух лошадей для волисполкома.

ПОСТАНОВИЛИ: Ввиду того, что Кошелевская волость не обладает большим запасом сенокосных площадей, поручить одному из членов ВИК срочно снестись с Старо-Рудненским, Недойским волисполкомами о взыскании 10 десятин заливного луга на предмет приобретения двух лошадей, которые необходимы для связи ВИК с сельсоветами.

СЛУШАЛИ: 3. Об оборудовании мебелью волисполкома.

ПОСТАНОВИЛИ: Ввиду полного отсутствия при ВИК мебели поручить зам. пред. ВИКа т.Гаку снестись с волисполкомами Старо-Рудненским и Недойским с тем, чтобы вся мебель и все волостное имущество хранилось по описям до сдачи такового Кошелевскому ВИКу.

Подлинник подписан: зам. пред. ВИК (Гак).

Секретарь (Отрошко).

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1023. Воп. 2. Спр. 13. Л. 19—20, 65—67.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ПРА ДЗЕЙНАСЦЬ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНКОМА З ЧАСУ ЎЗБУЙНЕННЯ ВОЛАСЦІ ДА 26 ЖНІЎНЯ 1923 г.

1. Организационная часть

...Новый состав волисполкома сконструирован 21 июля, каковой и утвержден беспартийной конференцией совместно с сельсоветами 29 июля. Состав волисполкома: 4 человека с распределением занятий — председатель исполкома, заввоенстолом, завблагоустройства и инструктор-ревизор. Технический состав: 5 человек — секретарь, 3 делопроизводителя, машинистка и курьер. В течение отчетного времени заслушаны доклады деятельности 12 сельсоветов, начмилиции, страхагента, лесничества, начальника Буда-Кошелевской пас. ст., участкового агронома и участкового врача и им преподаны дальнейшие директивы в работе...

Состав сельсоветов: всего сельсоветов — 25, в них председателей, секретарей и членов — 102 человека, из них бедняков — 70, середняков — 23 и кулаков — 2, в том числе красноармейцев — до 60%.

...Населенных пунктов в волости 55, в них населения 28 684 души. В текущем году зарегистрировано родившихся 319 (муж. пола — 164, жен. — 155), умерших 41 (муж. пола — 22, жен. пола — 19), браков 199 и разводов 9...

Лошадей по волости состоит на учете 6408...

Постановлением волисполкома от 7 августа за N 35 установлено проведение недельника помощи воздухофлоту с 9 августа...

В волости работают два кооператива (многолавки) Недойский и Кошелевский, деятельность их совершенно слабая, пайщиков нет...

2. Административная часть

Контрреволюционных выступлений, политического, уголовного бандитизма не наблюдалось, население к власти относится благожелательно. Религиозные секты зарегистрированы, в коих пока выявился 21 человек. Меры борьбы с разного рода преступностью приняты, особое внимание обращено на самогонокурение, разного рода воровство, а главное — конокрадство. В отношении лесохищения по волости спокойно... Торговля происходит под строгим наблюдением волисполкома и волмилиции.

Волмилицией в течение отчетного времени произведено: задержание 4 человек по обвинению в государственном политическом преступлении, обнаружено 11 самогонных аппаратов, 11 бутылок и 1 бидон самогонки, 1 случай продажи самогонки и вылито 10 ведер браги; изъято оружия: 2 револьвера, 1 винтовка, 1 карабин, 3 урезка, 4 охотничьих ружья. Раскрыто 3 случая воровства, 2 случая конокрадства и один случай присвоения лошади должностным лицом, 1 случай продажи краденного, случай проституции, 2 случая взяточничества, 1 случай покушения на убийство на романтической почве и др. мелкие преступления. В остальном работа милиции проходит в взыскании штрафов как административных, так и по постановлению суда и выполнению исполнительных листов. Проведено совещание сельских сотских, работа которых совершенно слаба. Предложено начмилиции пересмотреть их состав и произвести чистку.

3. По благоустройству

а). По народному образованию

Школ на госснабжении 20 и договорных — 3. Из числа состоящих на госснабжении 16 в специальных зданиях и 4 в приспособленных, а договорные — в частных домах. Все школы подразделяются: однокомплектные — 19, двухкомплектные — 4. Школьных работников на госснабжении 24 и договорных — 6. Волисполкомом обращено особое внимание на ремонт школ и заготовку топлива для них, но по первому достигнуть желательных результатов не удалось из-за отсутствия средств, которых по выявленным объемам ремонта каждой школе понадобится в колоссальной цифре, по второму — получены и разосланы на места лесорубные билеты с распоряжением приступить к немедленной заготовке и вывозу дров... Учебников в школах нет, бывшие пришли в совершенную негодность, а фонда на их закупку также нет... В районе волости 6 изб-читален, функционируют удовлетворительно. Библиотеки при избах-читальнях требуют значительного пополнения, недостает периодических изданий газет и журналов...

б). По здравоохранению

В районе волости имеется участковая больница со штатом: один врач, два фельдшера, одна акушерка и один фельдшерский пункт с одним фельдшером. Больница нуждается в

стороже и санитарах, т.к. медперсоналу приходится бессменно день и ночь, помимо оказания медицинской помощи, выполнять обязанности санитаров и сторожа... Заразных заболеваний эпидемического характера не наблюдается... В больнице в среднем в месяц находятся 3 коечных больных и 200 — 400 амбулаторных.

в). По коммунальному хозяйству

...Муниципализированных домов по волости 24, из них часть заняты частными лицами, кои их и ремонтируют, часть госучреждениями, часть никем не занята. Большинство из этих домов требуют серьезный ремонт... Паровых мельниц 5, находятся у частных владельцев. Торговых лавок 15, крупорушек 2, кузниц 10, бондарей 27, сапожников 6, портных 4, ветряных мельниц 35, строений нетрудового элемента около 50.

г). По комитету взаимопомощи

Сельских комитетов взаимопомощи 25, функционируют 23. Натурфонда собрано 800 пудов разных семян, каковой роздан нуждавшимся. Отвода земельных участков для общественной запашки компомам не производился... Эта работа поручена завземстолом для обязательного отвода под посев в текущем году и отведено 10 комитетам по 2 десятины каждому... Учет малоимущих хозяйств еще не закончен... сведения не полны: инвалидов 133, вдов 362, сирот 127, семей красноармейцев 83 и детей Поволжья 21. В текущем году беднота, инвалиды и нуждающиеся семьи красноармейцев наделены сенокосом из 25% фонда, дано распоряжение об оказании им помощи по засеву озимых... Состав волисполкома чисто пролетарский, в сельсоветах же есть и середняки...

4. По сельскому хозяйству

...По селениям, совхозам и артелям: пашни — 10 915, 5 дес., заливных лугов — 789, 25 дес., хозяйств — 4946, крупного рогатого скота, в т.ч. и волов 9137, лошадей 5764 голов...

...Объявлен двухнедельник засева озимых и конкурс для селений, обсеявших озимый клин раньше других.

11 и 12 августа проведен день крестьянина, где населению рассказывалось значение сужения озимого клина, переход к многополью, важность сева сортовым и отсортированным зерном, а также раннего посева. Приступлено к организации семенных амбаров со ссыпкой в них по волости 2000 пуд. зерна, о чем разослано соответствующее распоряжение сельсоветам для проведения разверстки по 6 фунтов с дес. пахотной земли и сбора, ...пока имеется 687 пуд. Учреждено 5 зерноочистительных пунктов, из них 3 передвижных, кои работают по ранее составленному календарному плану... Сортовых озимых семян учтено 200 пудов и предложено населению произвести обмен. Для полного засева озимого клина понадобится семссуды для беднейшего населения и семей красноармейцев 1057 пудов. В районе волости имеется агрономический и ветеринарный пункт со штатом: один агроном и один ветфельдшер...

Батраков в волости учтено 98 человек, за жизнью и работой коих волисполком следит...

5. Налоговая часть

Новому составу волисполкома пришлось проводить проверку учета объектов обложения и предъявления его населению. Проверка прошла успешно и жалоб на неправильный учет было совершенно мало и в большинстве случаев ничем не обоснованные. Поступали многочисленные заявления и продолжают поступать в настоящее время на освобождение полностью или частично от налога по стихийным бедствиям. Волисполкомом проведено определение урожайности... при пробном обмолоте средний урожай зерновых — 30 — 35 пудов с десятины...

ЗАКЛЮЧЕНИЕ

...Волисполком предполагает во главу своей работы принять укрепление сельсоветов и достижение их работоспособности путем инструктирования и производства ревизий. Самое главное внимание обращается на проведение осенней посевной кампании, ссыпку семссуды в общественные амбары, усиление работы компомов и подготовку к единому сельхозналогу.

Предволисполкома (подпись).

Секретарь (подпись).

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1023. Воп. 2. Спр. 13. Л. 132.

Першы выпуск Кашалёўскай сямігодкі. 1926 – 1927 гг.

Выканаўчае бюро навучэнцаў ляснога тэхнікума ў Буда-Кашалёве. 1925 г.

Будынак Радзееўскай 8-гадовай школы.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁННАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА ПА СТАНЕ НА 1 СНЕЖНЯ 1925 г.

1. Общеэкономический обзор

...Населенных пунктов — 96, а если принять во внимание расположенные на территории района ж. д. будки, лесные сторожки и другие мелкие единицы, то цифра населенных пунктов по району будет равняться 169.

Население с г.п., включая вновь присоединенные населенные пункты, равняется 34 527 человек... в большинстве своем относятся к белорусам с незначительным числом русских, евреев и поляков.

Земли... удобной и пахотной 28 324, 5 дес., сенокосной 14 860 дес., неудобия и выгоны 5108 дес.

Дворов в районе 5988. Главное занятие жителей, за небольшим исключением, отхожие промыслы и кустарничество, земледелие. Причем обеспеченность землей, ...исходя из нормы на едока: безземельных — 205 дворов, до 0, 5 дес. сенопашни — 1085, от 0, 5 до 1, 0 дес. — 2438, от 1, 0 до 2, 0 дес. — 1708, от 2, 0 до 3, 0 дес. — 281, от 3, 0 и выше — 271 двор. (Принимая во внимание землеустроительство, за точность указанных данных ручаться нельзя.)

Посевы по культурам 1925 г. занимают приблизительно следующие соотношения: рожь — 40—50%, овес — 25—20%, ячмень — 4—5%, просо — 3—4%, картофель — 20—25%, гречихи — 10—15%, льна — 7—9%.

Всего коров — 11 119, лошадей — 8029, мелкого скота — 22 753 головы. Безлошадных хозяйств — 615, однолошадных — 2721, двухлошадных — 2197, многолошадных — 455.

Свиньи, за редким исключением, разводятся только местной полудикой породы. Овцы только местной породы и для собственного потребления, хотя за последнее время некоторые хозяйства пробуют разводить и курдюков.

Травосеяние развито слабо и присуще хуторам и околицам.

...Садоводство также развито и в особенности в Любовинском сельсовете, исключая 8 садов местного значения, состоящих в ведении ЕПО, у граждан по району 525 с разным количеством деревьев.

Промышленность, кустарничество и торговля

Ветряных мельниц — 68, почти все работают. Паровых — 5, все работают. Водяных — 1, работает. Круподерок — 7, работают. Вовночесок ручных — 19, работают. Маслобоек — 3, работают. Смолокуренных заводов — 1, работает. Кирпичных печей — 3, работают. Сукновалок — 3, работают. Отделений ЕПО — 8, частных лавок — 63...

Кроме земледелия, жители при наличии лесных разработок занимаются заготовкой и валкой леса. Работы производятся на разработках «Лесбела» и «Гомлеса», а также жители некоторых сельсоветов отправляются и в другие губернии для выработки клепки.

Ремесленников в районе очень мало: кузнецов — 31, сапожников — 9, портных — 7, столяров — 4, кожевенников — 5, прялочников — 1.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 782. Воп. 1. Спр. 147. Л. 27—28.

СА СПРАВАЗДАЧЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТА ЗА ПЕРЫЯД З 1 ЛЮТАГА ДА 1 ЖНІЎНЯ 1926 г.

1. На территории сельсовета работают 3 школы. Изб-читален не имеется. Различных газет... выписывается 80 экз. и 16 разных журналов. Санитарное состояние в районе сельсовета в среднем.

2. Отношение граждан к землеустроительству хорошее, за исключением д.Бушевки, где тормозят всю работу кулаки.

3. Пожарное дело в районе совершенно не развернуто, нет пожарных дружин, инвентаря и машин, последние имеются, но в негодном состоянии и не могут приводиться в действие.

4. Предприятий по району сельсовета особенных нет, за исключением паровых и ветряных мельниц, первых имеется 2, вторых — 8, а также имеется 1 маслобойка. Все данные предприятия находятся в частных руках.

5. Населения по району сельсовета учтено 4020, из коих мужчин — 2953, женщин — 1967.

6. Хозяйств — 718, из которых по деревням:

по д.Морозовичи — 304, из них безлошадных — 3, до 2 дес. — 40, от 2 до 5 дес. — 122, от 5 до 10 дес. — 98, от 10 до 15 дес. — 28, от 1 и выше — 13 хозяйств;

по д.Славенец - безлошадных нет, от 2 до 5 дес. — 18, от 5 до 10 дес. — 45, от 10 до 15 дес. — 18, от 15 и выше — 1 хозяйство. Всего 82 хозяйства;

по д.Бушевка до 2 дес. — 4, от 2 до 5 дес. — 65, от 5 до 10 дес. — 68, от 10 до 15 дес. — 27, от 15 дес. и выше — 10 хозяйств, безземельных — 4 хозяйства, а всего 178 дворов;

по с.Уборки до 2 дес. — нет, от 2 до 5 дес. — 9, от 5 до 10 дес. — 11, от 10 до 15 дес. — 1 хозяйство. Всего 21 двор;

д. Буда-Кошелевская, всего 119 хозяйств, из них: безземельных — 12, до 2 дес. — 4, от 2 до 5 дес. — 48, от 5 до 10 дес. — 32, от 10 до 15 дес. — 18, от 15 и выше — 3 хозяйства;

хутор Боровая Корма, всего 10 хозяйств, из них до 2 дес. — 3, от 5 до 10 дес. — 5, от 10 до 15 дес. — 2 хозяйства;

всего лошадей учтено по сельсовету, которые связаны с сельским хозяйством — 1095, из этих 718 хозяйств имеется 27 безлошадных хозяйств, однолошадных — 360, двухлошадных — 271, трехлошадных — 50, многолошадных — 10 хозяйств, коров учтено по сельсовету — 1363, рабочих волов — 2;

еврейского населения в сельсовете 62 семейства, из которых 21 семья не трудовая, которая занимается частной торговлей, остальные — трудовые;

железнодорожников, которых обслуживает сельсовет — 21 семья. Итого в сельсовете 801 хозяйство.

По национальности в сельсовете белорусов — 700 семей, русских — 27, евреев — 62, поляков — 2 семьи и немцев — 10 семей.

Рождений всего 125, из них мужчин — 66, женщин — 59.

Смертей 27, из них мужчин — 13, женщин — 14.

Браков — 32, разводов — 8.

Имеется кредитная кооперация. Кредитование населения выражается в сумме 2427 руб. на 67 хозяйств, что является недостаточным. Пайщиков — 70 человек.

Работает потребобщество с двумя лавками в Б.Кошелевской. Кооперировано населения 165 человек, кроме того граничащие деревни с Уваровичской вол. состоят там пайщиками Уваровичского кредитного общества...

Президиум сельсовета.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 782. Воп. 1. Спр. 63. Л. 78—79.

Падрыхтавала Т.А.Бяланава.

Юнацтва камсамольскае

З успамінаў І.Я.Кандраценкі, былога сакратара Царкоўскай камсамольскай ячэйкі

Нарадзіўся я ў 1903 г. У момант Лютаўскай рэвалюцыі мне было 14 гадоў. Памятаю, што летам 1917 г. вярнуліся з фронту жыхары нашага сяла і прывезлі шмат новага ў наша жыццё. Вельмі часта былі сходы грамадзян нашага сяла па прычыне станаўлення ўлады. Сяло Царкоўе тады знаходзілася на тэрыторыі, не акупіраванай немцамі. У с. Царкоўе стаяў атрад чырвонаармейцаў-пагранічнікаў. Зімой 1918 г. быў выгнаны памешчык Гінтаўт і размеркаваны яго зямля, інвентар і жывёла сярод беднякоў сяла. З'явілася шмат літаратуры, якая тлумачыла палітыку савецкай улады, брашуры Дзям'яна Беднага з крытычнымі вершамі ў адносінах да кулакоў, папоў, памешчыкаў і капіталістаў. З памешчыцкага маёнтка кнігі былі перададзены ў хату-чытальню.

У 1918 г. наша моладзь была мабілізавана ў Чырвоную армію, а старэйшыя працавалі ў працарміі па нарыхтоўцы дроў. Арганізавалі лікбезы. Да гэтай працы прыцягнулі мяне і Грычанкова Аляксея. Я быў настаўнікам у в. Лазова. У Царкоўі ізбачом быў Елісееў Яфім, а потым стаў я. Пад хату-чытальню занялі адзін пакой у кватэры папа. Хата-чытальня стала цэнтрам асветы грамадзян.

У канцы 1921 г. прыбыў у наша сяло інструктар па камсамолу тав. Лук'яненка. Ён сабраў моладзь у хаце-чытальні і арганізаваў ініцыятыўную групу камсамола. Я быў выбраны яе сакратаром. Неўзабаве вясной 1922 г. с. Царкоўе наведаў інструктар Бабруйскага акругкома камсамола тав. Петрушэня і з ініцыятыўнай групы арганізаваў камсамольскую ячэйку. Я

быў выбраны сакратаром ячэйкі, адначасова працаваў і ізбачом.

Першымі ўступілі ў камсамол Елісееў Рыгор Емяльянавіч, Елісееў Пётр Емяльянавіч, Ільюшчанка Цімафей Цітавіч, Кандраценка Іван Яфімавіч, Кандраценка Трафім Яфімавіч, Куцапалаў Міхаіл Піліпавіч, Лебедзеў Пётр Іосіфавіч, Луфераў Міна Міхайлавіч, Макараў Рыгор Рыгоравіч, Макараў Мікалай Пятровіч.

Летам 1922 г. уступілі ў камсамол хлопцы з вёскі Майсееўкі — Барашкоў Арсенцій Іванавіч, Глыкін Калман, Глыкін Шмэрка і Іван Юркоў. Камсамольская ячэйка задавала тон усёй працы на сяле. Настаўнікі Блістанаў і Рэуцкі дапамагалі камсамольскай арганізацыі ў пастаноўцы спектакляў і ў антырэлігійнай прапагандзе. Мы занялі ўвесь папоўскі дом. У ім мы абсталявалі залу, дзе ставілі спектаклі, слухалі лекцыі і праводзілі танцы.

Працаваў камітэт беднаты, які ўзначаліў камсамолец Кандраценка Трафім і беспартыйны Кабадзейцаў Сяргей Ерамеевіч. Беспартыйныя актывісты Макараў Лазар Фёдаравіч, Елісееў Аверкій Емяльянавіч, Елісееў Яфім Емяльянавіч, Яўмененка Аўраам і Ільюшчанка Аляксандр Якаўлевіч аказвалі вялікую дапамогу ў правядзенні розных кампаній.

Прыязджаў у нашу ячэйку і сакратар акругкома камсамола тав. Драмчук. Пры ім было арганізавана першае ў вёсцы камсамольскае вяселле, г.зн. вяселле без папа, жаніўся камсамолец Кандраценка Трафім Яфімавіч з Якавенка Ганнай. Пасля гэтага камсамольскія вяселлі былі частымі з'явамі ў жыцці сяла.

Жыццё ў камсамоле кіпела і шмат дапамагала моладзі знайсці свой жыццёвы шлях.

Запісаў У.Я.Райскі.

Гісторыя газетным радком

З публікацый у газетах 1920-х гадоў*

ХОРОШИЙ ПОЧИН

Дер. Липы Дудичской вол. Гомельского у. приступила к усердному проведению шестидневной топливной кампании.

За 1 и 2 июня вывезено более 1500 шпал на станцию Уза. Расстояние от места вывозки до станции 23 версты. Таким образом, почин сделан и сделан успешно. Нет сомнения, что крестьяне д. Липы выполнят с честью свой долг перед республикой.

Крестьяне всей Гомельской губ. должны последовать примеру липовцев, памятуя, что если будет топливо, то будут плуги, серпы, косилки, одежда, обувь, соль и пр.

Крестьяне Л.Розенков, И.Вишенков.

Новая деревня. 1921. 18 чэрв.

Гомельское райотделение насчитывает в настоящее время 38 товарообменных пунктов (многолавок). С 10 из них уже заключены договоры на доставку 1275 пуд. муки или продуктов ее заменяющих (картофель, крупа, пшено, масло) в обмен на предметы городского и фабрично-заводского производства. Приемка назначена с 15 июня по 1 июля с.г. Благоприятно начался уже товарообмен в волостях: Уваровичской, Носовичской, Гомельской. В Дятловичской вол. хорошо идет заготовка масла, которое передается губздраву. Кроме своего товарообменного фонда, райотделение получило в свое распоряжение для обмена плуги сухиничского типа от коллектива рабочих завода «Двигатель», а также мебельные и другие изделия для деревни (стулья, табуреты, столы, кровати, сундуки, железные ведра, заслонки, жаровни, самоварные трубы, изделия столярно-строительные, как-то: рамы, двери и т.д.).

В настоящее время ведутся переговоры с губкустпромом о выдаче кирпича, для обмена в деревнях. Сейчас приступлено к постройке в Гомеле на Советской площади большого балагана длиной свыше 60 арш. экспонатно-показательного и практически обменного характера. В этом балагане будут выставлены образцы товаров и предметов, назначаемых для товарообмена. Будут развешены по стенам плакаты и лозунги, краткие пояснения порядка и техники товарообмена и одновременно там же будет проводиться и самый обмен, причем часть продуктов в известных случаях будет отпускаться за деньги. В упомянутом балагане будет отведено место и

*Захаваны стыль і арфаграфія артыкулаў.

для особого агитационно-инструкторского отдела, где инструкторами и сотрудниками райотделения совместно с сотрудниками губполитпросвета будут даваться подробные объяснения.

Новая деревня. 1921. 22 чэрв.

ЕЩЕ ОДИН УСПЕХ

Число рабочих и служащих.

Наспенский завод «Возрождение» приступил к работе после произведенного на нем ремонта 1-го ноября 1921 г. В настоящее время на заводе работает 400 штатных рабочих и более 100 рабочих из местных крестьян, работающих периодически, по мере надобности, по подвозке сырья, топлива и прочих материалов, а также на вспомогательных работах. Кроме того, завод обслуживают 24 человека административно-технического состава, 4 учителя и 2 лица медицинского персонала.

Производительность.

Завод переведен на хозяйственный расчет. Заработная плата построена на сдельщине. Это резко повысило производительность завода: прежде Наспенский стеклозавод вырабатывал в среднем 450 ящиков в месяц, теперь только за один месяц своей работы он выпустил около 900 ящиков стекла.

Если принять во внимание, что задание центра определялось для Наспенского стеклозавода в 600 ящиков в месяц — приходится признать наличие крупного успеха, превышающего самые смелые ожидания.

Ноябрьская выработка Наспенского стеклозавода, составляя 150 проц. задания центра, одновременно приближается к норме выработки довоенного времени.

Качество фабриката.

Фабрикат (оконное стекло) вырабатывается хорошего качества и был бы еще лучше при наличии соды и лучшей закалки стекла, так как температура закаливающего газа низка, а поднять ее нет возможности вследствие плохого качества дров, имеющихся в настоящее время на заводе.

Выгодность эксплуатации завода.

Наспенский стеклозавод не только вполне окупает все затраты на производство, но дает государству довольно большую прибыль и, вообще, представляет собой одно из выгоднейших предприятий ГСНХ.

Запасы материалов и топлива.

Главные материалы на заводе имеются в незначительном количестве. Топлива (дров) имеется приблизительно на два месяца. Принимаются срочные меры к пополнению сырья и топлива.

Хозяйственное оборудование завода.

Отдаленность завода от снабжающих органов железной дороги вынуждает его держать большое и громоздкое хозяйство. Обоз стеклозавода в полном порядке: лошади сеном обеспечены на два месяца, овсом — на несколько меньшее количество времени. При заводе имеется лесопилка: кряжей для работы имеется на один месяц. Мельница, бывшая до 1-го декабря в ведении Е.П.О., с 1-го декабря перешла к заводу. Что касается противопожарных мер, то бочки заказаны и ведутся переговоры с коммунальным отделом о приобретении насосов.

Один из лучших в губернии.

Таков, в самых кратких чертах, обзор деятельности Наспенского стеклозавода «Возрождение». Благодаря новому экономическому курсу, повышению заработной платы (с 400 000 до 1 000 000 р. в среднем в месяц), создавшейся заинтересованности рабочих в производстве, благодаря энергии, труду и гражданской сознательности лиц, участвовавших в восстановлении завода, последний из полуразрушенного превратился в одно из первых предприятий Гомельской губернии и дает Республике солидную прибыль. Этот, еще один, успех на трудовом фронте лишний раз подчеркивает правильность нового курса, взятого в деле восстановления нашей промышленности.

Полесская правда. 1921. 25 снеж.

А ВСЕ-ТАКИ ЗАВОД ПОСТРОИМ!

После разрушения бурей завода рабочие на общем собрании с горечью отмечали: «У нас — общий покойник», — и бодро заявили:

— Упорный труд — лучший доктор. Он воскресит мертвеца. Постигло несчастье, но вешать носы не станем, — завод построим.

Больше недели в кабинетах обсуждался вопрос, «как быть», и это время было мучительным для каждого наспенца. Судили, рядили и, наконец, все же решили: «Строим завод».

5 ноября загудел призывный гудок, громкий и радостный. Истощенные силенки рабочих снова напряглись. Собрались труженики и задумались: как начать разборку обломков завода?

Разбились на группы, вооружились топорами, ломами, «кошками» и закипела работа дружная, неустанная. Три дня только потребовалось для разборки рухнувшего здания, на постройку которого было затрачено 3.000 рабочих дней.

Восстановлением предприятия занимались и крестьяне окрестных сел. Узнав о начале работ по постройке, они явились на помощь. Некоторые из них запрягли даже по пять лошадей и, несмотря на осеннюю слякоть и бездорожье, подвезли необходимый лесной материал.

— Раз нужно, так мы готовы, — заявили крестьяне.

12 ноября началась постройка завода.

— Помните, товарищи, что я обещал губсовнархозу окончить постройку к сроку, — сказал рабочим заведующий по восстановлению предприятия.

— Построим, — единодушно ответили наспенцы.

И действительно, не прошло месяца, как «мертвец» начал оживать. Уже поставлены столбы, затянуты прогоны, заготовлены и установлены стропильные ноги. Словом, работа по плотничьей части выполнена на 65—70 проц. и по кладке ванной печи — на 60—65 проц. Ежедневно работает до 300 человек, не взирая на непогоду. Главным тормозом в работе является недостаток средств. «Врач» хорош, но нет «лекарства». Раббанк и ГСНХ, помогите наспенцам! Затраченные вами деньги завод окупит потом сторицей.

Рабкор Бывалый.

Полесская правда. 1923. 11 снеж.

УШЕЛ И ЛАДНО

По причинам так-таки нам не известным ушел на покой без пенсии старый директор гр. Элькинд. Шутка ли просидеть 25 лет в Наспе и иметь дело с рабочими стекольщиками!

Дело было так. Ячейка и фабком предложили директору отчитаться на общем собрании рабочих о проделанной им работе.

Ловко, по-директорски, как и свойственно старым спецам, гр.Элькинд со слезливой подмазкой рабочих начал перечислять те работы, какие им были проделаны: Нам удалось добиться восстановления завода. Нам удалось сделать то-то и избежать того-то. А в заключение от «господа» всего хорошего:

— Желаю Вам счастья. Я устал, больше служить невмоготу.

По докладу выступал целый ряд рабочих, которые сурово обошли «благие пожелания» спеца, а указали на множество дефектов в его работе. Рабочие спрашивали гр. Элькинда, почему это, когда он был душеприказчиком у хозяина-эксплуататора, дело шло хорошо, почему при хозяине-рабочем оно стало убыточно. Диву дался старый спец тому, что рабочий так вырос, став на голову выше его самого. Не находя оправдания, он снова рассыпался в благодарностях перед рабочими. По докладу была вынесена ничего не говорящая резолюция: «Принять к сведению». Это показывает, как была безразлична должность директора для рабочих завода.

Рабкор Бывалов.

Полесская правда. 1923. 30 снеж.

РАБОЧАЯ ЖИЗНЬ

БЕЗ ДРОВ

До сентября рабочие строили завод бесплатно. Затем было заключено тарифное соглашение и установлена плата. Плата эта выражается в трех товарных рублях для 1-го разряда, а тарифная сетка существует только до 5-го разряда включительно. Находясь в тяжелом материальном положении, рабочие были рады и тому, что дождались времени, когда им будут выдавать жалованье. На отдельные невыгодные пункты договора они не обратили внимания или выпустили их из виду.

Рабочие испытывают большие лишения. Работая с 8 утра до 5 часов вечера, наспенцы, возвратясь домой, должны думать о топливе для своей квартиры: где взять дров?

Идти в лес опасно — поймает лесничий или сторож, оштрафует. Ну и приходится брать дрова ночью тайком со склада. Между тем, администрация и прорабы над этим вопросом головы не ломают. Они берут в заводском дворе казенную лошадь и на глазах у всех наваливают себе воз дров. Возмущаются рабочие: «Почему им можно, а нам нельзя». Обращались за

разъяснением к заведующему работами по восстановлению завода, и тот ответил, что в тарифном соглашении ничего не сказано о снабжении рабочих топливом.

Если так, то почему же пользуются дровами администрация и прорабы? И много раз поднимали рабочие вопрос о дровах, даже ходатайствовали перед ВЦИК об отводе для них в лесу лесосек, но результатов до сих пор нет. Когда же перестанет наспенца тревожить мысль о топливе? Когда же он перестанет быть ночным посетителем ночных складов?

Рабкор Дровянник.

Гомельская правда. 1924. 17 лют.

БЬЕМ ЧАСТНЫЙ РЫНОК

До прибытия нового заведующего Уваровичское ЕПО работало вяло. Не было квалифицированного кооператора. Товары отпускались пайщикам по ценам дороже рыночных. Оборот был незначителен. Местные частные торговцы успешно конкурировали с кооперативом.

Теперь работа ЕПО понемногу налаживается. Имеется довольно большой выбор товаров. Цены на них ниже рыночных на 5—7 проц. Открытая недавно местная лавка торгует бойко.

Частные местные торговцы не выдерживают конкуренции. Прежде они продавали мясо по 25—30 коп. за фунт, сейчас же вынуждены держать равнение по кооперативному, где мясо стоит 10—11 коп. фунт.

Полесская правда. 1924. 22 ліст.

ВСЕЙ ДЕРЕВНЕЙ В КООПЕРАЦИЮ

В д. Кленовице (Уваровичская вол., Гом. у.) — 96 дворов. Побочных заработков у деревни нет. Поднимать же хозяйство необходимо. Путь один — кооперация. И стали кленовинчане кооперироваться. 26 хозяйств вступило в сельхозкооперацию, 20 — в потребительскую и 20 организовали кооперативную артель обручников. Таким образом, из 96 дворов уже кооперировано 66. Очередь за остальными.

С.Корба.

Полесская правда. 1927. 7 студз.

Падрыхтавала Т.А.Бяланава.

Не знікай, крыніца жыватворная...

В уникальном школьном музее деревни Гавли, что в Буда-Кошелевском районе (организовал его в свое время бывший директор школы Николай Алексеевич Казаков, ныне координатор общества Кирилла Туровского), хранится экземпляр газеты «Правда» за 26 мая 1917 года.

В рубрике «Рабочая жизнь» помещена любопытная информация «Конфискация завода»: «Рогачев. Рабочие стекольного завода наследников Курындина, Недойской волости, число которых доходит до 400, арестовали администрацию и вступили во владение заводом и миллионным имуществом».

О каком заводе идет речь? Документы, хранящиеся в Государственном архиве Гомельской области, рассказывают об известном стеклозаводе, который существовал вблизи деревни Гавли до 1923 года.

До революции этот завод принадлежал купцу Курындину, почетному гражданину Могилевской губернии. Продукция предприятия переправлялась по Днепру до Черного моря, а оттуда — за рубеж.

После революции все ранее принадлежавшее купцу перешло в руки губернского Совета народного хозяйства. В 1919 году землю там разделили по 140 квадратных саженей каждому рабочему и его семье. Завод назвали «Возрождение». Рабочий коллектив предприятия остался прежним, на 1 октября 1922 года трудилось там 450 человек. Директором был назначен В.Ф.Май, заместителем — А.Г.Бабенчук, управляющим — О.О.Белоус, техническим руководителем — С.Н.Давыдов.

На заводе изготавливалась стекольно-фаянсовая продукция, которая распределялась практически во все братские республики. Ведь в то время действовал, аналогичный этому, только Лисичанский завод в Донбассе.

Со всех уголков Советского Союза поступало на железнодорожную станцию Солтановка сырье: мел, сульфат, огнеупорная глина, песок. Затем все это перевозилось на завод.

Рабочий коллектив предприятия жил теми же заботами, что и вся страна. Напри-

мер, в протоколе совместного заседания правления стеклозавода и профсоюза от 21 октября 1920 года зафиксировано решение о проведении недели помощи фронту. Проявилась она в следующем: заводоуправление отпустило два ящика оконного стекла для застекления окон в лазаретах города Рогачева. Там находились на излечении раненые и больные красноармейцы.

Пошли в ход и двадцать пудов пшеницы, имевшейся на заводском складе. Зерно было смолото на своей мельнице и использовано для сухарей. Рабочие высушили их, упаковали в ящики с надписью: «Наспенские рабочие. Больным и раненым красноармейцам».

В рабочем поселке помимо стекольного был и лесопильный завод. Здесь, в первую очередь, изготавливалась тара и упаковочный материал для стекла. (Кстати, для упаковки использовали и отходы производства заводской мукомольной мельницы.) Кроме того, вырабатывались стройматериалы для возведения и ремонта зданий и жилых домов.

Баня, прачечная, магазин — вот перечень тогдашнего «соцкультбыта» стеклоделов. Была в поселке «гутняков» конюшня. Кони использовались для перевозки грузов и земледельческих работ.

В местном училище обучали стекольному делу. Учащиеся обеспечивались одеждой, обувью, имели бесплатную столовую.

Так четко, налаженно шла жизнь в рабочем поселке до зловещего осеннего дня 1923 года. Последствия непродолжительного урагана оказались трагическими.

Вот что зафиксировал акт, приобщенный к протоколу заседания ответственных рабочих и технического персонала «Возрождения»:

«25 октября 1923 года в 18 часов 30 минут пронесшимся над поселком циклоном необыкновенной силы были обрушены все здания стеклозавода, а также были нанесены повреждения в окружающей местности: снесены кровли с домов, вырваны деревья в лесу, разметаны стога сена, наклонена почти на 30 градусов стоящая железная труба, высотой трех сажень, причем ее каменный фундамент также свернут на сторону».

Губисполком и руководство стеклозавода планировали восстановить завод,

І.Р.Дымнікаў.

ликвидировать последствия стихии. Но это стоило для государства огромных денег. И вопрос был снят с повестки дня. Люди, лишенные работы, разъехались, а рабочий поселок и все, что осталось от завода, оказалось заброшенным и со временем разрушилось.

Однако, как свидетельствуют документы, многие высококлассные специалисты стекольного завода «Возрождение» стали своеобразным костяком стеклозавода в Костюковке, строительство которого было начато в 1930-м.

Строил новый завод, к примеру, Иван Григорьевич Дымников, организатор выступления стеклоделов, о котором писала «Правда» в 1917 году.

В 1920-м герой революции в соответствии с постановлением президиума ЦИК БССР был удостоен памятной ленты «Герой труда».

Родился Иван Григорьевич Дымников в Смоленской губернии, в бедной многодетной семье. У матери, Марфы Ивановны, было 15 детей (от «хорошей» жизни в живых осталось семеро). С юных лет Иван Григорьевич включился в революционную борьбу. Впоследствии вспоминал, как беспощадно избивали его урядники в дореволюционные годы. От природы И.Г.Дымников был человеком мощного сложения, 13-пудовый мешок с легкостью перебрасывал через забор. На Наспенском стеклозаводе, что в Буда-Кошелевском районе, он дул «халявы» (бутылки). Из них тогда и получали листы стекла...

После стихийного бедствия и развала завода Дымников работал на стеклозаводе «Труды», что на станции Дретунь, с 1933 — на строительстве, а с пуском — на основном производстве стеклозавода в Костюковке...

Мастер вертикального вытягивания стекла И.Г.Дымников всю свою сознательную жизнь отдал любимому производству. В начале 50-х возглавлял первую на заводе стахановскую сквозную бригаду, которая объединяла в себе все звенья стекольного производства, достигла рекордных показателей выработки.

И.Г.Дымников щедро делился своим опытом, воспитал таких мастеров-фуркистов как Ф.М.Груздов, В.И.Помозов, И.А.Хващевский, П.А.Голиков и другие.

...На Буда-Кошелевщине, у деревни Гавли, на месте бывшей здесь гуты стоит скромная кирпичная пирамидка, памятник высококлассным умельцам стеклодувам, прадедам и прапрадедам сегодняшних мастеров этой древней профессии на Гомельщине...»

Татьяна Беланова, Тамара Крюченко.

Гомельская праўда. 1990. 17 жн.

У гады калектывізацыі

Красавік 1927 г. Менавіта ў гэты час IV з'езд Саветаў СССР узяў курс на калектывізацыю сельскай гаспадаркі. Кааперыраванне бядняцкага і серадняцкага сялянства стала галоўнай дзяржаўнай аграрнай палітыкай. За кароткі час трэба было на добраахвотных асновах аб'яднаць у кааператывы ўсе ці большасць аднаасобных сялянскіх гаспадарак.

Між тым, вопыт дзейнасці калектыўных гаспадарак за мінулыя гады ў раёне не стаў прыкладам для пераймання. Слабыя, нізкатаварныя і малаэфектыўныя эканамічна — такія гаспадаркі не атрымалі прызнання сялян. Асноўным таваравытворцам па-ранейшаму заставаўся селянін-аднаасобнік.

На 1927 г. у раёне ў сярэднім на адну калектыўную гаспадарку прыпадала 10 — 11 двароў, да 90 дзес. ворнай зямлі, 10 — 12 галоў буйной рагатай жывёлы, некалькі коней, фурманак, плугоў і барон, іншай маёмасці. Ва ўмовах рэгіёну яны былі нізка рэнтабельныя, заставаліся на датацыі дзяржавы і таму былі мала папулярныя ў сялян.

Да канца 1927 г. на Буда-Кашалёўшчыне ў асноўным завяршыліся землеўпарадкавальныя работы. Сялянскія ўгоддзі складалі да 73% усёй ворнай зямлі. У севазвароце пераважала трох- і чатырохполле.

Асноўны даход аднаасобная сялянская гаспадарка атрымлівала за кошт паляводства. Захавалася адыходніцтва.

Ва ўмовах НЭПа асноўным рэгулятарам цэн на сельскагаспадарчыя прадукты заставаўся рынак. Гэта аблягчала сялянам выконваць адзіны сельскагаспадарчы падатак, які вылічваўся з памераў ворнай зямлі. У ворны клін уключаліся азімы і яравы палетак, папарны палетак, прысядзібны ўчастак і г.д.

У раёне на адну гаспадарку прыпадала ў сярэднім да 5 дзес. ворнай зямлі і больш за 2 дзес. сенакосаў. Дзейнічала традыцыйна-тыпавая для акругі структура пасеваў. І па суадносінах культур паляводства рэгіён мала чым адрозніваўся ад сярэдняга па акрузе. Па суадносінах нязбожжавых і збожжавых культур узровень 1916 г. (адпаведна 18,2% і 81,8%) так і не быў дасягнуты да канца 1927 г. Паскорана развіваліся пасевы нязбожжавых культур (бульба, лён, каноплі). Палявы і лугавы палетак займалі да 7% пасяўных плошчаў. Да таго ж у раёне 2,66% гаспадарак наогул не мелі жывёлы, без кароў былі 4,08, без рабочай жывёлы каля 10% гаспадарак.

Па аснашчанасці прыладамі працы і цяглавай сілай Буда-Кашалёўшчына значна ўступала і па сярэдніх паказчыках па акрузе і большасці іншых раёнаў. Так, калі ў Гомельскай акрузе адна малатарня прыпадала на 48 двароў, арфа і сарціроўка — на 31, саламарэзка — на 55, сеялка — на 1095, касілка — на 1296, а жняярка — на 3126 двароў, то на Буда-Кашалёўшчыне гэтыя паказчыкі былі значна ніжэйшыя (адна малатарня — на 175 двароў, сарціроўка — на 94, саламарэзка — на 192, сеялка — на 1417, касілка — на 7093 двары).

Да 1928 г. Буда-Кашалёўскі раён у сучасных межах меў 12 сельскіх Саветаў, 277 населеных пунктаў, тут пражывала 39 185 чалавек.

Большасць пасёлкаў, сёл і вёсак раёна былі невялікія. У 1929 — 1930 гг. у Буда-Кашалёўскім раёне да 5 двароў мелі 59 населеных пунктаў, па 6 — 10 двароў — 39, па 11 — 50 двароў — 91, па 51 — 150 двароў — 15, па 151 — 300 двароў — 11, па 301 — 500 двароў — 1 населены пункт. Да 10 жыхароў мелі 26, па 10 — 20 жыхароў — 24, па

21—50 жыхароў — 48, па 51—100 жыхароў — 52, па 101—200 жыхароў — 31, па 201—300 жыхароў — 15, па 301—500 жыхароў — 7, па 501—1000 жыхароў — 11 і больш за 1000 жыхароў — 8 населеных пунктаў.

Зямельныя надзелы сялян у раёне мала чым адрозніваліся па ўрадлівасці і ўраджайнасці. Да 1928 г. большасць гаспадарак былі серадняцкія не толькі па памерах надзелаў, але і па таварнасці. Такія гаспадаркі ахвотна аб'ядноўваліся ў тыя формы кааперацыі, якія не закраналі самастойнасці іх асабістай гаспадарчай дзейнасці. Гэта было законам.

Раён адносіўся да аграрна-перанаселеных рэгіёнаў Гомельскай акругі. Мясцовыя ўлады імкнуліся перасяліць сялян на новыя землі, выкарыстоўваючы непрыдатныя і малапрыдатныя ўчасткі ўнутры раёна. Не абышлося без перасялення і ў аддаленыя раёны краіны (Крым, Сібір, Самарскую, Саратаўскую вобласці і інш.). Тым не менш вырашыць праблему малазямелля шляхам перасялення не ўдалося, а пры гэтым былі страчаны вопытныя і ўмелыя гаспадары і спецыялісты.

Малазямелле, галоўным чынам, вымушала сялян займацца і адыходнымі промысламі. На сезонныя работы з сяла выязджалі працаздольныя.

НЭП ствараў умовы паскоранага развіцця кааперацыі, таму што рынак немінуча прымушаў дробных таваравытворцаў аб'яднацца, каб адшукваць магчымасці і спосабы павышаць эфектыўнасць гаспадарання.

У 1928—1929 гг., праз 12 гадоў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, у раёне яшчэ было 10 382 беднякі, якія мелі дробныя гаспадаркі. Амаль 1/3 з іх не маглі самастойна апрацоўваць зямлю, паколькі не мелі сродкаў вытворчасці. Каля 10% двароў не мелі рабочай жывёлы, 17% — ворнага інвентару, каля 5% — кароў, больш за 3% — наогул не мелі жывёлы. Асноўнымі прыладамі працы заставаліся саха, каса, прымітыўны сельскагаспадарчы інвентар. Амаль 2/3 пасяўных плошчаў засявалася ручным спосабам, каля паловы збожжавых касілі сярпамі і косамі, малацілі ланцугамі. Бедната вымушана была здаваць зямлю ў арэнду і наймалася да заможных сялян, або арандавала ў іх жа рабочую жывёлу і інвентар.

Да 1929 г. у раёне развівалася прыватнае прадпрымальніцтва. Былі і аднаасобныя гаспадаркі, даходы якіх перавышалі 200 тыс. руб. у год. Менавіта яны заставаліся асноўным таваравытворцам і далёка яшчэ не вычарпалі свае эканамічныя магчымасці далейшага росту.

Тым не менш да 1928—1929 гг. у цэлым па рэгіёне таварнасць сельскіх гаспадарак заставалася нізкай і ледзь складала 1/4 узроўню даваеннага часу.

Цэнтральнай фігурай на сяле стаў серадняк. Яго галоўным канкурэнтам усё больш і больш станавіліся калгасы і саўгасы. Яны выгадна адрозніваліся ад гаспадаркі серадняка-аднаасобніка значнымі фінансавымі сродкамі за кошт крэдытаў дзяржавы, больш высокай ураджайнасцю за кошт передавой агракультуры ў вытворчасці, выкарыстання сартавога насення, мінеральных угнаенняў і інш.

Аднак адразу аб'яднаць сялянства ў буйныя калектыўныя гаспадаркі было немагчыма.

У канцы 1927 г. у краіне здарыўся крызіс хлебанарыхтовак. Ён узнік як вынік рыначнага хістання цэн. Пачаліся перабоі ў забеспячэнні хлебам. Увялі картачную сістэму размеркавання харчавання. Між тым на рынку свае дзеянні ўзмацнілі спекулянты і скупшчыкі хлеба, якія прадавалі яго ў 4—6 разоў даражэй. Выканком сваім рашэннем у раёне закрыў рынак. Супраць «злосных сабатажнікаў» збожжаздачы прымянілі 72-і артыкул Крымінальнага кодэкса БССР — «за антысавецкую дзейнасць», «за антысавецкую агітацыю». Пакаранне было непазбежна. Хлебныя «лішкі» канфіскоўваліся на карысць дзяржавы, 25% іх прадаваліся праз камітэты сялянскай грамадскай узаемадапамогі для размеркавання беднаце і незаможным сераднякам па нізкіх дзяржаўных цэнах або ў якасці доўгатэрміновага крэдыту.

Прэс санкцый, пазаэканамічных і эканамічных мер супраць прадпрымальнікаў у вёсцы ў 1927—1928 гг. разбурыў «моцныя» гаспадаркі. Надзвычайныя меры нярэдка білі і па серадняку. У краіне пачалося згортванне НЭПа як сістэмы эканамічных адносін.

У канцы красавіка 1929 г. новы закон «Аб сельскагаспадарчым падатку» поўнасцю вызваліў бядняцкія гаспадаркі ад падаткаў, значна скараціў падатак з серадняцкіх

гаспадарак. Асноўны цяжар падаткаабкладання перакладаўся на кулацтва.

Курс на калектывізацыю захоўваў класавы характар падыходу да сялянства. Аб'яднанне беднякоў і серадднякоў у калгасы зрабіла кулака на вёсцы наогул «лішнім» чалавекам. Але менавіта ў гэты перыяд так званы «кулак» быў прадуктам палітыкі НЭПа, быў «нашым кулаком».

Дырэктыва ад 13 лютага 1928 г. патрабавала «...ўзняць на ногі партыйныя арганізацыі...» на ліквідацыю крызісу збожжанарыхтовак, а следам выканкомы атрымалі дырэктыўнае пісьмо «Аб вясенне-пасяўной кампаніі», якое ставіла задачы «...ва ўдарным парадку дабіцца пашырэння пасяўных плошчаў, умацавання існуючых і стварэння новых калгасаў і саўгасаў».

Пачынаўся новы этап рэарганізацыі сельскай гаспадаркі — перавод аднаасобнага аграрнага сектара краіны на рэйкі калектывізацыі.

Сельская гаспадарка — галоўны занятак насельніцтва Буда-Кашалёўшчыны ва ўсе гады. Тэрыторыя раёна мела працяглас́ць з поўначы на поўдзень 40 км, з захаду на ўсход 24 км і плошчу 882 км^2. У выніку раяніравання ў 1927 г. да раёна далучаны Рагінскі сельсавет, які раней належаў Меркулавіцкай, а да 1927 г. — Рагадзецкай воласці.

Паводле перапісу 1926 г., пражывала 35 128 жыхароў, з іх мужчын — 17 132, жанчын — 17 996 чал. Па стану на 1931 г. у Буда-Кашалёўскім раёне мелася 12 сельскіх Саветаў, якія аб'ядноўвалі 277 населеных пунктаў, 6844 двары з насельніцтвам 39 185 чал.

У пераважнай большасці глебы на 60% супясчаныя, каля 1/3 — суглiністыя і на 8% — пясчаныя. Больш за 33 723 га ворыва і 17 102 га сенажацяў, пад выганамі 1091 га. Каля 38% плошчы займалі лясы. Пад дзяржаўнымі лясамі — 22 942 га, пад лясамі мясцовага значэння — 706 га, іншымі — 4522 га.

Прамысловасць у эканоміцы краю істотнага значэння не мела. Працаваў Рагінскі вінзавод, які выпрабляў спірт-сырэц. З верасня і да канца 1933 г. яго было выраблена на 228 235 руб., а ў 1934 г. — на 382 141 руб.

У 1933 г. увайшла ў строй дзеючых інкубатарная станцыя магутнасцю ў 2 інкубатарныя сістэмы «Камунар» ёмістасцю 16 000 яйкамесц кожная. За 1933—1934 гг. калгасы раёна атрымалі больш за 8100 куранят. Інкубатарная станцыя давала электраэнергію раённым установам.

Да саматужнай прамысловасці адносіліся майстэрні смалакурэння, кравецкая, цагельна-гаршковая, санна-палозная, абручная і інш. Дзейнічалі 35 млыноў, у т. л. 3 крупадзёркі, 27 ветраных і 5 нафтамлыноў.

Асобнае месца ў прамысловасці раёна займала чыгуначная станцыя Буда-Кашалёў. Павялічваўся абарот грузапасажырскіх цягнікоў. У 1934 г. ён складаў 9800 саставаў. Калі ў 1931 г. было пагружана 2411 вагонаў, то ў 1934 г. — каля 3000, а выгружана ў 1931 г. — 360, у 1934 г. — больш за 500 вагонаў.

Вядучая роля сельскай гаспадаркі вызначыла вастрыню і марудныя тэмпы карэнных пераўтварэнняў у аграрным сектары.

У 1930-я гады дзяржаўная палітыка ў гэтай галіне, праваднікамі якой у раёне былі Саветы, заставалася класавай.

Да сярэдзіны 1929 г. курс на калектывізацыю ажыццяўляўся асцярожна. А з канца 1929 г. эканамічныя меры стымулявання развіцця сельскай гаспадаркі былі адкінуты. На іх месца прыйшлі метады прымусу.

Яшчэ ў гады НЭПа ў вёсцы сфарміраваўся пласт заможных («моцных») сялянскіх гаспадарак з тымі рысамі, па якіх іх прылічвалі да кулацкіх. Прадстаўніком гэтага пласта сялян быў моцны, руплівы гаспадар-працаўнік, які вырас у выніку афіцыйнай савецкай палітыкі. Аднак яго далейшае развіццё ўвайшло ў супярэчнасць з адміністрацыйна-каманднай сістэмай кіравання і курсам на агульную калектывізацыю.

Пастанова СНК СССР ад 21 мая 1929 г. дазваляла адносіць да кулакоў тых, хто валодаў хаця б адной з наступных прыкмет: сістэматычна выкарыстоўваў наёмную працу для сельскагаспадарчых работ ці на саматужных промыслах і прадпрыемствах, меў у гаспадарцы млын, маслабойку, крупадзёрку, сушылку для садавіны і агародніны ці іншае прадпрыемства з рухавікамі, пастаянна або сезонна здаваў у наём абсталяванне, памяшканне пад жыллё ці прадпрыемства, сельгасмашыны з механічным рухавіком, займаўся гандлем, ліхвярствам, камерцыйным пасрэдніцтвам.

Дзейнічала таксама вызначаная ўрадам так званая «норма працоўнага даходу» ад

вядзення аднаасобнай гаспадаркі. Падаткам абкладаўся даход больш за 565 руб. у год. І здаралася, што пры вызначэнні даходу да кулацкіх гаспадарак адносіліся і тыя, дзе проста прыбытковасць гаспадаркі ад умелага яе вядзення была большая за ўстаноўленую норму.

Да кулакоў у раёне адносілі і сялянадыходнікаў (75% кулакоў — гэта сяляне-адыходнікі). Узнікла сур'ёзнае пытанне аб правільным уліку даходаў селяніна-адыходніка. Пры сельскіх Саветах для вызначэння пунктаў даходу сялянскіх гаспадарак, якія падлягалі падаткаабкладанню, стваралі спецыяльныя камісіі. Працавалі яны пад кіраўніцтвам старшынь сельскіх Саветаў. У іх склад уключалі прадстаўнікоў ад калгаснікаў, беднаты і іншых пластоў насельніцтва.

Як і ў гады грамадзянскай вайны, пры Саветах ствараліся групы беднаты. Хутка раслі іх колькасць, масавасць і актыўнасць. Да пачатку 1930-х гадоў у Буда-Кашалёўскім раёне ў групах беднаты працавала каля 1600 чалавек. Нарады і сходы праводзіліся з удзелам актыву з серадлякоў. Прынятыя сумесныя рашэнні праводзіліся ў жыццё праз Саветы, мясцовыя зямельныя, фінансавыя і іншыя органы.

У студзені 1930 г. у раёне прайшоў 1-ы з'езд дэлегатаў ад калгасаў і ініцыятыўных груп. Галоўнае пытанне яго — «Аб калгасным будаўніцтве». Рэзалюцыя з'езда заклікала «...выявіць кулацка-варожы элемент, які супраць калгасаў, і выслаць яго з раёна».

Большасць насельніцтва Буда-Кашалёўшчыны да высялення кулацтва адносілася адмоўна. Мелі месца выпадкі супраціўлення высяленню. Нярэдка супраць высялення выступалі былыя партызаны, удзельнікі рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. У вёсках на падпісных лістах супраць высялення шэрага кулацкіх сем'яў стаялі подпісы членаў сельскіх Саветаў.

Сяляне патрабавалі ад сельсаветаў удакладняць, каго і за што вырашана высяляць. На агульных вясковых сходах гучалі такія заявы: «...нікога высяляць не трэба. У нас кулакоў у вёсцы няма».

Назіраліся масавыя ўцёкі кулакоў, што падлягалі высяленню. Жонкі кулакоў, асабліва выхадцы з бядняцкіх сем'яў, патрабавалі разводаў з мужамі, якіх высялялі.

Выкарыстанне надзвычайных мер стала практыкай. Жорсткія меры прымяняліся і да тых кіраўнікоў на месцах, хто праяўляў «мяккасць», «прымірэнства», «зрастанне з кулацтвам» і г. д. У гэты ж час прэса заклікала: «За скрыўленне класавай лініі — пад суд!»

Надзвычайныя меры і сілавы стыль сталі метадамі работы кіраўніцтва, не маглі не выклікаць стыхійнага пратэсту сялянства. Асабліва балюча была ўспрынята пастанова Калгасцэнтра СССР да пачатку вясенне-пасяўной кампаніі 1930 г.: правесці абагуленне жывёлы, якая належала калгаснікам. Прадпісвалася абагуліць кароў — 100%, свіней — 80%, авечак і коз — 60%.

Жывёла і інвентар абагульваліся без грашовай кампенсацыі, а ўнесены ў калгас пай не павялічваўся пры размеркаванні прадуктаў. Разумеючы гэта, многія сяляне, перш чым уступіць у калгас, сталі забіваць частку жывёлы. Вясной 1930 г. у раёне значна скараціўся статак. Пастанова ЦВК і СНК СССР ад 3 сакавіка 1930 г. «Аб мерах супраць драпежніцкага зарэзу жывёлы» забараняла да 31 снежня 1931 г. зарэз племянной скаціны і маладняку, буйной рагатай жывёлы, бараноў і кныроў. Парушальнікам пагражаў штраф у памеры дзесяцікратнага кошту забітай жывёліны. Для кулакоў пакаранне было яшчэ больш суровае — канфіскацыя жывёлы з прыцягненнем гаспадароў да крымінальнай адказнасці. Суд пазбаўляў вінаватых волі тэрмінам на 2 гады з высяленнем з гэтай мясцовасці ці без яго.

У снежні 1930 г. адказнасць яшчэ больш узмацнілася. Прымянялася канфіскацыя маёмасці і зямлі, пазбаўленне волі да 3 гадоў. Становішча ў вёсцы абвастралася.

Пагрозы раскулачвання выкарыстоўваліся мясцовымі работнікамі і як сродак націску на серадняка з мэтай уцягвання ў калгасы. Уласнасць раскулачаных уключалася ў якасці паявога ўзносу беднаты пры ўступленні ў калгас. На 1 кастрычніка 1930 г. большая частка асноўных фондаў калгаснай уласнасці складалі сродкі, атрыманыя ад раскулачвання мясцовых сялян. Так спрашчалася правядзенне ў жыцце «генеральнай лініі» на калектывізацыю.

Саветам на месцах дазвалялася прымаць усе, на іх погляд, неабходныя меры барацьбы з кулацтвам, аж да поўнай канфіскацыі маёмасці кулакоў і высялення іх за межы

раёна, края, вобласці. Канфіскаваная маёмасць перадавалася ў непадзельны фонд калгасаў у якасці ўзносаў беднаты і батракоў, якія ўступалі ў калгасы. Справа даходзіла да таго, што тым, хто не жадаў уступаць у калгасы, спыняўся продаж солі, газы, мануфактуры, пускаліся ў ход актыўныя пагрозы арыштамі і высяленнем, сяляне незаконна пазбаўляліся права голасу (у 1929 г. — 512 чал., у т.л. 355 чал. «...за эксплуатацыю чужой працы»). Часта не раздзялялі сераднякоў і кулакоў, гвалтам абагульвалі маёмасць, абразалі ў сялян зямельныя надзелы і г. д.

Дзяржава спрабавала весці з сялянствам нераўнапраўныя гандлёвыя адносіны. Яна імкнулася скупляць у сялян збожжа і іншыя прадукты па гранічна нізкіх цэнах, прадаваць прамысловыя тавары па значна ўзнятых цэнах. Сяляне ж не жадалі прадаваць дзяржаве збожжа па так званых «цвёрдых» цэнах, што стала разглядацца як сабатаж.

У пачатку 1930-х гадоў наогул узмацнілася работа Саветаў па вырашэнні гаспадарчых і сацыяльна-эканамічных праблем. У складзе райвыканкома былі арганізаваны вытворча-галіновыя секцыі: раённая кантрольная інспекцыя, аддзелы гандлю і аховы здароўя, планава-статыстычны, інспекцыі па працы і інш. Тут працавалі спецыялісты ўсіх галін гаспадаркі.

Ужо ў 1-й палавіне 1930-х гадоў агульны аб'ём бюджэту ў раёне ўзрос амаль у 8 разоў. Калі на пачатак 1930 г. ён складаў усяго 153 тыс.руб., то ў 1934 г. — 1 226 625 руб. (у 1930 г. на душу насельніцтва прыпадала 4 руб. 37 кап., у 1934 г. — 34 руб. 48 кап.).

Сельскім Саветам сталі выдзяляць самастойныя бюджэты. Важнай крыніцай фінансавання і састаўной часткай бюджэтаў сельскіх Саветаў былі сродкі, атрыманыя ад дадатковага падатку па самаабкладанні сялянскіх гаспадарак. Памер яго складаў амаль 35% агульнага сельгаспадатку. За іх кошт сродкі выдзяляліся на рамонт школ, будаўніцтва і рамонт мастоў, дарог, на культурныя мерапрыемствы.

Саветы размяркоўвалі фінансаванне галін гаспадарак, кантралявалі выдзяленне крэдытных і іншых матэрыяльных сродкаў. Такім чынам, у руках Саветаў канцэнтраваліся эканамічныя рычагі рэгулявання развіцця раёна. І ва ўмовах, калі курс на хуткія тэмпы калектывізацыі сельскай гаспадаркі стаў галоўным у дзейнасці Саветаў, а эканамічныя меры развіцця былі заменены прымусовымі, узмацніўся адміністрацыйны ціск зверху на кіраўніцтва мясцовых Саветаў, у раёне ўзрасла сацыяльная напружанасць.

У пагоні за тэмпамі калектывізацыі многія актывісты не саромеліся ў выкарыстанні сродкаў. У вёсках старшыні сельсаветаў і сакратары парт'ячэек, робячы падворны абход сялянскіх гаспадарак, гаварылі:

— Або ўступіш у калгас, або мы абложым цябе падаткам у індывідуальным парадку.

У 1929 — 1930 гг. расклад гаспадарак па сельскагаспадарчаму падатку ўключаў: 2080 двароў, вызваленых ад падатку; 3815 двароў з падаткам без працэнтнай надбаўкі; 123 двары, якія абкладаліся сельгаспадаткам з працэнтнай надбаўкай; 24 двары з індывідуальным падаткам.

Абкладанне індывідуальным падаткам праводзілася не толькі грашыма (да 150 руб.), але і натурай (збожжам у памеры 10 — 100 пудоў). Такія меры запалохвання падзейнічалі. Калі ў 1929 г. у раёне было 19 калгасаў, якія аб'ядноўвалі 510 гаспадарак, што складала 7,8% ад агульнай колькасці сялянскіх двароў, то ў пачатку 1930 г. адпаведна — 21 калгас, 975 двароў, або 14,8%.

Але ўжо на другі дзень пасля апублікавання ў друку артыкула І.В.Сталіна аб добраахвотнасці ўступлення ў калгасы з іх выйшла амаль 1/3 двароў. Практычна 7 калгасаў распаліся, у т.л. «Новае жыццё» (Ліпінскі сельсавет), «Камінтэрн» (Люшаўскі сельсавет), «Красін» (Губіцкі сельсавет), «Зорка селяніна» (Наспенскі сельсавет) і інш.

У раёне абагульванне ішло маруднымі тэмпамі. Па стану на 1929 г. у Патапаўскім, Забалоцкім сельсаветах наогул не было калгасаў, ад 3 да 5% двароў было калектывізавана ў Рагінскім, Дуравіцкім, Буда-Люшаўскім сельсаветах. У 1930 г. з 12 сельсаветаў у 6 калектывізавана было ўсяго па 9 — 15% двароў.

Памеры і структура калектыўных гаспадарак аказаліся непрадуманымі. Памеры калгасаў не дазвалялі эфектыўна весці вытворчасць. У сярэднім па раёну ў пачатку 1930-х гадоў нагрузка зямлі на калгасны двор складала 8,08 га, на аднаго каня —

8,15 га, на аднага працаздольнага — 3,86 га. Па 10—15 га на аднаго працаздольнага мелі калгасы «Ударнік», «Пабеда», «Трактарыст», «Орка»; па 16—22 га на адзін калгасны двор мелі калгасы імя Якаўлева, «Пабеда». «Трактарыст», «Орка». Пры гэтым гаспадаркі не мелі сродкаў для развіцця вытворчасці.

З году ў год заставаліся нізкімі ўрадлівасць палёў і прадукцыйнасць жывёлагадоўчага статка. Сярэдняя ўраджайнасць збожжавых у 1930 г. была 9,6 ц, бульбы — 114,6 ц, лёну — 4,1 ц з гектара. Гэта некалькі вышэй за ўраджайнасць гэтых культур у індывідуальных гаспадарках, але валавы збор збожжавых у калгасах і саўгасах складаў менш за 15% вытворчасці ў індывідуальным сектары (па бульбе — 12,5%, па лёну — 23,7%).

Такім чынам, галоўнымі вытворцамі прадукцыі земляробства заставаліся гаспадаркі індывідуальнага сектара. Ва ўмовах прымітыўнай тэхнікі і арганізацыі вытворчасці калгасы аказваліся проста недзеяздольнымі.

У 1930 г. у Беларусі пачалося стварэнне машынна-трактарных станцый (МТС). У Буда-Кашалёўскім раёне арганізацыя МТС пачалася ў 1932 г., на што было асігнавана 126 тыс. руб. Спачатку ў МТС мелася 6 трактароў, а напярэдадні вясенняй сяўбы — 21 трактар, 10 складаных малатарань, 4 ільноцерабілкі, 6 дваццацічатырохрадных сеялак.

МТС абслугоўвала 42 з 60 калгасаў. У першы перыяд работы справы ішлі марудна. Выходзіла са строю тэхніка, перарасход гаручага складаў 18—20%, а страты — больш за 12 тыс.руб. Ні адзін будаўнічы аб'ект МТС не быў уведзены ў строй. За 1932 г. узарана 2301 га і абмалочана 16 394 ц збожжа, перарасход паліва склаў 20,3%. У далейшым калектыў МТС набіраў працоўныя тэмпы. У 1933 г. узарана 24 000 га, абмалочана 32 900 ц збожжавых.

На сходах па праблемах калектывізацыі, якія праходзілі ў раёне, дакладчыкі пераконвалі сялян, што калектывізацыя — надзейны шлях умацавання гаспадаркі для сяла, аб'яднання дробных гаспадарак у буйную, якая і называецца калгасам. Гэта абавязкова павысіць жыццёвы ўзровень, зробіць людзей заможнымі, а іх жыццё змястоўным.



Арганізатары калгасаў у Губіцкім сельсавеце — Разуванаў (злева) і Е.П.Усцінаў.



Першыя калгаснікі Недайскага сельсавета Л.М.Данілкава і А.І.Чындароў.

П.С.Панцялееў, першы трактарыст калгаса «Ураджай».

Да канца 1932 г. у Буда-Кашалёўскім раёне дзейнічалі 2 саўгасы: Рагінь — малочнага напрамку (плошча 1191,77 га, 153 рабочыя) і прыгарадная гаспадарка (плошча сенажаці 296,63 га, 40 рабочых). Калектывізавана было 3022 (47,9%) гаспадарак. Працавалі 60 калгасаў, якія мелі 48,7% плошчаў сенажаці, 31 свінаферму (651 свіння), 14 малочна-таварных ферм (2047 галоў буйной рагатай жывёлы), 11 ферм па вырошчванню цялят (419 галоў) і інш.

Т.П.Круцялёва, настаўніца і актыўны ўдзельнік калгаснага будаўніцтва на Буда-Кашалёўшчыне ў 1930-я гады.

Аднак нават у 1933 г. калгаснікі шэрагу гаспадарак на працадзень атрымалі па 163—220 г збожжа і 700—800 г бульбы. У найбольш заможных гаспадарках на працадзень выдалі каля 2 кг збожжа і да 4 кг бульбы. Зразумела, што ў сялян-калгаснікаў, якія аддалі ў калгасы ўвесь свой набытак і ўсклалі на іх вялікія надзеі, першы вопыт выклікаў спачатку неўразуменне, а потым і адкрытае абурэнне.

У дакладной запісцы ў сельгасаддзел ЦК КП(б)Б 24 жніўня 1934 г. аб ходзе калектывізацыі ў раёне паведамлялася, што ў ліпені 1933 г. калгасы аб'ядноўвалі 37% сялянскіх двароў. Галоўная ўвага была накіравана на арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае ўмацаванне дзеючых калгасаў, таму «што яны значна засмечаны класава чужымі элементамі (за год выключана з калгасаў 97 гаспадарак, а з 63-х у раёне — знята 23 старшыні калгасаў)».

Не лепш ішлі справы ў мясцовых савецкіх органах улады. Так, з 1930 г. да 1934 г. у 12 сельсаветах раёна было зменена 72 старшыні. У Буда-Кашалёўскім сельсавеце старшыня мяняўся кожныя 5 месяцаў, у Забабскім, Патапаўскім — кожныя 6. У 1930 г. у склад сельсаветаў выбрана 258 аднаасобнікаў і 98 калгаснікаў. Значная частка аднаасобнікаў была выведзена па прычыне сувязі з кулакамі і сабатажам дзяржаўна-палітычных мерапрыемстваў. У 1934 г. у адноўлены склад сельскіх Саветаў выбрана 375 чал., у т. л. 27 аднаасобнікаў.

Частая змена старшынь і іншых кадраў актыву мясцовых органаў улады і гаспадарчых органаў кіравання негатыўна адбівалася на справах.

Тым не менш да канца 1934 г. каля 71% двароў увайшлі ў калгасы. На калгасных фермах мелася 3659 галоў жывёлы, у т.л. 1477 кароў, 2078 галоў маладняку (90 — 94% патрэбнай колькасці). Недакамплект ферм буйной рагатай жывёлай быў вынікам падзяжу цялят (30—35%).

Свінафермы калгасаў мелі 1975 свіней, у т. л. 357 свінаматак, што складала 65% патрэбнай колькасці.

У развіцці жывёлагадоўлі ў раёне ўзровень пагалоўя 1929 г. буйной рагатай жывёлы і свіней быў дасягнуты толькі ў сярэдзіне 1934 г., а авечак і коней — працягваў скарачацца; было 138 двароў калгаснікаў, якія не мелі кароў.

Сельская гаспадарка раёна папоўнілася адукаванымі кадрамі спецыялістаў. Працавала 14 аграномаў, 7 землеўпарадчыкаў, 10 чалавек заатэхперсаналу. У сярэднім на аднаго агранома прыпадала 4,5 калгаса, 369 гаспадарак. Дзейнічалі 1 ветлячэбніца і 4 ветпункты.

Значна ўзраслі выдаткі на народную адукацыю і ахову здароўя. На народную асвету яны складалі ў 1934 г. 57,3% бюджэту. Затраты на душу насельніцтва павялічыліся з 2 руб. 58 кап. у 1930 г. да 19 руб. 43 кап. у 1934 г.

Усеагульным навучаннем было ахоплена 96% дзяцей школьнага ўзросту. Працавалі 45 школ (11 сямігодак, 1 сярэдняя, 1 руская двухкамплектная з 40 вучнямі, астатнія — пачатковыя).

Асігнаванне сродкаў на ахову здароўя ў раёне ўзрасло з 4,9% у 1930 г. да 8,2% агульнага бюджэту ў 1934 г. Дзейнічалі бальніца (2 урачы, 2 фельчары,1 акушэрка), 5 фельчарскіх пунктаў, 2 урачэбныя амбулаторыі, 2 зубаўрачэбныя кабінеты.

У 1934 г. адкрыта 10 пастаянных і шмат часовых ясляў. Працавалі 12 Дамоў сельскай культуры, 12 хат-чытальняў, 36 чырвоных куткоў, меліся 3 кінаперасоўкі, стацыянарная кінаўстаноўка, радыёвузел. У Буда-Кашалёве працавалі лазня, гасцініца. У раёне было тэлефанавана 8 з 12 сельсаветаў.

Працягвалася настойлівая барацьба за пераўтварэнне краю ў рэгіён суцэльнай калектывізацыі, развіццё вытворчай і сацыяльнай сферы.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

СПІС КАЛГАСАЎ І САЎГАСАЎ УВАРАВІЦКАГА РАЁНА ПА СТАНЕ НА 1 СТУДЗЕНЯ 1929 г.

Назва гаспадарак	Месца знаходжання	Дата заснавання
Саўгас «Уваравіцкі»	м. Уваравічы	1919
Саўгас «Ст.Беліца»	с. Ст. Беліца	1920
калгас «Сяброўства»	в. Прудаўка	15.7.1928
калгас імя К.Маркса	Ліпініцкі с/с	1919
калгас «1 Мая»	Уваравіцкі с/с	1923
калгас «Веккер»	Чабатовіцкі с/с	23.4.1928
калгас «Вольная Праца»	в. Рудзянец	21.4.1928
калгас «Чырвоная Плошча»	Целяшоўскі с/с	7.5. 1928
калгас «Першамайскі»	Цярэніцкі с/с	11.5.1928
калгас «Першамайскі»	Борхаўскі с/с	17.6.1928
калгас «Калініна»	Івольскі с/с	21.8.1928
калгас «Калініна»	Ліпініцкі с/с	21.8.1928
калгас «Баявы»	Пянчынскі с/с	16.1.1929
Маш.-каапер.таварыствы:		
«Мохаўскае»	Глазаўскі с/с	25.9.1927
імя Сталіна	Смычоцкі с/с	1.10.1927
«Новая культура»	п. Маслінаўка	—
«Дзвігацель культуры»	Целяшоўскі с/с	7. 5.1928
«Сенавец»	п. Сенавец	11.5.1928
«Сокал»	п. Сокал	11.5.1928
«Селянін»	Целяшоўскі с/с	17.6.1928
«Верны Шлях»	п. Лук'янаў	17.6.1928
імя Сталіна	п. Сокал	17.6.1928
«Расткоўскае»	п. Расткоў	17.6.1928
Пасялковыя таварыствы:		
«Новы Свет»	п. Н. Свет	13.1.1929
«Новае Жыцце»	п. Парасоў	9.2.1928
«Чыстая Лужа»	п. Чыстая Лужа	8.3.1928
«Новы Свет»	п. Дубраўка	17.3.1928
«Першамайск»	п. Курганне	19.3.1928
«Вясёлы сябра»	п. Каменка	21.3.1928
Садова-пасялковыя таварыствы:		
«Земляроб»	п. Рубеж	17.3.1928
«Кісялёўшчына»	п. Кісялеўшчына	23.3.1928
Сельскагаспадарчы гурток		
«Чырвоны Кастрычнік»	Целяшоўскі с/с	8.3.1928
Малочныя арцелі:		
«Зялёна-Лугская»	п. Зялёны Луг	13.1.1928
«Шлях да Новага Жыцця»	п. Уладзіміраўка	4.4.1928
Масларобчыя арцелі:		
«Ясная Паляна»	п. Ясная Паляна	17.3.1928
«Першы прамень»	п. Борхаў	4.4.1928
«Новая Данія»	п. Малінаўка	21.4.1928
Кантр.тавар.па малоч.		
жывёлагад.	в. Пыцькаўка	13.2.1928
Кантр.тавар.па льнаводству	п. Аляксандраўка	17.6.1928
«Чырвон. ільнавод»	в. Крыўск	16.1.1929
С/г. насенняводчы		
каапер. «Н. Ліпа»	п. Н. Ліпа	17.6.1928

Сем будаўніч. таварыстваў
Перасяленч. таварыства
«Чырвон. Ніва» (у Сібір) 30.8.1928

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 735. Воп. 1. Спр. 155. Л. 1—3.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

СА СПІСА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ АРЦЕЛЕЙ ПА БУДА-КАШАЛЁЎСКІМ РАЁНЕ

15 мая 1929 г.

Назва	Месца дыслакацыі	Двары	Душы	Паша /лугі	Выган	Лес	Сады	Усяго	Коні /мал.	Каровы /мал.
«Новае жыццё»	Ліпінскі с/с	7/–	36	19/18	–	9	23	69	10/1	15/3
«Гром»	Б.Кашалёўскі с/с	6/–	31	42/21	–	–	–	63	6/–	12/5
«Камінтэрн»	Б.Люшаўскага с/с	11/2	67	22/12	2	–	18	54	7/1	22/3
«Пабеда»	Забабскага с/с	7/1	25	30/12	–	–	7,7	49,7	5/–	16/4
«Чырвоная Зорка»	–	12/4	52	30/75	15	–	–	120	12/1	11/–
«Дружба 2»	Б.Кашалёўскі с/с	6/–	24	34/44	24	7	18	134	8/–	29/10
«Шлях да сацыялізму»		7/1	34	26/49	42	–	8	125	7/–	35/7
«Чырвоная Наспа» (яўр.)	Губіцкі с/с	12/–	50	117/22	12	–	15,6	166,6	14/1	47/24
«Гофенулг» (яўр.)	Кашалёўскі с/с	5/–	24	20/12,5	–	–	–	42,5	–	5/–
«Зорка селяніна»	Наспенскі с/с									
«Красін»	Губіцкі с/с									
«Трактарыст»	Наспенскі с/с									
«Саўмесная праца»	Іванаўскі с/с									
«Праца»	Іванаўскі с/с									
«Салтанаўка»	Б.Люшаўскі с/с									
«Негаўка»	–									
«Рагінскі»	–									
«Лазова»										
«Дзербічы»										
«Колас»	п.Наспа Губіцкі с/с									

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 29. Л. 1.

З КАРЭСПАНДЭНЦЫІ АБ РАЗРЫВЕ З КАСЦЁЛАМ КАЛГАСНІКАЎ КАЛГАСА ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУГІ

У апошнія часы каталіцкая царква, самая моцная ва ўсім свеце, траціць пад нагамі грунт. Вясковая беднота і калгаснікі парываюць з ёю сувязь. Напрыклад, у Буда-Кашалёўскім раёне калгаснікі ўступілі ў сацыялістычнае спаборніцтва па знішчэнні са свайго быту абразоў. Ксёндз касцёла, бліжэйшага да калгаса імя Дзяржынскага, зрабіўся «беспрацоўным» і адрокся ад сану. Касцёл пустуе. Калгаснікі ўзнялі пытанне аб перадачы касцёла пад бальніцу. Чутны галасы, каб касцельныя званы перадаць у распараджэнне Асінбуда на патрэбу індустрыялізацыі... Замест абразоў калгаснікі ўпрыгожваюць свае памяшканні партрэтамі правадыроў рэвалюцыі, карцінамі савецкага і антырэлігійнага зместу.

Фатограф.

Беларуская вёска. 1929. 23 снеж.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ПРА АДМОВУ АД РЭЛІГІІ КСЯНДЗА БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУГІ ВАЛЫНЦА

Ксендз Волынец — настоятель Люшевского костела (Буда-Кошелевского района на Гомельщине) отказался от своего сана. Совершив очередное богослужение в костеле, он об-

ратился к прихожанам с нижеследующей речью: «Сегодня в последний раз я выполняю свои священнические обязанности. На этом алтаре я принес в жертву свою молодость. На протяжении ряда лет я пережил несколько кровавых войн и видел их ужаснейшие последствия. Я видел человеческую нужду, человеческую кровь, я видел, что бог ни одним чудом не доказал своего существования. Религия, обещая счастливую загробную жизнь, требует жертв и мучений.

После долгих и мучительных раздумий я узнал о том, что никакая религия не принесла человечеству справедливости, она служит преимущественно интересам богатых и привилегированных людей. Я пришел к убеждению, что религия выдумана для эгоистических интересов и отнюдь не для всего обездоленного населения. Религия — это ярмо для тех, кто верит в нее. Руководясь всем этим, я добровольно покидаю свой сан и слагаю с себя обязанности священнослужителя. Вот ключи от костела — делайте, что хотите, мне с вами не по пути...»

Рабочий. 1929. 24 кастр.

З ДЫРЭКТЫВЫ ГОМЕЛЬСКІХ АКРУГОВАГА КАМІТЭТА І АКРУГОВАЙ КАНТРОЛЬНАЙ КАМІСІІ КП(б)Б

4 студзеня 1930 г.

Совершенно секретно

Всем секретарям РК КП(б)Б Гомельского округа.

За последнее время в ряде районов мы имеем явные искривления партийной политики по вопросу об изъятии молитвенных домов, церквей, выразившиеся в том:

1. В Хойникском районе параллельно с вынесением приговоров на общих собраниях о закрытии церкви по инициативе учителя и комсомольской ячейки — был выставлен вооруженный караул для охраны церкви и недопущения богослужения. Причем караул был выставлен из среды безбожников и членов ЛКСМ.

2. В Речицком районе сразу же после вынесения приговора на собрании об изъятии церкви безбожники приступили к закрытию церкви и снятию колоколов.

3. В Чечерском районе такой же факт, но со снятием с дверей икон церкви.

4. Аналогичные факты имеются по Лоевскому району нашего округа.

Ввиду того, что такие незаконные и нетактичные действия со стороны отдельных коммунистов, комсомольцев и советских общественников вызывают ряд недовольств со стороны крестьянства, подчас бедняцкой и середняцкой части его, и не исключена возможность, что на этой почве будут массовые недовольства, вылившиеся в эксцессы — Бюро Окружкома на своем заседании от 3 января с. г. вынесло постановление о том, чтобы молитвенные дома, церкви, костелы, каплицы отчуждались тогда, когда будет проведена достаточная подготовительная работа на местах, как в смысле изучения и преломления настроений крестьянства по этому вопросу, а так же [и в] отношении подготовки и использования молитвенных помещений для культурных нужд районного центра, деревни и т.д. Кроме того, к изъятию можно приступить только тогда, когда в каждом отдельном случае при предоставлении всех материалов из районов в округе будет постановление фракции Окрисполкома, которое будет высылаться в местные РИК и для исполнения.

А посему ОК и ОКК КП(б)Б категорически предлагает всем секретарям райкомов, под их личную ответственность, провести расследование по всем моментам искривления и незаконных действий со стороны членов партии и советских работников, по предмету привлечения первых — по партийной линии, а вторых, через фракцию РК — по Советской линии к ответственности за нарушение элементарных правил по вопросу об отделении церкви от государства.

Впредь категорически руководствоваться тем, что ни одна церковь и молитвенное здание не может быть изъято до тех пор, пока не будет на это постановления соответствующих органов. Одновременно необходимо усилить антирелигиозную пропаганду подготовительной работы в отношении изъятия церквей в Вашем районе путем вынесения соответствующих решений на общих собраниях и производства подписных листов среди крестьянства.

В каждом отдельном случае при невыполнении и нарушении нашей директивы кем бы то ни было немедленно ставить нас в известность.

Гомель.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 73. Л. 2.

ІНСТРУКЦЫЯ ПА ЧЫСТЦЫ КАЛГАСАЎ АД КУЛАЦКІХ І АНТЫСАВЕЦКІХ ЭЛЕМЕНТАЎ

17 студзеня 1930 г.

Чыстка калгасаў мае мэтай вызваленне калгасаў ад кулацкіх і антысавецкіх элементаў як класавых ворагаў калгаснага будаўніцтва.

Чыстка калгасаў ад кулацкіх і антысавецкіх элементаў з'яўляецца важнейшай палітычнай задачай, накіраванай на выкараненне ўсялякіх спроб кулацтва разлагаць і падрываць калгасы.

Чыстка калгасаў праводзіцца калгаснай сістэмай пры шырокім удзеле рабочых і батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас калгаснікаў і вясковай беднаты, мясцовых савецкіх, кааперацыйных і грамадскіх арганізацый.

Выключэнню з калгасаў падлягаюць: 1. Кулакі і нэпманы; 2. Асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў; 3. Асобы, сістэматычна вядучыя работы па падрыве калгасаў; 4. Асобы, якія сістэматычна скарыстоўвалі да ўступлення ў калгасы наёмную сілу або займаліся іншай эксплуататарскай і антысавецкай дзейнасцю, але па розных прычынах захавалі выбарчыя правы.

Увага: У калгасах можа застацца тая частка беднаты, пазбаўленая выбарчых правоў, якая раней не займалася вытворчай працай, а займалася дробным гандлем, але не эксплуатавала чужой працы і ў сучасны момант на працягу не менш аднаго года не займаецца гандлем і цяпер сумленна працуе ў калгасе.

Праўленне Калгассаюза

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 95. Л. 21.

З ДЫРЭКТЫВЫ ГОМЕЛЬСКАГА АКРУГОВАГА КАМІТЭТА КП(б)Б

1930 г.

Совершенно секретно

Всем секретарям РК КП(б)Б Гомельского округа.

С получением сего ОК КП(б)Б предполагает приступить к выявлению и учету всех кулацких хозяйств Вашего района, подлежащих расселению по 3-ей категории. Подлежат выявлению и учету все кулаки третьей категории, оставшиеся по разным причинам кулацкие семейства первой и второй категории, в том числе и возвращенные обратно из ссылки по мотивам старости и многосемейности.

Одновременно с проведением учета кулацких хозяйств, подлежащих переселению по третьей категории, Вам подлежит также взять на учет все орудия производства, скот, строения, кормовые и пр. семена. Категорически запретить кулакам распродажу и порчу имущества. При обнаружении таких случаев имущество конфисковать, виновных привлечь к уголовной ответственности.

Параллельно с проведением учета кулацких хозяйств Вам надлежит через земельные органы наметить соответствующие участки худшей земли для расселения кулаков третьей категории. В принципе исходить из того, чтобы расселение допускалось только небольшими поселениями в 15 — 20 хозяйств. В соответствии с наличием кулацких хозяйств в районе и наличием свободных земель для их устройства наметить и составить фактические планы переселения, учитывая размер необходимых затрат материальных и физических сил на переселение.

Всю подготовительную работу закончить не позже 13 августа 1930 г. и материалы предоставить в ОК КП(б)Б, после чего получите конкретные указания по фактическому переселению.

Секретарь ОК КП(б)Б.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 188. Воп. 1. Спр. 69. Л. 1.

ТЭЛЕГРАМА АКРКАЛГАССАЮЗА АКРПЛАНУ

1930 г.

Акркалгассаюз наступным паведамляе, што скупка жывёлы ад кулацкіх гаспадарак з ліквідацыяй кулакоў як класа спынена і адабраная маёмасць ад кулакоў перадаецца калгасам дарма, а пагэтаму крэдыты на пакупку жывёлы ад кулакоў зараз не патрэбны. Што датычыцца крэдытаў наогул на папаўненне стада жывёлы ў калгасах, дык гэтыя крэдыты адпушчаюцца с/г банкам.

Праўленне калгассаюзу (Здановіч)

Заатэхнік (Аарон).

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 53. Л. 129.

З САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ РАЁНА

1931 г.

4. Размеркаванне пасяўных плошчаў па культурах:

Тыпы гаспадарак	Жыта	Авёс	Ячмень	Лён	Бульба	Травы	Інш. культ.	Усяго
Саўгасы	89,95	66,06	10,7	—	83	63,15	42,37	355,23
Калгасы	421,0	933,5	222,8	262	613	286,5	427,3	3429,6
Індывідуальныя гаспадаркі	8804,0	4384,0	1142	1582	3675	680	2499	23642

5.Сярэдняя ўраджайнасць з га (у ц) у 1930 г.

Тыпы гаспадарак	Жыта	Авёс	Ячмень	Лён	Бульба	Травы	Зал.	Сухад.	Бал.
Саўгасы	11,79	9,83	11,79	—	136,06	32,76	—	11,79	—
Калгасы	11,46	8,83	8,19	4,1	114,6	32,76	16,38	11,47	14,0
Індывідуальныя гаспадаркі	8,19	8,19	6,55	3,27	106,5	25,39	16,38	11,47	11,47

6. Валавы збор.

Тыпы гаспадарак	Жыта	Авёс	Ячмень	Лён сем.	Лён вал.	Бульба	Сена
Саўгасы	988,7	589,69	132,67	—	—	10333	17750
Калгасы	4414,43	8393,31	1670,8	1072,91	600,9	64 326	42 100
Індывідуальныя гаспадаркі	65 549,56	32 858,3	6847	5182,63	2531	358 174	178 155

8. Колькасць жывёлы (у адзінках галоў).

Тыпы гаспадарак	Буйная рагатая жывёла		Авечкі	Свінні
	да 1 года	старэй 1 года		
Саўгасы	—	83	—	—
Калгасы	597	1422	246	258
Індывідуальныя гаспадаркі	1154	10 371	10 625	9469
Усяго:	1751	11 876	10 871	9727

10. Колькасць коней. 11. Мясцовы транспарт

Тыпы гаспадарак	Усяго	Трактары	Аўтамабілі	Калёсы
Дзяржаўныя ўстановы	16	7	—	11
Саўгасы	—	—	—	—
Калгасы	434	—	—	151
Індывідуальныя гаспадаркі	7918	—	—	1206

12. Саўгасы раёна.

Саўгас «Рагінь» — жывёлагадоўля, 85 рабочых.

13. Калгасы раёна.

Назва гаспадарак	Месцазнаходжанне	Тып	Спецыялізацыя	Батрацкія	Бядняцкія	Серадняцкія	Усяго гаспадарак	Едакі
«Дружба»		к-с	жывёлагадоўля	3	9	11	23	68
«Гром»	Марозавічы	арцель	свінагадоўля	3	10	7	20	85
«Чырвоная Беларусь»	Б.Кашалёў	к-с		2	35	19	63	209
«Гофенунг»	Кашалёў	арцель	—	8	28	17	87	347
«Камунар»	Б.Кашалёў	—	насенняводства	21	102			
«Трактарыст»		—	свінагадоўля	8	21	20	51	194
«Агульная праца»	Іванаўка	—	насенняводства	4	10	7	21	98
«Граніт»	Недайка	—	—	—	5	2	7	28
«Перамога»	Забаб'е	—	свінагадоўля	5	30	4	42	148
«Чырвоны пахар»	Хмяльное	—	—	4	15	6	27	84
«Ураджай»	Гаўлі	—	жывёлагадоўля	3	17	9	31	112

18. Цэнзавыя прадпрыемствы раёна (акрамя харчовай вытворчасці) у цэнах 1929/30 г.

Назва	Месцазнаходжанне	Магутнасць	Рабочых	Служачых	Вытворчасць	Вал
Рагінскі броварны завод	Рагінь	12 л/с	20	1	спірт	176 593

19. Дробныя саматужна-рамесныя прадпрыемствы (акрамя харчовай вытворчасці).

Галіны	Месцазнаходжанне	Колькасць	Рабочых	У т.л. кааператыўных заводаў	Рабочых
Абутковая майстэрня	Б.Кашалёў	1	23	1	23
Кравецкая майстэрня	—	1	9	1	9
Смалакурныя	Губічы, Сялец	2	8	2	8
Слясарна-кавальскі	Патапаўка	1	5	1	5
Цагельная майстэрня	Кашалёў, Наспа, Шарыбаўка, Лозаў	4	39	4	39
Лесапільная	Наспа	1	3	1	3
Чарапічная		1	4	1	4

20. Харчовая прамысловасць.

Назва прадпрыемства	Месца-знаходжанне	Рухавік	Магутнасць	Рабочых	Жорнаў	Дзённая вытворчасць
Мукамольна-крупяное	к-с «Інтэрнацыянал»	механічны	75	3	2	73 ц
	к-с «Дружба 2»	—	30	4	2	65
	к-с «Гофенунг»	—	35	5	2	70
	к-с «Камінтэрн»	—	25	4	2	60
Масла-сыраварства	к-с «Інтэрнацыянал»	—		3		
	к-с «Чырвоны Кастрычнік»	—		1		
	к-с «Чырвоны Рухавік»	—		1		
	Рагінь	—		5		
Млын	Рагінь	—	36	3	2	70

21. Гандаль раёна ў 1929/30 г.
Сельская кааперацыя — 1. Абарот 655 440 руб.
Спажыўкааперацыя — 1. Абарот 1 200 000 руб.

Усяго: 21 855 440 руб.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ СКЛАД НАСЕЛЬНІЦТВА РАЁНА

Рускія — 274, палякі — 235, яўрэі — 980, беларусы — 37 578, інш. — 118. Усяго — 39 185 чалавек.

Нацыянальны сельсавет: Любавінскі (польскі). У яго склад уваходзяць н.п.: Любавін, Н.Любавін, Бычкі, Асінаўка, Шутнае, Дзеднае.

РАСКЛАД СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК ПА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАМУ ПАДАТКУ

1. Вызваленыя ад сельскагаспадарчага падатку — 2080 гаспадарак.
2. Абкладаюцца падаткам без працэнтнай надбаўкі — 3815.
3. Абкладаюцца сельгаспадаткам з працэнтнай надбаўкай — 123.
4. Абкладаюцца сельгаспадаткам у індывідуальным парадку — 24.

САЦЫЯЛЬНЫ РАСКЛАД НАСЕЛЬНІЦТВА (сельскае насельніцтва).

Рабочыя — 315, служачыя — 680, саматужнікі — 855, батракі — 605, калгаснікі — 3700, бедвякі — 10 182, серадвякі — 21 054, заможныя — 902, кулакі — 239, лішэнцы — 512. Усяго — 39 185 чалавек.

ПІСЬМЕННАСЦЬ СЕЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА (у % да ўзроставых груп).

У групе ва ўзросце ад 8 да 18 гадоў — 92,1%; 18 — 21 г. мужчыны — 96,3; жанчыны — 84,0%; 21 — 32 г. мужчыны — 24,6, жанчыны — 63,2%; 32 — 40 г. мужчыны — 76,7, жанчыны — 52%.

У раёне ячэек УКП/б) — 13, членаў партыі — 91, кандыдатаў — 57.
У раёне ячэек УЛКСМ — 17, усяго камсамольцаў — 272 чал.

СПІС ПАЛІТАСВЕТУСТАНОЎ РАЁНА

Буда-Кашалёўскі народны Дом — 1, 160 месц
Недайская хата-чытальня — 1, 100 месц
Любавіцкая хата-чытальня — 1, 60 месц
Буда-Люшаўская хата-чытальня — 1, 50 месц

Рагінская хата-чытальня — 1, 50 месц
Дуравіцкая хата-чытальня — 1, 50 месц
Кашалёўская хата-чытальня — 1, 90 месц
Народны Дом — 1 (160 месц), хаты-чытальні 6 (310 месц), чырвоных куткоў — 39 (400 месц), кінаперасоўкі — 2, радыёпрыёмнікі агульнага карыстання — 5 (470 месц).

УСТАНОВЫ НАРОДНАЙ АСВЕТЫ

	Школы 1-й ступені	Прафтэхшколы	Школы сялянскай моладзі	Усяго
Колькасць устаноў	40	1	2	43
Месц (у адну змену)	3601	120	370	4091
Навучэнцаў	4069	39	626	4734

КОЛЬКАСЦЬ ПАЗБАЎЛЕНЫХ ВЫБАРЧЫХ ПРАВОЎ — 512, у т.л. 355 за эксплуатацыю чужой працы.

У РАЁНЕ ДЗЕЙНІЧАЮЦЬ: праваслаўных цэркваў — 2, евангелісцкіх хрысціян-баптыстаў — 1 (80 чал.).

ТЭРЫТОРЫЯ І НАСЕЛЬНІЦТВА РАЁНА:
Плошча — 882 кв.км. У складзе раёна 12 сельсаветаў

Назва сельсавета	Колькасць нас. пунктаў	Двароў	Жыхароў
1	2	3	4
Буда-Кашалёўскі	36	938	5572
Буда-Люшаўскі	41	634	3843
Губіцкі	17	781	4534
Дуравіцкі	11	371	2473

Адкрыццё новай школы ў в. Харошаўка. 1930 г.

1	2	3	4
Забабскі	24	506	2921
Забалоцкі	10	354	2044
Кашалёўскі	29	600	2053
Ліпініцкі	19	657	4114
Любавінскі	11	204	813
Недайскі	29	657	3883
Патапаўскі	39	485	2956
Рагінскі	11	657	3979
Усяго:	277	6844	39185

КОЛЬКАСЦЬ ГАСПАДАРАК У НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ (н.п.) РАЁНА

Да 5 двароў маюць 59 н.п.; 6—10 двароў — 39 н.п., 11—50 двароў — 91 н.п., 51—150 двароў — 15 н.п., 151—300 двароў — 11 н.п., 301—500 двароў — 1 н.п.

КОЛЬКАСЦЬ ЖЫХАРОЎ у н.п.: да 10 чал. — 26 н.п., 10—20 чал. — 24 н.п., 21—50 чал. — 48 н.п., 51—100 чал. — 52 н.п., 101—200 чал. — 31 н.п., 201—300 чал. — 15 н.п., 301—500 чал. — 7 н.п., 501—1000 чал. — 11 н.п., больш за 1000 чал. — 8 н.п.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 99. Л. 1 адв., 2 адв., 3 адв., 4—5, 5 адв., 6, 6 адв., 7 адв., 8, 9.

СПІС СВІНАТАВАРНЫХ КАЛГАСНЫХ ФЕРМАЎ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА ПА СТАНЕ НА 1 КРАСАВІКА 1932 г.

Назва калгаса	Год заснавання	Сельсавет	Вёска	Колькасць зямлі	Колькасць свіней	З іх с/матак
Чырвоны пахар	1930	Ліпініцкі	Шарыбаўка	313,5	35	18
Камінтэрн	1930	Б.Люшаўскі	Люшаў	1236,7	30	
Чырвоны партызан	1931	Ліпініцкі	Бронніца	270,5	20	5
Новае жыццё	1931	—	Віктарын	352,4	47	10
Будзённы	1931	Люшаўскі	Струкі	309,0	—	—
Бальшавік	1931	Забабскі	Халочча	286,8	—	—
Камунар 1	1931	Рагінскі	Лазаў	360,0	9	4
Улада Саветаў	1931	—	Рагінь	522,0	12	7
Дзяржынскі	1931	Любавінскі	Любавін	1167,3	106	39
Пабеда	1930	Забабскі	Забаб'е	597,3	110	42
Граніт	1930	—	Недайка	1237,0	87	32
Гром	1930	Б.Кашалёўскі	Марозавічы	437	107	36
Калініна	1931	Дуравіцкі	Дуравічы	244,8	90	41
Парыжская Камуна	1932	—		264,0	15	15
1 Мая № 2	1932	—		299,3	8	8
Сталіна	1930	Патапаўскі	Патапаўка	491,5	28	17
					665	294

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 995. Воп. 1. Спр. 1. Л. 45.

З АРТЫКУЛА Ў ЧАСОПІСЕ «ЖУРНАЛІСТ»

Люты 1933 г.

Уже год существует газета «Ленінскі Шлях» (Буда-Кошелевский район, Белоруссия), но и до сих пор редакция вынуждена ютиться в одной маленькой комнатке (18 куб.м). Работаем за двумя маленькими столами. Четыре работника редакции районной газеты едва размещаются по углам заваленных бумагами столов.

Если приходят селькоры, для беседы с ними приходится выходить на улицу, ибо работать в маленькой комнате во время разговоров просто невозможно. Работники редакции не имеют квартир, приходится ночевать в редакции на столе. Больше работать в таких условиях невозможно. Пора создать человеческие условия для редакции газеты «Ленінскі Шлях»...

Журналист. 1933. 9 лют.

Члены камсамольскай ячэйкі калгаса «Шлях да камуны». У цэнтры — сакратар ячэйкі Гаўрыленка.

СПІС КАМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА

15 верасня 1933 г.

Назва сельсавета і ячэйкі	Колькасць членаў	Прозвішча сакратара
1	2	3
Буда-Кашалёўскі сельсавет		
ячэйка дзяржустаноў	18	Шапіра
ячэйка міліцыі	5	Галавараў
ячэйка к-са «Чырвоная Беларусь»	9	Маслава
ячэйка к-са «Дружба 2»	7	Кавалёў
ячэйка к-са «Рассвет»	7	Сяліцкі
Кашалёўскі сельсавет		
ячэйка к-са «Гофенунг»	9	Фінкельштэйн
ячэйка к-са імя Сталіна	6	Бурчык
ячэйка школы калгаснай моладзі	12	Шваякаў
Буда-Люшаўскі сельсавет		
ячэйка к-са «Дыктатура пралетарыяту»	9	Блінцоў
ячэйка к-са «Камінтэрн»	9	Кузьмянкоў
ячэйка школы калгаснай моладзі	9	Арыховік
ячэйка к-са «Шлях да камуны»	8	Гаўрыленка
ячэйка к-са «Чырвоны пахар»	7	Мінаў
Любавінскі сельсавет		
ячэйка к-са імя Дзяржынскага	12	Віленкін
Рагінскі сельсавет		
ячэйка саўгаса «Рагінь»	13	Беры
ячэйка к-са «Вызваленне»	8	Цытрыкаў
ячэйка к-са «Пралетарый»	12	Лявончыкаў
ячэйка к-са «Камунар»	7	Юркоў
Ліпінскі сельсавет		
ячэйка к-са «Новае жыццё»	9	Сарокін
ячэйка к-са «Перадавік»	8	Янкоў
ячэйка к-са «Чырвоны пахар 2»	7	Афанасенка
Дуравіцкі сельсавет		
ячэйка к-са «Чырвоны Кастрычнік»	12	Нічыпарэнка
ячэйка к-са імя Леніна	7	Масленчанка

1	2	3
ячэйка к-са імя Калініна	8	Зайцаў
Забабскі сельсавет		
ячэйка к-са «Ураджай»	9	Андрэеў
ячэйка к-са «Перамога»	8	Маераў
ячэйка к-са імя Якаўлева	7	Шаўцоў
ячэйка к-са «Шлях да сацыялізму»	7	Талан
Забалоцкі сельсавет		
ячэйка к-са «Селькор»	7	Рудніцкі
Патапаўскі сельсавет		
ячэйка к-са імя Сталіна	25	Азкукаў
Губіцкі сельсавет		
ячэйка к-са «Інтэрнацыянал»	9	Захараў
ячэйка к-са імя Варашылава	16	Абраменка
Недайскі сельсавет		
ячэйка к-са «Граніт»	8	Буткевіч
ячэйка к-са «Агульная праца»	12	Каналеш
ячэйка к-са «Трактарыст»	8	Еўтушка
ячэйка к-са «Кааператар»	9	Шэйоліна
ячэйка завода імя Варашылава	5	Чундар

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 287. Л. 3—4.

ХАРАКТАРЫСТЫКА КАЛГАСАЎ РАЁНА

1933 г.

1.В среднем нагрузка земли на колхозный двор составляет 8,08 га, на одного коня — 8,15 га, а по трудоспособному населению — 3,86 га. Но в отдельных колхозах картина пестрая.

Название колхозов	Количество дворов	На 1 двор	На 1 коня	На 1 трудо-способного	Количество голов скота
16-я годовщина Октябрьской революции	20	13,9	18,8	7,6	20
Селькор	34	7,85	14,0	4,6	13
Ударник	50	9,0	7,0	15,5	199
им.Яковлева	16	16,3	12,2	8,0	56
Победа	38	18,1	15,0	10,6	118
Тракторист	40	22,6	11,6	11,3	373
им.Дзержинского	116	9,5	7,8	4,1	419
Интернационал	32	6,7	7,2	4,1	163
им.Энгельса	47	9,1	7,8	4,5	216
Новая Заря	27	10,0	7,7	7,9	88
Большевик	35	11,4	9,3	6,7	69
им.Ворошилова	57	11,1	10,8	8,2	186
Путь Ленина	31	12,7	10,3	7,8	147
Орка	31	20,6	12,8	10,6	175

Это наиболее отстающие колхозы. Первые два — не из зоны МТС, остальные — в зоне деятельности МТС. Проблема не только в перегруженности землей на 1-го коня и 1-го трудоспособного колхозника. Сказывается еще и слабый состав мероприятий, проводимых в направлении укрепления экономики хозяйств.

2. Чтобы оздоровить хозяйства, следует: по колхозу «Тракторист», «Интернационал» — отсрочить кредиты (колхоз «Тракторист» должен банку 28 800 руб., колхоз «Интернационал» — 29 900 руб.

3. Колхозам «16 годовщина Октябрьской революции», «Селькор» требуется предоставить долгосрочный кредит на приобретение лошадей и продуктивного скота. По остальным колхозам — укрепить руководящий состав.

Секретарь РК КП(б)Б (Певзнер)

Пред. Райисполкома (Будько)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 397а. Л. 1—6.

СПІС КАЛГАСАЎ РАЁНА

1934 г.

Назва калгаса	Гаспадарак на 1.7.33 г.	Гаспадарак на 1.3.34 г.	Назва калгаса	Гаспадарак на 1.7.33 г.	Гаспадарак на 1.3.34 г.
Чырвоная Беларусь	52	52	імя Варашылава-1	57	52
Ударнік	50	51	імя Энгельса	47	—
Гром	50	38	імя Дзяржынскага	116	101
Рассвет	64	59	Орка	31	29
Новая Зара	27	27	Шлях Леніна	31	37
Дружба-2	44	33	Ураджай	151	116
Гофенунг	130	130	Шлях да сацыялізму	62	55
імя Варашылава-2	54	47	Перамога	38	69
Камунар-2	68	60	Бальшавік	35	33
Пралетарый-2	50	46	імя Якаўлева	16	18
імя Сталіна-1	77	82	Камінтэрн	66	82
Чырвоны Гарадок	15	16	Дыктатура пралетарыяту	42	40
імя Сталіна-2	92	64	Шлях да камуны	72	60
Муравей	26	27	Чырвоны пахар-1	39	31
імя Косарава	26	1	імя Молатава	30	8
Чырвоны Кастрычнік	120	120	Пралетарый-1	84	86
Парыжская Камуна	54	52	Камунар-1	125	27
1-е Мая	32	33	Улада Саветаў	121	94
імя Калініна	35	39	Вызваленне	58	60
імя Леніна	64	66	Чырвоны Сцяг	53	51
Чырвоны луч	50	55	Усход-1	36	22
Трактарыст	40	45	16 год Кастрычніцкай рэвалюцыі	20	12
Граніт	78	89	Селькор	25	20
Агульная праца	58	52	Селянін	19	16
Другая пяцігодка	20	17	Усход-2	14	14
Новая Хваля	36	27	Перадавік	92	85
імя Карла Маркса	28	—	Перамога	70	71
Інтэрнацыянал	30	84	Чырвоны пахар-2	49	30
імя Красіна	68	66	імя Будзённага	63	59
Чырвоны цягнік	56	62	Чырвоны партызан	46	52
Новае жыццё	51	50	Авангард	38	34
Новы шлях	18	16			

Усяго на 1.7.1933 — гаспадарак 3403, на 1.3.1934 — гаспадарак 3141.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 290. Л. 2—3.

АБ ХОДЗЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў БУДА-КАШАЛЁЎСКІМ РАЁНЕ

1 ліпеня 1934 г.

Назва с/саветаў	Двароў	Адна-асоб.	У кал-гасе	Прац.	Уступ.	Выйш.	% калект.
Дуравіцкі	416	117	299	825	9	6	71
Ліпініцкі	763	276	487	885	51	3	64
Патапаўскі	492	345	147	337	61	2	30
Рагінскі	731	234	497	931	80	5	68
Буда-Кашалёўскі	760	488	272	558	53	9	36
Недайскі	747	497	250	535	32	13	39
Губіцкі	763	568	195	545	7	5	26
Забабскі	661	304	357	477	32	14	54
Любавінскі	210	40	170	373	55	18	81
Забалоцкі	400	333	67	108	12	2	17
Буда-Люшаўскі	685	431	254	582	60	5	37
Кашалёўскі	659	251	408	681	30	15	62
Разам:	7287	3884	3403	6837	482	97	47

Начальнік РайЗА (Канапацкі)
Інспект. па ўчоту (Фінкільштэйн)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 290. Л. 1, 10.

СА СПРАВАЗДАЧ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА ЗА 1931 — 1934 гг.

ХОД КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў БУДА-КАШАЛЁЎСКІМ РАЁНЕ

Гады	Калгасаў	Гаспадарак у калгасах	Усіх гаспадарак у раёне	Калектывізавана (%)
1929	19	510	6547	7,8
1930	21	975	6547	14,8
1931	49	2813	6484	43,3
1932	56	2769	6484	42,7
1933	60	3010	7140	46,3
1934	65	5137	7236	71,0

За 1932—1934 гг. з калгасаў выключана 307 гаспадарак.

* * *

Змена старшынь з 1930 па 1934 г. у кожным сельсавеце: Буда-Кашалёўскі — 9, Кашалёўскі — 6, Дуравіцкі — 5, Забалоцкі — 6, Рагінскі — 6, Буда-Люшаўскі — 5, Ліпніцкі — 6, Патапаўскі — 7, Забабскі — 7, Недайскі — 4, Губіцкі — 4. Усяго — 72.

Частая змена старшынь сельсаветаў і іншых кадраў актыву мясцовых органаў улады негатыўна адбівалася на справах. У Буда-Кашалёўскім сельсавеце практычна старшыня мяняўся кожныя 5 месяцаў, у Забабскім, Патапаўскім — 6 месяцаў. Цякучасць тлумачылася сацыяльным складам актыву. У 1930 г. у склад сельсаветаў было выбрана 258 аднаасобнікаў і 98 калгаснікаў. Значная частка аднаасобнікаў была выведзена па прычыне сувязі з кулакамі і сабатажам дзяржаўна-палітычных мерапрыемстваў... Нездавальняюча працавалі дэпутацкія групы і секцыі.

...У 1934 г. у склад сельскіх Саветаў раёна былі выбраны 375 чалавек. З іх калгаснікаў — 307, аднаасобнікаў — 27, мужчын — 261, жанчын — 114, камуністаў — 40, камсамольцаў — 34, рабочых — 19, батракоў — 10, беднякоў — 227, серадніякоў — 131, саматужнікаў — 5, служачых — 16.

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Агульная колькасць гаспадарак у раёне 7453, з іх калектывізавана — 5137 гаспадарак. Дзейнічае 1 саўгас — 120 пастаянных рабочых і 105 — сезонных.

У раёне ўсяго рабочых коней — 5719, з іх вытворцаў — 153. Буйной рагатай жывёлы — 8412 галоў.

Землеўпарадкавана 50 калгасаў, не землеўпарадкавана — 15.

... Пасяўныя плошчы ў раёне ў 1930 г. складалі 27 397 га, у 1934 г. — 32 729 га (рост на 19%). Пашырэнне пасяўных плошчаў ішло за кошт разворвання непрыдатных і цалінных зямель, распрацоўкі і скарачэння папараў.

У 1934 г. задоўга да веснавых работ была праведзена значная работа па прырэзцы зямлі калгасам і ўрэгуляванні прысядзібных участкаў калгаснікаў. На кожны калгасны двор стала прыпадаць 0,30 (у 1931 г. прыпадала 0,70 — 0,80 да 2-х і больш га) на адну сядзібу, у выніку чаго рашаючую ролю ў жыцці калгаснікаў сталі адыгрываць не прысядзібныя гаспадаркі, а калгасы.

У 1934 г. на кожны калгасны двор прыходзілася зямлі — 7,78 га, у т.л. пахаці — 4,91 га. На кожнага працаздольнага калгасніка па 4,90 га, у т.л. пахаці — 3,10 га.

На аднаасобны двор — 5,75 га, у т.л. пахаці — 3,0 га. На кожнага працаздольнага аднаасобніка — 3,63 га, у т.л. — 1,90 га пахаці. На 1 каня па калгасах — 6,20 га пахаці, а ў аднаасобным сектары — 3,60 га.

Ураджайнасць збожжавых у 1934 г. у параўнанні з 1930 г. узрасла на 30%, валавы збор збожжавых — на 56%, адпаведна па бульбе ўраджайнасць — на 9,8, а валавы збор — на 31% і па льновалакну ўраджайнасць узрасла на 25,2, а валавы збор — на 24%.

У 1934 г. у раёне створаны новыя фермы: МТФ — 21, СТКФ — 14, АТФ — 18, КТФ — 2. І толькі калгасы «Селянін» і «Усход» Забабскага сельсавета не мелі ферм.

На фермах мелася 3659 галоў жывёлы (1934) — 90% да патрэбнай колькасці. Фермы ўкамплектаваны каровамі — 86% (1477галоў); быкамі — 114% (114 галоў), маладняком — 94% (2078 галоў). Недакамплект ферм буйной рагатай жывёлай складаўся з-за падзяжу цялят (30—35%). СТФ мелі 1975 свіней (91%), у т.л.матак — 357 (65%), кныроў — 65 (82%), маладняку — 1573 (100%).

Перадавыя калгасы раёна: «Ураджай» (загадчык фермы Лосеў, даглядчыца — Гуркова) атрымалі 191 парася, з якіх пала ўсяго 4, пры плане 150 свіней мелі 164, або 109%. У калгасе «Гром» (загадчык фермы Юрцаў) захаваны ўвесь прыплод парасят. У калгасе імя Калініна (загадчык фермы Картавенка) захаваны ўвесь прыплод парасят.

Па Буда-Кашалёўскаму раёну ў 1934 г. бескароўных гаспадарак калгаснікаў — 137, надзелена каровамі — 73 гаспадаркі.

Аднаасобны сектар з ацяліўшыхся 3549 кароў мае 1451 цяля (40,8%). Калгаснікі з 2594 кароў — 652 цяляці (25%) у Кашалёўскім сельсавеце ў калгасах з 172 кароў атрымана ўсяго 77 цялят, па аднаасобніках з 129 кароў — 45 цялят, па калгасніках з 238 кароў — 59 цялят. У раёне па калгасах з 1485 кароў атрымана 1478 цялят. Пала 378 цялят, закуплена 448 цялят.

За безгаспадарчасць пад суд аддадзены і засуджаны загадчык фермы калгаса «Орка» Пунікскі за падзеж 10 цялят, загадчык фермы калгаса «Агульная Праца» Кіраў за падзеж 12 цялят, загадчык фермы калгаса «Чырвоны Кастрычнік» за падзеж 8 цялят, загадчык фермы калгаса імя Дзяржынскага за падзеж 14 цялят і інш.

Згодна з пастановай урада ад 4.11.1932 г.у калгасах раёна ўтвораны пастаянныя вытворчыя брыгады. У 1933 г. — 112 паляводчых брыгад, у 1934 — 127.

Здзельшчына ў калгасах уведзена згодна норм выпрацоўкі, якія ўстанаўлівалі праўленні калгасаў на сумесных сходах калгаснікаў.

У 1934 г. былі заключаны ўмовы сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж 48 калгасамі, 90 брыгадамі, індывідуальна — 200 калгаснікамі.

Падрыхтоўка кадраў: трактарыстаў — 52. Калгасных брыгадзіраў — 62, старшынь калгасаў — 50, рахункаводаў — 34, конюхаў — 36, машыністаў складаных машын — 115, уборачных машын — 282. Разам — 631 чалавек. У 1934 г. у калгасах раёна працавалі 82 агратэхгурткі. Менавіта там павышалі гаспадарчыя веды 1882 калгаснікі.

ПЧАЛЯРСТВА

На пчалярных калгасна-таварных фермах у 1934 г. мелася пчоласем'яў рамачных — 771, у калодах — 63. Разам — 834. Таварная прадукцыя мёду складала — 57 ц, воску — 2 ц. У раёне было ўсяго калгасна-таварных ферм — 23.

У той жа час у аднаасобнікаў усяго пчоласем'яў — 310, з іх у скрынях — 30.

МЕЛІЯРАЦЫЯ

Да 1934 г. амаль што не вялася. У 1934 г.праведзены пошук на плошчы 500 га, асушана бросавых зямель — 149 га, адвод павярховых вод з плошчы 1208 га, сенажацяў і выпасаў — 455 га, пракладзена магістральных каналаў — 6,85 км, праведзена карчоўка і ачыстка сенажацяў — 624,5 га.

МАШЫННА-ТРАКТАРНАЯ СТАНЦЫЯ (МТС)

У 1930 г. Урадам вырашана будаваць МТС, але ў Буда-Кашалёўскім раёне ў сувязі з невыкананнем раёнам абавязку па акцыях пастановай Усебеларускага з'езда Саветаў будаўніцтва МТС было адменена. Раённае кіраўніцтва і калгаснікі пастанову сустрэлі з крыўдай, але ўзялі шэраг абавязкаў, якія выканалі ў 1931 г. Будаўніцтва МТС у раёне было дазволена ў 1932 г. На арганізацыю МТС у 1932 г. было асігнавана 126000 руб., з іх на будаўніцтва — 62 000, на сродкі вытворчасці — 64 000 руб.,на абсталяванне майстэрань — 15 000 руб. З пачатку арганізацыі ў МТС было 6 трактароў, а на пачатак вясенняга севу — 21 трактар.

Пры арганізацыі МТС у апарат і на вытворчыя ўчасткі пралезла шмат тых, хто стрымліваў работы. У першы перыяд работы ішлі марудна (адбылося 10 аварый тэхнікі, перарасход гаручага склаў 18%, а ўбыткі больш за 120 000 руб.). Ні адзін будаўнічы аб'ект не быў уведзены ў строй. У 1933 г. МТС узарана 24 000 га і абмалочана 32 900 ц (у 1932 г. узарана пры тым жа парку трактароў — 2301 га і абмалочана — 16 394 ц, а перарасход гаручага склаў 20,3%). У 1933 г. МТС працавала без дэфектаў. Была арганізавана падрыхтоўка кадраў механікаў, брыгадзіраў, старшынь калгасаў. Новыя кадры дапамаглі змяніць у раёне 60 брыгадзіраў і 40 старшынь калгасаў. У 1934 г. майстэрні МТС лічыліся здольнымі выконваць капітальны рамонт трактароў і складанай сельскагаспадарчай тэхнікі. Разгортваецца спаборніцтва. Расце прадукцыйнасць працы. Калі на рамонт трактароў у 1933 г. затрачвалася 246 гадзін, то ў 1934 г. — 232, панізіўся сабекошт работ. Узраслі аб'ёмы выкананых МТС работ. Так (у пераводзе на мяккую пахату), калі у 1932 г. было апрацавана 2843 га, або па 135 га на адзін трактар, то ў 1933 г. — 2958 га (146 га на трактар), а ў 1934 г. — 5353 га — больш за 205 га на трактар. Па стану на 1.11.1934 г. у МТС — 27 трактароў, у т.л. 7 ХТЗ. Скарацілася колькасць аварый, але заставаліся вялікімі (да 30%) прастоі тэхнікі.

ВЕТЭРЫНАРНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ РАЁНА

У 1930 г. былі 1 ветурач, 2 фельчары; у 1931 г. — 1 ветурач, 2 фельчары; у 1932 г. — 1 ветурач, 3 фельчары; у 1933 г. — 1 ветурач, 5 фельчараў; у 1934 г. — 2 ветурачы, 5 фельчараў.

У 1930—1931 гг. у раёне дзейнічалі 1 ветлячэбніца і 1 ветпункт. У 1933 г. — 1 ветлячэбніца і 2 ветпункты, а ў 1934 г. — 1 ветлячэбніца і 4 ветпункты.

* * *

У развіцці прамысловасці раёна асаблівае месца займае чыгуначная станцыя Буда-Кашалёў. Абарот груза-пасажырскіх паяздоў складаў у 1931 г. — 8510; у 1932 г. — 8700, у 1933 г. — 9440, а ў 1934 г. — 9800 саставаў. Павялічвалася пагрузка вагонаў. Калі ў 1931 г. — 2411 вагонаў, то за 11 месяцаў 1934 г. — 2760, а выгружана ў 1931 г. — 360, за 11 месяцаў 1934 г. — 501 вагон. Развіццё калгаснага будаўніцтва і стабілізацыя эканамічнага становішча значна скарацілі патокі пасажыраў. Калі ў 1931 г. Буда-Кашалёўская станцыя прадала 272 740 пасажырскіх білетаў, то ў 1933 г. — 138 000, а за 11 месяцаў 1934 г. — 137 200.

У ліпені 1933 г. новы статус здабыў вінакурны завод. Ён перайшоў у сістэму «Белгалоўспірту», а да гэтага часу падпарадкоўваўся абласному масла-малочнаму трэсту. У новай сістэме пашырыліся перспектывы развіцця вытворчасці за кошт пашырэння вытворчых сродкаў, бесперабойнай пастаўкі сыравіны і матэрыялаў. Выпуск прадукцыі ў 1933 г. завод пачаў у верасні і да канца 1933 г. было выпрацавана 32 087 дэкалітраў спірту-сырцу на 228 235 руб., за 1934 г. выпуск прадукцыі склаў 47 760 дэкалітраў спірту на 382 141 руб. Сыравіна паступала за кошт мясцовых нарыхтовак збожжа і матэрыялаў, а таксама з Украіны і іншых пунктаў у Беларусі.

ІНКУБАТАРНАЯ СТАНЦЫЯ

У 1933 г. у раёне ўвайшла ў строй інкубатарная станцыя магутнасцю ў 2 інкубатарныя сістэмы «Камунар», ёмістасцю на 16 000 яйцамест. Станцыя мела 2 рухавікі — нафтавы ўнут-

ранага згарання магутнасцю 18 к/с і бензінны магутнасцю ў 3 к/с. Мелася 2 дынамамашыны ў 8 і 4 кВт. Ужо ў 1933 г. было выпушчана і размешчана па калгасах раёна 4000 цыплят, у 1934 г. — 4167 цыплят. Інкубатарная станцыя давала электраэнергію раённым установам.

КАМУНАЛЬНАЯ ГАСПАДАРКА

За час 1930 — 1934 гг. у Буда-Кашалёўскім раёне пабудавана 6 жылых дамоў на 16 кватэр, памяшканне НКУС, райміліцыі, радыёвузел і інш. Увайшлі ў строй пабудовы тыпавых школ (Наспенская і інш.). Па м. Буда-Кашалёва маецца камунальных будынкаў 9 з агульнай плошчай у 476,55 куб.м. Працуе лазня, гасцініца, каманда пажарнай аховы. Вялікі недахоп кватэр.

АХОВА ЗДАРОЎЯ

Бальнічная сетка ў 1930 г. мела 1 бальніцу на 15 ложкаў. За год бальніцу наведалі 612 чалавек, з іх 100 парадзіх. У складзе персанала 2 урачы, 2 фельчары і 1 акушэрка. За год было абслужана амбулаторна 25 000 хворых. Працаваў і 1 урачэбна-фельчарскі пункт. За год абслужана 522 хворых. Адчынены зубаўрачэбны кабінет (абслужана 4000 хворых), ФАП (абслужана 423 хворых). У 1932 г. адчынены медыцынскі пункт у саўгасе «Рагінь» і калгасе «Ураджай». У 1933 г. пабудаваны і абсталяваны інфекцыйны барак на 16 ложкаў. Пашыраецца сетка медыцынскіх і фельчарска-акушэрскіх пунктаў. У 1934 г. у раёне былі ўжо 2 урачэбныя пункты і 2 зубаўрачэбныя кабінеты.

З году ў год павялічвалася колькасць сродкаў на развіццё сеткі аховы здароўя. У лік бюджэтных сродкаў на развіццё аховы здароўя ў 1930 г. было вылучана 32 000 руб., у 1931 г. — 46 000, у 1932 г. — 72 000, у 1933 г. — 94 000, у 1934 — 114 000 руб.

Асігнаванні на ахову здароўя па гадах у рублях:

1930 г.	—	7500 руб.	— 4,9%	агульнага бюджэту, 0,22 руб.	на 1 чал.
1932 г.	—	48 618 руб.	— 5,8%	—"—	1,3 руб.
1933 г.	—	66 115 руб.	— 5,0%	—"—	1,84 руб.
1934 г.	—	100 000 руб.	— 8,2%	—"—	2,81 руб.

НАРОДНАЯ АСВЕТА

Да рэвалюцыі ў 1914 г. была 31 школа, з якіх 12 — земскіх з 420 вучнямі, 11 — царкоўна-прыходскіх школ з 385 вучнямі, 7 — народных школ з 245 вучнямі і 1 школа граматы (Хмяльнянская) — 17 вучняў. Усяго навучэнцаў — 1067 (14,7%). Школы ў большасці аднакамплектныя. Непісьменныя ў воласці складалі 85,3% насельніцтва.

Да 1917 г. у воласці не было ніводнай сярэдняй школы і школ павышанага тыпу. Па дадзеных за 1925 г. у раёне 35 школ з ахопам 2520 вучняў. Працуе 87 настаўнікаў. Колькасць насельніцтва школьнага ўзросту, ахопленага школамі, расло з года ў год. У 1930 г. у раёне вучняў — 5028, у 1931 — 6224, у 1934/35 — 7228 (97,3%). Каб высветліць склад вучняў па класах, прывядзем прыклад: у 1932/33 навучальным годзе у 1 — 4 класах навучалася 5463 вучні; у 5 — 7 класах — 784 вучні. У раёне было ўсяго 50 школ, у т.л. няпоўных сярэдніх — 11 і 1 сярэдняя школа (Кашалёўскі сельсавет). З часам і пашырэннем школьнай сеткі ў раёне расла і колькасць настаўнікаў: у 1930 г. — 154, а ў 1934/35 — 207. У 1934 г. правялі разбуйненне школ. З 50 школ у 1932/33 навучальным годзе ў 1933/34 — сфарміравалі 45 (11 няпоўных сярэдніх,1 — сярэдняя, 1 — руская двухкамплектная з 40 вучнямі і астатнія — пачатковыя). Кожная школа мела політэхнічнае абсталяванне. Пад 7-годкі ў раёне пабудаваны 3 тыпавыя школьныя памяшканні (Рагінская, Буда-Кашалёўская, Браніцкая).

Настаўнікі павышаюць сваю адукацыю і прафесійную падрыхтоўку: 24 вучацца завочна, 40 — на тэрміновых курсах. Больш за 100 настаўнікаў лічыліся настаўнікамі-ўдарнікамі.

У 1934 г. для школьных бібліятэк закуплена 31 148 кніг — па 4 кнігі на аднаго вучня.

З года ў год павышалася колькасць сродкаў, вызначаных на развіццё народнай адукацыі: у 1932 г. — 285 713 руб., у 1933 г. — 651 317 руб., у 1934 г. — 605 740 руб.

Выдаткі на народную асвету складалі ў 1934 г. — 57,3% бюджэту. У 1930 — 90 700 руб. (59,1%); у 1932 — 285 713 руб. (33,8%); у 1933 — 651 317 руб. (48,8%); у 1934 — 691 365 руб. (56,4%). Затраты на душу насельніцтва на народную асвету складалі: у 1930 г. — 2 руб. 58 кап.; у 1932 г. — 7 руб.74 кап.; у 1933 г. — 18 руб.08 кап.; у 1934 г. — 19 руб.43 кап.

Выдаткі на будаўніцтва па школах 1-й ступені складалі, улічваючы зарплату настаўнікаў, — 29 руб.09 кап., без зарплаты — 9 руб.09 кап. У 1933 г. — з зарплатай настаўнікаў — 33,92 руб.,

або з ўзростам на 16,6% і без зарплаты — 13,03 руб., (+43,3%) да 1932 г. Па сямігодках на 1 вучня у 1934 г. выдаткі складалі з зарплатай настаўнікаў 221,89 руб., без зарплаты — 55,32 руб.

У раёне 45 школ. З іх ва ўласных будынках — 22, з іх у тыпавых — 3, прыстасаваных — 54 хаты. У раёне 12 сямігодак, з іх у тыпавых будынках — 3 школы.

Непісьменных у раёне — 698, малапісьменных — 2198,з іх ахоплена школамі непісьменных — 532, малапісьменных — 1660.

РАБОТА БРЫГАДМІЛА

Пасля выхаду ў свет пастановы ўрада аб арганізацыі брыгад садзейнічання міліцыі ад 1932 г. у раёне арганізаваны 38 брыгад (300 чалавек), з якіх 36 — у калгасах. Актыўна дзейнічала Рагінская брыгада (кіраўнік Кірыла Новікаў).

* * *

Праяўляўся бандытызм. 12 кастрычніка 1934 г. у калгасе «Новае жыццё» Недайскага сельсавета адбываўся сход калгаснікаў. Якаў Шаўцоў прыйшоў дадому і сеў за стол вячэраць. У гэты час стрэлам праз вакно ён быў забіты напавал. У в.Патапаўка ў кастрычніку 1934 г. злачынцам Жураўлёвым быў забіты брыгадзір калгаса Жураўлёў. У час правядзення ўрачыстага свята, прысвечанага 17-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі, у калгасе «2-я пяцігодка» Недайскага сельсавета былі паранены стрэлам з абрэза дзве калгасніцы Купцова і Шупкова.

* * *

У Губіцкім сельсавеце ў 1933 г. была ліквідавана банда Сакалова Антона, якая складалася з 24 чалавек. Пры ліквідацыі былі забіты 2 бандыты. Ліквідавана банда Сінякова Сяргея ў складзе 3 чалавек. У Недайскім сельсавеце ліквідавана банда Кайтанава з 8 чалавек, у Буда-Кашалёўскім сельсавеце — банда з 10 чалавек Мацвея Фядорчанкі, а ў Патапаўскім сельсавеце — 3 банды (Зэкава — 8 чалавек, Зобава — 6 чалавек, Жураўлёва — 4 чалавекі). У Ліпініцкім сельсавеце — банда Сарокіна Аўраама з 4 чалавек, Дурава Максіма — з 3 чалавек, Загорцава Пятра — 11 чалавек, і інш. У 1934 г.ліквідавана банда Івана Дубініна з 3 чалавек, Фёдара Катлярова з 6 чалавек, Дзям'янава і Куралікава — па 2 чалавекі. На працягу 1932—1934 гг. міліцыяй раёна і нарсудом асуджана 50 жывёлаконекрадаў. Толькі ў 1933 г. міліцыяй канфіскавана наганаў — 7, паляўнічых стрэльбаў — 32, вінтовачных абрэзаў — 13, вінтовак — 2. У 1934 г. выкрыта і канфіскавана вінтовачных абрэзаў — 27, вінтовак — 3, рэвальвераў — 21, шашак — 2, паляўнічых стрэльбаў — 16. Раскрыты 2799 крымінальных злачынстваў.

У раёне за нядбайныя адносіны да працы ў 1934 г. асуджана 281 асоба, з іх 232 — калгаснікі, 49 — служачых.

* * *

Шчыльнасць насельніцтва ў Буда-Кашалёўскім раёне складала ў 1934 г. 43,2 кв. км на 1 чалавека. У раёне 12 сельсаветаў, 211 населеных пунктаў.

* * *

Агульны аб'ём бюджэту 1930—1934 гг.:

1930 г. — 153 500 руб. — 100%; 1932 г. — 844 638 руб. — 550,2%; 1933 г. — 1 132 785 руб. — 868,2%; 1934 г. — 1 226 625 руб. — 799,1%.

Бюджэт раёна ў 1934 г. у параўнанні з 1930 г. узрос на 799,1%.

Бюджэт расходаў на 1 душу насельніцтва ў 1930 г. — 4 руб. 37 кап., у 1932 г. — 22 руб.99 кап., у 1933 г. — 37 руб.92 кап., у 1934 г. — 34 руб.48 кап. У параўнанні 1930 г. з 1934 г. дае рост на душу насельніцтва на 789,0%.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 458. Л. 11, 15, 22—23, 38, 42—43, 46, 48—50, 52, 58, 66, 92—95.

З ПРАТАКОЛА СХОДУ ГРАМАДЗЯН ЛЮБАВІНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

20 сакавіка 1934 г.

Прысутнічалі 35 чалавек калгаснага актыву з групы аднесеных сельсаветам да катэгорыі палякаў, якія, тым не менш, карыстаюцца ў быту беларускай мовай.

Прэзідыум сходу: сябр Будзько — старшыня Райвыканкома, Ясінскі Алесь, Ясінская Паўліна.

Павестка дня:

1. Аб Ленінскай нацпалітыцы і правядзенне яе ў Любавінскім сельсавеце (дак.Будзько).

СЛУХАЛІ: даклад т. Будзько аб нацпалітыцы Савецкай улады і партыі, які ўказаў, што партыя і Савецкая ўлада ўсяляк заахвочваюць нацменшасцям, якія былі прыгнечаны царскім урадам.

ВЫКАЗАЛІСЯ: Вадзевіч М., Казлоўскі І., Ясінская Г. (10 чал.).

ПАСТАНАВІЛІ: Агульны сход калгасаў імя Дзяржынскага і «Орка» аднагалосна адзначае, што абсалютная большасць насельніцтва Любавінскага сельсавета з'яўляецца беларусамі і ў дамашнім быту і польскае насельніцтва ўжывае беларускую мову, і што ўся работа сельсавета праводзілася і праводзіцца на беларускай мове, і што арганізацыя польскай нацыянальнай школы, як і сельсавета, па сутнасці, была навязана меншасцю большасці заможнай часткай насельніцтва, якія, у асобным, усе высланы як кулакі з БССР, таму агульны сход просіць РВК разгледзець гэта пытанне і рэарганізаваць наш Любавінскі сельсавет у беларускі, таму што насельніцтва з'яўляецца беларусамі, таксама просім рэарганізаваць польскую сямігодку ў беларускую школу, каб сапраўды вучыць нашых дзяцей на роднай беларускай мове.

ПРЭЗІДЫУМ СХОДУ

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 448. Л. 24—25.

АБ ПОЛЬСКІМ НАСЕЛЬНІЦТВЕ ЛЮБАВІНСКАГА СЕЛЬСАВЕТА

19 жніўня 1934 г.

«...В Любавинском сельсовете имеется в колхозе Дзержинского 40 хозяйств с польским населением, в колхозе «Орка» — 15 хозяйств, в колхозе «Шлях Ленина» — 2 хозяйства. На территории сельсовета размещены 25 единоличных хозяйств, в которых проживают поляки. Всего в сельском Совете 82 таких хозяйства. Остальные хозяйства — белорусские римско-католического вероисповедания и приезжие белорусы.

Работа в сельсовете ведется на белорусском языке за исключением школы семилетки, где преподавание ведется на польском языке. Среди учащихся, по нашим данным, большой процент белорусов, которые совершенно не знают польского языка.

...В процессе работы, т.е. проведения собраний среди населения поляков, по нашим данным, выступать на собрании никто не намерен, так как боятся репрессий и поляки скрывают свою национальность, все живут под маркой белорусской национальности, но не исключается возможность проведения работы нелегальным путем со стороны верующих одиночек.

Ясинская Антонина, Левкович Стефания, Круковский Иосиф, Ясинский Павел, бывший председатель сельпо, Чернушевич Банифаций — данные лица могут и нелегально командировать с данным вопросом в Рогачев для совета с ксендзом и распространения слухов о ликвидации польской национальности. Указанных лиц просьба на собрании не касаться, а через актив установить их настроение...»

НАЧАЛЬНИК РО УГБ НКВД (Дулесов)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 448. Л. 11.

З ЛІСТА Б.С.ЮХНЕВІЧА Ў БУДА-КАШАЛЁЎСКІ РАЙВЫКАНКОМ

...З 1919 года я, Юхневіч Браніслаў Сямёнаў, жыву ў Буда-Кашалёўскім раёне, з 1924 — у Любавінскім сельсавеце, дзе ў той час насельніцтва ў пераважнасці было польскае. На тэрыторыі маёнтка абшара Салтана, у 2-х км ад Любавіна знаходзіўся касцёл. Зараз на тэрыторыі Буда-Люшаўскага сельсавета, у якім да 1929 г. быў ксёндз, у тым жа гаду ксёндз Валынец публічна адрокся ад сана, касцёл быў закрыт. Насельніцтва Любавінскага сельсавета па пераважнасці заможнае (кулацкае). Былі гаспадаркі, якія мелі, па расказах старыкоў, прыгонных сялян, як, напрыклад, Крукоўскі Іосіф, які меў прыгоннага селяніна. Калі той ад яго ўцёк, то ён аддаў яго ў салдаты на 25 гадоў. У сучасны момант гэтага Крукоўскага сын Антон Іосіфавіч знаходзіцца ў калгасе «Орка» членам калгаса. Дзе зараз знаходзіцца калгас «Орка», гэта зямля належала абшарніку Кузняцову. У 1924 г. там адбіты п. Новы Любавінь, а таксама быўшы х. Ляды, дзе мелась да 1929 г. паравая мельніца Цукінскага К., які да рэвалюцыі быў арандатарам хутара і мельніцы абшарніка Кузняцова. Пасля рэвалюцыі хутар і млын адышлі ў карыстанне Цукінскага К. У 1929 г. Цукінскі быў высланы як кулак. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі насельніцтва Любавінскага сельсавета не мела магчымасці адкрыта

вучыцца па-польску, школы не было. Вучылі польскі язык чытаць скрытна па дамах. Па расказах старыкоў, калі даведваўся аб існаванні такой школы ўраднік,то прыязджаў, адбіраў кнігі, школу разганяў. З часу рэвалюцыі была арганізавана польская школа, дзе настаўнікам быў Міхайлоўскі Вацэк, пасля ўехаўшы ў Польшчу. Пасля Міхайлоўскага настаўнікам быў нейкі прафесар Парноўскі, які жыў у ксяндза Сабачынскага Мечыслава, у 1922 г. таксама выехаў у Польшчу. Настаўніцай заступіла Сталыпка Яніна (Ястражэмская), бежанка з Польшчы, якая ўчыцельствавала ў Любавінскай школе да 1929, яе муж Сталыпка Міхаіл высланы за межы БССР, як контррэвалюцыянер...

Да 1926 г. у Любавіне быў сельсавет беларускі, пры перавыбарах у 1926 г. па ініцыятыве Крукоўскага Івана Іосіфавіча, Сенажэнскага Вікенція Стэфанавіча, Залескага Аляксандра і Антона Міхайлавіча, Сталыпка Ігната Міхайлавіча арганізаваны польскі нацыянальны Савет. Першы састаў склалі: старшыня — Сталыпка І.М., сакратар — Міхайлоўскі Іван Антонавіч, члены — Вярбоўскі Пётр, Залескі Антон, Сенажэнскі Аляксандр, Ніцыеўскі Дзмітрый, Успенскі Свірыд, з ліку якіх у даны момант высланы Сенажэнскі, Ніцыеўскі, Залескі. Сам старшыня сельсавета Сталыпка Ігнат у чэрвені 1928 г. зняты з работы, як праводзіўшы кулацкую лінію і засуджаны на 6 месяцаў прымусовай працы. Дзелапраізводства Любавінскага сельсавета, калі арганізаваўся нацсавет, вялося на беларускай мове, за выключэннем пратаколаў пленумаў і прэзідыума сельсавета, запісаў актаў грамацкага стану таму, што ў Райвыканкоме не могуць чытаць па-польску і патрэбна перапіску весці на беларускай мове. Насельніцтва вельмі мала ўжывала польскі, за выключэннем некалькіх гаспадарак.

Сучасная польская 7-ка ў Любавіне ўкамплектавана наступным чынам: Рудзінская Вера Іванаўна — дырэктар школы калгаснай моладзі, скончыла Мінскі тэхнікум, харашо ўладае польскай мовай, Чэрнушэвіч Вацлаў, Рудзінскі Венэк скончылі Ленінградскі польпедтэхнікум, добра ўладаюць польскай мовай, Чарнышэвіч П., Сталыпка Косця — мясцовыя настаўнікі, скончылі 6-месячныя курсы пры педтэхнікуме, Навіцкая Геня таксама з курсаў, слаба падрыхтавана да педпрацэсу. Апрача таго, Сталыпка К., Чарнушэвіч П. маюць высланых родзічаў.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 448. Л. 20–21.

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА Ў СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ АДДЗЕЛ ЦК КП(б)Б ПРА ХОД КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў БУДА-КАШАЛЁЎСКІМ РАЁНЕ

24 жніўня 1934 г.

1. Общая характеристика коллективизации в районе.

На 1 июня 1934 года в Буда-Кошелевском районе насчитывалось всех колхозно-крестьянских хозяйств — 7287, в т.ч. колхозных дворов 3403 (47%) и единоличных дворов — 3884 (53%). Из общего количества единоличных хозяйств не занимались сельским хозяйством 238 (6%) к общему числу единоличных дворов и 3,2% к общему количеству всех дворов в районе.

В районе имеется 63 колхоза, в которых сосредоточено пахотной земли 18 664 га, что составляет 98% всей пахотной земли. Сенокоса — 8262 га, что составляет 54,7% всего сенокоса, лошадей — 3445, что составляет 50,7% всего поголовья. Крупный рогатый скот в колхозах и у колхозников — 7519 голов, что составляет 57,4% всего крупного рогатого скота, свиней в колхозах и у колхозников — 6502 голов, что составляет 49% всех свиней, овец в колхозах и у колхозников — 2506 голов, что составляет 46,5% всех овец.

2. Ход коллективизации за последний год.

Процент коллективизации в районе на июль месяц 1933 года составлял — 37. Основное внимание было направлено на организационно-хозяйственное и политическое укрепление существующих колхозов, так как они были значительно засорены классово-чуждыми элементами (за год исключено из колхозов 97 хозяйств и заменено 23 председателя колхозов из общего количества 63) и кроме того почти у каждого колхозника приусадебный участок достигал от 1,5 до 3-х га. В отдельных колхозах (Орка) приусадебные участки отдельных колхозников достигали 5 га.

Такое положение привело к незаинтересованности колхозников в продуктивности общественного производства. Земля колхозных массивов плохо обрабатывалась. Имели место сплошные опоздания, а то и невыходы на работу, что, естественно, отразилось на ценности трудодня.

В 1933 г. ценность трудодня составляла по колхозам зоны МТС: зерновых — 1,4 кг, картофеля — 3,5 кг, по колхозам не зоны МТС: зерна — 2 кг, картофеля — 5,7 кг. В отдель-

Першыя піянеры
в. Недайка.

Калгаснікі калгаса
імя Энгельса. 1931 г.

Члены Буда-Кашалёўскага
РК ЛКСМБ. 1935 – 1936 гг.

ных колхозах цена трудодня в 1933 году была совершенно ничтожной. Колхоз «Тракторист» (зона МТС) выдал на трудодень зерновых — 845 гр., картофеля — нет. Колхоз «Гранит» (зона МТС) выдал на трудодень зерна — 729 гр., картофеля — 3 кг. Колхоз «Большевик» (зона МТС) выдал зерновых — 833 гр., картофеля — 1,5 кг. Колхоз «Освобождение» (не зона МТС) выдал зерновых - по 828 гр., картофеля — 3 кг. Колхоз «Ударник» (зона МТС) выдал на трудодень зерновых по 627 гр., картофеля — нет. Колхоз «Интернационал» (зона МТС)выдал на трудодень зерновых 615 гр., картофеля — 1кг. Колхоз Дзержинского (зона МТС) выдал на трудодень зерновых по 600 гр., картофеля — нет. Колхоз «Пролетарий» (не зона МТС) выдал на трудодень зерновых 570 гр., картофеля по 2,7 кг. Колхоз «Орка» (зона МТС) выдал на трудодень зерновых по 220 гр., картофеля — по 800 гр. Колхоз «Путь Ленина» выдал на трудодень зерновых по 163 гр., картофеля по 700 гр.

После проведения уменьшения приусадебных участков и очистки колхозов от классово-чуждых элементов начался прилив в колхозы. За год процент коллективизации поднялся до 47. Но и при этом положение по коллективизации в районе в разрезе сельских Советов представляет собой пеструю картину, как это и видно из следующего: Любанский — 81, Дуравичский — 71, Рагинский — 68, Липиничский — 64, Кошелевский — 62, Забабский — 54, Буда-Люшевский — 37, Буда-Кошелевский — 36, Недойский — 33, Потаповский — 30, Губичский — 26, Заболотский — 17%.

По коллективизации особое внимание уделялось отстающим сельсоветам, в результате за год процент коллективизации в этих сельсоветах удвоился (Потаповский — с 14 до 30, Заболотский — с 9 до 19%).

Причины слабого прилива в колхозы (10% за год) — слабость массово-политической работы среди населения, засоренность отдельных сельсоветов классово-чуждым и уголовным элементом, недостаточный нажим по линии выполнения единоличными дворами всех государственных обязательств, о чем говорят итоги проверок района.

В результате работы по коллективизации в июле 1934 года в отдельных сельсоветах процент коллективизации дворов увеличился на 6 — 8, по району — на 3 и составил 50% всех дворов.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 397а. Л. 1—6.

З ПАСТАНОВЫ РАЁННАЙ КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВЕ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА І УВАРАВІЦКАГА РАЁНАЎ

1934 г.

...Адзначаючы, што нараду з перадавымі калгасамі («Ураджай», імя Якаўлева, «Перадавік», «Чырвоны Сцяг», «Чырвоная Любань», «Колас») Прыбарскага сельсавета і сельсаветаў Ліпініцкі, Прыбарскі і Забабскі, па якіх сяўба закончана, маецца рад калгасаў і сельсаветаў, у якіх не разгорнуты сацыялістычныя спаборніцтвы і стаханаўскі рух...

Камісія ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Пераходны Чырвоны Сцяг Раённага камітэта і Райвыканкома перадаць Ліпініцкаму сельсавету, як перадавому па сяўбе.

2. За лепшыя паказчыкі на сяўбе занесці на Чырвоную Дошку: Ліпініцкі сельсавет (старшыня НЕПАЧАТОЙ), Прыбарскі (старшыня Кліменка). Кандыдатам залічыць Забабскі сельсавет (старшыня ГРАМЫКА).

3. За добрыя паказчыкі сева збожжавых, ільну таксама занесці на Чырвоную Дошку калгасы: «Ураджай» (старшыня Гольдзін), імя Якаўлева (старшыня Шаўцоў), «Перадавік» (старшыня Цітоў), «Чырвоны Сцяг» (старшыня Чарняўскі), «Чырвоная Любань» (старшыня Макараў), «Колас» (старшыня Барашка), імя Варашылава (старшыня Круцікаў).

4. За ганебнае адставанне на сяўбе збожжавых і льну занесці на Чорную Дошку Забалоцкі сельсавет (старшыня Гайшуноў), Патапаўскі сельсавет (старшыня Янвоў).

Камісія (подпісы)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 448. Л. 1—2.

З ХАРАКТАРЫСТЫКІ АДСТАЮЧЫХ КАЛГАСАЎ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА І МЕРАПРЫЕМСТВЫ ПА ІХ АРГАНІЗАЦЫЙНЫМ І ГАСПАДАРЧА-ПАЛІТЫЧНЫМ УМАЦАВАННІ Ў ХОДЗЕ ДАЛЕЙШАЙ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ

Калгас імя Дзяржынскага Любавінскага сельсавета.

Калгас імя Дзяржынскага мае ў сваім карыстанні 677 га пахатнай зямлі, з іх пасяўной — 569 га. Двароў — 116. Працаздольных калгаснікаў — 263 чалавекі. Рабочых коней — 106. Нагрузка на каня — 6,4 га, а з улікам сенажацяў і гаспадарчых работ — 6,7 га.

У калгасе 3 палявыя брыгады, 2 брыгады на МТФ, АТФ, СТФ, брыгада па садоўніцтву, агародніцтву і пчалярству, акрамя таго калгас абслугоўвае масладзельчы завод. На розных падсобных работах занята 40 чалавек, тады як на паляводстве — 223 чалавекі, і на кожнага працаздольнага калгасніка прыходзіцца па 3 га пахатнай зямлі і па 2 га сенажаці. Калі ўлічыць, што каля 30% паляводчых работ калгасу выконвае МТС, то нагрузка на аднаго працаздольнага ў калгасе цалкам нармальная. У калгасе ёсць 4 радковыя сеялкі, 1 сеялка для рассейвання мінугнаенняў, 4 жняяркі-самаскідкі, 4 сенакасілкі, 1 бульбакапалка, 2 конных малацілкі з прыладамі і г. д. Нягледзячы на гэта, сеў скончаны са спазненнем на 10 дзён, сенажаць убрана са спазненнем на 20 дзён і не поўнасцю. Пры ўборцы збожжавых страты склалі 10% ад ураджаю. Палі засмечаны. Сады на плошчы 26 га не дагледжаны, кусты ягаднікаў, пітомнікі — запушчаны і амаль цалкам знішчаны. У безгаспадарчым становішчы знаходзяцца лугавыя ўгоддзі. У жывёлагадоўлі з пачатку года загінула 95 галоў жывёлы, з іх 28 цялят, 67 свіней. Фермы жывёлы не ўкамплектаваны.

Прычыны адставання калгаса:

— адсутнасць працоўнай дысцыпліны (нявыхады на работу ў асобныя дні складаюць 25 — 30%). Дрэнна арганізавана праца. Не ўведзена індывідуальная здзельная аплата працы;

— адсутнасць адпаведнага кіраўніцтва, частая змена старшынь, брыгадзіраў, загадчыкаў ферм;

— раскіданасць калгаса (каля 60 хутароў) у радыусе 4—6 км ад калгаса. Наяўнасць 21-го хутара аднаасобнікаў;

— размяшчэнне калгаса на нізкіх забалочаных глебах, інш.

Мерапрыемствы па ўмацаванні калгаса:

1. Умацаваць кіраўніцтва калгаса ў брыгадах і на фермах.
2. Правесці самаачыстку ад чужых элементаў.
3. Разбуйніць калгас на 2 гаспадаркі.
4. У бягучым годзе пракласці канал да 10 000 паг.м.
5. Пабудаваць свінарнік і 2 канюшні.
6. Умацаваць калгас крэдытамі...

Калгас «Орка» Любавінскага сельсавета.

Калгас займае плошчаў — 652 га, з іх пахаці — 323 га, пасяўной зямлі — 260 га. Двароў калгаснікаў — 31, працаздольных — 60 чалавек. Рабочых коней — 51. Нагрузка на каня — 6,33 га, на 1 працаздольнага — 5,5 га. Садоў — 18 га, ферм кароў — 75, свіней — 10, авечак — 40 галоў. На палявых работах занята 40 чалавек. МТС выконвае да 35 палявых работ. У калгасе на 1 працаздольнага — каля 10 га зямлі, таму ўборачныя работы выконваюцца з дапамогай рабочых з іншых калгасаў. У дрэнным становішчы жывёлагадоўля, агароды і сады.

Прычыны адставання:

— вялікі недахоп рабочай сілы;

— забалочанасць зямель;

— наяўнасць 15 хутароў калгаснікаў, размешчаных за 3 — 4 км ад калгаса;

— адсутнасць надворных і памяшканняў для жывёлы, інш.

Меры па ўмацаванні калгаса:

1. Перасяленне 20 гаспадарак (на пачатках поўнай добраахвотнасці) у калгас «Орка» з іншых калгасаў раёна. Адпусціць асігнаванні на гэту мэту.

2. Меліярацыя 6000 паг.м (1934 — 1935 гг). Выдзеліць патрэбны доўгатэрміновы крэдыт.

3. Гаспадарча ўпарадкаваць калгас. Адрамантаваць і ўцяпліць жывёлагадоўчыя памяшканні, інш. меры.

Калгас імя Якаўлева Забабскага сельсавета.

Маецца 266 га зямлі, з якой 167 га пахатнай, 162 га пасяўной. Двароў калгаснікаў — 16. Працаздольных — 25. Коней — 20. У калгасе 28 галоў рагатай жывёлы (60% планкамплекту). МТС вымушаны абслугоўваць гэты калгас замест больш буйных калгасаў.

Прычыны адставання:

— адсутнасць наладжанага кіраўніцтва;

— недахоп рабочай сілы (з 150 двароў на пасёлку — 16 калгаснікаў).

[Меры па ўмацаванні калгаса]:

— пашырыць работу па калектывізацыі;

— перадаць калгасу кулацкі будынак для праўлення калгаса, а таксама будынкі для перабудовы ў памяшканні для размяшчэння рагатай жывёлы, у тым ліку тыя, што былі абагулены і зараз захоплены выключанымі з калгаса;
— укамплектаваць фермы жывёлай.

Калгас «Бальшавік» Забабскага сельсавета.
Усёй зямлі 382 га. Ворнай зямлі — 296 га, пад пасевам — 191 га. Каля 50 га зямлі не скарыстоўваецца. Двароў калгаснікаў — 35, працаздольных — 60. Рабочых коней — 32. Калгас мае ўсяго 13 галоў рагатай жывёлы замест 33 па плану. Свіней з парасятамі — 39. Авечкагадоўчая ферма не ўкамплектавана.

Калгас «Трактарыст» Недайскага сельсавета.
Зямлі — 861 га, з іх ворнай — 398, пасяўная плошча — 342 га. Двароў калгаснікаў — 54. Працаздольных — 80 чалавек. Рабочых коней — 66. Калгас мае МТФ — 142 галавы рагатай жывёлы, СТФ — 100 галоў свіней, авечак — 93, пчол — 35 калод. На фермах працуе 25 чалавек. Сфарміраваны 2 палявыя брыгады. Землі калгаса раскіданы на адлегласці 5 і больш км ад месцажыхарства калгаснікаў.

Калгас «Ударнік» Буда-Кашалёўскага сельсавета.
Усяго зямлі 620 га, з якой ворнай — 452 га, пад пасевамі — 398 га. Двароў калгаснікаў — 50, працаздольных — 116. Рабочых коней — 59. Рагатай жывёлы — 99, авечак — 20, свіней — няма.
Калгас «Новая зара» Буда-Кашалёўскага сельсавета.
Усей зямлі 285 га, з іх ворнай — 155 га, у т. л. пасяўной — 149 га. Двароў — 17, працаздольных — 35, коней — 25. Гэты калгас адстае па ўсіх галінах вытворчасці. На калгасных землях — 60 гаспадарак аднаасобнікаў. Гаспадаркі калгаснікаў раскіданы па хутарах. У калгасе няма надворных і пабудоў для жывёлагадоўлі.

Калгас імя Энгельса Губіцкага сельсавета.
Зямлі 800 га, з якіх 408 га — ворнай. Пад пасевам — 339 га. Двароў калгаснікаў — 47, працаздольных — 100. Рабочых коней — 51. Калгас мае 103 галавы рагатай жывёлы. Аўцаферма — 68 галоў, свінаферма не ўкамплектавана. У калгасе нізкая вага працадня. У 1933 г. на працадзень выдалі 150 гр зернавых, у 1934 г. — 1 кг зерня. Запазычанасць па фінансіраванні складае 30 000 руб. Адсутнічаюць крыніцы пагашэння запазычанасці.

Калгас «Селькор» Забалоцкага сельсавета.
Зямлі 475 га, з якой 198 га — ворнай. Двароў калгаснікаў — 30, працаздольных — 55 асоб. Рабочых коней — 15. У калгасе рагатай жывёлы — 20, свіней — 15, авечак — 10 галоў.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 605. Л. 17 — 31.

АБ СТАНЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў РАЁНЕ

Верасень 1935 г.

I. ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ БУЙНОЙ РАГАТАЙ ЖЫВЁЛЫ:
Маецца МТФ БРЖ — 66. Усяго жывёлы 5764 галоў, у т. л. кароў — 1754, у т. л. нецелей — 412, цялят бягучага года — 2355. У раёне безкароўных гаспадарак — 740. Па гаспадарках калгаснікаў і аднаасобнікаў прыплод бягучага года па БРЖ склаў 3019 галоў.
II. СВІНАГАДОЎЛЯ:
У калгасах СТФ — 53 фермы. Усяго пагалоўя свіней — 2145, у т.л. свінаматак — 459, свінаматак ад 4-х да 9 месяцаў — 211, парасят — 1172.
Выдана парасят калгаснікам — 132. Пала — 197. Маецца парасят у калгаснікаў і аднаасобнікаў — 8351.
III. АВЕЧКАГАДОЎЛЯ:
Авечкатаварных калгасных ферм — 46. Усяго пагалоўя — 1439 авечак, у т. л. аўцаматак — 731, ярак — 127. Прыплод бягучага года — 629 галоў. Пала ягнят — 51. У гаспадарках калгаснікаў і аднаасобнікаў — 1479 авечак.
IV. КОНЕГАДОЎЛЯ:
Усяго ў калгасах маецца жарабят — 580, у аднаасобнікаў — 90.

V. ПЛЕМЯННАЯ ЖЫВЁЛА:

Маецца племяннай буйной рагатай жывёлы — 286 галоў, у т. л. кароў і быкоў — 229, свіней і хракоў — 195, авечак і бараноў —42, конематак і жарабцоў — 31.

Намеснік загадчыка райза (Лазаковіч)

Ст. заатэхнік

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 601. Л. 9.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЗІМЫ 1934—1935 гг.

1. Пачата будаўніцтва 14 новых свінарнікаў — на 1190 галоў. Закончана і здадзена ў эксплуатацыю 5 свінарнікаў на 770 галоў. У шэрагу калгасаў свінні размяшчаліся ў незакончаных будработамі памяшканнях. Прыстасаваны і ўцеплены 27 свінарнікаў. Пабудавана новых кароўнікаў — 26 на 2600 галоў і 2 новыя цялятнікі. Прыстасаваны і ўцеплены — 24 кароўніка. Пабудавана новых канюшань — 25 на 1750 галоў.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 2а. Спр. 458. Л. 66.

Умацаванне калгаснага ладу

Першыя гады пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы раёна не прынеслі жаданых поспехаў. Наадварот, «гонка за тэмпам» калектывізацыі стала сур'ёзнай прычынай спаду вытворчасці: зніжалася ўраджайнасць, значна скарацілася пагалоўе жывёлы, падалі надоі малака і прыбаўленне ў вазе маладняку на адкорме, памяншаліся агульныя аб'ёмы вытворчасці і пры гэтым непамерна рос сабекошт. Хуткае сацыяльна-эканамічнае і культурнае аднаўленне вёскі не адбывалася.

Прычын было шмат: часовыя (арганізацыйныя, суб'ектыўныя), трывалыя (перагібы, адсутнасць вопыту і інш.), прынцыповыя эканамічнага і псіхалагічнага характару. На аналіз, прагназіраванне і папярэджванне негатыўных працэсаў не хапала часу. Па стану на 1936 г. было калектывізавана 86,8% двароў. Калгасы мелі 29 695 га ворыва і 15 076 га сенажацяў, або займалі 88,2% агульнай зямлі. У 1936 г. у раёне заставалася 900 гаспадарак аднаасобнікаў, якія мелі 1136 га ворыва (каля 12%). Галоўным быў «тэмп» калектывізацыі, хаця палітыка «гонкі за тэмпам» не прыносіла адчувальных вынікаў.

Складаным пытаннем была аплата працы. Доўгі час бытавалі розныя формы аплаты: «па паях», пры якой былы бядняк і батрак атрымлівалі за сваю працу менш, чым серадняк, паколькі іхнія паі былі меншыя, чым у сераднякоў, або аплата за праведзены на працы час (падзёншчына). Сустракаўся і «ядоцкі» прынцып (плата па едаках). Выходзіла так — абы ў сям'і едакоў больш! А які іх удзел у вытворчасці — значэння не мела. А на аплату па працаднях у калгасах перайшлі не адразу.

Калгасна-кааператыўная ўласнасць патрабавала рашэнняў адносна дзяльбы даходаў так, каб забяспечыць пры гэтым хуткія тэмпы росту калгаснай вытворчасці. Аплата працы па працаднях была скіравана на зацікаўленасць калгасніка ў кольксасным, а не ў якасным росце вытворчасці. Незразумелым было і тое, што за адзін светлавы працадзень добрасумленны калгаснік мог выпрацаваць 1,5—2 нормы і зарабіць два працадні. Тым не менш працадзень прыжыўся, хаця яшчэ доўгі час не стымуляваў калгаснікаў да высокай вытворчасці.

Негатыўную ролю адыгрывалі перагібы ў калгасным будаўніцтве. Па вытворчай спецыялізацыі Буда-Кашалёўскі раён з'яўляўся жывёлагадоўчым. У 1931—1932 гг. у раёне была абагулена ўся прадукцыйная жывёла. Аднак умоў для яе ўтрымання не было. Падзеж, асабліва маладняку, дасягаў 50% пагалоўя.

У далейшым з пункту гледжання колькаснага росту пагалоўя за 1935 і 1936 гады у параўнанні з 1934 г. прырост па агульнаму пагалоўю буйной рагатай жывёлы складаў 138% (па цялятах — 320%), пагалоўю свіней — 183% (па маладняку — 235%). У авечкагадоўлі прырост склаў усяго 1%, па пагалоўю коней — зніжэнне (у 1934 г. было 6956, у 1936 — 6282 галоў; падзеж — 11%). За гэтыя гады ў раёне паляпшалася пароднасць і прадукцыйнасць жывёлы. Пашырыўся ўвод спецпамяшканняў для яе ўтрымання, былі па-

будаваны 36 стайняў, 26 кароўнікаў і 3 аўчарні.

Між тым падзенне сельскагаспадарчай вытворчасці ў раёне з пераходам да суцэльнай калектывізацыі ў параўнанні з перыядам НЭПа аказалася даволі адчувальным, асабліва ў жывёлагадоўлі. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўзровень 1928 г. па гэтай галіне ў раёне так і не аднавіўся. Адна з прычын — беспадстаўная змена кадраў сярэдняга звяна ў жывёлагадоўлі. Па стану на 1937 г. загадчыкаў ферм са стажам да 1 года было 28, да 2 гадоў — 16, да 3 гадоў — 9 чалавек, ад 3 да 4 гадоў — 13 і ніводнага са стажам працы 4—5 гадоў. Нізкім заставаўся і прафесійны ўзровень жывёлаводаў. З 1935 г. пачалася масавая падрыхтоўка кадраў жывёлаводаў. Праз курсы ў 1935 г. прайшлі 38 даярак і свінарак, 16 загадчыкаў ферм, у 1936 г. — 29 загадчыкаў ферм і 27 конюхаў.

Балюча адбіўся на жыцці сялян і прыняты 7 жніўня 1932 г. Закон «Аб ахове сацыялістычнай маёмасці». Ён уводзіў у якасці меры пакарання за крадзеж калгаснай і кааператыўнай маёмасці расстрэл з канфіскацыяй усёй маёмасці і замену, пры змякчаючых акалічнасцях, пазбаўленнем волі на тэрмін не менш за 10 гадоў з канфіскацыяй усёй маёмасці. Амністыя па такіх справах была забаронена. У вёсцы яго называлі «законам аб пяці каласках». У святле новага закона сельскія Саветы нярэдка чынілі самасуды.

Адчувалася нізкая вытворчая і працоўная дысцыпліна, часта — безгаспадарчыя адносіны кіраўнікоў да арганізацыі працы. Жорсткі адміністрацыйны падыход, выключэнне з калгаса за нават адзіны нявыхад на работу асабістым рашэннем старшыні або на прэзідыуме, а не на агульным сходзе калгаснікаў не дапамагалі паправіць справы. Заставаліся нізкімі вытворчыя паказчыкі працы, прадукцыйнасць жывёлагадоўлі і ўраджайнасць палёў.

Ураджайнасць збожжа ў 1934 г. склала 6,6 ц з гектара, у 1935 г. — 6,5 ц; тым не менш у 1935 г. раён паставіў дзяржаве каля 1000 тон збожжа. Калгаснікі ж атрымалі па 400—600 г збожжа і па 3—4 кг бульбы на працадзень і не мелі жадання да напружанай працы.

На наладжванні работы ў калгасах негатыўна адбіліся і дапушчаныя перагібы ў землеўпарадкаванні. Ад прысядзібных участкаў калгаснікаў было адрэзана і перададзена саўгасам зямлі значна больш за ўстаноўленыя нормы. Пастановай СНК і ЦК ВКП(б) ад 2 жніўня 1937 г., якая падавалася як аказанне дапамогі беларускаму сялянству па ліквідацыі вынікаў варожай дзейнасці ў сельскай гаспадарцы, у раёне былі вернуты 907 га прысядзібных зямель. Вернута калгасам больш за 1411 га зямлі, што ў свой час была адабрана ў калгасаў і аддадзена саўгасам. Была перагледжана і падатковая палітыка. У 1934—1936 гг. у раёне падатковая палітыка праводзілася так, што аднаасобныя гаспадаркі абкладаліся непасільнымі падаткамі. У іх уключаліся неземляробчыя даходы. У ходзе мерапрыемстваў па зборы падаткаў у больш як 1000 гаспадарак раёна былі адабраны асабістая маёмасць, жывёла, інвентар і інш. Незаконна адабраная маёмасць была вернута больш як 800 гаспадаркам. Вернуты 54 кані, 61 карова, хлявы, гумны, а таксама 150 000 руб. грашыма. Спісаны нядоімкі па падатках на 315 000 руб. (Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 69. Л. 30.)

У 1935 г. быў прыняты новы Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі. Зямля замацоўвалася за калгасамі ў бестэрміновае, вечнае карыстанне. Яна не падлягала ні куплі-продажу, ні здачы ў арэнду. Статут вызначаў і памеры прысядзібных участкаў калгаснікаў.

Правядзенне ў жыццё артыкулаў статута выклікала ўздым творчай энергіі і працоўнага энтузіязму. Разгортваецца спаборніцтва, расце прадукцыйнасць працы работнікаў вядучых прафесій. Свінарка М.Дз.Нікіценка з калгаса імя Дзяржынскага ў 1935 г. атрымала ад 5 свінаматак па 23 парасяці. Цялятніца В.Жукава з калгаса «Чырвоны цягнік» вырасціла за тры гады 137 цялят без адзінай страты. Аўчар калгаса «Чырвоны луч» Я.Картавенка за тры гады захаваў увесь маладняк ягнят. Свінарка саўгаса «Рагінь» В.Шэльманская дабілася штодзённага прыросту вагі 4—5-месячных парасят па 600—800 г. Загадчыца фермы камсамолка Старасценка з калгаса «Ураджай» вывела ферму па ўсіх вытворчых паказчыках у лік узорных раёна.

У 1935 г. высокія ўраджаі атрымалі калгасы «Гром», «Ураджай», імя Дзяржын-

скага, імя Сталіна (Кашалёўскі сельсавет). На асобных участках атрыманы нават рэкордны ўраджай (па 18 — 20 ц зерня, па 200 — 250 ц бульбы, па 4 — 4,5 ц ільновалакна). У гэтых калгасах калгаснікі атрымалі на працадзень больш за 2 кг збожжа, 8 — 10 кг бульбы, а таксама да 1 руб. грашыма. Калгасы маюць добрыя клубы, працуюць радыёўстаноўкі, ёсць патэфоны, бібліятэкі.

Брыгадзір 1-й брыгады калгаса «Гром» Верачынскі і звеннявыя Ц.Яначкін, П.Сапліцкі, І.Дзмітраўцоў на асобных участках дабіліся рэкордных ураджаяў ячменю — па 25 ц з гектара на плошчы 7 га, аўса — на плошчы 9 га па 25 ц з гектара, бульбы — на плошчы 3 га па 500 ц з гектара, ільновалакна — на плошчы 3 га па 10 ц з гектара.

У калгасе «Дружба» на асобных участках звеннявыя А.Бібікаў, Я.Аўраменка, А.Палякоў, А.Філіпаў, А.Ляўкоў атрымалі пшаніцы па 20 ц з гектара на плошчы 5 гектараў, ячменю — па 25 ц з гектара на плошчы 15 га, бульбы па 500 ц, ільновалакна — на плошчы 3 га па 10 ц з гектара.

Уздыму творчай актыўнасці шырока садзейнічала развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы МТС. Павялічвалася не толькі колькасць тэхнічных сродкаў у МТС і калгасах, што садзейнічала росту прадукцыйнасці працы асабліва ў працаёмкіх працэсах вытворчасці, але і складваліся спрыяльныя ўмовы выкарыстання перадавых дасягненняў агранавукі і агракультуры ў калгасах і саўгасах. З другога боку, тэхнічнае ўзбраенне вытворчасці садзейнічала росту адукаванасці і творчаму падыходу ва ўсіх галінах гаспадаркі. Калі ў 1934 г. трактарны парк Буда-Кашалёўскай МТС у пераводзе на мяккае ворыва апрацоўваў 4597 га калгасных зямель, то ў 1935 г. — 7628 га, а ў 1936 г. — больш за 20 000 га. Калгасы, якія абслугоўвала МТС, атрымлівалі мінеральныя ўгнаенні. Механізатары ўключаліся ў стаханаўскі рух за якаснае і датэрміновае выкананне ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Пасадка лесу ў Буда-Кашалёўскім лясніцтве. 1935 г. На здымку (злева направа): Т.С.Гузава, памочнік ляснічага, Ф.І.Зяцікава, рабочая, В.І.Зяцікаў (крайні справа), памочнік трактарыста.

Разгортваецца спаборніцтва паміж калгасамі, звеннямі, фермамі і нават асобнымі калгаснымі дварамі. Ужываюцца стаханаўскія метады працы. У калгасе «Камінтэрн» калгаснікі Ф.Арцеменка і М.Карніенка пры норме 0,70 га параконным плугам узаралі па 1,35 га. У калгасе «Перамога» А.Быкаў, П.Ткачоў — узаралі па 0,96, а М.Дудкоў — 0,94 га. К.Быкаў на коннай сашніковай сеялцы пры норме 4 га засяваў па 5—6 га, а П.Крапасны, якому споўнілася 70 гадоў, засяваў уручную за працадзень па 6 га. Але большасць калгасаў у раёне заставаліся маламоцнымі.

Галоўнымі галінамі прамысловай вытворчасці ў гэтыя гады былі лесанарыхтоўка і вінаробства. Развіваліся саматужныя арцельныя прадпрыемствы, якія сваёй прадукцыяй забяспечвалі галоўным чынам бытавыя патрэбы насельніцтва. Аб'ём валавой прадукцыі саматужных арцеляў у 1935 г. склаў больш за 220 345 руб.

Лясная гаспадарка налічвала ў 1934 г. 25 148 га. За 1934—1936 гг. на Буда-Кашалёўшчыне лесу было пасаджана 1224 га. Развівалася і лесанарыхтоўка. У 1934 г. было нарыхтавана і вывезена 72 525 куб.м лесаматэрыялаў, у 1935 г. — 77 000 куб.м, а за 1-ы квартал 1936 г. — 40 760 куб.м. Выраблялiся шпалы, клёпкі, гонта. Буда-Кашалёўскі раён у 1934—1935 гг.займаў першае месца ў Беларусі па лесанарыхтоўках і лесавывазе. У 1935 г. леспрамгас рэалізаваў прадукцыі на 1 406 598 руб. Насельніцтва раёна ад працы ў леспрамгасе атрымала за 1934 г. 705 тыс.руб., а толькі за 1-ы квартал 1936 г. — 397 тыс. руб. Такім чынам, заработкі калгасаў і насельніцтва на лесанарыхтоўках і лесавывазе ў раёне значна павышалі даходы і дабрабыт жыхароў, умацоўвалі гаспадарчае становішча калгасаў.

Першыя гады ўмацавання калгаснага ладу былі адзначаны пашырэннем дзейнасці ўстаноў народнай асветы, культуры і аховы здароўя, грамадска-палітычнай актыўнасці насельніцтва. Калі ў 1933/34 навучальным годзе на развіццё народнай асветы было асігнавана 56,4% сродкаў раённага бюджэту, то ў 1934/35 — 60,7% (амаль 1,4 млн. руб.). Пашырылася сетка школ і колькасць навучэнцаў. Калі ў 1933/34 навучальным годзе 173 настаўнікі мелі ніжэйшую, 27 сярэднюю і толькі 7 вышэйшую адукацыю, то ў 1935/36 вышэйшую адукацыю мелі 10, сярэднюю — 93 настаўнікі.

Значнае месца ў дзейнасці школ адводзілася ажыццяўленню політэхнізацыі вучэбнага працэсу, увядзенню сельскагаспадарчага ўхілу ў школах. Не ўсё ўдавалася адразу. Політэхнізацыю пачыналі без папярэдняй падрыхтоўкі. Настаўнікі не былі падрыхтаваны. Прыходзілася распаўсюджваць парады і рэкамендацыі. Школы замацоўваліся за саўгасамі і калгасамі. Аднак толькі некаторыя школы засявалі агароды, і то на невялікіх дзялянках.

Неаднойчы і кожны раз няўдала пачыналася і беларусізацыя. Яшчэ ў 1923 г. у раёне былі адкрыты доследныя школы з мэтай распаўсюджвання беларускай мовы. Падкрэслівалася, што пытанне аб беларусізацыі «...неабходна звязваць з патрабаваннямі і воляй насельніцтва, што можна выявіць толькі пры паступовай і сістэматычнай культурнай і школьнай рабоце на беларускай мове». У 1926 г. дзейнічала камісія па вызначэнні фактычнага нацыянальнага складу насельніцтва і яго адносін да беларусізацыі. І на пачатак 1930-х гадоў у раёне па-ранейшаму не хапала школ, выкладчыкаў, падручнікаў, мэблі і вучэбных дапаможнікаў. Асабліва востра гэтыя праблемы адчуваліся ў нацыянальных школах.

Развівалася раённая сетка ўстаноў аховы здароўя. Зніклі ачагі цяжкіх захворванняў насельніцтва. Сталі масавымі мерапрыемствы па прафілактыцы папярэджвання масавых захворванняў. Павышаліся санітарная культура і адукаванасць жыхароў, грамадская актыўнасць.

Суцэльная калектывізацыя зламала ў раёне асновы дробнатаварнай вытворчасці. Зямля, тэхніка складалі дзяржаўную ўласнасць, жывёла, пабудовы, простыя машыны, інвентар — калгасную. Свойская прадукцыйная жывёла і птушка, дробны сельгасінвентар, жылы дом з невялікім прысядзібным участкам былі асновай падсобнай гаспадаркі калгаснікаў.

Па стану на 1.12.1938 г. у раёне было 78 калгасаў, якім належала 64 369 га зямлі, у т. л. 31 034 га пашы, 848 га — пад садамі, 3331 га — пад сядзібамі, 22 400 га — пад сенажацямі, выганамі і лясамі. Больш за 2321 га зямлі, у т. л. 961 га пашы і 291 га пад сядзібамі, мелі аднаасобнікі; 92 га зямлі, у т.л. 77 га пад сядзібамі, мелі рабочыя.

Больш за 870 двароў калгаснікаў, рабочых і аднаасобнікаў размяшчаліся на хутарах і ў малых (да 10 двароў) населеных пунктах.

Усе калгасы раёна мелі малочнатаварныя фермы (МТФ). У іх налічвалася 6667 галоў буйной рагатай жывёлы, у т.л. 2420 кароў. Па пагалоўю жывёлы МТФ былі неаднолькавыя: ад 5 да 20 галоў мелі 36 МТФ, ад 26 да 50 — 32 МТФ, астатнія 10 МТФ — 50 і больш галоў буйной рагатай жывёлы. У асноўным невялікімі (па 5—10 галоў) былі свінатаварныя фермы (СТФ). Тут гадавалася 3519 свіней, у т.л. 645 свінаматак. Авечкатаварныя фермы (АТФ) таксама мелі невялікія статкі жывёлы. Па 40 і больш галоў авечак было ў 40 з 77 АТФ раёна. Усяго статак авечак налічваў каля 3600 галоў. Меліся дзве фермы па вырошчванні коней-метысаў рысістых і цяжкавозных парод.

Статак калгаснага пагалоўя жывёлагадоўлі па стану на 1 студзеня 1941 г. скараціўся амаль на 1168 галоў свіней і на 800 галоў буйной рагатай жывёлы, у т.л. і па колькасці кароў, а пагалоўе авечак павялічылася амаль на 700 галоў.

У галіне паляводства раён не лічыўся ў перадавых па вобласці. У 1938 г. тут сярэдні ўраджай збожжа склаў 9,7 ц, бульбы — 143 ц, ільну — 3,9 ц з гектара. Калгаснікі, наватары і стаханаўцы пастаянна даказвалі, што на Буда-Кашалёўшчыне можна і патрэбна атрымліваць значна вышэйшыя ўраджаі.

У калгасе «Камунар» Рагінскага сельсавета брыгадзір П.І.Бублікаў асвоіў 35 га балоцістых зямель, атрымаў ураджай проса па 14 ц, канапель-семя па 8 ц, капусты па 655 ц з га.

Брыгадзір А.С.Надтачаеў з калгаса «Камунар» Прыбарскага сельсавета асвоіў 19 га балот, атрымаў ураджай капусты па 1040 ц, махоркі па 18 ц, проса па 16,5 ц з га.

Брыгадзір П.М.Шынгароў атрымаў ураджай ільнасемя па 5 ц, ячменю па 18 ц, грэчкі па 12 ц з га.

Па 162 ц памідораў і 30 ц махоркі з гектара сабрала агародная брыгада В.В.Крукоўскага з калгаса «Шлях сацыялізму» Забабскага сельсавета. Калектыў выканаў план дзяржаўных паставак па ўсіх культурах.

Значную ролю ў развіцці спаборніцтва за добрыя ўраджаі адыгралі грамадскія арганізацыі і мясцовыя Саветы. У 1937 г. дзейнічалі 13 партыйных і 4 кандыдацкія арганізацыі, у якія ўваходзілі 122 камуністы, 45 камсамольскіх арганізацый — 467 камсамольцаў, 20 прафсаюзных арганізацый — 600 чалавек. Грамадскі актыў калгасаў аб'ядноўваў амаль 2/3 складу партыйна-камсамольскіх арганізацый раёна.

У 1938 г. у 37 калгасах і 2 МТС раёна працавалі амаль 400 з 832 членаў ЛКСМБ.

Па ініцыятыве камсамольцаў збіраліся сродкі на будаўніцтва лінкора «Парыжская камуна» і авіяэскадрыллі, праводзілася добраахвотная падпіска на пазыкі, арганізоўваліся чырвоныя абозы выканання дзяржпаставак, планавых адгрузак бульбы на Украіну, у Ленінградскую, Курскую і інш. вобласці. Камсамольцы арганізоўвалі самамабілізацыю моладзі на працу ў леспрамгасы, на сяўбу «шэфскага гектара» для воінаў Чырвонай арміі і Ваенна-марскога флоту. Па камсамольскіх пуцёўках амаль 219 маладых людзей з раёна паехалі працаваць у Данбас. Атрады камсамольскай «лёгкай кавалерыі» былі надзейнымі памочнікамі Саветаў ва ўсіх грамадскіх і гаспадарчых мерапрыемствах, якія праходзілі ў раёне. Яны актыўна ўдзельнічалі ў «штурмах» ворыва і сяўбы, шэфствавалі над фермамі па вырошчванні жывёлы і догляду за пасевамі на ўчастках рэкордных ураджаяў у палявых брыгадах.

Камсамольскія арганізацыі вылучалі моладзь на кіруючыя пасады старшынямі і намеснікамі старшынь калгасаў і сельсаветаў, брыгадзіраў палявых і трактарных брыгад, загадчыкамі ферм. Толькі ў 1937 г. былі вылучаны і накіраваны на адказныя пасады 27 камсамольцаў, у т.л. 1 на пасаду старшыні райвыканкома і 1 на пасаду загадчыка райза, 49 беспартыйных, з іх на пасады старшынь калгасаў — 30, старшынь сельсаветаў — 3 і старшыні райвыканкома — 1.

Вылучэнне кадраў дапамагала ў вырашэнні кадравай праблемы. Палітычныя рэпрэсіі 1937—1939 гг. пазбаўлялі вытворчасць вопытных кадраў. За 1938 г. у раёне было зменена 49 старшынь калгасаў, у 1939 г. — 54 з 78. Акрамя рэпрэсій, існавалі іншыя матывы замены кадраў: вылучэнне на больш адказныя пасады, перавод у іншыя калгасы, звальненне за зламыснасць, неадпаведнасць пасадзе, па асабістых заявах

і г.д. Але галоўным у такім становішчы было тое, што кадравыя перастаноўкі негатыўна адбіваліся на дзейнасці гаспадарак, маральным стане людзей, параджалі няўпэўненасць і нават страх.

У 1938 г. у раёне пачала працаваць зноў арганізаваная Рагінская МТС. Гэта было моцнай падтрымкай тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі раёна. У 1939 г. Рагінская МТС мела трактароў ХТЗ — 12, СТЗ — 8, ЧТЗ — 1, камбайнаў збожжаўборачных — 5, комплекс складанай сельскагаспадарчай тэхнікі. Разам з Буда-Кашалёўскай МТС трактарны парк раёна складаў 70 адзінак. МТС і калгасы мелі сеялкі, плугі, культыватары, дыскавыя бароны, іншыя машыны і механізмы.

Сталі прыярытэтнымі падрыхтоўка спецыялістаў-механізатараў, абучэнне кіраўнікоў сярэдняга звяна калгасаў, палляводаў і жывёлаводаў авалоданнем тэхнікай і сродкамі механізацыі. Працавалі курсы па набыцці і ўдасканаленні прафесій механізатараў. У 1936 г. прайшлі агратэхэкзамен машыністы складаных сельскагаспадарчых машын, трактарысты, ільноцерабільшчыкі, камбайнеры. Залік па агратэхніцы і сродках механізацыі сельскагаспадарчай вытворчасці здавалі брыгадзіры палявых брыгад і звеннявыя, конюхі, даяркі, цялятніцы, свінаркі, загадчыкі ферм, старшыні калгасаў, спецыялісты калгасаў і раённага звяна.

Ад узроўню прафесійнай падрыхтоўкі ва ўмовах калектыўнай гаспадаркі залежалі прадукцыйнасць і эфектыўнасць вытворчасці.

На раённай сельскагаспадарчай выстаўцы дасягненняў у 1938 г. у ліку лепшых быў адзначаны старшыня калгаса «Ураджай» К.Гузаў. Яго гаспадарка выканала план развіцця жывёлагадоўлі на 107%, прадала Гомельскай племканторы для рэалізацыі іншым калгасам 21 племяннога бычка, поўнасцю выканала план мясапаставак і авансам у лік 1939 г. здала 15 галоў буйной рагатай жывёлы і яшчэ 20 галоў рэалізавала на рынку. СТФ калгаса мела 79 галоў свіней, што складала 105,2% да плана. 109 парасят прададзена калгаснікам і 16,1 ц свініны здадзена дзяржаве па мясапастаўках. АТФ мела 188 авечак (104,4%), прадала калгаснікам 15 і здала дзяржаве 50 авечак.

Сярод лепшых была названа таксама даярка гэтага калгаса Д.Міхалюк, якая ад 12 замацаваных за ёю кароў захавала ўсіх цялят і прадала 14 340 л малака. Атрымала ад каровы па мянушцы Ася 2-й генерацыі галандскай пароды за 10 месяцаў 1938 г. 3212 л малака.

Даглядчыца свіней калгаса «Ураджай» Бяланава ў 1938 г. ад замацаваных за ёю 8 свінаматак атрымала і захавала 104 парасяці, у т.л. ад 2 свінаматак атрымала па 18 парасят.

Выстаўком адзначыў высокія дасягненні даяркі калгаса імя Дзяржынскага В.Ермаковай, загадчыка каняфермы калгаса «Улада Саветаў» Вераб'ёва і інш.

Ураджай 1940 г. у раёне па збожжы быў на 1,7 ц, а па бульбе — на 87,9 ц з гектара большы, чым у 1939 г.

На базе тэхнікі, шырокага ўкаранення дасягненняў агранавукі асобныя калгасы дабіліся ўзорных ураджаяў. У 1939 г. калгас «Перамога» Забабскага сельсавета сабраў па 13 ц збожжа. У гэтым калгасе брыгада Быкава з плошчы 20 га атрымала ўраджай збожжавых па 20 ц з гектара. Калгасы «2-я пяцігодка», «Перамога», «Камінтэрн», «Селькор» атрымалі ўраджай ільну па 4,5 ц з га, а брыгадзір Кустачоў — па 5,5 ц. Ураджай тытуню склаў 50 ц з гектара.

Нягледзячы на высокія паказчыкі стаханаўцаў і шэрагу гаспадарак, Буда-Кашалёўскі раён у 1940 г. апынуўся сярод адстаючых у рэспубліцы. Менавіта таму перадавыя калектывы не атрымалі магчымасці дэманстраваць свае дасягненні, прадстаўляць раён у ліку 10 лепшых з Беларусі на Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі ў Маскве.

Тым не менш сяляне, рабочыя, спецыялісты працавалі з уздымам. Трактарыст Д.Котаў з Буда-Кашалёўскай МТС на трактары ХТЗ трактарнай сеялкай за змену засеяў 31,4 га пры норме 12,2 га, а камсамолец М.Сцепаненка, трактарыст той жа МТС, за змену трактарнай сеялкай засеяў 32,0 га пры норме 12,2 га. У 1939 г. выпрацоўка на трактар у Рагінскай МТС складала ў пераліку на мяккае ворыва ў сярэднім 230—240 га. Стаханавец Аляксей Жукаў на трактары СТЗ выпрацаваў 389,99 га, А.Чарнякоў на трактары СТЗ — 554,12 га, Я.Асіпенка на трактары ХТЗ — 449,88 га, П.Несцераў — 478,05 га.

Значна вырасла прадукцыйнасць працы і аб'ём валавой прадукцыі мясцовай

прамысловасці. Бандарная, шавецкія і ткацкая арцелі па стану на 1.1.1941 г. выпусцілі прадукцыі на 785 897 руб., цагельная арцель «Чырвоная Зорка» — на 41 400 руб. Агульны аб'ём вытворчасці мясцовай прамысловасці склаў больш за 973 600 руб.

У дакладной запісцы ў ЦК КП(б)Б райком партыі і райвыканком паведамлялі, што ў Буда-Кашалёўскім раёне адначасова працуюць 5 цагельных заводаў. За год вырабляецца 1 550 000 штук цэглы, што поўнасцю задавальняе ўнутраныя патрэбы.

Мірная стваральная праца была спынена страшэннай весткай — 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія напала на нашу Радзіму. Пачалася Вялікая Айчынная вайна.

У.Я.Райскі.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РК КП(б)Б І РАЙВЫКАНКОМА ЗА 1934—1936 гг.

...У 1936 г. у раёне былі: лесанарыхтоўчая апрацоўчая прамысловасць, спіртзавод, саматужныя арцелі (шавецкая, кравецкая, бандарна-сталярная), 2 маслазаводы, інкубатарная станцыя і 47 млыноў. Рашучага значэння ў эканоміцы раёна прамысловасць не мела. У 1934 г. вінзаводы выпрацавалі 54 200 дэк./л спірту. За 1935 г. — 77 585 дэк./л, у першым квартале 1936 г. — 36 323 дэк./л. Рост вытворчасці — 113,9%.

Прадукцыя саматужных арцеляў у 1934 г. склала 150 929 руб., у 1935 г. — 220 345 руб., у 1-м квартале 1936 г. — 89 780 руб.

* * *

У 1936 г. у калгасах пабудавана: канюшань — 33, кароўнікаў — 21, свінарнікаў — 18, аўчарні — 2, збожжасховішчаў — 33, 57 іншых гаспадарчых пабудоў (клубы, лазні, хлявы, дамы і г.д.). За год у будаўніцтва калгасы ўклалі 1 175 100 руб.

Работа МТС

На 1.1.1934 г. у Буда-Кашалёўскай МТС — 21 трактар (20 ФП). У 1935 г. — 33 трактары (18 ФП), а на 1.1.1936 г. — 34, з іх 1 — ЧТЗ НАЦІ, 19 — ХТЗ. У 1936 г. раён атрымаў 4 трактары ЧТЗ НАЦІ, 16 ХТЗ, 2 УНІ, 12 трактарных сеялак, 3 камбайны, 3 шыроказахопныя льноцерабілкі ВНІЛ—5, інш. сельгастэхнікі на 211 810 руб. У 1934 г. МТС абслугоўвала 34 калгасы з агульнай плошчай 12 635 га, у 1935 — 42 калгасы з агульнай плошчай — 16 036 га, а ў 1936 г. — 51 калгас з плошчай 23 400 га. І калі ў 1934 г. трактарны парк МТС у пераводзе на мяккае ворыва апрацаваў 4597 га калгасных зямель, у 1935 г. — 7628 га, то ў 1936 г. — больш за 20 000 га. Калгасы, якія абслугоўвала МТС, атрымлівалі мінугнаенні.

Рабочыя МТС уключыліся ў стаханаўскі рух. За першыя 4 дні дэкады стаханаўскай працы трактарны парк МТС апрацаваў 706 га, з'эканоміў больш за 600 кг гаручага. Трактарыст Котаў за змену 4 мая на трактары ХТЗ засеяў 37 га, Авяр'янаў Ф. — 31 га, па-стаханаўску працавалі трактарысты Семчанка Восіп, Балдуеў Тарас і інш.

Народная асвета

У 1933/34 навучальным годзе на развіццё народнай асветы раёна было асігнавана 691 365 руб. (56,4% раённага бюджэту), у 1934/35 навучальным годзе — 1 379 300 руб. (60,7%).

У 1933/34 навучальным годзе ў Буда-Кашалёўскім раёне было 36 пачатковых школ (193 класныя камплекты) — 5463 вучні, а ў 1935/36 г. — 30 пачатковых школ (194 класныя камплекты) — 5776 вучняў. Няпоўных сярэдніх школ у 1933/34 н.г. — 12 з 44 класакамплектаў, 1313 вучняў. У 1935/36 г. — НСШ — 11 і 1 СШ, у якіх 58 класакамплектаў — 1991 вучань.

Настаўнікі ў 1933/34 г.: 173 — мелі ніжэйшую, 27 — сярэднюю і 7 — вышэйшую адукацыю. У 1935/36 г. вышэйшую адукацыю мелі 10, сярэднюю — 93 і ніжэйшую — 83 настаўнікі.

Па стану на 1936 г. у раёне 5957 чалавек былі непісьменнымі або малапісьменнымі.

Ахова здароўя

На ахову здароўя ў 1935 г. раён атрымаў 243 380 руб., а ў 1936 г. — 268 000 руб. (каля 7,9% раённага бюджэту), што складала на душу насельніцтва у 1935 г. — 6 кап., у 1936 г. — 7 кап.

Раённая сетка лячэбных устаноў мела: бальніц — 1, урачэбных пунктаў — 2, ФАПаў — 5, бальнічных койкамесц — 40 — 45. Працуюць сезонныя і сталыя яслі. У 1935 г. сезонных ясляў — 50, у іх 1720 дзяцей, у 1936 — 55, у іх — 2200 дзяцей. Сталых ясляў — 11.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 3а. Спр. 266. Л. 8, 23—24, 26, 29, 32—34, 39, 41, 43, 45.

* * *

На 1.1.1936 г. у Буда-Кашалёўскім раёне 37 камсамольскіх арганізацый, 365 камсамольцаў. На 1.1.1937 г. — 42 камсамольскія арганізацыі (калгасных — 29, школьных — 9, вытворчых — 3, савецкіх — 4), у іх 452 камсамольцы. У раёне на трактарах працуюць 32 камсамольцы. За 1936 — 1937 гады выбылі з камсамола — 129 чалавек.

У раёне ў 1936 г. — 82 члены і 30 кандыдатаў у члены партыі, у 1937 г. — 89 і 33. Дзейнічалі 13 партыйных арганізацый (калгасных — 1, вытворчых — 3, тэрытарыяльных — 4, устаноўчых — 5, кандыдацкіх груп — 3, партыйна-камсамольскіх — 1).

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 5а. Спр. 14. Л. 14—15.

СПІС СТАХАНАЎЦАЎ РАЁНА Ў 1936—1937 гг:

ЗАЙЦАВА Моця — 200%, КРУГЛІКАВА Таццяна — 250%, «Чырвоная Беларусь»; АРХІПЦАВА Надзея, «Шлях да камунізму» — 300%; АНАННЕВА Ганна, «Гром», — 150%; ДРАЗДОВА Ганна — 150%, МІХАЛЁВА Ганна, «Ударнік», — 170%; КАВАЛЁВА Ганна, КАРТАВЕНКА Аксенія, МІНІНА Валя, АЎДАШКАВА Марфа, «Чырвоны луч», па — 150%; БЯЛОВА Таццяна, БЯЛОВА Аляксандра, ПУСЕВА Алена, ЮРКОВА Прося, КАВАЛЁВА Хадосся, «Ураджай», па 150 — 180%

1937 г. стаханаўцы калгаса «Чырвоны пахар», Буда-Люшаўскі сельсавет: КІРЭЕНКА Ніна Купрыянаўна на апрац. ільну — 290%, ЦІХАНАВА Насця Яўхімаўна — на апрац. ільну

Першы выпуск няпоўнай сярэдняй школы ў в. Гаўлі. 1935 г.

— 270%, ШКЛЯРОВА Вера Сямёнаўна — 300%, КІРЭЕНКА Хроня Канстанцінаўна — 280%, ІСАКАЎ Сяргей Мацвеевіч на жніве жыта — 150—170%.

Стаханавец калгаса «Перадавік» ГУЗАЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1908 г., працуе ў калгасе з 1931 г. у складзе паляводчай брыгады № 1 — ударнік, з 1936 г. — стаханавец, звеннявы 1-га звяна 15.9.1937 г. на копцы бульбы плугам выканаў норму на 300%.

Стаханавец ТУПІКАЎ Дзмітрый Іванавіч, н. у 1910 г., працуе ў калгасе з 1931 г., у складзе паляводчай брыгады № 2 — ударнік, з 1936 г. — стаханавец. Звеннявы 1-га звяна 2-й брыгады. З 15.8.1937 г. — брыгадзір паляводчай брыгады. На копцы бульбы выконвае норму на 300%.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 5а. Спр. 169. Л. 8; Воп. 3а. Спр. 58. Л. 3.

З АРТЫКУЛА «МАЛАДНЯК ГІНЕ» Ў ГАЗЕЦЕ «КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА»

19 студзеня 1936 г.

Молочно-животноводческая ферма в колхозе «Урожай» Забабского сельсовета Буда-Кошелевского района БССР — одна из крупнейших в районе. Сейчас проходит массовый отел коров, но колхоз к этому совершенно не подготовился: не построены зимние сараи, не закончено строительство телятника. Сейчас в колхозе уже 185 голов молодняка, а сохранить его негде.

В прошлом, 1935 году колхоз также не был подготовлен к отелу, также не было подготовлено помещение для молодняка и в результате погибло около 60 голов молодняка. Руководство колхоза не сделало выводов из этого урока. Председатель колхоза Гольдин, с приехавшим из райцентра ветеринарным врачом, пьянствует, забыв думать о телятнике. На справедливые указания колхозников о недопустимости такого положения Гольдин отвечает увольнениями с работы. Недавно была уволена комсомолка-доярка, сняты с работы комсомольцы—ударники, примерно работавшие по 6 лет. Никакой политической и культурно-массовой работы у нас в колхозе не ведется. Молодежь предоставлена самой себе. Партийно-комсомольские организации не имеют своего лица в колхозе.

Колхозники: пять подписей. ЖДЕМ ОТВЕТА.

УРАДЖАЙНАСЦЬ ПА РАЁНЕ ЗА 1937 г.

Ураджай 1937 г. па раёну склаў: жыта азімае — 7,1 ц; пшаніца — 3,3 ц азімая, 5,8 ц — яравая; ячмень — 7,3 ц, авёс — 4,8 ц, проса — 8,3 ц. Сярэдні ўраджай збожжа склаў 6,4 ц з гектара. Па льнасемю — 2,7 ц, па льновалакну — 1,3 ц, махорка — 8,8 ц, бульбы — 80,9 ц.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 69. Л. 27.

АБ ССЯЛЕННІ ХУТАРСКІХ ДВАРОЎ У КАЛГАСНЫЯ СЁЛЫ ПА СТАНЕ НА 1.1.1938 г.

Мелася хутароў калгаснікаў — 350, аднаасобнікаў — 75, рабочых — 32. Пражывала ў дробных пасёлках да 10 двароў: калгаснікаў — 304, аднаасобнікаў — 58, рабочых — 40. Усяго на хутарах і ў дробных пасёлках, належачых ссяленню, мелася: калгасных двароў — 654, аднаасобных — 133, рабочых — 72.

АБ СТАНЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў 1938 г.

Уступіла ў калгас аднаасобнікаў 476. Калектывізавана — 89%.

Сярэдні ураджай збож. — 9,7 ц; бульбы — 143,6 ц, ільну — 3,9 ц.

Прыплод: жарабяці — 416, пала — 37 (8,8%); цяляці — 2407, пала — 313 галоў (10,9%); парасяці — 4863, пала — 936 (19%); ягняці — 2013, пала — 89 (4,4%).

Ст. заатэхнік (Фалейчык)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 130. Л. 7—8.

АБ ССЯЛЕННІ ХУТАРОЎ І МАЛЫХ ПАСЁЛКАЎ

Па стану на 1.12.1938 г. у раёне хутарскіх двароў 454, у т.л. калгаснікаў — 346, аднаасобнікаў — 76, рабочых і служачых — 32. Пасёлкаў да 10 двароў — 65, у іх 402 двары, у т.л. калгаснікаў — 304, аднаасобнікаў — 58, рабочых — 40.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 130. Л. 1.

З ДАКЛАДНОЙ У КУЛЬТАСВЕТАДДЗЕЛ ГОМЕЛЬСКАГА АБКОМА КП(б) БЕЛАРУСІ

По Буда-Кашалёўскім раёне бюджэтныя сродкі ў 1938 г. накіраваны: раённай бібліятэцы асігнавана на закупку кніг, інвентару — 7000 руб. Фактычна расходавана — 7988 руб.40 кап., уключаючы на зарплату — 11 939 руб.13 кап.

На патрэбы РДК асігнавана 20 000 руб. Фактычна выкарыстана 17 084 руб. 42 кап. (5162 р. 96 к. — зарплата). Хатамі-чытальнямі выкарыстана з асігнаваных 50 440 р. усяго 27 717 р. 40 к., у т.л. зарплата склала 13 889 р. 25 к.

Сакратар РК (Барашкаў)

ЗВЕСТКІ АБ РАЗВІЦЦІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў 1934 і 1938 гг.

Від жывёлы	1934 г.	1938 г.
Коней па калгасах	3113	5840
Коней у аднаасобнікаў	3582	495
БРЖ па калгасах	3201	6491
БРЖ па раёну	10217	16223
Свіней па калгасах	870	2954
Свіней па раёну	11135	17003
Авечак па калгасах	830	2515
Авечак па раёну	3862	4402

1-ы т.зв. план па развіцці жывёлагадоўлі (акрамя авечак) за 1937 г. не выкананы. Адбіўся значны падзеж жывёлы (635 галоў). Па стану на 11.10.1938 г. пала 146 коней (94 у калгасах).

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 69. Л. 39, 94.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б Т.ЛЯВІЦКАМУ

У 1938 г. ва ўноў арганізаванай Рагінскай МТС было: трактароў ХТЗ гусенічных — 6 (новых), ХТЗ калёсных — 6. Усяго — 12.

Пяты выпуск Буда-Кашалёўскай СШ, 1939/40 навучальны год.

К.П.Гузаў, старшыня калгаса «Ураджай» у 1937—1941 гг.

Стаханаўка 1930-х гадоў Разуванава з в. Гаўлі.

У Буда-Кашалёўскай МТС: трактароў ЧТЗ — 4, ХТЗ калёсных — 43, трактароў У-2 — 4. Усяго — 51. У раёне 63 трактары.

У 1939 г. адна Рагінская МТС мела: трактароў ХТЗ — 12, СТЗ — 8, ЧТЗ — 1, камбайнаў паўднёвых «Камунар» — 3, паўночных — 2, комплекс складанай сельскагаспадарчай тэхнікі.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 131. Л. 156; Спр. 270. Л. 26.

ДАСЯГНЕННІ ЛЕПШЫХ УДЗЕЛЬНІКАЎ РАЁННАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎКІ 1938 г.

ГУЗАЎ Каленік — старшыня калгаса «Ураджай» — за добрае кіраўніцтва калгасам, выкананне планаў развіцця жывёлагадоўлі. Па БРЖ — на 1.10.1938 г. калгас меў 311 галоў (107%), прадаў Гомельскай племканторы для рэалізацыі інш. калгасам 21 племяннога бычка, поўнасцю выканаў план мясапаставак — 42,4 ц, здаў авансам у лік 1939 г. 15 галоў БРЖ і 20 галоў рэалізаваў на рынку. На 1.10.1938 г. на СТФ мелася 79 галоў свіней, што складала 105,2% да плана. Здадзена па мясапастаўках 16,1 ц свініны, 109 галоў прададзена калгаснікам. На 1.10.1938 г. на ферме калгаса 188 авечак — 104,4%. Прададзена калгаснікам 15 і дзяржаве — 50.

МІХАЛЮК Дуня, даярка калгаса «Ураджай», ад 12 кароў захавала ўсіх цялят. Прададзена за 10 м-цаў б.г. 14 340 л малака. Ад каровы па мянушцы Ася 2-й генерацыі галандскай пароды атрымана за 10 месяцаў 1938 г. 3212 л малака.

БЯЛАНАВА, даглядчыца свіней калгаса «Ураджай». На ферме працавала 3 гады. У 1938 г. ад замацаваных 8 свінаматак атрымала і захавала 104 парасяці, ад 2 свінаматак атрымала па 18 парасят.

ЕРМАКОВА Вольга, даярка калгаса імя Дзяржынскага, на ферме з 1934 г. Яна штогод захоўвае ўвесь прыплод цялят ад замацаваных 12 кароў. У 1938 г. захавала да 6 месяцаў узросту 12 цялят.

РЫБАКОЎ Якаў Аляксандравіч, старшыня калгаса «Власть Советов», быў узнагароджаны выстаўкомам за высокую арганізацыю працы, дасягненні ў галіне жывёлагадоўлі.

ВЕРАБ'ЁЎ, загадчык каняфермы калгаса «Власть Советов», адзначаны выстаўкомам. У 1938 г. атрымаў і захаваў прыплоду — 21 жарабя.

Заг. Райза (Макееў)

Заатэхн. (Волчак)

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 130. Л. 11.

АБ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЯХ

У 1937 г. у раёне было партарганізацый — 13, кандыдацкіх груп — 4, партыйна-камсамольская група — 1. Усяго членаў партыі — 89, кандыдатаў — 33 чалавекі. Па стану на 1.4.1938 г. у раёне партарганізацый — 12, кандыдацкіх груп — 5, усяго членаў партыі — 84, кандыдатаў у члены — 31. Прафсаюзных арганізацый — 20 (600 чалавек).

Па стану на 1.4.1937 г. было 45 камсамольскіх арганізацый (467 чалавек), у т.л. калгасных — 29 арганізацый (275 чалавек), школьных — 9 (102 чалавекі), дзяржустаноўчых — 7 (90 чалавек). На 1.4.1938 г. камсамольскіх арганізацый — 59, у іх 832 камсамольцы, у т.л. 37 калгасных арганізацый — 364 камсамольцы, у дзяржустановах — 8 ячэек, 92 камсамольцы, у МТС — 2 ячэйкі, 30 камсамольцаў, школьных 11 ячэек, 146 камсамольцаў.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 69. Л. 11—12, 23, 26.

З ХАРАКТАРЫСТЫК ПЕРАДАВЫХ ЖЫВЁЛАВОДАЎ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА

1. НІКІЦЕНКА Марыя Дзмітрыеўна — загадчыца свінафермы калгаса імя Дзяржынскага Любавінскага сельсавета, удзельніца Усесаюзнай нарады перадавікоў жывёлагадоўлі,

узнагароджана Граматай ЦВК БССР. На ферме працуе з 1934 г., загадчыцай фермы — з 1935 г. У 1938 г. Нікіценка ад 27 апаросаў свіней атрымала 235 парасят і ўсіх захавала. На ферме 7 свінаматак далі па два апаросы, а ад адной свінаматкі атрымана і захавана 27 парасят, а яшчэ ад 2 па 24 і ад адной — 23 парасяці. Ферма здала ў 1938 г. дзяржаве 32,64 ц мяса.

2. ІЛЬЕЎ Сямён Пахомавіч, н. у 1909 г., у калгасе з 1934 г., конюхам працуе з 1935 г. У 1936 г. ад 9 кабыл атрымаў і вырасціў 9, у 1937 г. — таксама 9, у 1938 г. — 6 жарабят. Ільеў С.П. зацверджаны Белвыстаўкомам экспанентам на УСГВ у Маскве.

3. КАРТАВЕНКА Ягор Мацвеевіч, н. у 1877 г. Працаваў у калгасе «Чырвоны луч» Дуравіцкага сельсавета з 1932 г. аўчаром. Вырасціў 575 ягнят. У 1936 г. ад 38 аўцаматак атрымаў 77, у 1937 г. ад 41 аўцаматкі — 79, у 1938 г. — 84 ягняці. Усё пагалоўе авечак на ферме ў выніку метызацыі з 1937 г. — метысаў I—III генерацыі цыгейкавай пароды. У 1937 г. ад 41 аўцаматкі атрымаў 155 кг шэрсці, або па 3,8 кг з кожнай, а ў 1938 г. — па 4,1 кг. Картавенка Я.М. удзельнік Усебеларускай нарады перадавікоў.

4. ЗУБКОЎ Фёдар Антонавіч — аўчар калгаса «Ураджай» Забабскага сельсавета. На ферме з 1935 г. За 3 гады давёў пагалоўе авечак з 69 у 1935 г. да 275 у 1938 г. У 1938 г. прыплод склаў 128 ягнят, усе захаваны. Настрыг шэрсці — па 2,8 кг.

5. ЦЯРЭШЧАНКА — даглядчыца свіней калгаса імя Дзяржынскага Любавінскага сельсавета. На ферме працуе 3 гады. У 1938 г. ад замацаваных за ёю свінаматак атрымала і захавала 86 парасят. Ад адной свінаматкі за 2 апаросы атрымала 27 парасят, ад другой — 24.

6. ПАЎЛАЎ — загадчык свінафермы калгаса «Трактарыст» Недайскага сельсавета. У 1938 г. атрымаў 186 парасят ад 16 свінаматак і ўсіх захаваў. Ад 2 свінаматак па 25 парасят.

7. СЦЕПАНЕНКА Лекса — даярка калгаса імя Сталіна Кашалёўскага сельсавета. На ферме працавала з 1935 г. За 1935—1938 гг. вырасціла 48 цялят. У 1938 г. ад 12 кароў захавала 12 цялят.

Нам. заг. райза (Сцепаненка). Ст. заатэхнік (Фалейчык).

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 130. Л. 13.

* * *

На 20.6.1939 г.па Любавінскаму сельсавету ссялена: па к-су імя Дзяржынскага хутароў 31 з 35, адбудавана 15 дамоў, па к-су імя Куйбышава хутароў 22 з 25, адбудавана 10 дамоў, па калгасу «Шлях Леніна» хутароў 11, адбудавана 4 дамы. Усяго з 71 хутара ў сельсавеце ссялена 63, адстроена 29 дамоў.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 267. Л. 83.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ Ў ГОМЕЛЬСКІ АБКОМ КП(б)Б

1. За 1939 год у Буда-Кашалёўскім раёне было заменена 54 з 78 старшынь калгасаў, у т.л. на адказныя работы вылучаны 2, пераведзены ў інш. калгасы — 5, звольнены за зламыснасць — 11, як не адпавядаючыя пасадзе — 24, па асабістых заявах — 3, па інш. прычынах — 9. Да судовай адказнасці прыцягнуты — 13, асуджаны — 5. Масавая змена старшынь калгасаў у Патапаўскім — 9, Буда-Кашалёўскім — 6, Забабскім — 5, Дуравіцкім — 6, Рагінскім — 5. Прычыны няўдалага падбору кадраў адказных работнікаў: адсутнасць учоту маральных і прафесійных здольнасцей пры падборы кадраў. У 1938 г. па раёну таксама было зменена 49 старшынь калгасаў.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 410. Л. 6—9.

СА СПРАВАЗДАЧЫ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РК КП(б)Б ЗА ПЕРЫЯД З КРАСАВІКА 1937 г. ПА МАЙ 1938 г.

Трактарыст КОТАЎ Даніла з Буда-Кашалёўскай МТС на трактары ХТЗ трактарнай сеялкай 2 мая засеяў за змену 31,4 га пры норме 12,2 га, а трактарыст той жа МТС камсамолец Мікалай Сцепаненка на трактары ХТЗ 8 мая трактарнай сеялкай засеяў за змену 32,0 га пры норме — 12,2 га. Трактарысты Рагінскай МТС Антон ЧАРНЯКОЎ і Ганна ТОДАРАВА на трактары ХТЗ узаралі па 9—10 га за змену.

У 1939 г. выпрацоўка на трактары ў Рагінскай МТС складала, у пераліку на мяккае ворыва, у сярэднім ад 230 да 240 га. Стаханавец Аляксей ЖУКАЎ на трактары СТЗ выпрацаваў

389,99 га, Антон ЧАРНЯКОЎ на трактары СТЗ — 554,12 га, Якаў АСІПЕНКА на трактары ХТЗ — 449,88 га, Панас НЕСЦЕРАЎ — 478,05 га...

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 69. Л. 26; Спр. 270. Л. 19.

З ПАСТАНОВЫ РАЙВЫКАНКОМА І БЮРО РК КП(б)Б

25 красавіка 1940 г.

...У Буда-Кашалёўскім раёне балоты складаюць 4920,5 га і забалочаных мінеральных зямель 5515 га. Выкарыстанне іх дазваляла ў 2—3 разы падняць ураджайнасць. Між тым з больш за 10 435 га забалочаных зямель практычна выкарыстоўваліся 4815 га, а інтэнсіўна ўсяго — 367 га, асвоена — 360 га. Шэраг гатовых да эксплуатацыі балотных зямель заставаўся неасвоеным. Была прынята пастанова аб абавязковай адпрацоўцы кожным працаздольным жыхаром раёна на меліярацыйных работах па 10 дзён з выпрацоўкай 100 куб. м выемкі грунту, расчысткі 0,15 га кустоўя і карчоў. Арганізаваць масавую асушку і асваенне балот, палепшыць лугі і пашы...

2...прыняць канкрэтныя абавязкі кожным сельсаветам у арганізацыі гэтай адказнай справы...

3. У бягучым годзе асушыць 1200 га балот і 2500 га мінералізаваных забалочаных глебаў. Павысіць якасць стока вады з празмерна вільготных зямель: пашы — 805 га, лугоў і пашы — 770 га. Выканаць увесь комплекс работ па асваенні балот і забалочаных зямель...

9. Прасіць СНК БССР і ЦК КП(б)Б аказаць раёну тэхнічную дапамогу спецыялістамі-меліяратарамі.

* * *

Па стану на 21.4.1940 г. у МТС Буда-Кашалёўскага раёна мелася трактароў 50 (у т.л. ХТЗ—35,СТЗ—2, газагенератарных — 8, ЧТЗ — 2, У-2 — 3), інш. сельгастэхнікі: сеялкі, плугі, культыватары, дыскавыя бароны і інш.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці . Ф.253. Воп. 4а. Спр. 410. Л. 10 —13, 93.

УДЗЕЛЬНІКІ ВДНГ У МАСКВЕ Ў 1940 г.

У 1940 г. 10 раёнаў БССР паслалі сваіх экспанентаў у Маскву на Усесаюзную Выстаўку дасягненняў народнай гаспадаркі СССР. На жаль, Буда-Кашалёўскі раён быў сярод адстаючых і не ўдзельнічаў у УВДНГ. Сярэдні ўраджай збожжавых па раёну складаў 7,7 ц з гектара, бульбы — 115 ц, і г.д. Нават перадавыя па раёну гаспадаркі, такія як «Сцяг Саветаў» Забалоцкага сельсавета, які меў у сярэднім 10,5 ц збожжавых, па асобных культурах (жыта — 13,5 ц, ячмень — 12,9 ц), калгас імя Сталіна Буда-Кашалёўскага сельсавета, дзе ўраджай бульбы склаў 153 ц з гектара, а цукровых буракоў — 600 ц, «Селькор» Забалоцкага сельсавета — 10,75 ц збожжа, «Камінтэрн» — проса — 15, грэчка — 12, капуста — 260, агуркі — 205,тытунь — 32 ц з гектара (у брыгадзіраў КУСТАЧОВА — 60, БАРАНАВА — 69 ц), калгас «Усход» Рагінскага сельсавета — 20 ц проса, не атрымалі пуцёўкі на права прадстаўляць раён на УВДНГ.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 513. Л. 19—21.

МЯСЦОВАЯ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ПА СТАНЕ НА 1.1.1941 г.

БАНДАРНАЯ АРЦЕЛЬ «16 год Кастрычніцкай рэвалюцыі». Выпрацоўвала: абознае абсталяванне, калёсы, дзіцячыя матрасы, цацкі, хатні посуд (вёдры, бочкі, балеі, цэбры, інш.). Аб'ём вытворчасці — 455 171 руб.

ШАВЕЦКАЯ АРЦЕЛЬ «Герой Працы». Выпрацоўвала дзіцячы абутак. Аб'ём вытворчасці — 39 368 руб.

ШВЕЙНАЯ АРЦЕЛЬ «Новае Жыццё». Аб'ём вытворчасці — 91 358 руб.

ТКАЦКАЯ АРЦЕЛЬ імя Крупскай. Аб'ём вытворчасці — 200 000 руб.

КАВАЛЬСКАЯ АРЦЕЛЬ «Новае Жыццё». Выпрацоўвала: вёдры, тазы, цэбры, печы.

ЦАГЕЛЬНАЯ АРЦЕЛЬ «Чырвоная Зорка». Выпрацоўвала ганчарныя вырабы. Аб'ём вытворчасці — 41 400 руб.

ЗАВОД БЕЗАЛКАГОЛЬНЫХ НАПІТКАЎ. Выпрацоўваў марынадныя і кандытарскія вырабы. Агульны аб'ём вытворчасці мясцовай прамысловасці раёна — 973 600 руб.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 383. Л. 15.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ Ў ЦК КП(б)Б

1941 г.

В Буда-Кошелевском районе есть кирпичный завод «Чырвоная Зорка» мощностью в 800 000 шт. кирпича в год. Одновременно работают 4 колхозных кирпичных завода общей мощностью в 750 000 шт. кирпича и 500 000 шт. черепицы (впервые освоено производство). Таким образом, в год изготовляется 1 550 000 шт. кирпича и 50 000 шт. черепицы. Этот объем вполне удовлетворяет внутренние потребности района.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 513. Л. 57.

* * *

Спіртзавод «Рагінь» мае вытворчую магутнасць 900 дэк./л спірту-сырцу ў суткі. Працуе на мясцовай і прывезенай сыравіне. Для бесперапыннай працы патрэбна не менш 50 с/м дроў, якія падвозяць за 15—20 км. Са станцыі Буда-Кашалёў прывезці 20 т зерня і вывезці кожны дзень па 940 дэк./л спірту (за 22 км) не хапае гаручага і аўтатранспарту.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 131. Л. 46.

АБ СТАНЕ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ Ў РАЁНЕ НА 1.1.1941 г.

Коней — 5866,у т.л.жарабят — 417
БРЖ — 5521, у т.л.кароў — 2226
Свіней — 2351, у т.л. свінаматак — 639
Авечак — 4368, у т.л. аўцаматак — 3083

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 69. Л. 39, 94.

КОННА-СПАРТЫЎНЫЯ ВАЕНІЗАВАНЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ

12 мая 1941 г. в районе прошли конно-спортивные военизированные соревнования между колхозными командами. Мероприятие проведено на хорошо организованной базе с участием от сельских Советов по 8—15 конников, 124 лошади.

Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гомельскай вобласці. Ф. 253. Воп. 4а. Спр. 547. Л. 2.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Будынак спіртзавода ў в. Рагінь.

Газета паведамляла...

Па старонках абласной газеты «Гомельская праўда»*

15 красавіка 1940 г.

ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАННЕ КАЛГАСА

Калгас імя Энгельса Губіцкага сельсавета Буда-Кашалёўскага раёна не гатоў да вясенняй сяўбы. Рамонт сельскагаспадарчага інвентару не закончан, насення не хапае. Па плану трэба вывезці на поле 3000 тон торфу, а не вывезлі ні адной тоны. Галоўная прычына такога адставання — адсутнасць палітыка-масавай работы сярод калгаснікаў. З 284 працаздольных калгаснікаў на работу выходзяць усяго 40—50 чалавек. Былі выпадкі раскрадвання калгаснага дабра. Нядаўна з ведама праўлення калгаса размеркавалі на працадні апошнія 5 тон кармоў, а коней няма чым карміць. У калгасе ўжо 9 месяцаў існуе партыйна-камсамольская група. Час упаўне дастаткові для таго, каб глыбока вывучыць калгасную вытворчасць і мабілізаваць калгаснікаў на своечасовае выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных задач. Але партыйна-камсамольская група работае вельмі слаба. Яна стаіць у баку ад гаспадарчых спраў калгаса, не вывучае беспартыйны актыў, не цікавіцца работай стаханаўцаў. Парторг тав. Круцікаў забыў, што толькі шляхам шырокага разгортвання партыйна-палітычнай, растлумачальнай работы, правільнага ажыццяўлення кантролю дзейнасці праўлення калгаса можна дабіцца вытворчых поспехаў. Вопыт лепшых стаханаўцаў і ўдарнікаў не стаў здабыткам усіх калгаснікаў. Конюх 3-й брыгады тав. Разуванаў Васіль і загадчык аўцатаварнай фермай тав. Сінякоў Яўсей з'яўляюцца ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1939 г. і кандыдатамі на выстаўку 1940 г. Узоры стаханаўскай работы паказваюць калгаснікі тт. Ляхаў Архіп, Быкава Ульяна, Катляроў Прахор, а партыйна-камсамольская група не ставіць іх у прыклад іншым калгаснікам, каб такім чынам палепшыць працоўную дысцыпліну. Вясенняя сяўба — сур'ёзны экзамен для ўсіх камуністаў, камсамольцаў. Партыйна-камсамольская група калгаса павінна на хаду навярстаць упушчанае, наладзіць працоўную дысцыпліну і паспяхова правесці вясеннюю пасяўную кампанію.

Г.Н.Фактаровіч.

14 чэрвеня 1940 г.

ГЛЫБЕЙ УНІКАЦЬ У КАЛГАСНЫЯ СПРАВЫ

...Партыйная арганізацыя Буда-Кашалёўскага раёна прарабіла значную работу па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў. Многія з калгасаў з'яўляюцца перадавымі, паспяхова закончылі сяўбу, дабіліся нядрэнных паказчыкаў у развіцці грамадскай жывёлагадоўлі. Памножыліся рады калгаснікаў-перадавікоў. Большасць камуністаў, якія работаюць у калгасах, сталі сапраўднымі важакамі мас, узначальваюць барацьбу за высокі ўраджай, высокую прадукцыйнасць жывёлагадоўлі, за ўмацаванне працоўнай дысцыпліны.

На прыкладах калгасаў «Ураджай», «Пабеда», «Новае жыццё», ім.Сталіна, «1 Мая» і інш. можна бачыць, як камуністы, работаючы на калгаснай вытворчасці, забяспечваюць бальшавіцкае кіраўніцтва сельскай гаспадаркай, глыбока ўнікаюць у гаспадарчыя справы. Таму поспехі самі гавораць за сябе: сяўба праведзена ў ранція і сціплыя тэрміны, на высокім узроўні агратэхнікі, дзяржаўныя заданні паспяхова выконваюцца. У гэтых калгасах разгорнуты сацыялістычныя метады працы, а камуністы з'яўляюцца арганізатарамі сацыялістычнага спаборніцтва, узначальваюць палітычны і творчы ўздым калгаснікаў, мабілізуюць іх на паспяховае вырашэнне гаспадарча-палітычных задач.

Аднак, далёка не так абстаіць справа ва ўсіх калгасах, далёка не так працуюць усе камуністы ў калгасах. Сяўба ў раёне недапушчальна зацягнулася. Пасадка бульбы, пасеў лугапашавых траў, грэчкі, канапель і караняплодаў яшчэ не скончаны. План пасеву коксагыза сарваны,. 32 гектары не засеяны.

Згодна пастановы Саўнаркома БССР Буда-Кашалёўскі раён вызначаны як насенняводчы і павінен пасеяць лугапашавыя травы. Між тым рад калгасаў: «Селькор», «Камунар», «Шлях Кастрычніка», «Чырвоны пахар» і інш. яшчэ не выбралі насенне па разнарадцы для пасеву траў. Пры плане 290 га пасеяна 135 гектараў кармавых культур. Многія калгасы не клапацяцца аб стварэнні кармавой базы, не ўлічылі ўрокаў мінулага года.

*Стыль і арфаграфія публікацый захаваны.

Калі МТС прыслала ў калгас «Камунар» сеялку для пасеву грэчкі, то кіраўніцтва калгаса наадрэз адмовілася праводзіць радковы пасеў грэчкі. Антымеханізатарскімі настроямі заражоны нямала кіраўнікоў калгасаў. Ёсць факты, калі дзе-нідзе асобныя старшыні калгасаў адмаўляюцца ад узняцця папараў трактарамі. Калгас «Бальшавік» не засеяў вызначаных па плану 17 гектараў бульбы, хаця, як высветлілася, тут яшчэ вясной мелася лішкаў бульбы — 3 тоны. Аказваецца, што гэтую бульбу з лёгкай рукі кіраўнікоў, разбазарылі, расцягнулі і зараз няма чым абсемяніць плошчу ў 17 гектараў. Старшыня калгаса «Камунар», Прыбарскага сельсавета Яначкін раздаў 2 бурты бульбы, а 4 гектары (з яго слоў) яшчэ і на сёння не засеяны. Аналагічнае ў калгасе «Новая Зара». Сотні гектараў грэчкі яшчэ не засеяны ў калгасах Ліпініцкага, Кашалёўскага, Дуравіцкага і інш. сельсаветаў. Гэта таму, што кіраўнікі калгасаў, у тым ліку і партыйныя арганізацыі, штучна зацягваюць сяўбу, чым зніжаюць ураджайнасць. ЦК КП(б)Б і СНК БССР у сваёй пастанове аб разгортванні меліярацыйных работ ясна ўказвалі кіраўнікам партыйных, савецкіх і зямельных органаў, кіраўнікам калгасаў, МТС на неабходнасць зараз пасля заканчэння сяўбы прыступіць да разгортавання ў кожным калгасе масавых меліярацыйных работ. Толькі 10 калгасаў прыступілі да меліярацыі, асушылі ўсяго 130 га балота, а раёну ж патрэбна асушыць і асвоіць каля 5000 га новых зямель. На плошчы 530 гектараў трэба правесці пасеў папярэдніх культур. МТС, згодна плана, павінны апрацаваць больш за 5000 гектараў меліярацыйных зямель, на жаль, ні адзін трактар яшчэ не адпраўлены на балоты.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР абавязалі дырэктараў МТС неадкладна пераключыць не менш 50% трактароў на асваенне новых зямель. Аднак, тэмпы разгортвання масавых меліярацыйных работ у раёне недапушчальна нізкія... Калгасы Буда-Кашалёўскага раёна маюць усе ўмовы паспяхова правесці ўсе сельскагаспадарчыя работы.

М.Пугач.

8 ліпеня 1940 г.

СПАБОРНІЦТВЫ БРЫГАД

Брыгады сельскагаспадарчай арцелі «Палеская праўда» Смычкоўскага сельсавета Уваравіцкага раёна для паспяховага правядзення палявых работ разгортваюць сацыялістычнае спаборніцтва і стаханаўскія метады працы. Садова-агародная брыгада (брыгадзір Мельнікаў Раман) ужо засеяла ўсе гародныя культуры і гектар табаку. За садам наладжаны добры догляд. Яблыні абяцаюць даць добры ўраджай. Агародна-паляводчая брыгада (брыгадзір Маркелаў Філіп) у сціплыя тэрміны і па ўсіх правілах агратэхнікі правяла вясеннюю сяўбу і выканала план пасеву ўсіх культур. Не адстае ад яе і 1-я брыгада. У гэтым годзе калгас стварае моцную кармавую базу: засеяў згодна плану канюшыну, віку і іншыя травы. Жывёла калгаса і жывёла калгаснікаў будзе забяспечана на зіму добрымі кармамі. Актыўна рыхтуецца калгас да ўборкі ўраджаю і да сенакашэння.

В.М.Маркелаў.

Падрыхтавала Т.А.Бяланава

Палітычныя рэпрэсіі на Буда-Кашалёўшчыне

Новая эканамічная палітыка дала магчымасць сялянству, тады асноўнай частцы насельніцтва краіны, паўней карыстацца плёнам сваёй працы. Разам з ростам сельскагаспадарчай вытворчасці расла і заможнасць сялян. У другой палове 1920-х гадоў звычайная сялянская гаспадарка на Беларусі складалася з 5—7 чалавек сям'і, мела 5—6 дзесяцін зямлі (крыху больш як 5—6 гектараў — пры максімальна ўстаноўленай норме 13 дзесяцін), каня, некалькі кароў, свіней, птушкі. Удзельная вага беднякоў і батракоў у параўнанні з дарэвалюцыйным часам скарацілася прыкладна з 60% да 31,2%, а серадзякоў вырасла амаль да $^2/_3$ усяго сялянства. Сяляне, аднесеныя да кулакоў, крыху перавышалі 4% агульнай колькасці.

Разам з ростам заможнасці сялянства расла і яго самапавага, пачуццё годнасці, імкненне адыгрываць больш значную ролю пры вырашэнні спраў, якія яго датычылі — праз мясцовыя органы ўлады, кааператывы, на сялянскіх сходах. У такога селяніна цяжка было ўзяць хлеб па нявыгаднай для яго цане, у чым партыйныя і савецкія органы пераканаліся пасля неўрад-

жаяў 1924 і 1927 гадоў, калі хлеба было сабрана меней, чым планавалася.

Як паказалі кампаніі па хлебанарыхтоўках 1924/25 і 1927/28 гадоў, уладам даводзілася чакаць супраціўлення з боку сялян. Таму ўжо вясной 1929 г. пачала зараджацца хваля масавых рэпрэсій.

У архіўных матэрыялах па Буда-Кашалёўскім раёне сустракаюцца звесткі аб дзейнасці пазней набыўшых нядобрую вядомасць так званых «троек» яшчэ летам 1921 г. (Дзяржархіў Гомельскай вобласці. Ф. 1072. Воп. 1. Спр. 7. Л. 1). У 1924 г. з'явіліся асобыя нарады пры органах АДПУ з правамі судоў. Значэнне несудовых органаў у рэпрэсіўнай сістэме расло, а пакаранні, якія яны выносілі, рабіліся больш жорсткімі.

Апора ў самой вёсцы для правядзення палітыкі масавых рэпрэсій была створана шляхам яе штучнага расколу і нацкоўвання адной часткі сялянства на другую — беднаты на заможных сялян. Бяднейшае сялянства шырока ўцягвалася ў кампаніі па канфіскацыі хлеба ў багацейшых сялян. За гэта ўдзельнікі канфіскацый атрымлівалі 25% хлеба, адабранага ў іх аднавяскоўцаў. Эфектыўным інструментам расколу вёскі была падатковая палітыка: бедната вызвалялася ад падатку, а заможныя сяляне абкладваліся ў павышаных памерах. Найбольш моцныя гаспадаркі абкладваліся ў індывідуальным парадку ў такіх памерах, што гэта нярэдка вяло да іх разарэння. Так, падатковая камісія пры Дуравіцкім сельсавеце летам 1930 г. абклала ў індывідуальным парадку Х.Л.Ляскоўскага, гаспадарка якога давала яму прыбытак «па норме» 547 руб. 40 кап., а па падліку камісіі — 1470 руб. 20 кап. (у т. л. сад — у суме 200 руб.). З гэтага прыбытку ён павінен быў заплаціць 594 руб. 45 кап. падатку (Тамсама. Ф. 989. Воп. 1. Спр. 7. Л. 9, 15, 32.). Падатковая камісія Ліпініцкага сельсавета ў тым жа годзе абклала ў індывідуальным парадку Дз.А.Ражкова, які па падліках раённай падатковай камісіі меў са сваёй гаспадаркі прыбытак у суме 3950 руб., у тым ліку неземляробчага паходжання (крупарушка, кузня, майстэрні) — 3000 рублёў. Падатку ён павінен быў заплаціць 1759 руб. 50 кап. (з гэтай сумы 19 рублёў на 5 курэй — болей, чым сярэднезаможны селянін плаціў з усёй сваёй гаспадаркі) (Тамсама. Спр. 8. Л. 18, 19.). У той жа час у адпаведнасці з «Палажэннем аб адзіным сельскагаспадарчым падатку», прынятым у лютым 1929 г., ад падатку вызваляліся ўсе члены сельскагаспадарчых камун і арцелей, даход якіх не перавышаў 30 рублёў на едака, а таксама іншыя катэгорыі сялян з невысокімі даходамі. Гэтак жа было і з так званым «добраахвотным самаабкладаннем» — фактычна дадатковым падаткам, якім заможныя сяляне абкладваліся ў павышаных памерах, а бедната ў паніжаных, нават магла зусім ад яго вызваляцца па рашэнні сходаў той жа беднаты. Селянін-бядняк вызваляўся яшчэ ад такой формы ўціску з боку дзяржавы, як «цвёрдае заданне» — дадатковага натуральнага падатку, які стаў сродкам падрыву моцнай сялянскай гаспадаркі ў часы масавай калектывізацыі. Гэтая мера закранула немалую частку насельніцтва: напрыклад, сярод сялян в. Буда-Люшаўская ў 1931 г. «цвёрдазаданнікаў» аказалася 20 чалавек. Кожны з іх павінен быў аддаць дзяржаве ў сярэднім 100—200 пудоў сена, 50—100 пудоў саломы, 10—20 пудоў бульбы, па адной свінні (некаторыя — па дзве), 200—400 літраў малака і г.д. (Тамсама. Спр. 20. Л. 15 і інш.)

Неабходна заўважыць, што нават бяднейшае сялянства не адразу паддалося на спакусу лягчэйшага, як здавалася, жыцця за кошт сваіх багацейшых суседзяў. У архіўных матэрыялах сустракаюцца неадзінкавыя факты расколу саміх груп беднаты пры вырашэнні пытанняў аб абкладанні індывідуальным падаткам. Так, напрыклад, 13 студзеня 1931 г. група беднаты пры Дуравіцкім сельсавеце 11 галасамі супраць 9 не падтрымала прапанову старшынствуючага на сходзе «члена ВКП(б) тов. Красного», як гаворыцца ў дакуменце, аб прызнанні кулацкай гаспадаркі П.І.Шваякова і абкладанні яго падаткам у індывідуальным парадку. Пры гэтым група пайшла супраць рашэння калгаса пасёлка Леніна, які прадставіў акт аб аднясенні названай гаспадаркі да кулацкай (Тамсама. Спр. 7. Л. 57.). Яшчэ часцей у абарону сваіх землякоў выступалі сяляне на агульных сходах жыхароў вёсак і пасёлкаў раёна. Свае меркаванні яны выказвалі ў так званых «прыгаворах» — дакументах, падпісаных усімі прысутнымі для перадачы іх уладам. Пад прыгаворамі мы бачым дзесяткі прозвішчаў і подпісаў кашалёўцаў — Агеевы, Бабковы, Бухлавы, Гаевы, Лагуціны, Кіры-

енкі і інш. (Тамсама. Ф. 1072. Воп. 1. Спр. 31. Л. 1, 15; Ф. 989. Воп. 1. Спр. 7. Л. 9, 118; Архіў УКДБ па Гомельскай вобласці. Спр. 1860. Л. 241, 242, 243, 249.). Недзе з зімы 1931 г. такія дакументы знікаюць — разгорнуты ў краіне тэрор і пасеены ім страх зрабілі сваю справу.

Пачатак «вялікага пераломy» на Буда-Кашалёўшчыне можна вызначыць дакладна: 18 мая 1929 г. арыштавалі 17 чалавек, абвінавачаных у антысавецкай агітацыі і зрыве дзяржаўных кампаній. На працягу мая — чэрвеня да іх былі далучаны яшчэ 20 дарослых членаў іх сем'яў. Усе яны жыхары Любавіна, суседніх вёсак і хутароў. Захар Іванавіч і Алена Станіславаўна Богушы, Аляксандр Пятровіч і Феліцыя Антонаўна Будкевічы, Іван Іосіфавіч, Вацлаў Іосіфавіч, Сцяпан Іосіфавіч і Тэадора Іосіфаўна Крукоўскія, Марыя Аляксандраўна Крукоўская, Марыя Вацлаваўна Крукоўская, Зянкевічы, Контаўты, Ніцыеўскія, Пукінскія, Іван Іванавіч, Францыска Іванаўна і Канстанцыя Іванаўна Сенажынскія, Казімір Леанардавіч, Альбіна Міхайлаўна, Бернард Сцяпанавіч Сенажынскія, Сакалоўскія, Цэханы, Марцін Францавіч Яцкевіч і інш. Як відаць з матэрыялаў следчай справы, канкрэтных доказаў антысавецкай дзейнасці гэтых людзей не знайшлося. Асноўнымі фактамі, выкрываючымі іх, было сацыяльнае паходжанне і сацыяльнае становішча: «з дваран» — запісваў следчы, што азначала — з мясцовай шляхты, «кулакі», выплачваюць вялікі падаходны падатак (160—300 рублёў), пазбаўлены выбарчых правоў. У віну ставіліся таксама крытычныя выказванні ў адрас савецкай улады, адпаведныя настроі і верагодныя намеры арыштаваных, якія здолеў разгадаць следчы. Зыходзячы з таго, што ўсе яны былі сваякамі або суседзямі, следчы кваліфікаваў іх як арганізаваную антысавецкую кулацкую групу. Сведкамі выступалі мясцовыя жыхары з ліку беднаты і прадстаўнікі сельскага савецкага актыву. Асобныя прызнанні аб сваіх антысавецкіх настроях (але не аб дзейнасці) давалі і самі падследныя. Напрыклад, Марцін Францавіч Яцкевіч, былы садоўнік з панскага маёнтка, прызнаўся, што ён незадаволены пазбаўленнем яго выбарчых правоў «за гандаль ёлкай... Да таго ж яшчэ бедната мяне злуе: яны працаваць не хочуць, а хочуць, каб ім нехта даў гатовае». (Архіў УКДБ па Гомельскай вобласці. Спр. 1860. Л. 44). Думаем, што гэтым паказанням можна давяраць, бо яшчэ не ведаючы, што іх чакае, людзі выказвалі шырока распаўсюджаныя ў той час настроі.

11 чэрвеня 1929 г. следчы Гомельскага акруговага аддзела ДПУ Беларусі склаў абвінаваўчае заключэнне ў адносінах гэтай першай на Буда-Кашалёўшчыне групы арыштаваных. Яно цікавае тыповасцю матывацыі абвінавачання і прапанаванага пакарання, таму працытуем яго шырэй. Насуперак матэрыялам справы, з якіх не відаць, у чым заключалася антысавецкая дзейнасць арыштаваных, следчы канстатуе даказанасць іх віны. Аднак сапраўдныя прычыны арышту гэтых людзей выяўляюцца далей: «... Исходя из тех соображений: 1) что следствием полностью установлена социальная опасность обвиненных;

2) что помимо наличия контрреволюционных настроений и антисоветской агитации, не исключена возможность занятия обвиненными шпионской деятельностью в пользу Польши, чему предпосылкой служат связи с заграницей отдельных участников группировки;

3) что оставление обвиняемых глав семейств на свободе и обвиняемых членов семей — в пределах БССР, как социально опасных, является нежелательным, а в условиях политического состояния Буда-Кошелевского района — даже опасным...», следчы «полагал бы» справу № 1454 па абвінавачанні названых 37 чалавек «направить в КРО ОГПУ с просьбой войти с ходатайством перед Особым Совещанием Коллегии ОГПУ о заключении в концлагерь на срок по усмотрению (пералічваюцца 17 прозвішчаў) и высылке остальных». (Тамсама. Л. 192—193). У гэтай жа архіўнай справе (Л. 197) ёсць выпіска з пратакола асобай нарады пры Калегіі АДПУ ад чэрвеня 1929 г. з рашэннем аб высылцы ў Сібір усіх 37 чалавек тэрмінам на 3 гады. Далейшы лёс большасці з гэтых людзей губляецца на халодных прасторах Краснаярскай і Томскай акруг. Іншыя дакументы з таго ж архіва сведчаць, што маёмасць высланых была канфіскавана, а на іх зямлі пачалі ствараць калгас.

Вось яшчэ адзін лёс звычайнага чалавека, факты яго трагічнага жыцця ў тыповых рысах адлюстроўваюць сітуацыю, што

склалася тады ва ўсёй Беларусі. Летам 1929 г. Канстанцін Захаравіч Богуш з жонкай і трыма дзецьмі вярнуўся ў в. Шутнае з Самахвалавіцкага раёна, дзе працаваў рахункаводам, у апусцелую хату свайго арыштаванага бацькі, спадзеючыся, напэўна, тут жыць. Але хата была канфіскавана, а зямля перададзена калгасу. Таму ў сярэдзіне верасня 1929 г. К.З.Богушу было прапанавана выселіцца з бацькавай хаты. Можна зразумець, што адбывалася ў душы гэтага чалавека. Магчыма, пагражаў сваім крыўдзіцелям, бо аб ім гаварылі, што быў «адчайнай асобай». Арганізатарам мясцовага калгаса здавалася, што К.З.Богуш спрабуе «разлажыць» калгас. 24 верасня прэзідыум Любавінскага сельсавета прыняў рашэнне аб высяленні антысавецкіх элементаў, як актыўна выступаючых супраць мерапрыемстваў савецкай улады, зрываючых калектывізацыю і землеўпарадкаванне ў в. Шутнае. У зацверджаным спісе тых, каго належала выселіць, К.З.Богуш аказаўся пад нумарам 5. Перад высяленнем, 30 верасня, ён атрымаў распараджэнне Буда-Кашалёўскага сельскагаспадарчага таварыства, каб хутчэй выкапаў бацькаву бульбу, бо ўжо быў заказаны вагон для яе адпраўкі дзяржаве. Відавочна, ён не паспеў выканаць гэта распараджэнне, бо праз дзень упаўнаважанаму ДПУ па Буда-Кашалёўскім раёне паступіла заява ад намесніка старшыні калгаса імя Дзяржынскага І.С.Казлоўскага аб тым, што вечарам 30 верасня на яго напалі К.З.Богуш і яшчэ два чалавекі, так што ледзь удалося ўратавацца. Звесткі, прыведзеныя ў гэтай заяве, пацвердзіў стрыечны брат І.С.Казлоўскага — якраз той чалавек, які дапамог яму ўратавацца. На гэтай падставе 4 кастрычніка К.З.Богуш быў арыштаваны і абвінавачаны ў здзяйсненні тэрарыстычнага акта. Сваёй віны ён не прызнаў. Следству не ўдалося таксама ўстанавіць іншых двух чалавек, якія быццам бы ўдзельнічалі ў нападзенні. Нягледзячы на гэта і адсутнасць іншых доказаў віны К.З.Богуша, акрамя паказанняў братоў Казлоўскіх, яго справа была перададзена ў ДПУ БССР, а адтуль — на асобую нараду АДПУ СССР з прапановай прымяніць да абвінавачанага «вышэйшую меру сацыяльнай абароны — расстрэл». Як можна зразумець на падставе абвінаваўчага заключэння, такое жорсткае пакаранне гомельскія чэкісты прапанавалі за тое, што К.З.Богуш сапсаваў ім работу, праведзеную ў маі — чэрвені, калі была арыштавана і «абясшкоджана» «кулацка-шляхецкая групоўка» з 37 чалавек (Тамсама. Спр. 18028. Л. 6, 11, 21, 25, 32—34.). Аднак Калегія АДПУ СССР не згадзілася з мерай пакарання — занадта хісткімі былі доказы віны — і 3 снежня 1929 г. асудзіла К.З.Богуша да заключэння ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў на падставе арт. 58 п. 8 і 10 Крымінальнага кодэкса РСФСР («Контррэвалюцыйныя злачынствы»). Праз 7—8 гадоў такой «мяккасці» ДПУ ужо не дапускала. Уцалелы ў канцлагеры К.З.Богуш у 1938 г. быў зноў арыштаваны і ўжо амаль без усялякага следства, на падставе быццам бы ўласнага прызнання, быў асуджаны да вышэйшай меры пакарання (Тамсама. Спр. 14894. Л. 10—11, 14—15, 26). Такім быў лёс многіх арыштаваных на мяжы 1920—1930-х гадоў.

Зімой і вясной 1930 г. рэпрэсіі былі непасрэдна звязаны з правядзеннем суцэльнай калектывізацыі. Так, напрыклад, былі рэпрэсіраваны чатыры браты Берчанкі з хутара Мядзведзева Патапаўскага сельсавета. Са спасылкай на звесткі, паступаўшыя ў Гомельскі акругoвы аддзел ДПУ, абвінаваўчае заключэнне адзначае, што, «карыстаючыся аўтарытэтам у адсталага і малаграматнага сялянства і трымаючы яго ў эканамічнай залежнасці», браты Апанас, Сяргей, Ігнат і Ануфрый Берчанкі «з мэтаю зрыву суцэльнай калектывізацыі, якая праводзіцца ў раёне, сістэматычна збіраюць у сябе на хутары таемныя сходы беднякоў і сераднякоў... вядуць антысавецкую і антыкалгасную агітацыю...» (Тамсама. Спр. 16710-С. Л. 57). 29 студзеня, калі заведзена следчая справа, у Патапаўцы быў праведзены сход беднаты, на якім прысутнічала, калі верыць пратаколу, 120 чалавек. Старшынстваваў на сходзе прадстаўнік РК КП(б)Б Дупанаў. І вось сяляне з Патапаўкі, сярод якіх браты Берчанкі карысталіся аўтарытэтам, як гэта відаць з вышэй цытаванага дакумента, аднагалосна адобрылі арышт 8 чалавек, у тым ліку і братоў Берчанкаў. Больш таго: удзельнікі сходу быццам бы абавязаліся садзейнічаць органам улады ў правядзенні калектывізацыі ў Патапаўцы і ліквідацыі кулацтва як класа.

Некаторыя дэталі пратакола сходу патапаўцаў сведчаць аб тым, што супра-

цоўнікі ДПУ, хутчэй за ўсё, былі сааўтарамі гэтага дакумента, што падрывае верагоднасць усёй інфармацыі, якая ў ім прыводзіцца. Так, у яго трэцім пункце мясцовая бедната быццам бы пахваліла органы ДПУ: яна «действительно на факте убедилась и установлено, что органы ГПУ под руководством партии четко, быстро выявляют замыслы и агитацию антисоветской кулацкой своры, что и в дальнейшем (они) справятся с этими вылазками...». Пад машынапісным тэкстам дакумента надпіс «верно». «Уполномоченный ГПУ Высоцкий» і подпіс упаўнаважанага (Тамсама. Спр. 16710. Л. 48.). 21 лютага 1930 г. тройка пры паўнамоцным прадстаўніцтве АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе падтрымала прадстаўленне Гомельскага акруговага аддзела ДПУ і прыняла рашэнне расстраляць братоў Берчанкаў на падставе артыкула 76 Крымінальнага кодэкса БССР (за дзейнасць супраць савецкай улады). Як відаць з іншых дакументаў, іх сем'і былі сасланы на Поўнач (Тамсама. Спр. 18211. Л. 142).

Акалічнасці рэпрэсіравання ў пачатку 1930 г. 8 чалавек з Патапаўскага сельсавета сведчаць аб пэўных нязручнасцях, з якімі сутыкаліся мясцовыя ўлады пры вырашэнні пытання, як быць з сем'ямі і маёмасцю «раскулачаных». Паколькі для гэтага яшчэ не было нарматыўнай базы, даводзілася іншы раз інсцэніраваць сходы беднаты і абапірацца на іх рашэнні. Аднак 30 студзеня 1930 г. Палітбюро зацвердзіла пастанову ЦК ВКП(б) «Аб мерапрыемствах па ліквідацыі кулацкіх гаспадарак у раёнах суцэльнай калектывізацыі» (БССР была аднесена да такіх раёнаў). 20 лютага таго ж года была прынята спецыяльная пастанова Палітбюро аб калектывізацыі і барацьбе з кулацтвам у нацыянальных раёнах, якая таксама датычылася і Беларусі. Першая з гэтых пастаноў даводзіла мясцовым органам планы («развёрсткі») высялення сем'яў кулакоў, а другая — дадатковы план высялення з Беларусі і Украіны польскіх сялянскіх сем'яў, у прыватнасці сем'яў асуджаных. З Беларусі належала выселіць 3—3,5 тыс. польскіх сем'яў. А іх было нямала і ў Буда-Кашалеўскім раёне. Цяпер мясцовы рэпрэсіўны апарат пачаў рабіць сваю справу з большай цвёрдасцю, што хутка прывяло да адпаведных вынікаў. За 1930 г., па архіўных даных, у Буда-Кашалёўскім раёне было рэпрэсіравана звыш 80 чалавек, з іх 18 чалавек прыгавораны да расстрэлу.

Сем'і расстраляных вывозілі ў аддаленыя раёны, яны нічога не ведалі аб лёсе сваіх родных. Франц Казіміравіч Ясінскі, 1921 года нараджэння, жыхар в. Любавін, успамінае: «Бралі ноччу, заганялі ў грузавую аўтамашыну, ставілі ў ёй на калені... Выселеным дазвалялася браць з сабой 25 пудоў маёмасці». Да таго часу кашалёўцы яшчэ не бачылі такіх жахаў, а тыя нямногія, хто дзецьмі, падлеткамі перажылі іх, не могуць забыць і сёння. Вось што пісалі на адрас X сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 12-га склікання сведкі тых падзей з в. Любавін: «На станцыях Буда-Кашалёўская, Уза, Салтанаўка стаялі таварныя цягнікі для пагрузкі раскулачаных. Раскулачванне адбылося хутка, літаральна за дзве гадзіны. Людзей грузілі ў таварныя вагоны як скаціну... Ніхто з іх не вярнуўся...»

У прыведзеных радках няма ні кроплі перабольшання — яны пацвярджаюцца даступнымі цяпер дакументамі. Вось, напрыклад, акты на канфіскацыю маёмасці раскулачаных па Недайскім сельсавеце: на Цімоха Шынкарова, Трафіма, Якава і Паўла Капусціных, Ягора Зубкова, Ціхана Прышчэпенка, Панаса Юрчанку, Міколу Кухарава, Алеся Хількевіча, Трафіма Шостава. Такія ж акты на жыхароў Дуравіцкага, Буда-Кашалёўскага сельсаветаў. Сума канфіскаванай маёмасці, па ацэнцы камісій, вагаецца ў межах ад 600 да 1000 рублёў. А вось маёмасць Еўдакіма Адамавіча Галіцкага з Буда-Кашалёўскага сельсавета ацэнена ў 5608 рублёў. У Маркі Сцяпанавіча Пархвянецкага з хутара Мачулішча Дуравіцкага сельсавета канфіскавалі ветраны млын, які не здолелі ацаніць, а ў ім яшчэ і вагі. Канфіскавалася ўсё: хаты, гаспадарчыя пабудовы, майстэрні з абсталяваннем, інвентар, жывёла, сады, пчолы. У Цімоха Шынкарова з в. Іванаўка забралі абсталяванне для вырабу цэглы на суму 162 рублі, у Яўхіма Крукоўскага з в. Слабада-Люшаўская, акрамя ўсяго іншага — яблыкі на фантастычную суму ў 708 рублёў (тады карова ацэньвалася ў 50—60 рублёў).

Канфіскаваная маёмасць, як правіла, перадавалася ў калгасы, але частка яе прадавалася тым жа калгасам і насельніцтву. Напрыклад, у Яўхіма Крукоўскага было

прададзена маёмасці калгасу і насельніцтву на суму 494 руб., унесена на пагашэнне сельгаспадатку 526 руб., на самаабкладанне — 214 руб. і г.д. (Дзяржархіў Гомельскай вобласці. Ф. 989. Воп. 1. Спр. 25. Л. 7). У калгасы трапляла нямала няўлічанай маёмасці, якая разбазарвалася.

Ці спрабавалі людзі супраціўляцца? Па многіх прычынах у сітуацыі, якая склалася да пачатку 1930-х гадоў, гэта было безнадзейнай справай. Тым не менш жыхары Буда-Кашалёўшчыны на сваіх сходах выступалі ў абарону землякоў. Вядома нямала выпадкаў уцёкаў з месцаў высылкі, многія ўцекачы стараліся дабрацца на радзіму, а вярнуўшыся, жылі тут, не хаваючыся, нават працавалі ў калгасе. Некаторыя лічылі тое, што адбылося з імі, трагічным непаразуменнем. Спрабавалі дабіцца праўды. Так зрабіў Сямён Антонавіч Душкевіч з пасёлка Чырванарэчча Лапіцкага сельсавета, у лютым 1930 г. сасланы ў Пермскую вобласць. Ён уцёк, дабраўся да Мінска і звярнуўся ў ЦВК БССР з мэтаю «выясніць сваю справу». Спадзяваўся на сваё рэвалюцыйнае мінулае — як напісаў у заяве, ён «служыў пры штабе галоўнакамандуючага Заходнім фронтам тав. Берзіна», а пазней «увесь час стаяў на баку савецкай улады». Аднак у ЦВК яму параілі звярнуцца ў Гомельскі акруговы аддзел ДПУ, дзе ён і быў арыштаваны. Без доўгага разбору 25 лістапада 1930 г. С.А.Душкевіча асудзілі яшчэ раз, але ўжо да зняволення ў канцлагер на 3 гады. Шукаючы праўды, гэты чалавек не ведаў, што гомельскія чэкісты незадоўга да яго вяртання ў Гомель правялі аперацыю, у выніку якой арыштавалі 283 мужчыны і жанчыны, якія ўцяклі з месцаў высылкі. 246 чалавек адправілі назад без суда, а 37 чалавек, з боку якіх можна было чакаць «актыўных антысавецкіх дзеянняў», перадалі «тройцы» Паўнамоцнага прадстаўніцтва АДПУ па Беларускай ваеннай акрузе, якая і асудзіла 35 чалавек з гэтай групы на 3 гады канцлагера (Архіў УКДБ па Гомельскай вобласці. Спр. 17696. Л. 2—5, 35; Спр. 18608-С. Л. 1, 3, 12). Сярод асуджаных уцекачоў — і кашалёўцы А.І.Берчанка, І.А.Галіцкі, Р.І.Ткачоў, П.І.Парфёнаў, С.Я.Семчанка, Я.Г.Долгін.

1931 г. і большая палова 1932 г. — гэта час, калі хваля рэпрэсій пайшла на спад. Але з канца 1932 г. рэпрэсіі супраць сялянства разгарнуліся з новай сілай. Суседнюю Украіну ахапіў страшэнны голад, ад якога паміралі тысячы людзей. Праз Гомельшчыну на Беларусь і далей у пошуку харчоў прабіраліся галадаючыя. Многія з іх паміралі ў дарозе. Каб спыніць некантралюемыя перамяшчэнні па краіне вялізных мас насельніцтва, урад СССР пазбавіў сялян права мець пашпарты, якія ўводзіліся для ўсіх іншых грамадзян у гэты час.

У гэтай напружанай, трывожнай сітуацыі знізілася працоўная дысцыпліна ў калгасах, многія з іх развалiліся. Упаўнаважаны Буда-Кашалёўскага раённага апарату ДПУ ў лютым 1933 г. адзначаў, што толькі ў Забалацкім сельсавеце ў 1932 г. кулакі развалілі 2 калгасы з 20 арганізаваных. І тады для ратавання калгаснай сістэмы пачалася новая хваля рэпрэсій. У 1933 г. па раёне было рэпрэсіравана звыш 270 чалавек, з іх 40 чалавек былі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Цяпер рэпрэсіі праводзіліся, у асноўным, па двух матывах: першы — калі разгільдзяйства і безгаспадарчасць, якіх хапала ў калгасах, кваліфікаваліся як дзеянні, накіраваныя на іх свядомы развал, другі — калі так званыя «антысавецкія элементы» абвінавачваліся ў здзяйсненні тэрарыстычных актаў супраць калгаснага актыву. А.А.Ляўковіч, В.І.Ляўковіч, Р.І.Ляўковіч, С.І.Крукоўскі, А.С.Сенажынскі, К.Л.Сенажынскі з пасёлка Любавін былі прыцягнуты да адказнасці як «пралезшыя ў калгас імя Дзяржынскага кулакі». Усе яны былі асуджаны «тройкай» пры Паўнамоцным прадстаўніцтве АДПУ па БССР да зняволення ў ППЛ на тэрмін ад 3 да 8 гадоў (Тамсама. Спр. 14096). З студзеня 1933 г. у в. Забалацце адбылася падзея, якая была кваліфікавана як тэрарыстычны акт і каштавала жыцця 14 чалавекам.

Позна вечарам у акно хаты, дзе знаходзілася брыгада хлебанарыхтоўшчыкаў — мясцовых актывістаў — нехта стрэліў з абрэза. Пры аглядзе месца здарэння, праведзенага па гарачых слядах начальнікам раённай міліцыі ў прысутнасці старшыні сельсавета, у сцяне аднаго з пакояў «сякерай была вынута са сцяны куля ад рускай трохлінейнай вінтоўкі». Аднак дзіўным чынам упаўнаважаны раённага апарату АДПУ Лешчанка, які на наступны дзень завёў следчую справу, не заўважыў ні кулі, ні ўпамінання аб ёй у пратаколе аб агля-

дзе месца здарэння, складзеным начальнікам раённай міліцыі. Ён распарадзіўся арыштаваць 28 чалавек. 27 з іх было прад'яўлена абвінавачанне ў правядзенні на працягу доўгага часу антысавецкай дзейнасці, якая і завяршылася тэрарыстычным актам. У абвінаваўчым заключэнні, падпісаным 1 красавіка, упаўнаважаны напісаў: «Рэчавых доказаў па гэтай справе няма» (Тамсама. Спр. 1401. Л. 32, 221). Куля дзесьці знікла, не знайшлі і абрэз, з якога быў зроблены стрэл. Да гэтага часу ўпаўнаважаны вырашыў адпусціць 13 чалавек.

14 красавіка 1933 г. рашэннем «тройкі» пры Паўнамоцным прадстаўніцтве АДПУ па БССР на падставе артыкулаў 70, 72, 76 Крымінальнага кодэкса БССР былі асуджаны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці А.Е.Макееў, С.М.Шаршнёў, К.З.Карбачоў, Ф.А.Давыдзенкаў, М.І.Лебедзеў, І.Е.Бадзюкоў, Н.І.Купрыяшнікаў, М.Е.Купрыяшнікаў, Ц.Е.Еўтухоў, П.М.Чуракоў. Сем'і ўсіх пералічаных, акрамя П.М.Чуракова, былі высланы ў Паўночны край на 3 гады. М.Мікіт. Гуменнік, А.К.Рудзянкоў, І.Яўм. Макееў былі зняволены ў ППЛ на 10 гадоў без канфіскацыі маёмасці. Даных аб іх вызваленні няма, таму можна меркаваць, што і яны загінулі праз нейкі час.

У сярэдзіне 1930-х гадоў калгасны лад у савецкай краіне перамог, у сувязі з чым і рэпрэсіі пайшлі на спад. У снежні 1936 г. была прынята новая Канстытуцыя СССР, якая абвясціла аб перамозе новага грамадскага ладу — сацыялізму. Упершыню ўводзілася ўсеагульнае, роўнае для ўсіх выбарчае права пры тайным галасаванні. На 1937—1938 гг. былі запланаваны выбары ў Вярхоўны Савет СССР і ў Вярхоўныя Саветы саюзных рэспублік на аснове новага выбарчага права. Аднак упэўненасці ў тым, што яны прынясуць пажаданыя вынікі, не было. Не выключалася ажыўленне апазіцыйных настрояў, асабліва ў пагранічных раёнах са змешаным насельніцтвам. А Буда-Кашалёўскі раён быў адным з тых, дзе значную частку насельніцтва складалі палякі або беларусы-католікі. Тут у сярэдзіне 1920-х гадоў быў нават створаны польскі нацыянальны сельсавет з цэнтрам у Любавіне.

Польская нацыянальнасць чалавека або наяўнасць сваякоў у суседняй Польшчы заўсёды прыцягвалі ўвагу ДПУ. Аднак у часы правядзення суцэльнай калектывізацыі гэта акалічнасць у палітыцы рэпрэсій яшчэ не мела асаблівага значэння. Тады стаяла задача абясшкодзіць «антысавецкія элементы», якія аб'ектыўна, хацелі таго ці не, стваралі пагрозу зрыву гэтай важнейшай гаспадарча-палітычнай кампаніі. Паколькі сярод польскага насельніцтва ўдзельная вага заможнага сялянства была вышэйшая, чым сярод беларускага, таму яно і трапляла пад мацнейшы ўдар. З пачаткам суцэльнай калектывізацыі на Буда-Кашалёўшчыне дзеля абясшкоджвання «антысавецкай агітацыі» органы ДПУ пачалі шырока выкарыстоўваць у комплексе абвінаваўчых матэрыялаў агентурныя даныя і паказанні сведкаў аб прапольскіх сімпатыях тых, хто трапляў у поле іх зроку. Здаралася, што ў гэтай сітуацыі людзі, якія лічылі сябе палякамі, выказвалі спадзяванні на тое, што «прыйдуць палякі» і тут усё зменіцца на лепшае.

Нават у пачатку 1933 г. органы ДПУ яшчэ не праяўлялі адназначнага падыходу да рэпрэсій супраць палякаў. Гэта добра відаць з матэрыялаў дзвюх спраў, праведзеных на Гомельшчыне амаль адначасова. Па адной з іх сведкі паказвалі, што 6 кулакоў, арыштаваных у пасёлку Любавін, на працягу доўгага часу вялі агітацыю за аддзяленне Беларусі ад СССР і далучэння яе да Польшчы. Аднак упаўнаважаны АДПУ не ўключыў гэты матэрыял у абвінаваўчае заключэнне, засяродзіўшы ўвагу на фактах, якія, на яго думку, сведчылі аб дзейнасці, накіраванай на развал калгаса (Архіў УКДБ па Гомельскай вобласці. Спр. 14096. Л. 8, 11, 65). Іншая задача стаяла перад чэкістамі ў Гомелі. Тут зімой 1933 г. у сувязі з пагаршэннем забеспячэння харчовымі таварамі расла незадаволенасць насельніцтва палітыкай партыі і ўрада. Узнікшыя цяжкасці гамяльчане лічылі вынікам калектывізацыі. Каб змяніць гэтыя настроі, органамі АДПУ была сфабрыкавана справа аб контррэвалюцыйнай паўстанцкай арганізацыі эсэраўскага накірунку ў Гомелі, якая быццам бы мела свае аддзяленні на тэрыторыі тагачаснага Уваравіцкага раёна (вёскі Бацунь, Крыўск, Хоўхла, Пыцькаўка і інш.). У абвінаваўчым заключэнні па гэтай справе членамі арганізацыі называюцца 35 чалавек. Паколькі гэта быццам бы была разгалінавая арганізацыя, якая ставіла задачу падрыхтаваць паўстанне дзеля ліквідацыі савецкай ула-

ды, то яна, безумоўна, павінна была мець і сваю праграму, сваю зброю. Тут без Польшчы было не абысціся. Таму аўтар абвінаваўчага заключэння прыдумаў праграмна-палітычныя і тактычныя ўстаноўкі для гэтай «арганізацыі»: «Свержение советской власти...», «передача земли в собственность крестьянам и немедленная ликвидация совхозов и колхозов», «установление связей с польским правительством для получения материальной поддержки и оружия» і інш. (Тамсама. Спр. 8805. Т. 2. Л. 288). Па гэтай справе 28 чалавек былі асуджаны да расстрэлу, астатнія — да розных тэрмінаў зняволення ў ППЛ.

Пасля падпісання ў 1932 г. дагавора аб ненападзенні з Польшчай савецкае кіраўніцтва некаторы час спадзявалася на далейшае паляпшэнне адносін з ёй. Гэтыя спадзяванні былі яшчэ адной прычынай «зацішша» ў правядзенні рэпрэсій у раёнах з польскай нацыянальнай меншасцю. Аднак яны не спраўдзіліся, таму новая хваля рэпрэсій, якая накрыла Буда-Кашалёўшчыну ў 1937 — 1938 гг., з асаблівай жорсткасцю ўдарыла па мясцовым польскім насельніцтве. Першым сігналам яе набліжэння быў арышт у студзені 1936 г. жыхаркі в. Любавін Марыі Крукоўскай-Кшэсінскай за тое, што яна не паведаміла органам дзяржбяспекі аб сваім браце, які жыў у Польшчы, супрацоўнічаў з польскай разведкай і неаднойчы выконваў яе заданні на тэрыторыі СССР. М.Крукоўская-Кшэсінская атрымала 10 гадоў ППЛ — тады вышэйшы тэрмін зняволення. Калі ж у жніўні 1937 г. у БССР пачалася аперацыя НКУС «па польскай, нямецкай і латвійскай агентуры», справа Крукоўскай-Кшэсінскай аказалася проста знаходкай для энкавэдзістаў: многія яе знаёмыя, землякі пасля арыштаў абвінавачваліся ў тым, што былі завербаваны ёй для супрацоўніцтва з польскай разведкай.

Іншы раз арыштаванага «рабілі» палякам самі органы НКУС, бо гэта аблягчала абвінавачанне і вынясенне пакарання. Так, К.З.Богуш па справе 1929 г. праходзіў як беларус, з сялян, а па справе 1938 г. ён ужо — «паляк, буйны кулак». Ф.А.Язерскі, адвакат Рагачоўскага нарсуда, родам з Буда-Кашалёўшчыны, пры арышце 12 студзеня 1938 г. быў беларусам, а 20 студзеня ў прад'яўленым яму абвінавачанні ён ужо «паляк».

У выніку разгорнутага ў 1937 — 1938 гг. палявання за «польскімі шпіёнамі» імі аказаліся многія калгаснікі з Любавіна і іншых вёсак раёна. Яны быццам бы мелі заданні польскай разведкі збіраць звесткі «об экономической мощи» калгасаў раёна, «готовить диверсионные акты и контрреволюционные повстанческие выступления на случай войны с Польшей» (Тамсама. Спр. 5137-С. Л. 28; Спр. 9892-С. Л. 33; Спр. 14464-С. Л. 13; Спр. 13230-С. Л. 21; Спр. 13337-С. Л. 2). Як правіла, арышты праводзілі і заводзілі следчыя справы на такіх шпіёнаў на падставе даведак, складзеных раённым аддзелам НКУС, дзе давалася характарыстыка кандыдатаў у «шпіёны». Крыніцамі інфармацыі для такіх даведак часта з'яўляліся звесткі, атрыманыя ад сакрэтных супрацоўнікаў (у архіўных матэрыялах сустракаюцца іх псеўданімы).

У ходзе гэтага «палявання» іншы раз здараліся трагікамічныя выпадкі, якія сведчаць, што органы НКУС кіраваліся правілам: «мэта апраўдвае сродкі». Вось як следства дамагалася абвінавачання Паўла Іванавіча Ясінскага з в. Любавін, арыштаванага 25 жніўня 1937 г. У даведцы, складзенай начальнікам Буда-Кашалёўскага райаддзела НКУС Грунданам, адзначалася, што П.І. Ясінскі ў 1918 — 1920 гг. «служил в польских белогвардейских войсках... настроен к мероприятиям Партии и Правительства враждебно». Але праз тыдзень следчаму паступіла даведка сельсавета, з якой вынікала, што П.І. Ясінскі — брыгадзір мясцовага калгаса, паходзіць з беднякоў, у 1929 г. (у ліку першых) уступіў у калгас; на допыце высвятляецца, што да лістапада 1917 г. ён як ваеннаабавязаны служыў у Белгародскім польскім палку, потым вярнуўся на радзіму. Следчаму, магчыма, было невядома або не хацеў ён ведаць, што гэта быў рэвалюцыйны полк, які адразу перайшоў на бок савецкай улады. Як працяг гэтай тэмы, на допыце 27 кастрычніка 1937 г. паміж следчым і арыштаваным адбыўся такі дыялог: «Так почему же Вы не пошли в Красную Армию, а остались у белогвардейцев и врагов советской власти?

Ответ: Белогвардейцев у нас не было, были только немцы.

Вопрос: Следовательно, Вы являетесь приверженцем германского фашизма и состояли у них на службе?

Ответ: На службе я у немцев не состоял, они у меня забрали лошадь» (Тамсама. Спр. 5137-С. Л. 12).

Не ўбачыўшы шанцаў, каб прыпісаць арыштаванаму службу германскім фашыстам (у 1918 г.), следчы змяніў тэму і адразу выставіў абвінавачанне ў яго прыналежнасці да «контррэвалюцыйнай паўстанцкай арганізацыі — Польскай арганізацыі вайсковай». Гэта абвінавачанне стане стандартным і будзе адрасавацца амаль усім арыштаваным, каго так ці інакш можна было звязаць з Польшчай. Аднак у ім было не болей сэнсу, чым у абвінавачанні ў службе германскаму фашызму ў 1918 г., бо «Польская арганізацыя вайскова» (ПАВ) у 1930-я гады не існавала. Тым не менш ужо на наступным допыце П.І.Ясінскі прызнаўся ў прыналежнасці да ПАВ, а праз некалькі тыдняў быў асуджаны і расстраляны ў Гомелі.

Такіх прызнанняў шмат у следчых справах за 1937—1938 гг. Дык што ж штурхала людзей да іх? Мы зразумеем гэта, калі пазнаёмімся з архіўнымі матэрыяламі аб Р.А.Равінскім, былым начальніку аддзялення УНКУС па Гомельскай вобласці, які ў сакавіку 1940 г. быў арыштаваны, а ў верасні асуджаны і расстраляны за тое, што ў 1937—1938 гг. «последовательно проводил враждебную работу, направленную на фальсификацию следственных дел, производство необоснованных арестов и вымогательств от следственно-заключенных ложных провокационных показаний путем применения к ним варварских методов физического воздействия» (Тамсама. Спр. 7766-С. Л. 41). «Варварскія метады» ў гомельскіх чэкістаў — гэта, перш за ўсё, так званыя «парылкі», створаныя ў падвалах будынка УНКУС. Яны ўяўлялі сабой камеры памерамі 2,5 х 1,5 м, без вокнаў і вентыляцыі. Замест 3—4 чалавек сюды заганялі 20—25 чалавек, так што людзі маглі толькі стаяць, шчыльна прыціснутыя адзін да аднаго. Перад змяшчэннем у «парылку» вязняў кармілі салёнымі селядцамі і не давалі вады. Тых, хто траціў прытомнасць, выцягвалі з «парылкі», аблівалі халоднай вадой і вярталі туды зноў, і так да часу, пакуль чалавек не прасіўся «пакаяцца». А такіх Равінскіх было шмат у органах НКУС.

Колькі будакашалёўцаў прайшло праз такія «парылкі» НКУС — невядома. Напэўна, не ўсе з арыштаваных, бо вось, напрыклад, Івана Адамавіча Радзевіча з Любавіна следчы не прымусіў прызнацца, што ён, быццам, з'яўляецца «агентам замежнай разведкі». А можа чалавек аказаўся мацнейшым за іншых? Ва ўсякім разе, асобая «тройка» НКУС БССР, куды была перададзена яго справа для вынясення рашэння, была вымушана карыстацца толькі «справкой» райаддзела НКУС і паказаннямі сведкі (машынапісны тэкст пратакола допыту сведкі не падпісаны). У выніку абвінавачанне ў шпіянажы адпала: «Обвиняется в том, что распространял контрреволюционные провокационные слухи о свержении совввласти, имел связь с польшпионами..., — гаворыцца ў прысудзе. — Постановили: Радзевича Ивана Адамавича заключить в исправтрудлагерь сроком на 10 лет...» (Тамсама. Спр. 13230-С. Л. 23). Для старога чалавека такі прысуд азначаў толькі хуткую смерць на далёкай чужыне.

Акрамя абвінавачанняў у шпіянажы на карысць Польшчы і падрыхтоўцы дыверсійных актаў па заданнях яе разведкі, рэпрэсіўныя органы ў канцы 1930-х гадоў выкарыстоўвалі іншыя абвінавачанні палітычнага характару, хаця і значна радзей. Яны, як правіла, былі рэхам тых вялікіх судовых працэсаў, якія праводзіліся ў савецкай сталіцы. Так, Фёдар Паўлавіч Елісееў, жыхар в. Кашалёў, быў двойчы асуджаны як былы эсэр: у 1933 г. да высылкі на 3 гады ў Казахстан, а ў 1937 г. за тое ж — да расстрэлу. Вінаваты быў у тым, што «советской власти не любит... распространял пораженческие настроения» (Тамсама. Спр. 5562-С. Л. 8, 20).

Спробы падлічыць колькасць рэпрэсіраваных па Буда-Кашалёўскім раёне даюць лічбу, блізкую да 1000 чалавек. Гэта без уліку членаў іх сем'яў. З іх 176 чалавек (18%) былі прыгавораны да расстрэлу. Страшэнна вялікая лічба для сельскага раёна з агульнай колькасцю насельніцтва каля 35 тыс. Калі палічыць па 5 чалавек у сям'і, то выходзіць, што была рэпрэсіравана кожная сёмая сям'я. Але ж сем'і звычайна былі большымі. Найбольшая частка ахвяр рэпрэсій прыпадае на 1937—1938 гг.

Пасля смерці Сталіна і асабліва пасля ХХ з'езда КПСС, у другой палове 1950-х гадоў, была праведзена частковая рэабілітацыя рэпрэсіраваных. Як правіла, яна за-

кранала толькі тых, хто беспадстаўна быў аднесены да кулакоў, або тых, у адносінах да каго ў выніку дадатковага следства выяўлялася фальсіфікацыя доказаў абвінавачання ці прымяненне да іх незаконных метадаў уздзеяння ў час следства — запалохвання, збівання і г.д. Аднак праз 20—30 гадоў пасля рэпрэсій не заўсёды было магчымым адшукаць матэрыялы або сведкаў, якія дазвалялі праясніць справу, знайсці ісціну. Акрамя таго, шмат залежала ад добрасумленнасці, прафесіяналізму і нават ідэалагічных поглядаў следчых, якім у канцы 1950 — пачатку 1960-х гадоў даручалася правядзенне дадатковага следства. У архіве сустракаюцца і фармальныя адпіскі на заявы.

У канцы 1980-х гадоў, у часы перабудовы, пачалася масавая рэабілітацыя ахвяр палітычных рэпрэсій 1920—1950-х гадоў. Яна завяршылася ўжо ў суверэннай Рэспубліцы Беларусь у пачатку 1990-х гадоў. Аднак кампенсаваць велізарныя эканамічныя, палітычныя і духоўныя страты, нанесеныя рэпрэсіямі, аказалася немагчымым і да нашага часу.

Р.Р.Лазько.

«Нічога так не жадаю, як пабачыць сваіх дзяцей»

Слова пра бацьку

Мой бацька, Васіль Лявонавіч Штыхаў, сельскі настаўнік, інвалід з дзяцінства, у часы сталінскага таталітарызму быў асуджаны двойчы. Першы раз у 1933 г. у Беларусі, другі — у канцы 1937 г. у Казахстане. Мне давялося пазнаёміцца з дзвюма яго судовымі справамі.

У скарзе Вярхоўнаму Пракурору СССР бацька пісаў: «Я ўраджэнец в. Старая Беліца Уваравіцкага раёна Гомельскай вобласці, сын селяніна-бедняка, беспартыйны, настаўнік з 29-гадовым стажам...»

Цікава даведацца, як сын селяніна-бедняка атрымаў адукацыю настаўніка малодшых класаў у дарэвалюцыйныя часы. У сям'і было шасцёра дзяцей: пяць хлопцаў і дзяўчына. Адзін з братоў вельмі хацеў вучыцца і стаць настаўнікам. Ён добраахвотна прыслужваў па гаспадарцы мясцоваму праваслаўнаму святару, каб той спрыяў яму ў вучобе. У сямейным архіве захаваліся дакументы, якія даюць нейкае ўяўленне аб шляху да адукацыі сялянскага юнака.

Бацьку давялося здаваць заключны экзамен у Кіеве. У пасведчанні аб гэтым сказана: «Предъявитель сего крестьянинъ Василій Леоновіч Штыхов... подвергшись полному испытанію в Правленіи Кіево-Софійского духовного училища и выдержавъ оное удовлетворительно удостоенъ званія учителя церковно-приходской школы. 1909 года іюня 2-го дня».

Малады чалавек думаў аб больш шырокім полі педагагічнай дзейнасці, чым царкоўна-прыходская школа. Аб гэтым сведчыць наступны дакумент: «Вытрымаў экзамены на званне настаўніка пачатковага народнага вучылішча ў 1910 г. у Гомельскай мужчынскай гімназіі». У 1911 г. здаў дадаткова экзамен па геаметрыі ў той жа гімназіі. З 1931 г. бацька працаваў настаўнікам у в. Бярвёнаўка Буда-Кашалёўскага раёна. У 1933 г. разам з ім праходзіла па справе ўвараўцаў 22 чалавекі, асуджаны былі 19. У прыгаворы сказана: стварылі контррэвалюцыйную арганізацыю з мэтай звяржэння савецкай улады шляхам узброенага паўстання, якое быццам было назначана на вясну 1933 г. Асабіста бацьку «прышылі» ролю агітатара супраць калгасаў і савецкай улады. Прысуд — 5 гадоў ссылкі ў Казахстан (Фемида. Общественно-юридическая газета. 1992. 1—7 чэрв.).

З канца 1933 г. бацька знаходзіўся ў ссылцы ў Казахстане (цяпер Каменскі раён Уральскай вобласці), дзе яму ўдалося ўладкавацца настаўнікам няпоўнай сярэдняй школы пры Шыпаўскім мясасаўгасе. Аднačасова ён быў ліквідатарам непісьменнасці сярод мясцовага насельніцтва, чытаў лекцыі на раённых курсах па падрыхтоўцы настаўнікаў і нават вёў заняткі ў партшколе пры саўгасе.

Горкі жыццёвы вопыт навучыў настаўніка быць асцярожным, нідзе і ніколі не весці размоў на палітычныя тэмы. Сваім траім дзецям ён раіў у лісце наступнае: «Прашу вас, уступайце ўсім, уступайце за ўсё, не сярдуйце і не помсціце ні за якую крыўду, не стварайце сабе асабістых ворагаў. Няма нічога больш небяспечнага і шкоднага, як асабісты вораг, асабліва ў перажываемы намі час. У любы момант

вораг можа ўзвесці паклёп на чалавека і ўтапіць яго жартуючы».

Якой-небудзь спецыяльнай даведкі — даносу — у следчай справе на бацьку як быццам няма. Аднак тут фігуруюць тры сведкі. Роля першага «сведкі» — асноўная і найбольш гнюсная. Гэта паказанні рахункавода саўгаса. У іх ён сцвярджае, што раней інфармаваў органы НКУС аб палітычнай нядобранадзейнасці В.Л.Штыхава. Рахункавод хацеў падкрэсліць сваю пільнасць, але незнарок «засвяціў» сябе як інфарматар. Тое, што паведамляў гэты «сведка», фактычна было паклёпніцкім даносам. У ім гаварылася, што Васіль Лявонавіч сустракаўся са ссыльнымі ленінградцамі, станоўча адзываўся пра Зіноўева і іншых «ворагаў народа», выказваўся супраць калгасна-саўгаснай сістэмы. Сваю «блізкасць» да настаўніка рахункавод растлумачваў тым, што дачка вучылася ў яго класе, а сустракаліся яны не ў кватэры, а на вуліцы і размаўлялі, прагульваючыся.

У турме бацьку паведамілі, што пастановай асобай тройкі НКУС Уральскай вобласці ён асуджаны на 10 гадоў «за антысавецкую прапаганду». Адбываць незаслужанае пакаранне быў накіраваны ў 10-е аддзяленне НКУС у Сосьве (Гарынскі раён Свярдлоўскай вобласці). Адтуль бацька пісаў дзесяткі скаргаў на беспадстаўнасць абвінавачання, пісаў на імя Сталіна, Вышынскага, Молатава, Калініна, Жданава і іншых «правадыроў». Паступалі паведамленні: «скарга накіравана на разгледжанне». А праз некалькі тыдняў ці месяцаў прыходзіў адказ, дзе пацвярджалася «правільнасць» прысуду.

У следчай справе бацькі падшыты ўсе гэтыя дакументы. Аказваецца, у пракуратуры Заходне-Казахстанскай вобласці прыгавор двойчы апратэстоўваўся. У пратэсце, які падпісаны памочнікам пракурора Івановым, сказана, што В.Л.Штыхаў асуджаны няправільна. Памочнік пракурора адзначаў, што паказанні сведак агульныя і неканкрэтныя, не была праведзена вочная стаўка арыштаванага са сведкамі. Але гэта не дапамагло.

Рашаючае значэнне мела зусім кароткая, на паўстаронкі, даведка супрацоўніка НКУС, узятая са справы 1933 г. і дадаткова сфальсіфікаваная ім самім. У ёй гаварылася, што В.Л.Штыхаў «належаў да паўстанцкай арганізацыі беларускіх нацыяналістаў, па заданні якой займаўся антысавецкай агітацыяй». Гэтых некалькіх слоў упаўнаважанага органаў НКУС было зусім дастаткова, каб назаўсёды пакончыць з намаганнямі бацькі вырвацца з ГУЛАГа.

В.Л.Штыхаў (у цэнтры) з вучнямі. Казахстан, 1936 г.

Але бацька на нешта яшчэ спадзяваўся. У адным з апошніх лістоў да нас у 1940 г. ён пісаў: «Жыву надзеяй, што мяне раней ці пазней павінны вызваліць. Буду цярпець і чакаць. Нічога так не жадаю, як пабачыць сваіх дзяцей». Гэтай яго запаветнай мары не суджана было здзейсніцца.

Паводле даведкі, якую атрымала маці, бацька быццам бы памёр у 1943 г. ад «страсення мозга» ва ўзросце 53 гадоў. Такі дакумент ёсць і ў судовай справе. Аднак на яе вокладцы алоўкам ледзь прыкметна напісана: «Памёр у 1942 г.». Гэты запіс, канешне, не выпадковы.

Бацька быў рэабілітаваны па справе 1937 г. у 1957 г., а па справе 1933 г. — у 1962 г. Пры таталітарнай сістэме, калі ўсім жыццём краіны бескантрольна кіравала адна партыя на чале з «геніяльным правадыром», стала магчыма такое жудаснае глумленне над людзьмі — масавае знішчэнне ні ў чым не вінаватых грамадзян.

Г.В.Штыхаў, доктар гістарычных навук, прафесар, экс-прэзідэнт Беларускай асацыяцыі ахвяр палітычных рэпрэсій.

Полымя. 1992. № 10.

Дакументы сведчаць

З КРЫМІНАЛЬНАЙ СПРАВЫ ВАЦЛАВА ІОСІФАВІЧА КРУКОЎСКАГА

Первому Секретарю ЦК КПСС
Товарищу Хрущеву
от Крюковского Вацлава Иосифовича, проживающего в городском поселке Буда-Кошелевская Гомельскай области, улица Интернациональная, № 1.

ЖАЛОБА.

В 1929 году особым совещанием тройки ГПУ я был осужден по статье 58 пункт 9 Уголовного кодекса РСФСР на три года ссылки в Сибирь. Проживал я до ссылки в поселке Дубровка Любовинского сельсовета, ныне это Буда-Люшевский сельсовет Буда-Кошелевского района Гомельской области. Конкретного обвинения мне предъявлено не было, как и не вручено ни копии приговора либо выписки из него.

Схватили, посадили меня в тюрьму, потом без всякого суда дали мне три года ссылки. Семья моя вообще не подвергалась осуждению, но была милицией выслана вместе со мной.

Ссылку отбывал в Чаинским районе Томской области. В ссылке меня и семью три года содержали под надзором ГПУ, потом передали под надзор комендатуре и вместо трех лет продержали под надзором семнадцать лет.

Исходя из смысла статьи 58 пункт 9 я должен был совершить диверсионный акт с контрреволюционной целью, чего я никогда не совершал и понятия об этом не имел.

Любовинский сельсовет, где я в то время проживал, именовался национальным польским сельсоветом. Однако никакой связи я с Польшей не имел.

Осуждение и ссылку меня я считаю неправильным и потому 12 апреля 1958 года обратился с жалобой к Прокурору СССР. Мою жалобу направили в прокуратуру Гомельской области.

Длительное время не получая ответа, я 20 ноября 1958 года вторично обратился с жалобой к прокурору СССР и только после повторной жалобы прокурор Гомельской области товарищ Карасев прислал мне сообщение, датированное им двумя месяцами назад. Якобы оснований к моей реабилитации не найдено.

Спрашивается, за что я с моей семьей страдал семнадцать лет в ссылке?

В чем я виноват?

Датирование ответа прокурором Гомельской области двумя месяцами позже подачи моей жалобы о произведенной им якобы проверке моего дела свидетельствует о том, что проверки вообще не производилось и ответ о правильности осуждения меня в преступлении, которого я никогда в жизни не совершал и вообще не знаю, за что я был осужден и выслан, так как никто меня не допрашивал и обвинения не предъявлял, еще лишний раз свидетельствуют о бездушном бюрократическом отношении ко мне со стороны прокурора Гомельской области, чтобы не сказать, что его ответ простая отписка...

Чтобы сказать, что моя жалоба не осталась безответной.

Поэтому прошу Вас, товарищ Хрущев, дать соответствующее указание о пересмотре моего дела и реабилитации меня или хотя через тридцать лет сообщите мою вину.

Проситель Крюковский. 21/II-59 года

Первому секретарю ЦК КПСС
Товарищу Хрущеву
От Крюковского Ольгерта Вацлавовича, проживающего в городском поселке Буда-Кошелевская Гомельской области, улица Интернациональная, № 1.

ЖАЛОБА.

В 1929 году мой отец, Крюковский Вацлав Иосифович, был осужден особым совещанием тройки ГПУ на три года ссылки в Сибирь. Место ссылки было Чаинский район на севере Томской области или старое название Нарымский край, где в старину побывали И.В.Сталин и Я.М.Свердлов.

Только по рассказам старожилов в то время дисциплина для ссыльных была помягче. В наше время в период бериевщины не очень весело жилось ссыльным. Семья не подвергалась осуждению и независимо от приговора была выслана вместе с отцом.

В ссылке отца и семью продержали под надзором семнадцать лет, а было присуждено три года. Наверное, забыли своевременно освободить из-под надзора и разрешить выезд из Сибири. Я родился 28 января 1932 года и со дня рождения был взят под надзор и записан в список государственных преступников.

Не помню, какие органы меня брали под надзор, ГПУ или комендатура, но все отлично помню с пятилетнего возраста, как комендант в форме милиции регулярно, три раза в месяц, проводил переучет своих поднадзорных. Я был в том числе. Мне, так же как и другим ссыльным, было запрещено выезжать за пределы указанного селения без разрешения комендатуры, при том не выдавали никаких документов.

1 октярбя 1946 года, через пятнадцать лет после многих хлопот моих родителей, открепили из-под надзора комендатуры, а реабилитация не дана до сего времени. Обращаясь к Вам, товарищ Хрущев, хочу спросить, какое я сделал преступление перед Советским государством до своего рождения?

За что пятнадцать лет содержали меня под надзором, как государственного преступника, тем самым отравляли мое детство и юность? Отчего до сего времени не могу опомниться и равнодушно вспомнить прошедшее детство?

Мой отец в преклонном возрасте, ему 76 лет. Он уже дважды обращался с жалобами на предмет реабилитации к прокурору СССР. Обе его жалобы направили к прокурору Гомельской области, который отказал ему в реабилитации, не указав по какой причине.

Прошу Вас, товарищ Хрущев, дать указание на предмет расследования и реабилитации моего отца и тем самым снять с меня и отца незаслуженное грязное пятно долголетней вины перед Родиной.

Проситель Крюковский. 21/II- 59 года

Друкуецца паводле ксеракопіі, прадастаўленай архівам УКДБ Гомельскай вобласці за № 10/18660с 28 верасня 1998 г.

Жыццё ў ссылцы

З успамінаў Архіпа Іванавіча Ільева

Нарадзіўся ў 1905 г. у в. Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Закончыў 4 класы Патапаўскай пачатковай школы, 5-ы клас Кашалёўскай сямігодкі. З 12 гадоў працаваў на гаспадарцы. Жылі бедна. Пасля службы ў арміі займаўся сельскай гаспадаркай. У 1931 г. быў рэпрэсіраваны за адмову ўступіць у калгас.

...Разам са мной рэпрэсіравалі Зэкава Андрэя Уладзіміравіча. На падводах нас павезлі ў Гомель. Сям'я ў ссылку не папала, таму што на руках жонкі былі малыя дзеці. Канфіскавалі маёмасць і дом. З Гомеля адправілі ў Варкуту, потым у эшалоне павезлі далей на поўнач за Архангельск. Тры месяцы паўгалоднымі жылі ў бараках, накрытых звычайным галлём. Маразы сталі да 50 градусаў. У маі, калі рака Паўночная Дзвіна аслабанілася ад лёду, на баржы нас адправілі далей на поўнач. Стаялі ў тундры, будавалі вузкакалейку. Пачалі паміраць дзеці. Камендант аддаў загад, каб за дзецьмі прыехалі сваякі. Ніхто не прыязджаў. Хто працаваў, таму давалі 700 грамаў хлеба, рыбу. Непрацуючым —

300 грамаў хлеба на дзень і баланду. Арыштаваныя самі для сабе пабудавалі барак, нары ў тры паверхі і два рады. Умуравалі замест печаў жалезныя бочкі. На зіму выдалі валёнкі, шапкі-вушанкі, бушлаты. У ГУЛАГУ было шмат крымінальнікаў, але іх хутка вывезлі. Я адбыў у ссылцы 2 гады і 5 месяцаў. Вярнуўся на радзіму ў 1934 г.

Вернутыя імёны

Беспадстаўныя палітычныя рэпрэсіі канца 1920—1930-х гадоў не абмінулі Буда-Кашалёўшчыну. Бяда прыйшла амаль у кожную хату. Газетныя загалоўкі, набраныя вялікімі літарамі, падкрэслівалі страшэнныя па сутнасці прыгаворы, вынесеныя ў ходзе працэсаў над «ворагамі народа», «шпіёнамі» і «дыверсантамі», якія нібыта імкнуліся падарваць асновы нашага грамадства, значныя дасягненні народа ў ходзе сацыялістычнага будаўніцтва. Людзі, чытаючы такія артыкулы, не разумелі, адкуль тыя ворагі? Раптоўна знікалі ў турэмных засценках добра вядомыя, сумленныя людзі, калегі па працы, камуністы, актывісты і нават блізкія сваякі, чыё жыццё было наскрозь бачным і зразумелым. З аднаго боку, прапагандаваліся выдатныя поспехі ў будаўніцтве новага грамадства, а з другога — па незразумелых прычынах, асабліва ў вёсках, раптоўна, без тлумачэнняў «ворагамі», «шпіёнамі», «шкоднікамі» і «дыверсантамі» аказваліся радавыя калгаснікі, маладыя, а часам зусім старыя людзі. Жыхару в. Бацунь Міхаілу Маркавічу Прохараву было больш за 75 гадоў, калі ў 1937 г. ён быў рэпрэсіраваны, асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989 г. Пятру Трафімавічу Быкаву споўнілася 70, калі ў 1937 г. яго асудзілі на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1976 г.

Такія арышты выклікалі шмат пытанняў, але ва ўмовах афіцыйнага адурманьвання народа, пастаянных заклікаў да пільнасці, «змагання» супраць дзейнасці ўнутранай «контры» ўслых не задаваліся. Страх спараджаў у людзей маўклівую пакорнасць, сляпую веру ў справядлівасць таго, што чынілася навокал. У 1930-я гады ў Буда-Кашалёўскім раёне было рэпрэсіравана больш за 920 чалавек, каля 190 з іх расстраляны або памерлі ў месцах зняволення. Па многіх прычынах змешчаны ніжэй спіс ахвяр палітычных рэпрэсій раёна не можа быць поўным і дакладным. Але пошукавая работа не спыняецца.

Ахвяры палітычных рэпрэсій

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКЦЯБР

БАЛОЦІН Залман Шахнавіч, н. у 1882. Працаваў загадчыкам хлебапякарні ў м. Уваравічы. Арыштаваны 10.10.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ЗАХАРЧАНКА Піліп Барысавіч, н. у 1885. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 26.2.1937. Асуджаны на 3 гады турмы. Рэабілітаваны ў 1989.

ПАСЁЛАК БАЯВЫ

ДЗЕГЦЯРОЎ Мікалай Мінавіч, н. у 1920. Працаваў электраманцёрам. Арыштаваны 16.3.1957. Асуджаны на адзін год зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

ВЁСКА ЛІПА

ВІШАНКОЎ Арцём Міхайлавіч, н. у 1879. Аднаасобнік. Арыштаваны 9.4.1932. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны ў 1989.

ВІШАНКОЎ Іван Паўлавіч, н. у 1904. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВІШАНКОЎ Сяргей Ларыёнавіч, н. у 1891. Аднаасобнік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 26.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Сяргей Сцяпанавіч, н. у 1899. Працаваў выканаўцам па нарыхтоўках. Арыштаваны 5.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Паўторна арыштаваны ў студзені 1949, высланы ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны ў 1956.

ГАЕЎ Сцяпан Прохаравіч, н. у 1888. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 20.5.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЕЖАНКОЎ Дзяніс Мацвеевіч, н. у 1903. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЕРМАКОЎ Пракоп Сцяпанавіч, н. у 1886. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 26.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КАСЯНКОЎ Сямён Аляксеевіч, н. у 1886. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.3.1932. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

КУМАШОЎ Аляксей Іванавіч, н. у 1904. Працаваў тэхнікам-будаўніком Буда-Кашалёўскага райвыканкома. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 4.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Паўторна арыштаваны 24.1.1949. Рэабілітаваны ў 1958.

ЦЫГАНКОЎ Гаўрыла Трафімавіч, н. у 1900. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 26.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРКОЎ Даніла Іванавіч, н. у 1882. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 26.10.1932 і высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРКОЎ Марк Парфенавіч, н. у 1874. Аднаасобнік. Арыштаваны 24.3.1932 і высланы на 3 гады ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРКОЎ Нічыпар Іванавіч, н. у 1884. Аднаасобнік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 26.10.1932. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРКОЎ Фадзей Нічыпаравіч, н. у 1911. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРКОЎ Фядос Данілавіч, н. у 1896. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 23.3.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ЛУГІНІЧЫ

ДЗЕГЦЯРОЎ Ігнат Лаўрэнцьевіч, н. у 1897. Калгаснік. Меў шасцёра дзяцей. Арыштаваны 13.10.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ДЗЕГЦЯРОЎ Лаўрэнцій Васільевіч, н. у 1872. Аднаасобнік. Арыштаваны 5.10.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ДЗЕГЦЯРОЎ Нічыпар Васільевіч, н. у 1876. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.2.1931. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎСКІ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1927. Працаваў загадчыкам магазіна № 35 Гомельскага гархарчгандлю. Арыштаваны 9.2.1957. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення правоў. Рэабілітаваны ў 1990.

СЕРДЗЮКОЎ Ціт Іванавіч, н. у 1876. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 24.2.1932. Асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ПЫЦЬКАЎКА

ГАНЧАРОЎ Васіль Дзянісавіч, н. у 1873. Працаваў вартаўніком. Арыштаваны 14.1.1941. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ і на 5 гадоў пазбаўлення правоў. Рэабілітаваны ў 1960.

ГЕРАСІМАЎ Георгій Сяргеевіч, н. у 1884. Працаваў слесарам дэпо-сарціровачнае ў Гомелі. Арыштаваны 10.3.1938. Прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1970.

ГЕРАСІМАЎ Ніканор Сяргеевіч, н. у 1885. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 7.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ў 1960.

ГЕРАСІМАЎ Рыгор Сяргеевіч, н. у 1899. Без пэўнага занятку. Арыштаваны 2.3.1944. Асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1992.

ГРЫЦУК Сямён Аўдзеевіч, н. у 1885. Калгаснік. Арыштаваны 27.11.1932. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

ДАНІЛАЎ Даніла Савельевіч, н. у 1882. Аднаасобнік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 8.2.1931. Асуджаны на 3 гады канцлагера. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАНІЛАЎ Рыгор Палікарпавіч, н. у 1877. Працаваў рабочым на чыгунцы. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 27.11.1932. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 15.11.1933. Рэабілітаваны ў 1962.

КАРПАЎ Восіп Еўдакімавіч, н. у 1882. Калгаснік. Арыштаваны 28.4.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

КАРПАЎ Ціт Ісакавіч, н. у 1888. Калгаснік. Арыштаваны 29.4.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 29.9.1938 у Мінску. Рэабілітаваны ў 1972.

КУЗЬМЯНКОЎ Андрэй Фёдаравіч, н. у 1888. Калгаснік. Меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 8.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ў 1960.

КУЗЬМЯНКОЎ Гаўрыла Антонавіч, н. у 1911. Працаваў кавалём. Арыштаваны 26.2.1950 і высланы ў Краснаярскі край. Рэабілітаваны ў 1989.

КУЗЬМЯНКОЎ Гаўрыла Дзмітрыевіч, н. у 1911. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.3.1932. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

КУЗЬМЯНКОЎ Дзмітрый Кандратавіч, н. у 1874. Працаваў калгасным кавалём. Арыштаваны 8.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ў 1960.

КУЗЬМЯНКОЎ Зосім Сямёнавіч, н. у 1882. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 9.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ў 1960.

КУЗЬМЯНКОЎ Фядос Свірыдавіч, н. у 1883. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ў 1960.

КУЗЬМЯНКОЎ Ягор Сямёнавіч, н. у 1879. Аднаасобнік. Меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 9.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ў 1960.

МІХАЛЕВІЧ Нікадзім Мікалаевіч, н. у 1891. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.2.1931. Асуджаны на 5 гадоў канцлагера. Вызвалены 17.6.1935. Рэабілітаваны ў 1989.

МІХАЛЕВІЧ Якаў Мікалаевіч, н. у 1886. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 9.1.1933. Прыгавораны да расстрэлу з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны ў 1960.

ВЁСКА ЧЭРАПАЎКА

ПРАКАПЕНКА Іван Сцяпанавіч, н. у 1903. Цясляр Уваравіцкага камунгаса. Арыштаваны 17.7.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 17.7.1947. Рэабілітаваны ў 1965.

ГОРАД БУДА-КАШАЛЁВА

КЕТАЛЬ Адольф Германавіч, н. у 1894. Працаваў сарціроўшчыкам лесаматэрыялаў. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 28.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў высылкі ў Казахстан. Памёр 12.1.1943 у месцы зняволення. Рэабілітаваны ў 1960.

КЕТАЛЬ Эмілія Аўгустаўна, н. у 1899. Без пэўнага занятку. Арыштавана 1.1.1944. Асуджана на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалена ў 1953. Рэабілітавана ў 1991.

КРУГЛЯКОЎ Захар Лявонавіч, н. у 1903. Працаваў рахункаводам. Арыштаваны 20.10.1945. Асуджаны на 10 гадоў турмы. Вызвалены 17.1.1955. Рэабілітаваны 26.5.1955.

КРУГЛЯКОЎ Іван Якаўлевіч, н. у 1911. Чырвонаармеец 151-га сп 8-й сд. Арыштаваны 21.8.1940. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

РЭЗНІКАЎ Ціхан Фёдаравіч, н. у 1883. Пенсіянер. Былы машыніст цягніка. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 19.1.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28.2.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

БУДА-ЛЮШАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АСІНАЎКА

КОНТАЎТ Пётр Антонавіч, н. у 1890. Калгаснік. Арыштаваны 6.12.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1962.

КОНТАЎТ Цімафей Пятровіч, н. у 1882. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 25.5.1929. Асуджаны і высланы ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

СЕНАЖЭНСКАЯ Канстанцыя Іванаўна, н. у 1910. Сялянка. У 1929 выслана ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

СЕНАЖЭНСКАЯ Францыска Іванаўна, н. у 1904. Сялянка. Асуджана ў 1929. Выслана ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

СЕНАЖЭНСКІ Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1899. Выключаны з калгаса. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЕНАЖЭНСКІ Бярнард Сцяпанавіч, н. у 1901. Калгаснік. Арыштаваны 18.10.1932. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 3.11.1936. Рэабілітаваны ў 1961.

СЕНАЖЭНСКІ Вікенцій Сцяпанавіч, н. у 1890. Пчаляр калгаса імя Дзяржынскага. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 25.8.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 17.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1954.

СЕНАЖЭНСКІ Іван Іванавіч, н. у 1871. Аднаасобнік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 18.5.1929. Высланы на 3 гады ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1993.

ВЁСКА БАРСУКІ

УЛАСЕНКА Іван Фёдаравіч. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 1.11.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 20.5.1943. Рэабілітаваны ў 1969.

ВЁСКА БУДА-ЛЮШАЎСКАЯ

АНІКЕЕЎ Іван Архіпавіч, н. у 1892. Калгаснік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на высылку ў Казахстан (г. Чымкент) на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

КАВАЛЬКОЎ Адам Карпавіч, н. у 1871. Калгаснік. Арыштаваны 21.12.1939. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 6.6.1990.

КЛІМАЎ Пётр Васільевіч, н. у 1910. Калгаснік. Арыштаваны 21.12.1939. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

МАЗАЛАЎ Дзям'ян Нічыпаравіч, н. у 1874. Калгаснік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ (умоўна). Рэабілітаваны ў 1989.

НОВІКАЎ Кузьма Восіпавіч, н. у 1889. Аднаасобнік. Арыштаваны 8.9.1935. Асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1991.

СУЗДЗЯНКОЎ Давыд Кірылавіч, н. у 1885. Калгаснік. Меў шасцёра дзяцей. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны і высланы на 3 гады ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЕРАШКОЎ Міна Анціпавіч, н. у 1896. Калгаснік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 23.4.1933. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА БЫЧКІ

ВЕРАШЧАГІН (ВЕРАШЧАКА) Франц Канстанцінавіч, н. у 1899. Працаваў фельчарам. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 2.9.1937. Прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1959.

ДАМАРАЦКІ Антон Валянцінавіч, н. у 1892. Аднаасобнік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 4.2.1930. Высланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

ДАМАРАЦКІ Мікалай Вікенцьевіч, н. у 1885. Калгаснік. Арыштаваны 9.7.1938. Прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1959.

ЗІНКОВІЧ Венядзікт Вітольдавіч, н. у 1892. Ветэрынарны фельчар. Арыштаваны 17.8.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗЯНКЕВІЧ Антон Антонавіч, н. у 1912. Асуджаны 12.7.1929. Прыгавораны на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1992.

ЗЯНКЕВІЧ Антон Мікалаевіч, н. у 1882. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.5.1929. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1993.

КРУКОЎСКАЯ Марыя Аляксандраўна, н. у 1884. Аднаасобніца. Асуджана 20.6.1929. Прыгаворана да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

ЦЭХАН Іван Іванавіч, н. у 1872. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.5.1929. Асуджаны на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

ЦЭХАН Станіслаў Уладзіміравіч, н. у 1907. Сакратар праўлення калгаса «Камінтэрн». Арыштаваны 9.1.1933. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 16.2.1933. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЭХАН Сямён Уладзіміравіч, н. у 1898. Без пэўных заняткаў. Арыштаваны 25.8.1937. Меў чацвёра дзяцей. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 5.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

ХУТАР БЫЧКІ

ВЯРБОЎСКІ Апалінар Іосіфавіч, н. у 1909. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1959.

ВЯРБОЎСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1907. Сталяр. Арыштаваны 17.8.1938. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЯРБОЎСКІ Пётр Мартынавіч, н. у 1889. Калгаснік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 25.8.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1989.

ЗІНЬКОВІЧ Адам Браніслававіч, н. у 1896. Аднаасобнік. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1959.

ЗІНЬКОВІЧ Браніслаў Вітольдавіч, н. у 1896. Калгаснік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1959.

ЗІНЬКОВІЧ Пётр Вітольдавіч, н. у 1913. Калгаснік. Арыштаваны 27.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1959.

ЦЭХАН Варвара Іванаўна, н. у 1890. Працавала на гаспадарцы брата. Арыштавана ў 1929 і выслана ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

ЯСІНСКІ Іван Аляксандравіч, н. у 1897. Калгаснік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны ў 1959.

ХУТАР ДЗЕДНАЕ

ЗАЛЕСКІ Міхаіл Отавіч, н. у 1906. Рабочы завода «Пралетарый». Арыштаваны ў 1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ЗАЛЕСКІ Станіслаў Отавіч, н. у 1899. Бухгалтар-касір. Арыштаваны 18.7.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1986.

СЕНАЖЫНСКІ-ВОЙНІЧ Аляксандр Людгардавіч, н. у 1877. Селянін. Арыштаваны 2.2.1930. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЕНАЖЫНСКІ Казімір Леанардавіч, н. у 1885. Аднаасобнік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 18.5.1929. Асуджаны на высылку ў Сібір на 3 гады. Паўторна арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1993.

СЕНАЖЫНСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1902. Працаваў упаўнаважаным лясной аховы калгаса. Арыштаваны 17.1.1933. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 4.6.1942 у Пячорскім лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

ХУТАР ДУБРАЎКА

КРУКОЎСКАЯ Марыя Вацлаваўна, н. у 1912. Працавала на гаспадарцы бацькоў. Асуджана 12.7.1929 на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1992.

ВЁСКА ЛЮБАВІН

БУДКЕВІЧ Аляксандр Пятровіч, н. у 1862. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.5.1929. Асуджаны на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

БУДКЕВІЧ Антон Міхайлавіч, н. у 1897. Селянін. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 25.2.1932. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітавана ў 1969.

БУДКЕВІЧ Феліцыя Антонаўна, н. у 1882. Аднаасобніца. Асуджана на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

БЫКОЎСКАЯ Марыя Антонаўна, н. у 1878. Аднаасобніца. Мела пяцёра дзяцей. Арыштавана 22.12.1929. Асуджана на высылку ў Сібір. Рэабілітавана ў 1991.

ЗАЛЕСКІ Пётр Іванавіч, н. у 1893. Працаваў вартаўніком калгаса імя Дзяржынскага. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 17.8.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1958.

З пісьма Э.П.Залескага, сына П.І.Залескага, у раённую камісію па напісанні кнігі «Памяць»

17 августа 1938 г. отец, работавший ночным сторожем на ферме, ушел на дежур-

ство. В этот вечер, проводив отца на работу, мы все почему-то долго не ложились спать. В двенадцатом часу, когда догорала последняя лучина, мать напомнила, что пора спать. Она подошла к окну, чтобы затянуть шторы, и «прилипла» к стеклу. Далеко в темноте светились огни. «Машина... Это за ним», — мелькнула мысль (к этому времени уже были арестованы два маминых брата — Александр и Юрий Ясинские).

— Дети, я к папе, заприте за мною дверь!

Она и не заметила, как пробежала эти триста метров до фермы.

— Машина, это за тобою, спрячься, не выходи, — сказала она отцу.

— Куда спрятаться, от кого?

В это время в проеме открытых дверей мелькнул свет фонарика.

— Не выходи, — шепнула мать и пошла к выходу.

— Кого здесь по ночам черти носят? — громко спросила она.

— Это мы, Залесская, милиция. Только не вы нужны нам, а Залесский Петр.

Не успела мать открыть рот, чтобы соврать, что муж уехал в Гомель, как услышала:

— Я здесь, — вышел из темноты отец.

— Вы арестованы, вот ордер!

— Я? За что?

— Давайте в машину, в отделе вам все объяснят.

Дети, впервые оставшиеся ночью без матери, все прибежали на ферму. Они обступили мать, которая просила арестовавших подъехать к дому, дать возможность отцу переодеться, взять еду на дорогу.

— Ничего не нужно, там все есть, — ответил милиционер.

— Обыск бы сделали, — продолжала мать.

— Мы приехали не за этим. Давай, Залесский, в машину.

Отчаявшаяся мать выпалила:

— У меня дома есть пулемет, пригонят завтра доить коров — всех перестреляю.

Один из милиционеров подошел к матери и, глядя ей в глаза, сказал:

— Стреляйте, только смотрите ни одной живой не оставляйте, а сейчас ведите детей домой, — и, как-то замявшись, добавил: — Знаем мы, что у вас есть.

Он повернулся к машине и сказал отцу:

— Давай, Залесский, садись.

Отец попытался что-то сказать, но двое милиционеров втолкнули его в открытую дверцу «черного ворона». Мотор взревел, колеса грабанули перемешанный с навозом сухой песок, подняв столб пыли, и августовская темная ночь поглотила отца навсегда. Долго мы с матерью смотрели в эту темноту...

П.І.Залескі з жонкай і дзецьмі.

Через 62 года, в октябре 2000 г., мне довелось держать в руках пожелтевший листок бумаги — тот самый ордер на арест отца. В нем было указано: «Арестовать и произвести обыск. Исполнители: Лисичкин, Федотов, Абрам Бейлин».

После ареста на протяжении многих десятилетий тянулась вереница лжи от властных чиновников, заверенная гербовой печатью.

Самой первой ложью было то, что «Залесский П.И. осужден на 10 лет без права переписки». Затем извещение о том, что «Залесский П.И. умер в ИТЛ 29 октября 1941 г. от саркомы печени».

Теперь у меня на руках три(!) свидетельства о смерти отца: первое упомянуто выше, по второму — смерть наступила 9 октября 1938 г. от той же саркомы печени. Место смерти, как и в первом случае, не названо. И только в третьем извещении сказана правда: умер 9 октября 1938 г., причина смерти — расстрел, место смерти — Гомель. Последнее свидетельство я получил через 51 год после смерти отца.

Залесский Петр Иванович, измученный пытками и издевательствами, с выбитыми зубами и отбитыми почками не выдержал пыток и 27 сентября подписал все, что ему вменяли в вину. Об этом рассказал арестованный вместе с отцом Михаил Зажецкий, которому выпало временно выйти на свободу.

28 сентября особая тройка постановляет: расстрелять. Об этом я узнал из личного дела отца, хранящемся в архиве КГБ.

ЗЯНКЕВІЧ Ганна Аляксандраўна, н. у 1890. Аднаасобніца. Асуджана 20.6.1929 на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітавана ў 1993.

КОНТАЎТ Міхаліна Пятроўна, н. у 1889. Аднаасобніца. Асуджана 20.6.1929 на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітавана ў 1993.

КРУКОЎСКАЯ Тэадора Іосіфаўна, н. у 1899. Сялянка. Асуджана 20.6.1929 на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітавана ў 1993.

КРУКОЎСКАЯ-КШЭСІНСКАЯ Марыя Іосіфаўна, н. у 1900. Арыштавана 9.1.1936. Асуджана на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітавана.

КРУКОЎСКІ Антон Вікенцьевіч, н. у 1900. Працаваў бухгалтарам лясгаса. Арыштаваны 3.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1958.

КРУКОЎСКІ Антон Іосіфавіч, н. у 1876. Калгаснік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны ў 1959.

КРУКОЎСКІ Антон Іванавіч, н. у 1888. Працаваў манцёрам на чыгунцы. Арыштаваны 1.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1959.

КРУКОЎСКІ Вацлаў Іосіфавіч, н. у 1883. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.5.1929. Асуджаны на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

КРУКОЎСКІ Іван Іосіфавіч, н. у 1874. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.5.1929. Асуджаны на высылку ў Паўночны край на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

КРУКОЎСКІ Ігнат Сямёнавіч, н. у 1886. Калгаснік. Арыштаваны 3.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны ў 1989.

КРУКОЎСКІ Пётр Аляксандравіч, н. у 1897. Арыштаваны 2.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1958.

КРУКОЎСКІ Станіслаў Іванавіч, н. у 1893. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Паўторна арыштаваны 4.12.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 25.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны ў 1989.

КРУКОЎСКІ Сцяпан Іосіфавіч, н. у 1888. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.5.1929. Асуджаны на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

КРУКОЎСКІ Уладзімір Аляксандравіч, н. у 1900. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.2.1930. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КУХАРЭНКА Майсей Іванавіч, н. у 1889. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 10.2.1932. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Вызвалены 16.9.1935. Паўторна арыштаваны 3.3.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛЯЎКОВІЧ Антон Аляксандравіч, н. у 1904. Выключаны з калгаса. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛЯЎКОВІЧ Антон Клімавіч, н. у 1877. Калгаснік. Арыштаваны 3.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛЯЎКОВІЧ Людвіг Клімавіч, н. у 1885. Калгаснік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 1.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1961.

ЛЯЎКОВІЧ Роберт Іванавіч, н. у 1909. Калгаснік. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЛЯЎКОВІЧ Уладзімір Іванавіч, н. у 1898. Выключаны з калгаса. Арыштаваны 18.4.1933. Асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

НІЦЫЕЎСКАЯ Канстанцыя Нікадзімаўна, н. у 1863. Хатняя гаспадыня. У 1929 г. выслана на 3 гады ў Сібір. Рэабілітавана ў 1992.

ПУКІНСКАЯ Альбіна Іванаўна, н. у 1894. Аднаасобніца. Мела чацвёра дзяцей. Арыштавана і асуджана ў 1929 да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.



І.А.Радзевіч.

А.М.Ясінскі.

РАДЗЕВІЧ Іван Адамавіч, н. у 1858. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.4.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

РАДЗЕВІЧ Іван Клімавіч, н. у 1901 Калгаснік. Арыштаваны 3.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 29.12.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

САКАЛОЎСКАЯ Альбіна Міхайлаўна, н. у 1893. Аднаасобніца. Мела чацвёра дзяцей. Асуджана ў 1929 на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1992.

САКАЛОЎСКАЯ Марыя Аляксееўна, н. у 1877. Аднаасобніца. Асуджана ў 1929 на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

САКАЛОЎСКАЯ Станіслава Францаўна, н. у 1911. Аднаасобніца. Асуджана ў 1929 да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

САКАЛОЎСКІ Уладзімір Францавіч, н. у 1903. Аднаасобнік. Асуджаны ў 1929 да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

САКАЛОЎСКІ Франц Казіміравіч, н. у 1874. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.5.1929. Асуджаны на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

СТАЛЫПКА Ігнат Міхайлавіч, н. у 1887. Учотчык калгаса імя Дзяржынскага. Арыштаваны 25.8.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 29.12.1937. Рэабілітаваны ў 1958.

СТАЛЫПКА Людвіг Міхайлавіч, н. у 1886. Працаваў вартаўніком калгаса імя Дзяржынскага. Арыштаваны 10.6.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

СТАЛЫПКА Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1895. Калгаснік. Арыштаваны 25.9.1929. Асуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Паўторна арыштаваны 6.12.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1959.

ТЫЧЫНСКАЯ Мальвіна Антонаўна, н. у 1885. Калгасніца калгаса імя Молатава. Арыштавана 21.12.1937. Прыгаворана да вышэйшай меры пакарання. Расстраляна 11.1.1938 у Гомелі. Рэабілітавана ў 1989.

ЧАРНУШЭВІЧ Антон Баніфацыевіч, н. у 1897. Калгаснік. Арыштаваны 25.8.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў 1937 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАРНУШЭВІЧ Мікалай Іванавіч, н. у 1877. Калгаснік. Арыштаваны 25.7.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957.

ЧАРНУШЭВІЧ Павел Іванавіч, н. у 1885. Калгаснік. Арыштаваны 25.8.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11.1.1938. Рэабілітаваны ў 1957.

ЧАРНУШЭВІЧ Станіслаў Антонавіч, н. у 1898. Працаваў лесаводам у лягсасе. Арыштаваны 8.8.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1966.

ЮХНЕВІЧ Браніслаў Сямёнавіч, н. у 1905. Сакратар Любавінскага сельсавета. Арыштаваны 6.12.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 15.2.1938 у Мінску. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯСІНСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1887. Працаваў кавалём калгаса імя Дзяржынскага. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны ў 1959.

ЯСІНСКІ Іван Ігнатавіч, н. у 1900. Калгаснік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны ў 1959.

ЯСІНСКІ Канстанцін Іванавіч, н. у 1877. Працаваў вартаўніком лягсаса імя Горкага. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 4.6.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

ЯСІНСКІ Павел Іванавіч, н. у 1897. Калгаснік. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 25.8.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.1.1938. Рэабілітаваны ў 1959.

ЯСІНСКІ Пётр Ігнатавіч, н. у 1898. Калгаснік калгаса імя Куйбышава. Арыштаваны 28.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны ў 1959.

ЯСІНСКІ Станіслаў Адольфавіч, н. у 1898. Калгаснік. Арыштаваны 23.12.1932. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1968.

ЯСІНСКІ Сцяпан Іванавіч, н. у 1889. Арыштаваны 17.8.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 19.11.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯСІНСКІ Сцяпан (Стафан) Мартынавіч, н. у 1907. Калгаснік калгаса імя Дзяржынскага. Арыштаваны 1.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 11.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯСІНСКІ Франц Іванавіч, н. у 1882. Калгаснік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 14.1.1933. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯСІНСКІ Юрый Мікалаевіч, н. у 1889. Працаваў цесляром калгаса імя Дзяржынскага. Арыштава-

ны ў 1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Паўторна арыштаваны 24.6.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.10.1938. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА СЛАБАДА-ЛЮШАЎСКАЯ

КІРЫЕНКА Віктар Андрэевіч, н. у 1896. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.9.1929. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Вызвалены ў 1932. Рэабілітаваны ў 1993.

КІРЫЕНКА Канстанцін Андрэевіч, н. у 1882. Аднаасобнік. Меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 13.10.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1991.

КІРЫЕНКА Купрыян Андрэевіч, н. у 1888. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.9.1929. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1993.

МЕЛЬНІКАЎ Аркадзь Аляксеевіч, н. у 1878. Аднаасобнік. Арыштаваны 24.9.1929. Асуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны ў 1993.

НІЦЫЕЎСКІ Навум Сцяпанавіч, н. у 1868. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 18.5.1929. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1993.

ХУТАР СТАСІНА

КРУКОЎСКІ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1878. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.1.1930. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 12.9.1937 у Свярдлоўскай вобласці. Рэабілітаваны ў 1989.

КРУКОЎСКІ Станіслаў Аляксандравіч, н. у 1883. Аднаасобнік. Арыштаваны 1.2.1930. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

ВЁСКА ХМЯЛЬНОЕ

АБРАМЕНКА Дзяніс Архіпавіч, н. у 1890. Калгаснік. Меў сямёра дзяцей. Арыштаваны 13.1.1933. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1935. Рэабілітаваны ў 1963.

АБРАМЕНКА Фядос Емяльянавіч, н. у 1902. Калгаснік. Арыштаваны 2.1.1933. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1963.

АФАНАСЕНКА Даніла Спірыдонавіч, н. у 1905. Аднаасобнік. Арыштаваны 2.1.1933. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1968.

АФАНАСЕНКА Максім Спірыдонавіч, н. у 1893. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 26.2.1932. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АФАНАСЕНКА Пiлiп Спірыдонавіч, н. у 1900. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.10.1933. Асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 4.11.1943 у Нарыльскім лагеры. Рэабілітаваны ў 1989.

АФАНАСЕНКА Якаў Спірыдонавіч, н. у 1888. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.2.1932. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГЕРАСІМЕНКА Антон Паўлавіч, н. у 1907. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.1.1933. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Паўночы край. Рэабілітаваны ў 1963.

ЗАЙЦАЎ Пімен Якаўлевіч, н. у 1895. Працаваў сакратаром Забабскага сельсавета. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 24.12.1932. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

КУСТАЧОЎ Максім Еўдакімавіч, н. у 1897. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 24.12.1932. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЁСКА ШУТНАЕ

БОГУШ Алена Станіславаўна, н. у 1879. Хатняя гаспадыня. Арыштавана 20.6.1929. Асуджана на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

БОГУШ Захар Іванавіч, н. у 1870. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.5.1929. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1993.

БОГУШ Канстанцін Захаравіч, н. у 1900. Аднаасобнік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 4.10.1929. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Паўторна арыштаваны 9.7.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1989.

КАЗЛОЎСКІ Іван Сяргеевіч, н. у 1893. Калгаснік. Меў трое дзяцей. Арыштаваны 25.3.1932. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1942. Рэабілітаваны ў 1960.

КАЗЛОЎСКІ Пётр Васільевіч, н. у 1899. Калгаснік. Арыштаваны 23.3.1932. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1968.

НІЦЫЕЎСКАЯ Аляксандра Фёдараўна, н. у 1901. Аднаасобніца. Арыштавана ў 1929. Асуджана на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітавана ў 1993.

НІЦЫЕЎСКІ Антон Мартынавіч, н. у 1892. Працаваў кантралёрам суднарамонтнага завода. Арыштаваны 29.5.1938. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 21.9.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1989.

НІЦЫЕЎСКІ Браніслаў Навумавіч, н. у 1912. Аднаасобнік. Арыштаваны ў 1929. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны ў 1992.

НІЦЫЕЎСКІ Іосіф Мартынавіч, н. у 1897. Калгаснік. Меў чацвёра дзяцей. Арыштаваны 23.3.1932. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны ў 1968.

НІЦЫЕЎСКІ Павел Стафанавіч, н. у 1888. Працаваў настаўнікам у школе. Меў пяцёра дзяцей. Арыштаваны 4.9.1937. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны ў 1958.

НІЦЫЕЎСКІ Франц Навумавіч, н. у 1908. Аднаасобнік. Арыштаваны ў 1929. Асуджаны на высылку ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1993.

З РАПАРТА КАМАНДАВАННЯ ГОМЕЛЬСКАГА ГАРАДСКОГА ПАЛКА НАРОДНАГА АПАЛЧЭННЯ ГОМЕЛЬСКАМУ АБКОМУ І ГАРКОМУ КП(б)Б АБ УДЗЕЛЕ ПАЛКА Ў АБАРОНЕ ГОРАДА

21 жніўня 1941 г.

Доношу, что по приказанию нач. Гомельского гарнизона генерал-майора тов. Шевчука городской полк н[ародного] о[полчения] в 2.15 15 августа выбыл из города и занял оборонительную линию в районе Рощинская — Московская ул., и лишь батальон в Ново-Белице был оставлен на месте. 16 августа в 19.30 по приказанию того же нач. гарнизона полк выбыл в район дер. Семеновка Уваровичского района для отражения продвигавшейся вражеской колонны. Однако в связи с невыводом в срок командиром 2-го батальона майором Финашкиным своего батальона к месту сбора полка произошла задержка выхода полка в район обороны дер. Семеновка... Полк в составе 2 батальонов прибыл в Семеновку в 5.00 и, получив участок обороны, занял его, но непосредственно в боях участия не принимал. Полк под-

вергся лишь обстрелу вражеских минометов. Были выведены из строя 2 автомашины, 1 лошадь. Кроме того, полком была проведена большая разведывательная работа, было ликвидировано 1 пулеметное гнездо противника и 3 гнезда автоматчиков. В одной из перестрелок был убит немецкий офицер и захвачена его полевая сумка и оружие.

В 14.00 по приказанию командующего данным участком фронта полк вышел на новую оборонительную линию влево от дер. Семеновка, занял огневую позицию и окопался. Подвигаясь влево, полк занял поселок Гудок, стн. Уза и дер. Руденец. До вечера никаких столкновений с противником не было, ночью происходили незначительные перестрелки нашей разведки с вражескими разведками. Рано утром 17 августа произошла пулеметная и ружейная перестрелка с конной разведкой противника в направлении Руденец — Уваровичи, в результате которой было ранено 2 немецких солдата и убита 1 лошадь.

В 11 час. утра в 2 деревнях по направлению к стн. Уза было замечено продвижение танков противника и одиночные перебежки. Разведка 1-го батальона донесла, что в направлении Уваровичей к стн. Уза перемещается значительное кавалерийское соединение противника. Командованием полка был дан приказ окопаться в земле, не открывать огня до приближения противника. Но, заметив скопление н[аших] сил в районе стн. Уза и дер. Руденец, противник, не осмелясь двинуться вперед, в 17.00 открыл ураганный артиллерийский и минометный огонь, особенно концентрируя огонь по правому флангу 1-го батальона и стн. Уза, где размещен был второй батальон. В результате этого стн.Уза и дер.Руденец запылали в огне. Прекратив минометный огонь или частично под его прикрытием, противник двинул свои пехотные части. Завязался длительный бой, в результате которого полк потерял 1 бойца убитым и 7 чел. ранеными (убит тов. Шелехов — Белстройпуть).

В 19 час. полк получил устное приказание от командующего участком фронта отойти с занимаемых позиций на линию противотанкового рва в дер. Красное, Гом[ельского] района. 1-й батальон и отдельная рота милицейских работников и раб[отни]ков НКВД отошли на линию рва и заняли новую линию обороны в 2 часа ночи. 2-й же батальон к новой линии обороны не прибыл, так как в дороге получил новый приказ от командующего участком фронта — направиться в дер. Семеновка для поддержки сражавшейся там воинской части.

18 августа в 20.00 по приказу ком[анди]ра корпуса полк в составе 1-го батальона и отд[ельной] роты выбыл в дер. Прудок, где пробыл до рассвета. Я и пом. нач. штаба тов. Войтекун вместе с группой под командованием капитана Иванова приняли участие в бою в дер. Поколюбичи. Противник был отброшен далеко за деревню, а бой прекратился лишь глубокой ночью. Потерь не было.

19 августа в 5.00 полк получил приказание занять линию обороны налево от дер. Поколюбичи, куда и выбыл.

В 5.55 начался бой. На левом фланге н[ашей] линии обороны был размещен 1-й батальон (командир тов. Чуйкин), правее — особая рота под командованием майора госбезопасности тов. Димитриева и справа, на высоте [у] дер. Поколюбичи, — командирский пункт с 32 бойцами комендантского взвода и взвода связи. Бой продолжался минут 45. Противник бил по н[ашим] местам расположения из минометов, артиллерии, пулеметов, автоматов и винтовок. Мы же противопоставили лишь пулеметно-ружейный огонь...

Все это нанесло большой урон н[ашей] живой силе, и 1-й батальон и отд[ельная] рота вынуждены были отойти с большими потерями в район гор. Гомеля под сильным минометным и пулеметным огнем...

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944): Документы и материалы. Мн., 1967. Т. 1. С.102—103.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ Ў ЦК КП(б)Б КАМУНІСТА Л.З.ГЕЛЕРА

1942 г.

Я член ВКП(б)... Геллер Л.З. по решению Буда-Кошелевского РК КП(б)Б был оставлен в тылу для ведения партизанской войны в специально организованном партизанском отряде на территории Буда-Кошелевского района. В результате 3-месячного пребывания в тылу немцев партизанский отряд, в котором я состоял, насчитывал 32 чел., укомплектован преимущественно из партийно-советского актива. 17 августа в связи с вступлением немцев нелегально приступил к практическому действию. Лично я испортил телефонный кабель по линии Буда-Кошелево — Рогинь. Группа партизан уничтожила 2 фашистских мотоцикли-

стов. В октябре на перегоне Салтановка — Буда-Кошелево был взорван немецкий поезд с лошадьми и боеприпасами...

Дальнейшее действие партизанского отряда затруднилось из-за участившихся в сентябре—октябре бомбардировок и обстреливания из минометов лесов...

Как только немцы занимают деревню, производят подворный обход и грабят все, что им нравится. Этим налогам конца и края нет. Усилению террора и грабежа способствуют созданные немцами органы самоуправления и полиция. На эти должности назначаются контрреволюционные элементы, кулаки, уголовники. В Буда-Кошелево начальником полиции назначен Марченко, в 1933 г. осужден к расстрелу, затем ему заменили 10 годами. Рад приходу немцев преподаватель СШ Буда-Кошелева Дедовик М. — сын священника. Теперь он весь отдался службе немцам.

Отношение немцев к школе и культуре самое невнятное. Школы превращаются в конюшни, библиотеки выбрасываются на улицу, скульптуры разрушаются. К интеллигенции немцы относятся с презрением. Много уделяют внимания своей пропаганде в виде иллюстрированных плакатов, листовок, газет. Также дают балы в честь какого-нибудь события — например, взятия Москвы. Рассказывают о жизни рабочих и крестьян, эпизоды военных будней германской армии. Хотя в их лживости никто из населения не сомневается. Все с нетерпением ждут возвращения Красной Армии. Факты саботажа немецких мероприятий населением все учащаются...

Преданные советской власти люди собираются у Ф.Новикова в д. Новоселки Кормянского района и бывшего партизана Е.Степаненко в д. Шарибовка.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33а. Спр. 20. Л. 67—70.

Военачальнікі сведчаць

Маршал Савецкага Саюза А.М.Васілеўскі

ВАСІЛЕЎСКІ Аляксандр Міхайлавіч, нарадзіўся 30.9.1895 г. у с. Новая Галочыха Вічугскага раёна Іванаўскай вобласці. Маршал Савецкага Саюза (1943), двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Намеснік, 1-ы намеснік начальніка, з чэрвеня 1942 г. начальнік Генеральнага штаба. Па даручэнні Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання ў 1942—1944 гг. каардынаваў дзейнасць шэрага франтоў у буйных аперацыях. У 1945 г. камандуючы 3-м Беларускім фронтам, потым галоўнакамандуючы савецкімі войскамі на Далёкім Усходзе пры разгроме японскай Квантунскай арміі. З 1946 г. — начальнік Генштаба. У 1949—1953 гг. міністр Узброеных сіл СССР, ваенны міністр. У 1953—1957 гг. 1-ы намеснік міністра абароны СССР. Член ЦК КПСС у 1952—1961 гг., дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1946—1958 гг. Памёр у 1977 г.

...В мае — июне 1941 года по железной дороге на рубеж рек Западная Двина и Днепр были переброшены 19-я, 21-я и 22-я армии из Северо-Кавказского, Приволжского и Уральского военных округов, 25-й стрелковый корпус из Харьковского военного округа, а также 16-я армия из Забайкальского военного округа на Украину в состав Киевского особого военного округа. 27 мая Генштаб дал западным приграничным округам указания о строительстве в срочном порядке полевых фронтовых командных пунктов, а 19 июня — вывести на них фронтовые управления Прибалтийского, Западного и Киевского особых военных округов. Управление Одесского округа по ходатайству окружного командования добилось такого распоряжения ранее. 12—15 июня этим округам было приказано вывести дивизии, расположенные в глубине округа, ближе к государственной границе. 19 июня эти округа получили приказ маскировать аэродромы, воинские части, парки, склады и базы и рассредоточить самолеты на аэродромах.

Однако полностью провести в жизнь и завершить намеченные мобилизационные и организационные мероприятия не удалось. Сказались здесь и просчеты в определении времени возможного нападения гитлеровской Германии на нашу страну, да и экономические возможности страны не позволили выполнить их в сроки, отведенные нам историей. Сыграли, конечно, в этом свою роль и те недочеты, которые были допущены военным руководством при планировании и практическом осуществлении этих мероприятий.

…8 августа 2-я армия и 2-я танковая группа фашистов перешли в наступление в направлении Могилев — Гомель и Рославль — Стародуб против войск Центрального фронта, прикрывавших брянское, гомельское и черниговское направления. Было очевидно, что враг стремится выйти во фланги и тыл войск Юго-Западного фронта. Начались ожесточенные бои. Особенно сильный удар наносил противник по войскам 21-й армии. До 5 фашистских пехотных дивизий стремились здесь развить наступление на Гомель и не менее 3 дивизий начали 12 августа форсирование Днепра южнее Жлобина. С целью ликвидации угрозы, нависшей над войсками Центрального и правого крыла Юго-Западного фронта, и прикрытия направления на Брянск 14 августа Ставка приняла решение образовать Брянский фронт в составе 13-й и 50-й армий. Командующим фронтом был назначен генерал-лейтенант А.И.Еременко, членом военного совета — дивизионный комиссар П.И.Мазепов, начальником штаба — генерал-майор Г.Ф.Захаров.

Друкуецца паводле кн.: Василевский А.М. Дело всей жизни. Мн., 1984. С. 100, 119.

Генерал-палкоўнік Л.М.Сандалаў

САНДАЛАЎ Леанід Міхайлавіч, нарадзіўся 10.4.1900 г. у г. Вічуга Іванаўскай вобласці. Генерал-палкоўнік (1944). У Чырвонай арміі з 1919 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Закончыў ваенныя акадэміі імя М.В.Фрунзе (1934), Генштаба (1937). З верасня 1937 г. у Беларускай ваеннай акрузе. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г. З 1940 г. — начальнік штаба 4-й арміі, у ліпені – жніўні 1941 г. — Цэнтральнага фронту, войскі якога абаранялі Гомельскую вобласць (у т.л. Буда-Кашалёўскі, Уваравіцкі раёны). У 1941 – 1945 гг. — начальнік штаба Беларускага фронту, 20-й арміі, 2-га Прыбалтыйскага, 4-га Украінскага франтоў. Да 1953 г. — на адказных пасадах у Савецкай арміі. Памёр у 1987 г.

…Одно из важнейших сражений первых месяцев войны происходило летом 1941 года на Гомельщине… Здесь войска Красной Армии вместе с народным ополчением активной обороной приковали к себе значительную… часть главных сил группы армий «Центр»… Советское Главное Командование подвело к Днепру войска внутренних округов… В район Гомеля перебрасывалась 21-я армия… из войск

А.М.Васілеўскі.

Л.М.Сандалаў.

Приволжского военного округа. 27 июля на нее была возложена оборона на левом крыле Западного фронта…

Немецкие части танковой группы генерала Гудериана …11 июля переправились через Днепр: вечером в районе Быхова, а ночью — южнее Орши …12 июля танковые части противника ринулись на Горки, Смоленск…

Главнокомандующий Западным направлением Маршал Советского Союза С.К.Тимошенко спешно перебрасывал к Смоленску войска из других районов и принимал различные меры к ослаблению вражеского удара. Одна из них, причем наиболее результативная, — организация наступления войск левого крыла Западного фронта из-под Гомеля на Бобруйск по тылам противника.

Утром 12 июля начальник штаба Западного фронта генерал-лейтенант Г.К.Маландин информировал меня, что 21-й армии дано приказание нанести правофланговыми войсками … удар на Быхов, а главными силами перейти с утра 13 июля в наступление на Бобруйск…

Вечером 12 июля я и член военного совета армии дивизионный комиссар Ф.И.Шлыков выехали к командиру 63-го стрелкового корпуса 21-й армии, оборонявшегося по Днепру перед городами Рогачев и Жлобин. Это был мой старый знакомый комкор Л.Г.Петровский….

Я показал Петровскому на карте положение войск своей армии и сообщил о разговоре с генералом Г.К.Маландиным.

— Боюсь,что заткнуть брешь у Быхова 13-я армия не сможет, — разочаровал

Л.Р.Пятроўскі.

меня Л.Г.Петровский. — И сил недостаточно, и придут к Быхову с опозданием....

Разговор с Л.Г.Петровским поколебал мою веру в успех наших войск под Быховом.

Мы возвратились в армию. Вечером 13 июля штаб фронта сообщил: войска Л.Г.Петровского неожиданно для врага форсировали Днепр и захватили врасплох оборонявшиеся за рекой части противника.

В разгоревшихся ожесточенных боях наши войска наголову разбили неприятеля, штурмом овладели городами Рогачев, Жлобин и успешно развивают наступление на Бобруйск.

Но положение южнее Орши и у Быхова ухудшилось. Противник расширил прорыв и бросает к Смоленску свои моторизованные войска.

...В первую неделю августа 1941 г. войска правого крыла немецкой группы армий «Центр» в составе двадцати пяти дивизий готовились к наступлению против нашей гомельской группировки. Основной удар от Кричева на Новозыбков и Унечу в обход Гомеля с востока возлагался на оттянутую от Смоленска и усиленную армейскими корпусами 2-ю танковую группу Гудериана. Непосредственно на Гомель нацеливалась с севера вдоль обоих берегов реки Сож 2-я немецкая армия.

...В первых числах августа командование Центрального фронта несколько раз просило Ставку в связи с угрозой окружения корпуса Л.Г.Петровского разрешить отвести его за Днепр, но каждый раз получало отказ...

...Хотя наступление 2-й немецкой армии непосредственно на Гомель развивалось медленно, обстановка там становилась угрожающей. Глубокий прорыв моторизованных и танковых войск группы Гудериана от Кричева на юг, в обход нашей гомельской группировки с востока, создавал угрозу не только войскам Центрального фронта, но и выхода фашистских войск в тыл Юго-Западному фронту.

Вражеская авиация круглосуточно бомбила железнодорожные станции на линии Гомель — Брянск...

...На усиление дивизий 21-й армии, оборонявших подступы к городу, были выдвинуты Гомельский полк народного ополчения и отдельный полк народного ополчения под командованием майора Н.С.Исаева. Военный совет фронта вновь поставил перед Ставкой вопрос о переводе войск левого крыла фронта на восточный берег Днепра: корпус Л.Г.Петровского — в район Гомеля, а 3-ю армию из Мозыря — на Десну. Но Ставка отклонила это предложение. И лишь 12 августа, после того как противник форсировал Днепр у Стрешина, была дана санкция на отвод одной дивизии из корпуса Л.Г.Петровского за Днепр, к Довску.

14 августа 2-я немецкая армия, используя успех группы Гудериана, стала теснить войска 21-й армии к Гомелю. На ближних подступах к городу развернулись ожесточенные бои...

...И только в ночь на 20-е августа ценою огромных потерь врагу удалось овладеть городом...

...Однако активная героическая оборона на Гомельщине и прилегающих к ней районах Приднепровья не пропала даром.

Во-первых, ожесточенные бои за Гомель причинили большой урон гитлеровцам, обескровили вражескую группу армий «Центр».

Во-вторых, эти тяжелые оборонительные бои дали возможность частям советских войск в Полесье выйти из окружения и присоединиться к своим.

В-третьих, пока шли бои за Гомель, партийные и советские организации города успели завершить эвакуацию основных предприятий и учреждений на восток.

В-четвертых, задержка Красной Армией противника под Гомелем дала возможность областному и городскому партий-

ным комитетам закончить организацию партийного подполья.

Друкуецца паводле кн.: В грозные годы: Воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов на территории Гомельской и Полесской областей. Мн., 1973. С. 27—37.

Палкоўнік Г.П.Куляшоў

КУЛЯШОЎ Георгій Пятровіч, нарадзіўся ў 1902 г. у г. Варонеж. У 1919 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную армію, прымаў удзел у разгроме банд Антонава на Тамбоўшчыне. У 1926 г. закончыў 1-ю Артылерыйскую школу ў Ленінградзе, у 1939 г. — Артылерыйскую акадэмію імя Дзяржынскага. Вялікая Айчынная вайна застала яго камандзірам 318-га гаўбічнага артпалка ў Бабруйску. У ліпені—жніўні 1941 г. полк, разам з часцямі 63-га стралковага корпуса, удзельнічаў у абарончых баях на Гомельскім напрамку. З 1947 г. выкладчык аператыўна-тактычнага цыкла Артылерыйскай акадэміі імя Дзяржынскага. З 1954 г. па стане здароўя ў адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, пяццю ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны» і васьмю медалямі.

...К концу июля 1941 г. части 63-го корпуса вклинились в глубину обороны противника местами до 30 километров. Образовался большой уступ. В связи с концентрацией фашистских войск на этом направлении командующий 21-й армией 30 июля приказал 63-му стрелковому корпусу перейти к обороне... Мотоциклетные части и бронемашины врага к 22 часам 13 августа вышли в район Меркуловичи и стали продвигаться в направлении Чечерска, создавая угрозу окружения 63-го стрелкового корпуса. Утром 14 августа противник овладел Чечерском, в окрестностях которого находился штаб 21-й армии. Затем гитлеровцы заняли станцию Буда-Кошелевская, завершив полное окружение частей 63-го корпуса.

Связь 63-го стрелкового корпуса со штабом 21-й армии оказалась прерванной. Генерал-лейтенант Л.Г.Петровский ... в очень сложной обстановке организовал отрыв корпуса от противника и к исходу 14 августа переправил дивизии на восточный берег Днепра. Но немецкие подвижные части отрезали штаб и некоторые части корпуса ... от основных его сил. Тогда генерал-лейтенант Петровский с группой командиров штаба возглавил атаку подразделений, чтобы прорвать окружение. Стремительный удар заставил гитлеровцев отступить. Л.Г.Петровский повел части на юго-запад и в тот же день прибыл в части 154-й стрелковой дивизии и других войск корпуса.

Встреча состоялась в лесу ... 16 августа в 12 часов он отдал приказ, нацелив основной удар в направлении Скепня, Губичи, т.е. на юго-запад, а не на юго-восток, как этого мог ожидать противник...

Ровно в 3 часа 17 августа 1941 года, после короткого, но мощного артиллерийского налета, 473-й стрелковый полк начал прорыв. За ним последовали атаки всех остальных частей дивизии, сравнительно легко прорвав кольцо вражеского окружения, быстро двинулись вперед. В населенном пункте Губичи они разгромили штаб 134-й немецкой пехотной дивизии и захватили в шести портфелях ее боевые документы.

Таким образом, кольцо блокирующих войск было прорвано...

Друкуецца паводле кн.: В грозные годы: Воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов на территории Гомельской и Полесской областей. Мн., 1973. С. 38—47.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Бой каля вёскі Негаўка

З успамінаў Фёдара Мацвеевіча Вялічкі, былога камандзіра 183-га медыка-санітарнага батальёна 154-й стралковай дывізіі

У чэрвені 1941 г. наша 154-я дывізія ў складзе 63-га корпуса Прыволжскай ваеннай акругі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Леаніда Рыгоравіча Пятроўскага, яшчэ не адмабілізаваная, была тэрмінова накіравана на папаўненне войскаў Беларускай ваеннай акругі. 21 чэрвеня мы разгрузіліся на станцыі Добруш і рушылі сваім ходам, але ўжо пад ударамі нямецкай авіяцыі, да ўсходняга берага Дняпра, дзе на лініі Жлобін — Рагачоў павінны былі заняць абарону. Нашымі суседзямі былі 67-ы (справа) і 66-ы (злева) стралковыя карпусы. Наш корпус, уведзе-

ны ў склад 21-й арміі, удзельнічаў у баях з ворагам на Бабруйскім напрамку, на ўсходнім беразе Дняпра, у контратаках і вызваленні гарадоў Жлобін і Рагачоў.

У ходзе баёў часці нашага корпуса прасунуліся далёка ўперад адносна 67-га стралковага корпуса, нашага суседа справа. Гітлераўцы спрабавалі акружыць нас і знішчыць, але гэта ім не ўдалося, бо камандзір 21-й арміі своечасова аддаў загад корпусу перайсці да абароны і пачаць інжынернае абсталяванне занятых рубяжоў: расстаўляць процітанкавыя міны, танкавыя пасткі, рабіць завалы, засады і іншыя малапрыкметныя заслоны. У перадавых, тылавых, рэзервовых часцях ішла інтэнсіўная баявая падрыхтоўка. Вялікая ўвага надавалася інструктажу па ўжыванні гранат і бутэлек з гаручай сумессю. Рыхталіся разведчыкі.

Становішча рабілася ўсё больш напружаным. Гітлераўцы таксама рыхтаваліся не толькі акружыць «чорны корпус» і «Сталінскую групу» (так яны называлі адпаведна корпус Л.Пятроўскага і 21-ю армію), але падавіць наогул супраціўленне савецкіх войскаў.

Прыкладна 10 жніўня фашысты ўзнавілі наступленне на 110-ы стралковы полк каля пасёлка Стрэшын. Адначасова ад шашы Доўск — Гомель выйшла група нямецкіх дэсантнікаў і пачала акружэнне савецкіх войскаў.

У гэты дзень я быў у штабе дывізіі, дзе даведаўся, што 110-ы стралковы полк адышоў праз Стрэшын на ўсход — гэта была жудасная вестка. Немцы фарсіравалі Днепр.

Начальнік штаба падпалкоўнік Іофель загадаў мне адысці з медыка-санітарным батальёнам (МСБ) на паўночна-ўсходні край Рудні, да хутароў Селіванаўка ці Салтанаўка. Раніцай 11 жніўня батальён прыбыў на вызначанае месца, але разгарнуць работу было немагчыма з-за бамбёжак немцаў. Да раніцы наступнага дня батальён укрыўся ў невялікім лесе каля вёскі Негаўка, побач з шашой Рагачоў — Гомель, пра што паведамілі ў штаб дывізіі. Увечары паступіў загад са штаба выдзеліць 40 санітараў, узброіць іх вінтоўкамі і гранатамі і накіраваць у штаб дывізіі.

Мы выставілі ахову, параненых эвакуіравалі ў армейскі шпіталь. Разгарнулі толькі аперацыйныя палаткі.

Каля хмызняку сеў нямецкі самалёт. З яго павыскаквалі ўзброеныя немцы і хутка зніклі. Самалёт адразу ж адляцеў. Аб гэтым мы накіравалі данясенне ў штаб з нарачным на аўтамашыне. Ці давёз ён данясенне, мы не ведалі.

Ноччу з 13 на 14 жніўня ў размяшчэнне нашага батальёна прыбыў ветэрынарны лазарэт 154-й стралковай дывізіі. У лазарэце налічвалася 40 чалавек, на ўзбраенні якіх былі вінтоўкі і станковы кулямёт. Прыбыўшы з Гомеля старшына МСБ Злыдароў, куды ён адвозіў параненых, далажыў, што немцы занялі амаль усю дарогу Гомель — Рагачоў.

Позна вечарам 14 жніўня я атрымаў загад сіламі МСБ заняць абарону ў раёне вёскі Негаўка. Раніцай 15 жніўня загад удакладнілі: заняць абарону ў гаі на паўднёвы ўсход ад вёскі Негаўка.

Я, Грэйскоп, Сухінін, Загіраў і начальнік ветлазарэта Фабрыкаў абмеркавалі становішча. Вырашылі: ветлазарэту абараняць паўночна-заходнюю частку гаю, Сухініну з дваццаццю байцамі заняць абарону ў яго паўночнай частцы. З імі былі некалькі байцоў МСБ і ваеннаслужачых рамонтных майстэрань аўтамабільнага батальёна. Я з шасцю байцамі заняў заходні бок гаю.

Раніцай 15 жніўня пачаліся сутычкі з немцамі, якія рухаліся на Гомель. Яны пачалі нападаць на нас з тылу. У нас былі вінтоўкі, пісталеты, некалькі гранат. Да таго ж ваеннаслужачыя рамонтных майстэрань адрамантавалі гармату, да якой былі снарады. Усе змагаліся з вялікім адчаем, бо ведалі, што прапусціць ворага нельга. У першыя ж хвіліны мы расстроілі рады ўзброенага да зубоў ворага, а калі загаварыў станковы кулямёт ветлазарэта, немцы кінуліся наўцёкі. Гэта натхніла нас. У баі мы захапілі кінутыя немцамі аўтаматы. На хаду вучыліся з іх страляць.

Праз гадзіну на нас рушылі 3 танкі. Яны ішлі прама на групу Сухініна. Хутка вылучылі лепшых стралкоў для абстрэлу амбразур танкаў. Калі танкі падышлі амаль ушчыльную, у іх паляцелі бутэлькі з гаручай сумессю, гранаты.

Нямецкія танкі павярнулі назад. Ім наўздагон мы адкрылі агонь з гарматы.

За некалькі крокаў ад маёй групы спынілася нямецкая аўтамашына, у якой было каля двух дзесяткаў салдат. Яны саскочылі з машыны, падышлі зусім блізка да нас. Па

маёй камандзе байцы кінуліся на ворага. Наша атака была для немцаў нечаканай: частка з іх была забіта асколкамі гранат, кулямі, астатнія пабеглі ў пшанічнае поле. Мы кінуліся за імі, але трэба было вяртацца на свае пазіцыі. Падабралі трафеі: нямецкія аўтаматы і патроны да іх. Палала нямецкая аўтамашына. У час кароткага перапынку паміж баямі камісар Грэйскоп арганізаваў адыход параненых, жанчын-урачоў і медсясцёр у вёску Негаўка. Камісар Загіраў агнём станковага кулямёта прыкрываў іх. Дзякуючы гэтаму ў жывых засталіся медсёстры К.М.Карабкова, А.М.Дзянісава, А.П.Несцерава і іншыя. Жыхарка вёскі Негаўка Аляксандра Мікалаеўна Гаўрыленка хавала жанчын-медыкаў ад фашыстаў, а затым пераправіла іх да партызан.

Нямецкія матарызаваныя часці прарваліся да шашы Доўск — Гомель і апынуліся побач са штабам 21-й арміі, асабісты склад якога з баямі прарываўся з акружэння.

Байцоў заставалася ўсё менш. Загінуў мой намеснік і сябар М.С.Сухінін, быў смяротна паранены наш камісар Грэйскоп. Старшая медсястра К.М.Карабкова зняла ордэн Чырвонай Зоркі з грудзей камісара, зрабіла мне перавязку. Каля мяне заставаліся 2—3 чалавекі. Я зірнуў на гадзіннік — было 19.00.

Чулася актыўная перастрэлка — гэта група Загірава вяла бой у сваім раёне абароны. Але з цягам часу і там усё сціхла.

З двума байцамі я пабег да камандзіра Загірава. Ён ляжаў на зямлі з павязкамі на галаве і грудзях. Кроў праступала праз бінты. Ад маёй дапамогі ён катэгарычна адмовіўся, сказаў, што памірае і нішто яму ўжо не дапаможа. Будучы параненым, ён паслаў у разведку аўтамашыну, каб высветліць шляхі адыходу. Кулямёт быў спраўны. Працягваючы камандаваць, Загіраў якраз аддаваў загад байцу адшукаць мяне і далажыць, што частка работнікаў ветлазарэта і МСБ ужо ў машынах. Я загадаў адправіць яго ў тыл. Загірава паклалі ў машыну — ён ужо нават не стагнаў.

Я кінуўся да машын МСБ — іх было на ходу тры. У іх сядзела каля 20 чалавек. Сеў у кабіну першай, і машыны рушылі. Станковы кулямёт прыкрываў наш адыход.

Не паспелі выехаць на дарогу, як на нас абрушыўся мінамётны агонь. Нашу машыну перакінула на левы бок, правыя дзверцы адчыніліся і мяне выкінула. Усе машыны былі разбітыя. Сярод людзей былі забітыя і цяжка параненыя. Тыя, што засталіся жывымі, хутка зарыентаваліся і адкрылі агонь па праціўніку.

Пад бортам адной з машын ляжала медсястра Кацярына Іванаўна. Яна была мёртвая. Я паспрабаваў з байцом падняць машыну, але нічога не выйшла. Тут я адчуў моцны ўдар — гэта адзін з гітлераўцаў агрэў мяне прыкладам аўтамата па галаве. Я страціў прытомнасць. Ачуняўшы, убачыў, што два немцы здымаюць з мяне рамень і кабуру. Падбег афіцэр і спытаў: «Камісар?» Я адказаў: «Ару» — урач. З нас сарвалі зорачкі, шпалы, медыцынскія знакі, крычалі, патрабавалі ўстаць. Хто не змог гэтага зрабіць, тых забілі на месцы.

У баях каля Негаўкі загінулі 120 савецкіх воінаў. Нямала палягло і гітлераўцаў.

14 жніўня нямецкія матарызаваныя часці прарваліся да шашы Доўск — Гомель. Да вечара таго ж дня фашысты захапілі населеныя пункты Дудзічы, Кашалёў, Баравінка. На наступны дзень — Буда-Кашалёва.

Генерал Прышчэпа

ПРЫШЧЭПА Мікалай Андрэевіч (14.4.1900 — 18.8.1941), савецкі военачальнік, генерал-маёр, удзельнік абарончых баёў на тэрыторыі Беларусі. Нарадзіўся на Украіне ў с. Вялікая Салтанаўка Васількоўскага раёна Кіеўскай вобласці. У пачатку вайны камандаваў 61-й стралковай дывізіяй, якая вызначылася ў баях пад Рагачовам і Жлобінам. У час выхаду дывізіі з акружэння быў цяжка паранены, але працягваў камандаваць. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

...Ішлі цяжкія ваенныя дні. У пісьмах дамоў Прышчэпа паведамляў аб жорсткіх баях пад Жлобінам і Рагачовам, расказваў пра мужнасць і гераізм байцоў дывізіі.

13 ліпеня 1941 г. 61-я дывізія перайшла ў контрнаступленне і штурмам авалодала Рагачовам і Жлобінам. Было знішчана 300 гітлераўцаў і 10 танкаў, шмат аўтамашын і іншай ваеннай тэхнікі ворага. За ўмелае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі дывізіі 31

Медсёстры 183-га медсанбата (злева направа) П.Васільева, Н.Тарубарава і Н.Чаркашына.

ліпеня Мікалаю Андрэевічу Прышчэпу было прысвоена званне генерал-маёра. Ішоў час. Вораг сканцэнтраваў буйныя сілы з танкамі, артылерыяй, самалётамі і акружыў 61-ю дывізію. Склалася амаль бязвыхаднае становішча. Усюды валяліся фашысцкія лістоўкі, у якіх гітлераўцы абяцалі добрае жыццё тым, хто кіне зброю і здасца ў палон.

17 жніўня ў 3 гадзіны ночы камандзір Прышчэпа з палымянай прамовай выступіў перад салдатамі і афіцэрамі дывізіі: «Салдаты і афіцэры, цвёрда трымайце зброю. Кожнай куляй, кожным штыком рэжце, біце нямецкіх людаедаў. Яны вераломна ўварваліся ў наш дом, забіваюць старых і малых. Храбра змагайцеся і немцы пабягуць, а яшчэ лепш, калі яны трупамі лягуць на нашай зямлі».

На світанку генерал узняў байцоў у атаку і вывеў дывізію з акружэння. Прарыў быў нялёгкі. Мікалай Андрэевіч быў цяжка паранены ў пазваночнік.

Былая медсястра Алена Яўгенаўна Лундсберг (па мужу Мацвеева) успамінае: «Каля Селівонаўскіх хутароў Рагачоўскага раёна ішлі кровапралітныя баі. Я і мае сяброўкі Ніна Чаркашына і Паліна Васільева знаходзіліся на дарозе каля лесу. Сюды неслі параненых байцоў. Медсёстры рабілі ўсё магчымае: пераліваалі сваю кроў параненым прама з вены ў вену. У гэты час мяне паклікалі да камбата Алейнікава. Ён загадаў быць каля параненага і аказваць яму неабходную дапамогу. На насілках ляжаў генерал-маёр. Вочы яго былі закрытыя, губы абяскроўленыя. Густыя чорныя бровы ўздрыгвалі. Раненне патрабавала неадкладнага хірургічнага ўмяшання, але ў палявых умовах аперацыя была немагчымай. У такім цяжкім стане камандзір працягваў камандаваць. Ён ціхім голасам паклікаў да сябе палкоўніка Гофмана, спытаў, у якім стане дывізія, і тут жа загадаў знішчыць дэсант нямецкіх аўтаматчыкаў.

Нам даручылі вывезці генерал-маёра з поля бою. Мы паклалі Мікалая Андрэевіча ў кузаў аўтамашыны і пачалі прабівацца ў напрамку Гомеля. Насустрач ішлі аўтамашыны і салдаты. У паветры кружылі нямецкія сцярвятнікі. Ехалі хутка. Раптам на дарозе атрымаўся затор. Я саскочыла з кузава з наганам у руцэ і закрычала: «Дайце дарогу! Вязём генерал-маёра Прышчэпу!» Пачуўшы гэта прозвішча, з «эмкі» выйшлі тры афіцэры і загадалі перанесці яго ў іх машыну.

Далі дарогу. Я на руках трымала Мікалая Андрэевіча. Ён часта траціў прытомнасць, прасіў піць.

Пачало змяркацца. Навокал чуліся гарматныя выбухі, стрэлы кулямётаў, рассыпаліся ў небе ракеты. Наша «эмка» хутка выскачыла на шашу. Раптам ззаду пачуўся трэск нямецкага кулямёта. Мы спыніліся. Немцы таксама. Прагучалі два стрэлы. Нашы апярэдзілі. Імчымся далей. Праз некалькі хвілін паказаўся шлагбаум. Шафёр развярнуў машыну назад. Пачуўся крык: «Wer ist dort?» Немцы! Нам услед пачулася аўтаматная чарга. Куля прабіла калена ўрачу Турганаву. Праехаўшы некалькі хвілін, звярнулі ў лес. Стан генерала пагоршыўся. На досвітку ён памёр. Пахавалі яго на ўзлессі, за 400 метраў ад пасёлка Адчаянны. Моўчкі пастаялі каля свежай магілы і пайшлі ў напрамку Лоева. Праз суткі далучыліся да 154-й дывізіі і расказалі пра апошнія хвіліны жыцця камдыва 61-й стралковай дывізіі».

У 1951 г. астанкі генерал-маёра перанеслі на брацкія могілкі гарадскога пасёлка Буда-Кашалёва. На мармуровай пліце выбіты словы: «Прышчэпа М.А. — камандзір 61 стралковай дывізіі, 1900 г. нараджэння. Загінуў 18 жніўня 1941 года». Адна з вуліц Буда-Кашалёва носіць яго імя.

У.Я.Райскі.

Калінінская абарона

Жорсткія баі разгарнуліся ў жніўні 1941 г. на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага і Уваравіцкага раёнаў, праз якія пралягаў шлях нямецка-фашысцкіх войскаў на Гомель.

Каля в. Калініна быў утвораны абарончы рубеж працягам 40 кіламетраў па лініі Пакалюбічы — Лапаціна — Касцюкоўка — Чырвонае — Урыцкае. На яго пярэднім краі былі ўстаноўлены зенітныя і палявыя батарэі. Тут заняла абарону рота крывапрожцаў. Для яе падстрахоўкі быў створаны яшчэ адзін абарончы рубеж пад Касцюкоўкай. Яго ўтрымлівала другая рота крывапрожцаў сумесна з узводам палітбайцоў-днепрадзяржынцаў пад камандаваннем Н.Дончанкі. 5-я рота нікапальскіх палітбайцоў (камандзір П.Чумакоў) заняла абарону ў цэнтры з боку Жлобіна. Яна была высунута да в. Чырвонае, дзе размяшчаўся штаб атрада. Участак каля Пакалюбіч абаранялі два ўзводы палітбайцоў з Днепрадзяржынска. Участак ад в. Лапаціна да галоўнай аўтамагістралі трымала рота старшага лейтэнанта Уртаева.

Камандзіра асобнага камуністычнага атрада А.Маневіча непакоіў правы фланг абароны, бо ад в. Пакалюбічы да ракі Сож ён быў не прыкрыты.

З усходам сонца з боку лесу ўздоўж ракі Ліпы пачуўся гул. Гэта па шашы ішлі варожыя танкі. Над акопамі абаронцаў адзін за адным грымнулі выбухі. Слупы агню ўспыхнулі і перад нямецкімі танкамі. Чарговы залп разварнуў пярэднюю машыну. Другая, што ішла за ёй, вырвалася наперад, але была спынена прамым пападаннем снарада. Чарговы залп батарэйцаў лейтэнанта Свярдлова спыніў яшчэ адну машыну ворага. З ахопленага полымем танка выскаквалі чорныя фігуры гітлераўскіх танкістаў. Раптам два моцныя выбухі страсянулі паветра — гэта ў падбітых танках узарваліся снарады і паліва. Астатнія чатыры танкі пачалі адыходзіць назад.

Неўзабаве над нашым абарончым рубяжом з'явіўся паветраны шар, за ім — нямецкі самалёт-разведчык. Хутка пачаўся артылерыйскі абстрэл. Снарады рваліся каля шашы: гітлераўцы не шкадавалі боепрыпасаў. Правы фланг абароны ўтрымлівалі байцы добраахвотніцкага батальёна Гомельскага гарнізона, сфарміраванага з рабочых Гомеля, Чачэрска, Буда-Кашалёва, Добруша. Камандаваў батальёнам Н.С.Ісаеў. Полк Гомельскага народнага апалчэння (камандзір Ф.Е.Уткін) заняў рубеж каля в. Калініна, каб падтрымаць асобны камуністычны атрад падпалкоўніка А.Маневіча. На шляху да вызначанага месца апалчэнцаў наведаў сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка. Ён цікавіўся настроем батальёна, яго ўзбраеннем, высвятляў цяжкасці. Паставіў задачу затрымаць гітлераўцаў дні на тры на рубяжы абароны паміж вёскамі Свісток, Рудзянец і станцыяй Уза. Батальён апалчэнцаў падтрымлівалі асобная армейская процітанкавая батарэя, караульны батальён Гомельскага гарнізона, камуністычны атрад падпалкоўніка А.Маневіча і бранепоезд.

На некаторы час на пярэднім рубяжы абароны настала зацішша. Але хутка тут разгарнуліся жорсткія баі. Асобная артылерыйская батарэя (пяць 76-міліметровых гармат з поўным разлікам) размясцілася на паўднёвым захадзе ад в. Калініна. Артылерысты надзейна прыкрывалі добраахвотнікаў.

Варожыя танкі пад прыкрыццём сваёй авіяцыі зноў пачалі атаку. Нямецкія лётчыкі нанеслі абаронцам значныя страты. Браніраваныя машыны рухаліся наперад на вялікай хуткасці. Артылерысты лейтэнанта Свярдлова трапна білі з гармат. За танкамі пайшла пяхота праціўніка. Услед за батарэйцамі адкрылі агонь і нашы зенітчыкі. Каля краю абароны задыміліся некалькі варожых танкаў. Праціўнік панёс вялікія страты. Баявы парадак танкаў і пяхоты разладзіўся. Атака праціўніка прыпынілася, але ненадоўга. Бой ішоў ужо другую гадзіну. Варожыя танкі націскалі, але моцны агонь нашых батарэй стрымліваў іх. Трапныя стрэлы з паўаўтаматычнай зброі, кіданне гранат, стойкасць і мужнасць абаронцаў зрабілі сваю справу — вораг адкаціўся на зыходныя пазіцыі.

Праз некаторы час праціўнік зноў рушыў наперад. Раптоўны агонь кулямётаў збіў атаку гітлераўцаў. На гэтым участку абароны вораг не прайшоў.

Гітлераўцы перанеслі ўсю сілу свайго ўдару на в. Калініна. Нашы байцы змагаліся мужна. І на гэтым участку абаронцы адкінулі праціўніка.

17 жніўня 1941 г. запалала ўся лінія абароны ад станцыі Уза да вёскі Пакалюбічы. У сярэдзіне дня праціўнік пачаў атаку паміж вёскамі Свісток і Калініна пад прыкрыццём шасці танкаў. Апалчэнцы сустрэлі іх звязкамі гранат, бутэлькамі з палівам.

Батальён маёра Н.Ісаева, атрад маёра С.Смолкіна і частка атрада падпалкоўніка А.Маневіча стрымлівалі націск праціўніка на левым флангу.

У сувязі з пагрозай акружэння палка народнага апалчэння генерал В.Н.Гордаў загадаў увечары адвесці батальёны на запасны рубеж пад Яроміна і Касцюкоўку. Адначасова для прыкрыцця ўчастка абароны паміж Узой і Рудзянцом адводзіліся батальёны апалчэнцаў на лінію 25-кіламетровага процітанкавага рова, што знаходзіўся за 300 метраў ад развілкі чыгункі і шашы.

1-ы батальён апалчэння, батальёны Н.Ісаева і Бяляева адарваліся ад праціўніка і занялі намечаныя рубяжы. 2-і батальён апалчэнцаў трапіў у цяжкае становішча. Яму на дапамогу прыйшлі нашы артылерысты. Батальёны разгарнуліся ў баявы парадак уздоўж чыгуначнага насыпу на поўнач ад пасёлка торфапрадпрыемства «Бальшавік». Спроба праціўніка выбіць апалчэнцаў з гэтага рубяжа не ўдалася.

Баі працягваліся і 18 жніўня. Пад націскам праціўніка апалчэнцы адышлі да чыгуначнага насыпу. Сярод іх былі значныя страты. Канчаліся боепрыпасы. У крытычны момант бою камісар батальёна Н.Н.Кунцэвіч падняў байцоў у атаку. Вораг завагаўся і адступіў. У гэтым баі загінуў камісар батальёна апалчэнцаў Н.Н.Кунцэвіч. Мужна змагаліся байцы 3-га батальёна, пехацінцы і танкісты 219-й матарызаванай дывізіі, атрад падпалкоўніка А.Маневіча, батальён капітана Бяляева і іншых фарміраванняў абаронцаў.

19 жніўня на досвітку пачаўся бой на ўчастку, дзе абарону трымаў полк народнага апалчэння капітана Ф.Е.Уткіна. Калі гітлераўцы наблізіліся да каманднага пункта, кулямётчык М.Пасынкаў адкрыў з «максіма» прыцэльны агонь. Але хутка ён сціх — кулямётчык загінуў. Капітан Ф.Е.Уткін кінуўся да кулямёта і ўдарыў па немцах. Атака ворага захлынулася, аднак гітлераўцы працягвалі абстрэльваць з мінамётаў камандны пункт. Асколкі мін барабанілі па шчытку кулямёта, уздымалі вакол зямлю. Але Ф.Е.Уткін працягваў агонь, пакуль не быў цяжка паранены. Да яго кінулася медсястра Раіса Школьнікава. Перавязваючы Ф.Е.Уткіна, яна была смяротна паранена.

У гэты дзень гітлераўцы двойчы бамбілі пазіцыі 1-га батальёна апалчэнцаў, абстрэльвалі яго з гармат і мінамётаў. Больш за 600 нямецкіх салдат і афіцэраў рушылі да ўчастка абароны. Апалчэнцам пагражала акружэнне. Але да іх прыбыло падмацаванне — дэсант пяхоты на танках 219-й матарызаванай дывізіі...

У канцы дня 19 жніўня абаронцы пакінулі і другі рубеж Уза — Пакалюбічы і адышлі да Гомеля.

І.П.Чарняк.

На агнявой пазіцыі

З успамінаў Анатоля Піліпавіча Свярдлова, былога камандзіра асобнай батарэі

Первые дни Великой Отечественной... 172-я стрелковая дивизия, в которой я служил помощником начальника связи 340-го артиллерийского полка, передислоцировалась в район Могилева. После тяжелых оборонительных боев дивизия получила приказ оставить Могилев, прорвать вражеское кольцо окружения и соединиться с советскими войсками.

В первых числах августа я с товарищами вышел из окружения в 40 километрах северо-западнее Чечерска (Гомельской области). А в середине августа был назначен командиром отдельной армейской артиллерийской батареи, занимавшей боевые позиции севернее Гомеля. У нас имелось пять 76-миллиметровых орудий, четыре трактора и автомашина. Личным составом батарея была укомплектована по штату. Часть красноармейцев уже воевала.

Обстановка была сложной: противник превосходящими силами пехоты и танков при поддержке авиации прорвал нашу оборону и углубился до рубежа Ветка, Ло-

патино, Семеновка, станция Уза, Руденец. Советские войска вели упорные оборонительные бои. Задача моей батареи состояла в том, чтобы не допустить прорыва танков на своем участке.

Батарея занимала позиции юго-западнее Семеновки. Южнее и впереди находилась зенитная артиллерийская батарея, которая прикрывала шоссе на Семеновку. Она имела орудия 85-миллиметрового калибра.

16 августа завязались упорные бои. Пехота противника при поддержке танков и бронемашин, под прикрытием сильного огня артиллерии и минометов предприняла атаки на рубеже Семеновка — станция Уза — Руденец. Однако дружными действиями наших стрелковых и артиллерийских подразделений эти атаки были отражены. К вечеру враг еще раз пытался перейти в наступление. Но оно также оказалось безуспешным.

С утра 17 августа гитлеровцы ввели в бой на Гомельском направлении две новые дивизии — пехотную и кавалерийскую. После артиллерийской подготовки танки и пехота противника ринулись в атаку. Но и на этот раз фашисты встретили организованное сопротивление. Вражеские цепи здесь вынуждены были залечь.

К вечеру противник продвинулся в сторону Гомеля с северо-востока и северо-запада. Учитывая угрозу окружения советских войск на рубеже Семеновка — станция Уза — Руденец, командующий 21-й армией приказал с наступлением темноты нашей группе частей и подразделений, которой командовал подполковник Маневич, отойти на рубеж Костюковка — Красное...

Друкуецца паводле кн.: В грозные годы: Воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов на территории Гомельской и Полесской областей. Мн., 1973. С. 88—91.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Жудасны дзень

З успамінаў Ніны Мацвееўны Бядрыцкай, жыхаркі вёскі Наспа

Гітлераўцы ўварваліся ў вёску Наспа жнівеньскім вечарам. Яны разышліся па хатах. Адразу ж пачуліся віск свіней, кудахтанне курэй, плач і лямант жанчын і дзяцей. Ноч прайшла ў трывозе.

Раніцай немцы рушылі да пасёлка Інтэрнацыянал. Там каля возера іх чакала засада камсамольцаў-апалчэнцаў, якія прыбылі з-за Дняпра. Яны блізка падпусцілі нямецкую разведку і адкрылі агонь. Адзін з немцаў быў забіты, астатнія павярнулі назад у Наспу, дзе паведамілі, што трапілі ў засаду партызан. Гітлераўцы акружылі пасёлак. Завязаўся бой. Жыхары пасёлка пахаваліся ў скляпах і зямлянках. Але іх знаходзілі, выганялі з укрыццяў і падпальвалі хаты. Людзей пагналі да палаючага хлява. Натоўп захваляваўся. Некаторыя кінуліся наўцёкі: хаваліся ў хмызняку. Астатніх пагналі да месца, дзе быў забіты немец. Тоўсты гітлеравец падбег да натоўпу, выштурхнуў незнаёмага хлопца і на вачах усіх застрэліў яго. Чацвёра нямецкіх салдат паклалі на коўдру забітага немца і панеслі да лесу. Туды ж пагналі і нас. Я несла на руках малога сына, старэйшы Мікалай ішоў побач.

Каля лесу гітлераўцы пачалі хаваць забітага. Нас пагналі далей у лясок. Раптам адна дзяўчына кінулася ў кусты. Ахоўнікі пабеглі за ёю, але спыніліся, баючыся, што мы ўсе паразбягаемся.

Стаяў цёплы сонечны дзень. Дзеці знемагліся без вады. Дарослыя пачалі крычаць, што яны ні ў чым не вінаватыя. Мікалай паказаў мне аб'яву нямецкіх улад, якая выпадкова аказалася ў яго кішэні, дзе пісалася, што немцы не будуць чапаць мірных жыхароў. Гэту аб'яву ён паказаў нямецкаму афіцэру. Той уважліва яе прачытаў, акуратна злажыў і паклаў у кішэню кіцеля.

Спякота ўзмацнялася. Ахоўнікі дасталі пляшкі і пачалі піць ваду. Убачыўшы гэта, дзеці зноў узнялі крык, прасілі піць. Я і мая суседка далі дзецям кружкі і паслалі іх да ахоўнікаў. Яны падышлі да высокага гітлераўца, які піў ваду, і працягнулі да яго кружкі. Той са злосцю адагнаў іх. Тады яны падышлі да другога немца. Той наліў ім вады. Мы па глыточку падзялілі ваду паміж дзецьмі. У гэты час вярнуліся немцы, што хавалі забітага салдата. Яны выбралі з натоўпу прыгожую жанчыну і павялі ў лес... Вярнулася яна ўся ў поце, нікому нічога не казала. Потым немцы пачалі дапытвацца ў аднаго з мужчын, ці ёсць

сярод нас камуністы, сем'і савецкіх актывістаў. Стары нікога не выдаў, хоць сярод нас былі сем'і Фільчанкі і Гузава — камуніста і старшыні Губіцкага сельсавета.

У бок нашага пасёлка прайшоў нямецкі абоз. Хутка пачуліся стрэлы. Кулі праляталі над нашымі галовамі. Некалькі сяльчан былі паранены. Мы ўсе палеглі на зямлю. Ахова кінула нас і засяшалася да месца бою. Адзін з ахоўнікаў паказаў нам рукой у бок вёскі Гаўлі. Мы рушылі туды. Раніцай вярнуліся ў пасёлак — ён быў спалены. На калгасным двары ляжалі забітыя апалчэнцы. Мы пахавалі іх.

Увесь час нямецкай акупацыі я жыла ў вёсцы Наспа ў хаце Ягора Катлярова. Сын Мікалай быў партызанскі сувязны. Муж загінуў на фронце пад Ельняй у 1941 г.

Акупацыя і акупацыйны рэжым

На тэрыторыі раёна, як і ўсёй акупіраванай рэспубліцы, гітлераўцы ўстанавілі «новы парадак» — рэжым жорсткай эксплуатацыі і бяспраўя. Яны ўмацоўвалі свой аўтарытэт адпаведна з указаннямі верхаводаў рэйха: расстрэльваць кожнага, хто кіне хоць бы адзін косы позірк на немца.

У адміністрацыйных адносінах раён уваходзіў у склад вобласці армейскага тылу групы армій «Цэнтр». Гэта накладвала свае асаблівасці на ўсё жыццё вобласці. Уся ўлада знаходзілася ў руках ваенных органаў. Па населеных пунктах расклейваліся загады і распараджэнні аб здачы насельніцтвам зброі, радыёпрыёмнікаў, фотаапаратаў. Забаранялася дапамагаць чырвонаармейцам.


ANORDNUNG
über Sperrstunden

Mit Zustimmung des Reichskommißars für das Ostland setze ich die Sperrzeit im Generalbezirk Weissruthenien in den Städten auf die Zeit vom Dunkelwerden bis zum Hellwerden fest.

Zivilpersonen, die während der Sperrzeit ohne zwingende Gründe auf der Straße betroffen werden, werden sofort standgerichtlich erschossen.

Für die Besucher von Theatern und sonstigen kulturellen Veranstaltungen ergeht eine Sonderregelung.

Diese Anordnung tritt am 1. November 1941 in Kraft.

Minsk, den 20. Oktober 1941

Der Generalkommissar für Weissruthenien
WILHELM KUBE

РАСПАРАДЖЭНЬНЕ
аб абмежаваньні хаджэньня вячэрняю парою

Са згодай Дзяржаўнага Камісара Ўсходняга Абшару пастанаўляю агранічыць час хаджэньня ў гарадах Гэнэральнай Акругі Беларусі ад сьцямненьня да развідненьня.

Асобы цывільныя, якія ў агранічаным часе без уважлівай прычыны будуць спатканыя на вуліцы, будуць зараз-жа на месцы расстраляны.

Для адведваючых тэатр і іншыя культурныя ўстановы выйдзе асобнае распараджэньне.

Гэта распараджэньне ўваходзіць у сілу ад 1 лістапада 1941 г.

Менск, 20 кастрычніка 1941 г.

Гэнэральны Камісар Беларусі
ВІЛЬГЭЛЬМ КУБЭ

ROZPORZĄDZENIE
o ograniczeniu ruchu cywilnego w czasie od początku zmierzchu do świtania

Za zgodą Komisarza Rzeczy Ostlandu zarządzam ograniczenie czasu chodzenia po miastach Generalnego Okręgu Białorusi od zmierzchu do świtania.

Osoby cywilne, które w zabronionym czasie spotka się chodzące bez powodu na ulicy, będą natychmiast doraźnym sądem rozstrzelane.

Dla odwiedzających teatr i inne kulturalne imprezy wydane zostanie odrębne uregulowanie.

Rozporządzenie wchodzi w życie z dniem 1 listopada 1941 r.

Mińsk, 20 października 1941 r.

Generalny Komisarz Białorusi
WILHELM KUBE

РАСПОРЯЖЕНИЕ
об ограниченном хождении вечерней порой

С согласия Государственного Комиссара Восточной Территории постановляю:

Ограничить время хождения в городах Генерального Округа Белоруссии от вечерних сумерок до рассвета.

Лица гражданские, которые в ограниченное время без уважительной причины будут встречены на улице, будут сейчас же Военным Судом расстреляны.

Для посещающих театр и другие культурные учреждения выйдет особый приказ.

Это распоряжение входит в силу с 1-го ноября 1941 г.

Минск, 20 октября 1941 г.

Генеральный Комиссар Белоруссии
ВИЛЬГЕЛЬМ КУБЕ

Адно з распараджэнняў акупацыйных улад.

Аператыўныя групы і жандармерыя «ачышчалі» тэрыторыю ад камуністаў, палітработнікаў, яўрэяў, цыганоў, усіх «непажаданых» для новых гаспадароў.

26 кастрычніка 1941 г. былі праведзены масавыя арышты яўрэйскага насельніцтва па ўсім раёне. Два месяцы людзей трымалі ў двухпавярховым будынку школы. Раніцай 27 снежня 485 арыштаваных вывелі на Чырвоны Курган і расстралялі. У лістападзе каля пасёлка Зорка Прыбарскага сельсавета пад выглядам барацьбы з партызанамі карнікі знішчылі 93 мірных жыхароў. Сотнямі гінулі параненыя і знясіленыя чырвонаармейцы, якія трапілі ў палон. Ім не аказвалася медыцынская дапамога, падоўгу не выдавалі харчаванне. Ваеннапалонных збіралі на пункты пры нямецкіх вайсковых фарміраваннях, а затым пераводзілі ў лагеры — № 121 у Гомелі, № 130 у Рагачове і іншыя. На станцыях Буда-Кашалёўская і Уза па заяўцы галоўнай чыгуначнай дырэкцыі працавалі групы ваеннапалонных. Не было амаль ніводнай вёскі, дзе б не было расстраляных, павешаных. Так выконвалася пагроза акупантаў: за аднаго забітага немца забіваць 10 чалавек з мясцовага насельніцтва. Кожны дзень людзі жылі пад страхам смерці.

У дапамогу нямецкім акупацыйным уладам ствараліся органы мясцовай улады. Яна складалася з раённай і валасных упраў на чале з бургамістрамі, па вёсках прызначаліся старасты.

У геаграфічных адносінах раён падзяляўся чыгункай Жлобін — Гомель на дзве амаль роўныя часткі. Было створана 13

валасцей: у паўночнай частцы — 8, у паўднёвай, якая прылягала да левага берага Дняпра, — 5. Межы валасцей у асноўным адпавядалі даваенным сельскім Саветам. Іх работу забяспечвалі гарнізоны, створаныя ў вёсках Рагінь, Меркулавічы, Губічы, Забаб'е, Чабатовічы, Пірэвічы і іншых. У г.п. Буда-Кашалёва размяшчаліся раённая камендатура, гарнізон з 40—50 чалавек. Пры раённай і валасных управах былі створаны паліцэйскія ўчасткі, якія налічвалі па 7—10 чалавек.

Намаганнямі нямецкіх акупацыйных і мясцовых улад уводзіўся новы рэжым жыцця для насельніцтва раёна. Жыхары ад 16 гадоў павінны былі мець асабістае пасведчанне (аўсвайс) за подпісам і пячаткай раённай управы і нямецкай камендатуры. Без такога пасведчання ўсе затрыманыя, асабліва ноччу, лічыліся партызанамі і на месцы расстрэльваліся. Усе людзі ад 14 гадоў падлягалі перапісу. Адзначаліся прозвішча, імя, год і месца нараджэння, род заняткаў.

У раёне дзейнічалі ваенна-гаспадарчыя інспекцыі, каманда і групы пры раённай камендатуры, спецыяльны ўпаўнаважаны па сельскай гаспадарцы, прамысловасці, выкарыстанні рабочай сілы. Іх галоўнай задачай было забеспячэнне нямецкіх войскаў усім неабходным. На тэрыторыі раёна дзейнічалі маслазавод, смалакурны, лесапільныя, шкіпінарны заводы. Працавалі паравыя млыны. Акупанты ўстанавілі ўсеагульную прыгонную працу.

На второй день нас под охраной на четырех автомашинах отправили в Гомель и на станции Гомель погрузили в эшелон, где уже сидели также советские граждане, и отправили в Германию.

В пути следования над нами немецкие солдаты издевались, морили голодом, не давали воды. Пищевой рацион, который выдавали немцы в пути следования, составлял по 200 грамм хлеба, по 20 грамм меда и около ведра воды на вагон, в который было посажено 45—50 человек. Больным медицинская помощь совсем не оказывалась.

Через пять дней пути нас привезли в Германию, в г. Гамбург, где разместили в лагерь рабов, который был обнесен колючей проволокой и находился под охраной немецкой полиции. В лагере всем нам устроили двухнедельный карантин. Всех нас, девушек, постригли. Затем нас построили в ряды, и немецкие власти объявили продажу русских рабов для немецких жителей и помещиков. На рынок «невольников» поприходили немецкое население и помещики, т.е. покупатели, которые ходили по рядам, смотрели на «товар», производили выбор, смеялись над нами, обзывали нас «русской свиньей» и, если покупатель произвел выбор «товара», то из ряда выводили девушку или мужчину. А дальше платили деньги представителю немецкой власти и уводили с собой. Так, меня вместе с другими семью девушками из моей деревни Калинино купил один немецкий помещик, у которого мы все работали на полевых работах около 4 месяцев. Над нами немецкий помещик издевался как только мог, создал нам невыносимые условия жизни. Заставлял работать от зари до зари без отдыха и оплаты. Кормил отходами от приготовления пищи, избивал. После окончания полевых работ нас помещик отправил обратно в лагерь, где меня вторично вместе с подругой Мещаниновой Раисой купил немецкий хозяин из д. Крампа, у которого я вместе с моей подругой проработала около 4 месяцев, и из-за невыносимых условий жизни мы с подругой бежали, но были пойманы немецкой полицией и отправлены в концлагерь «Равенсбрюк», который располагался в 80 км от г. Гамбург, где просидела 13 месяцев. В этом лагере немецкие палачи истребили десятки тысяч человек. В нем был выстроен крематорий из 7 печей, работавший круглые сутки, где сжигались сотни человек, замученных немецкими палачами. Как правило, немецкие палачи ежедневно выстраивали всех людей, находившихся в лагере, отбирали и отправляли в крематорий без исключения всех больных, которые не могли выполнять работу...

За время моего нахождения в концлагере, т.е. с июня 1944 г. по 5 мая 1945 г., немецкие палачи через крематорий пропустили около 83 тысяч человек. Когда меня немцы бросили в лагерь, мне присвоили номер 35535. При освобождении последняя жертва была брошена в концлагерь немецкими палачами под номером 118 тысяч...

З ПРАТАКОЛА АПЫТАННЯ ЦІХАНА МІКАЛАЕВІЧА СТАРАСЦЕНКІ, БЫЛОГА ПАРТЫЗАНА АТРАДА ІМЯ БЕРЫЯ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Кастрычнік 1947 г.

...В 1941—1942 гг. на территории торфозавода «Большевик» дислоцировалось подразделение охранной части, номер которой я не знаю. Солдаты этой части систематически занимались грабежом местного населения. Зимой 1941—1942 года у населения изымали теплые вещи для немецкой армии, как-то: полушубки, валенки и т.д., а также скот и продукты питания. Все это осуществлялось под руководством местного коменданта, фамилию которого я не помню.

Зимой 1941—1942 гг. в д. Ивановка, прилегающей к торфозаводу «Большевик», солдатами этой части были расстреляны 2 советских гражданина за связь с партизанами. Зимой 1942 года солдаты этой части в д. Зеленые Луки ушли просить продукты питания у населения. Весной 1942 года в д. Семеновка Уваровичского района были повешены 4 советских гражданина, подозреваемые в связях с партизанами.

В 1943 году, при отступлении немецких частей в октябре месяце, последние сжигали населенные пункты в Уваровичском районе, Чечерском, Стрешинском, Лоевском и Гомельском. Были сожжены д. Галевка, где в огне погибли 84 советских гражданина, пос. Алексеевка, где в огне сгорели 62 человека, п. Веселое Поле Гомельского района, где сгорели 34 человека, и другие.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 861. Воп. 1. Спр. 6. Л. 417, 418, 420, 424, 426—428, 430—433, 444.

З РАШЭННЯ №10 ВЫКАНКОМА УВАРАВІЦКАГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ГАРАДСКІМ ПАСЁЛКУ УВАРАВІЧЫ

1 чэрвеня 1969 г.

Рассмотрев на заседании исполкома Уваровичского поселкового Совета материалы Чрезвычайной комиссии, а также проведя работу по уточнению сведений о преступлениях немецко-фашистских оккупантов на территории Уваровичского поселкового Совета, исполком поселкового Совета констатирует, что на территории поселкового Совета имелся г.п. Уваровичи, в котором сожжено полностью домов — нет, частично — 151 дом, восстановлено на прежнем месте — 151 дом. В г.п. Уваровичи уничтожено — 251 человек, угнано в фашистское рабство — 1 человек, погибло на фронтах Великой Отечественной войны — 179 человек, погибло в партизанских отрядах и в подполье — 3 человека.

Председатель исполкома пос. Совета депутатов Ф. Василенко

Секретарь исполкома М. Пашкевич

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 753. Л. 69.

З РАШЭННЯ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА ГАРАДСКОГА ПАСЯЛКОВАГА САВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У ГАРАДСКІМ ПАСЁЛКУ БУДА-КАШАЛЁВА

2 чэрвеня 1969 г.

Рассмотрев на заседании исполкома Буда-Кошелевского гор. пос. Совета материалы Чрезвычайной комиссии по уточнению сведений о преступлениях немецко-фашистских оккупантов на территории Буда-Кошелевского гор. пос. Совета, исполком гор. пос. Совета констатирует, что на территории поселкового совета имелся г.п. Буда-Кошелево, в котором сожжено полностью домов — нет, частично — нет. В гор. пос. Буда-Кошелево уничтожено 483 человека, угнано в фашистское рабство — нет, погибло на фронтах Великой Отечественной войны — 138 человек, погибло в партизанских отрядах и подполье — 25 человек.

Председатель гор. пос. Совета Г.Пасько

Секретарь гор. пос. Совета Л.Кулевская

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 753. Л. 67.

РАШЭННЕ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЙВЫКАНКОМА АБ УДАКЛАДНЕНЫХ ЗВЕСТКАХ АБ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ І НАСЕЛЬНІЦТВЕ РАЁНА, ЗНІШЧАНЫХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ ЗАХОПНІКАМІ

3 чэрвеня 1969 г.

Рассмотрев материалы Чрезвычайной комиссии, а также проведя работу по уточнению сведений о преступлениях немецко-фашистских оккупантов на территории Буда-Кошелевского района Гомельской области, исполком районного Совета депутатов трудящихся констатирует, что на территории района имелось 305 деревень, из них 15 сожжено полностью, 30 частично. В настоящее время 43 восстановлено на прежнем месте. В этих деревнях уничтожено 198 человек, угнано в фашистское рабство 288 человек, погибло на фронтах Великой Отечественной войны 4230 человек, погибло в партизанских отрядах и в подполье — 68 человек.

Исполком Буда-Кошелевского районного Совета депутатов трудящихся решил:

Утвердить рассмотренные материалы, поступившие от комиссий по сельским Советам о населенных пунктах и населении Буда-Кошелевского района, уничтоженных немецко-фашистскими захватчиками в годы Великой Отечественной войны.

Приложение: материалы сельских Советов Буда-Кошелевского района на 42-х листах

Председатель исполкома Буда-Кошелевского
районного Совета депутатов трудящихся И. Яковцев

Секретарь исполкома Буда-Кошелевского
районного Совета депутатов трудящихся Д. Климков

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4683. Воп. 3. Спр. 753. Л. 66.

Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.

ЗВЕСТКІ АБ СТРАТАХ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

1944 г.

РАЗДЕЛ 1. УЩЕРБ В ДЕНЕЖНОМ ВЫРАЖЕНИИ	4386 актов
А. ПО ИНДИВИДУАЛЬНЫМ АКТАМ	Стоимость в рублях
1. Стоимость имущества, отобранного, похищенного и уничтоженного немецко-фашистскими оккупантами, а также погибшего, испортившегося в результате условий оккупационного режима, а также затраты по ремонту поврежденного оккупантами имущества	394 590 846
4. Налоги, штрафы и контрибуции, уплаченные оккупационным властям	22 887 777
6. Заработки и доходы, потерянные из-за увечья или заболевания	
7. Расходы по эвакуации и реэвакуации	
8. Заработки и доходы, потерянные из-за невозможности заниматься своей профессией	3 098 102
9. Заработки и доходы, утерянные семьями	
10. Прочие виды ущерба	40 189 324
Итого	460 766 049
Б. ПО АКТАМ-СПИСКАМ	
1. Стоимость отобранного, похищенного и уничтоженного имущества и затраты по ремонту поврежденного имущества	27 800 479
2. Прочий ущерб, выявленный по актам-спискам	2 627 600
Итого	30 428 079
Всего ущерба	491 194 128

РАЗДЕЛ 2. УЩЕРБ В НАТУРАЛЬНОМ ВЫРАЖЕНИИ ПО НЕКОТОРЫМ ВИДАМ ИМУЩЕСТВА

(по номенклатуре, приведенной в п. 6 инструкции)

Виды имущества	Ед. измерен.	К-во разграб., разруш., уничт.
1	2	3
Жилые здания	зд/кв. м	842/142 021
Надворные постройки	зд/кв. м	921/95 081

1	2	3
Лошади	голов	1069
Быки-производители	голов	113
Коровы	голов	3004
Волы рабочие	голов	155
Молодняк крупного рогатого скота	голов	1412
Свиньи	голов	2344
Овцы и козы	голов	2076
Птица разная (куры, гуси, утки)	голов	178 783
Пчелы	семей	621
Зерно	центн.	36573, 42
Мука	центн.	45, 94
Картофель	центн.	207190, 56

Ответственный секретарь областной комиссии — Н.Рыщук
Зав. отделом учета ущерба, причиненного гражданам СССР — Н.Фридман

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1345. Воп. 2. Спр. 6. Л. 3.

ЗВЕСТКІ АБ СТРАТАХ, НАНЕСЕНЫХ УСТАНОВАМ АХОВЫ ЗДАРОЎЯ БУДА-КАШАЛЁЎСКАГА РАЁНА

1944 г.

№№ пп	Наименование пред., уч., орг.	Местонахожд. адрес	Дата акта	К-во л.	№№ акта	Дата рег.	Сумма тыс. руб
1.	Амбулат. р-а	Б-Кошелево	25.X.	2	2470	10.44	11 036
2.	Райбольница	-»-	-»-	2	2471	10.44	177 281
3.	Врач. участок	д. Любовин	-»-	2	2469	10.44	47 390
4.	Врач. участок	д. Рогинь	-»-	2	2468	10.44	59 238
5.	Дет. консульт.	Б-Кошелево	-»-	2	2467	10.44	13 287
6.	Райбольница	Б-Кошелево	-»-	2	2466	10.44	34 441
Всего:							342 673

Заведующий Буда-Кошелевским отделом здравоохранения
Бухгалтер

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці. Ф. 1345. Воп. 2. Спр. 4. Л. 54.

Падрыхтавала Т.А.Бяланава.

Падполле

Масавыя пакаранні, расстрэлы савецкіх грамадзян не змаглі запалохаць людзей. Многія з іх пачалі думаць аб сваім месцы ў гэты грозны час, збіраць аднадумцаў, раіцца, як дапамагчы Чырвонай арміі, свайму народу. Кампартыя і Савецкі ўрад узброілі людзей, якія апынуліся пад акупацыяй, праграмай дзеянняў: ствараць падпольныя групы, ажыццяўляць хоць невялікія, але частыя дыверсіі, зрабіць невыносныя ўмовы для ворага.

Ужо ў першыя месяцы акупацыі ў раённым цэнтры Буда-Кашалёва, па вёсках раёна пачалі стварацца антыфашысцкія групы і арганізацыі. Яны дзейнічалі ў вёсках Патапаўка, Сялец, Сямёнаўка, Недайка, Губічы, Гаўлі і іншых населеных пунктах. З рызыкай для свайго жыцця падпольшчыкі ўтойвалі радыёпрыёмнікі, надзейна хавалі і па іх слухалі голас Масквы. Звесткі з франтоў, з краіны падпольшчыкі даводзілі да жыхароў раёна праз лістоўкі, якія перапісвалі ад рукі. На месцах нядаўніх баёў збіралі зброю, боепрыпасы і хавалі ў тайніках у лесе. Усё гэта хутка спатрэбілася партызанам. Камсамольцы-падпольшчыкі вёскі Патапаўка перадалі партызанам некалькі вінтовак і больш за 1000 патронаў.

Актыўна дзейнічалі падпольшчыкі ў

райцэнтры Буда-Кашалёва, якіх узначальвалі муж і жонка Закрэўскія. Кацярына Аўдашкова па заданні падполля працавала сакратаркай у паліцыі і своечасова паведамляла аб планах злачынцаў супраць партызан. Ганна Пахомава і Марыя Церашкова перапісвалі зводкі Саўінфармбюро і расклейвалі на будынках райцэнтра. Ганна Волкава дапамагла партызанам узарваць воданапорную вежу. Былы чырвонаармеец сяржант Кавальскі стварыў падпольную камсамольскую арганізацыю ў в. Сямёнаўка. У арганізацыю ўвайшлі вучні Ваня Сіўцоў, Лёня Шапоцька, Іван Канцавы і іншыя. Але дзейнічалі яны нядоўга. Усе яны былі арыштаваны. Чацвёра з іх — Кавальскі, Сіўцоў, Кабкоў і Канцавы — пасля жорсткіх допытаў былі павешаны ў роднай вёсцы, астатнія — расстраляны ў Гомелі.

У жніўні 1942 г. мясцовая настаўніца Таісія Чудакова арганізавала падпольную групу з чатырох чалавек. Група актыўна дзейнічала па зрыве сельскагаспадарчых мерапрыемстваў акупантаў.

Падпольную антыфашысцкую арганізацыю ў в. Губічы ўзначаліла настаўніца Ганна Лапіцкая. Падпольшчыкі праводзілі работу па разлажэнні губіцкага паліцэйскага гарнізона.

Група медыцынскіх работнікаў в. Борхаў на чале з галоўным урачом М.Я.Доўгай у жніўні 1941 г. арганізавала дапамогу параненым чырвонаармейцам, а ў гады акупацыі раёна ратавала іх. Падпольшчыкі арганізавалі аказанне медыцынскай дапамогі партызанам, забяспечвалі іх і падпольшчыкаў г. Гомеля медыкаментамі. У сувязі з пагрозай арышту ўсе члены групы пайшлі да партызан.

Усяго па раёне дзейнічала больш за 30 падпольных груп. Разам з партызанамі яны змагаліся супраць акупантаў, набліжаючы час вызвалення сваёй краіны.

Р.А.Чарнаглазава.

Дакументы сведчаць

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГОМЕЛЬСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА ЛКСМБ АБ ДЗЕЙНАСЦІ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ УВАРАВІЦКАГА РАЁНА

1944 г.

Комсомолец д. Ховхла Уваровичского района тов. В.М.Ермаков до ухода в партизанский отряд вёл активную разведывательную работу, помогая партизанам в разгроме вражеских гарнизонов.

В этой же деревне подпольному горкому и партизанским отрядам оказывали помощь комсомольцы Молчанов Григорий, Исаченко Павел, Афанасьев Никита, Харитонова Анна. Посредством этих товарищей члены подпольного Горкома комсомола получали важные сведения о противнике, добывали для партизанских отрядов оружие, распространяли советские листовки и литературу среди населения.

Учительница-комсомолка Н.Е.Грицкова в д. Репица Уваровичского района устроила у себя явочную квартиру для подпольщиков. Комсомолка Ф.Н.Лебешкова доставляла советскую литературу в пригороды Гомеля. Кириллова на квартире отца в д. Решетники Уваровичского района также устроила явочную квартиру, хранила советскую литературу, взрывчатку, вызывала связных.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3934. Воп. 1. Спр. 8. Л. 6.

ПАСТАНОВА БЮРО ГОМЕЛЬСКАГА АБКОМА КАМПАРТЫІ БЕЛАРУСІ АБ ПАДПОЛЬНАЙ ПАТРЫЯТЫЧНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ Ў ВЁСЦЫ БОРХАЎ УВАРАВІЦКАГА РАЁНА

30 чэрвеня 1977 г.

Рассмотрев постановление Речицкого райкома КПБ «О патриотической деятельности группы медицинских работников д. Борхов в годы Великой Отечественной войны» и документы, приложенные к нему, бюро Гомельского обкома КПБ постановляет:

1. Утвердить постановление Речицкого райкома КПБ от 20 мая 1975 года «О патриотической деятельности группы медицинских работников д. Борхов в годы Великой Отечественной войны».

2. Признать подпольную патриотическую организацию д. Борхов в годы Великой Отечественной войны (август 1941 – июль 1943 гг.).

3. Утвердить справку о патриотической деятельности группы медицинских работников д. Борхов и списки её участников.

Секретарь Гомельского обкома КПБ В.Гвоздев

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4903. Воп. 1. Спр. 1. Л. 1.

СПІС ЧЛЕНАЎ ПАДПОЛЬНАЙ ПАТРЫЯТЫЧНАЙ ГРУПЫ ВЁСКІ БОРХАЎ (1941—1943)

№ п/п	Фамилия, имя, отчество	Год рождения	Место жительства в период приобщения к подполью	Работа до оккупации района	Должность в подполье и время вступления	Куда выбыла из подпольной организации
1.	Долгая Мария Яковлевна	1912	д. Борхов Уваровичского р-на	Зав. Борховского врачебного участка	Руководитель группы с авг. 1941	В 1-ю Гомельскую партизанскую бригаду 24.7.1943
2.	Сирикова (Соколова) Евдокия Яковлевна	1921	д. Борхов Уваровичского р-на	Акушерка Борховского медучастка	Рядовая с авг. 1941	В 1-ю Гомельскую партизанскую бригаду 24.7.1943
3.	Сирикова (Волкова) Анна Яковлевна	1919	д. Ст.Дятловичи Гомельского р-на	Акушерка Дятловичского ф-ак. пункта	Рядовая с 12.1941	В 1-ю Гомельскую партизанскую бригаду 24.7.1943
4.	Сириков Виктор Яковлевич	1927	д. Борхов Уваровичского р-на	Учащийся	Рядовой с 07.1942	В 1-ю Гомельскую партизанскую бригаду 24.7.1943
5.	Галимская Дарья Потаповна	1918	д. Борхов Уваровичского р-на	Фельдшер, военнослужащая	Рядовая с 11.1941	В 1-ю Гомельскую партизанскую бригаду 24.7.1943

Председатель комиссии В.Солодуха.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4903. Воп. 1. Спр. 1. Л. 7.

Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.

Былыя падпольшчыкі вёскі Борхаў успамінаюць

Марыя Якаўлеўна Доўгая, кіраўнік падпольнай арганізацыі

У 1941 годзе, на другі дзень пасля аб'яўлення вайны, я прыйшла ў райваенкамат як ваеннаабавязаная, дзе мне была выдадзена бронь – да асобага распараджэння. Працягвала працаваць на сваім урачэбным участку разам з медыцынскімі работнікамі Еўдакіяй Якаўлеўнай Сірыкавай і Ганнай Іванаўнай Карнеевай – лячылі мясцовых жыхароў. У пачатку ліпеня 1941 года памяшканне нашай амбулаторыі было перабсталявана пад шпіталь, і нашы медработнікі працавалі сумесна з медработнікамі шпіталя. У сярэдзіне жніўня 1941 года, калі шпіталь пераехаў у іншае месца, то пакінуў нам параненых салдат і афіцэраў. Нашы медработнікі Е.Я.Сірыкава, Г.І.Карнеева і я працягвалі лячыць параненых, а наш повар, загадчык гаспадаркі і санітаркі забяспечвалі іх харчаваннем.

У той час па ўказанні Уваравіцкага РК КП(б)Б, я з медработнікамі ўрачэбнага ўчастка Сірыкавай і Карнеевай была пакінута для работы ў тыле немцаў у в. Борхаў. Мы працягвалі лячыць мясцовых жыхароў, хворых і параненых воінаў Чырвонай арміі...

У сувязі з тым, што да нас з Уваравіцкага РК КП(б)Б ніхто не прыйшоў, ніякіх

указанняў нам не паступала. Мы рабілі так, як падказвала нам сумленне савецкага чалавека...

У снежні 1941 года да нас за медыцынскай дапамогай звярнуўся рабочы-лесаруб, які з групай мужчын з Гомеля працаваў на нарыхтоўцы дроў... Ён прыходзіў не адзін раз. Прыносіў весткі з Вялікай зямлі: то лістоўку, то газету. Гэтым лесарубам аказаўся Сяргей Паўлавіч Купцоў. Так наладзілася сувязь з падпольнай арганізацыяй Гомеля. Мы пачалі дзейнічаць па ўказаннях С.П.Купцова.

Работу ўрачэбнага ўчастка мы падзялілі паміж сабой. Д.П.Галімская штомесяц ездзіла ва Уваравічы па гаспадарчых справах, па медыкаменты і адвозіла туды газеты, лістоўкі, атрыманыя ад С.П.Купцова і партызан. Наладжвала яна і сувязі з патрэбнымі людзьмі, напрыклад з загадчыцай аптэкі. Акушэрка Е.Я.Сірыкава абслугоўвала вёску Якімаўка. Сярод жыхароў вёскі былі свае людзі, ад якіх мы атрымлівалі звесткі аб станцыі Якімаўка, аб колькасці нямецкага гарнізона, яго ўзбраенні. Хадзіла яна і ў вёску Дзятлавічы, дзе працавала ў бальніцы яе сястра Ганна Якаўлеўна Сірыкава. Ад яе прыносіла медыкаменты. Пастаянным нашым сувязным быў 14-гадовы Віця, брат Ганны Якаўлеўны і Еўдакіі Якаўлеўны Сірыкавых. Ён жыў то ў адной сястры, то ў другой. Заўсёды прыносіў нам важныя звесткі пра ворага. Мне даводзілася разам з Віцем ездзіць у вёскі Дзятлавічы і Якімаўку, ва Уваравічы і Гомель, куды мы адвозілі медыкаменты і прадукты харчавання для падпольшчыкаў, ваеннапалонных.

З сярэдзіны 1942 года звязаліся з партызанскімі атрадамі імя М.А.Шчорса, В.І.Чапаева, К.Я.Варашылава і іншымі. Дапамагалі ім медыкаментамі, выязджалі да партызан, каб дапамагчы параненым і хворым.

Са жніўня 1943 года мы ўсе сталі партызанамі 1-й Гомельскай брыгады. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4903. Воп. 1. Спр. 2. Л. 4—6.)

Еўдакія Якаўлеўна Сірыкава (Сакалова)

У 1940 г. я закончыла фельчарска-акушэрскую школу і была накіравана на работу акушэркай на ўрачэбны ўчастак у вёсцы Борхаў, дзе мяне і застала вайна. Працягвала працаваць на ўчастку, лячыла мясцовых жыхароў, чырвонаармейцаў, бежанцаў. Выконвала заданні падполля і партызан.

...На ўсё жыццё запомніўся адзін з ліпеньскіх дзён 1943 года. Па даносе здрадніка на досвітку ў вёску прыбыў атрад карнікаў. Яны адразу ж акружылі тэрыторыю медучастка, устанавілі кулямёты. Нам загадалі заставацца на месцах. Пачаўся вобыск. Нам удалося спаліць партызанскія лістоўкі і газеты. Карнікі загадалі нам вызваліць для іх пакой, забраць адтуль нашы рэчы. У гэты момант на вачах карнікаў у мяне з кішэні халата выпала партызанская лістоўка, якая выпадкова засталася. Гэта было так нечакана, што ўсе разгубіліся. Але потым раз'юшаны нямецкі афіцэр загадаў М.Я.Доўгай прачытаць лістоўку. Пасля гэтага нас зачынілі ў розных пакоях і паставілі каля дзвярэй вартавых. Ноч была цёмная, ішоў дождж. Пад покрывам ночы нам удалося ўцячы.

Пасля гэтага выпадку заставацца нам у Борхаве было нельга. Мы пайшлі ў партызанскі атрад «Бальшавік». У атрадзе была медсястрой. Хадзіла на баявыя аперацыі. Вайну закончыла ў Германіі: працавала медсястрой у франтавым шпіталі. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4903. Воп. 1. Спр. 2. Л. 7—9.)

Дар'я Патапаўна Галімская

Пасля нападу фашысцкай Германіі на Савецкі Саюз я была мабілізавана ў Чырвоную армію. Служыла медсястрой у 67-м медсанбаце 55-й стралковай дывізіі 21-й арміі.

Вайсковая часць, у якой я знаходзілася ў верасні 1941 г., трапіла ў акружэнне ў горадзе Оржыца. Вырашыла перайсці лінію фронту.

Рухалася пешшу па незнаёмых дарогах без харчавання. Дайшла да г. Палтавы, высветліла становішча на фронце. Яно было несуцяшальным. Захварэла. Пайшла на Гомельшчыну. У лістападзе 1941 г. я прыйшла на ўрачэбны ўчастак, дзе працавала да вайны. Там я сустрэла ўрача М.Я.Доўгую і акушэрку Е.Я.Сірыкаву... Я была залічана медсястрой.

Неяк увечары да нас на кватэру зайшлі 4 ваеннапалонныя. Адзін з іх — афіцэр Ва-

ражцоў Якаў Міхеевіч — быў хворы на сыпны тыф. Ён быў цяжка хворы, выхадзіць яго каштавала шмат сіл і часу. Кармілі яго чым маглі. Іншы раз харчы для яго прыносілі жыхары вёскі Борхаў Белавусавы.

Са снежня 1941 г. М.Я Доўгая даручыла мне дастаўляць ва Уваравічы атрыманыя ад Купцова і іншых партызан лістоўкі і газеты. Я іх адносіла ўрачу В.С.Ковель, якая была тады загадчыцай райздраўаддзела і аптэкі.

Раз у месяц я ездзіла ва Уваравічы па зарплату на ўсіх работнікаў Борхаўскага медучастка... За частку грошай мы куплялі медыкаменты, медінструменты для партызан...

Разам з урачом Доўгай выязджала для аказання медыцынскай дапамогі параненым партызанам.

Аднойчы, пры чарговай паездцы ва Уваравічы, мяне запрасіў да сябе бургамістр Язвінскі. Ён ведаў, што мы ездзілі да партызан, і прапанаваў усяму медучастку пераехаць бліжэй да паліцыі і немцаў, бо нас могуць забраць партызаны. Я адмовілася, спасылаючыся на тое, што ў Борхаве ў нас дамы, гаспадарка, агароды, — усё ж жыць лягчэй, ды сказала, што партызаны жанчын у атрады не бяруць. У той жа дзень урач Ковель папярэдзіла мяне, што мае прыезды ва Уваравічы звярнулі на сябе ўвагу.

Неаднаразова партызаны-падрыўнікі заходзілі да нас (мы жылі з М.Я.Доўгай). Выкананыя імі заданні надавалі нам сіл у падпольнай рабоце. Мы адчувалі, што наша дзейнасць патрэбна людзям, якія змагаюцца з ворагам.

Аднойчы, гэта было ў ліпені 1943 года, здраднікі падпільнавалі чарговае наведанне партызанамі нашай кватэры. У тую ж ноч, на досвітку, будынак быў акружаны, але партызан у нас не знайшлі... Нас арыштавалі... Але нам пашанцавала ўцячы... (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4903. Воп. 1. Спр. 2. Л. 1—4.)

Ганна Якаўлеўна Сірыкава (Волкава)

У 1937 годзе я закончыла Магілёўскую акушэрскую школу і была накіравана на работу ў Гомельскі раён, у вёску Дзятлавічы, у раённую бальніцу акушэркай.

Калі пачалася вайна, на другі дзень была выклікана ў райваенкамат, дзе мне далі адтэрміноўку і сказалі, каб я знаходзілася на сваім месцы да асобага распараджэння.

У гэты час у вёсцы Дзятлавічы арганізаваўся атрад народнага апалчэння, якім камандавалі Андрэй Фёдаравіч Буры і Шундзікаў. Прымала ўдзел у загатоўцы харчавання, вопраткі для байцоў атрада.

Калі немцы занялі вёску, страцілася сувязь з атрадам...

У пачатку 1942 года я звязалася са сваёй сястрой Сірыкавай Еўдакіяй Якаўлеўнай і братам Віктарам, з Борхаўскім урачэбным участкам. Праз сястру і брата перадавала туды медыкаменты, перавязачныя матэрыялы. Хадзіла да іх і сама: забірала зводкі Саўінфармбюро.

У ліпені 1943 года Марыя Якаўлеўна Доўгая і брат Віктар прыехалі ў Дзятлавічы на кані, забралі падрыхтаваныя медыкаменты, перавязачныя матэрыялы, прадукты харчавання, і мы разам паехалі ў Гомель, адтуль у Борхаў. На другі ці трэці дзень бальніцу акружылі карнікі. Суткі мы прасядзелі ў зачыненых пакоях. Ноччу мы з Галімскай уцяклі. Раніцай усе сустрэліся ў вёсцы Заселле...

У партызанскім атрадзе была медсястрой роты. Некалькі разоў удзельнічала ў баявых аперацыях. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4903. Воп. 1. Спр. 4. Л. 2—4.)

Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.

Падпольшчыкі Буда-Кашалёва

Вясной 1942 г. у Буда-Кашалёве была створана падпольная арганізацыя, якую ўзначалілі настаўнік Уладзімір Іванавіч Закрэўскі і яго жонка Таццяна Кірылаўна. Адным з першых у арганізацыю ўступіў Міхаіл Цімохаў. Ён добра маляваў абразы на драўляных дошчачках. Гэта выкарысталі падпольшчыкі, да таго ж і нямецкая камендатура не перашкаджала яму разносіць абразы па вёсках. Так ён стаў сувязным паміж падпольнымі групамі і партызанамі. Яму ўдалося наладзіць сувязь з

дыверсійнай групай Эдуарда Лаўрыновіча. Па заданні апошняга падпольшчыкі дасталі сілкаванне да радыёпрыёмніка. Аднойчы ён папярэдзіў партызан, якія знаходзіліся ў Губіцкім лесе, аб прыездзе ў Буда-Кашалёва карнікаў. Партызаны зрабілі засаду і разбілі гітлераўцаў.

Падпольшчыкі наладзілі сувязь з партызанамі. Заданні ад партызан Вараб'ёва ці Курлянкова перадавалі падпольшчыку Папкову, той — Аляксандры Нагаеўскай, яна — Пятру Чарняку. Ад Пятра Чарняка звесткі даходзілі да мужа і жонкі Закрэўскіх. Буда-кашалёўскія падпольшчыкі распаўсюджвалі лістоўкі, вялі прапагандысцкую работу сярод насельніцтва гарадскога пасёлка і навакольных вёсак. Здабывалі важныя разведданыя аб ворагу, збіралі зброю і боепрыпасы на месцах нядаўніх баёў, рыхтавалі людзей да выхаду ў лес, да партызан.

У пачатку 1942 г. у Аляксандры Нагаеўскай хаваўся Уладзімір Берын. Ён быў сакратаром райкома камсамола ў Заходняй Беларусі, байцом знішчальнага батальёна. Аднойчы Пётр Чарняк паведаміў Закрэўскім, што намеснік начальніка паліцыі Макарэйка пачаў часта наведвацца да Нагаеўскай. Уладзіміру Берыну пагражаў арышт. Уладзімір Закрэўскі абсталяваў у кладоўцы хованку для У.Берына, а потым праз разведчыка Цімафея Сцепаненку пераправіў яго да партызан.

Задачы, якія стаялі перад падпольшчыкамі, ускладняліся з кожным днём. У.І.Закрэўскі змяніў прафесію настаўніка на цесляра. Хадзіў па вёсках, пашыраў круг надзейных людзей. Потым у інтарэсах падполля ён стаў хлебаробам. Атрымаў некалькі сотак вырубкі лесу за в. Сялец. Гэта дазваляла яму хадзіць у лес, не выклікаючы падазронасці. Так устанавілася яшчэ адна надзейная сувязь з партызанамі.

Але не ўсё гладка ішло ў падпольшчыкаў. Не хапала вопыту падпольнай работы. Здараліся правалы. Некаторыя з падпольшчыкаў траплялі ў рукі ворага па два разы. Двойчы быў арыштаваны У.І.Закрэўскі. Пасля другога арышту перакладчык папярэдзіў яго, каб той пакінуў райцэнтр, але зрабіць гэта яму не ўдалося. Ён зноў быў арыштаваны і адпраўлены ў Гомель.

Пасля арышту У.І.Закрэўскага ў яго доме амаль кожны дзень з'яўляліся гітлераўцы. Збівалі яго жонку Таццяну Кірылаўну, дапытваліся пра партызан. Дапытвалі і дзяцей. Малодшы з перапалоху надоўга страціў мову.

Увесну 1943 г. падпольшчыкі атрымалі заданне ад партызан — вызваліць з лагера нашых ваеннапалонных. Марыя Мазурава пазнаёмілася з аховай лагера. Усё складвалася добра. Было дамоўлена аб месцы сустрэчы вызваленых. Але нечакана ўсё сарвалася. У лес удалося ўцячы толькі васьмі ваеннапалонным. Астатніх схапілі па дарозе і адправілі ў Гомель. Некаторым з іх удалося ўцячы.

У жніўні 1943 г. у райцэнтр прывезлі вялікую групу ваеннапалонных з казахаў. Іх зачынілі ў школе, выставілі ахову. Т.К.Закрэўскай даручылі даведацца аб іх настроі і перавесці да партызан. Гэта была небяспечная работа.

Падпольшчыкі дапамаглі партызанам 1-й Гомельскай брыгады ўзарваць воданапорную вежу на чыгуначнай станцыі Буда-Кашалёва. Падпольшчыкі Вольга Банцырава і сувязны Сямён Алексін разведалі сілы і ўзброенасць варожага гарнізона. Падпольшчык дзяжурны-дублёр па станцыі Стамброўскі пасябраваў з дзяжурным немцам Генрыхам Бюнцэнталем. Міну і тол з лесу прынеслі сёстры-падпольшчыцы Марфа і Настасся Радзьковы і схавалі ў буфеце вакзала. У ноч на 13 верасня Стамброўскі, Манькоўская і Вольга Банцырава перанеслі міну з гадзіннікавым механізмам і тол у падземнае памяшканне вежы. Міну прычапілі да бочкі з бензінам, а тол паклалі ў кучу смецця. Праз гадзін пяць раздаўся моцны выбух.

І.П.Чарняк.

Падпольшчыкі вёскі Струкі

Падпольная група пад кіраўніцтвам Э.Лаўрыновіча актыўна развівала сваю дзейнасць. Партызаны збіралі зброю і хавалі яе ў Віктарынскім лесе. У лесе было ўжо некалькі баз зброі. Іх добра маскіравалі сярод маладога ельніку. Рэгулярна партызаны наведвалі свае базы. Усё было ў парадку.

Але аднойчы Віктар Кейзераў прыйшоў да Лаўрыновіча ўсхваляваны і паве-

даміў, што дзве базы са зброяй зніклі. Гэта было небяспечна. Хто мог даведацца пра сакрэтныя базы партызан? Што, калі вораг?

Лаўрыновіч загадаў сабраць некалькі чалавек і сам з імі пайшоў да месца здарэння. Агледзелі месца, але нічога не выявілі. Ноччу пайшоў снег, і ўсе сляды былі занесены.

Адна база зусім знікла, у другой засталося ўсяго некалькі вінтовак. Партызаны заляглі ў засаду. Чакалі яны доўга. Пачалі ўжо мерзнуць у мокрым снезе, як раптам пачулі непадалёк страляніну.

Стралялі з аўтамата. Партызаны насцярожыліся. Але страляніна неўзабаве сціхла і больш не аднаўлялася.

Хутка партызаны ўбачылі: да той базы, што была яшчэ не зусім разабрана, падыходзяць чацвёра хлапчукоў. Лаўрыновіч загадаў ім спыніцца, але яны кінуліся ўцякаць. Партызаны пачалі страляць угору і пабеглі ўслед за імі. Хлапчукі вымушаны былі спыніцца.

— Хто вы такія? — спытаў Лаўрыновіч. — Што робіце ў лесе?

— Мы нічога не рабілі. Прыйшлі ў лес па дровы. Мы вунь з той вёскі, — адказаў старэйшы.

— З гэтай вёскі? А што вы рабілі са зброяй? Толькі, хлопцы, не віляйце і гаварыце праўду.

Даведаўшыся, што перад імі партызаны, хлапчукі адразу павесялелі і расказалі аб усім.

Яны сапраўды былі са Струкоў, усе браты Сарокіны. Старэйшым, Лёню і Пецю, было гадоў па шаснаццаць, а малодшым — Алёшу і Валодзю — па трынаццаць.

Хлопцы задумалі пайсці ў партызаны, але ніяк не маглі іх знайсці. Тады яны вырашылі стварыць сваю падпольную юнацкую арганізацыю. Спатрэбілася зброя. Хлапчукі адразу прыняліся за справу. Яны абшукалі ўсе палі і ямы вакол вёсак і рушылі ў лес. Два дні пошукаў у лесе не далі вынікаў. Толькі на трэці дзень адзін з хлапчукоў незнарок залез пад густыя галінкі маладых елак, прыкрытыя снегам, і аж сумеўся: тут быў цэлы склад зброі!

Доўга не думаючы, пачалі выносіць знойдзеныя вінтоўкі і аўтаматы ў новае схованне. Яны знайшлі некалькі добрых мясцін пад іншымі елкамі, частку зброі схавалі нават на дрэвах.

— Вось што, хлопцы, — сказаў, выслухаўшы іх, Лаўрыновіч. — Вось вам першае баявое заданне: усю зброю, якую вы расцягнулі па лесе, зараз жа прынясці назад і скласці ўсё так, як было раней.

Радасныя і ўзбуджаныя, хлапчукі выканалі заданне. Усе чацвёра прынялі партызанскую прысягу, уступілі ў рады народных мсціўцаў. Лёню і Пецю далі зброю, яны засталіся ў атрадзе. Малодшыя — Валодзя і Алёша — сталі сувязнымі.

Валодзя і Алёша зрабілі для партызан многа карыснага. Важныя звесткі здабылі яны летам 1942 года, калі гітлераўцы рабілі па лясах блакіроўку з мэтай знішчэння партызан. У ліпені хлапчукі паведамілі, што атраду пагражае небяспека. Гэта ж пацвердзіў і другі сувязны атрада Авяр'янаў. Давялося спешна перабазіравацца. Але бой у партызан з фашыстамі ўсё ж адбыўся.

Гітлераўцы на гэтым не супакоіліся: вельмі ж дапякалі ім партызаны. Быў арыштаваны ляснічы Мартыненка, які дапамагаў партызанам. Па заданні партызан Авяр'янаў працаваў у немцаў ураднікам. У апошні час яго пачалі падазраваць у сувязях з партызанамі, але пакуль не чапалі. Фашысты праз яго хацелі даведацца пра партызанскі атрад.

Праз некалькі дзён немцы ўзнавілі блакіроўку лесу. Весці іх да партызан карнікі прымусілі Авяр'янава. Ён ведаў, дзе знаходзіцца партызанскі лагер, але на працягу некалькіх гадзін вадзіў немцаў па лесе, абыходзячы яго. Пад вечар фашысты вярнуліся ні з чым.

Партызаны супакоіліся. Стомленыя, яны адпачывалі ў лагеры. Не ведалі яны, што фашыстам дапамагае здраднік Лявонаў Кірыла, які працаваў да вайны лесніком. Ад яго фашысты даведаліся пра партызанскіх сувязных Мартыненку і Авяр'янава.

Калі партызаны адпачывалі, фашысты рушылі да партызанскага лагера. Сувязны Авяр'янаў пра гэта не ведаў. Але немцаў апярэдзілі Валодзя і Алёша Сарокіны. Яны даведаліся, што Лявонаў Кірыла здраднік і вядзе немцаў у лагер, і паведамілі аб гэтым партызанам. Карнікі не змаглі знішчыць партызанскі атрад. Цёмнай летняй ноччу група партызан на чале з Паўлавым падышла да дома здрадніка Лявонава. Яны пастукалі ў хату і загадалі Лявонаву выйсці на двор. Жонка адказала,

што яго няма дома. Партызаны ведалі, што здраднік знаходзіцца дома. Закідаць дом гранатамі было нельга, бо там былі малыя дзеці. Жонцы і дзецям Лявонава загадалі выйсці на вуліцу, а дом падпалілі. Здрадніку ўдалося вышмыгнуць з дома. Ён схаваўся на агародзе.

На другі дзень Лявонаў выдаў Алёшу і Валодзю. Гітлераўцы іх жудасна катавалі: білі ботамі, прышчэмлівалі пальцы рук дзвярыма, а потым абодвух братоў расстралялі.

Р.Казлова.

З настаўніцай на чале

У канцы жніўня 1941 г. лінія фронту адышла на ўсход. З кожным днём акупацыйны рэжым у в. Сямёнаўка станавіўся ўсё больш жорсткім. Бязлітаснасць акупантаў выклікала адчайную непрыязнасць, супраціўленне гітлераўскаму «новаму парадку» і ў дарослых, і ў падлеткаў. Яны цягнуліся да барацьбы з ненавісным ворагам. У адзіночку і невялікімі групамі збіралі зброю і боепрыпасы на месцах нядаўніх баёў. Гэта было небяспечна, любая неасцярожнасць пры абыходжанні са зброяй магла закончыцца трагічна. Да таго ж захаванне зброі каралася акупантамі смерцю. Але ўсё гэта не спыняла юных патрыётаў. Настаўніца Праскоўя Трафімаўна Хамянкова перад Вялікай Айчыннай вайной выкладала беларускую мову і літаратуру ў Сямёнаўскай школе і добра ведала пачуцці, думкі і настрой моладзі. Акупанты закрылі школу, разрабавалі калгасную маёмасць. Праскоўя Трафімаўна ўважліва прыглядалася да сваіх былых вучняў, гутарыла з імі, разумела, што пакідаць дзяцей без увагі нельга.

Кастрычніцкім днём 1941 г. жыхары выбіралі бульбу за вёскай. Раптам яны ўбачылі, як падае, не дацягнуўшы да лініі фронту, падбіты ў паветраным баі савецкі самалёт. На вачах вяскоўцаў у вышыні раскрыўся парашут. У гэты момант на шашы з'явіліся немцы і паліцаі. Што будзе з лётчыкам? Гэтая думка ўстрывожыла ўсіх. Карнікі да вечара прачэсвалі кусты на балоце, але так і не знайшлі пілота. Сярод жанчын на бульбяным полі была і Праскоўя Хамянкова. Пад покрывам ночы яна з сяброўкай Надзеяй Сауцінай адправіліся на балота, дзе яны знайшлі параненага лётчыка і перавезлі ў в. Іванаўка да Настассі Мінаўны, маці Праскоўі. Амаль тры дні выходжвалі лётчыка патрыёткі. Калі лётчык ачуняў, сабралі яго ў дарогу: ён рушыў на ўсход.

Вучні дапамаглі настаўніцы адрамантаваць радыёпрыёмнік, па якім уначы слухалі Маскву, запісвалі зводкі Савецкага інфармбюро. На сядзібе Настассі Мінаўны абсталявалі тайнік. Там настаўніца друкавала на пішучай машынцы лістоўкі са зводкамі. Юныя памочнікі распаўсюджвалі іх сярод жыхароў навакольных населеных пунктаў: Уза, Рудзянец, Ціхінічы, Камунар, Асобіна, Акцябр, Ліпа і інш. Так у Сямёнаўцы пачала складвацца падпольная арганізацыя.

Штуршком для больш арганізаванай падпольнай барацьбы стала з'яўленне ў Сямёнаўцы Івана Канцавога і Леаніда Кавальскага. Іван Канцавы 18-гадовым юнаком пайшоў на фронт. У час цяжкіх баёў трапіў у акружэнне, дабраўся дадому. Леанід Кавальскі, сяржант Чырвонай арміі, таксама выбраўся з акружэння і спыніўся ў Сямёнаўцы. У жніўні яго падраздзяленне трымала абарону каля гэтай вёскі, тады ён пазнаёміўся тут з дзяўчынай. Яна і прытуліла акружэнца ў сваёй хаце.

Пад уплывам Хамянковай склалася падпольная камсамольска-маладзёжная арганізацыя, у якую ўвайшлі Іван Канцавы, Леанід Кавальскі, Іван Сіўцоў, Васіль Капралаў, Аляксандр Кабкоў. Сакрата-

П.Т.Хамянкова.

Н.М.Сауціна.

І.Ф.Канцавы.

Л.М.Кавальскі.

В.Н.Капралаў.

І.Х.Сіўцоў.

Е.А.Дударава.

Л.Я.Шапоцька.

ром абралі Івана Канцавога. З часам група павялічылася да дваццаці чалавек. Ядром групы стаў узброены атрад з пяці чалавек на чале з Леанідам Кавальскім. Патрыётам удалося знайсці сховішча боепрыпасаў: каля 30 вінтовак, 2 кулямёты, больш як 50 гранат, 5 скрыняў толу і 2 скрыні дэтанатараў, пісталеты, шмат патронаў і рацыю. Падпольшчыкі стварылі і другую ўзброеную групу з дванаццаці чалавек, якую ўзначаліў Уладзімір Калашнікаў.

Падпольная арганізацыя ахапіла сваёй дзейнасцю шэраг населеных пунктаў былога Уваравіцкага раёна: вёскі Рудзянец, Ціхінічы, Асобіна, станцыю Уза Буда-Кашалёўскага раёна, вёскі Чачэрскага і Гомельскага раёнаў. Пад пільную ўвагу падпольшчыкаў трапіў адрэзак чыгункі ад Касцюкоўкі да Радзеева і пасёлак торфазавода «Бальшавік», дзе яны пачалі ажыццяўляць дыверсіі.

Першая вылазка баявой групы адбылася непадалёку ад Касцюкоўкі. Аперацыяй кіраваў Леанід Кавальскі. Да чыгункі разам з ім пайшлі Іван Канцавы, Іван Сіўцоў, Васіль Капралаў і Аляксандр Кабкоў. Разведку і падрыхтоўку месца засады правялі загадзя. Калі сцямнела, занялі зручную агнявую пазіцыю ў хмызняку каля насыпу чыгуначнага палатна. Ва ўсіх былі вінтоўкі. Пачуўся гул цягніка. Гэта быў нямецкі састаў з бензінам, які ішоў на фронт.

— Страляць па маёй камандзе. Пасля трэцяга залпу адыходзім! — загадаў Кавальскі.

Як толькі перад хлопцамі паказаліся цыстэрны, тройчы з невялікімі інтэрваламі прагучалі стрэлы. Праз прабоіны з цыстэрнаў пацёк бензін. Каля станцыі Радзеева да абстрэлу цыстэрнаў далучыліся яшчэ пяць падпольшчыкаў.

Дыверсіі на чыгунцы прыносілі акупантам шмат страт. Фашысты ўзмацнілі ахову дарогі, іншых ваенных аб'ектаў. Тады падпольшчыкі ўстанавілі сувязь з чыгуначнікамі на станцыі Уза. Праз стрэлачніка Ігната Ягоравіча Сіўцова перадалі ім узрыўчатку. Праз дзень на станцыі быў узарваны паравоз і некалькі цыстэрнаў з палівам. На чыгунцы каля в. Ціхінічы патрыёты з Узы падарвалі нямецкі вайсковы эшалон узрыўчаткай, якую ім перадала група Уладзіміра Калашнікава. Ён і сам удзельнічаў у гэтай аперацыі.

Падпольшчыца Ефрасіння Дударава, былая старшая піянерважатая Сямёнаўскай школы, выратавала жыццё траім цяжка параненым чырвонаармейцам. Яна хавала іх на гарышчы сваёй хаты, даглядала, лячыла. Потым яны рушылі на ўсход. Падпольшчыца Аляксандра Беланожка (Дударава) і яе маці таксама хавалі і як маглі лячылі ў сваім доме цяжка параненага са-

вецкага байца. Гэта быў Яўген Андрэевіч Баравы, якога ў верасні 1941 г. у непрытомным стане падабралі жанчыны ў кустах каля шашы.

Акупанты прымушалі мясцовых жыхароў вазіць торф з торфазавода «Бальшавік» на электрастанцыю ў Гомель. Падпольшчыкі засоўвалі ў торф замаскіраваную ўзрыўчатку. Аднойчы ад выбуху выйшаў са строю кацёл электрастанцыі. Пад бокам у нямецкай камендатуры, якая знаходзілася ў пасёлку торфазавода, падпольшчыкі спалілі на балоце некалькі штабялёў торфу.

Падпольшчыкі імкнуліся звязацца з партызанамі. Але гэта, на жаль, не адбылося. Іх выдаў здраднік, які назваў прозвішчы 24 чалавек. Пачаліся арышты. Спачатку арыштаваных трымалі ва Уваравічах, затым — у гомельскай турме. Цяжкія катаванні, жудасныя здзекі выпалі на долю падпольшчыкаў.

У нядзелю 14 чэрвеня 1942 г. у в. Сямёнаўка фашысты павесілі каля школы Івана Канцавога, Аляксандра Кабкова, Івана Сіўцова і Леаніда Кавальскага. Віселі яны на шыбеніцы да 10 гадзін наступнага дня. Пахаваць іх на могілках нямецкія ўлады не дазволілі. Таму іх пахавалі ў брацкай магіле каля чыгункі.

Праз некалькі дзён карнікі забілі Праскоўю Хамянкову, яе маці Настассю Мінаўну Хамянкову, Яўмена Літвінава, якіх схапілі ў Іванаўцы. Васіля Капралава, Леаніда Шапоцьку, Анатоля Губанава, Мікалая Гладунова, Уладзіміра Калашнікава, Аляксандра Скарыну, Мікалая Скарыну, Анатоля Сяргеенку, Івана Стольнікава гітлераўцы расстралялі ў Гомелі, у ляску каля Давыдаўкі.

У 1967 г. на магіле чатырох павешаных падпольшчыкаў быў устаноўлены помнік. У Рудзянецкай сярэдняй школе арганізаваўся атрад «Пошук», які я ўзначаліў. Юныя следапыты сабралі шматлікія матэрыялы пра дзейнасць падпольнай арганізацыі.

8 мая 1976 г. ў в. Іванаўка Цярэніцкага сельсавета Гомельскага раёна на доме, дзе 20 кастрычніка 1918 г. нарадзілася Праскоўя Трафімаўна Хамянкова, была ўстаноўлена мемарыяльная дошка, вуліцу Гомельскую перайменавалі ў вуліцу Праскоўі Хамянковай. У 1981 г. у пасёлку Уза побач з будынкам сярэдняй школы ўзведзены помнік мужным падпольшчыкам в. Сямёнаўкі і іх баявым сябрам: фігура дзяўчыны ў поўны рост, якая ва ўзнятай руцэ трымае факел, сімвал барацьбы за свабоду. Ім жа прысвечана дакументальная аповесць Адама Сцепаненкі «Да апошняга дыхання», якая выйшла ў выдавецтве «Беларусь» у 1975 г.

С.Ц.Пігулеўскі.

А.Ф.Губанаў.

М.А.Гладуноў.

У.С.Калашнікаў.

А.С.Скарына.

А.Сяргеенка.

Падпольныя органы, якія дзейнічалі на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна

БУДА-КОШЕЛЕВСКИЙ ПОДПОЛЬНЫЙ РАЙКОМ КП(б)Б (3.1943—23.11.1943)

В марте 1943 года в Буда-Кошелевский район Гомельским подпольным обкомом КП(б)Б был направлен в качестве уполномоченного обкома партии С.И.Касьянов [до войны первый секретарь Ново-Белицкого райкома КП(б)Б города Гомеля, остался в тылу врага в августе 1941 года вместе с обкомом и Гомельским горкомом КП(б)Б].

15 мая 1943 г. С.И.Касьянов представил в подпольный обком партии на утверждение состав организованного им Буда-Кошелевского подпольного райкома КП(б)Б: С.И.Касьянов — первый секретарь райкома партии, Г.Е.Стриков — второй секретарь, комиссар партизанского отряда им. В.П.Чкалова; члены — секретарь партбюро партизанского отряда им. М.И.Кутузова Б.М.Гейфман, комиссар партизанского отряда им. М.И.Кутузова А.Н.Демченко, комиссар партизанского отряда им. В.И.Чапаева А.Т.Денисенко.

В августе 1943 г. на базе партизанских отрядов им. М.И.Кутузова, им. В.П.Чкалова и других была организована 1-я Буда-Кошелевская партизанская бригада под командованием А.Н.Демченко. В сентябре 1943 г. партизанский отряд им. В.И.Чапаева был развернут в партизанскую бригаду им. В.И.Чапаева, комиссаром которой назначили С.И.Касьянова.

Члены подпольного райкома КП(б)Б С.И.Касьянов и А.Т.Денисенко находились в партизанской бригаде им. В.И.Чапаева, а Г.Е.Стриков, Б.М.Гейфман и А.Н.Демченко — в 1-й Буда-Кошелевской партизанской бригаде.

СОСТАВ ПОДПОЛЬНОГО РАЙКОМА КП(б)Б

Секретари: Касьянов Стефан Иванович (3.1943 — 23.11.1943 — первый секретарь), Стриков Григорий Ефимович (15.5.1943 — 3.10.1943 — второй секретарь); члены райкома: Гейфман Броня Мееровна (15.5.1943 — 3.10.1943), Демченко Алексей Николаевич (15.5.1943 — 3.10.1943), Денисенко Андрей Титович (15.5.1943 — 23.11.1943).

Печатный орган подпольного райкома КП(б)Б — газета «Ленінскі шлях». Редактор — Ковалев Константин Сергеевич.

УВАРОВИЧСКИЙ ПОДПОЛЬНЫЙ РАЙКОМ КП(б)Б (1.3.1943—23.11.1943)

В марте 1943 года секретарь Гомельского подпольного обкома КП(б)Б И.П.Кожар назначил второго секретаря Ново-Белицкого райкома КП(б)Б В.В.Юдина секретарем Уваровичского райкома партии. Члены райкома утверждены 5 июня 1943 года. Райком базировался в партизанском отряде им. Н.А.Щорса. В сентябре 1943 года отряд был реорганизован в партизанскую бригаду им. Н.А.Щорса (комбриг А.П.Байков, комиссар В.В.Юдин).

СОСТАВ ПОДПОЛЬНОГО РАЙКОМА КП(б)Б

Секретарь — Юдин Вячеслав Васильевич (1.3.1943 — 23.11.1943); члены райкома: Духвалов Денис Тихонович (5.6.1943 — 23.11.1943), Шкрабышев Петр Федорович (5.6.1943 — 23.11.1943).

Печатный орган подпольного райкома КП(б)Б — газета «Калектывіст».

Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941 — 1944): Краткие сведения об организации, структуре и составе. Мн., 1975. С. 133 — 134, 144 — 145.

БУДА-КОШЕЛЕВСКИЙ ПОДПОЛЬНЫЙ РАЙКОМ ЛКСМБ (1.6.1943—25.11.1943)

До создания подпольного райкома комсомольской работой в районе руководил Гомельский подпольный обком комсомола, а с октября 1942 года уполномоченный ЦК ЛКСМБ по району Н.И.Бортник.

Подпольный райком комсомола создан Гомельским подпольным обкомом ЛКСМБ 1 июня 1943 года. Основная база райкома находилась в партизанской бригаде им. В.И.Чапаева (командир Н.Д.Стефанович, комиссар С.И.Касьянов) и в 1-й Буда-Кошелевской бригаде (командир А.Н.Демченко, комиссар С.П.Каспрук) в Буда-Кошелевском районе.

СОСТАВ ПОДПОЛЬНОГО РАЙКОМА ЛКСМБ

Секретари: Бортник Николай Иосифович (1.6.1943 — 25.11.1943), Хоняк Михаил Егорович, секретарь по пропаганде (1.6.1943 — 25.11.1943); члены райкома:

Синева Вера Александровна (1.6.1943–25.11.1943), Степаненко Тимофей Федорович (1.6.1943–25.10.1943), Севастенко Митрофан Петрович (1.6.1943–8.1943, погиб).

УВАРОВИЧСКИЙ ПОДПОЛЬНЫЙ РАЙКОМ ЛКСМБ (5.1943—27.11.1943)

До создания подпольного райкома комсомольской работой в районе руководил Гомельский подпольный обком комсомола, а с июля 1942 г. уполномоченная ЦК ЛКСМБ по Уваровичскому району Е.С.Соловьева. Подпольный райком комсомола приступил к работе в мае 1943 г. Его основная база находилась в партизанской бригаде им. Н.А.Щорса (командир А.П.Байков, комиссар В.В.Юдин) в Уваровичском районе.

СОСТАВ ПОДПОЛЬНОГО РАЙКОМА ЛКСМБ

Секретари: Соловьева Ефросиния Сергеевна (5.1943–27.11.1943), Карловский Степан Иванович (секретарь по пропаганде; 5.1943–27.11.1943); члены райкома:

С.І.Касьянаў.

М.І.Бортнік.

Кочкин Павел Федорович (5.1943–27.11.1943), Коцур Сидор Иосифович (5.1943–27.11.1943), Юдин Вячеслав Васильевич (5.1943–27.11.1943).

Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (1941–1944): Краткие сведения об организации, структуре и составе. Мн., 1976. С. 170, 180.

Па закліку сэрца

З успамінаў В.В.Юдзіна, былога сакратара Уваравіцкага падпольнага райкома КП(б)Б

ЮДЗІН Вячаслаў Васільевіч, нарадзіўся ў 1908 г. у г. Ліда Гродзенскай вобласці. Член КПСС з 1930 г. Да Вялікай Айчыннай вайны — другі сакратар Навабеліцкага РК КП(б)Б Гомельскай вобласці. У гады вайны — камандзір узвода, начальнік штаба гомельскага партызанскага атрада «Бальшавік», камандзір партызанскай брыгады імя М.А.Шчорса, адначасова сакратар Уваравіцкага падпольнага РК КП(б)Б. Пасля вайны на кіруючай партыйнай і савецкай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі. Памёр у 1978 г.

Полтора года я воевал в Гомельском отряде «Большевик». И вот в марте 1943 года меня вызвали в деревню Гавеновичи Речицкого района к секретарю подпольного обкома партии командиру соединения Илье Павловичу Кожару.

Мы были знакомы с довоенного времени. Илья Павлович поинтересовался моим здоровьем, настроением и после недолгой беседы предложил:

— Надо тебе возглавить Уваровичский подпольный райком партии.

Затем он рассказал о положении дел в районе, разъяснил ближайшие и последующие задачи.

Сразу по возвращении из штаба соединения я отправился в партизанскую группу А.П.Байкова, где предстояло базироваться Уваровичскому райкому. По указанию ЦК КП(б)Б она прибыла из советского тыла в ноябре 1942 года и к моему приходу значительно выросла — насчитывала уже около 50 проверенных бойцов. Группа продолжала пополняться за счет местного населения и в марте 1943 года оформилась в отряд имени Н.А.Щорса (командир А.П.Байков, комиссар Д.Т.Духвалов).

В июне 1943 года Дениса Тихоновича Духвалова и Петра Федоровича Шкробышева утвердили членами райкома партии. Обязанности между ними распределили так: Духвалову поручалось руководство массово-политической работой среди партизан и местного населения, создание скрытых партизанских резервов, а Шкробышев отвечал за боевую деятельность отряда.

В.В.Юдзін.

Развитие партизанского движения в районе, проведение боевых операций, работа среди местного населения всегда были в центре внимания райкома партии. В июле 1943 года, например, мы заслушали доклад командира отряда А.П.Байкова о действиях подрывников. На заседании отмечалось, что командование и парторганизация проделали большую работу. Систематически проводятся диверсии на вражеских коммуникациях, другие смелые боевые операции. Пущено под откос несколько эшелонов противника, взорвано более 10 шоссейных и железнодорожных мостов, сожжены работавшие на оккупантов Крывский льнозавод, Чеботовичский и Крывский маслозаводы, Речицкий сенопрессовальный завод с большим количеством готовой продукции, уничтожено более двух километров линий связи и т.д. Но выявлены и недостатки. Из 32 коммунистов в диверсионной работе участвовали только 6. Слабо использовались для обучения партизан товарищи, окончившие курсы подрывников-минеров. В отряде не распространялся опыт лучших.

Райком предложил организовать в каждой роте изучение подрывного дела с привлечением квалифицированных минеров, создать дополнительные диверсионные группы во главе с коммунистами и комсомольцами, добиваться, чтобы их боевые действия на объектах противника были эффективными.

С весны 1943 года штаб Гомельского партизанского соединения регулярно получал по воздуху с Большой земли оружие, боеприпасы, взрывчатку, которые направлял в отряды и бригады. Мы имели возможность наносить сильные удары по вражеским коммуникациям и использовали их сполна.

В марте 1942 г. Демченко и Лавринович совместно с группой подобранных людей, взяв оружие, ушли в лес и создали партизанский отряд. Рогинский и Лозовский леса, болота Белицы стали основным местом базирования отряда. Небольшой в это время партизанский отряд поставил перед собой задачу заняться диверсионной и террористической деятельностью, беспощадно уничтожать немцев, предателей, ставших на службу им.

В отряд стали добровольно приходить люди. Отбор их происходил после тщательной проверки посредством связных, агентурной разведки и другими путями. Этим занимался лично Демченко.

Вести боевые действия и разворачивать партизанскую борьбу без связи с населением было невозможно. Демченко лично сам, зная расположение района и людей, стал связываться сначала с родственниками, а затем и другими людьми. Население, узнав о пребывании в их местности партизан, относилось по-разному. Многие, невзирая на то, что предпринималось немецкими властями за связь с партизанами, не считаясь со своей жизнью, всеми силами старались помогать им в начавшейся борьбе. Например, Демченко лично решил разведать деревню Лозов и узнать обстановку. Когда он зашел в квартиру Борисовой, в это время в деревню приехал немецкий карательный отряд по борьбе с партизанами. Немцы стали расквартировываться по домам. Мария Борисова предприняла все меры к тому, чтобы спасти жизнь комиссара отряда. Она спрятала его в своем доме, и, несмотря на присутствие в доме немцев, Демченко не пострадал. Получив необходимые сведения, он возвратился в отряд.

Для разведки обстановки в д.Закревье был направлен Григорий Карпак. Когда он зашел в дом к Гарпине Герасимовой, внезапно наскочила полиция, и дом был окружен. Колхозница не струсила и вместе с Григорием вступила в бой с полицией. Они оба пали смертью храбрых, но живыми не сдались.

Враг стал усиливать свои гарнизоны, карательные полицейские отряды и насаждать изменников, которые стали свирепствовать по Буда-Кошелевскому району. Несмотря на это, партизаны стали усиливать работу среди населения. Эту работу сначала приходилось проводить путем разъяснения населению сущности и правоты этой войны и роли партизанского движения. Это давало свои результаты. Отряд стал пополняться людьми, стала большая сеть связных и агентурной разведки. Первые боевые подвиги партизанского отряда, жестокая расправа с изменниками Родины, события на фронте обеспечили успешный рост бригады.

Еще в июне 1942 года немцы, видя силу партизанской борьбы, начали блокировать леса, где находился наш отряд. Указанный изменником Леоновым наш лагерь был разбит, а мы с боем вышли из него. Более 2 недель не представлялась возможность выхода из леса.

27 сентября 1942 г. в эти леса с группой партизан прибыл т.Коротчиков, заявив, что он послан по решению ЦК для организации партизанского отряда. Но в виду неблагоприятных условий он забрал людей, ушел в Брянские леса и присоединился к соединению Федорова. Демченко остался в Буда-Кошелевских лесах с малой группой, но находиться здесь становилось опасно. Тогда я в январе 1943 г. послал Матюшкова связаться с отрядом Лебедева и Дикана, которые находились в это время в Кличевских лесах.

К этому времени немцы, собрав изменников и полицейские гарнизоны, в феврале 1943 г. опять предприняли блокаду этих лесов... Наш лагерь был обнаружен и разбит. В ожесточенных боях погибло 7 партизан. Оставшиеся партизаны с боем вышли из блокады, и я стал двигаться в Кличевские леса, т.к. в суровые февральские морозы нельзя было подыскать в этих малых лесах лагерь. Однако связь с Матюшковым была прервана, т.к. он был задержан в отряде Лебедева. И только 4 марта я встретился в Каменских лесах с Журавичским партизанским отрядом Белых и Дикана. Встретившись с ними, я решил принять все меры, чтобы объединиться с ними и создать бригаду, а из моей группы организовать партизанский отряд на Буда-Кошелевский район. Инициатива моя была поддержана, и 17 марта 1943 г.

был создан партизанский отряд № 263, командиром был назначен Матюшков, комиссаром стал я, начальником штаба — Финадеев. Народ стал вливаться в наш партизанский отряд. За два дня, с 17 по 19 марта, в отряде насчитывалось до 60 чел. с 45 винтовками и 3 ручными пулеметами...

5 августа из отряда им. Кутузова, ввиду его роста, в составе 450 чел., выделена 1-я Буда-Кошелевская бригада, в состав которой вошли: 263 отряд им. Кутузова, 262 отряд им. Чкалова, 108 отряд им. Котовского. Командиром бригады назначен Демченко, комиссаром — Каспрук. Помимо этого из состава бригады выделен вновь организованный отряд им. Рокоссовского.

Командир бригады Демченко.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 212. Л. 23—26.

АПІСАННЕ ЛОЗАЎСКАГА БОЮ З ГІСТОРЫІ 1-й БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ

1944 г.

29 апреля 1943 г. разведка донесла, что в д. Лозов сконцентрировались крупные немецкие силы и утром начнут блокаду леса, где находились несколько партизанских отрядов бригады Дикана. Главный удар немцы рассчитывали нанести со стороны д. Лозов. В 9 утра начался бой. Отряд Матюшкова занял свою позиционную оборону. Враг открыл ураганный артиллерийско-минометный огонь. После артподготовки враг со стороны болота Белицы пустил в атаку кавалерию. После этого в атаку ринулась пехота, она поддерживалась артиллерийско-минометным и пулеметно-автоматным огнем. Но партизаны не дрогнули. Разбили врага метким шквальным ружейно-пулеметным и минометным огнем. Враг, видя упорное сопротивление партизан и огромные потери в живой силе, бросил на помощь танки и бронемашины. Но и это не испугало партизан. Когда бронемашины подходили к лесу вплотную, подавалась команда — бронебойный огонь! Одна бронемашина заглохла. Экипаж старается спастись, выпрыгивает из машины, но их настигли партизанские пули.

С 9 часов утра до 10 часов вечера длился бой. Враг окружил Лозовский лес и пытался ворваться в него. Многие атаки на основном участке, где был расположен наш отряд, с успехом отбивались мужественными партизанами. Бойцы и командиры героически дрались с немецко-фашистскими оккупантами, расстреливая их в упор ружейно-пулеметным и минометным огнем. В этом бою особенно отличилась 2-я рота отряда во главе с командиром роты Кондратенко и политруком Жаркиным, взвод Такмачева первой стрелковой роты. В день боя отряд уничтожил 370 немцев, ранил 200. Всего немцы потеряли: убито 689 и более 1000 ранено. Смертью храбрых пали партизаны: Мищеренко В., Павлючков В.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 212. Л. 67—70.

Па старонках партызанскіх газет

«Ленінскі шлях» — орган Буда-Кашалёўскага падпольнага райкома КП(б)Б

16 жніўня 1943 г.

СЛОВА — ЗБРОЯ

З выключнай увагай, з вялікай цікавасцю адносіліся мы да бягучых падзей на франтах. Ды гэта і зразумела. Пераможныя поспехі Чырвонай Арміі радуюць і натхняюць нас на новыя баявыя справы. Партыйная арганізацыя нашага раёна, улічваючы жаданне мас, праводзіць масава-палітычную работу як сярод партызан, так і сярод насельніцтва.

Асабліва добра пастаўлена работа ў роце, дзе палітруком Іван Е. Байцы кожны дзень асведамлены аб становішчы на фронце і падзеях у міжнароднай абстаноўцы. Як вынік, у падраздзяленнях роты існуе моцная дысцыпліна і высокая баявая здольнасць.

На высокі ўзровень пастаўлена паліт-масавая работа ў атрадзе «Чырвоны партызан». У апошні час тут праведзена 36 гутарак, 9 дакладаў.

У атрадзе імя Чапаева з лепшых камсамольцаў створаны групы агітатараў, якія пастаянна знаёмяць насельніцтва з паведамленнямі Саўінфармбюро, право-

дзяць чыткі газет, гутаркі. Вялікім аўтарытэтам сярод насельніцтва карыстаюцца агітатары Вера С., Пецця Т., Мікалай Б., Міхаіл Д., Іван Н. Іх гутаркі насычаны канкрэтнымі прыкладамі, праходзяць жыва і цікава.

Там, дзе насельніцтва ахоплена масава-палітычнай работай, мацней сувязь з партызанамі, яно аказвае нам усямерную падтрымку.

Сцяпан К., сакратар Буда-Кашалёўскага РК КП(б)Б.

НЯШЧАДНА ПОМСЦІЦЬ ВОРАГУ

За 2-ю палову ліпеня месяца падрыўная група пад камандаваннем Віктара К. пусціла пад адхон 3 вайсковыя эшалоны. Віктар малады яшчэ падрыўнік, але кожны месяц лік пушчаных ім паяздоў павялічваецца. Баявая вывучка яго ўдасканальваецца, ён дасягае ўсё вышэйшай віртуознасці.

У ноч з 15 на 16 ліпеня ім быў узарваны вайсковы эшалон. Знішчаны паравоз і 15 вагонаў з боепрыпасамі.

Яшчэ не паспелі немцы ачысціць дарогу ад абломкаў гэтага эшалона, як назаўтра гэта група зноў пусціла пад адхон эшалон. Ператварыліся ў груду абломкаў паравоз, 2 платформы і 4 вагоны з боепрыпасамі. Увесь абслугоўваючы персанал эшалона змяшаўся з боепрыпасамі. Таго ж дня разведка наглядала з узгорка, як на працягу цэлага дня немцы расцягвалі абломкі эшалона, ачышчаючы чыгунку.

Праз некалькі дзён, у ноч з 24 на 25 ліпеня, група зноў пусціла пад адхон эшалон, які рухаўся да фронту. 14 платформ з зенітнымі пушкамі, вагоны з фрыцамі і паравоз са страшэнным грукатам апынуліся ў адкосе дарогі.

У гэтай падрыўной групе акрамя Віктара адлічыліся сваёй адвагай, майстэрствам міпіравання, вынаходніцтвам Павел З., Андрэй В., а ў нясенні патрульнай аховы і разведкі — Аляксей К. і Леанід К.

Так падрыўнікі з атрада імені Чапаева няшчадна помсцяць нямецкім акупантам за знішчаныя гарады і вёскі, за здзекі над нашым народам.

Міхаіл Д.

ПІЛЬНАСЦЬ І АДВАГА – ЗАЛОГ ПЕРАМОГІ.

Выканаўшы баявую задачу, партызаны вярталіся дадому. Яны зрабілі прывал каля вёскі Г., не ведаючы, што іх праследуюць звыш 100 гітлераўцаў. Дзякуючы пільнасці, вартавы, які ахраняў пакой сваіх таварышаў, своечасова заўважыў падпаўзаўшых гадаў. Завязалася баявая схватка.

Трапна страчыў кулямёт Хады Х. Адзін за другім лажыліся падкошаныя гвалтаўнікі.

Стойка вытрымалі партызаны няроўны бой і без сваіх страт знішчылі звыш 20 фрыцаў.

Так змагаюцца партызаны нашага атрада.

М.Н.

УДАР З ЗАСАДЫ

Ад мясцовых жыхароў мы даведаліся, што некалькі мадзьяр паехалі ў напрамку Буда-Кашалёва і праз 2-3 гадзіны будуць вяртацца назад. Нядоўга разважаючы, залягаем у засаду. Не прайшло і двух гадзін, як Валодя Т. заўважыў набліжаючыхся чужынцаў. Падпусціўшы іх зусім блізка, Валодзя крыкнуў: «Кідай зброю». Спалоханыя ад нечаканасці мадзьяры ў паніцы сталі страляць куды папала.

«Бей гадаў!» — крыкнуў камандзір групы Мікалай С.

У адзін момант я злавіў на мушку афіцэра. Са звярыным ровам гэты вырадак зваліўся ў канаву. Трапная партызанская куля пранзіла яму грудзі. Пачуліся яшчэ стрэлы і разрыў гранаты. Гэта партызаны дабілі афіцэра і паранілі салдата.

Дарэмна мадзьяры, прыехаўшыя на дапамогу, яшчэ доўга стралялі з кулямётаў па лесе.

Міхаіл Т., атрад імя Кутузава.

26 жніўня 1943 года

ПАРТЫЗАНСКАЯ ПОМСТА

У вёску Ч.-В. прыехала паліцыя рабаваць жыхароў.

На выручку сялян падаспелі партызаны. Нечаканасць іх нападу выклікала ў стане ворага паніку.

Увагу партызан прыкавала стральба з сарая. Адтуль біў пагарджаны здраднік, забойца дзесяткаў савецкіх людзей Шорын. Бясстрашна ўварваўся ў сарай фурманавец Мікалай Л. Ён знішчыў ворага і забраў трафеі.

У гэтым баі партызаны знішчылі 17 паліцаяў і 13 захапілі ў палон.

Міхаіл Д.

7 верасня 1943 года

НЯСПЫННА РАСЦЁМ

У адказ на зварот франтавікоў-беларусаў насельніцтва нашага раёна адказвае новым прылівам у рады народных мсціўцаў. За жнівень месяц у атрад імя Фурманава прыйшло 40 патрыётаў, а ў атрад імя Чапаева — 56.

Уступаючыя ў нашы рады заяўляюць:

— Поспехі Чырвонай Арміі натхняюць нас на баявыя дзеянні. Мы жадаем са зброяй у руках помсціць нямецкім акупантам за здзекі і пакуты свайго народа.

Міхаіл Д.

ПОМСТА КАТАМ

Не любяць у нас, калі падоўгу залежваецца тол. Падарваўшы адзін эшалон, група імкнецца падарваць другі. Мы адпраўляемся выконваць баявую задачу на чыгунцы. Пачуўшы прыбліжэнне эшалона, я і Іван К. закладваем міну пад рэйкі. Адышоўшы, чакаем. З гары на вялікай хуткасці ідзе поезд. Яркае полымя ад страшэннага ўзрыву разрэзала начную цемру. З грохатам і лязгам паляцела ў адхон 36 вагонаў і паравоз. З-пад абломкаў падабралі 80 забітых і 130 параненых фрыцаў.

Міхаіл П., атрад імя Кутузава.

МЫ НЕ БУДЗЕМ РАБАМІ

Шчаслівa і радасна жыло насельніцтва нашай вёскі. Грамадой працавалі мы на сваіх калгасных палях. Усяго нам хапала. Усе нашы дзеці вучыліся.

З прыходам нямецкіх акупантаў замерла ўсё гэта жыццё. Паганыя гітлераўцы затапталі наша шчасце. Гвалт і рабаванне — гэта ўсё, што яны нам прынеслі.

Многа дзён падрад налятаў сцярвятнік на нашу вёску трэніравацца ў паджогах і забойствах. Кроў стыне ў жылах, сэрца сціскаецца ад болю, калі замест хат зараз бачым папялішчы, замест багацця і радасці — пакуты.

— У мяне спалілі немцы будынкі, усё дабро, — гаворыць Параска А. — Зараз я вымушана туліцца ў зямлянцы. Але мяне не пакідаюць надзеі на будучыню. Не падняволяць яны нас, мы ніколі не будзем іх рабамі. Я глыбока веру ў тое, што наша Чырвоная Армія, у якой мой муж з першага дня вайны, ніколі не даруе гвалтаўнікам усіх гэтых здзекаў і разбоя.

— Мае два сыны і два зяці ў Чырвонай Арміі, а трэці сын і ўнук у партызанах. Яны адпомсцяць фашыстам за ўсе мае пакуты і знявагі, — з гонарам запэўнівае Х. — Мы ўсім, чым толькі можам, дапамагалі і будзем дапамагаць партызанам у іх барацьбе з акупантамі.

Сяляне Н-скай вёскі Яфім К., Максім Е., Пракоп Х., Параска А.

«Калектывіст» — орган Уваравіцкага падпольнага райкома КП(б)Б

20 верасня 1943 года

УЗМАЦНІМ УДАРЫ ПА ВОРАГУ

Партызанскі атрад імені Шчорса за апошнія шэсць месяцаў вырас колькасна ў 9 раз, узброіўся галоўным чынам за лік трафейнай зброі, палітычна акрэп і стаў грознай сілай для фашысцкіх захопнікаў.

За час свайго існавання атрад пусціў пад адхон 37 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка, у выніку чаго знішчана 38 паравозаў і 345 вагонаў, узарвана 2 чыгуначных і спалена 19 мастоў па шасейных і грунтовых дарогах, узарвана 195 рэек, знішчана 15 600 метраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі, знішчана 6 варожых аўтамашын.

Акрамя гэтага, партызаны атрада разграмілі 6 паліцэйскіх участкаў, знішчылі 7 прадпрыемстваў, якія працавалі на карысць ворага. Паляўнічыя групы, створаныя па ініцыятыве камсамольскай арганізацыі, забілі з засад 16 нямецкіх салдат, афіцэраў і паліцэйскіх.

Толькі за 18 дзён верасня пушчана пад адхон 14 варожых эшалонаў, разбіта 14 паравозаў і 97 вагонаў з жывой сілай і тэхнікай, спалена 4 масты, знішчана 1800 метраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі, узарвана 98 рэек.

Гэтыя ўдары з кожным днём узмацняюцца.

Дзяніс Д.

ДАСТОЙНА СУСТРЭНЕМ 25-Ю ГАДАВІНУ ВЛКСМ

З чэсцю выконваюць абавязацельствы камсамольцы атрада імені Шчорса, рыхтуючыся дастойна сустрэць 25 гадавіну Ленінска-Сталінскага камсамола.

Зараз на рахунку камсамольска-маладзёжнай групы маецца 8 знішчаных варо-

жых эшалонаў, узарвана 98 рэек, знішчана 4 масты на грунтовых дарогах, знішчана 1800 метраў тэлефоннай сувязі, выплаўлена 60 кг толу.

Усё гэта гаворыць за тое, што ўзятыя абавязацельствы камсамольцамі з чэсцю выконваюцца.

Але не патрэбна астанаўліваіца на дасягнутым. Яшчэ вышэй паднімем баявую актыўнасць у барацьбе з фашызмам! Яшчэ мацней ударым па тылах ворага.

Усімі сіламі дапаможам наступаючай Чырвонай Арміі ў вызваленні нашай Радзімы.

Сцяпан К.

1 кастрычніка 1943 года

ПАРТЫЗАНСКАЯ ПРЫСЯГА

Стройна стаяць байцы падраздзялення і слухаюць глыбокія па зместу і блізкія сэрцу словы партызанскай прысягі.

«Я — сын гераічнага беларускага народа», — гучаць гордыя словы чытаючага прысягу. І ў памяці ўсплываюць эпізоды гераічнай барацьбы беларускага народа з нямецка-фашысцкімі разбойнікамі, парушыўшымі спакой і мірнае жыццё нашага народа, жадаўшых заняволіць свабодалюбівы беларускі народ.

Гнеўным і цвёрдым голасам чытаюцца словы клятвы помсціць за спаленыя вёскі, за кроў бацькоў і матак, за кроў тысяч нявінных жанчын і дзяцей. Гэтыя словы выклікаюць частае біенне сэрца. У памяці ўсплываюць жудасныя малюнкі папялішч з грудамі абгарэўшых цел, калодзежы, заваленыя трупамі, зажыва закопаныя старыя, жанчыны, дзеці. Рука сціскае вінтоўку, у вачах рашучасць да барацьбы.

У паветры над лесам чуецца гурчанне фашысцкага самалёта. Але рады не скалыхнуліся, не змяніўся голас прынімаючага прысягу, бо кожны ведае, што недалёкі той час, калі беларускае паветра будзе ачышчана ад фашысцкіх сцярвятнікаў, апаганеная беларуская зямля зноў зацвіце радасным, свабодным жыццём.

Мацвей В.

Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.

Партызанскія камандзіры

БАЙКОЎ Андрэй Пракопавіч, нарадзіўся ў 1915 г. у в. Пясочная Буда Гомельскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну камандзір партызанскага атрада, потым партызанскай брыгады імя М.А.Шчорса. Пасля вайны працаваў у Веткаўскім раёне намеснікам старшыні райвыканкома, старшынёй арцелі «Чырвоны тэкстыльшчык», дырэктарам бавоўнапрадзільнай фабрыкі, гарпаліва.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр 22.12.1987 г. Пахаваны ў г. Ветка.

ДЗЕМЧАНКА Аляксей Мікалаевіч, нарадзіўся 12 кастрычніка 1912 г. у в. Антонаўка Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці. Скончыў Рагінскую сярэднюю школу, Гомельскі педагагічны інстытут (1954). Працаваў рабочым «УШОСДОРа», загадчыкам хаты-чытальні, старшынёй Рагінскага і Недайскага сельсаветаў Буда-Кашалёўскага раёна. З 1938 г. да пачатку Айчыннай вайны служыў у Чырвонай Арміі. Пасля заканчэння палкавой школы быў камандзірам узвода, палітруком роты, камісарам батальёна і сакратаром партыйнага бюро палка. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны, вызвалення Заходняй Беларусі. У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Быў адным з арганізатараў партызанскага руху на акупіраванай тэрыторыі Гомельскай вобласці — камісарам партызанскага атрада, камандзірам Буда-Кашалёўскай партызанскай брыгады. У 1944 — 1954 гг. знаходзіўся на кіруючай партыйнай рабоце: сакратар Буда-Кашалёўскага і Гомельскага райкомаў КПБ(б)Б, другі сакратар Гомельскага абкома КПБ(б)Б. Узначальваў Гомельскі абласны льнопянькатрэст, абласны трэст саўгасаў. Выбіраўся дэпутатам раённых, абласнога, Вярхоўнага Саветаў БССР, членам ЦК КПБ.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі «Партызан Вялікай Айчыннай вайны» I і II ступеняў і інш. Памёр 10 красавіка 1970 г.

ЛАЎРЫНОВІЧ Эдуард Віктаравіч, нарадзіўся 27 кастрычніка 1909 г. у в. Кулакова Верхнядзвінскага раёна. Герой Са-

вецкага Саюза. У Чырвонай арміі ў 1931—1932 гг. З 1933 г. на партыйнай рабоце ў Краснадарскім краі. У 1938–1941 гг. працаваў старшынёй калгасаў «Новы шлях», «Перамога» ў Буда-Кашалёўскім раёне Гомельскай вобласці. Са жніўня 1941 г. у тыле ворага — камандзір дыверсійнай групы, затым узвода партызанскага атрада імя Калініна 1-й Гомельскай партызанскай брыгады. У 1944 г. прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У 1943—1946 гг. — старшыня Буда-Кашалёўскага райвыканкома. У 1947—1971 гг. — на адміністрацыйнай рабоце ў г.п. Буда-Кашалёва Гомельскай вобласці. Памёр 12 сакавіка 1982 г.

А.М.Дземчанка.

Э.В.Лаўрыновіч.

ЭКЗАМЕН НА СТАЛАСЦЬ

За три недели нахождения в тылу врага я много уже знал о немецко-фашистских оккупантах. Необходимость требовала как можно быстрее связаться с подпольными райкомами партии и комсомола, с партизанскими отрядами. По заданию обкома партии в октябре 1941 г. я ушел на связь с Уваровичским райкомом партии. При обсуждении плана моего похода учитывалось, что Уваровичский партизанский отряд должен иметь связь с находившимися где-то в этих лесах народными мстителями Буда-Кошелевского района. Поход в Уваровичский район закончился безрезультатно. Прибыли мы в деревню Смычок вечером 10 октября. Связной подпольного райкома партии Митрофан Евдачков принял нас хорошо. Три дня водил он нас по лесу. Мы видели следы стоянок отряда, но никого не нашли.

Позже мы узнали, что Уваровичский, Буда-Кошелевский, Стрешенский отряды, оказавшись в зоне активных боевых действий, не сумели закрепиться, вместе с частями Красной Армии отошли на восток.

В апреле 1942 года в Буда-Кошелевском районе начала боевые действия диверсионная группа в количестве 12 человек под руководством Эдуарда Викторовича Лавриновича, оставленного там для подпольной работы.

Удержаться длительное время в этом районе диверсионно-подрывной группе Э.В. Лавриновича не удалось. За период с апреля по октябрь 1942 г. она 10 раз минировала полотно железной дороги, пустила под откос 6 вражеских эшелонов, разгромила до 10 заготовительных пунктов и волостных управ. В октябре фашисты выследили группу. Из 12 человек в живых остались только трое. Лавринович вывел их в клетнянские леса, где они присоединились к Чечерскому партизанскому отряду. В дальнейшем Лавринович также подорвал много вражеских эшелонов, за что удостоен звания Героя Советского Союза.

...В середине октября 1942 г. в Уваровичский район прибыла группа под руководством Андрея Прокоповича Байкова. Здесь она встретилась с коммунистами и комсомольцами, проживавшими в районе, и пополнилась за их счет. Оставленный ЦК и обкомом КП(б)Б в тылу врага коммунист Денис Тихонович Духвалов стал комиссаром группы. С его помощью она быстро наладила связи с советскими патриотами.

В это же время пришла группа и в Буда-Кошелевский район. При переходе железной дороги Минск — Орша ее обстрелял противник. Погибли командир Антон Антонович Хоменок и треть личного состава. В район действия группу привел Николай Денисович Стефанович. В ее составе находился житель Речицкого района Андрей Титович Денисенко. Он хорошо знал эти места, и его знали во многих населенных пунктах. Это дало возможность установить хорошие связи с населением, пополнить группу людьми и вооружением, преобразовать ее в партизанский отряд.

...Перед Буда-Кошелевским отрядом имени Чапаева и Уваровичским имени Щорса сохранялась задача — действовать в своих районах... К тому времени в Буда-Кошелевском и Уваровичском имелись

М.Дз.Сцефановіч.

секретари комсомольских организаций... Обком утвердил секретарем Буда-Кошелевского подпольного райкома партии Степана Ивановича Касьянова, секретарем Уваровичского подпольного райкома партии Вячеслава Васильевича Юдина. Их обоих мы хорошо знали еще по довоенному времени... Назначение Касьянова и Юдина секретарями райкомов партии преследовало такую цель — использовать возможности отрядов Чапаева и имени Щорса для налаживания связей с советскими патриотами, проживавшими в Гомеле. А среди них было немало знакомых Касьянова и Юдина...

В марте 1943 г. выделили группу для организации партизанских отрядов в северо-восточной части Жлобинского и Буда-Кошелевского районов. Их руководители Владимир Борисович Павлов, Алексей Николаевич Демченко и Петр Ефимович Матюшков за короткое время успели провести большую работу, и группы были близки к тому, чтобы преобразовать их в партизанские отряды.

Хотя фашисты расстреливали на месте каждого, кто не сдал даже своего охотничьего ружья или нескольких патронов к нему, патриоты тем не менее собирали и прятали боевое оружие.

Как-то раз я беседовал с одним из партизан, прибывшим к нам из Буда-Кошелевского района. К сожалению, фамилия его в памяти не сохранилась. На вопрос, когда и где достал винтовку, тот ответил: «Подобрал на поле боя еще в сорок первом году, — и добавил: — Я знал, что когда-либо она мне пригодится. Я и соседу говорил: возьми, спрячь, она хлеба не просит. Он тогда меня не послушал, побоялся. Теперь мы оба в партизанском отряде. Я имею винтовку, а он пускай побегает и поищет себе оружие».

...Большую работу по налаживанию связи с коммунистическим подпольем в Гомеле провело командование Уваровичского партизанского отряда имени Щорса — Вячеслав Васильевич Юдин, Андрей Прокопович Байков, Денис Тихонович Духвалов, Григорий Евтихиевич Петров и Добрушского отряда имени Сталина — Иван Павлович Кривенченко, Николай Афанасьевич Михайлашев и член Уваровичского райкома комсомола Сидор Иосифович Коцур. Они сами посылали в Гомель связных и разведчиков, выезжали на места явок для встречи с подпольщиками.

Друкуецца са скарачэннямі паводле кн.: Рудак А.Д. Экзамен на зрелость. Мн., 1981.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

СЦЕФАНОВІЧ Мікалай Дзянісавіч, нарадзіўся ў 1913 г. у в. Узбярэжжа Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці. Да пачатку Вялікай Айчыннай вайны працаваў намеснікам начальніка цягніка трэста спальных вагонаў прамога злучэння Беласток — Уладзівасток. З ліпеня па лістапад 1941 г. удзельнічаў у баях супраць гітлераўцаў на Заходнім фронце. Затым знаходзіўся на лячэнні ў эвакашпіталі № 3753. З красавіка па жнівень 1942 г. рыхтаваўся да дзейнасці ў варожым тыле на Асобым беларускім зборы. Са жніўня 1942 г. па снежань 1943 г. — камандзір спецгрупы, атрада, потым партызанскай брыгады імя В.І.Чапаева.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і медалямі.

З успамінаў Мікалая Дзянісавіча Сцефановіча

...25 августа 1942 г. ЦК КП(б)Б направил меня с группой в 18 человек в тыл врага... с задачей организовать в Буда-Кошелевском районе партизанский отряд и развернуть активную борьбу против немецко-фашистских оккупантов... С боями пройдя более 1000 километров по вражеским тылам, 17 ноября 1942 г. прибыли в заданный район, в леса южнее Буда-Кошелева, недалеко от Днепра... Первыми в группу вступили жители ближайших деревень И.Ф.Гомарко, Н. А.Стукач и ее два брата, А.И.Гавриленко, И.А.Клецовский,

В.И.Бушкевич, а также А.С.Гриб со своей семьей в пять человек, И.А.Шингерей и другие... За короткое время группа выросла в партизанский отряд и в декабре 1942 г. штаб Гомельского партизанского соединения переформировал группу в партизанский отряд, присвоил ему имя В.И.Чапаева.

Отряд наносил чувствительные удары по врагу. 30 декабря 1942 г., например, 18 партизан в результате дерзкого налета разгромили управу и полицейский участок в деревне Узнож Василевичского района, захватили оружие и боеприпасы. 2 января 1943 г. фашисты пытались расправиться в деревне Старое Красное Речицкого района с партизанскими семьями. Мы вовремя подоспели и помешали карателям выполнить их подлые замыслы. Одиннадцать народных мстителей выбили фашистов из деревни и при этом захватили повозки с боеприпасами и обмундированием.

По-настоящему боевое крещение отряд получил при разгроме вражеского гарнизона в деревне Борщевка Речицкого района... Продовольствием и боеприпасами отряд пополнялся за счет фашистских гарнизонов и немецких хозяйств, созданных оккупантами.

...Обозленные активными действиями отряда, оккупанты неоднократно предпринимали попытки с помощью карательных отрядов уничтожить партизан... В середине июня дивизия эсэсовцев блокировала район базирования партизанских отрядов им. Чапаева, им. Ворошилова и «Большевик». Началась карательная операция с применением артиллерии, танков и авиации... Эсэсовцы, засучив рукава, во весь рост поднимались в «психические» атаки... Расположившись на опушке леса, партизаны нашего отряда встречали фашистов всеми имевшимися средствами — артиллерийским и минометным огнем, пулеметными и автоматными очередями, гранатами... Враг не выдержал и отошел...

...Подрывники нашего отряда систематически взрывали вражеские эшелоны, железнодорожные мосты, рельсы, вели войсковую разведку... . Беспрерывные бои с врагом закаляли наш отряд.

...В сентябре 1943 года приказом командира Гомельского партизанского соединения генерал-майора И.П.Кожара отряд

П.Я.Мацюшкоў.

был преобразован в партизанскую бригаду им. Чапаева. Командиром утвердили меня, комиссаром — С.И.Касьянова...

...В итоге 15-месячной борьбы с фашистами партизанами бригады подорвано 59 железнодорожных эшелонов, уничтожено 152 автомашины, 5 танков, 4 мотоцикла, 37 мостов, более десяти тысяч метров связи, около двух тысяч вражеских солдат и офицеров... Было выпущено 9 номеров подпольной буда-кошелевской районной газеты «Ленінскі Шлях», десятки стенных газет и «боевых листков», в которых популяризировались отличившиеся в боях партизаны... Среди наиболее активных пропагандистов были герои боев В.Румянцев, Н.Гапон, А.Вальковская, В.Синева, Н.Стукач, А.Черниенко, Э.Воротницкий, Н.Бортник, С.Никитенко и др.

Друкуецца паводле кн.: В грозные годы: Воспоминания участников борьбы против немецко-фашистских оккупантов на территории Гомельской и Полесской областей. Мн., 1973. С. 171—176.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

НАШ КАМАНДЗІР

Камандзір партызанскага атрада імя Кутузава Пётр Яфрэмавіч Мацюшкоў у суровыя гады вайны быў адным з арганізатараў партызанскага руху ў нашым раёне. У канцы верасня 1941 г. у в. Аляксандраўка ён стварыў падпольную групу з 15 чалавек. Увайшлі ў яе даваенныя сябры з суседніх вёсак, былыя аднакласнікі, юнакі і дзяўчаты з калгаса «Памяць Леніна», дзе ён быў камсамольскім важаком.

Зімой 1941—1942 гг. група падпольшчыкаў здзейсніла шэраг баявых аперацый на шашы Гомель – Доўск. Іх дзеянні занепакоілі ворага. Акупацыйныя ўлады

аціанілі галаву Пятра Мацюшкова ў 50 тысяч нямецкіх марак.

У сакавіку 1943 г. па рашэнні Журавіцкага падпольнага райкома партыі з баявой групы П.Я.Мацюшкова быў сфарміраваны партызанскі атрад імя Кутузава. У атрад уступалі камсамольцы і моладзь з усёй Буда-Кашалёўшчыны. Сярод іншых былі Іван Дзяржынскі, Васіль Чарнякоў, Віктар Гузаў, Анатоль Каралёў, Ульяна Іванчыкава, Васіль Капаеў і дзесяткі іншых адважных юнакоў і дзяўчат.

Баявыя аперацыі партызан прыводзілі не толькі да разгрому нямецка-паліцэйскіх гарнізонаў, разбурэння дарог, але і перарасталі ў баі са спецыяльна падрыхтаванымі карнымі падраздзяленнямі ворага.

Ва ўсіх гэтых баях наш баявы камандзір заўсёды быў наперадзе, служыў для кожнага з нас прыкладам храбрасці, стойкасці і трываласці.

6 красавіка 1943 г. буйны карны нямецкі атрад акружыў і запаліў в. Царкоўе. Фашысцкія галаварэзы спалілі жывымі сем'і партызан Піліпа Ільюшчанкі, Яўстрата Давыдава і іншых.

Камандзір падняў атрад па баявой трывозе і аддаў загад выратаваць жыхароў вёскі ад нямецкіх захопнікаў. Нягледзячы на пераўзыходзячыя сілы ворага, мы кінуліся ў бой. Асноўныя сілы атрада Пётр Яфрэмавіч павёў у абход левага фланга ворага, і партызаны ўварваліся ў палаючую вёску. Завязаўся жорсткі бой, які працягваўся больш за дзве гадзіны. Было забіта звыш 30 карнікаў. Жыхары вёскі былі выратаваны. Дваццаць чалавек з іх сталі партызанамі.

Па плану Пятра Яфрэмавіча і пры яго ўдзеле былі знішчаны ўзмоцнены нямецка-паліцэйскі гарнізон у Гарадцы, які з'яўляўся апорным пунктам акупацыйных улад у Рагачоўскім і Жлобінскім раёнах, а таксама Рагінскі гарнізон, у якім наш камандзір абяззброіў і ўзяў жывым у палон начальніка гарнізона Ямшчыкова. Па прыгаворы партызанскага суда той быў расстраляны.

Р.М.Купрыяшчанка.

Падрыўнікі

З успамінаў Героя Савецкага Саюза Фёдара Пятровіча Котчанкі, былога камандзіра дыверсійнай групы

Я попал в диверсионную группу Саши Исаченко. Захватив с собой мины, мы отправились громить вражеские эшелоны на жлобинскую железную дорогу. По пути нам предстояло переходить речицкую железную дорогу. Дорога сильно охранялась. У населения узнали, что по этой дороге последние дни часто передвигаются эшелоны с танками и артиллерией. Решено было поработать и на этом участке. Ночи были лунными, но ждать было некогда: нас могли обнаружить. Ночью отправились в разведку. Я и Саша вылезли на железнодорожное полотно... Осторожно приступили к минированию. Волновались: нужно действовать быстро и аккуратно, малейшая неосторожность — и наша примитивная самодельная мина отправит нас к праотцам. Саша оттаскивал песок, а я устанавливал мины. Установка закончена. Тщательно замаскировав следы работы, вся группа перешла железную дорогу и, убедившись, что мы не замечены, расположилась в леске недалеко от полотна. Ночью поезда не ходили. Утром мимо нашей мины прошла немецкая охрана, но ничего не заметила. Вскоре послышался шум приближающегося поезда. От нетерпения и волнения знобило, — ведь это первая моя диверсия на железной дороге. Через несколько минут состав налетел на мину. Оглушительный взрыв, огромное пламя, треск вагонов, разбивающихся друг о друга, и огромный столб песка и щебня — вот все, что пришлось наблюдать притаившимся и ликующим диверсантам в те минуты. 12 вагонов и паровоз были уничтожены. Танки и автомашины не дошли до фронта. Сутки фашисты растаскивали с путей хаотически нагроможденные остатки вагонов...

Отдохнув пару дней, мы снова вышли на диверсию с последней миной. Выбрали участок дороги, проходивший через лес. Решили рвать более надежным способом — на шнур, «на удочку», как мы называли. Днем вели наблюдение. Установили, что примерно через час по полотну проходят патрули. Ночью подползли ближе к дороге, пропустили патруль. Мы с Сашей опять вылезли на полотно. Филя Кечко разматывал шнур. Быстро установив смертельный груз и замаскировав следы, мы отошли в кусты — метров за семьдесят. Дальше отойти было нельзя,

Ф.П.Котчанка ў час ускладання вянкоў на магілу баявых сяброў.

длина шнура не позволяла. Филя, я и Исаченко остались в кустарнике. А остальные четыре человека отправились на опушку леса: оставаться у полотна всем было опасно — слишком малое расстояние от мины. Другого выхода не было, решили рискнуть — лишь бы была удача. Долго ждать не пришлось. Приближался поезд. Когда паровоз поравнялся с нами, Кечко дернул за шнур. Сильный взрыв… Нам казалось, что состав обрушился на нас… Охрана, уцелевшая в задних вагонах эшелона, открыла по лесу огонь. В воздух взлетали ракеты, освещая ярким зеленым светом лесные тропы. Но было поздно. Невредимые и гордые своим успехом, мы уходили в глубину леса. Днем разведали результаты ночной работы. Паровоз и девять вагонов с фашистами разбиты вдребезги…

Друкуецца паводле кн.: С е р г е е в В. Красная лента. М., 1979. С. 44—47.

Разгром губіцкага гарнізона

Камандаванне партызан надавала вялікае значэнне разлажэнню варожых гарнізонаў. Іх на тэрыторыі раёна было шмат. Яны размяшчаліся галоўным чынам уздоўж чыгункі па лініях Жлобін — Гомель, Гомель — Калінкавічы, Калінкавічы — Жлобін. У гэтай справе вялікую ролю адыгралі падпольшчыкі і сувязныя партызан. Гарнізон, які стаяў у вёсцы Губічы, вёў актыўную барацьбу супраць партызан. 2 сакавіка 1943 г. партызаны атрада «Бальшавік» правялі паспяховую аперацыю. Праз два тыдні атрад імя К.Я.Варашылава зноў нанёс удар па варожым гарнізоне. Яны забілі начальніка гарнізона, яго намесніка, некалькі паліцэйскіх. Тыя, што засталіся ў жывых, разбегліся. Іх сабраў бургамістр Губіцкай воласці. Для іх падмацавання перавялі гарнізон з вёскі Забаб'е. Але ён праіснаваў нядоўга. 30 сакавіка камандзір узвода атрада імя В.І.Чапаева Мікалай Васілевіч з групай партызан непрыкметна падышлі да казармы губіцкага гарнізона, знялі вартавых, абяззброілі паліцэйскіх і адпусцілі па хатах. Гэта дэмаралізавала іншыя гарнізоны. З кожным днём павялічваліся пераходы паліцэйскіх да партызан.

З бою ў бой

На сельскіх могілках вёскі Патапаўка на адной з магіл стаіць мармуровы абеліск, на якім выбіты тры прозвішчы: А.М.Міраненка, І.А.Ільеў і В.І.Краўчанка. Гэта падрыўнікі партызанскага атрада імя Фурманава брыгады імя Чапаева. Міраненку і Ільеву было па 24 гады, Краўчанку — 21. Многа слаўных спраў на рахунку кожнага з іх.

Аднойчы разведка данесла, што на дарозе Гомель — Жлобін, недалёка ад вёскі Губічы, засела гітлераўская грузавая аўтамашына. Камандзір атрада звярнуўся да партызан, хто добраахвотна пойдзе на ўзяц-

це машыны. Вызваліся пяць байцоў — Міраненка, Ільеў, Краўчанка, Сямёнаў і Мазураў. Групу ўзначаліў Аляксандр Міраненка. Па дарозе, каля вёскі Губічы, з'явілася калона нямецкіх аўтаматчыкаў на веласіпедах. Партызаны спачатку разгубіліся. Камандзір групы падаў загад заняць абарону. Мазураў, прысеўшы сярод дарогі, перавёў на аўтаматычны ўзвод сваю дзесяцізарадку СВТ і першы даў чаргу па калоне гітлераўцаў. Фашысты саскочылі з веласіпедаў і пачалі адстрэльвацца. Завязаўся бой. Сілы былі няроўныя, і камандзір групы падаў каманду да адыходу. Партызаны адышлі на ўскраіну вёскі. Ноч правялі ў пустой хаце, а раніцай рушылі да месца бою. Над Губічамі ўзнімалася густое воблака дыму. На двух пакінутых у дазоры партызан знянацку напалі гітлераўцы. Аднаму ўдалося ўцячы і прыбегчы ў атрад. Другі быў забіты. Атрад быў падняты па трывозе. У лесе ў старых акопах зрабілі засаду. Група партызан на чале з Міраненкам пайшла ў вёску Губічы, каб забраць забітага таварыша і адначасова заманіць фашыстаў у засаду. Група ішла асцярожна. Мазураў заўважыў немцаў. Яны ішлі гуськом. Побач з акопам, у якім схавалася група Міраненкі, за тоўстай сасной стаяў камандзір узвода Качанаў. Ён блізка падпусціў нямецкага афіцэра і выстраліў. Адразу адкрылі агонь партызаны. Трэба было эканоміць боепрыпасы, і партызаны непрыкметна пакінулі акопы. Мазураў так захапіўся стральбой, што яму прыйшлося даганяць таварышаў.

25 кастрычніка 1943 года, вяртаючыся з баявога задання па падрыве варожага эшалона, група партызан каля вёскі Гаўлі наскочыла на варожую засаду... У няроўным баі загінулі А.П.Міраненка, І.А.Ільеў, В.І.Краўчанка. Лёс двух іншых падрыўнікоў групы, на жаль, невядомы.

І.П.Чарняк.

Больш гітлераўцы гарнізон не аднаўлялі

З успамінаў Ганны Мікалаеўны Губанавай, былой партызанкі атрада імя В.І.Чапаева

Мне было шаснаццаць гадоў, калі я прыйшла ў атрад імя В.І.Чапаева. Мяне залічылі ў дыверсійную групу Мікалая Іосіфавіча Бортніка. Разам з усімі збірала зброю і боепрыпасы, мініравала грунтавыя дарогі і масты, удзельнічала ў «рэйкавай вайне». Асабліва запомніўся мне разгром варожага гарнізона ў вёсцы Чабатовічы. Там знаходзіліся 130 нямецкіх салдат і паліцэйскіх. Яны ажыццяўлялі карныя экспедыцыі супраць партызан, якія дзейнічалі ў Буда-Кашалёўскім і Уваравіцкім раёнах.

25 мая 1943 г. на досвітку прыбылі мы да Чабатовічаў. Занялі пазіцыі па кюветах. Пачало світаць. Ужо выявіліся контуры ўправы, дзоты, калючы дрот. Падышла група партызан з атрада імя Фурманава. Гітлераўцы выявілі нас і адкрылі агонь. Нямецкі снайпер, засеўшы на дрэве, трапным агнём прыціснуў нас да зямлі. Толькі аднаму нашаму сувязному ўдалося дабрацца да ўзлесся, дзе была замаскіравана гармата, і расказаць пра снайпера. Наш артылерыст Пётр Ткач прамой наводкай ударыў па дрэве, і снайпера не стала. З-за рова ўдарыла і «саракапятка» Пятра Забродскага. Партызаны адкрылі агонь з усіх відаў зброі. У бой уступіў мінамёт Мікалая Чапарына. Яго міны клаліся на казарму, бальніцу, дзе размяшчаліся гітлераўцы. Бой станавіўся ўсё больш жорсткім. Камандзір роты Аляксандр Хрыпач падняў партызан у атаку. З крыкамі «Ура!», «За Радзіму!» кінуліся партызаны наперад. Да поўдня чабатовіцкі варожы гарнізон спыніў сваё існаванне. Больш яго гітлераўцы не аднаўлялі.

Збівалі і нямецкія самалёты

З успамінаў Яраслава Адольфавіча Куніцкага, ветэрана вайны

Вайна застала мяне ў горадзе Кастраме ў школе сярэдніх камандзіраў запасу ў 527-м стралковым палку 118-й стралковай дывізіі. З першых дзён вайны дывізія была накіравана на Ленінградскі фронт, дзе была ў жорсткіх баях амаль уся знішчана. Мне пашанцавала застацца ў жывых. Мяне накіравалі ў Яраслаўскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча стралкоў-бамбардзіраў. Вораг набліжаўся да Масквы. Авіяшколу эвакуіравалі ў Чэрдаклынскі раён Ульянаўскай вобласці. Хутка я трапіў у 1-ю стралковую

дывізію 339-га дывізіёна, якая фарміравалася ў горадзе Мелікес. Але на фронт я не трапіў. У маі месяцы мяне, як і многіх беларусаў і ўраджэнцаў рэспублікі, накіравалі на спецыяльны Беларускі збор, дзе мы прайшлі падрыхтоўку для барацьбы ў тыле ворага. У жніўні 1942 г. наша група была накіравана ва Уваравіцкі раён Гомельшчыны. Вынікам нашай работы была арганізацыя спачатку партызанскага атрада, а потым і брыгады імя М.А.Шчорса. Камандаваў брыгадай Андрэй Пракопавіч Байкоў.

Многа добрых спраў на рахунку партызан брыгады. Нашы падрыўнікі — «партызанскія гвардзейцы», як мы іх называлі, падарвалі 48 эшалонаў, большасць з якіх былі з жывой сілай ворага, баявой тэхнікай. Партызаны брыгады падарвалі 594 рэйкі, 4 чыгуначныя і 28 шашэйных мастоў, 7 танкаў, 27 аўтамашын, 12 матацыклаў, знішчылі 6030 метраў тэлефоннай сувязі, правялі 23 баі з гітлераўцамі, разграмілі 14 паліцэйскіх участкаў, спалілі 5 фашысцкіх участкаў і складаў. У баях знішчылі больш як 400 гітлераўцаў, вызвалілі з фашысцкага палону больш за сем тысяч савецкіх грамадзян.

У 1943 г. наша брыгада ўяўляла сабою ўнушальную сілу. На яе ўзбраенні былі кулямёты, аўтаматы і нават гарматы і мінамёты. Раслі нашы рады. Ішлі да нас мясцовыя жыхары, ваеннапалонныя, якія вырываліся з фашысцкіх лагераў, многіх вызвалялі і партызаны.

Складанай была баявая аперацыя па вызваленні савецкіх ваеннапалонных на торфазаводзе «Бальшавік». Лагер быў абнесены калючым дротам у некалькі радоў. Праз кожныя 10—15 метраў былі ўстаноўлены варожыя пасты аховы. У лагеры знаходзілася каля дзвюх тысяч палонных. Мы добра падрыхтаваліся да аперацыі. Сувязны Алег Старасценка паведаміў нам

Я.А.Куніцкі.

караульны пароль. Агульнае кіраўніцтва аперацыяй было даручана камандзіру атрада Івану Залівіну. Мне з ротай было загадана знішчыць немцаў і адкрыць лагер. Было вырашана правесці аперацыю за кароткую летнюю ноч. Да лагера трэба было прайсці больш як 40 кіламетраў у асноўным па адкрытай мясцовасці. Да торфазавода мы падышлі ўжо ноччу. Па дарозе сустрэлі двух паліцэйскіх, у якіх даведаліся пароль. Таму нам удалося ціха зняць ахову і на яе месца паставіць партызан. Усё адбылося хутка. Немцы былі знішчаны. Многія з палонных сталі партызанамі.

Уступалі ў бой мы і з авіяцыяй. Неяк, гэта было ў кастрычніку 1943 г., з боку фронту нізка ішоў падбіты «Ю-87». Наша застава каля пасёлка Гарадок Смычкоўскага сельсавета адкрыла па ім агонь. Самалёт упаў на зямлю ўверх коламі. Нямецкія лётчыкі засталіся жывыя. Гэта былі камандзір 6-й эскадрыллі оберлейтэнант Франц Рано і стралок Кілер. Яны былі вельмі здзіўлены, што іх збілі на акупіраванай немцамі тэрыторыі.

Насельніцтва раёна добра да нас адносілася, лічыла нас сваімі абаронцамі. У кожнай вёсцы раёна былі сувязныя і падпольшчыкі, якія нам дапамагалі ва ўсім.

Апанас Ананенка з вёскі Раманаўка

З успамінаў Мікалая Аляксандравіча Труснова, былога камандзіра партызанскага атрада № 108 імя Р.І.Катоўскага

Баявыя дзеянні на тэрыторыі Буда-Кашалёўскага раёна наш атрад пачаў з лістапада 1942 г. Ён размясціўся па вёсках Бронніца, Першамайскі пасёлак, Раманаўка. У Раманаўцы жыў Апанас Ігнатавіч Ананенка, 1884 года нараджэння. Нягледзячы на свой узрост, ён збіраў зброю. Толькі нашаму атраду А.І.Ананенка перадаў станковы кулямёт, 84 вінтоўкі. Мы яму з атрада выдзелілі сівога каня з вупражжу і павозку. Дапамагалі нам сувязныя з вёскі Негаўка В.П.Кажамякін, А.В.Кажамякіна, М.Р.Шараварaў і іншыя.

Нашы падрыўнікі кантралявалі чыгун-

ку на ўчастку паміж станцыямі Уза і Жлобін. Мы ўтрымлівалі сваю частку партызанскай зоны з вёскамі Рудня Віктарынская, Ліпінічы, Бронніца. За зону ішлі пастаянныя баі з карнікамі. За адну ноч партызаны спалілі ўсе масты цераз раку Ліпа. 29 красавіка 1943 г. гітлераўцам удалося ўварвацца ў Лозаўскія лясы. Танкамі і самаходнымі гарматамі праціўнік адрэзаў нас ад Лозаўскага лесу. Мы перайшлі ў Руднявіктарынскі лес. Але і тут нам не пашанцавала: карнікі акружылі і гэты лес. Мы ўвесь дзень вялі бой, у лес карнікаў не пусцілі, а ўначы прарвалі кола акружэння і выйшлі з-пад удараў праціўніка.

«Адская машына» на службе ў партызан

З успамінаў Рыгора Іванавіча Караткова, былога начальніка штаба партызанскага атрада № 108 імя Р.І.Катоўскага

Партызаны нашага атрада літаральна не злазілі з чыгункі. Адна была цяжкасць — мала было ўзрыўчаткі.

Мы з камандзірам атрада М.А.Труснобым былі кадравыя камандзіры-артылерысты. Вырашылі выкарыстоўваць для дыверсій артылерыйскія снарады, якія знаходзілі па лясах. Дастаўлялі да нас снарады і мясцовыя жыхары. Асабліва іх многа знайшлі ў Лозаўскім лесе Буда-Кашалёўскага раёна. Але на першым часе не ўдаваліся дыверсіі на снарадах. Не так проста ўзарваць артылерыйскі снарад у зручны момант. Нягледзячы на няўдачы, мы працягвалі дамагацца свайго. І вось аднойчы камісар нашага атрада С.П.Каспрук, вяртаючыся з разведкі, прынёс у атрад, як ён назваў, «адскую машыну», якую яму даў жыхар вёскі Камарычы Быхаўскага раёна. Гэтай «адскай машынай» аказалася магнета ад трактара першых гадоў выпуску. Трэба адзначыць, што магнета выкарыстоўвалі ў вёсцы для здабычы агню, бо з запалкамі было вельмі цяжка. Прымацаваўшы да магнета невялікае кола з ручкай і хутка круцячы яго, на кантактах здабывалі іскру, якая запальвала кавалачак ваты, змочаны ў бензіне.

У пачатку жніўня 1942 г. ноччу група дыверсантаў рушыла да чыгункі Рагачоў — Магілёў каля станцыі Тошчыца. Непрыкметна для нямецкай аховы паклалі пад рэйкі пяць артылерыйскіх снарадаў. У сярэдні снарад уклалі капсуль-дэтанатар, падвялі канцы дроту ад магнета і пачалі чакаць варожы эшалон. Доўга чакаць не прыйшлося. Праз некалькі хвілін на вялікай хуткасці паявіўся варожы эшалон, які ішоў на ўсход. Аляксандр Таўстапятаў хутка пачаў круціць рукаятку магнета. Раздаўся моцны выбух, які асвяціў усё наваколле. Потым з грукатам паляцелі вагоны пад адхон.

Ляцелі пад адхон эшалоны

З успамінаў Івана Фёдаравіча Гамаркі, былога камандзіра партызанскай брыгады «Бальшавік»

Добра памятаю люты — сакавік 1942 года. Баявыя аперацыі партызан ішлі адна за адной.

Апоўначы рота партызан на конях раптоўна ўварвалася ў вёску Губічы. Там размяшчаўся нямецка-паліцэйскі ўчастак і перашкаджаў нам падыходзіць да чыгункі для падрыву варожых эшалонаў. Вартавыя-паліцэйскія разбегліся, астатніх партызаны абяззброілі.

Амаль адразу пасля гэтага партызаны напалі на варожы гарнізон у вёсцы Патапаўка. Нас было ўсяго пяць чалавек, апранутых у нямецкую форму. Адзін з нас ведаў нямецкую мову. Мы ўшчыльную падышлі да патруля, ціха знялі яго і самі заступілі на «варту» чыгункі. Тым часам нашы падрыўнікі закладвалі міны. Мы ведалі, што ў бок фронту павінен прайсці варожы эшалон з танкамі. Зрабіўшы сваю справу, мы адышлі ад чыгункі і заляглі ў засадзе каля вёскі. Пачуўся грукат колаў, затым паказаўся і сам эшалон. Раптам раздаўся моцны выбух — гэта цягнік наскочыў на нашу міну. Заднія вагоны і платформы на поўным ходу напіралі на пярэднія. Успыхнуў пажар. Доўгі час цемру ночы асвятляла полымя. Мы паспяхова вярнуліся ў лагер...

Навагодні падарунак

З успамінаў В.П.Румянцава, былога камандзіра разведкі партызанскага атрада імя В.І.Чапаева

Вясной 1942 г., як ураджэнец і жыхар Беларусі, я быў адазваны з радоў Чырвонай арміі і накіраваны ў партызанскую школу пры ЦК КП(б)Б. Калі пачала фарміравацца група для адпраўкі ў тыл ворага для арганізацыі партызанскай барацьбы разведвальна-дыверсійнай дзейнасці, я быў уключаны ў яе склад. Мы накіроўваліся ў Гомельскую вобласць. Праз Віцебскія «вароты» мы перайшлі лінію фронту. Прайшлі больш за тысячу кіламетраў па тылах ворага з баямі. З 18 чалавек да месца прызначэння дайшлі 13. Пачалі знаёміцца з жыхарамі. Наша група хутка ператварылася ў партызанскі атрад, якому было прысвоена імя легендарнага героя грамадзянскай вайны В.І.Чапаева. Вялікая заслуга ў стварэнні атрада належала А.В.Дзенісенку, М.І.Бортніку, Э.І.Варатніцкаму, В.А.Сінёвай і іншым. Вось некалькі эпізодаў з баявых спраў атрада.

31 снежня 1942 г. партызаны разграмілі варожы гарнізон у вёсцы Баршчоўка, якая знаходзілася на шашы паміж Гомелем і Рэчыцай. Немцы і паліцэйскія рыхтаваліся адзначыць Новы год і не чакалі нападу партызан. Ноччу партызаны падышлі да вёскі, зрабіўшы 50-кіламетровы рэйд. Разбіўшыся на тры групы, яны ўварваліся ў вёску. Спатрэбілася менш за 30 хвілін, каб партызаны знялі вартавога каля будынка паліцыі (размяшчалася ў былым сельсавеце), парвалі тэлефонную сувязь і разграмілі паліцэйскі ўчастак. Аднак аперацыя не прайшла гладка. З акна суседняга дома па партызанах быў адкрыты агонь. Кінутая туды граната прымусіла яго змоўкнуць. Супраціўленне партызанам было аказана і яшчэ ў двух пунктах, але і яно было падаўлена. Гэта быў наш навагодні «падарунак» ворагу.

У маі ці ў пачатку чэрвеня 1943 г. мы разграмілі варожы гарнізон у вёсцы Чабатовічы Уваравіцкага раёна. Кіраваў аперацыяй І.Ф.Гамарка. Партызаны ноччу падцягнуліся да вёскі, на ўзлессі ўстанавілі 45-міліметровую процітанкавую гармату і падрыхтаваліся да штурму варожага гарнізона. Гарнізон размяшчаўся ў будынках, абнесеных у два рады сцяной з бярвенняў, з амбразурамі ў ёй. Разведку гарнізона правялі Сцяпан Маеўскі, Мікалай Маладоінаў і іншыя нашы разведчыкі.

На досвітку прагрукацеў гарматны стрэл. Гэта быў сігнал да штурму. Партызаны падняліся ў атаку. Іх падтрымлівалі сваім агнём гармата і кулямёты. Але нечакана моцны агонь праціўніка прыціснуў партызан да зямлі. Камандзір роты Хрыпач зноў падняў партызан у атаку. З магутным «Ура!» яны атакавалі гарнізон.

Атрад імя М.А.Шчорса зрабіў засаду на дарозе Уваравічы Чабатовічы, каб прыкрыць чапаеўцаў. І не памыліўся. Неўзабаве пачуўся гул матораў. Гэта ішла дапамога гарнізону. Трапны агонь з засады перашкодзіў ім рухацца далей. Праравацца да гарнізона яны не змаглі. Яшчэ адзін варожы гарнізон быў знішчаны. Іх станавілася ўсё менш. Яны заставаліся ў Буда-Кашалёве, Уваравічах, уздоўж чыгункі Гомель — Жлобін. Амаль уся тэрыторыя ад чыгункі да Дняпра, Бярэзіны і далей на захад была партызанскай зонай, дзе існавала савецкая ўлада. Арганізаваная на базе нашага атрада брыгада кантралявала пераправы цераз Днепр і Бярэзіну каля вёсак Верхняя Олба, Горваль, бо асноўныя сілы і штаб брыгады дыслацыраваліся ў лясах праваўзбярэжжа гэтых рэк, а адзін атрад — у раёне вёсак Губічы і Губіцкі Кардон.

В.П.Румянцаў.

Край мой партызанскі

З успамінаў Рыгора Мікітавіча Купрыяшчанкі, былога разведчыка-падрыўніка партызанскага атрада імя М.І.Кутузава

На территории Буда-Кошелевского района действовали подпольный райком партии и райком комсомола, базировались три партизанские бригады.

Весной 1943 г. по решению Журавичского подпольного райкома партии из боевой группы П.Е.Матюшкова был сформирован наш партизанский отряд № 263. Он пополнялся комсомольцами и молодежью района. 16 июля 1943 г. отряду было присвоено имя М.И.Кутузова. В 1943 г. он состоял из двух рот и четырех диверсионно-подрывных групп. Ротами командовали Л.М.Падунов и М.Е.Кондратенко. Санслужбой отряда и бригады руководил врач А.С.Парфенов. Численный состав отряда имени М.И.Кутузова на март 1943 г. составлял около 60, а на конец ноября 1943 г. — 870 бойцов. Кроме Ключевских лесов, местом дислокации отряда и 1-й Буда-Кошелевской бригады были Каменский и Рысковский, Лозовский, Кормянские и Чечерские леса, а также Викторинская дача.

Подрывные группы 1-й Буда-Кошелевской бригады и подпольщики в 1943 г. подорвали 49 фашистских поездов с живой силой и боевой техникой, 109 автомашин на шоссейных дорогах, более 20 танков и бронемашин, 42 шоссейных и железнодорожных моста. В этот общий бригадный боевой счет внесли свою немалую долю подрывные группы отряда имени М.И.Кутузова: группы В.Банькова, Н.Баркова, А.Шеховцова (погибшего при выполнении боевого задания). Отличились и подрывные группы других отрядов бригады, особенно группы В.Вербицкого и Н.Янова. Следует подчеркнуть, что в группы подрывников подбирались самые выносливые и грамотные партизаны. Слово «подрывник» в понимании всех, кто знал партизанскую жизнь, означало мужество, находчивость, смекалку. Не все, конечно, получалось гладко, были и досадные провалы, за которые приходилось расплачиваться жизнью.

Оценивая прошлое сквозь призму полувековой давности, хочу поделиться некоторыми личными наблюдениями и выводами о деятельности партизанских подрывных групп, которая мне, как их рядовому бойцу, ближе всего. Летом 1943 г. Центральный штаб партизанского движения предложил провести операцию партизан по массовому разрушению железных дорог на захваченной врагом территории. Но из-за недостатка авиации не смог обеспечить подрывников минно-взрывными средствами в достаточном количестве. Поэтому «рельсовая война» не достигала в полном объеме поставленных целей. Установить заряд для подрыва рельсов было проще, чем мину под поезд, но толовые шашки только выбивали из рельса кусок длиной до 35 сантиметров. Немцы опиливали взорванные рельсы и сваривали их термитом. Мы, подрывники, не сразу поняли, что при недостатке взрывчатки ее выгоднее использовать на подрыв поездов и другие серьезные диверсии, чем на подрыв рельсов. Уменьшение количества подрываемых рельсов и увеличение подрывов поездов и других диверсий дали неплохие результаты.

Большие и ощутимые потери заставили немецкое командование проводить ответные меры против партизан. Оно пыталось ослабить наши удары. Так, 29—30 апреля 1943 г. 10-я Журавичская партизанская бригада под командованием С.М.Белых, в которую входил и наш отряд под командованием П.Е.Матюшкова, в течение 18 часов вела крупное сражение, вошедшее в историю партизанской войны в Белоруссии как Лозовский бой.

Командованием бригады через партизанскую агентурную разведку было установлено, что в деревне Меркуловичи и населенных пунктах Довск, Старый и Новый Кривск дислоцируется целый полк немецких регулярных войск, к которому стали стягиваться немецкие и полицейские гарнизоны из других районов Гомельской области. Общая численность вражеских войск составляла свыше 5 тысяч человек с полковой артиллерией, бронемашинами и даже танками. Против партизан был брошен также отряд из 800 всадников так называемой «русской освободительной армии», сколоченный из власовцев и насильно мобилизованных военнопленных.

Наши силы к этому времени состояли из девяти отрядов 10-й Журавичской бригады численностью 2 тысячи 494 человека с 96 пулеметами, 24 минометами и одной пушкой-«сорокапяткой». Получив точные сведения партизанской разведки о том, что противник будет проводить блокировку Каменского и Рысковского лесов, командование бригады отдало приказ о нашей передислокации в Лозовский лес. Отряды бригады заняли оборону по заранее разработанному плану.

Немецкое командование поставило перед своими частями в качестве основной задачу: любой ценой уничтожить партизанские отряды, ведущие непрерывные боевые действия в районе важных коммуникаций на железных дорогах Гомель — Ленинград и Гомель — Минск, а также на шоссе Гомель — Ленинград. Враг стремился вытеснить партизан из Лозовского леса в поле, окружить их и уничтожить.

Командование нашей бригады решило дать бой гитлеровцам в Лозовском лесу, нанести им именно здесь как можно больший урон, показав возросшую силу партизан. Этим решением наши командиры преследовали и другую цель — не дать противнику, обладавшему большой маневренностью, навязать нам невыгодные условия боя на открытой местности.

В девятом часу утра 29 апреля основные силы врага начали наступление из деревни Лозов. Мощным ружейным и пулеметно-минометным огнем партизан немцы были отброшены и отступили на исходные позиции. Перегруппировав силы, фашисты начали ожесточенные атаки на левом фланге бригады и особенно в районе обороны 263-го отряда, который в начале боя вынужден был отойти, а затем, получив подкрепление из резерва, восстановил положение. Вскоре враг предпринял новое наступление, теперь уже с трех сторон. Однако, несмотря на двукратное превосходство в живой силе и технике, ему и на этот раз не удалось добиться успеха. Все атаки противника были отбиты с большими для него потерями. К вечеру, дождавшись пополнения, гитлеровское командование организовало очередное наступление с восточной стороны деревни Лозов, но и оно закончилось провалом. Противник предпринял ряд повторных атак, бросая в бой новые резервы на позиции 263-го отряда имени М.И.Кутузова, который выдержал и эти атаки. Тогда фашисты применили тактику обхода отдельных отрядов и стали нащупывать стыки между ними. Командование бригады поставило перед партизанами боевую задачу: удержать оборону до полной темноты, а затем всем отрядам по заранее указанным маршрутам оставить Лозовский лес. Это было необходимо: боезапасы у нас были на исходе, а к немцам шли все новые и новые подкрепления.

Гитлеровцы почти окружили бригаду, но, понеся большие потери, вынуждены были прекратить наступление. Это позволило отрядам бригады ночью через деревню Малые Козловичи уйти в Рогачевские леса, сохранив организованность и порядок.

В этом знаменитом Лозовском бою оккупанты потеряли свыше 600 человек убитыми и много боевой техники. Были убиты немецкий полковник, командовавший боем, и два его адъютанта.

Потери партизан составили около 30 убитых и более 40 раненых, уничтожена была и наша единственная пушка. Смертью храбрых в этом бою погибли командир бригады С.М.Белых, разведчики Степан Силкин и Владимир Павлючков.

Вскоре по решению Белорусского штаба партизанского движения на базе 263-го отряда, 262-го отряда имени В.П.Чкалова (командир Ф.Л.Шилов) и 108-го отряда имени Г.И.Котовского (командир Н.А.Труснов) была сформирована 1-я Буда-Кошелевская бригада. Вышеназванные отряды были выделены из состава 10-й Журавичской партизанской бригады. Сделано это было для обеспечения более оперативного руководства партизанскими отрядами, усиления их боевой деятельности, налаживания связи с населением, быстрого и массового вовлечения его в партизанскую борьбу с врагом. Командиром бригады был назначен А.Н.Демченко. В 1943 г. на территории Буда-Кошелевского района были сформированы также бригады имени В.И.Чапаева (командир Н.Д.Стефанович) и имени Н.А.Щорса (командир А.П.Байков). Кроме этих трех бригад и 10-й Журавичской, в районе действовали диверсионно-подрывные группы 1-й Гомельской бригады, и особенно активно — группа Героя Советского Союза Э.В.Лав-

риновича, на боевом счету которой 35 подорванных вражеских эшелонов. Все они принимали участие в боевых действиях не только в Буда-Кошелевском, но и в других районах Гомельской области.

Воевать с регулярными немецкими частями и немецко-полицейскими гарнизонами партизанам было нелегко. Противник, с которым мы бились насмерть, был серьезный, опытный, лучше, чем партизаны, вооруженный. Кстати, у нас не было и мысли попасть в плен к гитлеровцам, так как мы знали, какие душевные и физические муки ждут не только попавшего в плен партизана, но и его семью. Велик перечень погибших от зверств фашистов мирных жителей. 6 апреля 1943 г. в деревне Церковье гитлеровцы заживо сожгли семьи партизан Ф.Илюшенко, Е.Давыдова, И.Якименко и других. В октябре специальные немецкие карательные части трижды проводили блокаду Викторинского и Лозовского лесов, зверски убив свыше 200 мирных жителей Заболотья, Коромки и других деревень. В ноябре фашисты уничтожили деревни Селец и Закревье, а в поселке Чирвоный Стяг заживо сожгли десятки жителей Рогини, Коромки и окрестных селений.

Беспощадный террор и бессмысленная жестокость не шли на пользу оккупантам. Страх перед ними не сковал волю белорусов, они не встали на колени перед врагом, а, наоборот, день ото дня усиливали борьбу с ним.

Оценивая партизанскую войну на Буда-Кошелевщине в годы минувшей войны, хочу засвидетельствовать, что мы, ее участники, не нанесли бы и половины потерь оккупантам без всесторонней помощи со стороны большинства жителей района: моральной и материальной поддержки, добровольного пополнения наших рядов, снабжения продовольствием, одеждой, обувью и всем необходимым в партизанской борьбе. И эту помощь буда-кошелевцы оказывали всем отрядам, действовавшим в районе, несмотря на страшный риск, которому они подвергали не только себя, но и свои семьи, своих близких. У фашистских извергов был только один ответ за помощь партизанам — расстрел всей семьи патриота, сожжение его дома, а нередко и всей деревни.

На всю жизнь в душе осталось партизанское и фронтовое братство, великое и святое. Тогда мы не делили людей по национальности и не жалели жизни в борьбе за свободу единого Отечества. Храню светлую память о моих боевых друзьях, павших в боях и ушедших из жизни уже в мирное время, — П.Е.Матюшкове, А.Н.Демченко, Э.В.Лавриновиче, А.Ф.Чернякове и других.

В тяжелейших испытаниях минувшей войны с особой силой раскрылись такие высокие нравственные качества наших людей, как мужество и стойкость, боевая доблесть и взаимопомощь, духовное единство и душевная щедрость, человеколюбие, доброта и отзывчивость. В этом наша сила, в этом источник дальнейшего развития и процветания нашего Отечества.

Лозаўскі бой

З успамінаў Міхаіла Афанасьевіча Дзмітрыева, былога партызанскага разведчыка

ДЗМІТРЫЕЎ Міхаіл Афанасьевіч, нарадзіўся 23 верасня 1921 г. у в. Барсукі Кармянскага р-на Гомельскай вобл. Беларускі вучоны ў галіне асветы і педагогікі. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Доктар педагагічных навук (1993), прафесар (1994), акадэмік Міжнароднай акадэміі акмеалагічных навук (1995), акадэмік Міжнароднай акадэміі тэхнічнай адукацыі (1995).

У 1936 г. працаваў настаўнікам. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны актыўна ўдзельнічаў у барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Быў у складзе знішчальнага батальёна, у падполлі, у партызанах. Займаў шэраг камандных пасад. З'яўляўся сакратаром падпольнага райкома камсамола, упаўнаважаным асобага аддзела атрада ў 10-й Журавіцкай брыгадзе, памочнікам камісара па камсамольскай рабоце, начальнікам асобага аддзела атрада ў складзе 1-й Буда-Кашалёўскай брыгады. З 1943 г. у сістэме народнай асветы — дырэктар Журавіцкай СШ (Рагачоўскі р-н), Кармянскай СШ, Кармянскай сярэдняй школы-інтэрната (Гомельскі р-н). У 1950 г. скончыў БДУ. З 1974 г. рэктар Мазырскага педагагічнага інстытута. З 1985 г. дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф. Скарыны. Аўтар больш як 100 публікацый, у якіх даследаваны праблемы тэорыі, методыкі і гісторыі

педагогікі і асветы. Яны выдадзены на беларускай, рускай, украінскай і нямецкай мовах. Удзелу настаўнікаў і вучняў у партызанскім руху і дзейнасці школы на Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны прысвечаны кнігі «Каля ціхай Серабранкі» (Мн., 1975) і «У імя жыцця» (Мн., 1981). Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна (1960, 1971), ордэнам Айчыннай вайны II ступені (1985), ордэнам Славы III ступені (1945), 13 медалямі, знакам «Партызан Беларусі 1941 – 1945 гг.»; трыма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР (1964, 1968, 1981). Лаўрэат Скарынаўскіх чытанняў па праблеме тэорыі адукацыі і навучання (1990).

Красавік 1943 г. для партызан быў вельмі цяжкі. Дарогі і сцежкі развезла ад дажджоў. Непралазная мешаніна са снегу і гразі прыкавала партызан да часовых лагераў і лясных вёсак. Народныя мсціўцы не трацілі дарма часу. Асноўны ўдар трэба было нанесці па чыгуначных камунікацыях праціўніка на ўчастку Жлобін — Гомель. Акупанты на найкарацейшым для нас шляху — да станцыі Хальч — насадзілі гарнізоны, а на самой чыгунцы цяпер дзейнічала спецыяльная ахова. Першыя ваенныя аперацыі і прадугледжвалі разгром гэтых гітлераўскіх гарнізонаў. Аперацыі прайшлі паспяхова, і вораг адчуў, што ў міжрэччы Дняпра і Сожа дзейнічае буйная партызанская групоўка. Акупанты маглі прыняць контрмеры, таму партызаны ўмацавалі сувязь з падпольшчыкамі, пасылалі сувязных у раённыя цэнтры. Мяне накіравалі ў Карму ў разведку. Падпольшчыкі перадалі, што рыхтуецца небывалая яшчэ для гэтых мясцін вялікая карная экспедыцыя супраць партызан. Таму 27 красавіка было прынята рашэнне: на працягу ночы вывесці ўсе атрады ў Буда-Кашалёўскі раён, у Лозаўскі лес. Гэты масіў шырокі, з трох бакоў акружаны балотамі. Адзіная прасёлачная дарога перасякала лес з в. Лозаў на Стоўпню. На ўзлессі знаходзіліся акопы, пакінутыя чырвонаармейцамі яшчэ ў 1941 г. Праціўніку ж прыходзілася наступаць на адкрытай мясцовасці. У выпадку зацяжнога бою можна было б карыстацца і боепрыпасамі з ваеннага склада, пакінутымі нашымі часцямі ў час адступлення. І яшчэ адна несумненная выгада: да Лозаўскага лесу адным вуглом прымыкае Рагінская лясная дача, значыць, у крайнім выпадку можна будзе зманеўраваць. Прыкрываць адыход брыгады заставаўся атрад К.М.Драчова. І

М.А.Дзмітрыеў.

К.М.Драчоў.

не толькі прыкрываць, але і стварыць выгляд, што тут дзейнічаюць галоўныя партызанскія сілы.

Раніцай на прывале побач з Лозавам я знайшоў Белых і Дзікана, паведаміў ім звесткі, дабытыя ў Карме. За Сожам гітлераўцаў не было. Яны рэдка з'яўляліся ў тых месцах. Калі перадыслацыравацца за раку, то адзіная невялікая перашкода — гарнізон у самім мястэчку Карма.

Дзікан паведаміў, што ўжо наладжана сувязь з кармянскімі партызанамі. Яе ўстанавіў Ціханаў. Ён падрыхтаваў і дзве пераправы — у асноўным на лодках і плытах. Стала вядома, што напярэдадні кармянскія паліцаі выехалі ў бок Доўска.

Пазней мы даведаліся, што адбылося ў тых месцах, адкуль адышла брыгада.

У тры гадзіны ночы Карп Міхайлавіч Драчоў падняў па трывозе свой атрад і павёў яго праз вёскі Каменка Стралкоўская і Каменка Рыскаўская. На світанку падышлі да Варварына. І тут разведка далажыла, што з другога канца ў вёску ўваходзіць невядомая ўзброеная калона, якая рухаецца ў процілеглы бок ад Лозава. Праз некалькі хвілін прыскакаў другі разведчык, які паведаміў, што гэта — карнікі, на іх узбраенні гарматы, танкетка, бронемашына.

Карнікі лічылі, што перад імі галоўныя сілы партызан. Раніцай праціўнік пачаў хаатычную кулямётна-аўтаматную страляніну, каб намацаць дыслакацыю партызан. Першая атака гітлераўцаў была адбіта, а за дзень партызаны адбілі дзесяць атак фашыстаў. Пад вечар карнікі ўвайшлі ў Каменку. Ноччу Карп Міхайлавіч увёў свой атрад у Лозаўскі лес.

Да гэтага часу партызанская разведка, сувязныя і падпольшчыкі высветлілі сілы

М.П.Жураўлёў.

праціўніка. Аказалася, што ў склад карнай экспедыцыі ўваходзіў полк рэгулярнай арміі, які сканцэнтраваўся ў Меркулавічах і Крыўску. Другі полк, сфарміраваны з асабістага складу гітлераўскіх гарнізонаў з Рагачова, Жлобіна, Буда-Кашалёва, Чачэрска, Кармы, Прапойска, Чэрыкава, Крычава, Журавічаў і Гомеля, размясціўся ў Серабранцы, Гадзілавічах і Доўску. Акрамя гэтага, 800 коннікаў знаходзіліся ў Дзербічах. Агульная колькасць карнікаў перавышала пяць тысяч. На ўзбраенні яны мелі палявую артылерыю, танкеткі, бронемашыны, кулямёты, аўтаматы, карабіны, вінтоўкі. Сувязныя і падпольшчыкі Фядора Маркава, Марыя Патапенка, Васіль Дзмітрыеў і Марк Мачэча выявілі, што карнікі павінны былі прачасаць лясы ў трохвугольніку Рагачоў — Доўск — Гомель і знішчыць партызан.

Гэтай велізарнай карнай экспедыцыі процістаяла 10-я Журавіцкая брыгада колькасцю 2494 байцы. З узбраеннем у нас было нягуста: 2101 вінтоўка, 68 аўтаматаў, 96 кулямётаў, 24 мінамёты, гармата. Вядома, ні танкетак, ні бронемашын мы не мелі.

Да бою партызаны ўстанавілі мінныя палі. Замініравалі лясную дарогу, якая ішла з Лозава на Стоўпню. Напярэдадні бою 8 атрадаў занялі пазіцыі. Надзейна ўмацавалі стыкі паміж падраздзяленнямі. Выставілі заставы. Устанавілі гармату і мінамёты. У тры гадзіны ночы 29 красавіка 1943 г. разведчыкі данеслі, што карнікі падцягнулі свае сілы да вёсак Зорка, Раманаўка, Малінаўка, Падзелы, Лозаў, Царкоўе, Рагінь, Любань, Негаўка. Мы былі акружаны з усіх бакоў. Абарона таксама была кругавой. Роўна ў 9 гадзін раніцы 29 красавіка пачалася атака. Больш за 300 коннікаў на шалёнай хуткасці кінуліся на пазіцыі 260-га і 256-га атрадаў. Калі да коннай лавіны засталося метраў 400, Белых, які знаходзіўся на пазіцыі, даў каманду страляць.

Поле перад партызанскімі рубяжамі ўсеялася забітымі карнікамі і коньмі. Каля 50 коней, але ўжо без коннікаў, праравіліся ў лес. Частцы карнікаў удалося ўцячы. Але не прайшло і паўгадзіны, як праціўнік зноў перайшоў у наступ. Сюды былі кінуты танкеткі і бронемашыны. Шчыльны агонь кулямётаў і гармат абрушыўся на нашы пазіцыі.

Але браніраваныя машыны наскочылі на міннае поле. Артылерыйскі разлік Івана Дышлова трапным агнём падбіў танкетку і бронемашыну. Уцалелыя павярнулі да вёскі. Тады артылерысты перанеслі агонь на аўтакалону, якая выпаўзала з в. Лозаў. Па ёй ударылі і батальённыя мінамёты. Чорныя слупы дыму падняліся над дзвюма аўтамашынамі.

Карнікі спрабавалі знайсці слабыя месцы ў нашай абароне. Яны пачалі шалёныя атакі на пазіцыі партызанскіх атрадаў П.Я.Мацюшкова і Л.Ф.Шылава. Але і там фашыстам праравацца не ўдалося.

Злева ад мяне каля дубовага пня ляжаў Мікалай Жолудаў, далей — Іван Вострыкаў, Мікалай Тылыгузаў, Аляксандр Рудэнка. Справа — Мікалай Купцоў, Яўген Анаськоў, камісар атрада Афанасій Гонтараў, побач з ім — начальнік штаба Васіль Анікіевіч. А крыху ззаду нас — сам камандзір Міхаіл Жураўлёў, тут жа Герасім Цімашэнка. Снарады свісталі над галовамі і разрываліся ў глыбіні лесу. А міны больш каварныя. Яны шыпяць зверху і быццам бы з неба падаюць амаль на нашы пазіцыі. Мы шчыльна прыціскаемся да зямлі паміж пнямі.

Жураўлёў загадаў сустрэць карнікаў гранатамі.

Я ўзняўся ва ўвесь рост і рэзкім узмахам шпурнуў гранату туды, дзе трое немцаў цягнулі кулямёт. Не паспела заглохнуць рэха разрываў, як зычны голас камісара Афанасія Гонтарава загадаў прабірацца наперад.

Моцнае «ўра!» пракацілася па ўзлессі. З флангаў ударылі кулямёты, кароткімі чэргамі заліліся аўтаматы.

Карнікі на вокамгненне застылі на месцы, потым падаліся назад і раптам пабеглі.

На нашым участку акупанты не паказваліся да вечара. Яны перанеслі націск на

левы фланг. Мяне направілі ў штаб брыгады для сувязі.

Стагнаў стары лес ад разрываў мін і снарадаў, перастукаў аўтаматаў, доўгіх кулямётных чэргаў. Кароткія сутычкі, атакі і контратакі чаргаваліся паміж сабою.

Белых загадаў мабілізаваць усіх веставых, тых, хто папраўляецца, неадкладна забяспечыць боепрыпасамі ўсе атрады.

Праз паўгадзіны начальнік брыгаднага пункта боезабеспячэння Зубкоў дакладваў Белых і Антонаву, што боепрыпасамі папоўнены ўсе падраздзяленні. І тут жа паказаў у бок, дзе шчыльнай групай стаяла каля трыццаці старых, жанчын і параненых, якія маглі трымацца на нагах і таму не пажадалі перадаць сваю зброю таварышам.

Камбрыг і начальнік штаба павярнуліся, сустрэлі суровыя позіркі. Сярод параненых з павязанай галавою стаяў і кулямётчык Пётр Мішын. Ён цвёрда выступіў наперад, прастуджаным голасам папрасіў, каб дазволілі вярнуцца да свайго «максімкі», бо яшчэ не паспеў разлічыцца з фашыстамі.

Белых з Антонавым пераглянуліся. Яны зразумелі кулямётчыка Мішына, параненага 24 лютага ў баі пад Фундаменкай і, канечне, выканалі яго просьбу.

А напружанасць бою, між тым, узрастала. Веставыя дакладвалі камбрыгу, што карнікі цяпер з трох бакоў ідуць у атаку. Было вырашана падпусціць іх бліжэй, страляць толькі напэўна, утрымлівацца на ўзлессі і не выходзіць у поле.

Гэта атака, аказваецца, была разлічана на тое, каб адцягнуць галоўныя сілы партызан. Была шостая гадзіна вечара. Моцная варожая групоўка, выкарыстоўваючы перасечанасць мясцовасці, якая парасла хмызняком, зрабіла спробу прарвацца ў лес праз лінію абароны 263-га атрада. Аб гэтым Таццяна Карніенка неадкладна далажыла камбрыгу.

Белых загадаў Драчову накіраваць туды дзве роты рэзерву і не пускаць карнікаў у лес.

Драчоў узмацніў 1-ю і 2-ю роты дыверсійнымі групамі, сам павёў іх на дапамогу 263-му атраду. Падмацаванне падаспела своечасова. Карнікі адступілі з лесу, пакінуўшы забітых і параненых.

Бой пачаў сціхаць і на іншых участках. Толькі злева, на пазіцыях атрада імя Чкалава, ён успыхнуў з патроенай сілай, змяшчаючыся да стыку з 260-м атрадам. Белых накіраваў туды роту на падмацаванне.

На асобных участках бой то заціхаў, то ўспыхваў з новай сілай. Кулямётчык Пётр Мішын якраз своечасова дабраўся да свайго «максімкі». Кулямёт маўчаў. Пётр ліквідаваў няспраўнасць і праз некалькі хвілін, выглядаючы цэль, загадаў свайму другому нумару Віктару Кавалёву падаваць кулямётную стужку. Праз дзесяць хвілін у сектары Мішына карнікі былі прыціснуты да зямлі.

Нямецкі афіцэр вырваў у аднаго з салдат вінтоўку і пачаў страляць у кулямётчыка.

Мішын даў кароткую кулямётную чаргу, прыўзняў забінтаваную галаву над шчытком кулямёта і... апусціў яе. Куля афіцэра забіла Пятра Пятровіча Мішына. Кулямёт змоўк, але толькі на некалькі хвілін. Віктар Кавалёў перацягнуў яго ўправа. Фашысты, што ўзняліся ў атаку, заляглі пад кулямётным агнём.

На пазіцыях 261-га атрада мінамётчык Міхаіл Мельнікаў пераносіў свой мінамёт з месца на месца і пасылаў міну за мінай у ланцугі карнікаў. Побач з ім быў сябар Аляксандр Рудэнка.

Часам надыходзілі хвіліны, калі сціхаў агонь праціўніка. І тады нас ахопліваў дзіўны настрой — хіліла на сон. Магчыма, аказвалі якісьці ўплыў голад і смага. Дзіўна, але есці і піць не хацелася. Адбывалася, безумоўна, і нервовае перанапружанне. На пазіцыі 256-га атрада была распачата яшчэ адна, самая шалёная атака.

Перастрэлка паміж карнікамі і партызанамі працягвалася па ўсёй лініі абароны да 10 гадзін ночы. У штаб брыгады данеслі, што праціўнік адводзіць свае войскі. Так закончыўся бой каля Лозаўскага лесу — перамаглі партызаны. Многіх не далічыліся і мы.

Сярод загінуўшых быў і наш славуты камандзір брыгады Сцяпан Мітрафанавіч Белых. Яго пахавалі каля в. Рыскава ў Рагачоўскім раёне. Партызаны далі клятву адпомсціць за яго смерць праклятым фашыстам. Адзін за адным падыходзілі да труны камандзіры і камісары атрадаў, партызаны. Боль страты сціскала горла, скоўвала губы. Сотні партызанскіх він-

товак, карабінаў і аўтаматаў далі трохразовы развітальны салют...

Камандзірам 261-га партызанскага атрада быў лейтэнант Чырвонай арміі Міхаіл Пятровіч Жураўлёў. Вырваўшыся з акружэння, уступіў у партызаны. Быў камандзірам узвода, узначальваў падрыўную групу, вырас да камандзіра атрада. Захаваўся яго дзённік суровых ваенных гадоў. Вось адзін з запісаў, які датычыцца Лозаўскага бою: «29 красавіка 1943 г. у Лозаўскім баі, нараўне з 256-м, 260-м і іншымі партызанскімі атрадамі 261-ы на працягу 14 гадзін прымаў на сябе галоўныя ўдары гітлераўцаў. Вораг разбіты нашчэнт».

1 мая 1943 г. брыгада перадыслацыравалася ў лес пад Турск. Мяне пакінулі ў Лозаве, даручыўшы сабраць дробныя аператыўныя партызанскія і асобныя дыверсійныя групы і вывесці іх у месцы дыслакацыі 10-й Журавіцкай партызанскай брыгады на ўзмацненне атрадаў, якія панеслі сур'ёзныя страты ў баях у Лозаўскім лесе. Я выканаў заданне, вывеў 170 байцоў.

У штабе брыгады са мной гутарыў упаўнаважаны Беларускага штаба партызанскага руху Н.К.Ждановіч. Неабходна было папоўніць партызанскія атрады ў рэгіёне міжрэчча Дняпра і Сожа, а таксама сур'ёзна аслабелыя ў ходзе карнай экспедыцыі. Трэба было і ў міжрэччы сабраць дробныя партызанскія і дыверсійныя групы і папоўніць імі атрады 1-й Буда-Кашалёўскай брыгады. Я выканаў і гэта заданне. З баямі аб'яднаныя групы партызан прарываліся ў Свержанскія лясы. У гэтых баях я быў паранены і кантужаны, але заставаўся ў страі і выконваў абавязкі начальніка асобага аддзела атрада імя Чапаева 1-й Буда-Кашалёўскай брыгады.

Сакрэтная справа

З успамінаў Таццяны Кандрацьеўны Зубавай, сувязной партызанскага атрада імя М.І.Калініна

ЗУБАВА (СУВАЛАВА) Таццяна Кандрацьеўна, нарадзілася 19 студзеня 1921 г. у в. Куклічы Чачэрскага р-на. У 1940 г. пасля заканчэння Чачэрскага педагагічнага тэхнікума працавала настаўніцай у в. Палессе. Прымала актыўны ўдзел у партызанскім руху. Са жніўня 1941 г. была сувязной падпольнай групы сакратара Чачэрскага падпольнага райкома КП(б)Б П.І.Дзедзіка, пазней — партызанскага атрада імя М.І.Калініна і 1-й Гомельскай партызанскай брыгады. Пасля Вялікай Айчыннай вайны працавала ў райкоме камсамола, у 1946 — 1997 гг. — настаўніцай біялогіі СШ № 1 г. Чачэрска. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «Партызан Айчыннай вайны» II ступені і інш.

Гомельская вобласць у яе даваенных межах мела на сваёй тэрыторыіі толькі адзін буйны лясны масіў, які межаваў на поўначы, паўночным усходзе і ўсходзе з лясным масівам суседніх абласцей, — Чачэрскі лес. Усе астатнія лясы на поўначы Гомельскай вобласці параўнальна невялікія.

Акупанты арганізавалі тут добра прадуманую сістэму аператыўных паліцэйскіх і вайсковых гарнізонаў, рупліва сачылі за ляснымі масівамі. Летам лясы добра праглядаліся па дзялянках, а зімой снежныя заносы стваралі для партызан дадатковыя перашкоды. Па снезе не складала цяжкасцей знайсці след, які вёў ад дарогі ў лес.

Умовы дзейнасці сувязных, якія былі пакінуты ў падполлі для разгортвання партызанскага руху на часова акупіраванай гітлераўцамі тэрыторыі, аказаліся значна больш складанымі, чым гэта меркавалася. З пачатку вайны хуткае прасоўванне на ўсход фашысцкіх полчышчаў не дазваляла прадугледжваць шматлікія сітуацыі, якія ў выніку мелі месца на акупіраванай ворагам тэрыторыі.

У гэтых умовах у першы, пачатковы перыяд арганізацыі падпольнага і партызанскага руху роля сувязных была асабліва важная.

Праз сувязных, пакінутых у населеных пунктах паблізу загадзя арганізаваных баз магчымай дыслакацыі Уваравіцкага і Буда-Кашалёўскага партызанскіх атрадаў, удалося ўстанавіць, што гэтыя атрады, апынуўшыся ў зоне актыўных баявых дзеянняў, не змаглі замацавацца на месцах базіравання і разам з часцямі Чырвонай арміі адышлі на ўсход. Дыверсійным групам і атрадам, якія прыбылі з-за лініі фронту, давялося практычна нанава фарміраваць на гэтай тэрыторыі партызанскія атрады, дапамагаць разгортваць актыўныя баявыя дзеянні ў тыле ворага.

Да канца 1941 г. у Чачэрскіх лясах

базіраваліся 4 партызанскія атрады і дзве баявыя групы пад камандаваннем М.М.Ігнатовіча і Н.А.Міхайлашава. Востра паўстала пытанне забеспячэння харчаваннем. Усю восень і зіму 1941—1942 гг. сувязныя падказвалі партызанам месцы размяшчэння харчовых баз праціўніка, колькасць войскаў у гарнізонах і паліцэйскіх фарміраванняў у апорных пунктах, якія абаранялі гэтыя базы.

Сувязныя аператыўна забяспечвалі кіраўніцтва падполля і партызанскіх атрадаў патрэбнай ім інфармацыяй. Так, з нашых данясенняў да 7 лютага 1942 г. камандаванне партызанскіх атрадаў нашай зоны дакладна ведала, што гітлераўцам вядомы базы дыслакацый некаторых атрадаў і дыверсійных груп, у тым ліку і нашага атрада — імя М.І.Калініна, і што ўжо 9 лютага фашысты распачнуць карную аперацыю.

Атрымаўшы гэта данясенне, партызанскія атрады 8 лютага перайшлі на новыя месцы базіравання. Выезд карнікаў нічога не даў.

Па ланцужку сувязных, што размяшчаліся на важных кірунках супраціўлення акупантам, здзяйснялася сувязь партызанскіх атрадаў Уваравіцкага, Буда-Кашалёўскага раёнаў з партызанамі Чачэршчыны, Веткаўшчыны і іншых суседніх рэгіёнаў Гомельшчыны.

Асабліва востра паўстала пытанне аб сувязях падпольных арганізацый, партызанскіх атрадаў і груп са штабамі аператыўнага кіраўніцтва сумеснымі баявымі дзеяннямі па ліквідацыі буйных варожых гарнізонаў і важных у стратэгічных адносінах ваенных аб'ектаў акупантаў. Гітлераўцы разумелі, што арганізацыя партызанамі такіх аперацый магчыма толькі пры актыўным удзеле сувязных, выкарыстанні для сувязі канспіратыўных кватэр і явак, і літаральна ўстройвалі паляванне за актывістамі з моладзі. У сельскай мясцовасці работа сувязнога была асабліва небяспечнай. Тут кожны чалавек на вачах ва ўсіх, а ўстаноўлены гітлераўцамі акупацыйны рэжым абмяжоўваў адносіны паміж людзьмі нават у час знаходжання на вуліцы.

Па заданні партызанскіх атрадаў і кіраўнікоў падполля сувязныя вялі разведку за перамяшчэннем праціўніка, па размяшчэнню абарончых збудаванняў, апорных пунктаў, руху аўта- і чыгуначнага

Т.К.Зубава (Сувалава).

транспарту. Сувязныя першыя сустракалі групы, якія засыліся з-за лініі фронту, уваходзілі ў кантакт з імі.

У сярэдзіне кастрычніка 1942 г. ва Уваравіцкі раён прыбыла група Андрэя Пракопавіча Байкова, а ў Буда-Кашалёўскі — Антона Антонавіча Хамянка. Пры пераходзе чыгункі Мінск — Орша група А.А.Хамянка трапіла пад абстрэл праціўніка. У баі загінуў яе камандзір, і ў раён дыслакацыі групу прывёў Мікалай Дзянісавіч Сцефановіч. Сувязныя дапамаглі аднавіць колькасны склад груп і папоўніць запасы харчавання.

У снежні 1942 г. фашысты арганізавалі блакаду партызанскіх атрадаў паўночнаўсходняй часткі Гомельскай вобласці з выкарыстаннем рэгулярных войскаў, артылерыі, танкаў і авіяцыі. Народныя мсціўцы вымушаны былі пакінуць свае лагеры і перайсці ў Амялькаўскія лясы на Браншчыну.

23 снежня 1942 г. сюды перабазіраваліся партызанскія атрады Буда-Кашалёўскага, Уваравіцкага, Чачэрскага і іншых раёнаў. 28 лютага 1943 г. па ўзаемнай згодзе камандавання Чачэрскага атрада імя М.І.Калініна і Кармянскага атрада імя Варашылава на іх базе была сфарміравана 1-я Гомельская партызанская брыгада.

У складзе атрада імя М.І.Калініна я ўдзельнічала непасрэдна ў 17 баявых аперацыях. Была сувязной сфарміраванай партызанскай брыгады, выконвала абавязкі сакратара падпольнай камсамольскай групы, якая складалася з 4 чалавек. Мы распаўсюджвалі партызанскія лістоўкі, здабывалі даныя аб прыбыцці і месцах размяшчэння нямецкіх войскаў і паліцэйскіх фарміраванняў, іх колькасці, неабходныя для паспяховага выканання партызанскіх аперацый.

У жніўні 1943 г. камандзір 1-й роты атрада імя М.І.Калініна Павел Іванавіч Маслаў атрымаў загад камандавання брыгады ўзарваць вадакачку на станцыі Буда-Кашалёўская. На другі ж дзень, захапіўшы боепрыпасы і тыднёвы паёк, рота знялася з месца, фарсіравала Сож, непрыкметна перайшла ў Віктарынскую дачу невялікага Забалоцкага лесу.

Буда-Кашалёўская вадакачка была агароджана двума радамі. Паміж імі зроблены земляны насып, які не прабівалі не толькі кулі, але нават і малакаліберныя снарады. Па чатырох вуглах пабудаваны дзоты, кожны з якіх меў кулямёт. На адлегласці 20 — 25 метраў ад агароджы было яшчэ ўстаноўлена восем радоў калючага дроту. Над будынкам вадакачкі ўзнімалася вышка, на якой пастаянна знаходзіўся вартавы. У яснае надвор'е кругавы агляд з вышкі быў ад трох да пяці кіламетраў. Вадакачка асабліва ахоўвалася ў начны час. Разведаць і ўдакладніць наяўнасць агнявых кропак, месца адпачынку асабовага складу, аховы і месца захавання зброі дапамаглі падпольшчыкі Сіма Дубчанка, Ганна Волкава і Васіль Яўдочнаў.

Васіль Яўдочнаў жыў за 100 — 110 метраў ад вадакачкі. Як сусед, ён браў цёплую ваду для сямейных патрэб, выглядваючы баявыя кропкі, парадак нясення ахоўнай службы.

Аперацыю праводзілі днём. Была сфарміравана штурмавая група ў складзе 32 чалавек. Іх узброілі аўтаматамі і ручнымі гранатамі. У кароткай схватцы 8 фашыстаў былі забіты і 22 узяты ў палон. З боку партызан страт не было. Мініраванне вадакачкі выканалі партызаны з дыверсійнай групы Э.В.Лаўрыновіча. Неўзабаве адзін за адным прагрымелі 6 магутных выбухаў. Вадакачка ўзляцела ў паветра. Загад быў выкананы.

У партызанскім атрадзе імя М.І.Калініна ў лютым 1942 г. я пазнаёмілася са сваім будучым мужам Іванам Пракопавічам Зубавым, які са жніўня па кастрычнік 1943 г. быў камандзірам гэтага партызанскага атрада.

З улікам абставін

З успамінаў Кацярыны Васільеўны Савельевай, партызанкі 1-й Буда-Кашалёўскай брыгады

САВЕЛЬЕВА Кацярына Васільеўна, нарадзілася 23 сакавіка 1923 г. у в. Масцеравая Слабада Кармянскага р-на Гомельскай вобласці. Скончыла Гомельскі настаўніцкі інстытут (1951), матэматычны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута (1957). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Заслужаны настаўнік БССР (1966). Працавала настаўнікам матэматыкі Кармянскай сярэдняй школы, дырэктарам школы, старшым выкладчыкам Мазырскага педагагічнага інстытута. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны» II ступені, «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна» і інш. Памерла ў 1998 г.

У лютым 1943 г. акупацыйныя ўлады распачалі супраць партызан шэраг карных аперацый. З студзеня карны батальён «Днепр», узброены 38 станковымі кулямётамі, 6 мінамётамі, 56 аўтаматамі, вінтоўкамі, увайшоў у в. Серабранка. Мэта карнікаў — знайсці партызанскія базы, уцягнуць разрозненыя атрады партызан у бой, акружыць і сумесна яшчэ з двума карнымі батальёнамі, якія стаялі ў баявой гатоўнасці ў Бабруйску і Гомелі, знішчыць партызан. За маскіровачныя халаты жыхары ахрысцілі карнікаў «белахалатнікамі».

Камандаванне нашай партызанскай брыгады даручыла нам выявіць лаяльна настроеных у батальёне і схіліць іх да пераходу ў партызаны.

Батальёнам «Днепр» камандаваў Пётр Мельнікаў з в. Зяньковіна, што знаходзіцца каля Кармы, а родны яго брат Міхаіл быў партызанам нашага злучэння. Было вырашана прывезці ў Серабранку маці камандзіра батальёна.

Перагаворы з Мельнікавым вялі я і Міхаіл Афанасьевіч Дзмітрыеў, начальнік асобага аддзела «Смерш» атрада імя Чапаева ў доме Ксеніі Архіпаўны Гарохавай. Спачатку перадалі яму запіску ад Міхаіла, у якой той прасіў брата аб сустрэчы. Пётр наадрэз адмовіўся.

— Родны ты мой сыночак! — загаласіла маці. — Ты ж можаш забіць Мішу ці ён заб'е цябе. Сустрэнься з ім. Вось людзі добрыя дапамогуць вам. Ты, мабыць, не верыш, што ён у партызанах? Павер мне: я ж дваіх вас пад адным сэрцам насіла.

Нізенькая, згорбленая ад гора маці ўвесь час плакала. А ён таксама нізкі, але каржакаваты, сядзеў побач з ёй і маўчаў. Яна гладзіла яго валасы, ужо парадзелыя, і ўсё ўгаворвала:

— І людзі паважаюць мяне з-за Мішы, што ён з усімі. А вось як з-за цябе ў вочы ім глядзець павінна?

— Мне не даруюць, усё роўна расстраляюць, — гаварыў Пётр, і на яго бледным твары ярка выступалі вяснушкі.

Дзмітрыеў ведаў яго раней, яшчэ да вайны, а з Мішам Мельнікавым дружыў. Сям'я была працавітая, паважаная ў вёсцы. Маці — ударніца, удзельніца Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, узнагароджана медалямі. Бацька таксама быў добрым калгаснікам. Памёр напярэдадні вайны.

— Шчаслівы бацька, што не дажыў да гэтага сораму, шчаслівы, — плакала маці.

Нечакана Пятро ўскочыў і захадзіў па хаце.

— А я нешчаслівы. Савецкая ўлада не дала таго, што павінна была даць. — Ён гаварыў хутка заплятаючымся языком, праглынаючы канчаткі слоў, хаця быў зусім не п'яны. Чаму мне ў сельсавеце тады не далі даведкі ў рабфак? Чаму? Маё жыццё знявечылі з-за гэтай даведкі.

— Не тая прычына, каб растлумачыць здраду, — умяшаўся ў размову Дзмітрыеў.

— Добра табе разважаць. А калі б не прынялі цябе ў інстытут, што б ты запеў?

— І без інстытута жыць можна.

Ён прысеў, а рукі маці, нібыта маленькага хлопчыка, гладзілі рыжую галаву сына-карніка.

Мельнікаў не згадзіўся на здачу батальёна. Ён прама сказаў: — Я буду ўказваць свой маршрут, а вы паведамляйце куды ведаеце... Справа ваша. — Ён рэзка павярнуўся, бліснуў афіцэрскімі пагонамі, накіраваўся да дзвярэй, на парозе кінуў праз плячо: — Перадайце, што заўтра іду

К.В.Савельева.

на Фёдараўку і Дзедлава. Але... — Ён са злосцю зірнуў на нас. — Але калі партызаны навяжуць бой, да нас тут жа прыйдзе дапамога.

Рэзка ляпнулі дзверы, стала ціха, толькі на лаўцы каля стала ціхенька ўсхліпвала старэнькая маці.

Камандаванне партызанскага атрада прыняло рашэнне не ўвязвацца ў бой з карнікамі. Меркавалі, што Мельнікаў абразуміцца.

Увечары, калі батальён карнікаў вярнуўся ў вёску, п'яныя карнікі шнырылі па вуліцы. Цяпер п'яны быў і камандзір. Патрэбна было неадкладна адыходзіць. М.А.Дзмітрыеў узяў вядро, якое стаяла каля парога, і мы выйшлі на вуліцу. Да свайго дома прабіраліся гародамі.

— Кацюша, — сказаў Дзмітрыеў, — ты ўжо пасачы за камандзірам батальёна. Пастарайся не адпускаць яго ад маці.

Пётр Мельнікаў зноў указаў маршрут, па якім заўтра пойдуць карнікі. А між тым па хатах, дзе спыніліся карнікі, жанчыны ўгаворвалі іх не ўступаць у бой з партызанамі: усе, маўляў, вы свае, рускія, ды і вёскі могуць пацярпець.

Кожны дзень я перадавала для камандавання атрада маршрут руху карнікаў, аб настроі ў батальёне. А ён быў зусім не баявы. Неўзабаве немцы адазвалі батальён і накіравалі ў Бабруйск на перафарміраванне.

Мой лёс

З успамінаў Паўла Герасімавіча Крышталя, былога камандзіра ўзвода 1-й Гомельскай партызанскай брыгады

Маё жыццё складанае і цяжкае. Я жыхар Заходняй Беларусі. У 20-гадовым узросце ўступіў у члены КПЗБ. Быў членам акруговага камітэта. Мяне высачыла польская дэфензіва і на 4 гады кінула за краты. Вызваліла мяне Чырвоная армія ў 1939 г., калі народ Заходняй Беларусі аб'яднаўся з братамі ўсходняй часткі рэс-

публікі. Скончыліся дні змрочнай польскай акупацыі. Я працаваў старшынёй сельскага Савета, а перад самай вайной — старшынёй Лагішынскага гарадскога пасялковага Савета.

Вайна з Германіяй застала мяне ў санаторыі «Наваельня». Вярнуцца дадому я не змог і пайшоў на ўсход разам з адступаючымі часцямі Чырвонай арміі. Зведаў і акружэнне, і палон. Тройчы трапляў у палон, тройчы ўцякаў. На трэці раз пашанцавала: саскочыў з поезда на хаду, дабег да лесу, што каля пасёлка Вясёлы Пахар, і сустрэў там разведчыка Цімафея Сцепаненку. Той і прывёў мяне да партызан, у атрад Рыгора Карпака. Праз некаторы час мы сустрэліся з дыверсійнай групай Э.Лаўрыновіча. Ён мне адразу спадабаўся, асабліва іх дзейнасць на чыгунцы, і я перайшоў да яго. Наша група дзейнічала ў Бранскіх, Чачэрскіх лясах. Але пастаяннай нашай базай быў Віктарынскі лес у Буда-Кашалёўскім раёне. Мы літаральна асядлалі чыгунку Жлобін — Гомель. Я хадзіў на «чыгунку» шэсць разоў. З часам я стаў камандзірам узвода ў роце Паўла Маслава.

У пачатку чэрвеня ў штаб 1-й Гомельскай партызанскай брыгады прыбыў сувязны з Кармы і далажыў, што сельскагаспадарчы камендант выкліканы ў Гомель. Вырашылі сустрэць яго як след. Хутка партызаны асядлалі коней. Начальнік штаба брыгады Аляксей Нічыпаравіч Падабедаў адабраў самых вопытных партызан, у тым ліку Івана Гатальскага, Сцяпана Сандзіна, Васіля Паўлава, Івана Самсонава і некалькі падрыўнікоў з групы Эдуарда Лаўрыновіча. Пайшла з імі і група з майго ўзвода. Засаду зрабілі каля вёскі Шарыбаўка, на шашы Чачэрск — Забалоцце. Чакаць прыйшлося нядоўга. Пачуўся гул матораў. З-за павароту паказаліся тры аўтамашыны. Легкавую аўтамашыну ззаду і спераду суправаджалі з інтэрвалам у 20—25 метраў два грузавікі з вартай.

Як толькі машыны ўвайшлі ў зону засады, партызаны па сігнале Падабедава адкрылі агонь. Машыны спыніліся. За хвілін дзесяць усё было скончана. Нам дасталася шмат зброі, патронаў і гранат. Я выхапіў з палаючай легкавушкі новы аўтамат, з якога яго ўладальнік не паспеў зрабіць ніводнага выстралу. Цудам удалося выратавацца толькі перакладчыцы, маладой дзяўчыне.

У вёсцы Прыямнае вырашылі адпачыць. І дарэмна. Каля роты карнікаў раптам уварваліся ў вёску. Нам удалося адбіцца ад іх.

Пасля нашай засады акупанты загадалі старастам вёсак скасіць пасевы ўздоўж шашы на 70 метраў з абодвух бакоў. Але гэта партызан не спыніла.

Асабліва вызначыліся партызаны ў «рэйкавай вайне». Нам трэба было штурмам узяць пяць дзотаў, умацаваныя блокпасты каля вёсак Патапаўкі, Галы, Будкі. Штурм пачаўся адначасова. Былі падаўлены дзоты, ачышчаны ад нямецкай аховы больш як чатыры кіламетры чыгункі. Каб не падышло немцам падмацаванне бранепоездам, мы замініравалі чыгунку з боку Буда-Кашалёва, зрабілі засады каля вёскі Чырвоны Курган і раз'езда Шарыбаўка. Узвод Івана Каротчыкава засеў на грунтавой дарозе каля вёскі Кастрышча, каб забяспечыць адыход партызан пасля баявой аперацыі. 1500 чыгуначных рэек узарвала 1-я Гомельская партызанская брыгада за дзве аперацыі. У іх загінулі партызаны Івашкоў і Бурцаў.

Падрыхтаваў І.П.Чарняк.

З «вудай» на варожы эшалон

З успамінаў Мікалая Мікалаевіча Жыгальцова, былога начальніка асобага аддзела партызанскай брыгады імя В.І.Чапаева

Летам 1942 года, калі разгарэлася Сталінградская бітва, узмацніліся ўдары партызан па камунікацыях ворага.

Разам з дыверсійнай групай А.Ісачанкі пайшоў я на падрыў варожага эшалона. Прайшлі каля 100 кіламетраў (атрад стаяў тады ў Лоеўскім раёне) да станцый Салтанаўка і Буда-Кашалёва на чыгунцы Мінск — Гомель. Суткі вывучалі рух паяздоў, паводзіны аховы. У наступную ноч мы з Сашам Ісачанкам падпаўзлі да чыгункі, паставілі пад рэйку міну-«вуду», замаскіравалі яе. Шнур працягнулі ад міны да ўзлесся. Мне было даручана ўзарваць міну. Чакаць варожы эшалон доўга не давялося. З боку станцыі Салтанаўка па-

чуўся шум поезда. Я ведаў, што немцы наперадзе цягніка пускаюць платформы з пяском. Платформы я прапусціў і, калі цягнік аказаўся над мінай, тузануў за шнур. Цягнік, а за ім платформы з танкамі паляцелі пад адхон. Мы адышлі ў лес. Потым мы даведаліся, што ў выніку нашай дыверсіі быў разбіты паравоз, шэсць платформ з танкамі. На працягу сутак рух на чыгунцы быў перапынены.

Партызанскі сувязны

Калі прывезлі тол і міны з Чачэрскага лесу ў Віктарын, падрыўнікі часцей сталі хадзіць на «жалезку». Толькі ў сакавіку сорак трэцяга ўзарвалі пяць эшалонаў.

Горш стала ў красавіку. Разліліся рэчкі, балоты зрабіліся непраходнымі. Усё часцей партызаны вымушаны былі хадзіць на заданні і вяртацца назад праз вёскі і пасёлкі. Сувязныя на іх шляху ставілі «маякі» — умоўныя знакі, і пакуль усё было добра.

І на гэты раз «маяк» на плоце Сямёна Алекіна сведчыў, што дарога свабодная. Падышлі да Рудні. На скрыжаванні — натоўп моладзі, грае гармонік. Стараліся перайсці вуліцу непрыкметна. Але раптам Сандзін, які ішоў ззаду, свіснуў. Партызаны прыціснуліся да старога плоту. Бачаць, нехта ідзе. Аказалася, што гэта Тоня Шалабудава.

— Будзьце асцярожныя, — зашаптала яна, — з паўгадзіны як на Шарыбаўку праехалі на фурманках узброеныя людзі. А хто — не ведаю...

Шлях партызан таксама на Шарыбаўку. Цяпер не пойдзеш па дарозе, ды і самую вёску давядзецца абмінуць, хоць ёсць вельмі вялікая патрэба сустрэцца з Аўдашковым, партызанскім сувязным...

На світанні, зрабіўшы круг з добры дзесятак кіламетраў, падрыўнікі выйшлі да чыгункі насупраць Чырвонага Кургана. Восенню тут высеклі ўздоўж чыгункі паласу лесу метраў на трыста.

Раптам ударылі кулямёты. Адпаўзлі ў лес. Ужо амаль развіднела. Вырашылі паспрабаваць шчасця каля самай Буды-Кашалёўскай.

Зноў няўдача: застракаталі кулямёты. Дзотаў паблізу няма, а кулямёты так і сякуць з укрыцця. Значыць, і тут сакрэтныя пасты-засады.

Адышлі ў балота пад Кастрышча. Правальваліся па пояс у ледзяную ваду, забраліся ў зараснік алешніку.

На дарозе з Шарыбаўкі пачуўся скрып колаў, фырканне коней. Ехалі немцы і паліцаі, чалавек трыццаць. Не здабраваць бы, каб Тоня Шалабудава не папярэдзіла...

На передапошняй фурманцы... Аўдашкоў Міхась! У бінокль відаць: збіты, твар у сіняках, кашуля падраная, звязаны рукі. А яны сядзяць за якіх сто метраў ад дарогі і нічога не могуць зрабіць. У бяссільнай злосці сціснуў Сандзін аўтамат. Ніна Юрчанка паспешліва дастала наган з санітарнай сумкі. Але партызаны разумеюць, што яны, седзячы ў балоце, бяссільныя супраць гэтых трыццаці, узброеных да зубоў.

Вечарам — зноў на «жалезку». На гэты раз пашанцавала. Пад адхон, акрамя дзвюх платформаў з аўтамашынамі, паляцелі тры вагоны з немцамі.

Партызанскае жыццё — не адна радасць ад такіх удалых аперацый. Часам было вельмі цяжка і горка. Дарэмна прасядзеўшы ўсю ноч у засадзе, не дачакаўшыся партызан, паліцаі схапілі Аўдашкова. Білі, каб даведацца, калі прыйдуць на дыверсію партызаны. Хто яго выдаў — высветліць не ўдалося.

Раніцай атрад карнікаў выехаў з Шарыбаўкі ў Буду-Кашалёўскую. Павезлі і Міхася.

Зноў допыты, катаванні. Пасля пятага допыту партызанскі сувязны заявіў:

— Добра, дапамагу вам. Так і быць, дапамагу...

Быў сонечны дзень, калі паліцаі зноў ехалі ў Шарыбаўку. Аўдашкоў сядзеў побач з Нясмашным. Магчыма, начальнік паліцыі і не дазволіў бы, каб у яго лёгкай брычцы сядзеў чужы. Але ў апошні час здорава даставалася Нясмашнаму ад каменданта. Усе тэрміны прайшлі, а партызаны заставаліся няўлоўнымі. Больш таго, гэтай ноччу дзевяты за сёлетнюю вясну эшалон узляцеў у паветра...

Вось і Шарыбаўка. Вось і дом. Міхась саскочыў, крыкнуў жонцы, якая замерла на парозе з вядром у руцэ, каб падрыхтавала перакусіць. Ён запрасіў «гасцей» да стала, а сам выйшаў з хаты нібы за самагонкай.

У хлеве пад дровамі былі схаваны вінтоўка і патранташ. Схапіў яе, вылез праз дзірку і кінуўся на агароды.

Але Нясмашны западозрыў няладнае.

Доўгая адсутнасць Аўдашкова насцярожыла яго.

А Міхась ужо бег лугам да кустоў. Раптам аўтаматная чарга. Ён спатыкнуўся, паваліўся. Але праз момант зноў бег, нязграбна цягнучы вінтоўку. Зноў застракатаў аўтамат, цяпер не адзін — некалькі. Нешта ўдарыла па нагах, у руку. Выслізнула вінтоўка, і ён страціў прытомнасць...

Ачуняў на возе. Трызніў Аўдашкоў аб партызанах.

Ніколі ён не быў на чыгунцы. Быў проста сувязны. Але ў самыя апошнія хвіліны жыцця грукат воза яму здаваўся грукатам нямецкага эшалона, і чалавек прагнуў помсты...

А.Кейзераў.

Партызанскія медыкі

З успамінаў Валянціны Фёдараўны Матвяйчук, былога фельчара партызанскай брыгады імя М.А.Шчорса

Калі пачалася вайна, я служыла ў 63-м карпусным палявым перасоўным шпіталі 26-й арміі на пасадзе старшай медыцынскай сястры хірургічнага аддзялення. Загадчыкам гэтага аддзялення быў мой муж маёр Мітрафан Піліпавіч Хамянок. Пад Палтавай на станцыі Драбава наша армія трапіла ў акружэнне. Усіх ваеннапалонных этапам адправілі ў Кіеў. Нам з мужам пашанцавала ўцячы з лагера. Прыйшлі мы ў родную вёску мужа Глазаўку Уваравіцкага раёна. Муж аказваў медыцынскую дапамогу хворым і параненым партызанам атрада імя Шчорса. Хутка ён стаў партызанам гэтага атрада. Я працягвала працаваць ва ўчастковай бальніцы вёскі Чабатовічы. Перадавала партызанам медыкаменты. За мной пачалі сачыць. З пяцігадовым сынам я збегла ў вёску Смычок, дзе стаяў партызанскі атрад. Стала фельчарам партызанскага шпіталя, мой муж быў там хірургам. Шпіталь зімой размяшчаўся па хатах, у зямлянках, летам — у палатках. Не хапала медыцынскага інструментарыя, быў толькі адзін малы набор для аперацый, і той не поўны. Медыкаменты былі ў асноўным трафейныя. Пазней мы іх атрымлівалі і з Вялікай зямлі, іх скідалі з самалётаў. Не хапала перавязачных матэрыялаў. Замест іх ужывалі паўпакеты, парашуты. Нават стэрылізаваць матэрыял не было магчымасці. Параненых часам прыходзілася перавязваць раз на тыдзень. Аперацыі, ампутацыі рабілі прымітыўным спосабам: замест наркозу давалі шклянку гарэлкі, замест хірургічнага нажа выкарыстоўвалі звычайную пілу, якую абпальвалі і праціралі гарэлкай.

Неяк партызан Лёня Касьяненка ў перастрэлцы ў час разведкі быў паранены: разрыўная куля адарвала яму палову языка, пашкодзіла губы, сківіцу. Мы зрабілі ўсё магчымае, асабліва з яго харчаваннем. Самалётам адправілі яго ў Маскву. Там яго вылечылі. Наш Лёня стаў лётчыкам.

Вылечылі мы і немца Гензеля, які з дапамогай падпольшчыкаў разам з другім нямецкім салдатам Куртам прыйшоў у наш атрад. Яны прыехалі на аўтамашыне са зброяй і радыёстанцыяй. Курт у час блакады страляў у партызан, і яго ліквідавалі. А Гензель быў пры шпіталі санінструктарам, добра даглядаў параненых партызан. Пасля вызвалення раёна ён вартаваў нямецкіх ваеннапалонных.

Сям'я Вераб'ёвых

Калі пачалася вайна, тры сястры — Ніна, Марыя і Ганна вярнуліся да маці ў Зялёны Дуб. Марыя і Ганна прыехалі з пяццю малымі дзецьмі, мужы іх пайшлі на фронт. Трэба было думаць, як пражыць у такі цяжкі час вялікай сям'ёй.

Сям'я Вераб'ёвых у гэты час была сапраўды вялікая. Літасці ад ворага чакаць не выпадала. Бо якая літасць, калі мужы дзвюх сясцёр на фронце змагаюцца супраць фашыстаў.

У 1941 г. многія байцы выходзілі з акружэння ці ўцякалі з палону. Выбрацца ў савецкі тыл удавалася не ўсім. Яны затрымліваліся ў вёсках, хаваліся па хатах.

Вераб'ёвы хавалі ў сваёй хаце савецкага салдата Якава Гутмана, які ўцёк з палону. Ён жыў у іх доме, у бакоўцы, больш за тры месяцы.

Аб тым, што ў іх доме хаваўся савецкі салдат, не ведала нават іх родная бабуля. Жыў у іх і баец Паўлаў. Яго ўзяла з пало-

ну адна з жанчын. Паўлаву было загадана адзін раз на тыдзень адзначацца ў камендатуры. Ён адзначаўся. Усё было ў парадку, яго ні ў чым не падазравалі. Тады і з'явіўся ў Зялёным Дубе Э.Лаўрыновіч. Ён шукаў надзейных людзей, каб пачаць актыўныя дзеянні. Нямецкія эшалоны ішлі на Маскву. Іх трэба было спыніць!

У падпольную арганізацыю адразу ўступілі Гутман і Паўлаў. Сёстры Вераб'ёвы сталі сувязнымі. Лістоўкі і зводкі Саўінфармбюро — гэта быў пачатак работы падпольшчыкаў. Адначасова яны збіралі зброю і хавалі яе ў лесе. Галоўнае ж тое, што яны пачалі праводзіць аперацыі на чыгунцы.

У гэтай справе ім вельмі дапамагалі сёстры Вераб'ёвы. Асабліва няўрымслівай была Ніна. Яна бліскуча выконвала кожнае заданне. Нават насіла і перадавала падпольшчыкам тол.

Да вясны падпольная група вырасла ў баявы атрад. Партызаны перабраліся ў лес і пачалі актыўную барацьбу з ворагам. Сталі партызанамі Гутман і Паўлаў.

Сёстры Вераб'ёвы засталіся сувязнымі. Усё больш небяспечным станавілася іх жыццё. За іх домам пачалі сачыць паліцэйскія.

Немцы не на жарт устрывожыліся дзеяннямі партызанскага атрада пад кіраўніцтвам Э.Лаўрыновіча. Яны пачалі шукаць атрад, каб знішчыць яго. Але атрад добра манеўраваў і быў няўлоўны. Тады фашысты завербавалі здрадніка — лесніка з вёскі Струкі Кірылу Лявонава. Яму ўдалося натрапіць на след партызан, аб чым ён паведаміў ворагам. У лесе за Струкамі фашысты навязалі партызанам бой, які адбыўся 27 ліпеня 1942 года.

У гэтым баі адстаў ад атрада цяжкапаранены Якаў Гутман. Але ў рукі ворагу ён не трапіў. Мясцовыя жыхары Алёша і Мікола Навічковы зрабілі яму перавязку, і ён, крыху акрыяўшы, зноў дабраўся ў Зялёны Дуб да Вераб'ёвых. Яго схавалі ў старым закінутым склепе, які быў непадалёку ад дома.

Сноўдаў уначы паліцэйскі Пятро Пракопенка каля дома Вераб'ёвых. Ён прычакаў, калі ўсе сёстры былі дома, і выдаў іх немцам, як сведчыў Э.В.Лаўрыновіч.

Ён выклікаў з в. Рагінь нарад паліцыі і сам прывёў іх надвячоркам да дому Вераб'ёвых. Сёстры, іх маленькія дзеці і старая маці былі арыштаваны.

Загінуў у гэты дзень і Якаў Гутман. Яго хацелі арыштаваць, але ён пачаў адстрэльвацца, і паліцаі кінулі ў склеп некалькі гранат.

Арыштавалі за дапамогу партызанам старога Сафона Сіліна і яго сына Цімафея. Іх хата была непадалёку ад склепа, дзе хаваўся Гутман.

Цудам удалося вырвацца адной з сясцёр Вераб'ёвых, Лізе. Калі іх прыйшлі арыштоўваць, яна была на двары і паспела ўцячы ў лес. Астатніх павезлі ў турму ў Буда-Кашалёва.

Старэйшая сястра Лукер'я, якая жыла ў вёсцы Бронніца, кінулася да ўрадніка пытаць, ці застанецца хоць хто жывы. Той параіў пайсці ў Буду і падаць прашэнне, каб ёй аддалі малых дзяцей. Так яна і зрабіла. Пяцёра маленькіх дзяцей аддалі Кейзеравай Лукер'і.

Трох сясцёр Вераб'ёвых — Марыю, Ніну, Ганну, іх маці, Сафона і Цімафея Сіліных павезлі ў Гомель у турму і там расстралялі за ўдзел у партызанскім руху.

Р.Казлова.

Партызанская сталіца

У дні нямецка-фашысцкай акупацыі жыхары вёскі Смычок цвёрда верылі, што Чырвоная армія хутка вернецца. Яны не выконвалі нямецкіх загадаў, не здавалі ворагу хлеба, мяса, іншых прадуктаў харчавання.

Большая частка моладзі пайшла ў партызаны. Вёска ператварылася ў цэнтр партызанскага руху на Гомельшчыне. Нездарма вёску называлі «партызанскай сталіцай». Партызаны з атрадаў Уваравіцкага, Буда-Кашалёўскага, Жлобінскага, Стрэшынскага, Рэчыцкага, Гомельскага і іншых раёнаў вобласці знаходзілі прытулак у смычкоўскім Доўгім бары. Мясцовыя жыхары гасцінна сустракалі народных мсціўцаў і аказвалі ім розныя паслугі.

Але і Смычкоўскі сельсавет не абышло гора. За час акупацыі фашысты поўнасцю знішчылі 100 дамоў калгаснікаў,

разбурылі і спалілі 30 калгасных пабудоў, расстралялі нявінных людзей: Сідара Якаўлевіча і Якава Сцяпанавіча Пінчуковых, Пятра Ціханавіча Еўдачкова, Ціхана Гаўрылавіча Еўдачкова, Антона Якімавіча Пінчукова, Сідара Пятровіча Слесарава, Мікалая Гаўрылавіча Сусолкіна, Піліпа Максімавіча Пінчукова, Максіма Мікалаевіча Пінчукова.

Т.А.Бяланава.

«Жыць для Радзімы...»

Іван Харытонавіч Казлоў нарадзіўся ў гарадскім пасёлку Уваравічы ў 1912 г. Пачаў працаваць чорнарабочым на чыгунцы ў Гомелі. Удзельнічаў у мастацкай самадзейнасці. Пасля рэспубліканскага агляду творчай моладзі, які праходзіў у Мінску ў 1934 г., яго ўзялі салістам у Беларускую дзяржаўную філармонію. Іван Казлоў не толькі спяваў, але афармляў сцэну, маляваў дэкарацыі.

У Вялікую Айчынную вайну ён знаходзіўся ў акупіраваным гітлераўцамі горадзе. Наладзіў сувязь с падпольшчыкамі. Жыў ён на кватэры М.Ф.Калашнікавай па вуліцы Камароўскай у доме № 55. Сястра гаспадыні В.Ф.Рубец працавала медсястрой у 2-й клінічнай бальніцы, дзе было многа параненых і хворых савецкіх байцоў. Усе трое аказвалі ім дапамогу харчамі, цывільнай вопраткай. Для тых, хто папраўляўся, І.Х.Казлоў пачаў рабіць дакументы — нямецкія асабістыя пасведчанні (аўсвайсы), савецкія пашпарты, метрыкі і г.д. З імі выратаваныя савецкія воіны пасяляліся ў горадзе па хатах падпольшчыкаў. Першым «кліентам» І.Казлова стаў сусед па даваенным часе Міхаіл Лібантаў. Са зробленымі дакументамі ён некаторы час жыў у Мінску, а потым пайшоў у партызаны.

Акрамя дакументаў І.Х.Казлоў па-майстэрску рабіў пячаткі, штампы нямецкіх устаноў. Узоры іх яму дастаўваў камсамолец-падпольшчык Захар Гала, які працаваў у пашпартным аддзеле мінскай гарадской управы. «Кліентаў» станавілася ўсё больш і больш. Днямі і начамі працаваў І.Х.Казлоў, каб выратаваць як мага больш людзей. Для падробкі дакументаў ён карыстаўся ўсяго вучнёўскай ручкаю з тонкім пяром, школьнай гатавальняй і тушшу.

І.Х.Казлоў.

Калі не хапала сувязных, ён сам выводзіў людзей з горада. Намаганнямі падпольшчыкаў вакол Мінска былі створаны некалькі партызанскіх атрадаў і груп. Самым вялікім з іх і баяздольным быў атрад на чале з былым камандзірам 208-й стралковай дывізіі палкоўнікам У.І.Нічыпаровічам. У гэтым атрадзе было шмат байцоў і камандзіраў Чырвонай арміі, якія пакінулі горад з дакументамі, зробленымі І.Х.Казловым.

Гітлераўцы доўга не маглі натрапіць на след «бюро прапускоў», але 26 кастрычніка 1942 года І.Казлоў быў арыштаваны. Больш за два месяцы яго дапытвалі аб патрыётах горада, катавалі. Усё было дарэмна: ён не назваў ніводнага прозвішча сваіх сяброў. Падпольшчыкі рыхтавалі яму ўцёкі з турмы, але яны не ўдаліся. І.Х.Казлоў быў мужны чалавек, ён знаходзіў у сабе сілы і спяваў для зняволеных, каб падтрымаць іх у цяжкі момант жыцця.

Ён наладзіў перапіску з таварышамі па падполлі. «Паштовай скрыняй» стаў гліняны жбан, у якім яму перадавалі ежу. Знаходлівы Іван Харытонавіч прасвідраваў дзірку ў полай ручцы жбана і клаў у сярэдзіну запіскі. Дзірку замазваў хлебам, расцёртым з тынкам.

У сваім апошнім пісьме ён пісаў:

«Дарагія мае! Не трэба слёз. Не трэба сумаваць. Наша кроў не пральецца дарма. Трымайцеся, не бойцеся, не трацьце надзеі...

Жыць! Жыць! Як хочацца жыць! Не хавацца за спіну таварышаў, а са зброяй у руках, у штодзённай барацьбе з ненавісным

катам — у гэтым уся асалода і мэта жыцця. Жыць для Радзімы, для свабодалюбівага народа, змагацца за гонар і свабоду яго — у гэтым прыгажосць жыцця...

Гарачы прывет жывым, якія са зброяй у руках змагаюцца за свой гонар і незалежнасць.

Прывет сябрам, таварышам! 27 снежня 1942 года.

Ваш Ваня Казлоў».

Мужны патрыёт быў пакараны гітлераўцамі ў канцы снежня 1942 года. Яго імем названа адна з вуліц у г.п.Уваравічы.

А.Сяргееў.

Партызанка Соф'я Брыль

Брыль Соф'я Іванаўна, якая перад вайной працавала настаўніцай у Буда-Кашалёўскім раёне, змагалася ў радах партызан на Міншчыне — сувязная, разведчыца, дыверсант. Яна была партызанкай брыгады імя газеты «Правда», якая дзейнічала ў Чэрвеньскім, Рудзенскім і Пухавіцкім раёнах. Збірала звесткі аб варожых гарнізонах, распаўсюджвала партызанскія лістоўкі сярод насельніцтва, здабывала для партызан зброю, медыкаменты. Удзельнічала ў баявых аперацыях, падрыве аднаго варожага эшалона, тройчы — у падрывах чыгункі на ўчастках Мінск — Міханавічы, Жодзіна — Барысаў. Была памочнікам камісара брыгады па камсамоле. Узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. У пасляваенныя гады да баявых узнагарод дабавілася працоўная — ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Трагічны лёс Фядоссі Сазонавай

Над вёскай Дубавіцы стаяла ціхая ноч. У хаце Фядоссі Мікалаеўны Сазонавай адпачывалі яе два сыны — старэйшы Мікола і малодшы Іван. Яны прыйшлі ў вёску па заданні камандзіра брыгады Аляксея Дземчанкі, каб сарваць адпраўку моладзі ў Германію. Ужо тры дні яны знаходзіліся ў вёсцы. Адправілі да партызан дзве групы моладзі. Гэтай ноччу яны павінны былі павесці ў лес яшчэ восем хлопцаў і дзяўчат. Раптам каля хаты пачуўся глухі тупат. Маці здалося, што гэта яе дачка Надзея, якая пільнавала на вуліцы адпачынак братоў. Як толькі Фядосся Мікалаеўна адкінула кручок на дзвярах, чыясьці далонь закрыла ёй рот, а рука сціснула шыю. Некалькі чалавек ускочылі ў хату. Пачалася страляніна. Аўтаматная чарга здрадніка-аднавяскоўца Сямёна Ткачова прашыла грудзі Івана. Увялі ў хату збітую, акрываўленую Надзею. Фядосся Мікалаеўна страціла прытомнасць. Ачуняла яна раніцай сярод траіх сваіх забітых дзяцей. На падлозе поўзала маленькая дачушка Каця. Толькі яна і засталася ў жывых.

В.Шацкі.

Вызваленне

Два гады і тры месяцы цягнулася акупацыя раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З нецярпеннем чакалі людзі вызвалення, дапамагаючы савецкім войскам барацьбой з гітлераўцамі ў іх тыле.

Буда-Кашалёўскі і Уваравіцкі раёны былі вызвалены войскамі Беларускага фронту (генерал арміі К.К.Ракасоўскі) у выніку праведзенай у ходзе асеннезімовай кампаніі 1943—1944 гг. Гомельска-Рэчыцкай (10—30 лістапада) наступальнай аперацыі і развіцця наступлення зімой 1943—1944 гг. Гомельска-Рэчыцкая аперацыя пачалася 10 лістапада 1943 года. У ёй удзельнічалі 50-я (генерал-лейтэнант І.В.Болдзін), 3-я (генерал-лейтэнант А.В.Гарбатаў), 63-я (генерал-лейтэнант А.В.Калпакчы), 48-я (генерал-лейтэнант П.Л.Раманенка), 65-я (генерал-лейтэнант П.А.Бялоў) і 16-я паветраная (генерал-палкоўнік С.І.Рудэнка) арміі. Перад імі стаяла задача разграміць гомельска-рэчыцкую групоўку праціўніка, вызваліць міжрэчча Сожа і Дняпра і заняць пазіцыі на заходнім

Ф.Ф.Данілоўскі, камандзір 197-й стралковай дывізіі.

С.Ф.Украінец, камандзір 323-й стралковай дывізіі.

Ю.М.Беркаль, камандзір 282-й знішчальнай авіядывізіі.

Камандзір 260-й стралковай дывізіі В.І.Булгакаў (справа) і начальнік штаба дывізіі А.З.Франчук (злева).

беразе Дняпра. Галоўны ўдар планаваласе нанесці з лоеўскага плацдарма сіламі трох армій, двух танкавых і двух гвардзейскіх карпусоў у напрамку на Рэчыцу і з наступным выхадам у тыл варожай групоўкі з поўначы. Другі ўдар планаваўся з раёна на поўнач ад Гомеля войскамі 11-й і 33-й армій у напрамках Буда-Кашалёва і Жлобіна. Савецкім войскам процістаялі 2-я, частка сіл 9-й і 4-й нямецкіх армій групы армій «Цэнтр».

У сярэдзіне кастрычніка 1943 г. разгарнулася наступленне савецкіх войскаў на гомельскім напрамку. Быў вызвалены абласны цэнтр — горад Гомель. Нашы войскі выйшлі да межаў Буда-Кашалёўскага раёна. Пачалося яго вызваленне. На досвітку 25 лістапада пачаліся баі за Касцюкоўку. Войскі 11-й і 63-й армій з баямі прасоўваліся да Буда-Кашалёва. Перад 889-м стралковым палком была пастаўлена задача ачысціць ад праціўніка ўчастак чыгункі ў бок Жлобіна з прылеглымі населенымі пунктамі. На подступах да вёскі Марозавічы полк трапіў на міннае поле. Да раніцы 27 лістапада супраціўленне фашыстаў у вёсцы было зломлена. Напружаныя баі завязаліся за вёску Патапаўку. Двое сутак 889-ы, 828-ы і 862-і стралковыя палкі адбівалі націск ворага. З дапамогай падышоўшага падмацавання падраздзяленні палкоў перайшлі ў наступленне і вызвалілі Патапаўку.

27 лістапада быў вызвалены раённы цэнтр Буда-Кашалёва часцямі 4-й стралковай дывізіі і 231-м танкавым палком 11-й арміі. У гэты ж дзень былі вызвалены і Уваравічы.

Адным з першых у Буда-Кашалёва ўвайшоў батальён маёра М.М.Скуратава, які ўваходзіў у склад 96-й дывізіі. У гэтых баях вызначыліся начальнік хімічнай службы М.А.Штаткоў, камандзір аддзялення М.І.Ісламаў, кулямётчык 220-га стралковага палка 4-й Бежыцкай дывізіі Б.П.Лебедзеў і многія іншыя.

Да 5 снежня 1943 г. раён быў поўнасцю вызвалены. У яго вызваленні прымалі ўдзел 4-я, 73-я, 96-я, 197-я, 217-я і 260-я, 282-я, 323-я стралковыя дывізіі, 15-я танкавая брыгада і 231-ы танкавы полк, 2-я гвардзейская, 196-я і 299-я штурмавыя, 282-я, 283-я знішчальныя і 271-я начная бамбардзіровачная авіядывізіі, 1263-і зенітна-артылерыйскі полк.

Вялікую дапамогу наступаючым савецкім войскам аказвалі партызаны, хоць трапілі ў гэты момант у цяжкае становішча. Справа ў тым, што з набліжэннем Чырвонай арміі гітлераўскае камандаванне спешна імкнулася стварыць абарончы рубеж па заходнім беразе ракі Днепр паміж гарадамі Жлобін і Рэчыца. Гэты раён кантраляваўся партызанамі. Гітлераўцы вырашылі ачысціць яго ад партызан. Яны кінулі супраць іх да дзвюх дывізій сваіх войскаў і 24 кастрычніка перайшлі ў наступленне. Завязаліся жорсткія баі, якія цягнуліся больш за двое сутак. Страціўшы 117 чалавек забітымі і параненымі, карнікі адышлі. Але блакіроўка партызанскай зоны працягвалася да 1 лістапада 1943 г. Цяпер гітлераўцы заселі па вёсках, каб расчысціць дарогі ад партызанскіх мін. Партызаны сарвалі і гэты намер гітлераўцаў. Тыя ўчасткі дарог, якія ім удалося разміраваць, партызаны мініравалі зноў. Дзякуючы адважным дзеянням партызан, гітлераўцы не змаглі заняць правы бераг Дняпра і стварыць лінію абароны, аднавіць важныя для праціўніка шляхі адыходу.

Партызаны 1-й Буда-Кашалёўскай брыгады ўтрымлівалі да падыходу савецкіх войскаў пераправу цераз раку Сож у вёсцы Васільеўка. Амаль суткі вялі баі партызаны сумесна з воінамі 17-й стралковай дывізіі за струменьскую пераправу цераз раку Сож. Партызаны пераправілі з варожага тылу каля 500 жыхароў раёна і шмат буйной рагатай жывёлы. 4 кастрычніка 1943 г. партызаны брыгады, што былі на левым беразе Сожа, уліліся ў 17-ю стралковую дывізію. Многія партызаны былі пакінуты ў раёне для аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі. Камандзір брыгады А.М.Дземчанка ўзначаліў Буда-Кашалёўскі райком КП(б)Б.

Л.С.Скрабіна, Р.А.Чарнаглазава.

Дакументы сведчаць

ДАКУМЕНТЫ АБ ПЕРАДАЧЫ ЗБРОІ І МАЁМАСЦІ 1-й БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ 17-й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ

5 кастрычніка 1943 г.

Справка

Выдана командиру 1-й Буда-Кошелевской бригады партизан тов. Демченко в том, что штабом 17-й стрелковой дивизии получено:

Отряд имени Кутузова — личного состава — 77 чел., винтовок — 57, ручных пулеметов — 1, повозок — 1, лошадей — 2, ружей ПТР — 1.

Отряд имени Чкалова — личного состава — 26 чел., винтовок — 23, ручных пулеметов — 2, минометов 50 мм — 1, повозок — 2, лошадей — 3.

Начальник отделения капитан Кочетков

6 кастрычніка 1943 г.

Справка

Выдана командиру Буда-Кошелевской бригады тов. Демченко в том, что 17 стрелковой дивизией принято партизан из отряда Кутузова — 98 человек и 91 винтовка, из отряда им. Чкалова — 70 человек, 59 винтовок и станковый пулемет, один 57 мм миномет и 50 мин.

Начальник штаба 17 СД майор Эпштейн

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 1. Спр. 212. Л. 91, 92.

З ЗАГАДУ № 6 ПА 1-й БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЗЕ АБ ПАЧАТКУ МІРНАГА ЖЫЦЦЯ Ў РАЁНЕ

5 кастрычніка 1943 г.

3. Оставляю для работы в Буда-Кошелевском районе проявивших себя партизан в борьбе с немецкими захватчиками т.т. Матюшкова П.Е., Кузнецова С.С., Парфенова А.С., Шкрабова В.А., Финадеева А.С., Стрикова Г.С., Юркова И.Е., Подунова В.А., Даниленко, Киселева С.Е., Токмачева В.Д., Киреева Ф., Сутягина, Силкова Ф.С., Симанеева Д.Д., Каменец С.Д., Ларионова Ф.Я., Гейфман Б.М., подчинив выше переименованных т.т. РК КП(б)Б и райсовету Буда-Кошелевского района, оставив имеющееся на руках оружие. Основание: указания уполномоченного ЦК КП(б)Б т. Жданович.

4. Для охраны и поддержания порядка в Буда-Кошелевском районе создать истребительный батальон из 40 чел. Командиром истребительного батальона назначаю т. Иванчикова Л.И., ком. взводов: 1-го взв. т. Корзун, 2-го взв. т. Каминского. В распоряжение командира отряда выделяю ручных пулеметов — 2 шт., автоматов — 2, винтовок — 36, наганов и пистолетов — 10, патронов — 2000 шт., лошадей — 6, повозок с упряжью — 3, лошадей верховых — 3, седел — 3. Для питания выделяю хлеба — 10 тонн, находящегося в хранилище северовосточнее дер. Лозовица в лесу, телят — 15 шт.

Подчиняю отряд председателю Буда-Кошелевского райсовета т. Лавриновичу.

Основание: инструктивное указание секретаря ЦК КП(б)Б т. Пономаренко.

Тов. Финадееву А.Е. оказать практическую помощь в организации истребительного батальона и доложить исполнение через день мне.

Ком.1-й Буда-Кошелевской бригады Демченко

Начальник штаба 1-й Буда-Кошелевской бригады

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3942. Воп. 1. Спр. 6. Л. 8—9.

З ЗАГАДУ № 4 ПА ПАРТЫЗАНСКІМ АТРАДЗЕ ІМЯ М.І.КУТУЗАВА АБ РАТАВАННІ НАСЕЛЬНІЦТВА І МАЁМАСЦІ РАЁНА

9 кастрычніка 1943 г.

п.1

Отступая под ударами Красной Армии, немецкая грабьармия сжигает на своем пути деревни, угоняет в немецкое рабство мирное население (особенно молодежь), забирает скот, лошадей, увозит зерно и т.д.

Приказываю:

Командирам рот, взводов и отделений, всему личному составу отряда им. Кутузова объяснить населению, как укрыться и спасти свое добро от немецких грабителей.

Всякие попытки немцев угнать из леса скот, забрать мирное население в немецкое рабство пресекать силой оружия. Для этого выделить специальные группы, которые обязаны вести разведку и делать засады там, где немцы пытаются провести грабеж.

п. 2

Красная Армия своими могучими ударами гонит немецко-фашистских захватчиков с советской земли. Немцы бегут в панике, но и в тылу их бьют партизаны и даже мирное население.

Приказываю:

1. Еще больше усилить удары по отступающей немецкой армии путем устройства засад по дорогам мелкими передвижными группами партизан (10 — 12 чел.).
2. Минирование дорог, для чего использовать все имеющиеся средства, как-то: мины 82-мм миномета, 50-мм миномета, снаряды и т.д.
3. Уничтожение связи между штабами и частями немцев. Для этого вырезать в нескольких местах кабель длиной 100—200 м.
4. Неожиданными налетами на разместившиеся на ночевку немецкие группы и обозы.
5. Сжиганием и подрывом мостов. Для этого из каждой роты отряда выделить по 2 подрывные группы.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3942. Воп. 1. Спр. 6. Л. 20—22.

Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.

З АПЕРАТЫЎНЫХ ЗВОДАК САЎІНФАРМБЮРО

27 лістапада 1943 г.

Между реками Сож и Днепр, в районе северо-западнее Гомеля, наши войска продолжали успешное наступление и овладели районными центрами Гомельской области городом Чечерск, г.п. Уваровичи, а также заняли более 80 других населенных пунктов, среди которых крупные населенные пункты Аннополье, Малыничи, Сойки, Уваровичи, Чеботовичи, Дудичи, Липа, Михалевка, Пытькова, Дуравичи, Лапичи, Особин, Блюдница, Руденец, Роги, Азделин, Ивановка, Телеши, Галеевка, Задоровка и железнодорожные станции Костюковка, Уза, Прибор, Якимовка.

* * *

...Северо-западнее Гомеля наши войска продолжали успешное наступление и, преследуя разгромленные части противника, значительно продвинулись вперед. В течение дня освобождены от немецких захватчиков районные центры Гомельской области Чечерск и Уваровичи, а также занято более 80 других населенных пунктов и железнодорожные станции Костюковка, Уза, Прибор, Якимовка. Поспешно отступая под ударами наших войск, противник бросает тяжелое вооружение, оставляет склады с военным имуществом и боеприпасами. Только в районе Уварович бойцами Н-ской части захвачено 10 орудий, 86 пулеметов, 3 склада с боеприпасами, вещевой и два продовольственных склада. На другом участке наши подразделения отбили у немцев много автомашин и повозок с военными грузами.

28 лістапада 1943 г.

В течение 28 ноября между реками Сож и Днепр, северо-западнее Гомеля, наши войска, продолжая развивать успешное наступление, овладели районным центром Гомельской области городом Буда-Кошелевская, а также заняли более 150 других населенных пунктов, среди них крупные населенные пункты Жлобин, Скартынь, Яцковщина, Глыбочица, Мотневичи, Ровковичи, Заболотье, Коромка, Липиничи, Шарибовка, Кошелев, Потаповка, Морозовичи, Житанеж, Недойка, Старая Буда, Чеботовичи, Ховхла, Черное и железнодорожные станции Буда-Кошелевская, Шарибовка.

* * *

Северо-западнее Гомеля наши войска продолжали успешное наступление и заняли свыше 150 населенных пунктов. Противник под ударами советских войск отступает, взрывая мосты и минируя дороги. Части Н-ского соединения, преследуя немцев, овладели районным центром Гомельской области Буда-Кошелевская. Части другого нашего соединения окружили гарнизоны двух опорных пунктов противника и в ожесточенном бою уничтожили большую часть гитлеровцев. Убито свыше 700 солдат и офицеров противника. Значительное количество немецких солдат взято в плен. Наши бойцы захватили в этих пунктах 16 орудий, 12 минометов, 70 пулеметов и два склада с боеприпасами.

Сообщения Советского информбюро. М., 1944. Т. 5. С. 261—263.

СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ 1-й БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ АБ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ БРЫГАДЫ Ў ЧАС ВЫЗВАЛЕННЯ РАЁНА ЧЫРВОНАЙ АРМІЯЙ

Лістапад 1943 г.

24 сентября 1943 г. Взорваны два моста Буда-Кошелевская — Рагинь. Сделан завал по шляху Заболотье — Струки с целью задержать подброску боеприпасов и отход немецких частей.

Рота Кондратенко. Отряд Кутузова.

1 октября 1943 г. Группой партизан отряда Кутузова разобран мост и настил по болоту на 100 метров и спущен на воду по шляху Меркуловичи — Городец (около д.Выдрица). Цель — затормозить отход немецкого обоза от Сожа на Жлобин.

6 октября 1943 г. Заминирован шлях Рагинь — Буда-Кошелевская 13 минами, по которому шло сильное движение пехоты и автомашин. Результат: движущаяся колонна немцев, до роты,

вошла на минированное поле. Взорвались 4 мины. Убито 5 человек, 12 ранено. Взорвана 1 бронемашина.

9 октября 1943 г. Вырезали телефонного кабеля 500 метров между д.Рагинь (штаб 23-го немецкого корпуса) и д.Раков Лог.

9 октября 1943 г. Засада в Матневичском лесу на немцев, пытавшихся проникнуть в лес в гражданские лагеря с целью угнать скот. Убито 5 немцев. Остальные бежали в панике.

12 октября 1943 г. Налет на обоз с почтой около д.Лозов. Убито 2 немца, ранено — 2. Трофеи: 1 ручной пулемет, 3 винтовки, пистолет. Захвачена почта.

28 ноября 1943 г. Нападение на обоз по шляху Шарибовка — Б.Люшов. Разогнали обоз. Убито 4 немца, ранено 7. Трофеи: 4 винтовки. Наших 2 ранено.

30 ноября 1943 г. Заминирован шлях Лозов — Неговка 2-мя снарядами. Подорвана бронемашина.

1 декабря 1943 г. Засады по шляху Неговка — Б.Люшов. Разогнан немецкий конный обоз.

1 декабря 1943 г. Заминирован шлях Буда — Люшов — Жлобин. Взорвано 2 автомашины.

1 декабря 1943 г. Засада на шляху Лозов — Столпня, по которому было сильное движение немецких обозов. Разбили немецкий обоз. Убито более 35 немцев. Взято: 1 пулемет, 2 автомата, 26 винтовок, большое количество патронов, мин, 1 кухня, 5 повозок, 13 лошадей, мастерская, радиостанция и много обмундирования и военного имущества. 5 немцев захвачено живьем. Остальные бежали... Наших потерь нет.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 212. Л. 31—33.

АКТ АБ ПЕРАДАЧЫ ЗНІШЧАЛЬНЫМ БАТАЛЬЁНАМ ЖЫВЁЛЫ, ІНВЕНТАРУ, ПРАДУКТАЎ ХАРЧАВАННЯ МЯСЦОВЫМ УЛАДАМ ПАСЛЯ ВЫЗВАЛЕННЯ РАЁНА АД НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ АКУПАНТАЎ

6 снежня 1943 г.

АКТ

6 дня, декабря месяца 1943 года.

Мы, нижеподписавшиеся: председатель Буда-Кошелевского райсовета тов. Лавринович, зав. РайЗо Ларионов Ф., нач. РОНКВД Мильчаков и ком. истреббатальона составили настоящий акт в нижеследующем:

1. Принято от ком. истреббатальона райсоветом Б.-К.* 36 лошадей (тридцать шесть).
2. Передано в РОНКВД и осталось при истреббатальоне 13 лошадей (тринадцать лошадей).
3. Сдано в распоряжение райсовета 8 (восемь) телег, оставили при истребительном отряде и РОНКВД 3 (три) телеги.
4. Сдано упряжи в организации райсовета 5 (пять) пар, оставлено РОНКВД и истреббатальону 3 (три) пары.
5. Сдано седел 6, оставлено при РОНКВД и истребительном отряде 8 (восемь) штук.
6. Согласно прилагаемых к акту документов сдано на заготскот 6 (шесть) штук рогатого скота, из которых 3 вола и три коровы.
7. Сдано в столовую 31 (тридцать один) кг мяса и 499 (четыреста девяноста девять) кг зерна и муки.

Вышеперечисленное передано вышеуказанным организациям, в чем и составлен настоящий акт.

Председатель Б.-К. райсовета нач. РОНКВД

Зав. РайЗо ком. истреббат.

РАСПІСКА АБ ПЕРАДАЧЫ Ў ВАЙСКОВУЮ ЧАСЦЬ ПАРТЫЗАН АТРАДА ІМЯ М.І.КУТУЗАВА

6 снежня 1943 г.

Расписка.

Дана тов.Воробьеву В.М. в том, что нами — частью 70433 принято 49 (сорок девять) человек партизан отряда им. Кутузова.

Ком. части 70433 капитан Аверский.

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 212. Л. 50.

---

*Буда-Кошелево.

АКТ АБ ЗДАЧЫ ЗБРОІ КАМАНДАВАННЕМ 1-й БУДА-КАШАЛЁЎСКАЙ БРЫГАДЫ ВАЙСКОВАЙ ЧАСЦІ 72-га ОДСБ

11 снежня 1943 г.

Мы, нижеподписавшиеся, с одной стороны представитель 1-й партизанской Буда-Кошелевской бригады Костюченков Г.М. и с другой стороны представитель 72-го ОДСБ мл. сержант Петрушенко Н.К., составили настоящий акт в 2-х экземплярах о сдаче трофейного вооружения и боеприпасов, взятых партизанскими отрядами 1-й Буда-Кошелевской бригады в боях с немецкими оккупантами.

1. Русских винтовок — 216
2. Русских СВД — 20
3. Немецких винтовок — 94
4. Пулеметов ручных — 10
5. Пулеметов станковых — 1
6. Пулеметов немецких ручных — 1
7. Противотанковое оружие — 1
8. Минометов ротных — 3
9. Диски к русским пулеметам — 15
10. Лент к немецким пулеметам — 5
11. Коробки с лентами к немецким пулеметам — 6
12. Русские и немецкие патроны — 3000
13. Патроны, гранаты ручные и мины — 7

Сдал: Представитель 1-й Буда-Кошелевской бригады (подпись).

Принял: представитель 72-го ОДСБ (подпись).

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 3500. Воп. 4. Спр. 212. Л. 38.

Падрыхтавала Р.А.Чарнаглазава.

АКТ АБ ПЕРАДАЧЫ ЗБРОІ І БОЕПРЫПАСАЎ ЗНІШЧАЛЬНАМУ БАТАЛЬЁНУ ПАРТЫЗАНСКІМ АТРАДАМ ІМЯ М.Ф.ГАСТЭЛЫ

15 снежня 1943 г.

Мы, нижеподписавшиеся, ком. отр. «Гастелло» Шульга Иван М., кладовщик истреббатальона Фатыков Харис, в присутствии опер. уполномоченного Б-Кошелевского РОНКВД мл. лейтенанта Солдатова составили настоящий акт о нижеследующем:

первый передал, а второй принял следующее вооружение и боеприпасы согласно наличия и документов:

1. Винтовок русских 220 (двести двадцать) шт.
   Согласно кв. № 1225 — 145 шт.
2. Пулеметов ручных 15 (пятнадцать).
3. Пулеметов станковых 1 (один).
4. Минометов ротных и к ним мин 2 (два) и 16 (шестнадцать) мин.
5. Автоматы 119 (сто девятнадцать) шт.
6. Патроны к винтовкам 17 500 (семнадцать тысяч пятьсот) шт.
7. Патроны к автоматам 2000 (две тысячи) шт.
8. Наганов и парабеллумов 40 (сорок) шт.
9. Ракетниц 3 (три).
10. Винтовок СВТ 9 (девять) шт.
11. Карабинов 33 (тридцать три) шт.
12. Винтовок иностранных 13 (тринадцать).
13. Дисков к РП 83 (восемьдесят три) шт.
14. Пуль.коробок к станков. пул. 4 (четыре).
15. Гранат разных 55 (пятьдесят пять) шт.
16. Капсюлей к гранат. 37 (тридцать семь) шт.
17. Дисков к ППШ 71 (семьдесят один).
18. Пулем. иностранных 2 (два).

19. Подсумков 221 (двести двадцать один).
20. Кухонь медных 6-ных 2 (две) шт.
21. Жестяных — 1 одна.
22. Мин магнитных 4 (четыре) шт.

Всего сдано 22 номера. Настоящий акт составлен в двух экземплярах по одному каждой стороне.

Что и подписываем.
1. Командир отряда «Гастелло»
2. Кладовщик РОНКВД
3. О/уп. мл. лейт.

Военачальнікі ўспамінаюць

Г.К.ЖУКАЎ

ЖУКАЎ Георгій Канстанцінавіч нарадзіўся 1 снежня 1896 г. у в. Стралкоўка Жукаўскага раёна Калужскай вобласці. Маршал Савецкага Саюза (1943), чатыры разы Герой Савецкага Саюза (1939, 1944, 1945, 1956). У 1939 г. камандаваў савецкімі войскамі ў баях на рацэ Халхін-Гол. У студзені — ліпені 1941 г. — начальнік Генштаба. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941—1942 гг. камандуючы войскамі Рэзервовага, Ленінградскага і Заходняга франтоў у Ленінградскай і Маскоўскай бітвах. Са жніўня 1942 г. 1-ы намеснік Наркома Абароны і Намеснік Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Па даручэнні Стаўкі Вярхоўнага Галоўнага Камандавання каардынаваў дзейнасць франтоў у Сталінградскай бітве і інш. У 1944—1945 гг. камандуючы войскамі 1-га Украінскага і 1-га Беларускага франтоў (у Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях). Ад імя Вярхоўнага Галоўнага Камандавання 8 мая 1945 г. падпісаў акт аб капітуляцыі фашысцкай Германіі. 24.6.1945 г. прымаў Парад Перамогі. У 1945—1946 гг. галоўнакамандуючы групай Савецкіх войскаў у Германіі, галоўнакамандуючы сухапутнымі войскамі. У 1953—1955 гг. 1-ы намеснік міністра, у 1955—1957 гг. міністр абароны СССР. Кандыдат у члены ЦК КПСС у 1941—1946, 1952—1953. Член ЦК КПСС у 1953—1957 гг. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1941—1958 гг. Памёр 18.6.1974 г.

...А.М.Василевскому и мне было приказано взять на себя координацию действий войск следующих фронтов: А.М.Василевскому поручались 1-й Прибалтийский и 3-й Белорусский, мне — 1-й и 2-й Белорусские фронты. В помощь мне Ставка посылала на 2-й Белорусский фронт начальника оперативного управления Генерального штаба генерала С.М.Штеменко с группой офицеров.

4 июня А.М.Василевский выехал в войска, чтобы на месте готовить операцию «Багратион», а я на сутки позже, 5 июня в 8.00 прибыл на командный пункт 1-го Белорусского фронта... По данным нашей разведки, главное командование немецких войск ожидало первый летний удар с нашей стороны на Украине, а не в Белоруссии. Оно, очевидно, исходило из того, что из-за лесисто-болотистой местности мы не сможем использовать в Белоруссии надлежащим образом дислоцированные на Украине 4 танковые армии.

Согласно плану Ставки войска 1-го Украинского фронта вступали в действие на втором этапе Белорусской операции, когда войска правого крыла 1-го Белорусского фронта, разгромив бобруйско-минско-слуцкую группировку, должны были выйти на линию Волковыск — Пружаны.

Большое значение Ставка придавала предстоящему удару войск 1-го Белорусского фронта. Сюда и направлялись ею основные силы и средства...

...Итак, рано утром 5 июня по поручению Верховного я прибыл на временный пункт управления 1-го Белорусского фронта в Дуравичи*, где встретился с К.К.Рокоссовским, членом Военного совета Н.А.Булганиным и начальником штаба М.С.Малининым.

После предварительного обсуждения вопросов мы с К.К.Рокоссовским и командующими армиями, командующими воздушной армией генералом С.И.Руденко, артиллерией фронта генералом В. И. Казаковым, бронетанковыми механизирован-

*Нарада ў в. Дуравічы (Буда-Кашалёўскі раён) на часовым камандным пункце 1-га Беларускага фронту з удзелам маршала Г.К.Жукава і групы афіцэраў Стаўкі была вельмі важным гістарычным момантам у выпрацоўцы і прыняцці камандуючым фронтам генералам арміі К.К.Ракасоўскім у адпаведнасці з планам Стаўкі рашэння аб напрамку і магутнасці прарыву абароны праціўніка ў пачатку здзяйснення аперацыі «Баграціён» па вызваленні Беларусі ад нямецкіх акупантаў.

ными войсками генералом Г.Н.Орлом тщательно обсудили обстановку на правом крыле фронта и договорились по планированию и практическим мероприятиям, связанным с подготовкой предстоящей операции. При этом особое внимание обращалось на тщательное изучение местности в районе действий, разведку, систему обороны противника на всю ее тактическую глубину, а также на подготовку войск, штабов и тылового обеспечения к началу операции…

Друкуецца паводле кн.: Жуков Г.К. Воспоминания и размышления. М., 1975. Т. 2. С. 246—248.

Г.К.Жукаў.

К.К.Ракасоўскі.

К.К.РАКАСОЎСКІ

РАКАСОЎСКІ Канстанцін Канстанцінавіч, нарадзіўся 21 снежня 1896 г. у г. Вялікія Лукі Пскоўскай вобласці. Маршал Савецкага Саюза (1944). Маршал Польшчы (1949). Двойчы Герой Савецкага Саюза (1944, 1945). У Вялікую Айчынную вайну камандаваў арміяй у бітве пад Масквой, Бранскім, Данскім (у Сталінградскай бітве), Цэнтральным, Беларускім, 1-м і 2-м Беларускімі (у Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях) франтамі. У 1945—1949 гг. галоўнакамандуючы Паўночнай групай войскаў. У 1949—1956 гг. міністр Нацыянальнай абароны і намеснік старшыні Савета Міністраў ПНР. У 1956—1957 і 1958—1962 гг. намеснік міністра абароны СССР. Кандыдат у члены ЦК КПСС у 1961—1968 гг. Член ВЦВК з 1935 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1946—1949, 1958—1968 гг. Памёр 3.8.1968 г.

…Из расформированного Брянского фронта к нам перешли со своими полосами три армии — 50-я под командованием генерала И.В.Болдина, 3-я генерала А.В.Горбатова и 63-я генерала В.Я.Колпакчи.

К тому времени эти армии, преследуя вражеские войска, достигли реки Сож и с боями форсировали ее, захватив несколько плацдармов на западном берегу. Таким образом они по существу поравнялись с правым флангом нашего фронта. Поэтому мы могли обойтись без крупных перебросок войск. Главное было не дать передышки противнику.

Войска нашего фронта уже вели бои на белорусской земле… Наступать было все труднее. После тяжелых боев части поредели… 63-я армия генерала В.Я.Колпакчи готовилась к форсированию реки Сож. Преодолеть ее с ходу не удалось. Усталость войск чувствовалась и здесь. Но настроение людей было боевое… Задержка с продвижением у Гомеля вынуждала нас срочно искать выход… наступление 50-й и 3-й армий вначале имело небольшой успех, но уже на третий день противник, подбросив на этом направлении дополнительные силы, перешел в контрнаступление и оттеснил наши части на исходный рубеж. К счастью, попытки врага развить успех были сорваны. Не добились перелома и войска 63-й армии. Расширить захваченный

Камандаванне Беларускага фронту. Другі справа — камандуючы фронтам К.К.Ракасоўскі, крайні справа — член ваеннага савета К.Ф.Цялегін.

А.Ц.Алтунін.

ими плацдарм на западном берегу реки Сож севернее Гомеля им не удалось, они еле удерживали его, отражая яростные вражеские атаки…

…Основной удар по-прежнему наносился войсками левого крыла фронта, где сосредоточены основные силы и средства… Основные сроки начала наступления ударной группировки — 10 ноября… Самое непосредственное участие в планировании операции приняли члены Военного совета Пономаренко и Телегин, начальник штаба Малинин, командующие родами войск Казаков, Орел, Прошляков, Максименко и Антипенко…

Перед нашим Белорусским фронтом действовали отборные немецкие войска группы армий «Центр» (4, 9 и 2-я армии), выполнявшие задачу гитлеровского командования — не допустить прорыва Восточного вала.

Мы уже убедились в прочности этого рубежа. В лоб его взять было трудно.

Тут требовался смелый маневр и умение обмануть противника. Так как инициатива находилась в наших руках, мы могли идти на риск, демонстрируя сосредоточение основных сил на одном участке фронта, в то время как готовили удар совсем на другом направлении.

11-я армия И.И.Федюнинского вместе с войсками В.Я.Колпакчи непрерывно атаковала противника севернее Гомеля, приковывая к этому участку его внимание. А основной удар нами уже был подготовлен с лоевского плацдарма…

Друкуецца паводле кн.: Рокоссовский К.К. Солдатский долг. М., 1988. С. 234—238.

А.Ц.АЛТУНІН

АЛТУНІН Аляксандр Цярэнцьевіч, нарадзіўся 14 жніўня 1921 г. у в. Сцяклянка Калачынскага раёна Омскай вобласці. Савецкі военачальнік, генерал арміі (1977), Герой Савецкага Саюза (1944). Член КПСС с 1943 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1972 г. начальнік грамадзянскай абароны СССР, намеснік міністра абароны СССР, член ЦК КПСС з 1976 г., дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

…Подходили к логическому завершению бои на Орловском плацдарме… Разворачивались события на Брянщине, в которых непосредственное участие принимала 197-я стрелковая дивизия полковника Федора Семеновича Даниловского.

17 сентября дивизия совместно с частями 323-й стрелковой дивизии полковника Сергея Федоровича Украинца овладели Брянском. Приказом Верховного Главнокомандующего дивизии было присвоено почетное наименование — Брянская…

В начале октября решением Ставки Главного Командования Брянский фронт был упразднен. Дивизия в составе корпуса и армии была передана Центральному фронту… На Гомель и Бобруйск наступали соединения правого крыла Центрального фронта…

…На рассвете 25 ноября передовые части дивизии вышли к Костюковке и завязали бои за поселок.

По распоряжению штаба корпуса фронт наступления дивизии несколько изменился. Была поставлена задача очистить от противника участок железной дороги в сторону Жлобина с прилегающими населенными пунктами. Предстояло форсировать небольшую, но полноводную речушку Уза с ее топким восточным берегом. На западном, поросшим густым лесом, по показанию пленных, фашисты успели организовать систему огня, оборудовать траншеи полного профиля, со всеми инженерными атрибутами.

Попытка передовых батальонов форсировать Узу с ходу не увенчалась успехом. С вечера, перегруппировав силы и средства, части вновь приступили к выполнению поставленной задачи…

С рассветом 889-й стрелковый полк сломал сопротивление фашистов в селе Морозовичи. Командир полка майор Ф.Ф.Заяц доложил о своем решении по овладению деревней Потаповкой. Комдив, выслушав его, уточнил:

— Решил обойти село слева и ударить двумя батальонами с тыла? Действуй.

Только не забывай о флангах, оставляй хотя бы по взводу для прикрытия. И расчеты противотанковых ружей. Обязательно. Разведчики доносят: со стороны Буда-Кошелева слышен гул немецких танков. Пока неизвестно сколько их, но скоро все прояснится. Мы тут меры уже принимаем. На подходе к тебе батарея иптадовцев, твои сорокапятки вот-вот догонят. Жди.

Маневр 889-го полка удался. Подразделения ворвались в центр Потаповки...

С рубежа Потаповки полки не продвинулись. Противник подбросил подкрепления и начал контратаковать. Двое суток части дивизии отбивали натиск врага. Двое суток беспрерывно клокотали пулеметы, автоматы, воздух сотрясался от взрывов бомб и снарядов. Двое суток горели фашистские танки. Двое суток командир корпуса генерал-майор Иван Алексеевич Гарцев требовал: «Держаться, перемалывать живую силу и огневые средства противника. Назад — ни шагу!»

И мы держались. 862-й стрелковый полк в течение двух первых часов отразил три контратаки противника. Последняя была особенно упорной... Гитлеровское командование, боясь успешного продвижения советских войск к Жлобину и Рогачеву, перебросило в этот район пять пехотных дивизий из-под Мозыря, две пехотные дивизии и бригаду СС. Это и помогло противнику остановить наступление фронта... Десять с лишним часов дивизия прорывала оборону севернее Потаповки, выйдя на рубеж восточнее хут. Святой — восточнее Паросля — северная окраина п. Первомайский, продвинулась всего на три-четыре километра. Правда, к рассвету полки смогли вырвать у противника еще два километра и оттеснить его на западный берег реки Окра. Я не оговорился, употребив слово «вырвать», именно так и было. Ожесточенные бои разворачивались не только за выгодные рубежи и населенные пункты, но и чуть ли не за каждый метр земли...

Друкуецца паводле кн.: А л т у н и н   А.Т. Звезды над Вислой. Новосибирск, 1982.

Ф.Г.БУЛАТАЎ

Ф.Г.Булатаў.

БУЛАТАЎ Фатых Гарыпавіч, нарадзіўся ў 1902 г. у в. Ніжні Сухаяш Азнакаеўскага раёна Татарыі. Закончыў Аб'яднаную татара-башкірскую ваенную школу ў Казані і з таго часу ўсё сваё жыццё звязаў з Савецкай арміяй. Служыў у першым татарскім палку камандзірам узвода, роты, памочнікам камандзіра батальёна. У 1939 г. — на чале сфарміраванага пад яго кіраўніцтвам палка ў Манголіі, Бурацііі. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандзір палка, 96-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у вызваленні Буда-Кашалёўшчыны. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава II ступені, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. У адстаўцы з 1956 г. Дэпутат Вярхоўнага Савета РСФСР. Заслужаны работнік культуры ТАССР.

...Нашай дывізі было загадана дзейнічаць на лініі Радзеева — Буда-Кашалёва — Шарыбаўка, асноўную ўвагу ўдзяляючы... Жлобінскаму напрамку. Побач з намі ішлі 323-я і 197-я дывізіі, а 260-я стралковая дывізія заставалася ў другім эшалоне корпуса.

Раніцай 27 лістапада мы выбілі ворага з Радзеева, куды адразу перавялі і камандны пункт. Было даволі холадна.

У Радзееве мы планавалі прывесці ў парадак палкі, але не паспелі яшчэ размясціцца як след, як разведка данесла аб новым адыходзе праціўніка. Нашы палкі сталі зноў праследаваць ворага. Каля сяла Шарыбаўка прыйшлося тугавата.

Гітлераўцы загадзя ўмацавалі подступы да сяла. Да таго ж, як нам стала вядома, на гэты ўчастак былі кінуты дадатковыя сілы з варожага рэзерву. Імклівы наступ нашых часцей на некаторы час быў прыпынены.

Спыніліся на ўзгорку. Адсюль Шарыбаўку было відаць як на далоні. Уздоўж ваколіцы цягнуліся траншэі, за імі гарматы. Трохі ніжэй, усяго ў якіх-небудзь двухстах метрах ад варожых акопаў, сярод рэдкіх слупоў рэдзенькага чарналесся, ляжаць нашы байцы. Усяго метраў дзвесце аддзяляла нас ад праціўніка. Але якія гэта былі метры!

Мы адчувалі, што вораг вось-вось паднімецца ў атаку.

— Лазоўскі, —скамандаваў я. — Агонь!

Вораг апярэдзіў нас. З боку Шарыбаўкі загрукаталі гарматы. Праціўнік... контратакаваў. У гэты момант грымнула «кацюша».

У той жа дзень Шарыбаўка стала нашай.

Пасля вызвалення Шарыбаўкі дывізія і ўвесь 53-і корпус праследавалі праціўніка аж да 29 лістапада. Вызваліўшы дзесяткі населеных пунктаў, выйшлі да берагоў ракі Окры. Окра — апошняя перашкода на шляху да Дняпра. Каля Дняпра былі сканцэнтраваны асноўныя сілы праціўніка. Калі мы іх адолеем — дарога на Жлобін адкрыта. Таму мы часова спыніліся і прыступілі да ўмацавання сваіх пазіцый.

12 студзеня 1944 г. па загаду камандуючага арміяй 323-я і 260-я стралковыя дывізіі былі выведзены са складу 53-га корпуса. Нашу дывізію адвялі ў рэзерв Беларускага фронту ва Уваравіцкі раён Гомельскай вобласці.

* * *

...У гэты дзень баі пачаліся з раніцы.

Лейтэнант Галабародзька ў гэты час на чале свайго ўзвода ПТР знаходзіўся на правым флангу і атрымаў асабістае заданне ўдакладніць становішча суседа на месцы.

Праз багністае балота, пад моцным артылерыйскім агнём праціўніка Галабародзька прабіўся да левага суседа. Першае, што ён убачыў, — стаяла гармата на прамой наводцы. Разлік яе поўнасцю выйшаў са строю. Не паспеў Лука Галабародзька разгледзець твары герояў, як пачулася нямецкая мова. Камсамолец Лука Галабародзька вокамгненна прыпаў вачыма да прыцэлу, а затым зрабіў першы стрэл. Снарад разарваўся каля ланцуга контратакуючых гітлераўцаў, затым разарваўся яшчэ снарад. Лука Сяргеевіч біўся не на жыццё, а на смерць. Ён адзін замяніў увесь разлік: яму прыходзілася зараджаць, наводзіць і страляць.

Два разы ён прымусіў немцаў адступіць, але трэці раз адбіць націск яму не ўдалося: быў цяжка паранены ў галаву...

Таварышы, якія падышлі на дапамогу, адкінулі немцаў і ўбачылі каля гарматы знявечаны труп і за два крокі ад яго свежы пянёк увесь у крыві, а наваколо яго валяліся адсечаныя рукі і ногі, тут жа ляжала сякера — нямая сведка зверства фашыстаў...

Друкуецца ў перакладзе з рускай мовы паводле кн.: Булатов Ф.Г. Будни фронтовых лет. Казань, 1984.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Баі за Буда-Кашалёва

З успамінаў І.Гарбатко, былога памочніка камандзіра ўзвода пешай разведкі 1026-га стралковага палка 260-й стралковай дывізіі

Зламаўшы ўмацаваную і глыбока эшаланіраваную абарону ворага на рацэ Сож, наш полк цясніў гітлераўцаў у напрамку Буда-Кашалёва. Цяжкія, кровапралітныя баі цягнуліся з 22 да 26 лістапада 1943 г. Фашысцкія войскі, упарта супраціўляючыся, адыходзілі ў паўночна-заходнім напрамку. Тым часам полк, праследуючы ворага, аказаўся ў краі народных мсціўцаў, дзе разведчык Канаплёў партызаніў каля двух гадоў.

Апошні тыдзень лістапада. Дажджлівая ноч застала нас у лесе. Тарфяная жыжка чмякала пад нагамі. Чобаты зацягвала ў зыбкую ціну. На досвітку ўжо белы снег тонкаю плёнкай накрыў зраненую зямлю. У нас не аказалася пад рукамі белых маскхалатаў. Замест іх разведчык Рыгор Паклонскі прынёс ніжнюю бялізну вялікіх памераў, у якую тут жа мы і «ўлезлі». Галовы і аўтаматы замаскіравалі бінтамі.

Сапёры павольна пракладвалі шлях. Першая процітанкавая гармата трапіла на міну. Загінуў разлік. Нямецкія кулямётчыкі, аўтаматчыкі і «зязюлі» сустракалі сапёраў градам куль з-за кожнага куста, павароту.

Хутка паласа лесу абарвалася. На нашы баявыя парадкі пасыпаліся варожыя міны. Стралялі прамою наводкаю і замаскіраваныя варожыя гарматы. Наша наступленне спынілася.

Падбіраючы назіральны пункт на дзялянцы, якая агінала Буда-Кашалёва, мы выявілі «зязюлю». Разведчык Раманаў трапным стрэлам зняў яе, немец рухнуў на

зямлю. Тут жа з-за доўгага хлява выскачыў другі фашыст. Раманаў злавіў і яго на прыцэл за некалькі метраў ад першага. Атрымаў аўтаматную чаргу і трэці немец, які спяшаўся замяніць загінуўшых. Больш захопнікі не паказваліся. Але яны вельмі актыўна прачэсвалі ўсімі відамі зброі ўзлесак, дзе размясціўся полк.

У гэты час начальнік штаба палка капітан М.М.Арлоў паклікаў разведку ў штаб. Рэдкі выпадак, калі разведку адклікаюць з перадавой. Усе мы насцярожыліся. Была пастаўлена задача: знайсці абходныя шляхі, вывесці батальён для атакі ворага з тылу, звярнуў нашу ўвагу на сінюю лінію на карце, якая намячала шлях для нанясення ўдару фашысцкім варварам у спіну.

Аперацыя пачалася... Прабіраліся абходнымі шляхамі. Байцы цягнулі кулямёты, мінамёты, процітанкавую зброю. Хутка хмызняк парадзеў, а потым і зусім знік. Вораг тут нас не чакаў. Зялёная ракета паклікала ў атаку. Салдаты, пераадолеўшы стомленасць, кінуліся на ворага. Фашысты, захопленыя знянацку, кідалі параненых, зброю і ўцякалі. Разведчыкі атрымалі добрую магчымасць папоўніць свае звесткі аб праціўніку. Асабліва вялікую ролю адыграла карта, якую разведчык Кіра знайшоў у планшэце забітага немца. На ёй былі пазначаны вузлы супраціўлення, агнявыя кропкі і камандныя пункты. Карыстаючыся захопленай картай, мы рушылі прама да каманднага пункта, які знаходзіўся побач з Буда-Кашалёвам. Але ў бункеры нікога не засталі. Немцы ўцяклі, нават тэлефон не вывелі са строю — ён падаваў сігналы. Але вораг не здаваўся. Нямецкае камандаванне хутка правяло перадыслакацыю войскаў, каб закрыць утвораны ў выніку нашага ўдару пралом. Новы бой завязаўся на бліжэйшых падыходах да Буда-Кашалёва. Кулі і асколкі так прашывалі зямлю, што недзе было схавацца. Але кожны воін разумеў задачу: гнаць ворага, не даць яму магчымасці зачапіцца.

26 лістапада па ланцугу наступаючых байцоў пранеслася радасная вестка: узяты Гомель. У гэты дзень воіны нашай дывізіі поўнасцю вызвалілі Буда-Кашалёўскі раён.

Адважны кулямётчык

Стралковы полк, у якім служыў Барыс Пятровіч Лебедзеў, з цяжкімі баямі прайшоў доўгі баявы шлях ад Брэста. Давялося яму вызваляць Беларусь. Асабліва цяжкімі былі баі на подступах да Гомеля і ў пойме ракі Сож. Б.П.Лебедзеў быў кулямётчыкам. «Максім» у яго руках літаральна не ведаў спакою. За дзень даводзілася кулямётчыку, прасоўваючыся наперад ці адбіваючы шалёны націск ворага, расстрэльваць па 10 — 15 стужак патронаў.

Упарта супраціўляўся вораг на ўскраіне Гомеля каля вёсак Давыдаўка і Асаўцы. 18 лістапада ў раёне горада Рэчыца нашы войскі перарэзалі дарогу Гомель — Калінкавічы. Супраціўленне ворага пачало слабець. У ноч на 26 лістапада савецкія байцы авалодалі вёскамі Давыдаўка і Асаўцы, а раніцай уварваліся ў горад. Сярод першых была кулямётная рота 220-га стралковага палка, у якім служыў Б.П.Лебедзеў.

Авалодаўшы горадам, 220-ы стралковы полк працягваў наступленне ў напрамку Буда-Кашалёва — Жлобін. З баямі былі ўзяты населеныя пункты Урыцкае, Іволься, Крыўск, Недайка.

29 лістапада савецкія войскі падышлі да вёскі Губічы. Вораг, выкарыстоўваючы выгадны рэльеф мясцовасці, тут зрабіў моцную абарону. Выбіць адтуль гітлераўцаў было нялёгка. Спачатку нашы войскі занялі толькі ўсходнюю частку вёскі, але развіць далей наступленне не ўдалося — яго спыніла невялікая рачулка, якая працякала праз вёску.

Кулямётчыкі Б.Лебедзеў і М.Казлоў, якія знаходзіліся адзін ад аднаго непадалёку, вялі прыцэльны агонь з кулямётаў па другім беразе. Неўзабаве нашы пехацінцы пайшлі ў атаку. На гэты раз яна прынесла поспех. Вораг быў выбіты з першай, а потым і з другой лініі абароны. Але фашысты не змірыліся са стратай пазіцый, яны арганізавалі некалькі контратак. Вось тут і праявіў мужнасць і вытрымку кулямётчык Барыс Пятровіч Лебедзеў. Фашысты ішлі напралом, імкнучыся раптоўным ударам змяць нашы рады. Аднак нашы воіны не адступілі. Лебедзеў, удала выбраўшы пазіцыю, апынуўся наперадзе. Трапна страляючы з кулямёта, ён прымусіў праціўніка павярнуць назад.

На наступны дзень фашысты контратакавалі яшчэ тройчы і кожны раз атрымлівалі належны адпор. У адной з перастрэлак Лебедзеў, які ўвесь час вёў прыцэльны агонь, быў паранены. Але ён не пакінуў пазіцыю, працягваў бой.

Пасля гэтага бою Б.П.Лебедзеў трапіў у шпіталь і больш у полк не вярнуўся. За мужнасць, праяўленую ў баях, ён быў узнагароджаны медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі» і іншымі.

А.Дранчук.

Прыфрантавая станцыя

Калі пачалася вайна, рабочыя-чыгуначнікі горада Горкага пабудавалі ў пасляработчы час два бронепаязды. У красавіку 1942 г. пачаўся іх баявы шлях. У састаў кожнага поезда ўваходзілі закрытыя і адкрытыя платформы, дзе былі ўстаноўлены гарматы, зеніткі, кулямёты, рэактыўныя ўстаноўкі.

Спачатку бронепаязды ўдзельнічалі ў абароне Масквы, пасля іх шлях пралёг праз Арлоўска-Курскую дугу. Перад воінамі бронепаяздоў стаяла задача ахоўваць прыфрантавыя станцыі ад налётаў фашысцкай авіяцыі. Увосень 1943 г. станцыя Буда-Кашалёўская стала прыфрантавой. Лінія фронту амаль на працягу паўгода пралягала на подступах да Жлобіна.

На станцыю Буда-Кашалёўская няспынна прыбывалі эшалоны з прадуктамі, боепрыпасамі, тэхнікай, палівам. Для аховы станцыі ад фашысцкай авіяцыі неўзабаве сюды прыйшлі два бронепаязды 31-га асобнага Горкаўскага дывізіёна бронепаяздоў. На баявым пасту тут яны знаходзіліся да пачатку летняга наступлення савецкіх войскаў у 1944 г. Услед за наступаючымі савецкімі войскамі далей на захад пайшлі і бронепаязды. У далейшым яны прымалі ўдзел у вызваленні Варшавы, за што дывізіён атрымаў ганаровае званне «Варшаўскі».

Дзень перамогі воіны дывізіёна сустрэлі ў Франкфурце-на-Одэры.

П.Фралоў.

У вызваленым Буда-Кашалёве

З успамінаў Ф.Кісельнікава, былога камандзіра 1-га стралковага батальёна 866-га стралковага палка

Памятаю 28 лістапада 1943 г. Вызвалены ад гітлераўцаў горад Буда-Кашалёва ляжаў у руінах. Жыхары са слязьмі радасці, з хлебам-соллю сустракалі воінаў-вызваліцеляў. Многія партызаны і жыхары прасілі прыняць іх у рады Чырвонай арміі.

Камандаванне 287-й Ноўгарад-Валынскай стралковай дывізіі дазволіла мабілізаваць усіх жадаючых. Іх было нямала.

Жыхарка пасёлка Вясёлы Пахар Марыя Кірэенка расказала воінам аб страшнай смерці ад рук гітлераўцаў свайго бацькі Пятра Піліпавіча, брата Івана, дзядзькі Андрэя Піліпавіча. Пасля доўгіх допытаў і здзекаў іх расстралялі за сувязь з партызанамі.

Такі ж лёс напаткаў і суседзяў Марыі Кірэенкі: Кузьму Прохаравіча Старасценку, Аўрама Андрэевіча Слесарава, Фёдара Рыгоравіча Сцепаненку і іншых. Пасёлак быў разрабаваны і спалены.

Калі мы, развіваючы наступленне ў напрамку Жлобіна, пакідалі Буда-Кашалёва, М.Кірэенка ад імя жывых і мёртвых дала нашым воінам наказ. Я добра памятаю гэтыя словы:

«Родныя нашы байцы! Вызваліцелі нашы! Вы бачыце сваімі вачыма дзікія злачынствы фашыстаў. Адпомсціце ім, таварышы! Знішчайце праклятых катаў-гітлераўцаў. Знішчайце бязлітасна!».

Гэтыя словы былі надрукаваны ў дывізіённай газеце «За перамогу» 30 лістапада 1943 г.

У нашай слаўнай дывізіі служыла многа беларусаў — афіцэраў, салдат і сяржантаў. Усе яны паказвалі ўзоры выканання воінскага абавязку. Добра помнім Мікалая Іванавіча Балдуева з Буда-Кашалёва. Служыў ён тады ў 1-м стралковым батальёне 866-га палка, якім я камандаваў. Гэта быў малады жыццярадасны чарнавокі хлопец. Прыйшоў ён да нас добраахвотнікам, уме-

ла валодаў стралковай зброяй. За адвагу, спрыт і знаходлівасць карыстаўся аўтарытэтам у таварышаў. Усе найбольш адказныя заданні даручалі яму. З баямі ён прайшоў па Украіне, удзельнічаў у баях за вызваленне Ноўгарад-Валынскага, Астрога, Крамянца, Бродаў.

Запомніў на ўсё жыццё

З успамінаў Івана Міхайлавіча Іўкіна, былога кулямётчыка 220-га палка

Баявое хрышчэнне я атрымаў у баях на рацэ Сож на Гомельшчыне. Адступаючы, вораг чапляўся за кожны населены пункт. Нам прыходзілася весці агонь па агнявых кропках і ДЗОТах праціўніка. Калі канчаліся патроны, іх дастаўлялі пад агнём ворага па-пластунску, прывязаўшы скрыню да нагі абмоткамі.

Аднойчы на рацэ Сож я заўважыў лодку ў кустах на беразе праціўніка. З дазволу камандзіра ў халоднай вадзе я пераплыў раку і прыгнаў лодку да нашага берага. Калі я быў на сярэдзіне ракі, фашысты заўважылі мяне і адкрылі мінамётны агонь, але ўсё ж лодку я даставіў.

У баях за горад Жлобін я быў паранены.

Пасля шпіталя мяне накіравалі ў танкавую школу. Потым ваяваў механікам-вадзіцелем танка Т-34. На ім я прайшоў Румынію, Польшчу, Венгрыю. Дзень Перамогі сустрэў у Аўстрыі. Многа было баёў. Але баі на Буда-Кашалёўскай зямлі запомніліся мне на ўсё жыццё.

Вышыня 140,6

Восенню 1943 года непадалёку ад вёскі Гаўлі Патапаўскага сельсавета разгарэліся жорсткія баі за невялікі ўзгорак — вышыню 140,6. Тут загінулі каля 200 воінаў 323-й стралковай дывізіі. Імёны многіх з іх адшукалі юныя следапыты Гаўлеўскай васьмігадовай школы на чале з яе былым дырэктарам М.А.Казаковым. Сярод загінуўшых былі грузіны Зеда-Месхеці і Кліменцій Міхайлавіч Пінтава, узбек Маскудава Насыбалі, украінец Логінаў Міхаіл Георгіевіч, рускі Аксёненка Максім Сцяпанавіч, беларус Сідарэнка Андрэй Дзмітрыевіч і іншыя.

На брацкую магілу прыязджаюць родныя загінуўшых. Яны прывозяць жменькі зямлі з іх родных мясцін. І ўзвысіўся над магілкамі курган Славы.

І.П.Чарняк.

Ордэн Славы за вызваленне Беларусі

Аляксандр Гаўрылавіч Мальчыкаў, ураджэнец Ульянаўскай вобласці, вызваляў Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прайшоў з баямі праз горад Добруш, г.п.Касцюкоўку, торфазавод «Бальшавік», вёскі Гусявіца, Гаўлі, Патапаўка і далей на Бабруйск. За ўдалы пераход чыгункі ў раёне станцыі Беразіно і ўтрыманне захопленага плацдарма артылерыст быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

А пачаў вайну Аляксандр Гаўрылавіч у лютым 1942 г. на Паўночна-Заходнім фронце. За мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях у раёне Старая Руса, ён атрымаў першую ўрадавую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі. Удзельнічаў у баях на Арлоўска-Курскай дузе. У баях за вызваленне горада Бранска атрымаў медаль «За адвагу». Вызначыўся А.Г.Мальчыкаў у баях за вызваленне Польшчы. За імклівае фарсіраванне Віслы і знішчэнне пасля пераправы чатырох агнявых кропак праціўніка атрымаў ордэн Айчыннай вайны II ступені.

З 1947 г. жыве ў г.п. Уваравічы. Яго жонкай стала Ніна Фёдараўна Шавялёва, з якой ён пазнаёміўся, калі вызваляў вёску Гусявіцу.

П.Мінкоў.

Вызваляў родную Беларусь

З успамінаў Івана Драздова, ветэрана вайны

Мне давялося ўдзельнічаць у баявых аперацыях за вызваленне Гомельшчыны і нашага раёна, і я гэтым вельмі ганаруся. У лістападзе 1941 г. я быў залічаны ў Саратаўскае ваенна-пяхотнае вучылішча. У кастрычніку 1942 г. у званні лейтэнанта трапіў у самае гарніла вайны — пад Сталінград, на Данскі фронт. Ужо ў снежні гэтага года я прыняў удзел у ліквідацыі блакады гераічнага горада на Волзе.

Як вядома, Данскі фронт пайшоў у абход Сталінграда з поўдня. За 8 баявых дзён мы зрабілі 250 кіламетраў на Мілерава, дзе былі знішчаны значныя сілы праціўніка і захоплена ў палон шмат фашыстаў. Гітлераўцы зрабілі свой марш па Маскве летам 1944 г., толькі не як пераможцы, а як палонныя. 28 снежня 1942 г. пад Мілеравам мяне цяжка параніла.

Пасля лячэння ў шпіталях я зноў трапіў у сваю часць, на свой фронт. Але ён ужо называўся Першым Беларускім і ішоў у напрамку Гомеля. Наша часць вызваляла Казельск, Бранск, Бежыцу, Унечу, Клінцы, Добруш. Да Сожа падышлі 3 лістапада 1943 г.

Баі за Гомель былі працяглыя і цяжкія. У жорсткіх бітвах за вызваленне Гомеля мяне зноў параніла. А неўзабаве мы вызвалялі Уваравічы. Паранены, я прыбыў у родную Глазаўку. Пасля кароткай пабыўкі ў родных зноў трапіў на лячэнне ў шпіталь.

У лютым — сакавіку 1944 г. удзельнічаў у жорсткіх баях пад Жлобінам. Там за Радзіму склалі галовы многія мае сябры, аднапалчане, землякі. І зноў раненне, шпіталь, і зноў са шпіталя вярнуўся ў сваю часць.

За 8 баявых дзён мая часць прайшла баявы шлях ад Заходняга Буга да Віслы, вызваляла горад Люблін. Раненне 9 верасня 1944 г. на сандамірскім плацдарме вывела мяне з вайны. Закончыў яе ў званні старшага лейтэнанта. Маю ордэн Аляксандра Неўскага. Але асабліва дорага і прыемна, што ордэн Чырвонай Зоркі і медаль «За адвагу» мне былі ўручаны за актыўны ўдзел у баях за Гомельшчыну.

Воін, вучоны, педагог

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Павел Купрын закончыў дзевяць класаў. Удзельнічаў у абарончых работах на тульскай зямлі. Як і ўсе юнакі таго часу, імкнуўся на фронт. Але яго жаданне здзейснілася толькі летам 1942 г. Да гэтага часу Павел закончыў сярэднюю школу, і яго накіравалі ў ваеннае вучылішча, пасля заканчэння якога ён стаў камандзірам кулямётнага ўзвода 220-га палка Бежыцкай дывізіі.

Пасля баёў за Бранск на гімнасцёрцы П.Купрына заблішчаў першы баявы ордэн — ордэн Чырвонай Зоркі.

Баі за Бранск і Бежыцу былі цяжкія і кровапралітныя. За іх дывізіі было прысвоена званне «Бежыцкая». Яна працягвала наступленне ў напрамку Гомеля.

...Было гэта ў лістападзе 1943 г. У баях за Гомель воінам давялося фарсіраваць раку Сож ужо на самых подступах да горада. Дзьмуў моцны вецер, ішоў дождж са снегам. Кулямётны ўзвод з правага берага падтрымліваў пераправу батальёна. Хутка пераправіліся на захоплены плацдарм на левым беразе і кулямётчыкі. Воіны падняліся ў атаку. І тут раптам разарвалася нямецкая міна. Асколкамі яе быў забіты наводчык з другога разліку ўзвода Валодзя Гарбачоў. Кулямёт яго змоўк. А немцы пачалі шалёную страляніну. Тады за змоўклы кулямёт лёг лейтэнант Купрын і працягваў весці прыцэльны агонь па фашыстах.

Нямецкі снайпер восем разоў трапіў у шчыт кулямёта, з якога страляў Купрын. Твар узводнага быў моцна падрапаны асколкамі з адваротнага боку шчыта. Пот і кроў залівалі вочы, але камандзір не пакідаў агнявой кропкі, паказваючы прыклад адвагі і мужнасці іншым кулямётным разлікам.

Пасля вызвалення Гомеля полк прарваўся з баямі ў напрамку Буда-Кашалёва. Асабліва ўпартае супраціўленне фашысты аказалі каля вёскі Губічы. За яе вызваленне загінулі 270 салдат і афіцэраў.

За вызваленне Буда-Кашалёўскага раёна Павел Мікалаевіч Купрын быў узнагароджаны другім ордэнам Чырвонай

Зоркі. А полк, у якім пасля баёў за Губічы засталося ўсяго 13 чалавек, затым папоўніўся і ўдзельнічаў у вызваленні Украіны, Карпат, Польшчы, у штурме Берліна. Павел Мікалаевіч стаў камандзірам кулямётнай роты. Да яго двух ордэнаў Чырвонай Зоркі дадаўся ордэн Айчыннай вайны II ступені, іншыя ўзнагароды.

Дэмабілізаваўшыся ў 1946 г. з арміі, Павел Мікалаевіч паступіў у Маскоўскі універсітэт, тут жа закончыў аспірантуру і ў 1955 г. былы франтавік абараніў кандыдацкую дысертацыю, стаў дацэнтам кафедры геалогіі.

П.Барысаў.

Вызваляў наш раён

Буйневіч Васіль Пятровіч нарадзіўся ў 1917 г. у вёсцы Забор'е Краснагорскага раёна Бранскай вобласці. З 1939 г. у Чырвонай арміі. Вялікую Айчынную вайну сустрэў у горадзе Стараканстанцінава Камянец-Падольскай вобласці (Украіна). У складзе 12-га танкавага палка 12-й танкавай дывізіі ваяваў пад Харкавам, Бранскам у складзе 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх франтоў. Удзельнічаў у ліквідацыі акружанай пад Бабруйскам варожай групоўкі, вызваляў Веткаўскі і Буда-Кашалёўскі раёны Гомельшчыны, сталіцу рэспублікі горад Мінск, Беласток.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў, адзінаццаццю медалямі.

І.П.Чарняк.

Круціў баранку салдат

Ураджэнец Растоўскай вобласці Аляксандр Аляксеевіч Васкоўскі праходзіў службу ў Віцебску. Тут і застала яго вайна.

У час, калі фашысцкія войскі рваліся да Масквы, Аляксандр Васкоўскі стаў яе абаронцам, за што атрымаў медаль «За абарону Масквы».

І зноў баі, зноў паходы, небяспечныя рэйсы. Летам 1943 г. Чырвоная Армія пачала вызваляць беларускую зямлю.

— Мы гналі фашысцкую нечысць па абпаленай і шматпакутнай зямлі, — расказвае А.А.Васкоўскі. — Радасна і ўрачыста сустракала вызваліцеляў Беларусь. У гарпасёлку Уваравічы пазнаёміўся з дзяўчынай, якая стала потым жонкай. Тут і застаўся пасля вайны. Але да перамогі было яшчэ далёка. Наперадзе былі Мінск, Варшава...

Пасля адгрымеўшых баёў Аляксандр Васкоўскі вярнуўся ва Уваравічы. На грудзях яго ззялі многія ўрадавыя ўзнагароды.

П.Нікітнёў.

Пісьмо з фронту

Байцы рыхтаваліся да атакі. Але на гэты раз вораг апярэдзіў. Раніцай немцы пачалі артпадрыхтоўку, і як толькі сціхлі разрывы, кінуліся на пазіцыі роты.

Куюкоў пільна сачыў за наступаючымі немцамі і, падпусціўшы іх бліжэй, некалькі разоў паласнуў па ворагу. Немцы заляглі, спрабуючы невялікімі групамі прарвацца да нашай траншэі. Але кулямётчык трапнымі стрэламі адбіў у іх гэту ахвоту: фашысты адышлі.

Паявіўся ўзводны і загадаў кулямётчыку заняць пазіцыю каля палаючага хлява.

— Калі немцы адтуль прарвуцца, нам не выстаяць, — сказаў ён.

Праз некалькі хвілін Куюкоў разам з памочнікам Сямёнам былі на новай пазіцыі. Яна была выгаднай: немцы не маглі падабрацца непрыкметна, а кулямётчыкам можна было весці прыцэльны агонь.

Хутка фашысты зноў пайшлі ў атаку. Бесперапынна стракатаў кулямёт. Яго некалькі разоў прыходзілася перацягваць ад адной варонкі да другой. Міхаіл біў кароткімі чэргамі, думаючы аб адным: не скончыліся б патроны.

Неўзабаве немцы пачалі мінамётны абстрэл. Адна з фашысцкіх мін разарвалася зусім побач. Міхаіла адкінула ад кулямёта, ён быў паранены.

Немцы кінуліся ў атаку. Доўгай чаргой Міхаіл прыціснуў іх да зямлі. Але ненадоўга. Фашысты ўпарта лезлі наперад. Чарга, яшчэ чарга, і кулямёт замоўк: патроны скончыліся.

Побач штосьці шчоўкнула, загрымела, і

Міхаіл больш нічога не чуў. Калі ён адкрыў вочы, зразумеў, што аглух. Перад сабой убачыў выскалены твар фашыста. Імгненна зрэагаваўшы, Міхаіл стаў на калені і секануў сапёрнай лапаткай па гэтым ненавісным твары. Аўтамат немца аказаўся ў яго руках.

Міхаіл з цяжкасцю падняўся. Прама перад ім стаялі з аўтаматамі чатыры варожыя салдаты. Адзін з іх як падкошаны ўпаў на зямлю, прашыты чаргой Міхаіла.

Больш Міхаіл Куюкоў нічога не чуў: тры аўтаматныя чаргі прашылі яго. Гэта здарылася 30 верасня 1943 г.

...Бацька Міхаіла ў вёсцы Старое Абашава Кемераўскай вобласці неўзабаве атрымаў пісьмо з фронту. Баявыя сябры сына пісалі:

«Дарагі Міхаіл Сцяпанавіч! Мы ведалі Вашага сына як сумленнага і адважнага воіна. Ён любіў сваю Радзіму больш, чым сваё жыццё.

Міша загінуў па-геройску. Камандаванне палка прадставіла яго да звання Героя Савецкага Саюза. Мы адпомсцім за смерць Мішы, за смерць таварышаў і выканаем свой абавязак перад Радзімай да канца.

Камсорг батальёна Голікаў, сяржант Дубровін, сяржант Фясенка, чырвонаармеец Уганаў».

М.Салаўёў.

Кулямётчык Казанцаў

Першае баявое хрышчэнне кулямётчык Уладзімір Казанцаў прыняў 22 чэрвеня 1941 г. у мястэчку Траўгутаве, што за тры кіламетры ад Брэста, дзе праходзіў тэрміновую службу. 800 метраў аддзялялі яго вайсковую часць ад граніцы. І тут раптам раніцай моцныя выбухі ўскалыхнулі зямлю.

Вайна... Здавалася, няма таго месца, дзе б не рваліся снарады. Усё навокал гарэла. Адзін снарад трапіў у казарму, дзе адпачывалі чырвонаармейцы, многія з іх загінулі.

Пасля моцнага артылерыйскага абстрэлу гітлераўцы на матацыклах рушылі да мястэчка. За імі ішла пяхота. Маленькая група нашых салдат, дзе старшым быў Казанцаў, залягла за разбураным домам. Адсюль добра было відаць ворага. Адлегласць да яго каля ста метраў. Ужо можна весці прыцэльны агонь.

— Агонь! — падаў каманду Уладзімір Казанцаў.

Застракатаў кулямёт, загаварылі аўтаматы. Дзесяткі фашыстаў пападалі забітымі, астатнія заляглі. Дзве атакі адбілі нашы воіны. Немцы перабежкамі пачалі іх акружаць. Заставацца тут было небяспечна, і воіны адступілі.

Тры дні кулямётчык У.Казанцаў абараняў Брэсцкую крэпасць. Чырвонаармейцы адбівалі атаку за атакай, пераходзілі і ў контратакі. На чацвёрты дзень вайны ў жорсткім баі ён быў паранены. Дзесяць месяцаў яму давялося вандраваць па шпіталях.

Потым былі баі за вызваленне беларускай зямлі. З баямі ішоў кулямётчык Казанцаў на захад. Летам 1944 г. удзельнічаў у акружэнні і разгроме гітлераўскіх войскаў пад Мінскам. Вызваленая сталіца рэспублікі з кветкамі сустракала сваіх вызваліцеляў. Сярод іх быў і Уладзімір Казанцаў, узнагароджаны ордэнам Славы II ступені.

Потым былі цяжкія баі на літоўскай зямлі. У адным з іх Казанцаў з байцом У.Гурковым захапілі штабную машыну з шасцю афіцэрамі, пры іх былі важныя дакументы. А праз некалькі дзён у раёне вёскі Пільвішкі ў жытнёвым полі падбілі тры «фердынанды» і забралі ў палон чатырох гітлераўцаў.

З баямі кулямётчык Казанцаў дайшоў да Германіі. За мужнасць і адвагу ён быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Славы II і III ступеняў, медалямі «За ўзяцце Кёнігсберга», «За адвагу», «За баявыя заслугі» і інш. Пасля дэмабілізацыі доўгі час працаваў у будаўнічай брыгадзе райспажыўсаюза ў родным горадзе Буда-Кашалёва.

І.П.Чарняк.

Дапамагалі партызаны

З успамінаў Пятра Яфрэмавіча Мацюшкова, былога камандзіра партызанскага атрада імя М.І.Кутузава

...22 чэрвеня 1943 г. у тры гадзіны ночы Уладзімір (наш партызанскі радыст) зайшоў у зямлянку і падаў мне радыёграму, у якой гаварылася аб узмацненні кантролю за адступленнем немцаў у напрамку Чачэрска і Кармы, актывізацыі баявых

дзеянняў партызан супраць адступаючых фашыстаў.

Раніцай начальнік штаба Аркадзь Фінадзееў у лесе каля вёскі Курганіца Чачэрскага раёна сабраў камандзіраў і паставіў ім баявую задачу.

1 ліпеня 1943 г. на золку наш атрад і рота партызан пад камандаваннем Маслава сустрэлі каля вёскі Кляпіна сем аўтамашын з акупантамі. Завязаўся бой. Ён быў кароткім і нечаканым для немцаў. 13 фашыстаў было ўзята ў палон, больш за 50 забіты. Пяць аўтамашын партызаны падарвалі і спалілі.

З ліпеня партызаны ўзвода, якім камандаваў Сяргей Касцянец, спалілі два масты на шашы Гомель — Доўск. Рух немцаў праз вёску Дзербічы быў на некалькі дзён спынены. Увечары гэтага ж дня чатыры дыверсійныя групы партызан накіраваліся на чыгунку Гомель — Жлобін. У вёсцы Майсееўка знішчылі дзве нямецкія аўтамашыны.

Баявыя дзеянні партызан з кожным днём узмацняліся. Немцы не мелі спакою ні днём, ні ноччу. Дапамога народных мсціўцаў воінам Чырвонай арміі перад стратэгічнай аперацыяй «Баграціён» была адчувальнай.

Узнагароджана медалём Флорэнс Найцінгейл

Соф'я Васільеўна Голухава нарадзілася ў 1921 г. у вёсцы Люшава Буда-Кашалёўскага раёна. У 1940 г. скончыла медыцынскую школу ў г. Жлобіне. Працавала медыцынскай сястрой ва Уваравіцкай раённай бальніцы.

З першых дзён вайны добраахвотна пайшла ў Чырвоную армію. Да восені 1941 г. суправаджала параненых на санітарным параходзе «Клім Варашылаў» у прыволжскія шпіталі. Затым была старшай медсястрой аперацыйна-хірургічнага аддзялення 235-га асобнага медыка-санітарнага батальёна 134-й стралковай дывізіі Калінінскага фронту. У жніўні 1942 г. дабілася пераводу на перадавую лінію фронту. За перыяд баёў за горад Белы Калінінскай вобласці вынесла з поля бою больш за 40 параненых байцоў і камандзіраў. У гэтых баях была цяжка паранена. Два гады ўрачы змагаліся за яе жыццё. Як інвалід была дэмабілізавана з арміі. Яшчэ ў шпіталях атрымала дзве новыя прафесіі — стэнографісткі і бухгалтара. У жніўні 1944 г. вярнулася ў родную вёску. Загадвала фельчарска-акушэрскім пунктам у вёсцы Буда-Люшава, працавала ў Любовінскай участковай бальніцы. Многа гадоў узначальвала пярвічны камітэт Таварыства Чырвонага Крыжа. Была дэпутатам раённага і сельскага Саветаў. Мае восем урадавых узнагарод, сярод якіх медаль Флорэнс Найцінгейл.

З запісак ваеннага хірурга

АМОСАЎ Мікалай Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1913 г. Хірург. Акадэмік АН УССР (1969). Член-кар. АМН (1961). Герой Сацыялістычнай Працы (1973). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1962—1979), лаўрэат Ленінскай прэміі 1961 г. М.М.Амосаў — удзельнік вызвалення Беларусі, у т.л. Буда-Кашалёўскага раёна.

Приехали вечером. Остановились у взорванного вокзала. Начальник пошел к коменданту. Холодно и тоскливо. Разожгли костер. Федя сделал шоферскую разведку — «Плохо!» Станция снабжает две армии. Все забито тылами.

Наконец идет начальник. Грустный. «Ничего нет». Ночевали в хате, занятой ЭПом.

Следующий день проискали в окрестностях... Безнадежно. Батальон аэродромного обслуживания. Автобазы, склады, все, кроме места для раненых...

Вечером, когда возвращались замерзшие, увидели двухэтажную школу без окон и дверей...

В 41-м году в этой школе немцы собирали всех евреев, перед тем как расстрелять.

— Пойдем посмотрим.

Посмотрели. Окна и двери выломаны, некоторые даже с косяками... Печки полуразрушены, украдены все дверки и вьюшки. Но полы и потолки почти везде целы. И крыша.

— Неплохой бы мог быть госпиталь, а?

— Отличный. Но как осилить?

Вечером приехали наши с летучкой. Выгрузились, погрустили, раскинули па-

М.М.Амосаў.

латки, чтобы ночевать. Ходили школу смотреть.

Решились. Утром начался ремонт. Сто человек выздоравливающих — есть мастера, но нет материалов. Пошли искать по домам. Обнаружены вывороченные вьюшки и часть дверей. Мужики не зевали. Но и мы не церемонились.

Трудно со стеклами. Нашлись добрые люди, отдали часть своих зимних рам, можно хоть маленькие окошки вставить. Кирпича много на станции — взорванный вокзал и башня. Но непросто его выламывать.

Каждое подразделение само ремонтировало себе помещение. Закладывали окна кирпичом до размеров имеющихся рам, вставляли вьюшки и дверки, ладили двери. Все стали печниками и плотниками.

Полностью воспроизвели схему Хоробичей, только в лучшем варианте — в одном здании двести пятьдесят коек, баня и перевязочная. Вместе с палатками снова имеем шестьсот мест.

На этот раз раненых, привозимых в Буду, сортировали в ЭПе. Проблемы не было. Приходит колонна машин, сортировщик командует: «Ходячие, вылезай!» Все, кто может, моментально слезут. Остальных везут нам.

26 декабря, еще не окончен был ремонт, но работа началась. Госпитали первой линии накопили раненых, пока мы переезжали, и теперь везли их к нам по пятьдесят — шестьдесят человек в день. Раненые тяжелые. Наш контингент.

Началось наступление, и поток увеличился. Такого сумасшествия, как в Хоробичах, не было: поступало самое большее двести—триста человек. Скоро пошли летучки, поэтому больше семисот раненых у нас не собиралось. Занимали одну-две соседние улицы.

В эвакуации была только одна трудность: захватить вагоны в поезде. ЭП стоял около станции, публика у него подвижная — скомандуй, сами прибегут и в вагоны залезут. Нам нужно было вывезти иногда двести—четыреста человек. Где транспорт взять? Но голь на выдумки хитра. В день эвакуации мы ставили «заставы» на дорогах, что ведут к Буде, — арестовывали всех колхозников с лошадьми, «пригоняли» к госпиталю. Они были обязаны возить раненых, пока не погрузим всех в поезд. В день летучки улица вокруг госпиталя запружена разномастными клячами и санями. На каждой сидит хозяин и с ним санитар из выздоравливающих.

Армия вела наступление до 20 февраля. Куда наступали, мы толком не знали. Бывают такие бои, которые в сводки не попадают...

Произошло важное событие в моей жизи: я женился. В первых числах января Лида Денисенко переехала ко мне. Было объявлено во всеуслышание: жена!

Кончилась моя свобода. Я не очень ею пользовался, но ощущение возможности приятно. Значит, уж такова судьба мужчины. Три с половиной года я был холостым после Али... Так мало! А первый раз женился в двадцать. Теперь мне уже тридцать. Пора. Нам нашли комнату рядом с госпиталем. Хорошая комната, даже радио. Хозяева живут в другой половине. Настоящие молодожены.

Было несколько бомбежек. Дважды вылетали стекла в перевязочной. Один раз бомбили днем, все столы в перевязочной были заняты. Не слышали, когда прилетели самолеты, и вдруг взрывы совсем рядом, полетели стекла. Наших лежачих, тяжелых раненых, как ветром сдуло со столов — сразу оказались на полу. В палатах тоже попрятались под топчаны. Паника была изрядная. Но сестры все остались на местах и успокаивали своих больных.

Второй раз бомбили целый вечер. После первого налета привезли раненного в живот лейтенанта — он оказался приятелем нашей сестры Веры. Поступил в шоке, вывели, срочно оперировали. Только вскрыли живот: бомбы! Одна, другая, совсем рядом. Посыпались стекла. Все

наши держались мужественно, никто не нарушил асептику. Лида боится самолетов, но и она только присела, выставив стерильные руки вверх. Лейтенант умер спустя пять дней после операции. Развился перитонит, и его не смогли спасти.

Еще одно событие: в Буде судили полицаев и других предателей. Двоих приговорили к повешению. Была публичная казнь на пригорке под высокими соснами, почти рядом с госпиталем. Масса народа собралась. Многие наши ходили. Приговоренных поставили на машину, петли приладили на ветку сосны, зачитали приговор, и машина пошла. Я за наказание предателей. Но надо ли публично? Чтобы дети смотрели?

Межбоевой период. Войска в обороне. Большинство госпиталей свернуто. Время переездов, инспекций, учебы и совещаний.

В апреле ездили с начальником и Канским в Речицу на армейскую хирургическую конференцию. На выставке мы похвалились гипсом, повязки были наложены на санитара Степу Кравченко, срезаны, заглажены и высушены. Получились как античные скульптуры. Очень всем понравилось. Думаем под них получить профиль спецгоспиталя «Бедро — суставы», если такой будет.

В президиуме сидели строевые генералы. Армейский хирург сделал обзорный доклад — пересказал «Указание». Ни слова о трудностях, будто и не было Угольной и Хоробичей.

Были научные доклады. Я тоже выступал, даже дважды. Повторил калужские материалы о «коленках» и рассказал новое о пневмотораксах. А самым лучшим было сообщение:

— Одессу освободили!

Со смешанным чувством еду домой, в Буду. Приятно, что доклады прошли хорошо. Приятно сравнить себя с другими и убедиться: да, на уровне. Вот и ящик с гипсами едет обратно, жалко было выбросить, хотя на что они? Приятно знакомство

У аперацыйнай медсанбата. 1944 г.

завести с хорошими людьми — хирургами. Но противно слышать хвастовство. И еще так далеко до Берлина. Идет дождь. Дорога совершенно размокла. Как свернули с шоссе, так и застряли. Я не стал ожидать, пока будет трактор или студебеккер, — пошел пешком. Восемнадцать километров по глубокой грязи... Пришел поздно вечером, устал до полусмерти. Лида ужин взяла для меня. Попили чай, рассказал... Стало легче. Брак — неплохо придумано.

Пришло письмо из 1-го Московского мединститута, сообщалось, что профессор Селищев дал на мою диссертацию отрицательную рецензию и поэтому она не может быть рекомендована к защите... Горько стало. Хотя я и не особенно рассчитывал, но тайно надеялся.

Кончится война — кому будут интересны «бедра», «коленки», пневмотораксы? И станешь ты, Амосов, опять ординатором с двухлетним стажем...

Едем старой дорогой через Гомель. Сейчас он куда красивее. Отцветают яблони. Масса зелени, она закрывает пепелища деревянных домиков на окраине. Странно торчат черные трубы среди цветущих деревьев. Трава еще не растет на пепелищах, и черные фундаменты домов как врезаны в зеленые рамы двориков.

Но всюду уже копаются люди. Уже не погорельцы, а горожане. Уже живой, наш, советский город. Висят лозунги: «Возродим родной Гомель!».

Наука и жизнь. 1974. № 1. С. 83—86.

Падрыхтаваў У.Я.Райскі.

Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад вамі.
Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы.
Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў вашай любові
да нашай Радзімы
навек незгасальна.
Памяць пра вас у нас назаўсёды,
як неўміручая наша зямля
і як вечнае яркае сонца над ёю!

АХВЯРЫ ВАЙНЫ

Загінуўшыя партызаны, удзельнікі антыфашысцкага падполля, асобы, якія садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, члены іх сем'яў і мірныя жыхары — ахвяры фашысцкага тэрору

АНІСЬКОЎ Фёдар Рыгоравіч, н. у 1911 у г. Буда-Кашалёва, партызан, загінуў у 1944.

АНТОНАВА Ефрасіння Іванаўна, н. у 1916 у в. Губічы, партызанка, расстраляна ў 1942.

АРХІПЕНКА Якаў Іванавіч, н. у 1914 у в. Буда-Люшаўская, партызан, загінуў у 1943.

АРЦЁМЕНКА Уладзімір Ціханавіч, н. у в. Прыбар Мікалаеўскага сельсавета, партызан, загінуў у 1943.

АТРОХАЎ Іван Сяргеевіч, н. у 1909 у в. Негаўка, партызан, загінуў 7.4.1943.

АЎДАШКОЎ Міхаіл Ермалаевіч, н. у 1908 у пас. Чырвоны Гарадок, сувязны, партызан, расстраляны ў 1943.

АЎСЯНІКАЎ Васіль Піліпавіч, н. у 1925, партызан, памёр ад ран 26.11.1943 у пас. Зара.

АФАНАСЕНКА Надзея Іванаўна, н. у 1924 у в. Харошаўка, партызанка, загінула ў 1942 у в. Елянец.

БАБУШКІН Максім Яўцехавіч, н. у 1911 у в. Бацунь, партызан, расстраляны ў 1943 у в. Бацунь.

БАГАЧЭНКА Міхаіл Паўлавіч, н. у 1919, ст. сяржант, камандзір аддзялення партызанскага атрада, загінуў 2.12.1943, пахаваны ў Ельскім р-не Гомельскай вобл.

БАРАНАЎ Віктар Несцеравіч, н. у в. Радзеева, партызан, загінуў 5.12.1944.

БОЛДЫРАЎ Пётр Гаўрылавіч, н. у 1914, партызан, расстраляны 24.5.1943 у в. Буда-Люшаўская.

БРУЯНКОЎ Іван Свірыдавіч, н. у 1902 у г. Буда-Кашалёва, партызан, расстраляны 10.9.1942.

ВАЙТЛЯНСКІ Анатоль Якаўлевіч, н. у 1915 у в. Выдрыца, баец атрада імя Калініна, загінуў 14.7.1943 у в. Саўгасная.

ГАНАЧКОЎ Гаўрыла Васільевіч, н. у 1905 у в. Крыўск, партызан, расстраляны ў 1943.

ГАЎРЫЛЕНКА Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1923 у в. Жытанежжа, партызан, загінуў.

ГЛАДУНОЎ Мікалай Аляксандравіч, н. у 1924 у в. Калініна, падпольшчык, расстраляны ў чэрвені 1942 у Гомелі.

ГРЭБЯНЧУК Мікалай Мікалаевіч, н. у 1921 у г.п. Уваравічы, партызан, загінуў у ліпені 1943.

ГУБАНАЎ Анатоль Фёдаравіч, н. у пас. Краснае Знамя, падпольшчык, расстраляны ў чэрвені 1942 у Гомелі.

ДЗЕРГАЧОЎ Мікалай Мікалаевіч, н. у 1915 у в. Фундамінка, мал. лейтэнант, партызан 255-га атрада імя Сталіна, загінуў 1.12.1942.

ДЗМІТРАЎЦОВА Анастасія Карнееўна, партызанка, загінула 13.6.1944.

ДЗМІТРЫЧЭНКА Іван Паўлавіч, н. у в. Струкачоў Кармянскага р-на, партызан 10-й партызанскай брыгады, загінуў, пахаваны ў в. Асінаўка Старасельскага сельсавета Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ЕЛІСЕЕЎ Авяр'ян Емяльянавіч, н. у г. Буда-Кашалёва, партызан, загінуў 16.2.1942.

ЕРМАКОЎ Піліп Піменавіч, н. у 1923 у в. Кастрышча, партызан, загінуў 25.10.1943.

ЖУКАЎ Генрых Фёдаравіч, н. у 1927 у в. Рудня-Віктарынская, партызан, загінуў 23.7.1943 у Катынецкім р-не Арлоўскай вобл.

ЗЕНІН Дзяніс Кузьміч, н. у 1923 у в. Буда Люшаўская, партызан, загінуў 24.8.1943 у в. Любань.

ЗУБКОЎ Аляксандр Прохаравіч, н. у 1917, партызан, загінуў у 1943 у в. Губічы.

ЗЮЗЯНКОЎ Ціт Трафімавіч, н. у 1925, партызан, загінуў 25.10.1943, пахаваны ў в. Елізаравічы Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

ЗЯЦІКАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1914 у в. Брылеў, партызан, загінуў 22.10.1943.

ІСАЧАНКА Аляксандр Лаўрэнцьевіч, н. у 1919 у в. Хоўхла, партызан, загінуў 7.10.1942.

КАБАНАЎ Мікалай Пятровіч, н. у 1923 у в. Шарыбаўка, партызан, загінуў 5.6.1943.

КАБКОЎ Аляксандр Сяргеевіч, н. у 1924 у в. Калініна, падпольшчык, павешаны 14.7.1942 у в. Калініна.

КАВАЛЬКОЎ Васіль Лявонавіч, н. у 1924, партызан, закатаваны 8.8.1943 у в. Буда-Люшаўская.

КАВАЛЬСКІ Леанід Міхайлавіч, н. у 1921 у в. Уза, падпольшчык, павешаны 14.2.1942 у в. Калініна.

КАЕШКА Емяльян Сцяпанавіч, н. у пас. Камунар, партызан, загінуў.

КАЖЭЎНІКАЎ Радзівон Іванавіч, партызан, расстраляны ў ліпені 1943.

КАЛАШНІКАЎ Уладзімір Сямёнавіч, н. у 1924 у в. Калініна, падпольшчык, расстраляны ў чэрвені 1942 у Гомелі.

КАМЕНЧУКОЎ Апанас Цярэнцьевіч, н. у 1910 у в. Елянец, партызан, загінуў 3.8.1943 у в. Капань Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

КАНАВАЛЕНКА Іван Андрэевіч, н. у 1919 у в. Кашалёў, партызан, загінуў 19 лістапада 1942.

КАНЦАВЫ Іван Фёдаравіч, н. у 1926 у в. Калініна, падпольшчык, павешаны 14.7.1942 у в. Калініна.

КАПРАЛАЎ Васіль Несцеравіч, н. у 1925 у в. Калініна, падпольшчык, расстраляны ў чэрвені 1942 у Гомелі.

КАРБАЧОЎ Аляксандр Несцеравіч, н. у 1925, загінуў 5.10.1943.

КАСЦЯНКОЎ Карп Кірылавіч, н. у 1902 у пас. Чырвоны Дунай, партызан, загінуў 23.11.1943.

КАЦУБАЎ Якаў Кузьміч, н. у 1908 у в. Губічы, баец атрада імя С.М.Будзённага Рэчыцкай брыгады імя К.Я.Варашылава, загінуў 9.8.1943.

КІРЭЕНКА Андрэй Піліпавіч, н. у 1904 у в. Сялец, партызан, загінуў у пас. Закрэўе.

КІРЭЕНКА Іван Цітавіч, н. у 1931, забіты ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КІРЭЕНКА Ціт Піліпавіч, н. у пас. Юга-Мікольск, расстраляны ў 1943.

КІРЭЕЎ Філімон Яўхімавіч, н. у в. Прыбар, партызан, загінуў 20.5.1943.

КІСЯЛЁЎ Якаў (Якуб) Цітавіч, н. у в. Радзеева, партызан, загінуў у в. Дуравічы.

КОХАН Міхаіл Малахавіч, н. у 1905, партызан, прапаў без вестак у 1941.

КРАЎЦОЎ Веніямін Гаўрылавіч, н. у в. Пыцькаўка, партызан, прапаў без вестак.

КРАЎЧАНКА Аляксей Палікарпавіч, н. у 1926 у в. Чэрапаўка, партызан, загінуў 17.9.1943.

КРАЎЧАНКА Уладзімір Іванавіч, н. у 1922 у в. Патапаўка, партызан, загінуў 25.10.1943 у в. Патапаўка.

А.Ц.Каменчукоў.

Т.І.Маркелава.

А.П.Міроненка.

КУЖАНАЎ Іван Нічыпаравіч, н. у 1922 у в. Струкі, партызан, прапаў без вестак у красавіку 1944.

КУЗЬМЯНКОЎ Фядос Барысавіч, н. у в. Радзеева, партызан, загінуў у верасні 1943.

ЛАРАЧКІН Рыгор Рыгоравіч, н. у 1919 у былым Увараўіцкім р-не, прапаў без вестак 1.7.1944 у с. Полін.

ЛАРЫЁНАЎ Уладзімір Якаўлевіч, н. у 1922 у в. Крыўск, партызан, загінуў.

ЛАТУШКІНА Марыя Архіпаўна, н. у 1923 у в. Лозаў, партызанка, загінула 1.5.1943.

ЛАЎРЭНАЎ Уладзімір Андрэевіч, н. у 1919, партызан, загінуў 15.3.1944 у в. Хмяльное.

МАЕЎСКІ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1922 у в. Губічы, баец атрада імя С.М.Будзённага Рэчыцкай брыгады імя К.Я.Варашылава, памёр ад ран у 1943, пахаваны ў лесе каля в. Балашаўка Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

МАРКАЎ Фёдар Мацвеевіч, н. у 1921 у пас. Светлы, партызан, загінуў 17.11.1943.

МАРКЕЛАВА Таццяна Ігнатаўна, н. у 1920 у в. Губічы, партызанка, загінула 19.11.1943 у в. Берагавая Слабада Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

МАРЧАНКА Іван Рыгоравіч, н. у в. Прыбар, партызан, загінуў 17.4.1944.

МАЧЭЧА Піліп Трафімавіч, расстраляны 19.12.1942 за сувязь з партызанамі.

МІКАЛАЕЎ Уладзімір Васільевіч, н. у 1923 у в. Негаўка, партызан, загінуў 26.7.1943.

МІРОНЕНКА Аляксандр Пятровіч, н. у 1919, партызан, загінуў 25.10.1943, пахаваны ў в. Патапаўка.

МІХАЛЁЎ Іван Фокавіч, партызан, загінуў 2.6.1943 у в. Лозаў.

НОВІКАЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1921 у в. Слабада-Люшаўская, партызан, прапаў без вестак 29.4.1943.

ПАДАШЭЎСКІ Раман Астапавіч, н. у 1900 у г. Буда-Кашалёва, партызан, загінуў у 1942 у г. Талачын Віцебскай вобл.

ПАХОМАЎ Апанас Рыгоравіч, н. у 1913 у в. Губічы, партызан Рэчыцкай брыгады імя К.Я.Варашылава, загінуў 8.5.1943 каля в. Губічы.

РАБЕНЬКІ Ілья Яўсеевіч, н. у в. Рудзянец, партызан, прапаў без вестак.

РАЗУВАЕЎ Аляксей Паўлавіч, н. у пас. Ленінскі, загінуў у чэрвені 1943.

САВАСЦЕЕВА Аксіння Цярэнцьеўна, н. у 1915 у в. Кашалёў, партызанская сувязная, загінула 24.10.1943.

САЗОНАЎ Мікалай Кірэевіч, н. у 1924 у в. Броды, партызан, загінуў 23.10.1943.

САЧЫЎКІН Максім Эмануілавіч, н. у в. Бацунь, партызан, загінуў у 1943 у Мінску.

СІВАКОЎ Васіль Ціханавіч, н. у в. Мікалаеўка, партызан, загінуў 20.3.1943.

СІДАРЭНКА Павел Апанасавіч, н. у 1924 у в. Лозаў, партызан, загінуў 16.4.1943.

СІЛКІН Уладзімір Фядосавіч, н. у 1926 у в. Хоўхла, расстраляны за сувязь з партызанамі.

СІНЯКОЎ Восіп Нічыпаравіч, н. у 1911 у в. Наспа, партызан, загінуў 21.6.1943 у пас. Новае Жыццё.

СІЎЦОЎ Іван Харытонавіч, н. у 1923 у в. Калініна, падпольшчык, павешаны 14.7.1942 у в. Калініна.

СКАРЫНА Аляксандр Сцяпанавіч, н. у 1913, падпольшчык, расстраляны ў чэрвені 1942 у Гомелі.

СКАРЫНА Мікалай Сцяпанавіч, н. у 1915 у в. Калініна, партызан, загінуў 9.6.1942 у в. Калініна.

СЛЕСАРАЎ Аўраам Якаўлевіч, н. у 1906 у в. Рудня-Кашалёўская, партызанскі сувязны, загінуў 3.2.1943.

СТАРАСЦЕНКА Антон Андрэевіч, н. у 1923 у в. Марозавічы, прапаў без вестак.

СТАРАСЦЕНКА Кузьма Піменавіч, н. у в. Чэрапаўка, партызан, расстраляны ў 1942.

СТРЫЖАКОЎ Пракоп Кузьміч, н. у 1922 у в. Губічы, партызан, загінуў 19.11.1943 у в. Берагавая Слабада Рэчыцкага р-на Гомельскай вобл.

СЦЕПАНЕНКА Максім Васільевіч, н. у 1910 у в. Марозавічы, партызан, загінуў у красавіку 1944 пры вызваленні Жлобіна.

ТКАЧОЎ Палікарп Ігнатавіч, н. у в. Губічы, партызанскі сувязны, расстраляны ў 1943.

ТКАЧОЎ Фёдар Ігнатавіч, н. у 1923 у в. Губічы, партызан, загінуў 9.8.1943 у в. Губічы.

ТОРМАНАЎ Васіль Пракопавіч, н. у 1922 у в. Губічы, партызан, расстраляны 13.11.1943.

ТУПКОЎ Дзмітрый Іванавіч, н. у пас. Буда, партызан, загінуў 5.7.1943.

ТУР Іван Аксёнавіч, н. у в. Лапічы, партызан, загінуў у 1943.

ФЕДАРЦОЎ Сяргей Кузьміч, н. у 1890 у в. Жытанежжа, партызан, памёр ад ран у 1943 у в. Свяцілавічы Гомельскай вобл.

ФІДЗЕЛЬ Максім Маркавіч, н. у 1922 у в. Бацунь, партызан, загінуў у сакавіку 1942.

ФІЛІПЕНКА Марцін Ягоравіч, н. у в. Пянчын, партызан, загінуў 29.2.1944.

ХАМРАЛ Фёдар Прохаравіч, н. у 1912, партызан атрада імя Кутузава, загінуў 14.11.1943 у пас. Губіцкі Кардон.

ХВАЙНІЦКІ Навум Пятровіч, н. у 1917 у в. Ліпа, партызан, загінуў у 1943.

ЦЕРАШКОЎ Сяргей Спірыдонавіч, н. у 1912 у в. Губічы, партызан, загінуў 8.5.1943 у пас. Беразоўка.

ЦЕРАШКОЎ Фёдар Нічыпаравіч, н. у 1923 у в. Губічы, партызан, расстраляны 13.11.1943.

ЦІТКОЎ Лука Дзямідавіч, н. у 1903 у в. Крыўск, партызанскі сувязны, загінуў у 1943 каля в. Івольск.

ЦІШЧАНКА Міна Міхайлавіч, н. у в. Радзеева, партызан, загінуў 14.10.1943.

ЦУРБАНАЎ Рыгор Лявонцьевіч, н. у 1909 у в. Калініна, падпольшчык, расстраляны ў чэрвені 1942 у Гомелі.

ЧАРНЯКОЎ Мікалай Гардзеевіч, н. у 1918 у пас. Чырвоны Сцяг, партызан, загінуў 25.7.1943.

ЧУМАКОЎ Іван Аляксеевіч, н. у 1923 у пас. Барок, партызан, загінуў 19.7.1943 у в. Струкі.

ШАПОЦЬКА Леанід Якаўлевіч, н. у 1926 у в. Калініна, падпольшчык, расстраляны ў чэрвені 1942 у Гомелі.

ШАРШНЁЎ Іван Паўлавіч, н. у 1924 у в. Міхалеўка, партызанскі сувязны, загінуў у 1942.

ШАЎЦОВА Зінаіда Цімафееўна, н. у в. Елянец, партызанка, загінула.

ШАЎЧЭНКА Васіль Іванавіч, н. у 1914 у пас. Чырвоны Сцяг, тэхнік-інтэндант 2-га рангу, партызан з 1942, загінуў у жніўні 1943.

ШЧАРБАКОЎ Сцяпан Савельевіч, н. у 1912 у в. Саўгасная, партызан, загінуў 15.10.1943.

ШЫНГЕЛЬ Іван Іванавіч, н. у 1908 у в. Наспа, партызанскі сувязны, закатаваны ў 1943.

ЮРКОЎ Іван Піліпавіч, н. у 1900 у в. Аляксандраўка, падпольшчык, расстраляны ў Гомелі.

ЯРОХАЎ Іван Якаўлевіч, н. у 1919, партызан атрада імя Сталіна, загінуў 17.3.1943 у в. Старое Сяло Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.

ЯСІНСКІ Восіп Казіміравіч, н. у 1907 у в. Любавін, партызан, прапаў без вестак 29.4.1943.

Загінуўшыя мірныя жыхары — ахвяры нямецка-фашысцкага тэрору

ГОРАД БУДА-КАШАЛЁВА

Расстраляны ў снежні 1941 г.
АКУНЬ Фаня (з двума дзецьмі).
АРОНАВА (дачка).
АРОНАЎ.
БАСАВА Рахіль Мееравна (з двума дзецьмі), н. у 1905.
БАСІН Давыд Ісакавіч, н. у 1851.
БАСІН Ізраіль, н. у 1866.
БАСІН Іосіф Якаўлевіч, н. у 1922.
БАСІН Ісар Ізраілевіч, н. у 1902.
БАСІН Лазар Якаўлевіч, н. у 1936.
БАСІН Міхаіл Ісакавіч, н. у 1937.
БАСІН Рыгор Ісакавіч, н. у 1941.
БАСІНА Бася Навумаўна, н. у 1904.
БАСІНА Зэлда Мордухаўна, н. у 1928.
БАСІНА Лея, н. у 1890.
БАСІНА Рыся Лазараўна, н. у 1900.
БАСІНА Рыся Мордухаўна, н. у 1930.
БАСІНА Сара, н. у 1887.
БАСІНА Цыля, н. у 1874.
ВІЛЕНКІН Лёва.
ГАРЭЛІК Рахіль.
ГАРЭЛІК Сямён.
ГЕНІНА Шыфра Мееравна, н. у 1906.
ГЕРЧЫКАВА Слава (з двума дзецьмі).
ГЕРШАНОК Абраша Рахміелавіч, н. у 1929.
ГЕРШАНОК Вольга Мееравна, н. у 1901.
ГЕРШАНОК Мера Рахміелаўна, н. у 1919.
ГЕРШАНОК Міля Рахміелаўна, н. у 1927.
ГЕРШАНОК Песя Рахміелаўна, н. у 1923.
ГЕРШАНОК Раіса Рахміелаўна, н. у 1937.
ГЕРШАНОК Рахміел Абрамавіч, н. у 1891.
ГІНЗБУРГ Абрам.
ГІНЗБУРГ Бася (з двума дзецьмі).
ГІНЗБУРГ Ганна.
ГІНЗБУРГ Нахім.
ГІНЗБУРГ Ніхама.
ГІНЗБУРГ Сара.
ГІНЗБУРГ Хая.
ГОЛЬБІН Рыгор Ісакавіч, н. у 1937.
ГОЛЬБІНА Геня Аронаўна, н. у 1906.
ГОЛЬБІНА Паліна Накаўна, н. у 1939.
ЗАЛМАНАВА Клара Мордухаўна, н. у 1931.
ЗАЛМАНАВА Фаня Майсееўна, н. у 1904.
ЗАЛМАНАЎ Мордух Еўзелевіч, н. у 1869.
ЗАЛЬМАВЕР Шыфра.
ІТЭНБЕРГ Слава Мееравна.
ІТЭНБЕРГ Смая Беркавіч.
КАНТАРОВІЧ Хая (з трыма дзецьмі).
КАНТАРОЎСКАЯ Фета Абрамаўна, н. у 1876.
КАНТАРОЎСКІ Арон Рыгоравіч, н. у 1871.
КРАСНАЯ Эля Мееравна, н. у 1913.
КРАСНЫ Меер Лейбавіч, н. у 1872.
КРЭЙНГОЛЬД Геня Рыгоравіч, н. у 1871.
КРЭЙНГОЛЬД Іда, н. у 1903.
КРЭЙНГОЛЬД Іда Яфімаўна, н. у 1936.
КРЭЙНГОЛЬД Клара Рыгораўна, н. у 1912.
КРЭЙНГОЛЬД Лёва Шмуйлавіч, н. у 1935.
КРЭЙНГОЛЬД Роня Шмуйлавіч, н. у 1937.
КРЭЙНГОЛЬД Сёма Яфімавіч, н. у 1935.
КРЭЙНГОЛЬД Фаня Яфімаўна, н. у 1927.
КРЭЙНГОЛЬД Хаім Львовіч, н. у 1909.
КРЭЙНГОЛЬД Якаў Яфімавіч, н. у 1933.
КУРЦ Вося, н. у 1871.
КУЦІКАВА Сара Евелеўна, н. у 1894.
КУЦІКАВА Соня Барысаўна, н. у 1928.
КУЦІКАВА Фаня.
КУЦІКАВА Эсфір.
КУЦІКАЎ Ісак.
КУЦІКАЎ Лёва Барысавіч, н. у 1926.
КУЦІКАЎ Міхаіл.
ЛЕВІНА Паша Мееравна (з двума дзецьмі).
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Браніслаў Іванавіч, н. у 1936.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Валерый Іванавіч, н. у 1940.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Гольда Айзікаўна, н. у 1893.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Ларыса Іванаўна, н. у 1934.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Марыя Барысаўна, н. у 1929.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Нона Іванаўна, н. у 1936.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Паліна Ісакаўна, н. у 1912.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Роза Берхаўна, н. у 1879.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Рыся Лейзераўна, н. у 1896.
ЛЕЙЗЯРОВІЧ Фаня Барысаўна, н. у 1926.
ЛІЎШЫЦ Злата.
ЛІЎШЫЦ Лейба Залманавіч, н. у 1891.
ЛІЎШЫЦ Сара.
ЛІЎШЫЦ Хаім.
МАЛЕВА Берта Навумаўна, н. у 1881.
МАЛЕЎ Давыд Айзікавіч, н. у 1864.
МЕРКУЛОВІЧ Берта Іосіфаўна, н. у 1921.
МЕРКУЛОВІЧ Вольга, н. у 1878.
МЕРКУЛОВІЧ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1937.
МЕРКУЛОВІЧ Уладзімір Рыгоравіч, н. у 1934.
МЕРКУЛОВІЧ Эстэр Уладзіміраўна, н. у 1913.
МЯРХОВІЧ Ізя Абрамавіч, н. у 1934.
МЯРХОВІЧ Міхаіл Абрамавіч, н. у 1931.
МЯРХОВІЧ Навум Шмуйлавіч, н. у 1888.
МЯРХОВІЧ Раіса Абрамаўна, н. у 1939.
МЯРХОВІЧ Рахіль Навумаўна, н. у 1924.
МЯРХОВІЧ Сара Гершанаўна, н. у 1905.
МЯРХОВІЧ Хана Навумаўна, н. у 1939.
МЯРХОВІЧ Хена Шмуйлаўна, н. у 1902.
МЯРХОВІЧ Цыпа Айзікавіч, н. у 1891.
МЯРХОВІЧ Эйдля, н. у 1855.
ПАЛЕЙ Саламон.
ПАЛЕЙ Сара Навумаўна.
ПІНСКАЯ Берта Львоўна.
ПІНСКАЯ Сара Файбусаўна.
ПІНСКІ Лёва Маркавіч.
ПІНСКІ Ной Маркавіч.

ПІНСКІ Цалер Навумавіч.
ПЛОТКІН Арон Давыдавіч, н. у 1925.
ПЛОТКІН Давыд.
ПЛОТКІН Іосіф Давыдавіч, н. у 1906.
ПЛОТКІНА Любоў Давыдаўна, н. у 1912.
ПЛОТКІНА Сара Мееераўна, н. у 1884.
РАБІНОВІЧ Мойша Якаўлевіч.
РАБІНОВІЧ Сара Файбусаўна (з трыма дзецьмі).
РУДНІЦКАЯ Слава (з двума дзецьмі).
РУЗІНА Хая (з двума дзецьмі).
РУЗІНА Цытна (з двума дзецьмі).
РЭЙНЛІБ Зуся Лейбаўна, н. у 1892.
РЭЙНЛІБ Лізавета Яфімаўна, н. у 1922.
РЭЙНЛІБ Марык Яфімавіч, н. у 1929.
РЭЙНЛІБ Рыва Яфімаўна, н. у 1935.
РЭЙНЛІБ Цыля Яфімаўна, н. у 1927.
РЭЙНЛІБ Яўгенія Яфімаўна, н. у 1938.
РЭЙНЛІБ Яфім Залманавіч, н. у 1886.
СТАНКОВА Марыя Ігнатаўна, н. у 1920.
УКРАІНСКАЯ Эля Мендзелеўна.
УКРАІНСКІ Маісей Львовіч.
ФАЙНГОЛЬД Айзік Вульфавіч, н. у 1870.
ФАЙНГОЛЬД Гіля Айзікаўна, н. у 1900.
ФАЙНГОЛЬД Марыя Айзікаўна, н. у 1870.
ФАЙНГОЛЬД Міргаш Аўрамавіч, н. у 1900.
ФАЙНГОЛЬД Рыц Айзікаўна, н. у 1891.
ФЕЛЬДМАН Любоў Паўлаўна, н. у 1940.
ФЕЛЬДМАН Хая Мееераўна.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Абрам Нафтульевіч, н. у 1939.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Анатоль Барысавіч, н. у 1926.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Барыс Анатольевіч (з чатырма дзецьмі).
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Барыс Навумавіч, н. у 1938.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Барыс Нафтульевіч, н. у 1887.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Барыс Якаўлевіч, н. у 1891.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Бася Анатольеўна.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Бася Майсееўна.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Бейля Навумаўна, н. у 1877.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Берта, н. у 1870.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Берта Нафтульеўна, н. у 1920.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Вера Нафтульеўна, н. у 1934.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Ганна, н. у 1919.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Ганна Барысаўна, н. у 1921.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Ганна Ізраільеўна, н. у 1906.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Іта Барысаўна, н. у 1918.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Зінаіда Я.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Майрэль Анатольевіч (з трыма дзецьмі).
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Майя Нафтульеўна, н. у 1899.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Марык Залманавіч, н. у 1937.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Марык Сямёнавіч, н. у 1933.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Міня Нафтульевіч, н. у 1935.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Міхаіл Нафтульевіч, н. у 1912.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Нісон (з жонкай).
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Раіса Сямёнаўна, н. у 1936.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Сара Мендзелеўна, н. у 1932.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Соня (з двума дзецьмі).
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Соня Янкелеўна.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Тыхля, н. у 1881.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Фаня Шмайкаўна.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Хаім Нафтульевіч, н. у 1939.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Хая Маісееўна.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Хая Янкелеўна.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Хена Львоўна, н. у 1890.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Эсфір Навумаўна, н. у 1916.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Якаў.
ФІНКЕЛЬШТЭЙН Янкель Ізраілевіч, н. у 1921.
ХАЙКІН Ісар Львовіч, н. у 1887.
ХАЙКІНА Гута Елеўна, н. у 1901.
ХАЙКІНА Іта Залманаўна (з пяццю дзецьмі), н. у 1892.
ХАНОЙ Рахіль (з двума дзецьмі).
ЦЫЛАВА (жонка Якава).
ЦЫЛАЎ Якаў.
ЦЫЛАЎ Яўсей.
ЦЫРКІН Нахім.
ЦЫРКІНА (жонка Нахіма).
ЦЫРКІНА (дачка Нахіма).
ЧАРНОВА Мая (з чатырма дзецьмі).
ЧАРНЯК Браніслава (з чатырма дзецьмі).
ЧАРНЯК Самуіл.
ШНЕЙДЭРМАН Арон Міхайлавіч, н. у 1921.
ШНЕЙДЭРМАН Песя Міхайлаўна, н. у 1926.
ШЫНКАРОВІЧ Іларыён Сямёнавіч, н. у 1908, павешаны ў снежні 1941.
ШЫФРЫН Леў.
ЭНЦІНА Муля Шэвелеўна, н. у 1924.
ЭНЦІНА Таццяна Евелеўна, н. у 1903.
ЭНЦІНА Хана Шэвелеўна, н. у 1926.
ЭНЦІН Шэвель Евелевіч, н. у 1888.
ЭПШТЭЙН Абрам Евелевіч, н. у 1896.
ЭПШТЭЙН Маісей Евелевіч, н. у 1884.
ЭПШТЭЙН Марыя.
ЭПШТЭЙН Навум.
ЭПШТЭЙН Соня Абрамаўна, н. у 1886.

АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АКЦЯБР

